# Земляробчы каляндар

БЕЛАРУСКАЯ
НАРОДНАЯ
ТВОРЧАСЦЬ

АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСКАЙ ССР
ІНСТЫТУТ МАСТАЦТВАЗНАЎСТВА, ЭТНАГРАФІІ
І ФАЛЬКЛОРУ

# БЕЛАРУСКАЯ НАРОДНАЯ ТВОРЧАСЦЬ

МІНСК
«НАВУКА І ТЭХНІКА»
1990

АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСКАЙ ССР
ІНСТЫТУТ МАСТАЦТВАЗНАЎСТВА, ЭТНАГРАФІІ
І ФАЛЬКЛОРУ

# ЗЕМЛЯРОБЧЫ КАЛЯНДАР

## (АБРАДЫ І ЗВЫЧАІ)

МІНСК
«НАВУКА І ТЭХНІКА»
1990

ББК 82.3 Бел-6
З-53

Рэдакцыйная калегія:
**В. К. Бандарчык, К. П. Кабашнікаў,**
**А. С. Фядосік** (галоўны рэдактар)

Укладанне, класіфікацыя, сістэматызацыя матэрыялаў
і каментарыі **А. І. Гурскага**

Уступны артыкул **А. І. Гурскага, А. С. Ліса**

Рэдактар **А. С. Фядосік**

Рэцэнзенты:
кандыдат гістарычных навук **Г. А. Каханоўскі,**
кандыдаты філалагічных навук
**І. У. Саламевіч, І. Я. Яшкін**

З $\frac{4702120105-146}{М316(03)-90}$ 143—90

ISBN 5-343-00464-4

© Складальнікі А. І. Гурскі, А. С. Ліс,
1990

## КАЛЯНДАРНЫЯ АБРАДЫ І ЗВЫЧАІ

Ёсць такое паняцце ў навуковым і агульнакультурным ужытку — «духоўныя традыцыі народа». Яно даволі шырокае. У самым вузкім і пераносным сваім значэнні гэта народныя абрады і звычаі, звязаны з імі слоўны і музычны фальклор. Звычаі і абрады ў складанай комплекснай форме адлюстравалі светаўспрыманне старажытнага чалавека, цэлую сістэму дзеянняў — урачыстых рытуалаў, абрадавай варажбы, скіраваных на забеспячэнне будучыні чалавека, працяг яго разумнага жыцця ў пакаленнях. Роля звычаяў і абрадаў у гісторыі чалавецтва, у захаванні асобных яго этнасаў надзвычай вялікая. Звычаі і абрады ў сваёй аснове склаліся на золку чалавечай цывілізацыі (навуковая думка акрэслівае час іх узнікнення эпохай энеаліту) і перадаваліся ад пакалення да пакалення як духоўная практыка асэнсавання свету, прыроды і самога чалавека ў іх. Яны былі своеасаблівым духоўным запаветам продкаў нашчадкам, духоўным лучвом безлічы пакаленняў, калі глядзець на іх у гістарычнай рэтраспектыве.

Што ж такое абрад у сціслa навуковым акрэсленні? Паводле думкі вядомага савецкага этнографа С. А. Токарава, «гэта... такая разнавіднасць звычаю, мэта і сэнс якой — в ы р а ж э н н е (у большай меры сімвалічнае) якойсьці ідэі, пачуцця, дзеяння або з а м е н а непасрэднага ўздзеяння на прадмет уяўляемым (сімвалічным) уздзеяннем»[1]. Вучоны падкрэслівае характэрную рысу абраду — сімвалічнае выражэнне ім пэўнай ідэі, уяўлення, імкнення паўплываць, уздзейнічаць на прадмет, з'яву, здзяйснянае не столькі непасрэдна, як з дапамогай імітацыі пэўных дзеянняў, слоў, заклёнаў, г. зн. сімвалічна.

Абрады і звычаі полісастаўныя па сваёй структуры. Яны ўключалі цэлы шэраг атрыбутыўных элементаў, суправаджаліся гульнямі, танцамі, сцэнічнымі дзействамі, варажбой, якія мелі рытуальны або пацяшальны сэнс, супольным спажы-

[1] Календарные обычаи и обряды в странах зарубежной Европы: Исторические корни и развитие обычаев. М., 1983. С. 6.

ваннем ежы. Ва ўсіх выпадках перш за ўсё яны звязаны з лёсам чалавека, загадкай на будучыню, павінны былі служыць забеспячэнню гэтай будучыні. Вельмі важны элемент абрадаў і звычаяў складалі абрадавыя песні.

Паводле функцыянальнага прызначэння абрады і звычаі падзяляюцца на сямейныя, каляндарныя і грамадскія. Сямейныя суправаджаюць тры найважнейшыя падзеі ў жыцці чалавека: нараджэнне, шлюб, смерць. Грамадскія — сацыяльна важныя, гістарычныя падзеі. Каляндарныя звязаны з гадавымі, пераважна аграрнымі святамі, працай. Яны былі заклікаты асвячаць сабой працоўную дзейнасць чалавека, найчасцей земляроба, садзейнічаць яму ў нялёгкай працы.

Унутраная класіфікацыя каляндарных звычаяў і абрадаў, хоць і агаворваецца, што гэта элементарна, робіцца, як правіла, паводле пор года або сезонна-вытворчых цыклаў. Падзел на цыклы і паэтапны, храналагічны ў дачыненні года разгляд звычаяў і абрадаў дазваляюць бачыць іх у арганічнай сувязі з жыццём і працай чалавека. Аўтары трох выпускаў кніг, прысвечаных каляндарным звычаям і абрадам зарубежнай Еўропы, прызнаюць іх чатырохчасткавы, пасезонны падзел, але дзеля зручнасці восеньскі цыкл аб'ядноўваюць з летнім. Беларускі каляндарна-абрадавы матэрыял дае поўную падставу гаварыць аб чатырох цыклах абраднасці і звязанай з ёй песнятворчасці. Беларуская каляндарная абраднасць, як і абраднасць іншых народаў,— з'ява багатая, шматсастаўная, выяўленча-вобразна выразная. Яна нясе на сабе адбітак розных этапаў развіцця чалавечага грамадства, светаўспрымання чалавека, яго мыслення.

Як з'ява светапогляднага характару, звязаная з духоўным жыццём народа, яго бытам, вуснапаэтычнай творчасцю, звычаёвасць і абраднасць здаўна прыцягвалі ўвагу вучоных, у першую чаргу гісторыкаў і этнографаў. Яшчэ ў XVI ст. пра жніўныя абрады, як яны адбываліся на Міншчыне, у раёне Заслаўя, пісаў лацінамоўны аўтар Ян Ласіцкі [2]. Першыя звесткі аб русальных павер'ях, Купаллі, траецкіх абрадах на Магілёўшчыне падала ў друк М. Чарноўская [3]. У сувязі з пашырэннем ідэй рамантызму, развіццём літаратурна-навуковай цікавасці да беларускага фальклору ў асяроддзі студэнтаў і выкладчыкаў Віленскага універсітэта запісы яго ўсё часцей трапляюць у друк, у тым ліку запісы абрадавых песень і саміх абрадаў.

[2] Losicki Jan. De Rusorum, Moskovitarum et Tartarorum Religione, sakryficii, nuptiarum, funerum vitu. Spiras, 1582.

[3] Czarnowska M. Zabytki mitologii sławiańskiej w zwyczajach ludu na Białej Rusi dochowyane //Dziennik Wileński. Wilno, 1817. T. 6. S. 369—408.

Матэрыялы па аграрным календары, сабраныя І. Лабойкам, В. Анастасевічам, І. Будзіловіч, трапілі ў публікацыі І. Снегірова, А. Цярэшчанкі, П. Бяссонава [4]. Ёсць асобныя звесткі аб каляндарных звычаях і абрадах беларусаў у артыкулах К. Фалютынскага і А. Мухлінскага [5]. Паўней прадстаўлены яны ў кнігах А. Рыпінскага, Я. Тышкевіча, у публікацыях Р. Зяնькевіча, М. Анімеле [6]. Жніўныя звычаі Міншчыны і Віцебшчыны, велікодныя абрады Наддзвіння даволі грунтоўна апісаў П. Шпілеўскі. Яму ж належыць адно з самых поўных апісанняў валачобніцтва [7]. Пры пэўнай кампілятыўнасці кнігі М. А. Дзмітрыева «Збор песень, казак, абрадаў і звычаяў сялян Паўночна-Заходняга краю» ў ёй таксама можна знайсці новыя звесткі аб беларускім земляробчым календары і звязанай з ім абраднасці [8].

Спецыяльна календару, каляндарнай абраднасці былі прысвечаны публікацыі Ю. Крачкоўскага і І. Бермана [9]. Пры гэтым калі ў Бермана скрупулёзна прасочаны каляндарны год аднаго рэгіёна, дакладней, адной мясцовасці, то Крачкоўскі ахапіў яго ў маштабе цэнтральнай і заходняй Беларусі, даў навуковае асэнсаванне ў цэлым.

Шмат цікавых матэрыялаў па каляндарнай звычаёвасці і абраднасці Беларусі, асабліва ўзятых па асобных святах, было апублікавана ў другой палове XIX ст. у перыёдыцы,

---

[4] Снегирев И. М. Русские простонародные праздники и суеверные обряды. М., 1837. Вып. 1. С. 159—163; Терещенко А. Быт русского народа. СПб., 1848. Ч. 6. С. 75—79, 107; Бессонов П. Белорусские песни с подробными объяснениями их творчества и языка, с очерками народного обряда, обычая и всего быта. М., 1871.

[5] Фалютынский К. Народные праздники, увеселения, поверья и суеверные обряды жителей Белоруссии//Вестник Европы. М., 1828. Март — апрель; Мухлинский А. Праздники, игры, суеверия и суеверные обряды простого народа в Новогрудском уезде Литовско-Гродненской губернии//Вестник Европы. СПб., 1830. № 15—16. С. 271—276.

[6] Rypiński A. Białoruś. Paryż, 1840; Tyszkiewicz E. Opisanie powiatu Borysowskieqo. Wilno, 1847. S. 369—411; Zieńkiewicz R. O uroczyskach i zwyczajach ludu pińskiego, oraz o charakterze jego pieśni//Biblioteka Warszawska. 1852. T. 4. S. 513—517; Анимелле Н. Быт белорусских крестьян//Этнограф. сборник. СПб., 1854. Вып. 2. С. 111—268.

[7] Шпилевский П. М. Обряды поселян Витебской и Минской губерний при убоке хлеба с полей//Пантеон. СПб., 1853. Т. 9. Кн. 6. С. 19—34; Ён жа. Волочебники в Витебской губернии//Рус. дневник. СПб., 1859. № 101.

[8] Дмитриев М. А. Собрание песен, сказок, обрядов и обычаев крестьян Северо-Западного края. Вильна, 1869. С. 179—255.

[9] Крачковский Ю. Ф. Быт западнорусского селянина. М., 1874. С. 83—182; Берман И. Календарь по народным преданиям в Воложинском приходе Виленской губернии Ошмянского уезда//Зап. имп. Рус. географ. о-ва по отд-нию этнографии. СПб., 1873. Т. 5. С. 3—43.

у губернскіх і часткова епархіяльных ведамасцях. Змястоўнейшыя з іх належалі М. Гашкевічу, П. Дземідовічу, І. Ярашэвічу, А. Васільевай, С. Карскаму, А. Троіцкаму, М. Петрулану, К. А., А. Пшчолку і інш.[10]

Каляндар народных звычаяў і абрадаў — асобны раздзел у кнізе А. Дамбавецкага, прысвечанай Магілёўшчыне[11].

Аграрныя абрады Палесся сцісла апісаны ў кнізе Дз. Булгакоўскага «Пінчукі», больш шырока пададзены ў манаграфіі І. Сербава «Беларусы-сакуны»[12]. Шырока прадстаўлена каляндарная абраднасць паўночна-ўсходняй Беларусі (з акцэнтам на народных прыкметах) у кнізе М. Нікіфароўскага[13].

Беглы агляд гадавых свят, звычаяў і абрадаў паўднёва-ўсходняй Беларусі маецца ва ўводзінах да кнігі З. Радчанкі «Гомельскія народныя песні»[14]. Даволі дэталёва, па месяцах, праца і звычаі земляроба разглядаюцца ў публікацыі М. Косіч «Ліцвіны-беларусы Чарнігаўскай губерні, іх побыт і песні»[15].

З розных рэгіёнаў беларускай этнічнай тэрыторыі паходзіць багаты каляндарна-абрадавы матэрыял, сабраны П. Шэйнам і яго шматлікімі карэспандэнтамі[16]. У двух тамах

---

[10] Гашкевич Н. Щедрец//Могилев. губерн. ведомости. 1852. № 11; Демидович П. Рождественские святки//Вилен. вестник. 1894. № 277, 281; 1895. № 3; Ён жа. Пасха у сельчан белорусов//Вилен. вестник. 1895. № 73, 74; Ярошевич И. Статистико-этнографические сведения о Бельском уезде Гродненской губернии//Гродн. губерн. ведомости. 1848. № 20—22; Васильева А. Я. Рождественские праздники у крестьян Мозырского уезда//Мин. губерн. ведомости. 1878. № 5; Карский С. Пасха у белорусов Виленской губ.//Вилен. вестник. 1891. № 110, 112; Троицкий А. Уклад, спеваки и шептуны-разорители//Лит. епарх. ведомости. 1875. № 8, 11, 18, 30, 35; Петрулан М. Пасха у сельчан-католиков в Свентянском уезде//Вилен. вестник. 1893. № 68; К. А. Рождество в Сенненском уезде//Могилев. губерн. ведомости. 1898. № 103—104; Пщелко А. Зажинки и обжинки//Витеб. губерн. ведомости. 1903. № 207, 240, 283; Ён жа. Толока//Витеб. губерн. ведомости. 1903. № 139.

[11] Дембовецкий А. С. Опыт описания Могилевской губернии в историческом, физико-географическом, этнографическом, промышленном, сельскохозяйственном, лесном, учебном, медицинском и статистическом отношениях... Могилев, 1882. Кн. 1. С. 503—523.

[12] Булгаковский Д. Г. Пинчуки: Песни, загадки, пословицы, обряды, приметы, предрассудки, поверья, суеверья и местный словарь. СПб., 1890. С. 178—190; Сербов И. А. Белорусы-сакуны. Пг., 1915.

[13] Никифоровский Н. Я. Простонародные приметы и поверья, суеверные обряды и обычаи, легендарные сказания о лицах и местах. Витебск, 1897. С. 221—256.

[14] Радченко Зинаида. Гомельские народные песни (Белорусские и малорусские). СПб., 1888. С. I—XLIII.

[15] Косич М. Литвины-белорусы Черниговской губернии...//Живая старина. СПб., 1901. Вып. 2. С. 255—260; Вып. 3—4. С. 1—42.

[16] Шейн П. В. Белорусские народные песни с относящимися к ним обрядами, обычаями, суевериями, с приложением объяснительного словаря и грам-

трохтомнага збору фальклaрыста прадстаўлены грунтоўныя апісанні ўсіх відаў каляндарных звычаяў і абрадаў беларусаў. З асаблівай паўнатой і паслядоўнасцю зафіксаваны каляндарна-абрадавы комплекс у «Народным календары» Е. Раманава [17]. Звычаі, абрады, песні ў ім пададзены па рэгіёнах, што дазваляе наглядна бачыць распаўсюджанне таго ці іншага абраду, песеннай разнавіднасці на ўсім этнічным беларускім абшары. Рэгіянальны каляндарны звычаёва-абрадавы матэрыял надрукаваны Е. Раманавым у рэдагаваным ім зборніку «Матэрыялы па этнаграфіі Гродзенскай губерні»[18].

У савецкай фалькларыстыцы на розных этапах яе развіцця ўвага да звычаёвасці і абраднасці была неаднолькавай. Калі ў 20-я гады яны яшчэ працягвалі цікавіць збіральнікаў і даследчыкаў, сведчаннем чаго на Беларусі можа быць публікацыя А. Шлюбскага [19], манаграфія М. Нікольскага [20], то з сярэдзіны 30-х гадоў літаральна да нядаўняга часу на абрады не звярталася ўвагі. Толькі з 70-х гадоў у працах рускіх савецкіх фалькларыстаў, асабліва пры вывучэнні абрадавага фальклору, шырока прыцягваюцца факты каляндарнай абраднасці і звычаёвасці. У Беларусі прыкладам таму можа быць манаграфія Г. А. Барташэвіч [21] і інш. Было б неаб'ектыўным сказаць, што ўкладальнікі каляндарных кніг выдання шматтомнага збору беларускай народнапаэтычнай творчасці праігнаравалі земляробчыя абрады і звычаі. Ва ўступных артыкулах да ўсіх шасці каляндарна-песенных тамоў акадэмічнага збору фальклору, дзе разглядаліся калядныя, веснавыя, летнія і восеньскія песні, іх функцыянальнае прызначэнне, шырока прыцягваліся для аналізу з'явы і факты абраднасці і звычаёвасці адпаведных цыклаў. Аднак этнаграфічныя апісанні каляндарных звычаяў і абрадаў у адпаведныя тамы не трапілі, што і абумовіла патрэбу падрыхтаваць і выпусціць іх асобным выданнем. У цэлым сабраныя на працягу амаль двух стагоддзяў звесткі аб каляндарных абрадах беларусаў, апісанні

---

матических примечаний. СПб., 1874. С. 38—221; Ён жа. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края. СПб., 1887. Т. 1. Ч. 1. С. 37—288; 1902. Т. 3. С. 227—247.

[17] Романов Е. Р. Белорусский сборник. Вильна, 1912. Вып. 8. С. 67—281.

[18] Материалы по этнографии Гродненской губернии. Вильна, 1911. Вып. 1. С. 35—42.

[19] Шлюбскі А. Матэрыялы для вывучэння фальклору і мовы Віцебшчыны. Мн., 1927. Ч. 1.

[20] Нікольскі Н. М. Міфалогія і абраднасць валачобных песень. Мн., 1931.

[21] Барташэвіч Г. А. Беларуская народная паэзія веснавога цыкла і славянская фальклорная традыцыя. Мн., 1985.

аграрных свят, звязаных з імі звычаяў і абраднасці даюць багаты матэрыял для ўяўлення аб развіцці народнага светапогляду, норавах, аб народнай этыцы і эстэтыцы. Каштоўныя звесткі пра каляндарныя абрады можна знайсці ў архіве Геаграфічнага таварыства СССР у Ленінградзе (часткова яны абагульнены і апублікаваны ў кнігах Дз. К. Зяленіна) [22], у Ленінградскім аддзяленні Архіва АН СССР, у фондах Шэйна (104), акадэміка Шахматава (134), у Цэнтральным дзяржаўным гістарычным архіве ЛітССР, асабліва ў фондзе Таварыства сяброў навукі (1135) і ў Архіве ІМЭФ АН БССР (фонд 8).

У асобных публікацыях фалькларыстаў і этнографаў мінулага акрамя фіксацыі фактаў народнага светасузірання, як яно адлюстравана ў каляндарнай абраднасці, знайшла месца і спроба навукова растлумачыць многія з'явы і моманты яго. Будучы прыхільнікамі і паслядоўнікамі міфалагічнай школы ў падыходзе да духоўнай спадчыны народа, П. Шпілеўскі і А. Кіркор глядзелі на беларускі фальклор, абрадавую творчасць перш за ўсё як на міфатворчасць і міфалогію [23]. Нельга, аднак, не аддаць належнага міфолагам: яны добра ўбачылі апасродкаванасць многіх з'яў, адлюстраваных у абрадах, космасам, сувязь іх з касмічнымі ўяўленнямі старажытнага чалавека. Дзякуючы правільна знойдзенай зыходнай пасылцы здолелі растлумачыць паходжанне асобных элементаў абраднасці, у прыватнасці цыклічнасці абрадаў, культу сонца і інш.

Асобныя палажэнні тэорыі міфалагічнай школы выкарыстоўваў у даследаванні каляндарна-абрадавай паэзіі Я. Ф. Карскі, які пры гэтым узбагаціў свой аналіз здабыткамі тэарэтычных росшукаў прадстаўнікоў гістарычнай школы, а ў некаторых момантах і распрацоўкамі кампаратывістаў [24].

Савецкія фалькларысты ў асэнсаванні спадчыны мінулага істотна расшырылі навуковы інструментарый. Галоўнае ж — марксісцка-ленінская метадалагічная аснова, дыялектыкаматэрыялістычны падыход да развіцця грамадства, прыроды, светапогляду дазволілі ўбачыць шырокую працоўную аснову каляндарных абрадаў.

---

[22] Зеленин Д. К. Описание рукописей ученого архива имп. Русского географического общества. Пг., 1914. Вып. 1. С. 108—145, 435—466; Пг., 1915. Вып. 2. С. 678—795.

[23] Шпилевский П. М. Белоруссия в характеристических описаниях и фантастических ее сказках//Пантеон. СПб., 1853. Т. 8, 9, 10, 15; 1856. Т. 25; Киркор А. К. Следы язычества в празднествах, обрядах и песнях//Живописная Россия. СПб.; М., 1882. Т 3. Ч. 1, 2. С. 249—277.

[24] Карский Е. Ф. Белорусы. М., 1916. Т. 3. Вып. 1. С. 90—235.

Вядомы беларускі літаратуразнавец, крытык 20-х гадоў М. Піятуховіч у даследаванні «Звычаі і песні беларускіх сялян у іх гаспадарчай аснове» пісаў: «Беларуская абрадавая паэзія грунтуецца на шырокай аграрнай аснове (разрадка наша.— *А. Л.*). Гэта аснова ва ўсіх нашых абрадах і звязаных з імі песнях выступае вельмі яскрава, можна сказаць, што ў нашай абрадавай паэзіі «ўлада зямлі» вылучаецца на першы план»[25]. Гэта крыху агульнае разважанне аб аграрнай аснове каляндарных абрадаў было канкрэтызавана ў працах іншых савецкіх фалькларыстаў, у навуковатэарэтычных даследаваннях і вучэбна-дапаможных курсах па беларускім фальклоры, найбольш удала ў гісторыка-тэарэтычным даследаванні «Беларуская народная вуснапаэтычная творчасць», дзе ў раздзеле «Каляндарна-абрадавая паэзія» (аўтар М. Грынблат) зроблены акцэнт перш за ўсё на працоўныя, стыхійна-матэрыялістычныя ў сваёй аснове вытокі земляробчага календара[26].

Шырэй, чым у фальклорных курсах для ВНУ, разгледжаны паасобныя цыклы каляндарна-абрадавай паэзіі, а з ёй і элементы саміх абрадаў ва ўступных артыкулах да тамоў БНТ каляндарнага профілю «Зімовыя песні» (1975), «Веснавыя песні» (1979), «Валачобныя песні» (1980) і інш. У некаторых тамах, якія рэпрэзентуюць каляндарныя жанры, грунтоўныя этнаграфічныя ракурсы зроблены не толькі пры філалагічным аналізе матэрыялу, але і ў музыказнаўчых уступных артыкулах В. Ялатава («Жніўныя песні», 1974), Г. Таўлай («Купальскія і пятроўскія песні», 1985). Адным з першых у савецкай фалькларыстыцы даследаванняў, прысвечаных асобна каляндарнай абраднасці ў комплексе з абрадавай паэзіяй, была манаграфія У. І. Чычарава[27]. Рускі земляробчы каляндар як цэласная сістэма разгледжаны У. Я. Пропам[28]. Украінскі фалькларыст Ю. Круць зрабіў удалую спробу высветліць земляробчыя асновы каляндарнай паэзіі ў агульнаславянскім маштабе[29]. Беларускія каляндарныя абрады вяснова-летняга цыкла знайшлі грунтоўнае навуковае паралельнае асвятленне

---

[25] Піятуховіч М. М. Звычаі і песні беларускіх сялян у іх гаспадарчай аснове// Полымя. 1928. № 3. С. 177.

[26] Беларуская народная вуснапаэтычная творчасць/Пад рэд. П. Ф. Глебкі, І. В. Гутарава, М. Я. Грынблата. Мн., 1967. С. 61—77.

[27] Чичеров В. И. Зимний период русского народного земледельческого календаря XVI—XIX вв. М., 1957.

[28] Пропп В. Я. Русские аграрные праздники. Л., 1963.

[29] Круть Ю. З. Хліборобська обрядова поезія слов'ян. Київ, 1973.

ў кнізе В. К. Сакаловай [30], веснавыя — у манаграфіі Г. А. Барташэвіч [31].

Вялікае значэнне для вывучэння каляндарнай абраднасці маюць толькі ёй прысвечаныя чатыры выпускі прац супрацоўнікаў Інстытута энтаграфіі імя М. М. Міклухі-Маклая АН СССР пад агульнай назвай «Каляндарныя звычаі і абрады ў краінах замежнай Еўропы»[32]. У іх улічаны вопыт даследавання каляндарнай абраднасці ўсяго еўрапейскага рэгіёна, накоплены ў нарадазнаўстве розных краін. Падняты вялікі фактычны матэрыял, які мае сур'ёзнае значэнне для параўнальнага вывучэння. Паходжанне асобных элементаў абраду, іх семантыка, аграрна-каляндарны змест, сімвалічная форма — усе гэтыя пытанні знайшлі ў артыкулах этнаграфічных выпускаў сучаснае навуковае вытлумачэнне. Калі ў першых трох выпусках згаданых прац этнографаў Інстытута этнаграфіі імя М. М. Міклухі-Маклая даследуюцца паасобку тры абрадавыя цыклы, як яны склаліся ў розных народаў замежнай Еўропы, то ў апошнім, чацвёртым, выпуску гэтага паважнага выдання абраднасць класіфікуецца і даследуецца з вылучэннем асобных структурных яе элементаў. Гэта дазваляе сканцэнтраваць увагу на ўсіх аспектах кожнага з іх паасобку, тым самым заглыбіцца ў сутнасць складанай архаічнай з'явы, вытокі якой губляюцца ў глыбіні сівых стагоддзяў, эпохі неаліту і энеаліту.

У падрыхтаваным томе беларускіх земляробчых абрадаў класіфікацыя зроблена паводле цыклаў, абумоўленых порамі года. Толькі такая сістэматызацыя матэрыялу ў падобным выданні навукова апраўдана. Па-першае, яна дазволіць скласці цэласнае ўяўленне пра ўсю сістэму нацыянальнай аграрнай абраднасці ў гадавой паслядоўнасці яе выканання, а па-другое, не будзе супярэчыць асноўнаму класіфікацыйнаму прынцыпу БНТ. У выданні, якое мае ўстаноўку не на вузкае кола спецыялістаў, а на шырэйшую культурную аўдыторыю, гэты момант мае прынцыповае значэнне.

Не лішне зазначыць, што як выданне апісанняў беларускіх каляндарных звычаяў і абрадаў, так і асобны нарыс пра іх, узятых у цэлым, ажыццяўляецца ўпершыню. Гэта акалічнасць

---

[30] Соколова В. К. Весенне-летние календарные обряды русских, украинцев и белорусов. М., 1979.

[31] Барташэвіч Г. А. Беларуская народная паэзія веснавога цыкла і славянская фальклорная традыцыя.

[32] Календарные обычаи и обряды в странах зарубежной Европы: Зимние праздники. М., 1973; Весенние праздники, 1977; Летне-осенние праздники, 1978; Исторические корни и развитие обычаев, 1983.

ускладае на аўтараў асобную адказнасць і аб'ектыўна абумоўлівае некаторыя непазбежныя выдаткі, у першую чаргу непаўнату даследавання, што робіць відавочным неабходнасць манаграфічнай формы вывучэння гэтага важнага пласта культурнай спадчыны народа.

*А. С. Ліс*

## ЗІМА

Калядная песенная паэзія беларусаў, як і іншых народаў, узнікла і функцыяніравала ў мінулым у непарыўнай сувязі з народным абрадам святкавання Новага года. На думку малдаўскага этнографа Ю. В. Паповіча, «абрадавая паэзія не ўяўляе сабою самастойнай з'явы — гэта толькі славесны акампанемент да абрадавага дзеяння»[33]. Нельга да канца зразумець сутнасці і складанай своеасаблівасці беларускай каляднай паэзіі без навуковага асэнсавання самога каляднага абраду: яго паходжання, зместу і яго значэння ў народным быце.

Звычаі і абрады — гэта істотная частка духоўнай культуры народа, у якіх адлюстроўвалася яго светаўспрыманне і светаразуменне. У каляднай абраднасці і паэзіі беларусаў, вядома, адбіліся язычніцкія рэлігійныя вераванні ў мінулым. Але ў іх увасобіліся стыхійна-матэрыялістычныя погляды, што паступова развіліся ў народным асяроддзі, і маральна-этычныя ўяўленні народа.

Беларускую калядную абраднасць у шэрагу народных звычаяў можна разглядаць як свайго роду помнік этнічнай гісторыі беларускага народа, як своеасаблівую культурную спадчыну мінулага.

Гісторыка-этнаграфічныя даследаванні ў розных рэгіёнах паказалі, што звычаі і абрады адлюстроўваюць дзейнасць чалавека на розных этапах яго грамадска-гістарычнага развіцця. З адным з найбольш старадаўніх відаў чалавечай дзейнасці — земляробствам — звязаны і старажытнейшыя звычаі, так званыя каляндарныя земляробчыя абрады, г. зн. абрады, прымеркаваныя да пэўных сельскагаспадарчых работ у сувязі са зменай пораў года.

Старажытны земляроб быў бездапаможны перад стыхіямі прыроды. Назіранні за з'явамі прыроды параджалі ў яго свядомасці ўяўленні, быццам жывёлы, расліны і нежывая

[33] Попович Ю. В. Молдавские новогодние праздники (XIX — начало XX в.). Кишинев, 1974. С. 28.

прырода (стыхіі) валодаюць чалавечымі ўласцівасцямі: думкамі, пачуццямі, воляй.

Імкненне першабытнага чалавека «задобрыць» разбуральныя прыродныя стыхіі спарадзіла старажытныя язычніцкія культы: пакланенне нябесным свяцілам (салярныя культы), жывёлам і раслінам (татэмізм), розным неадушаўлёным прадметам (фетышызм) і інш., а таксама адпаведныя рытуалы, якія складаюць знешняе афармленне гэтых культаў. Так адбылося раздваенне практычнай дзейнасці чалавека на дзейнасць карысную, рэальна накіраваную на дасягненне жаданага выніку, і дзейнасць, накіраваную на дасягненне жаданага выніку толькі сімвалічна, фармальна, дзейнасць непатрэбную, марную і бескарысную, але якая разглядаецца як абсалютна неабходная для дасягнення жаданага выніку [34]. У вытоках сваіх калядны абрад, як і іншыя народныя каляндарныя абрады, з'яўляецца абрадам з ярка выражаным магічным зместам.

У гадавым коле народных каляндарных абрадаў цэнтральнае месца належыць навагодняму цыклу. Для земляроба сярэдняй еўрапейскай паласы час з кастрычніка па снежань — перыяд замірання прыроды. У яго свядомасці зіма асацыіравалася з панаваннем ліхіх сіл, якія знішчаюць усё жывое. Для барацьбы з імі селянін выкарыстоўваў магічныя дзеянні.

25 снежня ў паўночных шыротах — дзень зімовага сонцавароту. «Адраджэнне» сонца — пачатак новага сонечнага, а разам з ім і аграрнага года (яно абяцала прыход цяпла і святла, прабуджэнне пладаноснай сілы зямлі). Звычай святкавання Новага года таму і з'яўляецца для сялян адным з самых значных каляндарных свят. У гэты перыяд з асаблівай сілай разгортваюцца магічныя абрады ўрадлівасці, якія суправаджаюцца песнямі, танцамі, забавамі. Паколькі абрад калядавання адбываецца ў перыяд зімовага сонцавароту, выказваецца меркаванне, што ён з'яўляецца часткай старажытнага свята, прысвечанага сонцу [35]. Ю. В. Паповіч, даследуючы абрад калядавання ў Малдавіі, знайшоў у ім прысутнасць элементаў старажытных салярных культаў. Відаць, пад уплывам старажытнага свята зімовага сонцавароту тэолагі розных часоў прымяркоўвалі да 25 снежня «нараджэнне» багоў. Менавіта з гэтай датай звязвалася ў старажытных грэкаў нараджэнне Дыёніса — бога расліннасці, а таксама персідскага бога сонца Мітры, якога паважалі старажытныя

[34] Семенов Ю. И. Как возникло человечество. М., 1966. С. 358.

[35] Попович Ю. В. Молдавские новогодние праздники (XIX — начало XX в.). С. 138.

рымляне, і іншых багоў. Пазней, у IV ст. н. э., царкоўнікі атаясамлівалі міф аб нараджэнні сонца з міфам пра нараджэнне Хрыста, прыстасаваўшы новы культ да старажытнай сонечнай сімволікі. З X ст. новая рэлігія ў форме візантыйскага праваслаўя пачала ўкараняцца на Русі. Яна імкнулася падпарадкаваць сабе старажытныя народныя каляндарныя звычаі, прымеркаваўшы да іх свае царкоўныя святы, і падмяняла ўсталяваныя аграрныя абрады абрадамі рэлігійнага хрысціянскага культу. Аднак традыцыйныя аграрна-вытворчыя звычаі трывала ўвайшлі ў быт народаў Еўропы, у тым ліку і славян, зрабіліся неад'емнай часткай грамадска-эканамічных адносін феадальнай эпохі ў вёсцы і ў той жа час каштоўным набыткам этнічнай культуры народаў.

Этнаграфічныя назіранні паказваюць, што, калі ў пэўных народаў існуе аналагічнае натуральна-геаграфічнае і сацыяльна-эканамічнае асяроддзе, у іх развіваюцца агульныя рысы гаспадарання і звязаныя з імі падобныя звычаі і традыцыі, хоць канкрэтныя ўмовы жыцця кожнага народа ствараюць у яго звычаях і традыцыях непаўторную спецыфіку, прыдаючы ім пэўны нацыянальны характар. Гэта палажэнне адносіцца і да ўсходнеславянскіх народаў, якія маюць цесныя, гістарычна абумоўленыя эканамічныя, палітычныя і культурныя сувязі.

Тэрмін «каляда» паходзіць ад лацінскага «colendae». У старажытных рымлян першы дзень кожнага месяца называўся «календа». Усе календы святкаваліся, але асабліва ўрачыста адзначаліся календы наваготнія. Гэтыя назвы разам са святкаваннямі ў розныя часы і былі засвоены славянскімі і неславянскімі народамі.

Асновай жа народнага сельскагаспадарчага календара з'яўляецца працоўная дзейнасць селяніна. Каляндарныя звычаі і абрады функцыяніравалі ў адпаведнасці з патрабаваннямі гэтай дзейнасці, г. зн. яны павінны былі забяспечыць паспяховае вядзенне сялянскай гаспадаркі. А таму характар іх у многім быў абумоўлены канкрэтнымі асаблівасцямі пэўнага геаграфічнага асяроддзя, клімату, эканамічнымі і грамадскімі адносінамі, ва ўмовах якіх ажыццяўлялася вытворчая дзейнасць селяніна. Такім чынам, звычаі і абрады ствараліся тым ці іншым народам на ўласнай глебе, знаходзіліся ў пэўнай сувязі з укладам яго жыцця і адпавядалі яго вытворчым інтарэсам. Толькі пры такой умове яны маглі захавацца і перадавацца з пакалення ў пакаленне як традыцыйныя для гэтага народа.

Калі звярнуцца да канкрэтных прыкладаў гісторыі нашай

краіны, то ўбачым, што ў дарэформеннай Расіі і Беларусі жыццё сялянства характарызавалася эканамічнай адсталасцю і моцным феадальна-прыгонным прыгнётам. Рэакцыйная ідэалогія хрысціянскай царквы апраўдвала палітыку феадальных вярхоў грамадства, культывавала невуцтва, імкнулася да духоўнага заняволення народа. Усё жыццё сялян было аблытана забабоннымі абрадамі. Але ўжо тады творчыя сілы народа шукалі сабе выхад. Фальклорныя творы тых часоў указваюць на зараджэнне і паглыбленне ў светапоглядзе народа элементаў стыхійнага матэрыялізму, з'яўленне ў яго свядомасці свабодалюбівых рэвалюцыйных тэндэнцый. Сялянству ў яго масе царкоўная містыка была чужая.

У перыяд феадалізму і капіталізму навука не з'яўлялася здабыткам шырокіх народных мас, і сяляне вымушаны былі ў сваёй вытворчай дзейнасці абапірацца выключна на ўласныя назіранні над з'явамі прыроды і свой шматвяковы земляробчы вопыт. Нядзіўна, што пры такіх умовах каштоўныя вывады з вопыту спалучаліся з памылковымі поглядамі, якія ў быце станавіліся традыцыяй.

Значная частка традыцыйных народных абрадаў мае рэлігійную аснову. Ф. Энгельс гаварыў, што «ўсялякая рэлігія з'яўляецца не чым іншым, як фантастычным адлюстраваннем у галовах людзей тых знешніх сіл, якія пануюць над імі ў іх паўсядзённым жыцці,— адлюстраваннем, у якім зямныя сілы прымаюць форму незямных. У пачатку гісторыі аб'ектамі гэтага адлюстравання з'яўляюцца перш за ўсё сілы прыроды, якія пры далейшай эвалюцыі праходзяць у розных народаў праз самыя разнастайныя і стракатыя ўвасабленні»[36].

Што ж датычыцца генезісу, гісторыі і сутнасці звычаяў і абрадаў, то пры вывучэнні апошніх варта памятаць наступнае: «Рэлігійны ці бытавы характар абраду залежаў ад яго прызначэння: здзяйсняўся ён з мэтай магічнага ўздзеяння на навакольны свет або рэгламентаваў нормы бытавых, грамадскіх, сямейных узаемаадносін паміж людзьмі... Наяўнасць у абрадзе і абрадавай паэзіі, якая яго суправаджае... міфалагічных вобразаў яшчэ не з'яўляецца сведчаннем рэлігійна-рытуальнага значэння дадзенага абраду. Народжаны існуючым ладам і ўзроўнем эканамічнага развіцця, адлюстроўваючы элементы вераванняў, абрад ці звычай мог у шэрагу выпадкаў мець адзіны сэнс: паставіць чалавека ў пэўную ўзаемасувязь з сельскай і сямейнай абшчынай, замацаваць нормы і правілы паводзін людзей, даць кіраўніцтва для

[36] Энгельс Ф. Анці-Дюрінг. М., 1977. С. 321.

працоўнай дзейнасці»[37]. Такім чынам, вытокам усёй абрадавай паэзіі было жыццё, працоўная і грамадская дзейнасць чалавека, да якой далучылася імкненне выкарыстаць сілы, створаныя ўяўленнем чалавека [38].

У беларусаў, як і іншых усходнеславянскіх народаў, назва «Каляды» замацавалася за перыядам з 24 снежня па 6 студзеня (па ст. ст.), увесь гэты час называлі «святыя вечары», «святыя дні» (у рускіх — «святки»).

Да зімовага свята сяляне пачыналі рыхтавацца задоўга, яшчэ з пачатку зімы. Яны імкнуліся забяспечыць сябе прадуктамі харчавання, неабходнымі, паводле народных навагодніх звычаяў, для святочнага стала. Традыцыйная вячэра ў першы дзень Каляд (посная, або бедная, куцця) з'яўлялася пачаткам святочных вечароў і дзён. На працягу свят наладжваліся тры куцці. Паколькі першая куцця служыла пачаткам Каляд і святкавалася з асаблівай урачыстасцю, яна атрымала назву «Вялікая куцця». У гэты дзень з самай раніцы ў кожнай сялянскай хаце старанна мылі, скрэблі, прыбіралі, заканчвалі любыя пачатыя раней работы, затым уся сям'я мылася і гаспадыня пачынала гатаваць вячэру. З гэтага ж вечара і пачыналася выкананне цэлага комплексу абрадаў, прызначаных забяспечыць перш за ўсё поспех у земляробстве. Рытуальная ежа напярэдадні Каляд у беларусаў адзначалася архаічнай прастатой у падборы страў і спосабах іх прыгатавання. На колькасць страў, аднак, уплыў рабіў не столькі звычай, колькі сацыяльны фактар: у беднай сялянскай сям'і святочную вячэру складалі тры стравы: квас з грыбамі, бліны з макам і галоўная — куцця з мядовай сытой ці льняным алеем; у сям'і сярэдняга дастатку — пяць: акрамя ўпамянутых, яшчэ селядзец з ільняным алеем (ці рыба) і аўсяны кісель з мядовай сытой; у заможнай сям'і — сем: тыя ж, што ў папярэдніх варыянтах, і яшчэ вараныя грыбы, адвар з сушаных яблык, ігруш і сліў.

Куцця — каша з абтоўчаных у ступе зярнят ячменю або пшаніцы. На ўсе тры куцці каша варылася ў адным і тым жа гаршку і з аднолькавай колькасці круп. Звараная куцця да захаду сонца ставілася на сена на покуці і накрывалася хлебам. Каштаваць яе забаранялася не толькі да пачатку вячэры, але і ў час гатавання. Як толькі пачынала змяркацца і зоркі з'яўляліся на небе, на стол пад абрус падкладвалася сена (ва ўкраінцаў і малдаван замест сена ўжывалася часам

---

[37] Чичеров В. И. Зимний период русского народного земледельческого календаря XVI—XIX вв. М., 1957. Т. 40. С. 9—10.
[38] Там жа. С. 10.

салома, пасыпаная мукой). У некаторых сёлах ножкі стала абвязваліся ланцугом (ва ўсходнерамансіх народаў існаваў звычай пад стол класці лямеш ад плуга ці частку ярма). Усе гэтыя рэчы (і іх размяшчэнне) надзяляліся магічнай функцыяй, якая будавалася на фармальных законах падабенства і кантакту (імітатыўная і кантактная магія). Па сялянскім павер'і, яны павінны былі забяспечыць паспяховае вядзенне гаспадаркі ў новым годзе. Ярмо і плуг — добрае ворыва, салома — вялікі ўраджай, мука — урадлівасць збожжавых, г. зн. дабрабыт сям'і ў надыходзячым годзе. Куцця ж ставілася ў цэнтры стала, яна як бы аб'ядноўвала ўсе пералічаныя магічныя ўласцівасці, абазначаючы багаты ўраджай і асабісты дастатак для тых, хто ўдзельнічаў у абрадавай вячэры. У. Я. Проп тлумачыў гэты факт наступным чынам: «Зерне валодае ўласцівасцямі надоўга захаваць і зноў аднавіць жыццё, памнажаючы яго. Семя — расліна — семя складаюць вядомы кругаварот, які сведчыць аб бясконцым жыцці»[39]. Ланцуг, якім абвязвалі стол, выконваў ахоўную функцыю, ён з'яўляўся сімвалічным носьбітам апатрапеічнай магіі.

У дні навагодніх свят на свядомасць селяніна моцна ўздзейнічала ініцыяльная магія: уся сям'я ў час урачыстай вячэры павінна была быць у зборы, каб заставацца разам увесь год. Звычайна маладыя жанчыны ў першы год свайго замужжа прыходзілі на куццю да сваіх бацькоў, каб павячэраць у роднай сям'і. Дамачадцы садзіліся за святочным сталом, строга прытрымліваючыся законаў патрыярхальнага ўкладу жыцця вялікай сям'і. У некаторых сёлах існаваў такі звычай: перш чым сям'я сядзе вячэраць, гаспадар, узяўшы гаршчок з куццёй, тры разы абходзіць з ім вакол хаты, а затым стукае ў акно. Жонка пытае з хаты, хто там. Тады гаспадар адказвае, што гэта сам бог стукае з цёплай, мокрай вясною, з гарачым, спакойным летам, з сухой і ўрадлівай восенню. Пасля гэтага жонка запрашае мужа зайсці ў дом. Гаспадар садзіўся першым за стол, затым па старшынстве каля яго — сыны. На другім баку стала было месца гаспадыні і астатніх дзяцей. Кожны павінен быў пакаштаваць усіх страў, якія падаваліся гаспадыняй у пэўнай паслядоўнасці: селядзец з ільняным алеем, квас з грыбамі, блінцы з макам, аўсяны кісель, нарэшце куцця. Вячэра суправаджалася, як правіла, серыяй абрадаў магічнага характару, накіраваных да той жа галоўнай мэты: забяспечыць будучы ўраджай у новым годзе. Падсохлы верх куцці здымалі і аддавалі курам, «каб добра яйкі неслі». Зачарпнуўшы

[39] Пропп В. Я. Русские аграрные праздники. Л., 1963. С. 16.

першую лыжку куцці, гаспадар стукаў у акно і клікаў мароза «ісці куццю есці», каб не марозіў ячмень, пшаніцу, гарох, грэчку і г. д.: «Мароз, мароз, ідзі куццю есці, а летам не бывай, па межах не хадзі, яры не губі!» Гаспадыня таксама зазывала мароза на куццю, каб не марозіў расаду, агуркі, гарбузы, моркаў, буракі і інш. Калі на наступны дзень мароз рабіўся слабейшы, гаварылі: «Мароз паеў куцці і паласкавеў», а калі рабіўся мацнейшы: «Разгневаўся». (Мароза трэба было «клікаць» на ўсе тры куцці.)

Абрады шанавання памерлых продкаў у навагоднім цыкле беларусаў не атрымалі такога развіцця, як, напрыклад, ва ўсходнераманскіх і паўднёваславянскіх народаў. Аднак (згодна запісам П. В. Шэйна ў б. Смаленскай губ. і ў Слонімскім п. Гродзенскай губ.) беларусы лічылі Каляды і днём памінання памерлых сваякоў. Культ памерлых ва ўсіх народаў выкліканы ўяўленнямі аб залежнасці матэрыяльнага жыцця чалавека ад шанавання памяці продкаў. Шанаванне памерлых звязана з верай у іх здольнасць дапамагаць жывым у забеспячэнні ўраджаю і дабрабыту ў сям'і. Згодна з памінальным калядным звычаем, у беларусаў у знак павагі да нябожчыкаў на абрадавы стол падаваліся блінцы. Перад тым як пачаць святочную вячэру, гаспадар, а за ім і ўсе астатнія дарослыя члены сям'і пралівалі на абрус крыху гарэлкі і першую лыжку рэдкіх страў, клалі кавалачак хлеба, селядца і іншай ежы для нябожчыкаў. Каб сагрэць іх (у далёкім мінулым), 24 снежня на дварах распальвалі кастры, пазней іх замянілі факеламі, свечкамі.

Такім чынам, абрадавыя прынашэнні памерлым сваякам ежы і цяпла на Каляды мелі мэту паказаць, што нашчадкі памятаюць і клапоцяцца аб іх. Культ памерлых продкаў, несумненна, адносіцца да старажытнейшых рэліктавых з'яў: паважлівыя адносіны да старэйшых роду, сям'і, ад вопыту і ўяўлення якіх залежала паспяховае ажыццяўленне вытворчай дзейнасці ўсяго калектыву, характэрны для развітога родавага грамадства.

У некаторых сёлах (б. Сенненскі п. Магілёўскай губ.) існаваў звычай пасля вячэры рэшткі куцці падкідваць да столі, каб хутчэй расла маладая скаціна і каб высока рос лён. А затым усю куццю, што засталася, аддавалі раніцай жывёле, каб яна была сытай і добра пладзілася ў новым годзе.

Пераважна ў калядна-вадохрышчанскія дні сканцэнтроўваюцца мантычныя абрады — варожбы і прыкметы, якія займаюць асаблівае месца ў абрадавым цыкле беларусаў. Значэнне варожбаў і прыкмет вызначана імкненнем чалавека

даведацца пра будучае, каб падрыхтавацца да яго. Гэта імкненне заўсёды жыло ў свядомасці селяніна, таму што магчымасць хоць у якой-небудзь ступені прадбачыць умовы, у якіх яму трэба будзе выконваць сваю гаспадарчую працу, павінна была дапамагчы ў барацьбе з прыроднымі стыхіямі. «Мантычныя абрады... у адрозненне ад магіі не ставілі мэту зрабіць якія-небудзь змены ў знешнім асяроддзі. Яны звычайна накіраваны на тое, каб даведацца пра нешта такое, пра што чалавек не можа даведацца звычайным шляхам»[40]. Па сцвярджэнні А. А. Патабні, «варожбы па пачатку вядомага перыяду аб далейшым яго працягу ёсць пачын. Чым больш доўгі і важны для чалавека перыяд, тым больш значны яго пачатак, тым важнейшы пачын. Гэтым адным незалежна ад іншых вераванняў... тлумачыцца значнасць пачатку перыядаў, якія абазначаюцца гадавымі святамі, асабліва перыяду, які пачынаецца з нараджэння сонца, павароту яго на лета. Калядныя святы — час варожбаў»[41].

У ходзе ўсёй сваёй вытворчай дзейнасці чалавек, назіраючы за прыродай, імкнуўся даведацца аб прычынна-выніковых сувязях у з'явах навакольнага свету. З гэтых назіранняў ён робіць вывады, якія ў адных выпадках адпавядаюць рэальнасці, у другіх — памылковыя. Калядны цыкл прыкмет стварае асобную групу назіранняў і прадказанняў надвор'я, віду на ўраджай, прыплод жывёлы і г. д.

Варажба таксама пабудавана на назіраннях, але пераносіць іх у спецыяльна вызначанае ці створанае чалавекам становішча. Актыўнасць чалавека, такім чынам, абмяжоўваецца сучасным, па якім мяркуюць пра будучае.

На Беларусі калядныя варожбы праходзілі ў форме прыкмет-тлумачэнняў. Асноўная іх тэма — тэма зямлі і ўраджаю. Як правіла, у час варажбы выкарыстоўваліся рэчы хатняга ўжытку, сельскагаспадарчыя прылады і іншыя атрыбуты сялянскай гаспадаркі, якія ўжываліся ў сімвалічным вытлумачэнні (напрыклад, сноп, колас, зерне, хлеб як сімвал ураджаю). Пра будучы ўраджай лёну варажылі наступным чынам: выцягвалі з-пад абруса некалькі сяннінак: калі выцягваліся доўгія — лён будзе высокі, калі кароткія — не ўродзіцца. Пасля вячэры, прыбраўшы сена, па травяным насенні, што засталося на стале, «даведваліся», на якія зерневыя будзе лепшы ўраджай: калі на стале застанецца больш чорнага

---

[40] Попович Ю. В. Молдавские новогодние праздники (XIX — начало XX в.). С. 76.

[41] Потебня А. А. Объяснения малорусских и сродных народных песен: Колядки и щедровки. Варшава, 1887. Т. 2. С. 63—64.

насення — значыць, будзе добры ўраджай грэчкі, калі жоўтага — лепш зародзяць яравыя. Варажылі на куцці: калі каша атрымлівалася разварыстая — павінен быць багаты ўраджай ячменю і г. д.

Варожбы пра будучы ўраджай па сваім паходжанні і функцыі цесна звязаны з жыццём абшчыны ці вялікай сям'і. Варожбы як працэс пазнавання, несумненна, вялі да актывізацыі дзеянняў чалавека ў яго барацьбе з прыродай, але недахоп ведаў, які замяняўся ўяўленнем, прыдаваў гэтым дзеянням ілюзорны характар.

Разам з прыкметамі пра надвор'е і ўраджай, заснаванымі на ўважлівых і ўдумлівых назіраннях селяніна за з'явамі прыроды з дастаткова дакладнымі, апрабаванымі шматвяковай сельскагаспадарчай практыкай вывадамі, у беларускім сялянскім быце існавала нямала прыкмет, якія грунтаваліся на выпадковых супадзеннях: калі першы дзень Каляд выдаецца пагодлівы, ясны — будзе неўраджайны год, а калі пахмурны і снег ідзе — ураджайны. Калі ж у калядны вечар і ноччу на небе шмат зорак — летам будзе шмат грыбоў ці калі ў другой палове дня ў першы дзень Каляд пасыплецца град — гарох дасць вялікі ўмалот, калі снег — будуць добра раіцца пчолы.

Шматлікую групу складаюць прыкметы і павер'і, якія вынікаюць з народных забабонаў. Напрыклад, згодна павер'ю, калі ў час падрыхтоўкі да абрадавай вячэры сена ўнёс і паклаў на стол хлопец, які звычайна пасе валоў, то валы на пашы не будуць разыходзіцца і губляцца. У той жа вечар гаспадар лыжкай вылоўліваў бурбалкі ў кіпячай вадзе і кіпнем паліваў авёс. Раніцай яго аддавалі коням, каб былі такія ж гладкія і гэтак жа хутка бегалі, як гэтыя бурбалкі. Або ў першы дзень Каляд свінням сыпалі ў вочы снег, каб летам не глядзелі ў поле і агарод, не лезлі туды і не рабілі шкоды. Каб авечкі не адбіваліся ад дому, а ішлі ў свой двор, пасля вячэры лыжкі не мылі, іх звязвалі шарсцяной ніткай і пакідалі на стале і г. д. Існавала і такое павер'е, што ад першага наведвальніка ў першы дзень навагодніх свят залежыць дабрабыт у доме: калі ім акажацца дзяўчына — у сям'і павінны адбыцца няўдачы і няшчасці. Усе гэтыя калядныя прыкметы і варожбы — даніна ініцыяльнай магіі і не могуць расцэньвацца інакш, як рэлікты каляднага абраду.

Цэнтральнае месца ў святочным навагоднім абрадавым цыкле займае абрад калядавання: абход пераапранутымі двароў аднавяскоўцаў з выкананнем абрадавых песень. Звычай пераапранання на Беларусі (як і ў іншых славянскіх народаў) захаваў шэраг масак, генетычна звязаных з раннімі формамі

рэлігіі. Цэнтральная маска навагодняга пераапранання — «каза» («казёл»), распаўсюджаная таксама на поўдні Расіі, Украіны, у Малдавіі, Балгарыі, Чэхаславакіі. Ваджэнне «казы» абавязкова суправаджалася выкананнем песень і драматызаваных прадстаўленняў. «Каза» прыбіралася наступным чынам: кажух, вывернуты аўчынай наверх, адзявалі адным рукавом на канец дугі, якая ўстанаўлівалася выпукласцю ўніз. Рукаў завязвалі, ён служыў шыяй і галавой, да якой прымацоўваліся рогі, зробленыя з саломы ці асакі. Да другога канца дугі прывязвалі хвост, таксама з саломы. Невысокага росту, спрытны ў танцах хлопец залазіў пад кажух і выконваў ролю казы. «Казу» суправаджала «світа» пераапранутых. Хлопец высокага росту, які ўмеў складна гаварыць, быў за павадыра, ці «дзеда». Яго апраналі ў старое адзенне, на спіне рабілі горб, прымацоўвалі бараду з пянькі ці лёну, у адну руку давалі табакерку, у другую — вялікі посах. У «світе» павінна была быць і «маладзіца». На гэту ролю падбіралі шчуплага хлопца, апраналі яго ў жаночую кашулю з вышытымі рукавамі і ў андарак, на шыю вешалі ўпрыгожанні, на галаву завязвалі хустку і падмазвалі сажай бровы. У кампаніі калядуючых абавязкова прысутнічалі «цыган», апрануты, як звычайна, у сіні армяк, падпяразаны вяроўкай, з бізуном у руцэ, механоша, музыкант (музыка), запявала і некалькі спевакоў.

Увайшоўшы на двор, павадыр пасылаў бойкага і гаваркога хлопца да гаспадара папрасіць дазволу зайсці ўсім гуртам у хату. Атрымаўшы запрашэнне гаспадара, першым уваходзіў павадыр і вёў за сабой «казу», за імі — «цыган» з «маладзіцай», музыка, механоша і ўся «світа», следам накіроўваліся шматлікія гледачы. «Каза» выходзіла на сярэдзіну хаты, а з ёю павадыр і «цыган» з «маладзіцай», астатнія заставаліся стаяць у парозе.

Павіншаваўшы і пахваліўшы гаспадароў, павадыр пачынаў «муштраваць» «казу» палкай, а спевакі выконвалі песні, якія праслаўлялі «казу» за яе магічную сілу выклікаць добры ўраджай у надыходзячым годзе:

Го-го-го, каза,
Го-го, серая!
Ну-тка, козачка,
Расхадзіся-тка
Па ўсяму двару
Гаспадарскаму...
Дзе каза ходзе,
Там жыта родзе,
Дзе не бывае,
Там вылягае.[42]

[42] Романов Е. Р. Белорусский сборник. Вып. 8. С. 108—109.

Музыкант падыгрываў, «каза» выконвала свой рытуальны танец. Затым «каза» пачынае наравіцца, не слухацца павадыра, б'е яго капытамі, бадае рагамі. Павадыр сварыцца на яе, б'е палкай. У гэты час спяваюцца песні аб непаслухмянай, наравістай казе. Нарэшце «каза» пáдае і прыкідваецца мёртвай. Павадыр са спевакамі пачынаюць гаварыць усёмагчымыя замоўныя формулы (у жартоўна-парадыйным тоне), каб ажывіць яе. Паколькі нішто не дапамагае, калядоўшчыкі звяртаюцца да гаспадароў з просьбай шчодра абдарыць «казу». Пачуўшы гэта, «каза» нечакана падымаецца, скача, кланяецца гаспадарам. Павадыр звяртаецца да «маладзіцы» і «цыгана» з просьбай патанцаваць; музыка іграе «Барыню», «Казачка» ці «Падушачку», а тыя танцуюць. У заключэнне выконваецца віншавальная калядная песня, у якой гаспадарам выказваецца пажаданне добрага ўраджаю і ўсялякага дабрабыту ў новым годзе.

Прадстаўленне заканчвалася ўзнагародай калядоўшчыкаў: салам, каўбасой, пірагом ці грашыма, пасля чаго кампанія накіроўвалася ў наступную хату.

Абрад ваджэння «казы» ў тым выглядзе, у якім ён дайшоў да нашых дзён, з'яўляецца не столькі абрадавым дзеяннем, колькі бытавой гульнёй, забавай. Аб гэтым сведчаць чыста бытавыя персанажы, якія часта прысутнічаюць у святочным маскарадзе: афіцэр, пані (барыня), гандляр, цыган, яўрэй; маскі жывёл, не звязаныя з аграрным рытуалам: мядзведзь, журавель і г. д.; нарэшце, агульны жартоўна-вясёлы карнавальны настрой усіх прадстаўленняў з «казой».

Як паказваюць даследаванні вучоных (Я. Ф. Карскага, Ю. В. Паповіча [43] і інш.), сувязь гэтага абраду з навагоднім святам мае старажытныя генетычныя карэнні. Ускосным указаннем на старажытнае паходжанне абраду з'яўляецца і факт захавання і шырокага распаўсюджання культу «казы» ў многіх еўрапейскіх (славянскіх і раманскіх) народаў. Вывучэнне дахрысціянскіх культаў паказала, што «каза» ў старажытнасці шанавалася за яе нібыта здольнасць узмацняць урадлівасць зямлі. Адсюль і паходзяць магічная роля «казы» ў старажытнай навагодняй абраднасці і звязаныя з ёю забабонныя спробы людзей выкарыстаць сілу жывёлы для паляпшэння ўрадлівасці палёў. «Смерць» «казы», а затым «ажыўленне» яе, паводле абраду, увасабляюць паміранне прыроды зімой і яе ажыўленне з прыходам вясны і павінны

---

[43] Карский Е. Ф. Белорусы. Т. 3. Ч. 1. С. 133; Попович Ю. В. Молдавские новогодние праздники (XIX — начало XX в.). С. 98—100.

абазначаць сакральную сувязь жывёліны з раслінным светам. Акрамя таго, як вынікае з тэкстаў абрадавых песень, прысвечаных «казе», ёй прыпісвалася здольнасць адводзіць няшчасці ад дому, г. зн. функцыя апатрапеічнай магіі. Паводле народных павер'яў, чэрці не любяць і баяцца казы, а поўсць казы — магічны сродак, які абараняе ад варожых уплываў.

Звычай ваджэння «казы» ў зімовым абрадавым комплексе таго ці іншага народа з'яўляецца старажытнейшым перажыткам заалатрыі казы на пэўнай тэрыторыі.

Некалькі менш распаўсюджана ў беларускім калядаванні ваджэнне «каня» («кабылы»). Але ні ў самім абрадзе, ні ў абрадавай паэзіі не знаходзіцца ўказанняў на хтанічную функцыю гэтай маскі ў калядным абрадзе. Уключэнне каня (кабылы) у магічныя дзеянні каляднага цыкла, напэўна, абумоўлена важнай гаспадарчай роляй гэтай жывёлы ў сялянскім быце. У паўднёвых славян — на Украіне, а таксама ў малдаван (у меншай ступені ў рускіх) меў месца культ «свяшчэннага быка» (каровы). Паводле павер'я, у гэтых народаў бык ці карова прыносілі ў гаспадарку пладавітасць жывёлы і добры ўраджай. Іх уводзілі ў дом на святы і частавалі калачом.

У XIX—XX стст. у беларускай вёсцы на зімовыя святы аграрнага календара ўжо ў значнай меры была страчана магічная мэтанакіраванасць абрадавых дзеянняў, а ўсё большае значэнне набываў забаўляльны, гульнявы бок каляднай абраднасці. Выключную ролю ў стварэнні святочнай, вясёлай і ўрачыстай атмасферы ў навагоднія дні ў беларусаў разам з пераапранутымі меў абход калядоўшчыкамі двароў аднавяскоўцаў з выкананнем велічальна-віншавальных песень.

Пры больш падрабязным разглядзе тэматычнага зместу каляднай песеннай паэзіі няцяжка заўважыць, што заклінальны характар тэкстаў калядных песень цалкам падпарадкаваны законам прадуцыруючай магіі зімовага перыяду. У аснове калядавання як калектыўнага закляцця ляжыць уяўленне аб дзейснай сіле магічнага слова, імкненне чалавека змяніць навакольны свет, забяспечыць добры ўраджай і дабрабыт сям'і ў новым годзе. «Пажаданні маюць дзве рэдакцыі: а) дабрабыт, якога чакаюць (так будзе!), і б) паказ прадрачонага як існуючага (так ужо ёсць!). І тая і другая рэдакцыі з'яўляюцца праецыраваннем будучага, але другая з іх успрымаецца як больш дзейсная, таму што ў ёй тое, што жадаецца, паказана існуючым»[44].

---

[44] Чичеров В. И. Зимний период русского народного земледельческого календаря XVI—XIX вв. С. 128.

Калядаванне на Беларусі праходзіла, як правіла, з вечара другога дня Каляд і напярэдадні Новага года. У гэтыя дні, як толькі надыдзе вечар, калядоўшчыкі, сабраўшыся невялікімі групамі (ад 3 да 5 чалавек), адпраўляюцца хадзіць па вёсцы з віншаваннямі. Падышоўшы да хаты, старшы стукае ў акно і пытае ў гаспадара дазволу павіншаваць яго са святам. Калі дазвол быў атрыманы, спевакі, стоячы на двары, пад акном, ці па запрашэнні гаспадара зайшоўшы ў хату, выконвалі свае велічальна-віншавальныя песні. Спачатку спявалі гаспадару і гаспадыні, затым кожнаму члену сям'і ў парадку іх старшынства (у некаторых народаў — украінцаў, малдаван, балгар — калядавалі дзецям, сваякам, якія адсутнічалі, гасцям і нават нябожчыкам). Такі абрад калядавання патрабаваў доўгай папярэдняй падрыхтоўкі пад кіраўніцтвам старшага — настаўніка. У беларусаў кола велічальна-віншавальных калядных песень значна звужана і абмяжоўваецца песнямі гаспадару, гаспадыні, дзяўчыне на выданні, нежанатаму хлопцу. Такім чынам, калядны абрад беларусаў у пэўнай ступені больш падобны да зімовай абраднасці рускага і ўкраінскага народаў.

У велічальнай песні той, да каго яна была звернута, атрымліваў хвалебную характарыстыку. Калі песня адрасавалася гаспадару дома — праслаўлялася яго ўменне весці гаспадарку, багацце яго двара; гаспадыні — усхвалялася яе ўмеласць у рабоце, руплівасць; дзяўчыне на выданні — услаўлялася яе прыгажосць і працавітасць; маладому нежанатаму хлопцу — апявалася яго адвага і спрытнасць. У віншаваннях выказваліся добрыя пажаданні: гаспадарам дома павялічыць сваё багацце ў новым годзе — каб вырас добры ўраджай, каб жывёла дала вялікі прыплод, добра раіліся пчолы і г. д.; хлопцу і дзяўчыне — адшукаць сабе добрую нявесту ці жаніха і абраць шлюб у надыходзячым годзе.

Пажаданні калядоўшчыкаў, як правіла, заканчваліся просьбамі абдарыць за спевы, якія часам гучалі як патрабаванні. Імператыўная форма падобных просьбаў абумоўлена самім калядным абрадам: калядоўшчыкі выступаюць тут у ролі заклінальнікаў урадлівасці і дабрабыту, г. зн. у ролі носьбітаў патэнцыруючай магіі, якая набывае сілу толькі пры выкананні абраду — абдорвання заклінальнікаў. Пасля велічання гаспадары ўзнагароджвалі спевакоў падарункамі: давалі пірог, сала, каўбасу ці грошы. Усё гэта складвалася ў мяшок механошы, і калядоўшчыкі накіроўваліся да наступнай хаты. Такім чынам абходзілі ўсё сяло. У беларусаў калядой называюць любую навагоднюю абрадавую ежу, атры-

маную ў якасці ўзнагароды за выкананне навагодніх велічанняў-віншаванняў. Сабраўшы калядныя дары, калядоўшчыкі спраўлялі затым навагоднія вечарынкі са святочнымі застоллямі.

Вечар напярэдадні Новага года (Шчодры вечар) таксама адзначаўся абрадавай вячэрай — другой куццёй. Другая куцця яшчэ называлася ў народзе багатай, тоўстай, шчодрай, мясной, тлустай, ласай, паколькі стол у гэты вечар вызначаўся багаццем скаромнага. Кожная гаспадыня старалася падрыхтаваць багатую вячэру, сустрэць Новы год у поўным дастатку, каб на працягу ўсяго наступнага года была багатая ежа ў доме. Паводле ўяўленняў аб дзеянні ініцыяльнай магіі, лічылася: калі чаго няма на навагоднім стале, таго не будзе ў доме цэлы год. Колькасць страў навагодняй вячэры таксама мела рытуальнае значэнне: сем, дзевяць, дванаццаць. Куцця падавалася на стол з салам ці маслам. У адпаведнасці з традыцыямі абраду елі вараную свіную галаву, смажаныя каўбасы, сальцісон, крывяную каўбасу, халадзец, верашчаку, блінцы (часта двух сартоў: грачаныя і аўсяныя, што з'яўлялася адзнакай урачыстасці дня, паколькі блінцы на Беларусі былі пераважна святочнай стравай), сыр, кісель з малаком, пірагі. Як бачым, у цэнтры навагодняй абрадавай ежы аказваецца мяса свінні. Ёсць думка, «што рытуальнае забіццё свінні было састаўной часткай абраднасці старажытназемляробчага свята зімовага сонцавароту»[45]. Даследчыкамі ўстаноўлена, што ў старажытных грэкаў свіння па пладавітасці ўспрымалася як сімвал урадлівасці. Старажытныя рымляне ў дні зімовага сонцавароту Сатурну — богу пасеваў і ўрадлівасці — прыносілі ў ахвяру таксама свінню. Аналізуючы зімовую абраднасць рускага народа, У. І. Чычараў прыходзіць да вываду, што «парася ўваходзіла ў тое ж самае кола ахвярных жывёл і сімвалічна абазначала ўрадлівасць, багацце, дабрабыт у жыцці чалавека»[46].

У вечар перад Новым годам па беларускіх сёлах (як і ў іншых суседніх народаў) шчадравалі. Дзяўчаты хадзілі са Шчодрай. На гэтую ролю выбіралі прыгожую, статную дзяўчыну. Яе адзявалі ў святочнае адзенне, галаву ўпрыгожвалі вянком з папяровых кветак і рознакаляровымі стужкамі. Адзеўшы Шчодру, дзяўчаты адпраўляліся па хатах і спявалі

[45] Попович Ю. В. Молдавские новогодние праздники (XIX — начало XX в.). С. 113—114.

[46] Чичеров В. И. Зимний период русского народного земледельческого календаря XVI—XIX вв. С. 78.

шчадроўкі (калядныя песні, якія выконваліся толькі напярэдадні Новага года, з прыпевам «Шчодры вечар»). Шчадроўкі істотна не адрозніваліся ад калядак ні па форме, ні па змесце, ні па функцыі, з'яўляючыся разнавіднасцю зімовай велічальна-віншавальнай песні.

Пры абходзе дамоў аднавяскоўцаў дзяўчаты стараліся не абысці дом, у якім жыў малады нежанаты хлопец. Часам пры велічанні хлопца ў тую частку песні, дзе спявалася пра будучую нявесту, устаўлялася імя дзяўчыны, якая (як было вядома) па сэрцы хлопцу ці па нораве яго бацькам. У апошнім выпадку ўзнагарода была асабліва шчодрай.

У навагоднюю ноч вялікае значэнне надавалася варажбе. Усе дзяўчаты захапляліся ёю. Навагоднія варожбы вызначаюцца сваёй разнастайнасцю і з'яўляюцца яскравым адлюстраваннем невычарпальнай народнай фантазіі. Традыцыйная сувязь варожбаў з навагоднімі святамі ўказвае на тое, што гэты перыяд успрымаўся як вельмі важны і адказны этап у жыцці, які вызначаў лёс людзей. Навагодне-вадохрышчанскія варожбы — гэта ў пераважнай сваёй «асабістыя» варожбы, якія маюць непасрэдныя адносіны да лёсу чалавека.

Варожбы асабліва прыцягвалі да сябе моладзь, гэта і вызначала кола пытанняў, на якія трэба было атрымаць адказ: варажылі пра суджанага ці суджаную, аб будучым замужжы, пра характар мужа і яго маёмаснае становішча, аб жыцці ў сям'і мужа і да т. п. Пытаннямі варажбы былі таксама жыццё і смерць, багацце і беднасць, здароўе і хвароба і інш.

У. І. Чычараў падзяляе навагодні цыкл варожбаў на варожбы-тлумачэнні і варожбы ў форме чараўніцтва. Варожбы-тлумачэнні — «пазнанне» будучага з дапамогай пэўных прыёмаў і спосабаў тлумачэння з'яў, якія адбываюцца незалежна ад варажбітоў; дзеянняў, што наўмысна здзяйсняюць самі варажбіты; дзеянняў, якія выконваюцца людзьмі, жывёламі і птушкамі па волі варажбітоў. Як правіла, для гэтых варожбаў выкарыстоўваліся рэчы хатняга ўжытку ў сімвалічным тлумачэнні. Варажба-чараўніцтва заснавана на веры ў звышнатуральныя сілы, якія дапамагаюць «адкрыць будучае». У такіх выпадках выкарыстоўваліся разнастайныя прадметы, якія захоўвалі ў час варажбы сваё прамое назначэнне (свечкі, пярсцёнак, расплаўлены воск і г. д.).

Шматлікая група шлюбных варожбаў пабудавана пераважна на выпадковасці адказу на пастаўленае пытанне і на адвольных вытлумачэннях з'яў, якія былі прадметам назірання. Найбольш распаўсюджанымі былі варожбы на штыкецінах.

Увечар дзяўчаты бралі міску з куццёй ці каўбасой, выносілі на двор і ставілі яе ў тым месцы, дзе звычайна ссыпалі смецце, самі ж падбягалі да плоту і, датыкаючыся рукою да штыкецін, лічылі іх, прымаўляючы: «Маладзец, удавец». Апошняя са штыкецін і «адказвала», хто будзе мужам — маладзец ці ўдавец. Даволі шырока вядома была і такая варажба: дзяўчаты клалі аладкі на парозе хаты і ўпускалі сабаку — чыю аладку сабака з'есць першую, тая дзяўчына раней за іншых выйдзе замуж. Варажылі і на блінцах: дзяўчына потайкі ад усіх хатніх брала першы спечаны блінец і, выбегшы на вуліцу, пыталася ў першага сустрэчнага мужчыны яго імя. Пачуўшы адказ, яна амаль была ўпэўнена, што ведае імя свайго суджанага. Вельмі важным было для дзяўчыны пытанне, ці выйдзе яна замуж у новым годзе. Для гэтага з першым блінцом яна падкрадвалася да суседзяў пад акно і падслухоўвала, пра што гавораць у хаце. Калі дзяўчына чула словы «ідзі», «што засядзелася», «чаму не ідзеш» — значыць, замуж яна выйдзе; калі ж — «сядзь», «застанься», «яшчэ рана», «пачакай», то ў лепшым выпадку яшчэ год яна не выйдзе замуж.

Каб даведацца, у якім баку жыве яе суджаны, дзяўчына апоўначы павінна была выйсці на скрыжаванне (ці за вароты) і прыслухацца: адкуль данясецца брэх сабакі, у той бок і выйдзе замуж. Распаўсюджана была і варажба з чаравікам. За вароты (ці праз дах дома) кідалі зняты з нагі чаравік: у які бок ён ляжа наском, у той бок дзяўчына выйдзе замуж. А каб даведацца, ці будзе багаты суджаны, трэба было ноччу з першым блінцом пайсці да лазні, прасунуць руку ў аконца і пастарацца да чаго-небудзь дакрануцца. Калі рука намацае што-небудзь касматае (анучу, старызну, рыззё і да т. п.) — быць дзяўчыне замужам за багатым; калі ж пападзецца нешта гладкае (камень, кавалак дрэва і інш.) — усё жыццё прыйдзецца гараваць у беднасці. Не менш важна для дзяўчыны было даведацца, які будзе яе муж: добры ці злосны. Для гэтага яна ішла да калодзежа, рэчкі ці возера, каб кінуць у ваду камень: калі камень пойдзе на дно ціха, то муж будзе ціхі і добры, калі ж з шумам — не будзе ладу ў сям'і. Шырока бытавала ў народзе і шмат іншых відаў народнай варажбы на тэму шлюбу, які мае адбыцца. Варожбы ж з заручальным пярсцёнкам, расплаўленым воскам не атрымалі шырокага распаўсюджання на Беларусі.

Як бачым, аграрныя і сямейныя абрады зімовага цыкла ў беларусаў маюць адну мэту — імкненне чалавека зазірнуць у будучае і дабратворна паўплываць на яго. Тэма шлюбнага

саюзу, багата і разнастайна адлюстраваная ў навагодніх варожбах і варожбах на Вадохрышча, характэрна для ўсёй каляднай абраднасці і каляднай паэзіі. Сам шлюб у шэрагу выпадкаў разумеецца не толькі як з'ява асабістага лёсу чалавека, але і як агульная ідэя ўрадлівасці. Нельга не падкрэсліць, што тэма ўрадлівасці і складае той асноўны ідэйны стрыжань, вакол якога круціцца ўся складаная, адшліфаваная вякамі сістэма каляднай абраднасці беларусаў.

Навагодні цыкл беларускіх звычаяў і абрадаў з'яўляецца сукупнасцю традыцыйных абрадаў аграрна-вытворчага характару з выразна акрэсленымі нацыянальнымі рысамі. На Новы год гаспадар дома ўстае даволі рана і, агледзеўшы сваю гаспадарку, набірае ў міску якіх-небудзь збожжавых зярнят, абыходзіць усе свае пабудовы і жменяй раскідвае зярняты ў розныя бакі, каб у новым годзе быў такі ўраджай збожжа, якім можна было б напоўніць усе гэтыя збудаванні. Да шырока распаўсюджаных навагодніх звычаяў адносіцца, у прыватнасці, рытуальны пасеў, які сімвалізуе багаты ўраджай у новым годзе. Па традыцыі славянскіх народаў, гэта абрадавае дзеянне ажыццяўляецца дзецьмі.

Дзень Новага года вядомы яшчэ пад назвай «Васілле». Тут адбіўся знешні ўплыў царкоўнага календара (1 студзеня — дзень св. Васіля Вялікага). У гэты дзень раніцай сялянскія дзеці, павесіўшы цераз плячо торбачкі з зярнятамі, хадзілі па сяле з навагоднімі віншаваннямі. Увайшоўшы ў хату і прывітаўшыся з гаспадарамі, яны, імітуючы засявальнікаў, раскідвалі жменямі зярняты жыта, аўса, ячменю і інш. «Засяванне» суправаджалася калядкай, якая мела характар заклінання. Тэксты, прызначаныя для дзіцячага выканання, невялікія, вызначаюцца прастатой зместу і формы. Тэма такіх калядак адна — пажаданне гаспадарам добрага ўраджаю і дастатку ў новым годзе. Хлеб у земляробчых народаў з'яўляўся сімвалам матэрыяльнага дабрабыту і ў сувязі з гэтым носьбітам добрай магічнай сілы (кантактная магія).

Больш рэдкай разнавіднасцю абраду з'яўляецца жывёлагадоўчы варыянт, вядомы ў малдаван і на Заходняй Украіне пад назвай «пасяванне», калі «пасявалі» жывёлу і хатнюю птушку, а ў калядках жадалі не толькі вялікага ўраджаю, але і вялікага прыплоду жывёлы ў надыходзячым годзе. Аднавяскоўцы прымалі пасявальнікаў вельмі ахвотна, давалі ім хлеб, сала, баранкі, арэхі, семечкі і г. д.

Яркім прыкладам «вытворчага» абраду ў святочным цыкле звычаяў з'яўляецца рытуал дзеянняў з плугам, які шырока

бытаваў у румын і малдаван, а таксама вядомы на Украіне. Праводзіўся ён напярэдадні Новага года і складаўся з дзвюх частак: першая — вакол ці ўздоўж сяла праводзілі першую ўраджайную баразну для ўсяго сяла; другая — хадзілі па хатах з плугам (а ў больш далёкім мінулым і з valамі, запрэжанымі ў плуг), паказваючы ўмоўнае ворыва ў двары з пажаданнем дабрабыту ў новым годзе. Напрыклад, на Валыні 31 снежня «аруць зямлю і як бы падрыхтоўваюць яе для сяўбы, прычым песнямі і рухамі цела паказваюць працэс ворыва»[47] (імітатыўная магія).

Абрад з плугам і ворывам невядомы на Беларусі, не сустракаецца аб ім упамінання і ў тэкстах беларускіх навагодніх абрадавых песень. У. І. Чычараў адмаўляе існаванне гэтага абраду ў мінулым і ў рускіх. На наш погляд, ён мог знікнуць да таго, як з'явіліся першыя запісы рускай і беларускай народнай навагодняй абраднасці.

Абрады плуга і засявання, таксама як і заклінальныя тэксты, якія суправаджаюць іх, па сутнасці з'яўляюцца рытуалам магіі ўрадлівасці.

Трэцяя куцця, як і першая, у народзе называлася поснай, галоднай. Абрадавая вячэра складалася толькі з поснага; на стол падаваліся тыя ж стравы, што і на першую куццю. Пры гэтым захоўваўся наступны звычай: калі куцця зварыцца і яе трэба пераносіць з печы «на кут», гаспадыня, узяўшы гаршчок з куццёй, пачынае квахтаць, як курыца-квактуха. Пачуўшы гэта, дзеці стрымгалоў бягуць пад стол і пачынаюць там кудахтаць. А некаторыя крычаць, як пеўні. Маці ставіць куццю «на кут», накрывае яе хлебам і сыпле дзецям пад стол семачкі сланечніку. Пазбіраўшы іх, дзеці вылазяць з-пад стала. Сэнс абраду наступны: маці квохча, каб куры вывелі шмат куранят; дзеці кудахчуць, каб куры лепш несліся; пеўнем спяваюць, каб сярод куранят было болей пеўнікаў; семачкі сыплюцца, каб у гаспадарцы было болей курэй.

Па традыцыі ў гэты вечар выкарыстоўваліся пераважна тыя абрады, якія выконвалі апатрапеічную функцыю (г. зн. абарончы характар), маючы быццам бы магічную сілу адганяць усялякую «нечысць», якая, паводле павер'яў, асабліва актыўная і небяспечная ў святочныя дні. «Нячыстая сіла», «злыя духі» ў свядомасці селяніна, які верыў у розныя забабоны, асацыіраваліся з варожымі чалавеку прыроднымі стыхіямі, хваробамі, паморкам жывёлы, усялякай бядой у гас-

---

[47] Чубинский П. П. Труды этнографическо-статистической экспедиции в Западно-Русский край. СПб., 1872. Т. 3. С. 43, 437.

падарцы. Няправільнае разуменне з'яў навакольнага свету абуджала несвядомае імкненне чалавека надзяляць якасцямі жывых істот усё незразумелае, небяспечнае для яго ў прыродзе. Чаму ж «нячыстай сіле» прыпісвалася здольнасць асабліва шкодзіць людзям у дні навагодніх свят? Адказ на гэта пытанне дае А. С. Токараў: «Зімовая цемень, кароткія дні і доўгія ночы, траскучыя маразы і снежныя завеі — усё гэта якраз у сярэдзіне зімы, асабліва ў паўночных краінах, прыгнятала селяніна, дрэнна абароненага ад суровай прыроды. У краінах Заходняй і Паўднёвай Еўропы, калі і не было асаблівых маразоў, то былі зімовыя туманы, завеі, халодныя дажджы. Гэта бяссілле перад жорсткай стыхіяй зімы і ўвасаблялася ў свядомасці забабоннага чалавека ў вобразах нячысцікаў, ведзьм, усялякай нечысці, асабліва небяспечнай людзям у дні калядных свят»[48].

У адрозненне ад першай трэцяя куцця называлася яшчэ вадзяной, таму што да гэтай даты быў прымеркаваны хрысціянска-царкоўны абрад «вадохрышча» (прыстасаваны да старажытнаязычніцкіх вераванняў у магію вады). Цэлы шэраг «ачышчальных» звычаяў беларусаў звязаны з магічнай сілай вады. У некаторых месцах апоўначы, пад Вадохрышча, гаспадыні хадзілі на рэчку ці возера (а дзе іх няма — да калодзежа) і чэрпалі ваду, якую пасля захоўвалі ўвесь год як лекавую. Напярэдадні ўся сям'я мылася, адзявала чыстае адзенне, хату ў гэты дзень трымалі ў чысціні, каб увесь год сям'я была здаровай і чыстай ад «заразы» і розных хатніх паразітаў.

Перш чым пачаць абрадавую вячэру, гаспадар браў гаршчок з куццёй, хлеб, крыж, зроблены з дрэва, і крапілам з аржаных каласоў «асвячаў» ваду. Затым гэтай жа вадой крапіў хату і іншыя будынкі (адначасова маляваў крэйдай крыжы на сценах, дзвярах, вокнах хаты, варотах двара, сценах і дзвярах хлява, гумна і г. д.). Гэта называлася «запісаць Каляды». Куцця, вада і крыжы павінны былі адганяць «нячыстую сілу», засцерагаць ад «чараў» і захоўваць здароўе ўсім, хто жыў у хаце, зберагаць жывёлу ад паморку, усё хатняе начынне і гаспадарчыя прылады, што захоўваліся ў гумне і клеці, ад агню.

Вярнуўшыся ў хату, гаспадар ставіў на стол гаршчок з куццёй, сям'я прыступала да вячэры і спяшалася з ежай, каб летам хутчэй управіцца з палявымі работамі.

Прыкметы і павер'і гэтага дня былі звязаны з апатрапеіч-

---

48 Календарные обычаи и обряды в странах зарубежной Европы XIX — начала XX в. С. 335.

най магіяй. Магія ўказвае не толькі на тое, што трэба зрабіць, але і на тое, ад чаго трэба ўстрымацца. Напрыклад, кожны з членаў сям'і не павінен у гэты дзень дакранацца да зярнят, што прызначаны для пасеву, каб на полі не вырасла пустазелле. Каб засцерагчы будучы ячмень ад засмечанасці, гаспадыня ў святочныя дні называла абгарэлае паленне не «галавешкамі», а «залатушкамі». Каб куры не клявалі пасаджанай расады, не дазвалялася даваць ім у гэты час капусты.

Існаваў шэраг забарон, звязаных з дабрабытам сям'і ў цэлым і асобных яе членаў. Напрыклад, на Новы год нельга было спаць, інакш будзеш спаць цэлы год; нельга злавацца і біцца, а то будзеш злосным і біцца цэлы год; нельга даваць у доўг — увесь год у доме будзе недахоп і г. д. Катэгарычна забаранялася ў гэтыя дні і вечары (асабліва да Новага года) шыць, секчы сякерай, пілаваць, ламаць, віць вяроўкі і г. д., таму што, паводле павер'я, у дзяцей, што народзяцца пасля Новага года, ці ў хатняй жывёлы будуць усялякія ненармальнасці. Праз гэтыя забароны святочныя вечары называліся яшчэ ў народзе «крывымі». Такія забароны дыктаваліся верай у ініцыяльную магію, уяўленнем, што падобнае імкнецца да падобнага.

Каляды — цэнтральнае зімовае свята, час, калі інтэнсіўна разгортваліся забавы і гульні вясковай моладзі, так званыя святочныя вечарынкі ці ігрышчы, якія адбываліся на працягу ўсяго двухтыднёвага перыяду. Нярэдка на ігрышчы з'язджалася моладзь з навакольных вёсак. «Святочныя вячоркі былі адной з галоўных форм святочных гульняў насельніцтва. Можна лічыць зусім абгрунтаваным указанне на іх як на асноўную і старую форму абраду»[49].

Звычайна вясковыя хлопцы і дзяўчаты з нецярплівасцю чакалі Каляд і рыхтаваліся да іх. У наладжванні ігрышчаў асноўную частку клопатаў бралі на сябе дзяўчаты і маладыя замужнія жанчыны. Для ігрышчаў выбіралася больш прасторная хата (дзе была моладзь) ці карчма. У выбранай хаце перад пачаткам Каляд збіраліся дзяўчаты, мылі падлогу, лавы, вокны. Пасля яны прыносілі гаспадыні (часта патаемна ад старэйшых членаў сям'і) муку, сала, каўбасы, крупы і іншыя прыпасы для гатавання вячэры. Гаспадыня павінна была напячы блінцоў, насмажыць сала, каўбас, наварыць кашы з розных круп, насмажыць пабольш яечні і сыру. Час ад часу тая ці іншая дзяўчына прыходзіла дапамагчы ёй. Дзяўчаты

[49] Чичеров В. И. Зимний период русского народного земледельческого календаря XVI—XIX вв. С. 170.

закуплялі свечкі, наймалі музыкаў (звычайна скрыпку з бубнам).

У першы дзень Каляд пасля абеду, па-святочнаму адзеўшыся, дзяўчаты збіраліся ў «сваёй» хаце і наладжвалі танцы. Адвячоркам прыходзілі хлопцы і прымалі ўдзел у складчыне. Пасля ўзаемных пачастункаў за святочным сталом весялосць разгаралася. Спявалі песні, прымеркаваныя да калядных ігрышчаў, танцавалі, вадзілі карагоды. Песні часта былі блізкімі па сваім характары да танцавальных. Часам яны суправаджаліся паказам дзеяння, аб якім спявалі. Карагоды ж арганічна аб'ядноўвалі ў сабе танец, харавое спяванне і элементы драматычнага дзеяння. Вёў карагод найбольш здольны танцор і запявала. У гульнёвых карагодах змест песні разыгрываецца салістамі, якія звычайна знаходзяцца пасярэдзіне карагода. Напрыклад, пры выкананні карагоднай песні «Паскоч, папляш, перапёлачка» моладзь, спяваючы, ходзіць адзін за другім па крузе. «Перапёлачка» — пасярод круга. Ёй даюць (у адпаведнасці з патрабаваннямі песні) хустку, кофту, спадніцу, боты. Адзяваюць яе, затым доўга водзяць па крузе пад акампанемент песні. Танцавалі звычайна «Мяцеліцу», «Барыню», «Вераб'я», «Чыжыка», «Падушачку» (пазней — кадрыль і польку). Танцы і карагоды суправаджаліся прыпеўкамі. Звычайна танцавалі да раніцы і спыняліся, калі музыкі засыналі ад знямогі. Толькі тады хто ішоў дамоў, а хто завальваўся спаць тут жа на падлозе.

Моладзь збіралася ў «сваёй» хаце кожны вечар і праводзіла час у разнастайных забавах. Танцавалі пад спеў прыпевак, часта жартоўна-парадыйнага характару, абменьваліся вострымі жартамі. Хлопцы расказвалі розныя небыліцы, загадвалі мудрагелістыя загадкі і г. д.

Абавязковай часткай навагодніх святкаванняў у моладзі былі традыцыйныя гульні — «Цярэшка», «Яшчур», «Каралевіч» і інш. Самай папулярнай з'яўлялася гульня «Жаніцьба Цярэшкі». У Беларусі яна больш за ўсё была распаўсюджана ў Полацкім, Лепельскім і Дрысенскім паветах Віцебскай губерні. П. В. Шэйн найбольш падрабязныя сведчанні аб гэтай гульні сабраў у сяле Махірава Полацкага павета.

«Жаніцьба Цярэшкі» праводзілася выключна зімой і абавязкова ў заключэнне ігрышч. Месцам падзей звычайна была карчма, таму што праз фрывольны характар гэтай гульні ніхто да сябе ў хату не пускаў. Хоць моладзь з цікавасцю і хваляваннем чакала яе, пытаючыся адзін у аднаго, «ці будуць Цярэшку жаніць», аднак гульня пачыналася як бы нечакана, па камандзе карчмара: «Што гэта ўсё скокі да скокі! Лепей бы

Цярэшку жанілі!» Карчмар пачынаў падганяць (ужо раней ім выбраных) жанатых мужчыну і жанчыну («бацьку» і «маці») заняцца ўладкаваннем «вяселля» (пажылыя сяляне спяшаліся пакінуць карчму, таму што бачылі ў гэтай «жаніцьбе» «адну блазноту»). «Бацька» з «маткай» пачыналі падбіраць пары: прасілі маладых людзей выбраць сабе «жонку» ці «мужа», стараючыся актывізаваць больш хлопцаў, паколькі дзяўчаты часам лічылі за лепшае заставацца ў якасці гледачоў. У гульні звычайна ўдзельнічала пар дзесяць маладых людзей. Калі пары былі папярэдне падабраны, «бацька» з «маткай» садзіліся «на куце». Кожны хлопец ветліва і міла падыходзіў да дзяўчыны і надзяваў ёй на галаву сваю шапку, затым падводзіў яе да «бацькі» з «маткай». Тыя «благаслаўлялі» іх словамі: «Дай бог вам шчасця ў нянасце, харошую долю ў волю, уцечкі на печкі, дзеткі ў клеткі», пасля чаго ўсаджвалі за стол ва ўказанае месца. «Благаславенні» насілі тэатралізаваны характар. Пакуль пары ўсаджваліся, спяваліся спецыяльна прымеркаваныя да гэтага моманту песні ў суправаджэнні музыкі. За сталом хлопцы частавалі сваіх «жонак» гарэлкай, півам, баранкамі, пернікамі. «Вяселлі» суправаджаліся жартоўна-парадыйнымі вясельнымі песнямі, жартамі, а пасля выпітага — абдымкамі і пацалункамі. «Бацька» з «маткай» у сваю чаргу стараліся як мага развесяліць удзельнікаў гульні і гледачоў (тым больш што і самі яны былі «пад чаркай»). Назвы «муж» і «жонка» затым надоўга замацоўваліся за кожнай парай сярод аднавяскоўцаў [50].

У былой Віленскай губерні «Жаніцьба Цярэшкі» разыгрывалася некалькі інакш. Моладзь выстройвалася ў два рады: хлопцы — на адным баку, дзяўчаты — на другім. З жанчын выбіралі адну — больш бойкую, спрытную і галасістую — «сваццяй-маткай». А яна выбірала аднаго з хлопцаў, зацягвала песню і, прытанцоўваючы, праходзіла ўздоўж рада дзяўчат некалькі разоў. Дзяўчаты адказвалі ёй песняй хорам. Нарэшце «сваццfolk» выбірала дзяўчыну і аддавала яе хлопцу. Першая пара ішла танцаваць пад напеў «сваццi-маткі», затым спынялася ў пачатку радоў. «Сваццтя-матка» выбірала наступную дзяўчыну і зноў знаходзіла ёй пару, і так працягвалася да таго часу, пакуль яна ўсіх не «ператжэніць». Тады пары трошкі расступаліся, і ў праходзе паміж імі пратанцоўвала першая пара. У канцы рада хлопец пакідаў дзяўчыну і хаваўся ад яе, дзяўчына ж павінна была знайсці яго. Тое ж рабілі і наступныя пары. Затым такім чынам уцякалі дзяўчаты, хлопцы іх дага-

[50] Шейн П. Материалы... Т. 1. Ч. 1. С. 99—105.

нялі. У час гэтых «праследаванняў» моладзь дэманстравала сваю спрытнасць і знаходлівасць [51].

У в. Латыголічы Барысаўскага павета Мінскай губерні ў пачатку гульні выбіралі «бацьку» з «маткай», якія пад гукі скрыпкі, спяваючы і прытанцоўваючы, выбіралі дзяўчыну для кожнага з хлопцаў. Калі ж «бацькі» пачыналі «вянчаць» дзяцей, усе спявалі хорам жартоўныя вясельныя песні. Пасля таго як «пераажэняць» усіх, хлопцы і дзяўчаты частавалі адзін аднаго гарэлкай і markдругімі закускамі і прысмакамі. У адрозненне ад папярэдняга варыянта вясельнай каляднай гульні тут кожны хлопец у адзін вечар мог «жаніцца» на трох ці чатырох дзяўчынах. Гульня працягвалася некалькі дзён [52].

«Жаніцьба Цярэшкі», якая фактычна перарастала ў сапраўдную інсцэніроўку шлюбнага абраду, займала значнае месца ў беларускіх калядных ігрышчах. У мінулым яе адносілі да тых «грэшных» народных калядных гульняў і забаў, якія выклікалі рэзкія пратэсты, забароны і ганенні як духоўных, так і свецкіх улад. Так, у «Жаніцьбе Цярэшкі» — гэтым вясёлым народным драматызаваным прадстаўленні — своеасабліва адлюстроўваецца традыцыйная для каляднай абраднасці тэма шлюбнага саюзу, ідэя стварэння новай сям'і, новага жыцця ў надыходзячым годзе. Вясельныя матывы вызначаюць амаль усе дзеянні карагодаў.

Такім чынам, увесь песенна-гульнявы комплекс святочных ігрышчаў можна характарызаваць як абрад са шлюбнай сімволікай, які складае арганічную частку зімовых каляндарных народных звычаяў.

Паколькі навагоднія святочныя вечары моладзі для многіх халастых людзей станавіліся адначасова і знаёмствам з будучай нявестай (а час ад Каляд да Масленіцы лічыўся лепшым для вяселляў), то яны набывалі важную ролю ў далейшым развіцці шлюбнай абраднасці ў надыходзячым новым годзе.

Разам з «вяселлямі» дастаткова папулярнымі сярод моладзі, якая сабралася, каб павесяліцца, былі гульні пераапранутых. Ужо ў пачатку XIX ст. пераапрананне ў адзенне цыгана, афіцэра, гандляра і іншых стала неад'емнай часткай беларускіх калядных звычаяў. На ігрышчах навагодняе пераапрананне з абрадавага дзеяння ператваралася ў вясёлыя святочныя забавы, паколькі ў маскарадных касцюмах паказваліся камедыйныя вобразы рэальных людзей. У XIX ст. у паказе сатырычных вобразаў папа, пана, жандарма і іншых ужо

[51] Шейн П. Материалы... Т. 1. Ч. 1. С. 105—108.
[52] Там жа. С. 108—110.

выразна адчувалася нарастанне вострых класавых супярэчнасцей у дарэвалюцыйнай беларускай вёсцы.

Такім чынам, усе пералічаныя вышэй абрады беларускага зімовага цыкла сваімі карэннямі пранікаюць у далёкае мінулае. Паколькі разгледжаны цыкл народных звычаяў і абрадаў на працягу многіх стагоддзяў фарміраваўся і функцыяніраваў пад уплывам канкрэтных гістарычных умоў, якія ўключаюць такія асноватворныя фактары матэрыяльнага і духоўнага жыцця людзей, як гаспадарчая дзейнасць, грамадска-эканамічныя адносіны, палітыка і рэлігія, значную цікавасць у даследчыка выклікае пытанне: які ўплыў аказала на звычаі і абрады хрысціянскае веравучэнне і царкоўная абраднасць з іх гадавым колам свят, пастоў і памятных дзён?

Хрысціянскае веравучэнне ў X ст. пранікла да ўсходніх славян у форме візантыйскага праваслаўя. Першымі прыхільнікамі новай рэлігіі станавіліся звычайна пануючыя класы. Пры дапамозе духавенства яны імкнуліся схіліць да хрысціянства сваіх падданых. Праваслаўная царква пры падтрымцы свецкіх улад аб'явіла бязлітасную вайну дахрысціянскім вераванням і культам на Русі, імкнулася поўнасцю іх знішчыць.

Хоць да пачатку XI ст. амаль уся Еўропа была фармальна хрысціянскай, народныя масы, аднак, захоўвалі свае ранейшыя вераванні і прытрымліваліся традыцыйных звычаяў і абрадаў, якія перадаваліся з пакалення ў пакаленне. Захаваліся яны і ў перыяд позняга сярэдневякоўя, калі ўлада царквы на Русі значна ўзмацнілася (прыкладна з XIV ст.) і новая рэлігія пранікла ва ўсе бакі жыцця народа. Праваслаўная царква сурова асуджала «скверные бесовские действа и игрища», «бесовские» песні, танцы і іншыя «богомерзские дела» ў дні зімовага народнага свята. «Неции памяти того беса Коляды и доселе не перестают обновляти, наченше от самого рождества Христова, повся святыя дни собирающеся на богомерзскія игралища, песни поют, и в них аще о рождестве Христовом воспоминают, но зде же беззаконно и Коляду, ветхную прелесть дьявольскую, много повторяюще присовокупляют...»[53] Але ні пропаведзі і ганьбаванні, ні забароны і ганенні царкоўнікаў так і не змаглі знішчыць абрады, народжаныя старажытнай аграрна-сонечнай рэлігіяй славян, і традыцыйныя народныя зімовыя гулянні. Народу, па сутнасці, было чужым хрысціянскае веравучэнне з яго містыкай, пропаведзямі адмаўлення ад жыцця, ідэямі пакорлівасці і аскетызму, з яго накіраванасцю ў замагільны свет.

[53] Карский Е. Ф. Белорусы. Т. 3. Ч. 1. С. 101.

Царква, не здолеўшы выкараніць народныя звычаі, звязаныя са старажытнымі аграрна-вытворчымі культамі, імкнулася прыстасаваць да іх свае хрысціянскія святы і дні памяці «святых». Менавіта таму адны і тыя ж народныя абрады і вераванні ў розных краінах аказаліся прывязанымі да розных дат хрысціянскага календара. Напрыклад, калі ва ўсходнеславянскіх народаў у дні Каляд «засяванне» рабілася на Новы год, то ў заходніх славян гэты абрад праходзіў на другі дзень Каляд. Дата так званага нараджэння Хрыста была перанесена тэолагамі з 6 студзеня на 25 снежня — дзень зімовага сонцавароту. Згодна з запісам старажытнацаркоўнага аўтара, «калі настаўнікі царквы заўважылі, што хрысціяне зачароўваюцца гэтым язычніцкім святам, яны прынялі меры і на гэты дзень (25 снежня) перанеслі дзень нараджэння Хрыста... Такім чынам яны ўтрымалі гэтае свята да цяперашняга часу»[54].

Дата 6 студзеня (Вадохрышча) праваслаўнай царквой звязваецца з міфам аб хрышчэнні Хрыста ў рацэ Іардань. Царкоўны рытуал свята («вадохрышча» — асвячэнне вады ў рацэ ці ў моры або ў царкве) з'яўляецца, па сутнасці, далёкім адгалоскам старажытнаязычніцкага культу вады. Паводле выказвання С. А. Токарава, «так і нараджаўся рэлігійна-абрадавы сінкрэтызм, «дваяверства», характэрнае для ўсяго цыкла каляндарных народных свят»[55]. З аднаго боку, царква імкнулася перарабіць і вытлумачыць па-свойму рэшткі язычніцтва ў народных звычаях і абрадах, з другога — народныя традыцыі захоўвалі рэшткі старажытных рытуалаў і свят у рамках царкоўнага календара. Але хрысціянскі элемент не зацьміў аграрную сутнасць каляндарнай абраднасці, а закрануў толькі яе знешні бок [56].

Хрысціянскае веравучэнне праз царкву (у часы феадалізму, а затым і капіталізму) пастаянна імкнулася аказваць ідэалагічнае ўздзеянне на народныя масы, спрабуючы духоўна заняволіць як мага болей чалавечых душ. З гэтай мэтай яно старалася падмяніць традыцыйную народную абрадавую паэзію спецыяльна складзенымі хрысціянскімі каляднымі песнямі і рацэямі. Старанна насаджаліся ў мінулым царквой і школай «песні звязды», якія часта выконваліся дзецьмі, што насілі з сабой размаляваную звязду, зробленую з паперы. Гэтыя

---

[54] Алмазов С. Ф., Питерский П. Я. Праздники православной церкви. М., 1962. С. 50—51.

[55] Календарные обычаи и обряды в странах зарубежной Европы. С. 13.

[56] Грынблат М. Я. Некаторыя пытанні развіцця духоўнай культуры беларускай народнасці ў яе адносінах да хрысціянства//Пытанні беларускай этнаграфіі, фалькларыстыкі і тапанімікі. Мн., 1967. С. 56.

песні атрымалі вядомае распаўсюджанне ў калядныя дні. Па стылі і мелодыі яны нагадвалі царкоўныя калядныя песні. Змест іх вызначаўся «Свяшчэнным пісаннем». Па сваёй ідэйна-тэматычнай сутнасці яны зусім не адпавядалі характару і мэтам народных навагодніх звычаяў і заставаліся чужародным уключэннем у святочную абрадавую паэзію народа.

Шматвяковая ідэалогія хрысціянства ўсё ж не магла не адбіцца на светапоглядзе народа. Аднак рэлігійныя погляды сялян дарэформеннай Расіі глыбока адрозніваліся ад афіцыйнага вучэння царквы. Народ адхіляў містыцызм, які прапагандавала царква. Абстрактнасці вучэння царкоўнікаў у бытавым праваслаўі супрацьстаяла імкненне звязаць вобразы хрысціянскай рэлігіі з паўсядзённым працоўным жыццём селяніна. Гэта вяло да захавання ў хрысціянскай абалонцы старажытных язычніцкіх уяўленняў, звязаных з працай і бытам земляроба.

Пры разглядзе так званых хрысціянскіх калядак (песень, якія захавалі рэшткі біблейскіх сюжэтаў) няцяжка ўпэўніцца, што яны пранізаны язычніцкімі антрапаморфнымі элементамі (бог і яго апосталы паводзяць сябе, як людзі,— аруць, пільнуюць жывёлу і г. д.), г. зн. захоўваюць рысы старажытнай дахрысціянскай народнай творчасці. Пра духоўныя вершы А. М. Горкі пісаў: «Духоўны верш» для нас можа быць цікавы настолькі, наколькі ў яго прасачыліся старажытныя ўплывы язычніцкага фальклору... Гэта сведчыць аб жывучасці старажытнага фальклору, але вельмі мала аб рэлігійнай творчасці працоўнага народа хрысціянскай эпохі»[57].

Уплыў хрысціянскай рэлігіі на старажытныя народныя абрады і звычаі, таксама як і на абрадавую народную паэзію, аказаўся толькі павярхоўным: ён прыдаў ім чыста знешнюю хрысціянскую афарбоўку, але не змяніў іх старажытнай народнай сутнасці, іх магічнага аграрна-вытворчага зместу.

Трансфармацыя народных каляндарных звычаяў і абрадаў ішла як бы знутры іх саміх пад уздзеяннем працэсаў гістарычнай эвалюцыі. Па меры таго як ліквідавалася іх першапачатковая аснова (няразвітасць земляробчай працы, поўная залежнасць селяніна ад стыхійных сіл прыроды), мянялася і грамадская псіхалогія, паступова адыходзілі ў мінулае старажытныя магічныя вераванні. «У цэнтральным святкаванні зімовага аграрнага календара ў XIX—XX стст. адмірала магічная мэтанакіраванасць і ўладна заяўляў пра сябе рэалістычны

---

[57] Горький М. Собр. соч.: В 30 т. М., 1953. Т. 27. С. 496.

погляд на рэчаіснасць з яе супярэчнасцямі і сацыяльнай барацьбой»[58].

Аграрныя звычаі навагодняга свята паступова ператвараліся з рытуальных у бытавыя. Усе старыя і новыя песні, усе танцы (вясковыя і гарадскія), карагоды, гульні моладзі як найбольш свабодны ад рытуалу кампанент навагодняга свята служылі толькі адной мэце — унесці ў паўсядзённае жыццё вёскі весялосць і аптымізм. Гэта не азначала, зразумела, што ў XIX ст. у беларускай вёсцы і горадзе зніклі забабоны. «Застаючыся ў быце, яны тым не менш з развіццём народнай самасвядомасці ўсё болей і болей уваходзілі ў супярэчлівасць са стыхійна-матэрыялістычнымі поглядамі працоўнага народа. Цвярозы, здаровы погляд на навакольнае жыццё, які фарміруецца ў сувязі з працоўнай і грамадскай дзейнасцю народа, ростам культуры, паглыбленнем пачаткаў навуковых ведаў... абумовіў аслабленне рэлігійна-абрадавых элементаў у народных святкаваннях аграрнага календара — у тым ліку і ў святкаваннях, якія адкрываюць сабой новы год»[59].

У пачатку XX ст. на Беларусі даволі поўна захавалася калядная абраднасць. Пасля Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі пачаўся хуткі рост вытворчых сіл у нашай краіне, інтэнсіўна праходзіла механізацыя сельскай гаспадаркі, павышалася культура насельніцтва і ўсё больш забываліся магічныя прыёмы і ўсялякае чараўніцтва. Калектыўнае вядзенне гаспадаркі ў калгасах і саўгасах, якое абапіралася на сучасную сельскагаспадарчую тэхніку і агратэхнічную навуку, назаўсёды вызваліла беларускага селяніна ад пастаяннай няўпэўненасці ў будучым, ад спрадвечнага страху перад неўраджаем і бясхлебіцай. Старажытныя навагоднія звычаі ў гэтых умовах зусім згубілі свой магічны сэнс і ператварыліся ў святочныя забавы, нацыянальную традыцыю, «захаваліся яны толькі як форма рэгламентацыі і ўпрыгожання быту, грамадскіх ці сямейных адносін, як форма калектыўных адносін і задаволення эмацыянальна-эстэтычных патрэб»[60].

У нашы дні народныя навагоднія звычаі ў некаторай ступені захаваліся на Беларускім Палессі (у пэўных раёнах Гомельскай і Брэсцкай абласцей, асабліва ў вёсках Тонеж,

---

[58] Чичеров В. И. Зимний период русского народного земледельческого календаря XVI—XIX вв. С. 212.

[59] Там жа.

[60] Попович Ю. В. Молдавские новогодние праздники (XIX — начало XX в.). С. 153.

Букча, Глушкавічы, Клетная і інш., а таксама ў паўночна-заходніх раёнах Віцебскай вобл.).

У еўрапейскіх народаў захоўваюцца традыцыйныя формы абраднасці зімовага цыкла. На іх аснове сфарміраваліся новыя навагоднія звычаі (не пазбаўленыя нацыянальнай своеасаблівасці). Яны захоўваюцца як гарадскім, так і сельскім насельніцтвам. Гэта перш за ўсё папулярная ў розных народаў калядна-навагодняя ёлка, народжаная звычаем выкарыстоўваць у зімовай абраднасці ўпрыгожаныя галінкі вечназялёных раслін. Гэта агульнаеўрапейскі звычай навагодніх узаемных віншаванняў і абдорванняў з пажаданнем дабрабыту ў новым годзе. Гэта (асабліва любяць дзеці) вясёлы навагодні маскарад з пераапрананнем у Дзеда Мароза, Снягурачку, звяроў і іншых казачных персанажаў. Гэта, нарэшце, традыцыя навагодняга сваточнага стала, сваточных вечароў і карнавалаў, што трывала ўсталявалася ў быце розных народаў. «У апошнія гады,— піша С. А. Токараў,— у многіх краінах назіраецца... абагачэнне традыцыйных абрадаў, прымеркаваных да старых дат... абагачэнне іх дэманстрацыяй скарбаў народнага мастацтва (танцы, песні, музыка, артыстычныя спаборніцтвы, нацыянальныя касцюмы, часам спартыўныя гульні і выступленні)... Гэтыя фестывалі, якія дэманструюць лепшыя бакі нацыянальнай культуры, служаць цудоўнай формай узаемнага культурнага абмену і ўзаемнага абагачэння людзей розных краін. Калі яны і не заўсёды прама звязаны з датамі старога абрадавага календара, то, па сутнасці, яны арганічна працягваюць і развіваюць тую ж векавую традыцыю, але ўжо на новым, больш высокім узроўні»[61].

Такім чынам, традыцыйныя народныя звычаі зімовага цыкла, узбагачаныя новым зместам, набылі і новыя формы, зрабіўшыся неад'емнай часткай сучаснага грамадскага жыцця.

*А. І. Гурскі*

## ВЯСНА

Комплекс звычаяў і абрадаў веснавога перыяду асабліва багаты і разнастайны.

**Масленічныя абрады.** Да іх непасрэдна прымыкалі абрады і звычаі Масленіцы (Масленкі) — гадавога свята, якое адзначалася як праводзіны зімы і сустрэча вясны. Са сваёй

---

[61] Токарев С. А. Народные обычаи календарного цикла в странах зарубежной Европы//Сов. энтография. 1973. № 6. С. 28.

спецыфічнай абраднасцю Масленіца стаяла на мяжы двух цыклаў. Пераканаўчым уяўляецца меркаванне, паводле якога масленічныя ўрачыстасці ў дахрысціянскія часы адносіліся да веснавых святкаванняў, але пазней Вялікім постам былі адсунуты да зімовага цыкла [62]. На карысць такой гіпотэзы гавораць агульны настрой лікавання, характэрны для святкавання Масленкі, а таксама некаторыя яе абрады і песні, напевы якіх вызначаюцца характэрнай для вяснянак тыпалогіяй, наяўнасцю карагодных матываў. Два моманты, дзве бытавыя акалічнасці былі вызначальнымі для свята Масленіцы і звязаных з ёю абрадаў. Па-першае, як урачыстасць праводзін зімы і сустрэчы вясны яна мела аграрную аснову. Абрады яе былі скіраваны на магічнае заклінанне цяпла, адраджэння прыроды, памысную падрыхтоўку рабочага маладняку (каня, вала) для будучых палявых работ. Па-другое, час ад Каляд да Запустаў (апошнія пачыналі Вялікі пост) лічыўся адпаведным для шлюбавання, вяселляў, і таму масленічныя звычаі і асабліва песні заключалі ў сабе нямала матываў пра шлюб, сямейнае жыццё, былі павернуты да гэтых праблем. Уласна масленічныя звычаі, абрады, песні не былі тут выключэннем сярод іншых каляндарных цыклаў: аснову іх складалі аграрныя і любоўна-сямейныя клопаты чалавека працы.

Масленічны тыдзень (ад панядзелка да нядзелі) называюць Масленым, або Сырным, тыднем. З масленічных песень бачна, што маслу і сыру надавалася ў час святкавання асабліва вялікае значэнне. У часы язычніцтва гэта ежа на Маслены тыдзень, трэба думаць, мела абрадавы сэнс, спажыванне яе насіла рытуальны характар. На ўсходзе Беларусі на Масленку ў частаванні, у спажыванай на гэты час ежы вялікае месца займалі бліны і aладкі. Нягледзячы на веснавую сціпласць запасаў селяніна, Масленка патрабавала асабліва багатага частавання. Менавіта сытнай ежы надаваўся магічны сэнс для таго, каб паўплываць на добры зыход новага працоўнага года, што пачынаўся з прыходам вясны.

Аграрны сэнс праглядае і ў масленічных гульнях, забавах моладзі, асабліва ў гайданні на арэлях: чым вышэй узляталі на іх пары, тым большы, даўжэйшы, паводле вераванняў, абяцаў быць лён [63]. Запрэжанага ў санкі маладога жарэбчыка ці бычка аб'язджалі па крузе, што мела пэўную аграрна-магічную мэту. Пашыраны звычай катання на санках і саначках,

[62] Грынблат М. Каляндарна-абрадавая паэзія//Беларуская народная вуснапаэтычная творчасць. С. 70.

[63] Демидович П. Масленица и Великий пост//Вилен. вестник. 1895. № 54—55.

коўзанне на ледашах сталі адметнай забавай масленічных гульняў, садзейнічалі характэрнай для свята весялосці, гуллівасці, гарэзлівасці. На Масленку быў звычай абкатваць новыя санкі. Калі яны вытрымлівалі вялікую гурму моладзі, што ўсаджвалася на іх, і злятаі з гары цэлымі, то лічыліся годнымі ў гаспадарцы. Назіралі за канём ці маладым валом, якіх аб'язджалі: калі яны неахвотна ішлі дахаты, трухалі з апушчанай галавой, лічылася, што жывёліну лепш збыць [64]. У гэтых звычаях, прыкметах праглядаў просты практычны сэнс, стыхійна-матэрыялістычная аснова ўспрымання жыцця.

Такі абрад, як спальванне чучала, што сімвалізавала сабой зіму, на Беларусі меў лакальнае пашырэнне (вядомы на паўднёвым усходзе). Агні, вакол якіх вадзіліся карагоды, мелі магічна-ачышчальны характар. Магчыма, у глыбокай старажытнасці яны запальваліся для таго, каб магічна наблізіць цяпло, прыход вясны. На Беларусі, прынамсі ў цэнтральным яе рэгіёне, з Масленкай быў звязаны звычай адведваць маладзіцу, якая выйшла замуж на працягу апошняга года. Гурт дзяўчат і жанчын спявалі пры гэтым адведавыя масленкі, як рабілі ў паўночна-заходнім рэгіёне ў час абходу двароў на Купалле або ў цэнтральным і цэнтральна-заходнім Палессі падчас свята «куста». Быў яшчэ звычай адзявання «калодак» (істужак з кветкамі), найчасцей стасаваных да хлопца, што не спяшаўся жаніцца, ці да дзяўчыны, якая засядзелася ў дзеўках [65]. Які быў першапачатковы абрадавы сэнс у абходзе на Масленку двароў маладзіц-гаспадынь і вітанне іх, цяжка сказаць. Хутчэй за ўсё гэта было свайго роду абрадава-магічнае дзейства, накіраванае на ўмацаванне маладой сям'і. На Беларусі ў параўнанні з Расіяй Масленіца святкавалася сціпла [66].

**«Гуканне вясны».** Адзін з найруплівейшых даследчыкаў духоўнай культуры беларусаў Е. Р. Раманаў у вядомай сваёй працы «Народны каляндар» адзначаў: «Першага сакавіка лічыцца пачаткам вясны. У гэты дзень сяляне не працуюць, каб не ўгнявіць мучаніцу Аўдакію, якая «дзержа ў руцэ лета». Натуральна бачыць у гэтым адгалосак таго часу, калі год пачынаўся 1 сакавіка»[67]. У гэты дзень пачыналі спяваць

[64] Романов Е. Р. Белорусский сборник. Вып. 8. С. 137; Шейн П. В. Материалы... Т. 1. Ч. 1. С. 123—124.

[65] Косич М. Литвины-белорусы Черниговской губернии//Живая старина. 1901. Вып. 2. С. 225.

[66] Соколова В. К. Весенне-летние календарные обряды русских, украинцев и белорусов. С. 38—44.

[67] Романов Е. Р. Белорусский сборник. Вып. 8. С. 142.

вяснянкі — «клікаць вясну». З. Радчанка сведчыла, што на Гомельшчыне «гукаць вясну» пачыналі яшчэ ў лютым спевам вяснянкі «Зіма з летам сустракаецца»[68]. Наогул жа спяваць першыя веснавыя песні і адпраўляць адпаведныя веснавыя абрады пачыналі найчасцей тады, калі сонца пачынала хадзіць вышэй і з'яўляліся першыя праталіны. У кліматычна-геаграфічных умовах Беларусі, калі браць яе ў цэлым, час «гукання вясны» супадаў са святам Дабравешчання, або Звеставання (25 сакавіка *). Яго і лічыў акадэмік Карскі пачаткам уласна веснавых звычаяў, абрадаў і песень [69].

Абрад «гукання вясны» меў выразна аграрна-магічныя рысы. Выконвалі яго дзяўчаты. Яны выбіралі ўзвышаныя месцы, ужо вызваленыя ад снегу. Пасцілалі салому і, усеўшыся на яе кружком, увесь вечар, пачынаючы з полудня, спявалі вяснянкі — песні, у якіх горача заклікалася Вясна прыйсці на зямлю і прынесці з сабой «цёплыя дзянёчкі, частыя дажджочкі», а таксама збожжа і красак. У раўніннай мясцовасці гукальніцы вясны ўзбіраліся на гуменныя стрэхі — толькі б кінуць песню сваю вышэй у неба, далей у прасцяг.

У некаторых мясцовасцях пачыналі вадзіць «танкі» з веснавымі песнямі. На Чэрыкаўшчыне дзяўчаты збіраліся ля лазні, дзе з ільнянога і пяньковага мяління раскладвалі агонь і спявалі пры ім вяснянкі [70]. У Рагачоўскім павеце, па сведчанні Е. Раманава, дзяўчаты дзяліліся на два гурты, займалі кожны паасобку два ўзгоркі, дзе зямля ўжо падсохла, і пачыналі там «гукаць вясну», падаючы голас адны другім: «Ой, вясна-маці, хадзі к нам гуляці!» У сваіх этнаграфічных назіраннях вучоны падкрэсліваў, што «гукаюць вясну кожны вечар, пачынаючы з дня Дабравешчання да таго часу, пакуль не стане магчымым араць зямлю»[71]. Трэба думаць, што вяснянкам аддавалася ў ранневеснавы перыяд такая вялікая ўвага менавіта як песням абрадавага прызначэння, закліканым, паводле думкі старажытнага чалавека, магічна наблізіць цёплыя дні, адраджэнне прыроды і магчымасць палявых работ.

На Саракі (9 сакавіка), калі, паводле народнага павер'я, з поўдня вяртаецца сорак выраяў, выпякалі «жаваранкаў» з цеста, дзеці падкідалі іх угору з просьбай аб хутчэйшым

---

[68] Радченко З. Гомельские народные песни. С. XXII.

* Тут і далей каляндарныя даты падаюцца паводле ст.ст., як яны традыцыйна замацаваліся ў народнай свядомасці.

[69] Карский Е. Ф. Белорусы. Т. 3. Вып. 1. С. 142.

[70] Романов Е. Р. Белорусский сборник. Вып. 8. С. 142.

[71] Там жа. С. 143.

прылёце птушак, якіх лічылі за сімвалічных вестуноў вясны [72]. Гэта дзеянне магічнага характару, сімільная магія: паводле думкі старажытнага чалавека, падобнае здольна выклікаць падобнае.

З першых жа веснавых дзён вялася аграрная варажба па прыкметах. Лічылася, што першыя чатыры сакавіцкія дні прадракаюць надвор'е на ўвесь год, адпаведна: першы — вясну, другі — лета і г. д.[73] Па тым, якое надвор'е ў першыя веснавыя дні, быццам можна меркаваць, якім яно будзе ва ўсе чатыры пары года і ўраджаю ці неўраджаю ад якой земляробчай культуры можна спадзявацца ці не спадзявацца.

Самымі вялікімі гадавымі святамі вясны былі Вялікдзень, Юр'я і Сёмуха. Яны адбівалі ў сабе пэўныя этапы, вехі ў жыцці і працы селяніна-земляроба. Акрамя гэтых трох адзначалася яшчэ некалькі меншых свят і прысвяткаў, якія суправаджаліся адпаведнымі абрадамі, мелі свае звычаі, павер'і, выконвалі, паводле думкі земляроба, свае пэўныя жыццёвыя функцыі.

Найбольшаму веснавому святу Вялікадню папярэднічала Вербніца, або Вербная нядзеля. Пад напластаваннямі хрысціянскіх уяўленняў Вербніца захавала з язычніцкіх часоў вераванне аб перадачы здароўя, сілы адроджанай прыроды чалавеку праз непасрэдны фізічны кантакт (кантактная магія). На Вербніцу сустрэчных хвасталі асвячонай галінкай вярбы — вербачкай, прыгаворваючы:

Не я б'ю, вярба б'е,
За тыдзень — Вялікдзень.
Хвора ў лес на верас,
А здароўе ў косці.
Не я б'ю, вярба б'е,
За тыдзень — Вялікдзень.
Будзь здароў, як вада,
А расці, як вярба!
Будзь здароў на ўвесь год![74]

Вялікдзень у параўнанні з Калядамі больш сціпла абстаўлены абрадамі. Галоўны святочны рытуал на першы дзень Вялікадня — абход двароў валачобнікамі. У часы язычніцтва гэта быў прадуцыравальны абрад, заклікаючы забяспечыць памыснае правядзенне веснавой сяўбы і добры ўраджай у будучым, а таксама прыплод жывёлы. Хрысціянства змагалася

[72] Романов Е. Р. Белорусский сборник. Вып. 8. С. 147.
[73] Крачковский Ю. Ф. Быт западнорусского селянина. С. 89—90.
[74] Там жа. С. 104—105.

з ім як з перажыткам язычніцтва [75]. На шчасце, з невялікімі поспехамі: валачобніцтва дзякуючы высакароднасці самой традыцыі, багаццю песеннага суправаджэння яшчэ заставалася доўгі час пачцівым звычаем віншаваць дом са святам, вітаць гаспадара з гаспадыняй, іх дзяцей валачобнымі песнямі.

Вялікае рытуальнае значэнне ў час велікоднага свята аддавалася ежы. У язычніцкія часы яна мела пэўны абрадавы сэнс. Святочны велікодны рытуал патрабаваў адпаведны набор ежы. Этнаграфічная навука заспела велікодную рэгламентацыю страў ужо ў хрысціянізаваным выглядзе — як свянцонае (асвячонае царкоўным ці касцельным рытуалам). Адзін з галоўных атрыбутаў велікоднага святочнага стала — чырвонае яйка, якім распачыналі застолле. Яно мела, бясспрэчна, старадаўняе абрадавае прызначэнне. Сімволіка яго старажытная: яйка лічылася ўвасабленнем жыццядайнага пачатку. Фарбаванне велікодных яек у чырвоны колер мела на мэце ўзмацніць гэты пачатак, вылучыць яго. Хрысціянства, пераасэнсоўваючы язычніцкую сімволіку ў адпаведнасці са сваімі ўяўленнямі і догматамі, тлумачыла ўжыванне чырвоных яек як далучэнне да радасці ў сувязі з уваскрэсеннем Хрыста. Закопванне рэштак велікоднага стала, касцей на загонах з надзеяй, што гэта выратуе ад граду пасевы, лішні раз сведчыла аб наданні велікодным стравам здольнасці магічна ўплываць на прыроду [76]. Трэба думаць, стыхійна-матэрыялістычны, паводле паходжання, звычай, які практыкаваўся не толькі перад Вялікаднем, а і ў іншыя святы,— асабліва пільная ўборка хаты і падворышча, мыццё ў лазні *.

На першы дзень Вялікадня хадзілі сачыць «гульню» сонца. Дзеля гэтага ўзбіраліся на ўзгоркі, званіцы, каб першымі сустрэць яго ўзыход. З'яўленне сонца на чыстым небе і яго «гульню» (пераліўны бляск) лічылі за добры знак на будучыню: цёплае, урадлівае лета, шчаслівыя вяселлі [77].

Адным з пашыраных народных звычаяў Вялікадня было ладжанне моладдзю арэляў. Паколькі звычайна на Вялікдзень яшчэ халаднавата, арэлі падвешвалі ў гумне. Калыханне на арэлях, якое практыкавалася не толькі на Вялікдзень, але і ў іншыя гадавыя святы, а менавіта на Саракі, Масленку, на Пятра, мела ў язычніцкія часы аграрна-магічнае і магічна-

---

[75] Шейн П. В. Белорусские песни. С. 80.

[76] Романов Е. Р. Белорусский сборник. Вып. 8. С. 156.

* Апошняе, праўда, трактуецца ў навуцы як прафілактычная магія (гл.: Кагаров Е. Классификация и происхождение земледельческих обрядов// Известия ОАИЭ. Казань, 1929. Т. 34. С 180—196).

[77] Валынец А. Пасха в Белоруссии//Вилен. вестник. 1893. № 66.

ачышчальнае прызначэнне. Па сведчанні Е. Раманава, на арэлях, што ладзіліся на Саракі, трэба было, паводле народнага звычаю, хоць крыху пакалыхацца — дзеля здароўя [78]. Қалыханню надавалася ўласцівасць, як ужо адзначалася, уплываць на рост ільну: высокі ўзлёт арэляў звязвалі з большым ростам ільняной трасціны, яе трываласцю.

На Вялікдзень была пашырана гульня ў біткі і качанне яек з горкі. Гульня ў біткі (выігрываў той, чыё яйка разбівала іншыя) — забава дзетвары і падлеткаў. Дзіцячай пацехай было таксама і качанне яек з горкі: чыё далей кацілася, той забіраў яйкі астатніх удзельнікаў гульні [79]. З другога дня Вялікадня пачыналі вадзіць карагоды («танкі») [80]. Велікодны звычай — хаджэнне ў госці. На Вялікдзень лічылася абавязковым адведаць радню, блізкіх, суседзяў.

Вялікдзень не меў сталай даты прымеркавання, хоць цэлы шэраг гадавых свят, такіх, як Вербніца, Радаўніца, Ушэсце, Сёмуха, залежалі ад яго: адзначаліся цераз строга пэўны лік тыдняў.

У некаторых мясцовасцях у апошні дзень Вялікадня адведвалі на могілках сваіх памерлых родзічаў. На Віцебшчыне, напрыклад, чацвер велікоднага тыдня звалі Наўскім скрэсеннем *. У гэты дзень варылі яйкі па колькасці памерлых у сям'і дзяцей і, пакачаўшы іх па траве, на могілках з'ядалі [81]. Увогуле ж памінанне продкаў з мэтай задобрыць іх, з надзеяй на тое, што яны будуць спрыяць у жыцці і ў першую чаргу будучаму ўраджаю, на Беларусі, як і ва ўсіх усходніх славян, рабілася ў аўторак Фаміна тыдня (Романов, 8, 179), на Радаўніцу. Радаўніца захавала ў сабе рысы язычніцкай трызны. Сабраўшыся на могілках сем'ямі, ушаноўвалі памяць памерлых тым, што елі тут жа прынесенае з сабою і «частавалі» душы адышоўшых навекі родных: качалі па магіле чырвоныя яйкі, вылівалі або пакідалі чарку гарэлкі. Рэшткі прынесенай ежы аддавалі жабракам. Уся Радаўніца (Радунічныя дзяды) павінна вылучацца, па сведчанні Ю. Крачкоўскага, тужлівым настроем [82].

Веснавая сяўба як вельмі адказная работа ў працоўным

---

[78] Романов Е. Р. Белорусский сборник. Вып. 8. С. 142.

[79] Қарский С. И. Пасха у белорусов Виленской губернии//Вилен. вестник. 1891. № 110, 112.

[80] Валынец А. Пасха в Белоруссии//Вилен. вестник. 1893. № 66. Наўскі ад гоцкага «naus», «naus» — нябожчык, па-літоўску — духі наогул (Қарский. Т. 3. Вып. 1. С. 160). «Навье» (старажытнаславянск.) — духі, цені памерлых.

[81] Никифоровский Н. Я. Простонародные приметы и поверья... С. 244.

[82] Крачковский Ю. Ф. Быт западнорусского селянина. С. 114.

годзе земляроба была звязана з многімі звычаямі і абрадамі, суправаджалася імі. Е. Р. Раманаў адзначаў, што араць вясной пачыналі да Юр'я, крыху раней ці пазней у залежнасці ад прыходу цёплых дзён і прасыхання замлі [83]. Для заворвання выбіралі аўторак або суботу. Перад выездам у поле валоў (каня) і саху асвячалі. Гаспадар чыста мыўся, апранаў чыстую бялізну, браў з сабой хлеб, соль, сыр, яйка і вярбу. Праходзіў толькі некалькі баразён — тры-чатыры, закусваў хлебам і сырам, даваў крыху хлеба валам, «каб яны былі спасныя», а яйка закопваў там жа ў баразне — «рабіў пачостку матцы-зямлі, каб яна была ласкава да добрэ зарадзіла збожжа, усюды было поўно, як тое яйцэ»[84]. У некаторых мясцовасцях заворванне рабілі пад вечар, каб ужо да канца дня нічым болей не займацца [85]. Сеяць пачыналі як мага раней згодна народнай мудрасці: «Хто сее ў лёд, той п'е мёд» або «Сей авёс у гразь — будзеш як князь». Засеўкі адбываліся ўрачыста. Гаспадыня клапацілася пра чысціню ў хаце: спадзяваліся, што тым самым забяспечаць чысціню будучай нівы ад пустазелля. З гэтай жа мэтай сейбіт мыўся і апранаў свежую бялізну. Пачынаць сяўбу стараліся ў поўню, думаючы гэтым забяспечыць важкасць калосся. Зноў прыклад магічных захадаў, паводле якіх падобнае можна выклікаць падобным. Засеўкі заканчваліся святочнай вячэрай, вясёлай і сытнай, зноў жа з думкай пра тое, што гэта будзе садзейнічаць поспеху сяўбы, урадлівасці будучай нівы [86]. У заворванні і засеўках спалучаюцца стыхійна-матэрыялістычныя і ірацыянальныя ўяўленні старажытнага земляроба. Звычаі і абрады першых дзён выхаду на працу ў поле адлюстравалі пачуццё незвычайнасці моманту, вялікай адказнасці перад ім. Каляндарныя прыкметы пачатку сяўбы перадавалі рацыянальныя веды, здабытыя ў шматгадовай земляробчай практыцы.

На веснавую пару прыпадаў вельмі старажытны паходжаннем і высакародны паводле характару калектыўны працоўны звычай «талака». Талокі — працоўная ўзаемавыручка, калектыўная дапамога пры выкананні цяжэйшых, працаёмкіх работ у гаспадарцы — адбываліся ў розную пару года. Аднак самыя асноўныя вядомы тры: веснавая талака, якая склікалася на вывазку гною, летняя — жніўная, у час дажынак жыта, і асенняя, калі мялі лён, а таксама тралявалі лес, ставілі зруб хаты. Часам збіраліся талокі і для таго, каб скасіць

[83] Романов Е. Р. Белорусский сборник. Вып. 8. С. 179.
[84] Сержпутоўскі А. К. Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў. С. 96.
[85] Крачковский Ю. Ф. Быт западнорусского селянина. С. 92.
[86] Там жа. С. 93.

аўдавелай жанчыне сенажаць, прывезці сена, а таксама на лоўлю язёў [87], зрэдку на малацьбу, калі сталі малаціць малатарняй.

Спынімся на больш тыповым і пашыраным відзе талакі — веснавой, або гнаёвай. У ёй мо найпаўней адбіліся каляндарная працоўная звычаёвасць і абраднасць, асаблівасці працоўнага быту даўнейшага селяніна. Уласна абрадавага ў талацэ амаль няма. Хіба што прадвызначанасць страў у час талочнага застолля (вучоныя называюць пэўны іх набор: аўсяны кісель, клёцкі, каша) можа наводзіць на думку пра іх абрадавы сэнс. Практычна талака — звычай, прыгожы працоўны звычай народа. У беларусаў, здаецца, навука заспела яго ў даволі цэласным, добра захаваным стане. Найчасцей апісанні талакі маем з Падзвіння, зямлі колішніх крывічоў.

На талаку збіраюцца з раніцы. У адрозненне ад жніўнай ці льняной, на якую прыходзілі адны жанчыны, на гнаявую прыязджалі з вазамі сем'ямі. Каб выканаць такую працаёмкую работу, як вывазка гною, патрэбна было шмат рабочых рук. Мужчыны, званыя на талацэ капачамі, накідвалі гной на вазы, вычышчалі ад яго хлявы. Хлопчыкі-падлеткі вазілі гной на поле, дзе яго растрасалі дзяўчаты і жанчыны-трасенніцы. Этнографы падкрэсліваюць, што веснавыя талокі звычайна былі ажыўленыя і мнагалюдныя [88]. Мужчыны суправаджалі сваю работу размовамі, успамінамі, а жанчыны — песнямі. У дзень гнаёвай талакі гаспадар тройчы наладжваў застолле, пераважна на адкрытым паветры: у 11 гадзін, пасля чаго, накідаўшы вазы і выпрагшы коней, талачане адпачывалі да двух гадзін; потым наступалі падвячорак і вячэра. Асабліва вясёлым было вячэрняе застолле па сканчэнні цяжкой і такой неабходнай у гаспадарцы працы, з якой за дзень адной сям'ёю не справіцца. У гэты час спявалася шмат песень, што складаюць адну з адметнасцей беларускай каляндарнай паэзіі.

Заўсёды ў адзін час, як Каляды і Купалле, святкавалася і другое па велічыні веснавое свята Юр'я. Царква прымеркавала да яго ўрачыстасць у гонар аднаго са сваіх апосталаў — Георгія. У абраднасці, што суправаджае Юр'я, амаль нічога няма ад прыўнесенага хрысціянствам. У ёй выразна праглядае язычніцкая, земляробча-жывёлагадоўчая па змесце міфатворчасць. Адзначалася Юр'я 23 красавіка па ст.ст. і дзякуючы

---

[87] Сержпутовский А. К. Очерки Белоруссии. Толока//Живая старина. СПб., 1907. Вып. 4. С. 210—214.

[88] Шейн П. В. Белорусские песни//Зап. имп. Рус. географ. о-ва по отд-нию этнографии. Т. 5. С. 411.

таму, што да гэтага дня быў прымеркаваны першы выган жывёлы на пашу, набыло вялікую ўрачыстасць і атрымала шырокае распаўсюджанне. Прынамсі, на Беларусі Юр'я лічылася адным з самых вялікіх, самых папулярных у народзе гадавых свят.

На Юр'я выконваліся два асноўныя комплексы ахоўна-магічных па сваіх мэтах абрадаў. Адзін быў звязаны з першым выганам на «Юр'еву расу» жывёлы. Абрады, што суправаджалі яго, былі скіраваны на захаванне статка ад дзікіх звяроў, хвароб, уздзеяння звышнатуральных сіл. Другі насіў чыста аграрны характар і здзяйсняўся дзеля добрага росту збажыны і аховы засеяных палёў ад граду.

Выган жывёлы на пашу адбываўся даволі ўрачыста, з багатым абрадавым цырыманіялам. Перад тым як выганяць з хлява, у варотах клалі яйка, спадзеючыся, што каровы, пераступіўшы яго, будуць круглыя і поўныя, як і само яйка (сімільная магія) [89]. Падкладвалі таксама пад браму, з якой выпускалася жывёла на вуліцу, замок, каб зберагчы статак ад ваўкоў і мядзведзяў: замкнуць ім зубы [90]. Часам яйка і хлеб клалі загорнутымі ў вывернуты кажух, і той кажух апранаў і насіў увесь дзень да вечара пастух [91]: спадзяваліся, што гэта будзе спрыяць пладавітасці статка.

Перад выганам жывёлы гаспадар з гаспадыняй выконвалі некалькі абрадаў, у якіх выразна праглядвала магічная аснова. Усю жывёлу выганялі на падвор'е перад хлявом, так званы дзеннік, і гаспадар, узяўшы ў рукі накрытую талерку, на якой была замацавана грамнічная свечка і ляжала пара яек, абыходзіў яе наўкола. Услед за гаспадаром ішла гаспадыня з гаршком, напоўненым вуголлем і свентаянскай травой, і абкурвала «сваю жывоцінку». За гаспадыняй яшчэ часам ішоў пастух з вербачкай, захаванай з Вербніцы, і стараўся лёгка ўдарыць ёю кожную жывёліну. Пасля абходу гаспадыня брала з талеркі свечку і націрала воскам падгрудкі і крыжы коням, каровам і іншай жывёле. Нарэшце гаспадар загадваў пастуху ўтыркнуць вярбу ў падстрэшак хлява, для таго каб жывёла заўсёды ў час вярталася дахаты, і аддаваў яйкі пастуху, які гнаў кароў і авечак у поле [92]. Сутнасць гэтых абрадаў заключалася ў тым, каб запабегнуць усяму благому, што можа чакаць хатнюю жывёлу на пашы: зберагчы ад звера, ад благога вока, ведзьмаў-чараўніц. Поруч з рысамі

[89] Романов Е. Р. Белорусский сборник. Вып. 8. С. 180.
[90] Там жа.
[91] Шейн П. В. Материалы... Т. 1. Ч. 1. С. 166.
[92] Там жа.

ахоўнай магіі (абход з грамнічнай свечкай, абкурванне, змазванне частак цела жывёлы воскам ад свечкі) у абрадзе праступаюць і элементы прадуцыравальнай: прагон статка цераз вывернуты кажух, яйка.

На Магілёўшчыне Е. Р. Раманаў засведчыў яшчэ такі абрад у дзень выгану на «Юр'еву расу». Бралі акраец хлеба і з ім тройчы абходзілі наўкол коміна, прыгаворваючы: «Як печ стаіць на месцы, так штоб і скаціна хадзіла на месца!»[93] Маем даволі характэрны ўзор сімільнай магіі, здзейсненай у форме замовы-закляцця.

Яшчэ адзін абрадавы звычай. Па сведчанні Е. Р. Раманава, на Віцебшчыне, праганяючы жывёлу да пастуха, стараліся кіраваць яе цераз руннае поле. Пры гэтым збіралі расу і абмывалі ёю кароў, спадзеючыся, што тыя будуць даваць болей малака і зробяцца недаступнымі для ведзьмаў [94]. Такім чынам, у расе бачылі сродак ачышчэння, здароўя, пладароднай сілы.

Юр'я, акрамя таго, што было ўрачыстасцю ўсіх, лічылася яшчэ і святам пастухоў. Кожны гаспадар даваў у гэты дзень пастухам хлеб, сала, мяса, яйкі, і яны, выгнаўшы статак на пашу, ладзілі сабе балёк, на якім абавязковай ежай была яечня [95]. Не выключана, што гэта баляванне пастухоў мела раней рытуальна-абрадавае значэнне.

Даволі ўрачыста адбываўся юраўскі абрад абходу жытняга поля, руні. Узяўшы з сабою ў кашэль загорнуты ў абрус каравай, гаспадар раным-рана адпраўляўся на абход усіх сваіх палёў. Абышоўшы палі, ён прыкладаў каравай да маладога жыта, і, калі рунь была вышэй каравая, лічылі, што яно ўродзіць. Дома гаспадар дзяліў каравай усім сямейнікам у час снядання [96]. У некаторых мясцовасцях ніву абходзілі дзяўчаты з песнямі [97]. Відаць, ад колішніх абрадаў на ніве застаўся звычай моладзі збірацца на юраўскае гулянне менавіта каля руннага поля. Часам з караваем на ніву адпраўлялася ўся сям'я. Выбіраліся рана нашча і бралі з сабою кілбасы, яйкі, гарэлку, а таксама косці ад ялавічыны, якую свянцілі на Вялікдзень. Прыйшоўшы ў поле, гаспадары качаліся па жыце, каб акрапіцца «Юр'евай расой», затым качалі па руні свой каравай. Абходзячы поле з караваем, віталі ніву. Прынесеныя

---

[93] Романов Е. Р. Белорусский сборник. Вып. 8. С. 180.
[94] Шейн П. В. Материалы... Т. 1. Ч. 1. С. 168, 169.
[95] Романов Е. Р. Белорусский сборник. Вып. 8. С. 181; Крачковский Ю. Ф. Быт западнорусского селянина. С. 117.
[96] Берман И. Календарь по народным преданиям...//Зап. имп. Рус. географ. о-ва по отд-нию этнографии. Т. 5. С. 21.
[97] День св. Георгия в м. Камаи Свентянского уезда//Вилен. вестник. 1893. № 87.

косці ў натуральным выглядзе ўтыкалі на мяжы або спаленымі (попелам) пасыпалі ўзмежак — спадзяваліся вывесці пустазелле. Зноў жа бачым праявы ахоўнай магіі, прадуцыравальнага пачатку, прымхлівага па форме, аднак стыхійнаматэрыялістычнага па змесце: попел спрыяў росту раслін, і тыя расні, апераджаючы, глушачы пустазелле. З Юр'я пачыналі вадзіць на начлег коней, лічылася, што з гэтага часу ім бяспечна, бо Юрый «замкнуў» ваўкам зубы [98].

З Юр'ем было звязана нямала каляндарнай варажбы паводле прыкмет. Калі на Юр'я ішоў густы, вялікі дождж, то спадзяваліся, што жыта будзе расці густым і стаяць сцяною. Калі на Юр'я раса, то коням будзе даволі аўса. У народзе лічылася, што «Юрай вясну пачынаіць», «Юрый работы пачынаіць». Каляндарныя прыказкі, бачым, падкрэслівалі, што рэальны пачатак вясны для земляроба звязаны з пачаткам палявых работ. Некаторыя варожбы мелі ў сваёй аснове не магічныя ўяўленні, а практычныя шматгадовыя рацыянальныя назіранні за прыродай. Прыкладам такога рацыянальнага назірання можа быць юраўская каляндарная прыкмета: «За колькі дзён да Юр'я зацвітуць сады, пераважна вішні, за столькі дзён да Пятра пойдуць жаць жыта»[99].

Дзевятага мая святкавалі Міколу. Мікола — свята конюхаў. У гэты дзень выконваліся абрады (абкурванне коней, гладжанне іх па крыжы яйкам), мэтай якіх было захаваць асноўную цяглавую сілу ў гаспадарцы ад ведзьмакоў, спрыяць здароўю, трываласці коней. Сяўба да Міколы лічылася ранняй сяўбой. Міколу ўспрымалі як спрыяльніка веснавога поля. Верылі, што пасля людскіх «правідкаў» (адведкаў) палёў іх аглядае «Мікола цёплы» і вызначае, дзе быць ураджаю, а дзе не [100]. У гэты дзень на Гомельшчыне быў звычай наладжваць так званыя аброчныя абеды. Найчасцей яны рабіліся з выпадку якога-небудзь няшчасця ці ўратавання ад бяды. Гатавалі багаты абед, клікалі на яго радню, а затым гэтак жа багата і сытна карміді жабракоў, запрасіўшы ў застолле [101].

Апошнім познавеснавым гадавым святам была Сёмуха, або Тройца. Народная назва «Сёмуха» паходзіла ад таго, што гэта свята адбывалася праз сем тыдняў пасля Вялікадня. Хоць яно святкавалася тры дні, увесь Сёмушны тыдзень звалі Клечальным і нічога не рабілі. Сёмуху называлі яшчэ Зялёным

---

[98] Шейн П. В. Материалы... Т. 1. Ч. 1. С. 171; Крачковский Ю. Ф. Быт западнорусского селянина. С. 119.

[99] Никифоровский Н. Я. Простонародные приметы и поверья... С. 246.

[100] Там жа. С. 247.

[101] Романов Е. Р. Белорусский сборник. Вып. 8. С. 189.

святам па той прычыне, што ў сёмушныя дні асабліва вялікая ўвага надавалася зеляніне [102]. Тут практычна праглядваюць сляды старажытнага (язычніцкага) культу раслiннасці. На Сёмуху хату і падвор'е ўбіралі «маем»: у брамцы ставілі прынесеныя з лесу маладыя бярозкі, галінкамі бярозы і клёну (ліпы) аздаблялі сцены і вокны ў хатах. «Май» ставілі перад ганкам. Дарожкі на падворышчы, якія папярэдне чыста вымяталі, пасыпалі жоўтым пяском, падлогу ў хаце — «яварам» (аерам). Дзяўчаты адпраўляліся ў лес «завіваць бярозкі», бралі з сабою розную ежу і пітво. Пяклі яечню, частаваліся і спявалі траецкія песні. У песнях упаміналіся дуб, ясень, бяроза. Адна з траецкіх песень даволі дакладна перадае абставіны і характар абраду «завівання вянкоў», «завівання бярозак»:

Не радуйся, клён да ясеня,
Не к табе ідуць дзеўкі красныя,
Не табе нясуць яешні смашныя,
Гарэлку горкую, скрыпку звонкую.
Ой, люлі, люлі, люлі!

Ай, люлі, люлі, люлі!
Ты радуйся, белая бяроза,
К табе ідуць дзеўкі красныя,
Табе нясуць яешні смашныя,
Гарэлку горкую, скрыпку звонкую. [103]

Завіваючы вянкі з красак або бярозавага галля, дзяўчаты пускалі іх на ваду і загадвалі на будучае замужжа: калі два вянкі на вадзе сыходзіліся — дзяўчына спадзявалася хутка выйсці замуж; чый вянок хутчэй прыставаў да берага — тая, згодна павер'ю, магла найхутчэй выйсці замуж [104]. Скончыўшы спяваць песні, дзяўчаты махалі хвартухамі і раскачвалі бярозу так, каб потым звязаць яе вершаліну з другой, і папарна праходзілі пад імі. Гэты абрад называўся абрадам «кумлення» [105].

Сёмуха лічылася яшчэ святам у гонар ушанавання продкаў. Сёмушныя дзяды адлюстравалі сабой пашыраны ў старажытнасці культ продкаў. Верылі, што ў гэты дзень душы памерлых наведваюць родныя мясціны і нават нябачныя прысутнічаюць у святочным застоллі. На ўрачысты святочны стол, засланы белым абрусам, вечарам падавалася шмат страў: вараная капуста, свіное мяса, квашаніна, грэчневая або

[102] Романов Е. Р. Белорусский сборник. Вып. 8. С. 203.
[103] Шейн П. В. Материалы... Т. 1. Ч. 1. С. 186—187.
[104] Там жа. С. 185.
[105] Там жа. С. 190.

пшонная каша з маслам (малаком), яечня, бліны. Папярэдне адчынялі дзверы і, паставіўшы ў іх барану, заклікалі душы: «А кыш, душачкі, на абед: малыя цераз барану, а старыя праз дзверы»[106]. Гаспадар утыркаў у хлеб грамнічную свечку і пасля малення заклікаў: «Дзяды, прадзеды і ўсе душачкі, якія тут прабывалі, хлеба, солі зажывалі, просіма да абеду!» У час вячэры адкладвалася па тры лыжкі кожнай стравы ў асобную талерку — для памерлых[107]. Стараннасць і ўрачыстасць, з якімі рыхтаваліся і праводзіліся Дзяды, бясспрэчна, былі імкненнем пазбегнуць гневу продкаў і заручыцца іх падтрымкай. Аднак нельга не бачыць у гэтым і маральна-этычных матываў: пашаны да бацькоў, дзядоў, прадзедаў — сваіх папярэднікаў. У некаторых мясцовасцях, на поўначы Беларусі, на Барысаўшчыне, Сёмушныя дзяды называлі Стаўроўскімі[108].

Мясцовы характар насіў абрад «куста», вядомы на Піншчыне і часткова ў іншых раёнах Заходняга Палесся, які адбываўся на Сёмуху. Меў ён аграрнае і сямейна-любоўнае прызначэнне і выконваўся гуртам дзяўчат і жанчын. Адну з прыгажэйшых дзяўчат убіралі кляновымі (ліпавымі) галінкамі і з так званым «кустом» абходзілі двары з песнямі. Песні насілі велічальна-абрадавы характар і былі заклікаы традыцыяй, заключанымі ў іх словамі спрыяць ураджаю, хуткаму і памыснаму выхаду замуж дачок гаспадара (гаспадыні), якім адрасаваліся «куставыя» песні[109].

Веснавыя звычаі і абрады заканчваліся Русальным, або Граным, тыднем, як называўся наступны пасля Сёмухі тыдзень. Ужо на Тройцу-Сёмуху бытавалі засцярогі ад русалак. Маладых дзяцей да шасці год не пускалі гуляць на ўзлессе або да жыта, палохаючы тым, што ў лесе ў гэты дзень бегае «тучніца» — ваўчыная зграя, а ў жыце блукаюць «раскудлачаныя русалкі»[110]. Паводле народных павер'яў, русалкі — фантастычныя істоты з дзявочай галавой і грудзямі, з рыбіным хвастом і целам, пакрытым луской. У іх нібыта ўвасобіліся душы рана памерлых дзяцей жаночага полу, а таксама дзяўчат-тапельніц. Паводле павер'я, запісанага на Бабруйшчыне, русалкі з восені забіраюцца ў рэкі і вадаёмы і там зімуюць. Каля Сёмухі яны выбіраюцца на сушу, блукаюць па жытах і лясах, калышуцца на арэлях. Заўважыўшы чалавека, вабяць, клічуць да сябе

[106] Крачковский Ю. Ф. Быт западнорусского селянина. С. 123.
[107] М. Г. Сёмуха//Гродн. губерн. ведомости. 1893. № 40.
[108] Tyszkiewicz E. Opisanie powiatu Borysowskiego. S. 370.
[109] Шейн П. В. Материалы... Т. 3. С. 171—172; Захарава В. А. Беларускі фальклор у сучасных запісах: Брэсцкая вобласць. Мн., 1973. С. 58—59.
[110] Крачковский Ю. Ф. Быт западнорусского селянина. С. 120.

і стараюцца заласкатаць да смерці. П. В. Шэйн адзначаў, што ўвесь Русальны тыдзень, кожны дзень яго, дзяўчаты збіраліся вечарамі дзеля аховы «ад ліхіх падкопаў русалак», спявалі «асобага роду песні, якія таму і называюцца русальнымі»[111].

Ахоўна-магічныя ўяўленні ляжалі ў аснове абраду «праводзін русалкі». Ён даволі поўна апісаны ў нашых этнографаў і фалькларыстаў мінулага. Абрад «праводзін русалкі» праўляўся ў панядзелак Русальнага тыдня. Дзяўчаты надвячоркам ішлі збіраць кветкі і віць вянкі. Найчасцей для сябе звівалі вянкі з васількоў, а для прыгажэйшай, жвавейшай дзяўчыны, абранай на русалку,— з розных красак, акрамя любісціку. Абранніцу распраналі да сарочкі і абвівалі гірляндамі кветак, сабе ўскладалі вянкі на галовы і з распушчанымі валасамі ў белых палатняных сукенках адпраўляліся за сяло, найчасцей пад жыта. Па дарозе спявалі русальныя песні, вадзілі «танкі». Першая пара падымала рукі ўгору, і пад імі адна за другой праходзілі астатнія пары. Нацешыўшыся «танкамі», часам гульнямі разам з хлопцамі, якія выбіраліся ўслед за дзяўчатамі, удзельніцы абраду штурхалі «русалку» ў жыта, сарваўшы з яе вянок. Самі, паддаючы адна другой страху, уцякалі з крыкам: «Уцякайма, уцякайма ад русалкі!»[112] Часам, перад тым як развітацца з «русалкаю», пры жыце дзяўчаты палілі агонь і скакалі праз яго і спальвалі на ім сарваны з «русалкі» вянок. Здаралася, кідалі ў жыта свае вянкі ўслед «русалцы», а назаўтра, адшукаўшы кожная свой, неслі іх на гарод, там разрывалі і асыпалі грады. Існавала павер'е, што ад гэтага на капусце не будзе чарвей [113]. Такім чынам, у гэтым абрадавым дзеянні бачылі спосаб магічнага ўздзеяння на ўрадлівасць гародніны, засцярогу яе ад шкодных насякомых. У цэлым абрад «праводзін русалкі» меў аграрна-ахоўны характар, у ім праглядваюць рысы апатрапеічнай магіі.

З праводзінамі русалак заканчваліся абрады, звязаныя з веснавой парой года, і спяванне вясняных песень. Такім чынам, веснавая абраднасць земляробчых свят была скіравана на тое, каб забяспечыць поспех работ у полі і ўрадлівасць нівы, захаваць усходы ад розных стыхійных бедстваў, ад паморку і дзікіх звяроў статак, а ў выніку ўсяго — дабрабыт сям'і, прадаўжэнне роду. Веснавыя каляндарныя абрады мелі розную форму: насілі характар калектыўных заклёнаў, як «гукан-

---

[111] Шейн П. В. Материалы... Т. 1. Ч. 1. С. 198.

[112] Там жа. С. 199; Романов Е. Р. Белорусский сборник. Вып. 8. С. 204—207.

[113] Романов Е. Р. Белорусский сборник. Вып. 8. С. 207.

не вясны», абрадавага абходу двароў з мэтай паўплываць на добры зыход земляробчага года, калектыўных і індывідуальных магічных захадаў дзеля захавання пасеваў, пладавітасці свойскай жывёлы і яе збераження. Паводле функцыянальнага прызначэння ў веснавой абраднасці пераважалі абрады прадуцыравальныя і ахоўныя. Пры гэтым выразна дамініравалі абрады аграрнага характару, паколькі земляробства было асноўным заняткам большасці насельніцтва. Акрамя аграрна-жывёлагадоўчай абраднасці пэўнае месца ў яе сістэме займалі звычаі і абрады, накіраваныя на ўмацаванне здароўя чалавека, засцярогу яго жыцця ад уздзеяння злых сіл. Гэта абрадавыя засцерагальныя дзеянні супраць русалак, качанне па «Юр'евай расе», раскладанне агнёў, якім надавалася здольнасць ачышчаць і ачышчацца ад злых духаў, наслання звышнатуральных сіл — хвароб.

Абраднасць без мала ўсіх веснавых свят уключала вербальную магію: стараліся ўгадаць, якім будзе лета, на які ўраджай можна спадзявацца, а таксама які будзе лёс асобнага чалавека, што чакае яго.

*А. С. Ліс*

## ЛЕТА

З надыходам лета пачынаўся асабліва адказны перыяд у жыцці колішняга земляроба. Трэба было захаваць, зберагчы ўраджай у адказны час яго даспявання і ў пару сабраць жаданы плён. Гэта быў выключна напружаны час працы ў гаспадарцы, пярэдадзень жніва. Невыпадкова цяпер здзяйснялася шмат розных абрадаў, у аснове якіх ляжыць старажытнае, пераважна міфічнае светаўспрыманне.

Купалле, якое адзначалася ў ноч з 23 на 24 чэрвеня па ст. ст., мабыць, самае насычанае абрадамі старажытнае свята. Па разнастайнасці саміх абрадаў, іх вобразнай яскравасці яно пераўзыходзіла нават Каляды з іх багатай і разнастайнай старажытнай абраднасцю і звычаёвасцю.

У купальскіх звычаях і абрадах больш, чым у якіх-небудзь іншых, угадваюцца салярныя матывы. І гэта невыпадкова, паколькі Купалле ў глыбокай старажытнасці складвалася як урачыстасць у гонар летняга сонцастаяння, як свята найвышэйшага росквіту зямных сіл. Ірацыянальнае і стыхійна-матэрыялістычнае, практычна-гаспадарчае і ідэалістычна-паэтычнае перапляліся ў абрадах і звычаях Купалля. І за ўсім —

глыбокае адчуванне прыроды, яе жыватворных і стыхійна-разбуральных сіл, клопат пра чалавека.

Калі Каляды з іх абходамі калядоўшчыкаў, абрадамі куцці, Новы год са шчадраваннем і ваджэннем «казы», гульнямі і ігрышчамі ў абрадава-функцыянальным сэнсе былі звязаны з зімнім сонцастаяннем, паваротам жыватворнага свяціла на вясну і, паводле замыслу творцаў усёй каляднай абраднасці, павінны былі садзейнічаць гэтаму павароту, то Купалле азначала зеніт узыходжання сонца і пачатак паступовага яго паніжэння, а з ім і павольнага адыходу цяпла, яснага надвор'я і як вынік — заміранне прыроды да новай вясны. Купальская абраднасць шматсастаўная, неаднародная па часе ўзнікнення ў ёй тых або іншых з'яў, элементаў.

У купальскіх абрадах вялікае месца займала сімволіка дзвюх стыхій — агню і вады. Купальскае вогнішча было ў цэнтры ўсяго святочнага цырыманіялу. Яшчэ ў XIX ст. яго запальвалі старадаўнім спосабам — тручы адзін аб другі брусы дрэва. У песнях спявалася: «Не дзеўка агонь клала, сам бог агонь раскладаў»[114]. Раскласці купальскае вогнішча ў песнях заклікаліся касмічныя сферы: «Ой, месяцу, месяцу, узыдзі раненька і раскладзі купаллейка»[115]. У купальскім агні бачылі прадуцыравальны і ачышчальна-ахоўны пачатак. Над купальскім вогнішчам уздымалі запаленае прасмаленае кола. Запаленыя колы качалі з гары, пускалі па схілах узгорка. Кругам вадзілі карагод вакол раскладзенага купальскага агню, група супроць групы выконвалі песні. Ва ўсёй гэтай сімволіцы вучоныя схільны бачыць абрадавае адлюстраванне салярных матываў. Што да агнёў Купалля, то яшчэ А. Патабня адзначаў: «...Купальскія і іншыя ім падобныя агні маюць сілу даваць ураджай і праганяць смерць не самі па сабе, а таму, што ўвасабляюць сонца»[116]. Агонь продкі старажытных славян ды іншых індаеўрапейцаў лічылі адной з асноўных прыродных стыхій. «Напачатку быў агонь»,— сведчыць народная касмагонія [117]. Натуральна, што агонь, яго энергія лёгка асацыіраваліся і нават атаясамліваліся з сонцам, якому пакланяліся, лічачы яго хлебадарам, наогул ахоўнікам жыцця на Зямлі. Аб тым, што продкі славян лічылі сонца боствам, могуць пасведчыць і словы Кірылы Тураўскага, сказаныя ім з пафасам хрысціянскага трыумфатара: «Ужо бо не нарекуться богом

---

[114] Дмитриев М. А. Собрание песен, сказок, обрядов и обычаев... С. 230.

[115] Купальскія і пятроўскія песні. Мн., 1985. С. 79—81.

[116] Потребня А. А. О некоторых символах в славянской народной поэзии. Харьков, 1914. С. 163.

[117] Moszyński K. Poliesie Wschodnie. Warszawa, 1928. S. 159.

стихиа ни солце, ни огонь»[118]. Ахоўна-прадуцыравальны характар насіла спальванне на купальскім агні featured старызны: абноскаў адзення, абутку, прадметаў хатняга ўжытку[119]. Выразны ахоўна-ачышчальны абрадавы сэнс мелі купальскія звычаі скакаць праз палаючае вогнішча, кідаць галавешкі ў жыта (адпалохванне ведзьмаў), спальваць сарочкі хворых дзяцей. Аб тым, што з купальскім агнём у старажытнасці звязвалі надзеі на ўрадлівасць, плоднасць, могуць пасведчыць запісы этнографаў. Е. Раманаў, напрыклад, пісаў, што на Быхаўшчыне дзяўчаты кідалі ў купальскі агонь, які ўжо датляваў, кудзелю, спадзеючыся на ўраджай лёну[120]. А. Сержпутоўскі, назіраючы купальскія абрады на Палессі, сведчыў, што, падкладаючы ламачча ў агонь, палешукі прыгаворвалі: «Зарадзі жыто» або «Зарадзі лён», «Каб гадавалася гаўядо». Бяздзетныя жанкі пры гэтым ціхенька шапталі: «Пладзіцеса дзеці»[121]. Ахоўна-ачышчальныя мэты мела купанне на Купалле ў рацэ, а таксама качанне па расе. Калектыўны засцерагальна-ахоўны абрад «абворванне» апісаў Е. Раманаў з практыкі правядзення Купалля на Рагачоўшчыне. Пасля песень і гульняў ля купальскага вогнішча адна з дзяўчат адпраўлялася ў вёску і прыносіла адтуль саху. Грамадой браліся за яе і абворвалі навокал сяла, стараючыся, каб правая рука аратых заўсёды была з боку сяла. Праводзілі не суцэльную баразну, а «дзе скрабянуць, дзе не». Пасля гэтага вярталіся да агню, з якога пачыналі абворванне[122]. Гэта наглядны прыклад апатрапеічных абрадаў.

Звычай сачыць з 23 на 24 чэрвеня за ўзыходам сонца (павер'е гаварыла аб тым, што яно ўзыходзіць на Яна «іграючы») быў звязаны з аграрнай варажбой. Ясны ўзыход свяціла з пераліўным бляскам і лічылі за добры знак на ўрадлівае жніво. Гэта знайшло адлюстраванне ў песні:

А на Купалу
Рана сонца йграла,
Рана сонца йграла
На добрыя годы,
На добрыя годы,
На цёплыя росы,
На хлебы-ўраджаі.[123]

---

[118] Цыт. па кн.: Срезневский И. О языческом богослужении древних славян. СПб., 1848. С. 25.
[119] Шейн П. В. Материалы... Т. 1. Ч. 1. С. 221.
[120] Романов Е. Р. Белорусский сборник. Вып. 8. С. 211.
[121] Сержпутоўскі А. Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў. С. 103.
[122] Романов Е. Р. Белорусский сборник. Вып. 8. С. 209.
[123] Шлюбскі А. Матэрыялы да вывучэння фальклору і мовы Віцебшчыны. Ч. 1. С. 110.

Немалое месца ў купальскай звычаёвасці і абраднасці займала любоўная і ўвогуле лёсапазнавальная варажба. Аб сваёй будучай долі і лёсе родных дзяўчаты загадвалі на краскі, утыкаючы іх у шчыліны сцен будынкаў [124]. Імкнуліся даведацца аб скорым ці няскорым замужжы, напрамку, куды выйдуць замуж, па вянках, якія пускалі на вадзяную плынь [125].

З Купаллем у народзе было звязана вельмі многа розных павер'яў і прымхаў. Сярод іх павер'е аб нібыта небывалым разгуле ў купальскую ноч рознай нечысці, асабліва ведзьмаў. Павер'і аб ведзьмах суправаджаліся рознымі засцерагальнымі дзеяннямі. У некаторых рэгіёнах мужчыны ўсю ноч ахоўвалі жыта, «каб не прыйшла ведзьма і не сарвала некалькі каласкоў, бо тады жыта перастане рэсць»[126]. Часта само купальскае вогнішча раскладалі пры жыце і потым кідалі ў яго галавешкі з мэтай адпалохаць ведзьмаў і ведзьмакоў [127]. Асцерагаліся, што ведзьмы могуць забраць з нівы спор, адабраць у кароў малако. Дзеля таго каб засцерагчыся ад іх ліхіх наскокаў, абсыпалі хлеў макам, на парог клалі крапіву-жыгучку, а на вароты і вокны хлявоў вешалі калючы дзядоўнік [128]. Аберагаючы ад ведзьмаў коней, у купальскую ноч іх не выводзілі на начлег. Натуральна, што гэтыя засцярогі ірацыянальныя па сваім характары. У аснове іх ляжалі міфалагічныя ўяўленні. Міфічныя паводле паходжання і такія купальскія вераванні, як легенда пра папараць-кветку, у якой паэтычна ўвасоблена мара старажытнага чалавека аб пазнанні зямных таямніц, жаданне стаць празорлівым і шчаслівым. Аднак сярод мноства павер'яў, звязаных з купальскай ноччу, сустракаюцца і такія, што ідуць ад вытворчай практыкі земляроба, нясуць у сабе рацыянальныя веды. Сярод іх можна вылучыць павер'е аб святаянскіх зёлках. Лічылася, што зёлкі, сабраныя ў ноч на Купалле, маюць цудадзейную сілу [129]. Гэта вераванне стыхійна-матэрыялістычнае паводле вытокаў. Яно грунтуецца на шматвяковым назіранні за прыродай, лекавай дзейнасцю траў. Купалле — зеніт лета, пара, калі сонца дасягае свайго апагею, было і часам даспявання траў. Натуральна, што, сабраныя гэтай парою, яны мелі найбольшую лекавую моц. Веды, здабытыя непасрэдным назіраннем, практыкай, народ аформіў у міфе аб цудоўным уплыве купальскіх траў,

---

124 Шейн П. В. Материалы... Т. 1. Ч. 1. С. 220—221.
125 Романов Е. Р. Белорусский сборник. Вып. 8. С. 209—210.
126 Там жа. С. 210.
127 Там жа. С. 209.
128 Там жа. С. 207—208.
129 Там жа. С. 212.

здольнасці іх праганяць хваробы, ахоўваць ад рознага наслання. Нельга лічыць цалкам ірацыянальным павер'е пра тое, што нібыта на Купалле рэчкі свецяцца прывідным святлом, пачынаюць серабрыцца [130]. Сапраўды, сонца, знаходзячыся ў зеніце, кідае больш інтэнсіўнае выпраменьванне-адлюстраванне на месяц, і месячнай ноччу рэчкі, увогуле паверхня вадаёмаў могуць адсвечваць блакітным святлом. Спакойны пераліў хваль у месячным святле ды яшчэ пры паэтычным уяўленні сапраўды можа рабіць уражанне, быццам паверхня ракі серабрыцца.

Акрэсленую аграрную скіраванасць мелі звычаі і абрады жніва — гэтай вяршыні гаспадарчай дзейнасці земляроба. Вядомы на ўсёй Беларусі звычай у пярэдадзень жніва чыста вымываць хату, засцілаць стол свежым белым абрусам, выпраўляцца зажынаць у чыстым белым адзенні, трэба думаць, мае не толькі міфалагічныя (магічна-прафілактычныя), а і маральна-этычныя вытокі [131]. Хлеб быў святыняй для земляроба, і да ўборкі яго з поля прыступалі з пачуццём асаблівай адказнасці, святасці. Адзін з самых ранніх запісаў жніўных абрадаў, зроблены каля сярэдзіны XIX ст. П. Шпілеўскім, зафіксаваў пазней забыты ў народзе абрад «пакрыванне поля»[132]. Заключаўся ён у тым, што ў пярэдадзень жніва раніцай на ніву выходзіла маладзіца, якая нядаўна выйшла замуж, прыйшла ў новую сям'ю. Ёй асісціравалі дзяўчаты. Маладзіца нажынала невялікі сноп і, абхінуўшы яго ручніком ці кавалкам палатна, падкідала ўгору, прыгаворваючы:

Пакрыла ніўку
На добрую спажыўку,
Парадзі, божа, збожжа!

Дзяўчаты, лёгка кружачыся вакол яе, падпявалі: «Крыта, крыта! Поўна жыта!..»[133] Гэта прадуцыравальны абрад, прыклад аграрнай магіі. Савецкая даследчыца Н. Ціханіцкая бачыць у ім магічнае дзеянне, накіраванае на тое, каб выклікаць рост збажыны на будучы год [134]. Ю. Крачкоўскі таксама адзначаў на Навагрудчыне факт, што нявестка ў першы год

---

[130] Беларускі фальклор. Хрэстаматыя. Мн., 1977. С. 84.

[131] Шейн П. В. Материалы... Т. 1. Ч. 1. С. 239.

[132] Шпилевский П. М. Обряды поселян Витебской и Минской губерний при уборке хлеба с полей//Пантеон. СПб., 1853. Т. 9. Кн. 6.

[133] Там жа. С. 19.

[134] Тихоницкая Н. Спорина в жатвенных обрядах и песнях, преимущественно белорусских//Язык и литература. Л., 1932. Т. 8. С. 62.

свайго замужжа ішла на зажын з кавалкам палатна дзеля таго, каб пакрыць ім першы сноп [135].

Асноўныя жніўныя абрады былі звязаны з двума этапамі жніва: пачатковым — зажынкамі і заключным — дажынкамі. Зажынкі пачыналі звычайна надвячоркам. На ніву адпраўлялася адна гаспадыня або разам з дочкамі. Бралі з сабою «ў ношку» акраец хлеба, соль, кавалак сала, свежаадціснуты сыр. Прыйшоўшы на поле, віталіся з нівою: «Добры дзень, ніўка, ядраное жыта». Зжаўшы жменю калосся, жняя падпяразвалася імі, затым жала далей. А нажаўшы першы сноп, ставіла яго на зямлю са словамі: «Стаўлю сноп на сто коп, на тысячу мерак». Пасля гэтага клала яго на зямлю і пад яго падкладвала прынесеную «ў ношцы» ежу [136]. Зажынкавы абрадавы рытуал меў выразна магічна-прадуцыравальную форму. Усё, што здзяйсняла жняя-зажынальніца, было скіравана на тое, каб жніво прайшло добра і зжатая ніва дала жаданы спор, багаты ўраджай.

У некаторых мясцовасцях першы сноп зажыналі з прыгаворамі, заклёнамі накшталт: «Дай, божа, штоб лёгка жалася! Сярэдзінка не балела, ручанькі не млелі, ножанькі не дзервянелі, галава не гарэла!»[137] У гэтым звароце да боства, між іншым, пералічаны ўсе выдаткі гарачай жніўнай працы, можна зразумець, адчуць увесь цяжар яе. Першаму снапу (у некаторых мясцовасцях звалі яго «гаспадар») аказвалася асаблівая пашана. Яго ставілі на покуці. Калі пачыналася азімая сяўба, зерне з яго дамешвалася ў насенне [138]. Па сведчанні Е. Раманава, на Мсціслаўшчыне зерне з першага снапа выбівалі хлопцы, якія хацелі прываражыць дзяўчат. Дзеля гэтага варылі зярняты ў вадзе і пілі потым тую ваду ў надзеі, што іх будуць любіць дзяўчаты [139]. Такім чынам, відавочна, што першаму зжатаму снапу надавалася асаблівае значэнне, здольнасць прадуцыравальнага характару. Акрамя таго, ва ўшанаванні першага, гаспадарскага снапа можна бачыць і выяўленне той павагі, святасці, з якой земляроб адносіўся да хлеба.

Што датычыць патрабаванняў да зажынальніцы (каб яна была нестарая, лёгкая на руку, чыстая, увішная), то ў гэтых запаветах, традыцыі праявілася стыхійна-матэрыялістычнае,

---

[135] Крачковский Ю. Ф. Быт западнорусского селянина. С. 141.
[136] Романов Е. Р. Белорусский сборник. Вып. 8. С. 239.
[137] Там жа. С. 240.
[138] Там жа.
[139] Там жа; Шейн П. В. Материалы... Т. 3. С. 234.

заснаванае на працоўнай практыцы бачанне зарукі паспяховага жніва [140].

У дзень зажынак у хаце звычайна была святочная вячэра [141]. Само жніво не суправаджалася абрадамі. Цяжкая пад спякотным сонцам праца не пакідала часу, месца для абрадавых дзеянняў. Калі жнеі стамляліся і дазвалялі сабе хвіліну адпачынку або калі жніво было на панскім полі і аканом, прыганяты, злітаваўшыся над жанчынамі, аб'яўлялі перапынак, гучалі жніўныя песні [142]. Найчасцей, аднак, іх спявалі жнеі па дарозе дахаты. Ва ўласна жніўных песнях абрадавыя моманты амаль не праглядваліся. Зместавае напаўненне песень насіла сацыяльны, бытавы характар.

Найпаўней абстаўлены абрадам быў завяршальны этап жніва — дажынкі, або абжынкі. У гэты дзень дажынаць жыта ў гаспадара збіралася талака — некалькі пакліканых дзеля гэтага жанок. Дажынаючы апошні загон, жнеі пакідалі на ім невялікую, каліў на дзесяць лапінку звычайна лепшага жыта. Дзяўчаты пачыналі віць вянок з каласоў і палявых кветак, жанчыны ж тым часам няспешна і старанна выполвалі траву ўнутры пакінутай, нясцятай сярпом жмені каласоў; затым на камені, прасунутым між сцяблін, ці на белай насоўцы клалі акраец хлеба і соль. Пры гэтым жняя качалася па ніве, прыгаворваючы: «Ніўка, ніўка, аддай маю сілку на другую ніўку. На коніка лой, на ніўку гной, а мне здароўя. Судзі, божа, на лета жаці і ядранейшае і гусцейшае!» [143] На Віцебшчыне жнеі пасля таго, як прапалолі «куст» (а рабіць гэта мусілі няголай рукой), завівалі яго справа налева [144]. Адсюль, відаць, і ўзяў сваю назву абрад «завіванне барады».

Перад тым як зжаць «куст» («бараду»), кожная жанчына павінна была некалькі разоў перакаціцца па ім. Рабілася гэта, паводле меркавання выканаўцаў абраду, дзеля таго, каб к налеццю быў добры ўраджай, каласы хіліліся да зямлі пад цяжарам зерня [145]. Затым адна са жней лоўка падразала звязаны зверху жычкаю ці саломінай «куст» і кідала серп убок праз галаву. Зрэзаны «куст» клалі ў апошні нязвязаны сноп. Адзявалі на галаву вянок, часта звіты з найбольшых каласоў «барадатага снапа», і адпраўляліся з песнямі дахаты.

---

[140] Романов Е. Р. Белорусский сборник. Вып. 8. С. 240.
[141] Шейн П. В. Материалы... Т. 1. Ч. 1. С. 240.
[142] Там жа. С. 237.
[143] Романов Е. Р. Белорусский сборник. Вып. 8. С. 262; Шейн П. В. Материалы... Т. 1. Ч. 1. С. 263—264.
[144] Романов Е. Р. Белорусский сборник. Вып. 8. С. 265.
[145] Там жа.

У абрадзе «завіванне барады», такім чынам, можна ўбачыць цэлы шэраг магічных дзеянняў, накіраваных на тое, каб забяспечыць ураджай на будучы год. Але спачатку некалькі слоў аб гісторыі тлумачэння гэтага абраду ў цэлым. Міфолагі бачылі ў дажынкавым абрадзе «завіванне барады» ахвярапрынашэнне «духу нівы». Погляд гэты, выказаны нямецкім вучоным Мангартам, падзяляў А. Патабня. Яго трымаецца і Я. Карскі [146] . Не адмаўляючы міфалагічнага тлумачэння гэтай з'явы, ён зазначае, аднак, што ў народзе сэнс абраду забыты, а звычай пакідаць на ніве некалькі сцяблін нязжатага жыта інфарматары тлумачаць легендай. Згодна легендзе, жменьку нязжатага жыта пакідаюць звярам (птушкам) ва ўдзячнасць за тое, што яны некалі разнеслі зерне па зямлі [147]. Вядомы рускі этнограф Д. Зяленін бачыў у гэтым абрадзе «імітацыю, магічнае сеянне хлеба на будучы год»[148]. Ёсць усе падставы разглядаць абрад «завіванне барады» (дарэчы, у адной мясцовасці называлі яго «завіваць бараду богу»; у іншай — «завіваць бараду» гаспадару імярэк, таму, у каго адбывалася талака, дажынкі) як абрад прадуцыравальны, як комплекс магічных дзеянняў, спосаб захаваць спор нівы, паспрыяць ураджаю на будучы год. У абрадзе «завіванне барады» можна прасачыць некалькі відаў аграрнай магіі: апатрапеічнай, сімільнай, карпаганічнай.

Абрадавы характар меў і звычай калектыўнага частавання жней пасля заканчэння жніва. Абраднасць дажынак заключалася ў першую чаргу ў стравах, якія даўней падаваліся на стол. На Лепельшчыне, як сведчыў адзін з карэспандэнтаў П. Шэйна, на дажынкі пяклі бліны. Да іх падавалі масла, мяса і сыту. Абавязковым атрыбутам дажынкавага стала была густая каша, што, па меркаванні даўнейшага земляроба, павінна было спрыяць густым усходам збажыны [149]. Зноў жа прыклад сімільнай магіі, адзін з чарадзейных спосабаў выклікаць урадлівасць будучых пасеваў. Можна ўспомніць яшчэ некалькі абрадавых дзеянняў, звязаных з уборкай збажыны з поля і абмалотам яе.

Калі прывозілі ў гумно першы воз жыта, гаспадар браў буханку хлеба, загорнутую ў настольнік, клаў на таку ля дзвярэй, і праз яе правозілі снапы. Рабілі гэта дзеля таго, каб у хаце не пераводзіўся хлеб і заўсёды хапала старога да таго часу,

---

[146] Карский Е. Ф. Белорусы. Т. 3. Вып. 1. С. 202.
[147] Шейн П. В. Материалы... Т. 1. Ч. 1. С. 269—270.
[148] Зеленин Д. К. Спасова борода: Східнеслов'янські хліборобські обряд жнівярскі//Етнограф. вістник. Київ, 1929. Т. 3. С. 119.
[149] Шейн П. В. Материалы... Т. 1. Ч. 1. С. 264.

пакуль нажнуць новага [150]. Як вобразна казалі ў народзе, «каб новы хлеб заўжды выязджаў на старым». Укладанне ў застаронак, тарпу першага зажынкавага снапа разам з завезеным возам жыта таксама было актам прадуцыравальным, накіраваным на захаванне плёну, памнажэнне ўрадлівасці збажыны — «каб сыціла».

Такім чынам, каляндарныя абрады жніва і ўборкі жыта з поля цалкам былі падпарадкаваны працоўнаму клопату земляроба ў час і без страт убраць хлеб — гэту аснову дабрабыту, жыцця працоўнай сям'і. У звычаях і абраднасці зажынак і дажынак знайшлі ўвасабленне вялікая пашана чалавека працы да хлеба, своеасаблівы культ яго — традыцыя, вартая ўвагі, вартая працягу сёння з пункту гледжання маральна-этычнай і утылітарна-практычнай яе каштоўнасці.

*А. С. Ліс*

## ВОСЕНЬ

Восеньскія звычаі і абрады выглядалі больш сціпла, было іх менш. Тлумачыцца гэта тым, што заканчваліся палявыя работы, а з іх заканчэннем мінаўся на нейкі час у земляроба і клопат аб ніве. Збажына была пад страхой, заставалася яе абмалаціць, спарадкаваць ужо гатовае. Для селяніна наступала ў гаспадарцы кароткая перадышка, час падумаць пра ўнутрысямейныя справы: ажаніць сына, выдаць замуж дачку і г. д. З асенніх гадавых свят вылучаліся Звіжанне, Багач, Асяніны, або Змітраўскія дзяды, а таксама Пакровы. З іх толькі Багач і Асяніны суправаджаліся старажытнымі абрадамі. Звіжанне ж і Пакровы шырэй былі вядомы толькі як пэўныя этапы ў жыцці прыроды, дакладней заміранне яе, ды асеннімі кірмашамі, або фэстамі. Асобныя звычаі і павер'і, аграрныя абрады былі звязаны яшчэ з асенняй азімай сяўбой.

Восеньскае, або аўсянае, жніво праходзіла без тых урачыстасцей, якімі характарызавалася летняе, жытняе, жніво. Тлумачылася гэта, мабыць, тым, што збор яравых, грэчкі, лёну ўжо не меў таго значэння для селяніна, як уборка жыта, якое забяспечвала сям'ю галоўным прадуктам — хлебам.

Святам, што стаяла на мяжы лета і восені, паводле народных уяўленняў, лічылася Ілля. «На Іллю да абеда лета, а па абедзе восень»,— казала народная прымаўка [151]. З уборкай

---

[150] Шейн П. В. Материалы... Т. 3. С. 235.

[151] Фалютынский К. Народные праздники, увеселения, поверья и суеверные обряды жителей Белоруссии//Вестник Европы. 1828. Март — апрель. С. 85.

яравых палявыя работы, якія цягнуліся ў гаспадарцы з вясны ўсё лета і займалі пачатак восені, не канчаліся. Селяніна чакала ў полі яшчэ адна пільная работа: засеяць азіміну. Клопат пра будучы хлеб пачынаўся з восені. Неабходна было спяшацца засеяць жыта, каб яно паспела абысці і ўкараніцца. Калі ў перадзім'і рунь закучаравілася на ніве, стала цёмназялёнай, земляроб мог спакойна сустракаць зіму, цешыць сябе надзеяй на новае лета.

Як аўтарытэтна сведчыць адзін з найбольшых знаўцаў гаспадарчага і духоўнага жыцця беларускага селяніна дарэвалюцыйных часоў Е. Р. Раманаў [152], асенняя сяўба пачыналася каля 1 (14) верасня, але сеялі і раней, дзесь пасля Успення — 15 (28) жніўня *. Да пасеву жыта, як і вясной да яравой сяўбы, земляроб прыступаў урачыста. Гаспадыня з дочкамі і нявесткамі чысцілі, мылі ў хаце, варылі і пяклі. Перад усім клапаціліся пра тое, каб засеўкі пачынаў гаспадар з «лёгкай» рукой. Каб выбраць такога, адварвалі яйкі, збіраліся грамадой і, ачысціўшы іх, глядзелі, у каго яйка акажацца без пяткі. Той, у каго ўся падшкарлупная ёмкасць была запоўненай, і павінен быў пачынаць сеяць. Астатнія сеялі ўжо за ім. Такім чынам, зноў бачым даволі тыповае міфалагічнае ўяўленне (сімільная магія). Стараліся сеяць так, каб зерне не кідаць супроць ветру. У апошнім правіле кіраваліся земляробчай практыкай: кінутае супроць ветру зерне не магло так дакладна класціся ў глебу, як было трэба [153]. У некаторых мясцовасцях часам усцілалі поле саломай, зерне якой пайшло на першы пасеў. Спадзяваліся гэтым магічным дзеяннем паспрыяць таму, каб будучае жыта таксама ўсцілала зямлю [154], як разасланая салома першых абсеўных снапоў. Адпраўляючыся на засеўкі, селянін апранаў белую сарочку, часам абходзіў ніву са свянцонай вярбой [155]. Вярнуўшыся з сяўбы, вечарам спраўлялі ўрачыстую вячэру. Чысціня ў хаце, у адзенні сейбіта, дастатак, сыць на стале былі абрадавымі захадамі дзеля поспеху ў працы, ўрадлівасці засеянай нівы. Разам з тым было гэта ўсё святасцю, выказваннем пачуцця вялікай адказнасці, асобай пашаны да хлеба.

---

[152] Романов Е. Р. Белорусский сборник. Вып. 8. С. 276.

* Дарэчы, яшчэ ў запісках польскага храніста XVI — пачатку XVII ст. А. Гваніні гаварылася, што сеяць жыта ў Беларусі пачыналі каля Спажы, г. зн. 28 жніўня па н. ст., і калі нядбайны гаспадар не паспяваў пасеяць да 21 верасня, то зямля не давала яму належнага плёну (гл.: Гісторыя Беларусі ў дакументах і матэрыялах. Мн., 1936. С. 134).

[153] Романов Е. Р. Белорусский сборник. Вып. 8. С. 276.
[154] Крачковский Ю. Ф. Быт западнорусского селянина. С. 154.
[155] Там жа.

Толькі ў некалькіх друкаваных крыніцах сустракаюцца звесткі пра асенняе земляробчае свята Багач [156]. Упершыню яно апісана А. Багдановічам. З Багачом звязвалі азімую сяўбу. Аб гэтым сведчыць прыказка: «Прыйшоў Багач, кідай рагач, бяры сявеньку і сей памаленьку». Багач святкаваўся 8 (21) верасня. Мяркуючы па характары абраду, гэта была ў мінулым язычніцкая ўрачыстасць, да дня якой царква з мэтай пацясніць дахрысціянскія ўрачыстасці прымеркавала свята Раства багародзіцы, або дзевы Марыі [157]. А. Багдановіч выказаў меркаванне, што «Багач — адно з земляробчых боствaў дахрысціянскага перыяду, адно з відаадмен нестараўскага Дажбога сонца» [158]. Этнограф зазначаў, што спраўляюць Багач не толькі ў названы дзень, але і ў іншыя святы, блізкія да асенняга раўнадзенства.

Галоўную ролю ў абрадзе святкавання Багача адыгрывала лубка, напоўненая жытам з устаўленай у яго свечкай. Лубка гэта прыладкоўвалася на самым пачэсным у сялянскай хаце месцы — на покуці і называлася «багач». Відаць, у назве старажытнага свята, у галоўным абрадавым атрыбуце яго знайшло выражэнне паняцце аб дастатку, багацці, якое к гэтаму часу прыйшло ў хату земляроба. На свята лубку з зернем і запаленай свечкай па чарзе пераносілі ад гаспадара да гаспадара. У кожным наступным двары «багача» сустракалі на падвор'і за накрытым белым абрусам сталом, на якім ужо стаялі лубкі з рознай збажынай. У канцы абходу «багача» пераносілі да наступнага гаспадара, дзе ён стаяў на покуці год аж да будучага свята. На калектыўнасць абраду ўказвае і такая дэталь: у некаторых мясцовасцях, паводле сведчання А. Багдановіча, жыта і воск для «багача» збіралі з усёй вёскі [159]. Той факт, што жыта для «багача» ўжывалі з першага, зажынкавага снапа і што яго потым дадавалі да насення, пераконвае ў земляробча-прадуцыравальных мэтах усяго абраду і самога характару гэтага асенняга свята.

Меў «багач» у вачах даўнейшага селяніна таксама здольнасць служыць чарадзейнай аховай свойскай жывёлы: невыпадкова ім абносілі статак перад тым, як на ўвесь год паставіць сімвалічны знак свята ў хаце чарговага гаспадара [160]. Народнае павер'е сцвярджала, што «багач» прыносіць у дом багацце

[156] Романов Е. Р. Белорусский сборник. Вып. 8. С. 276; Богданович А. Пережитки древнего миросозерцания у белорусов. Гродно, 1895. С. 122—125.
[157] Богданович А. Пережитки древнего миросозерцания у белорусов. С. 123.
[158] Там жа.
[159] Там жа. С. 124.
[160] Там жа.

і шчасце. Таму рада была сям'я, дзе «багача» пакідалі перабыць да наступнага года. А ў пакіданні яго пачаргова ва ўсіх хатах селішча нельга не бачыць этычна-прыгожага, сацыяльна-гуманнага пачатку народнай традыцыі гэтага свята восені. М. Я. Нікіфароўскі даваў матэрыялістычнае вытлумачэнне святу Багач і яго назве. Этнограф пісаў, што «свята нараджэння св. дзевы Марыі рэгіянальна называецца Багачом, таму што да гэтага дня так ці іначай вызначаецца «багацце» ад летняга ўраджаю»[161]. Нікіфароўскі прывёў яшчэ адзін факт, які сведчыў аб магічна-прадуцыравальным характары абрадаў Багача. «У гэты дзень,— паведамляў вучоны,— жанчыны ходзяць гуртамі па сваіх і чужых іллянішчах, прыгаворваючы на кожным з іх: «Ніхай будзіць лён такей доўгей, колькі мы прайшлі!»[162] У этнаграфічных матэрыялах, сабраных на Гродзеншчыне і выдадзеных пад рэдакцыяй Е. Р. Раманава, адзначалася такая рыса Багача, як звычай хлопцаў і дзяўчат выглядаць у гэты дзень сабе нявесту, жаніха, а цётак і кумак — распытваць пра тых ці іншых дзяўчыну, кавалера[163].

Сведчанні некалькіх аўтараў на падставе этнаграфічных звестак, сабраных на Міншчыне, Віцебшчыне і Гродзеншчыне,— пераканаўчае пацвярджэнне распаўсюджанасці традыцыі святкавання Багача, прынамсі, на асноўным беларускім этнічным абшары.

Асяніны, або асеннія, багатыя Дзяды, Ю. Крачкоўскі называў адным з найбольшых свят у сельскім асяроддзі[164]. Асяніны адбываліся суботнім вечарам у тры тыдні пасля Пакроваў і насілі рэгіянальныя назвы «Змітраўскія дзяды», «Памінальная субота» або проста «Дзяды»[165]. Пасля абеду ў гэты дзень кідалі работу і рыхтаваліся да ўрачыстай вячэры — памінак памерлых. Мужчыны прыбіралі з падвор'я сельскагаспадарчыя прылады, якімі карысталіся ўлетку і восенню, падмяталі двор, жанчыны парадкаваліся ў хаце: мылі вокны, лавы, стол. Асабліва старанна вычышчалі покуць і запечак. Гатавалі няцотны лік страў, сярод якіх звычайна былі вараная капуста, куцця, смажаныя каўбасы, верашчака, поліўка, квашаніна. Верылі, што мноства страў, парадак у гаспадарцы, у хаце прынясуць прыемнасць, радасць памерлым[166]. Калі ўсё было спарадкавана і прыходзіў вечар, сям'я, запрошаныя

---

161 Никифоровский Н. Я. Простонародные приметы и поверья... С. 254.
162 Там жа.
163 Материалы по этнографии Гродненской губернии. Вып. 1. С. 40.
164 Крачковский Ю. Ф. Быт западнорусского селянина. С. 156.
165 Романов Е. Р. Белорусский сборник. Вып. 8. С. 278.
166 Дмитриев М. А. Собрание песен, сказок, обрядов и обычаев... С. 214—216.

госці збіраліся да стала. Дзед запальваў свечку і тварыў малітву. Па скнчэнні яе свечку тушылі і ўсаджваліся за стол. Гаспадар звяртаўся да душ памерлых родных: «Святыя дзяды, завём вас, хадзіце да нас! Ёсць тут усё, што бог даў, што я для вас ахвяраваў, чым толькі хата багата. Святыя дзяды, просім вас, хадзіце, ляціце да нас!»[167] Затым наліваў чарку гарэлкі так, каб крыху пралілося на абрус (для дзядоў), і выпіваў. Усе дарослыя сямейнікі рабілі тое самае. Адведваючы кожнай стравы, першую лыжку адкладвалі ў асобную гліняную міску і затым ставілі яе на падаконнік, часам нават за акно. «Няхай гэта будзе нашым старыкам, каторыя ў гэтай хаце працавалі»,— гаварылі пры стале[168]. Застолле не ажыўлялася весялосцю. Прыслухоўваліся да парыву восеньскага ветру, шуму дрэва пры хаце, якое скідала апошняе сваё лісце. Скрыпне брамка, зазвоніць шыба, устрапянецца мятлушак — усё гэта для ўдзельнікаў вячэры ў памяць дзядоў быў знак наведвання хаты душамі памерлых родных. Размовы за сталом былі перарывістыя, складаліся звычайна з адных заўваг аб нібыта прысутных ужо душах, кароткіх успамінаў аб памерлых як жывых у мінулым. Часам звяртаючыся да дзядоў, сямейнікі наракалі на сваё жыццё, на нястачы. Павячэраўшы, развітваліся з «незямнымі гасцямі»: «Святыя дзяды! Вы сюды прыляцелі, пілі і елі, ляцеце ж цяпер да сябе. Скажыце, чаго яшчэ вам трэба, а лепей ляцеце да неба, акыш, акыш, акыш!»[169] Рэшткі ежы аддавалі звычайна жабракам. У некаторых мясцовасцях на Дзяды пяклі асобны пірог, званы «курэц», які заўсёды аддавалі жабракам[170].

Да Асянін прымыкалі памінкі на могілках, якія называліся Прыкладзінамі. У абрадавым плане яны нагадвалі Радаўніцу[171]. У абрадах Асянін, або асенніх Дзядоў, паслядоўна праглядвае старажытная светапоглядная аснова: анімістычнае светаўспрыманне, вера ў замагільнае жыццё, імкненне заручыцца спагадай і спрыяннем адышоўшых навекі родных. Ярка выражаны абрадавы характар насіла святочная ежа, якая ўключала куццю — гэты традыцыйны магічна-прадуцыравальны мацунак паводле язычніцкіх уяўленняў. Сціслы зварот-запрашэнне да дзядоў нагадвае формулу заклёнаў. У самім святкаванні Асянін менавіта ў пару, найбольш спрыяльную ў гаспадарцы,

---

[167] Дмитриев М. А. Собрание песен, сказок, обрядов и обычаев... С. 214—216.
[168] Крачковский Ю. Ф. Быт западнорусского селянина. С. 157.
[169] Дмитриев А. М. Собрание песен, сказок, обрядов и обычаев... С. 216.
[170] Крачковский Ю. Ф. Быт западнорусского селянина. С. 157.
[171] Дмитриев М. А. Собрание песен, сказок, обрядов и обычаев... С. 217—218; Крачковский Ю. Ф. Быт западнорусского селянина. С. 159—160.

калі скончыліся ўсе палявыя работы, дабро было звезена ў гумно, выкапана бульба, сабрана гароднiна, нельга не бачыць і чыста практычнага аспекту духоўнага жыцця даўняга земляроба. Дзядам, продкам аддавалася належнае ў поўную меру якраз тады, калі для гэтага быў ва ўсіх сэнсах самы спрыяльны для селяніна час. Са Змітраўкай у народзе быў звязаны і такі ўнутрысямейны клопат земляроба, як жаніцьба сыноў і выданне замуж дачок. Валачобная песня ў паэтычна-мастацкай форме перадала гэты значны бытавы факт:

Святы Змітры за ўсіх хітры:
Ячмень росціць, піва робіць,
Піва робіць, мёд гатовіць,
Сыноў жэніць, пасаг дзеліць.[172]

Паколькі засеўкам у працоўным побыце селяніна надавалася вялікае значэнне, а ў апублікаванай літаратуры акрамя Ю. Карачкоўскага ім ніхто з этнографаў не ўдзяліў увагі, ёсць сэнс прывесці больш поўнае апісанне гэтага звычаю, нядаўна знойдзенае ў архіве М. Федароўскага. Запіс зроблены на Пружаншчыне адным з вясковых карэспандэнтаў славутага збіральніка.

«Засеўкі бываюць толькі жытнія. Загатаваўшы насенне, а таксама паараўшы ў загоны ўсё поле, гаспадары едуць сеяць жыта. Калісь людзі сеялі, засявалі жыта ад Сямёна да Прачыстай (ад 1 да 8 верасня), а сягоння пасля Сплення зачынаюць сеяць. Тая сяўба, што была да Прачыстай, называлася ранняя, а гэта ўжо позняя сяўба.

Выбіраючыся на засеўкі, гаспадар бярэ ў воз салому, а на яе кладзе мяшкі з жытам і «кветку» (вянок з каласоў, якую свенцілі на Спленне разам з зеллем. Прыехаўшы на поле, спачатку сеялі свянцонае жыта, якое выбіралі з «кветкі» тут жа на полі ў сявеньку. Сявец садзіўся на зямлю, ставіў перад сабой сявеньку і выціраў «кветку». Выцершы, салому закапваў у зямлю, а жыта рассяваў.

...Потым, рассеяўшы і забаранаваўшы, бярэ з воза салому, на якой ляжала насенне, і рассцілае поперак свайго поля затым, каб жыта не памерзла, бо яно ж на зіму пасеяна.

Вечарам, згаварыўшы пацеры ў полі, сявец сядае і едзе дадому. Дома гаспадыня павінна варыць тлустую вячэру.

Прыкметы для сяўбы таксама маюць вялікае значэнне.

[172] ЦНБ АН БССР, АРКіР, ф. 3, воп. 1, спр. 57, л. 144.

Калі грыбы прыгожыя і раннія, то жыта будзе добрае. Калі ж грыбы пракінуцца позна, то і жыта будзе позняе» [173].

Такім чынам, засеўкі ў сялянскім асяроддзі лічыліся таксама значным святам.

Драбнейшыя святы і прысвяткі, якіх наогул багата было ў земляробчым календары, завяршалі гаспадарчы год селяніна. З Каляд пачынаўся новы кругабег жыцця і працы. Гадавыя святы дзялілі год на пэўныя адрэзкі часу, складалі нейкі этап у гаспадарчай працы, духоўным жыцці. Для кожнай пары года, кожнага сезонна-вытворчага цыкла былі характэрны свае звычаі і каляндарныя абрады. Асобнымі сваімі элементамі яны маглі паўтарацца, аднак у цэлым былі адметныя. І гэта адметнасць абумоўлівалася неаднолькавай функцыянальнасцю абраднасці ў розныя часы года, у розныя гаспадарчыя перыяды. У кожную пару года былі нейкія галоўныя гадавыя святы, у пэўным сэнсе вызначальныя для гэтай пары. Найчасцей звязаны яны былі з гадавым сонцаваротам, асабліва зімнім і летнім сонцастаяннем і веснавым і асеннім раўнадзенствам, залежнымі ад іх этапамі ў развіцці прыроды і адпаведна — галоўнымі работамі ў земляробстве. Звычаі і абрады ўвасобілі ў сабе пэўны вопыт пазнання чалавекам прыроды, працы на зямлі. Увесь іх змест і наіўная форма, падказаная міфічным мысленнем, прасякнуты жывым клопатам пра чалавека. Каляндарныя і сямейныя звычаі і абрады маюць глыбока гуманістычны сэнс. Акрамя паважнай утылітарнай мэты садзейнічаць дабрабыту сям'і, прадаўжэнню роду звычаі і абрады напаўнялі працу і дні земляроба святлом духоўнасці, давалі нейкую патолю ў нялёгкім жыцці. Яны дапамагалі кіраваць жыццё ў сталае рэчышча, выверанае гадамі працоўнай практыкі, садзейнічалі этнічнай кансалідацыі, захаванню нацыянальнай супольнасці. Цяжка пераацаніць ролю абраднасці і звычаёвасці ў перадачы працоўнага і маральна-этычнага вопыту ад пакалення да пакалення. Разнастайныя па складзе, часе ўзнікнення асобных сваіх элементаў, яны спалучалі ў сабе рацыянальнае і ірацыянальнае, стыхійна-матэрыялістычнае і ідэалістычнае, народжанае практыкай і прымхлівай фантазіяй. Хрысціянства наклала на каляндарныя звычаі і абрады свой семантычны адбітак, аднак аснову іх склалі ўяўленні, сімволіка эпохі першабытнаабшчыннага ладу, таму так выразна дамінуе ў беларускай абраднасці прыродна-сузіральны, язычніцкі і стыхійна-матэрыялістычны пачатак. Звычаёвасць і абраднасць кожнага народа маюць

[173] Б-ка Варшаўскага ун-та, АРКіР, сігн. 445, п. 1, с. 66—67.

нямала супольнага з абраднасцю і звычаёвасцю іншых народаў. Разам з тым канкрэтныя гістарычныя і геаграфічныя ўмовы жыцця кожнага з іх, асаблівасці быту, матэрыяльнай культуры надалі непаўторнасць кожнаму нацыянальнаму духоўнаму комплексу, званаму абрадамі і звычаямі.

Беларуская каляндарная звычаёвасць і абраднасць — арганічная частка звычаёвасці і абраднасці еўрапейскіх народаў. Яна лёгка прачытваецца ў іх кантэксце і разам з тым вылучаецца сваёй аграрнай дамінантай. У цэлым звычаёвыя і абрадавыя традыцыі — каштоўная спадчына мінулага, важная і сёння. Невыпадкова сучаснае грамадства, у тым ліку наша, сацыялістычнае, мае аб'ектыўную патрэбу ў выкарыстанні гэтай спадчыны. Асабліва наглядна гэта праяўляецца на сучасным этапе, калі ўзнікла патрэбнасць стварэння новых савецкіх сямейных і каляндарных абрадаў і звычаяў. Маральна-этычны зарад старадаўніх народных звычаяў і абрадаў, асобныя элементы іх формы і абрадавая песенная творчасць — у гэтай справе крыніца незаменная. Наша патрэбнасць абаперціся на гэтыя традыцыі лішні раз сведчыць аб іх вартасці, назапашанай і не растрачанай у вяках.

*А. С. Ліс*

# АПІСАННІ
# СВЯТ ЗЕМЛЯРОБЧАГА
# КАЛЕНДАРА





# КАЛЯДА

Напярэдадні Новага года апранаюць чатырох мужчын: двух як старых, прырабляючы ім сівыя валасы (з ільну) і бараду, а другіх двух па-юнацку, чапляюць махры чырвоных іступжак і інш. Першых двух закрываюць доўгім пакрывалам, а другіх двух, не закрываючы, так пакідаюць. Як з першых двух, так і з другіх двух адзін апрануты багата: на галаве мае вянок з поўнага жыта, кішэні яго світкі дапаўна набіты збожжам і дабром. А кожны другі — у абарванай світцы, на галаве таксама вянок, але ўжо з адной саломы, кішэні пустыя.

Выбраныя для такой цырымоніі водзяць гэтых чатырох мужчын па вёсцы і, уваходзячы ў кожны дом гаспадара, тых двух, што з пакрывалам, уводзяць у хату, а другіх двух пакідаюць ля варот. Увайшоўшы ў хату, даюць магчымасць гаспадару выбраць аднаго з двух. Калі гаспадар (зразумела, не ведаючы нічога) выпадкова выбера таго, які з вянком поўнага жыта і багата прыбраны, то карагод дзяўчат і хлопцаў пасылае гэтага выбранага да тых двух, каб адзін з іх — такі ж, г. зн. з вянком поўнага жыта, у багатай світцы і з набітымі кішэнямі, прыйшоў у дом гаспадара без пакрывала, радуючыся такому выбару гаспадара. І як толькі той увойдзе ў хату, то, звяртаючыся да гаспадара з прывітаннем, спяваюць наступную песню:

Ды ўжэ ж тут будзе
Шчасце, усяка доля,
Бо ў яго на грудзях
Усё, што боска воля.

Пасля звяртаюцца да прыбранага хлопца:

Ой ты, багацька Каляда!
Дзякуй табе за тваё дабро,
Бо ўжо ж наша чарада:
Штоб было ў госця (гаспадара) поўна гумно дабра.

Калі ж гаспадар выбера, наадварот, абадранага дзецюка, то не пасылаюць яго да варот, пакідаюць тут жа; пасля, як здымуць пакрывала, звяртаюцца да яго з такой песняй:

Ідзі, ідзі, ты наш старэнькі,
Ты нам ніяк не спадабенькі.
Як ты спаткаешся там з кім,
Няхай ён вернецца туды к сваім.
Нам трэба той другі,
Што б даў нам поўны карабы.

## КАЛЯДА

Калядныя святы, г. зн. два тыдні пачынаючы з 24 снежня да 7 студзеня, на Беларусі вядомы пад агульнай назвай «Каляды». Мяркуюць, што «каляда» — значыць «ко-ладу», г. зн. «да ладу», і прымаюць гэта слова за назву асобнага язычніцкага бажаства. Але няма сумнення, што беларускае і маларасійскае слова «каляда» (па-польску «kolęda», у паўднёвых славян «koledo, kolido, kolendo, kalanda») ёсць не што іншае, як лацінскае слова «kalendae» і менавіта «calendae januavii». У рымлян, як вядома, першая дата кожнага месяца нызывалася «календа». Не дзіўна, што свята Каляд, якое бывае перад студзеньскімі календамі і якім у хрысціян пачынаецца царкоўны год, у каталіцкіх краінах, а ад іх і ў Маларасіі, Беларусі і іншых славянскіх землях названа «Календа» ці «Каляда». У каталіцкіх краінах у гэты час ходзяць з музыкай і песнямі дзеля віншавання гаспадароў са святам Каляд і атрымання падарункаў, якія ў сваю чаргу атрымалі назву «колядьі» ці «календы». Па-краацку «каледо» — «дар, кой се на младо лето дае» (падарунак, які даецца на Новы год). У Магілёўскай губерні ў сёлах удовы і бабылі таксама ходзяць ці ездзяць у гэты час па сваёй і суседніх вёсках дзеля збірання жыццёвых прыпасаў, што называецца «калядаваць» ці «хадзіць па калядзе».

У многіх славянскіх землях святочныя дні з 25 снежня да 7 студзеня суправаджаюцца рознымі забавамі, асабліва маскіраваннем, пераапрананнем у жураўля, казла, барана, а то і ў чорта і г. д.

У Магілёўскай губерні Калядою, уласна, называюць тры дні: дзень перад Калядамі, перад Новым годам і перад Вадохрышчам. Першы і апошні дні называюцца поснаю Калядою, а дзень перад Новым годам — тоўстаю Калядою *.

Даволі добрыя некаторыя звычаі, якіх строга прытрымлі-

* Гэтыя ж дні называюцца яшчэ і куццёю. Так гавораць: на першую куццю, на другую, на трэцюю.

ваюцца ў простанароддзі карэнныя жыхары тутэйшай губерні, асабліва сельскія.

На абедзве куцці і перад Новым годам звычайна гатуюць сытную вячэру, якая, акрамя іншых страў, на куццю абавязкова павінна складацца з бліноў, бурачнага расолу з рыбай і куцці, а перад Новым годам — з бліноў, печаных каўбас і куцці ці кашы з салам. Куцця і бліны адыгрываюць важную ролю.

Пасля куцці варожаць, які час будзе найбольш спрыяльным для сяўбы яравога хлеба: калі першая куцця (перад пачаткам Каляд) будзе поўнай, г. зн. вырасце ў гаршку, то першы пасеў ярыны будзе ўдачлівым і г. д. Ад кожнай вячэры першы блін і верх куцці пакідаюць жывёле, якой дзеляць гэта раніцаю ў дзень Каляд, каб цэлы год яна была гладкай і здаровай. З куццёй і першым блінам дзяўчаты варожаць аб сваёй долі. Перад вячэраю засцілаюць стол сенам, наверсе якога рассцілаюць чысты абрус і перш за ўсё ставяць на стол гаршчок з куццёю *.

За вячэраю запрашаюць мароза есці куццю, прыгаворваючы: «Мароз, мароз, ідзі куццю есці, а летам не бывай, па межах не хадзі, яры не губі!» Пасля вячэры выцягваюць з-пад абруса некалькі сяннінак і па іх варожаць, які будзе ўраджай ільну: калі выцягнуцца доўгія, то лён уродзіцца доўгі, калі кароткія, то кароткі. Прыбраўшы сена, па насенні траў, якое засталося на стале, варожаць, на які хлеб будзе лепшы ўраджай: калі на стале застанецца болей чорнага насення — значыць, будзе ўраджай на грэчку; калі ж болей жоўтых, то лепей уродзіць яравы хлеб. Па стане надвор'я ў гэтыя вечары варожаць аб ураджаі грыбоў: калі на небе не шмат убачаць зорак ці ні адной не ўбачаць, то і грыбоў будзе мала ці зусім не будзе. У некаторых вёсках перад Новым годам, скончыўшы вячэру, варожаць, ці ўсе, хто вячэраў, застануцца ў наступным годзе ў гэтай хаце. Дзеля гэтага ўсе кладуць лыжкі на адно акно, і потым кожны б'е чым-небудзь па канцы сваёй лыжкі: чыя лыжка адляціць далей ад іншых — той аддзеліцца, г. зн. ці пяройдзе ў другую хату, ці памрэ.

У многіх сялян ёсць звычай у першы дзень свята да ўсходу сонца віць вяроўкі і імі аблытваць стол у хаце, каб летам коні не разбягаліся і не рабілі шкоды на лугах і засеяных палях. У гэты дзень не ходзяць у чужыя хаты, каб жывёла не збягала з двара і не прападала...

* Гаршчок з куццёю, як хутка будзе выняты з печы, звычайна ставяць «на кут», г. зн. у пярэднім вугле, дзе стаіць да самай вячэры, але за вячэраю куцця складае апошнюю страву.

Ва ўсе святочныя вечары ніхто з сялян не бярэцца ні за якую работу, асабліва баяцца пракручваць дзіркі ў дрэве, бо ўпэўнены, што калі хто-небудзь з дамашніх возьмецца ў гэтыя вечары за якую-небудзь работу, то ў той хаце абавязкова народзіцца вырадак. Таму гэтыя вечары часта называюць крывымі. Вадохрышчанскую куццю адрозніваюць ад усіх вечароў тым, што, выняўшы з печы гаршчок з куццёю, ставяць у ім зроблены з лучыны крыж, які на другі дзень апускаюць у ваду — у раку ці студню, а перад вячэраю гаспадар хаты, узяўшы першы блінец і верх куцці, абходзіць усе свае будынкі і робіць на сценах крыжы крэйдай.

## СВЯТОЧНЫЯ ДЗЯВОЧЫЯ ВАРОЖБЫ Ў МАГІЛЁЎСКАЙ ГУБЕРНІ

Варожбы адбываюцца на працягу трох вечароў: перад Калядамі, Новым годам і Вадохрышчам, пераважна ў два апошнія. Пачынаюць з бліноў. Дзяўчына стараецца ўпотайкі ад усіх узяць першы, зняты з патэльні блінец і, выбегшы з ім за вароты, спытаць у першага мужчыны, які ёй сустрэнецца, як яго імя. Атрымаўшы адказ, яна ўжо ўпэўнена, што ведае імя і свайго суджанага, і ў думках перабірае ў сваёй і суседніх вёсках усіх кандыдатаў у мужы, каб даведацца, каму з іх належыць такое імя. Але ведаць адно толькі імя суджанага — невялікая ўцеха, галоўнае, патрэбна даведацца, ці выйдзе яна ў гэтым годзе замуж. Вось яна з тым жа бліном бяжыць да суседа пад акно, прыслухоўваецца, пра што гавораць у хаце, і скарыстоўвае размову ў сваёй сардэчнай задуме: напрыклад, калі ў размове пачуе слова «ідзі» ці што-небудзь падобнае, сэрца яе моцна заб'ецца ад радасці, і яна з таго вечара кожны дзень чакае сватоў ад свайго суджанага; калі ж да яе вушэй дойдзе слова «сядзь», апусціўшы галаву, вяртаецца яна ў сваю хату, упэўненая ў тым, што асуджана, прынамсі, яшчэ год сядзець у дзеўках. Аднак не ўсё яшчэ страчана: і акрамя бліна ёсць нямала сродкаў, якія дапамогуць спазнаць ісціну. Ды і не кожнай дзяўчыне ўдаецца ўпотайкі ад усіх вынесці з хаты першы блінец, асабліва калі ў хаце ёсць дзеці: галодныя, яны сочаць за першым блінцом надзвычай пільна. [Яшчэ варажба]: некалькі сяброўак збіраюцца ў адну хату, кожная бярэ ладку (аладку) і кладзе яе на парог, пасля клічуць у хату сабаку: чыю аладку сабака з'есць першую, то тая дзяўчына раней за ўсіх і выйдзе замуж. Гэтая варажба, вядома, нічога добрага не гаворыць аб лёсе дзяўчат, але ў той жа час сэрца

кожнай з іх заспакоена — усе жывуць салодкаю надзеяй: рана ці позна знайсці сабе спадарожніка жыцця, бо галодны вясковы сабака не грэбуе нічыёю аладкай, хоць бы яна сабе была пакладзена нават хударлявай рукою пяцідзесяцігадовай жанчыны. Каб даведацца аб чым-небудзь больш дакладна, сяброўкі бягуць да кастра дроў. Тут кожная з іх набірае цэлае бярэмя, не лічачы пален, і нясуць дровы ў хату. Толькі ў хаце кожная падлічвае свае палены. У каго будзе цотны лік, тыя смела могуць чакаць да сябе сватоў ад суджаных [на працягу года].

[А вось яшчэ адзін спосаб варажбы].

Прыгажуня перад тым, як класціся спаць, бярэ блюда, кладзе на дно яго кучку пяску, ключы, ляльку мужчынскую і ляльку жаночую і кожны прадмет накрывае асобнай міскай (кубкам). Затым кладзецца спаць.

Раніцаю, як толькі прачнецца, трапяткою рукою падымае яна адну міску, толькі адну. Калі адкрыецца пясок — смерць чакае дзяўчыну; адкрыецца лялька жаночая — усё жыццё прападаць ёй у дзеўках; адкрыюцца ключы — лёс прызначыў ей быць поўнаю гаспадыняю дома; нарэшце, калі адкрыецца лялька мужчынская — шлюб яе з тым любым, якога выбрала яе сэрца.

Даведаўшыся што-небудзь пра свайго суджанага, добра было б на яго і паглядзець, хоць бы ў сне. На гэта таксама ёсць сродак. Дзяўчына, якая жадае ўбачыць у сне суджанага, стараецца ў час вячэры пакінуць першую, узятую ёю з міскі лыжку куцці так, каб ніхто не заўважыў, што яна яе адклала, а не з'ела; кладзе гэтую куццю сабе пад падушку і спадзяецца, што суджаны абавязкова з'явіцца да яе ў сне. Ці, напрыклад, паслужлівая сяброўка робіць мосцік з лучыны ці з саломы, апускае яго ў які-небудзь посуд з вадою і ставіць гэты посуд пад ложак сваёй жа сяброўкі без яе ведама. Заснуўшы, тая ўбачыць свайго суджанага, які пераходзіць праз мост.

Каб даведацца, у якім баку жыве суджаны, выходзяць на скрыжаванне дарог і прыслухоўваюцца да брэху сабак: у якім баку забрэша сабака — у той бок дзяўчына і выйдзе замуж.

Кідаюць яшчэ лапаць ці чаравік з нагі: у які бок лапаць ці чаравік ляжа наском — там быць і замужам.

Цяпер патрэбна ўжо і паваражыць пра тое, ці багаты суджаны, ці ў пашане ён у аднавяскоўцаў, ці пакорлівы, ці будзе кахаць сваю жонку. Дзяўчына з блінам у руцэ, калоцячыся ад страху, бяжыць да лазні, прасоўвае руку ў вакенца і стараецца што-небудзь намацаць. Калі намацае што-небудзь касматае — выйдзе замуж за багатага. Калі ж пад руку пападзецца камень ці дрэва ці што-небудзь голае — усё жыццё

пакутаваць ёй за бедняком. Тыя дзяўчаты, якія баяцца ісці ноччу да лазні, уваходзяць у хлеў і, выставіўшы рукі ўперад, падыходзяць да каровы і ад яе чакаюць разгадкі сваіх задум: калі рукі перш за ўсё намацаюць рогі каровы ці галаву, то дзяўчына выйдзе замуж за добрага і паважанага чалавека; калі сярэдзіну — за пасрэднага; калі абмацае зад — за самага нізкага і беднага.

Застаецца ў дзяўчыны яшчэ адна неразгаданая задума: ці будзе памяркоўны яе муж, ці ён будзе сярдзіты, ці можна яго будзе ўзяць у свае рукі, ці самой прыйдзецца схіляць перад ім галаву. Каб даведацца пра ўсё гэта, патрэбна толькі збегаць да студні ці да ракі і апусціць у ваду камень. Калі камень пойдзе на дно з шумам — няма ніякай надзеі на ўзаемную сямейную любоў і згоду; калі камень пойдзе на дно ціха — няма сумнення, што суджаны пакорлівы і не любіць сваркі. З той жа мэтай выпускаюць курэй з-пад печы і прыкмячаюць, як тыя выходзяць адтуль: ціха ці з крыкам.

Вось яшчэ больш цікавы спосаб варажыць пра характар суджанага. Дзяўчына напярэдадні Новага года апоўначы ідзе ў куратнік, бярэ там пеўня і курыцу і прыносіць у хату, якая ў гэты час павінна быць добра асветлена. Раптоўна патрывожаная і непрывычная да штучнага святла курыная пара спачатку знаходзіцца ў незвычайным перапалоху, але памалу пачынае супакойвацца, і адно з іх, заўважыўшы пасыпаныя на падлогу зярняты, крыкам дае знаць аб гэтым сваёй пары. Вось тут і рашаецца загадка ўсяго яе (дзяўчыны) жыцця. Калі першым пачне кляваць певень, тады бывай салодкая надзея мець у будучым мужа ласкавага і ўважлівага. Калі ж першай пачне кляваць зерне курыца — суджаны будзе чалавекам добрым, несварлівым, старанным гаспадаром, не п’яніца, ва ўсім будзе слухацца сваёй жонкі, без яе ведама і згоды нічога не будзе рабіць.

Залішне, думаецца, успамінаць тут іншыя спосабы святочнай варажбы, вядомыя на ўсёй тэрыторыі Расіі: аб растопленым волаве і воску, яечным бялку, пра таямнічае люстэрка і падблюдныя песні.

## ШЧАДРЭЦ

Гэта адна са святочных вясковых забаў у Магілёўскай губерні. Дарэмна Шчадраца лічаць нейкім язычніцкім богам і думаюць, што гэта імя ў славян-язычнікаў азначала бога балявання̆ў. Вядома, што слова «шчадрэц» мае корань у пры-

метніка «шчодры», адгэтуль «шчадраваць», г. зн. даваць і атрымоўваць шчодрыя падарункі. Шчадрэц — той, хто дае ці збірае падарункі; таксама можа азначаць і той вечар, у які збіраюцца падарункі, што звычайна бывае напярэдадні 1 студзеня. Дык вось, напярэдадні 1 студзеня збіраецца вялікі гурт хлопцаў, вядомы пад назвай «шчадраванцы», «шчадруючыя госці».

Між імі ёсць свае важатыя, прыпявалы, запявалы, забіралы і музыкі. Але галоўную ролю выконвае той, каго прыбіраюць Шчадрацом, а пасля яго другі хлопец, апрануты ў адзенне казы ці якой-небудзь іншай жывёлы — каня, мядзведзя, жураўля і інш. Шчадрацом выбіраюць звычайна дзецюка высокага росту, мажнага і адзяваюць яго па-рознаму. Калі ён хоча мець выгляд старога дзеда, то ён апранаецца ў адзенне, абвешанае рознымі званочкамі, каляровымі рызманамі і доўгімі кудламі ўсялякага роду. На галаву надзяваюць яму шапку з бліскучай паперы, на твары — маска. Выгляд агідны, з чырвонымі шчокамі і носам. З-пад шапкі рассыпаюцца ці, лепей, распускаюцца доўгія валасы з пянькі ці лёну, а на спіну пад верхняе адзенне падкладваюць розны хлам, каб зрабіць горб. Калі ж ён прадстаўляе сабою жаўнера, то падрыхтоўваюць для яго адпаведнае таму адзенне. Прыбраўшы Шчадраца і таго, з кім ён павінен паказваць свае штукі, гэты стракаты карагод з набліжэннем вечара ў суправаджэнні музыкантаў і спеваў прыпявалаў і запявалаў ходзяць па вуліцах, прыпыняючыся каля кожнай хаты. Для захавання цырыманіяльнага парадку важаты адпраўляецца да гаспадара дома спытаць дазволу пашчадраваць у яго, а карагод між тым спявае пад акном:

Шчодры вечар
Добрым людзям!
Ці дома, дома
Сам пан гаспадар?
Сядзіць жа ён
Да й на куцячку,
Дзяржыць жа ён
Тры піражочкі, (2)
Тры сальца кусочкі.
Дай жа нам, дзядзечка,
Хоць піражочак, (2)
Хоць сальца кусочак.

Скарэй дарыце
Да не барыце.
Кароткі світкі,
Памерзлі лыткі,
Добры вечар!

Атрымаўшы дазвол у гаспадара пашчадраваць, важаты ў суправаджэнні ўсяго карагода ўваходзіць у хату і расстаўляе прыбраных у дзвярах так, каб можна было разглядзець усіх па аднаму. Пасля пачынае грымець музыка. З пачаткам музыкі Шчадрэц з «казою» ці з другім хлопцам, пераадзетым у якую-небудзь іншую жывёлу (каня, мядзведзя, жураўля і інш.), выходзяць на сярэдзіну хаты, раскланьваюцца на ўсе чатыры бакі і пачынаюць танцаваць. Калі Шчадрэц танцуе з «казою», то хор спявае наступную песню:

Го-го-го, каза,
Го-го, серая!
Наша козанька —
Дай залатая!
Ну-ткі, козанька,
  Павярнісят-ка
Па новаму дому,
Па гаспадарскаму.
Расхадзісят-ка!
Го-го-го, каза,
Го-го, серая!
Козынька, каза,
Каза добрая,
Бо дзе каза ходзіць,
Там жыта родзіць
І расцець карысць.
Го-го-го, каза,
Го-го, серая!
Махні-тка хвастом,
Зародзіць жыта
Вялікім кустом
Пану нашаму,
Расхазяіну.
Го-го-го, каза,
Го-го, серая!
Козанька, каза,
Каза добрая,
Бо дзе каза рогам,
Там жыта стогам,
Дзе каза нагой,
Там жыта капой.
Го-го-го, каза,
Го-го, серая!
Не хадзі, каза,
Пад тое сяльцо,
Пад Прылінаўку:
Там стральцы-байцы,
Добры малайцы.
Го-го-го, каза,
Го-го, серая!
Радзяць яны раду,
Раду худую:

Козаньку забіць,
Боцікі пашыць.
Го-го-го, каза,
Го-го, серая!
Бо былі б з цябе,
З добрае казы,
Боты, халявы,
З боку дзіравы.
Го-го-го, каза,
Го-го, серая!
Нут-ка жа, каза,
Ты расхадзіся,
Развесяліся,
Пану добраму
Ты пакланіся.
Гаспадар ідзе,
Каўбасу нясе.
Сем кускоў сала,
Штоб каза ўстала,
Паўмеркі жыта,
Штоб каза была сыта,
Паўмеркі аўса,
Штоб каза расла.

Пры выкананні апошняга куплета «каза» кладзецца на падлогу, а ў канцы спеваў устае.

Калі ж Шчадрэц замест «казы» выходзіць на сцэну з «мядзведзем» ці з іншай якой-небудзь жывёлай, то яму прапаноўваюць розныя жартоўныя пытанні, на якія ён адказвае падобнымі жартамі і трапнымі выразамі.

Пасля заканчэння ўсіх гэтых забаўных сцэн Шчадрэц з таварышам ізноў раскланьваюцца на ўсе чатыры бакі і ў хаце ўсе змаўкаюць. Пачынаюцца частаванні. Гаспадары частуюць са сваіх рук Шчадраца і шчадраванцаў рознымі напіткамі і ежай хатняга гатавання. І ў карагодзе раздаецца вясёлашумная размова, рогат і воклічы. Калі ж справа часам даходзіць да бойкі, то расправу робіць сам пан Шчадрэц.

У заключэнне гаспадары абдорваюць шчадруючых гасцей блінцамі, каўбасамі (сырымі), салам, сырам і інш. Усё гэта кладзецца ў торбы-выбіралы. Затым карагод накіроўваецца ў новую дарогу.

## КАЛЯДА

Многія вучоныя Каляду лічаць язычніцкім бажаством старажытных славян. Каб даказаць беспадстаўнасць гэтай думкі, прыходзілася звяртацца да манументальнага сачынення на лацінскай мове.

Каляда — гэта хаджэнне з песнямі па хатах на зімовыя святы 1 студзеня. Польскае «kolęda», чэшскае «koleda» — падарунак на Каляды і на Новы год. Каляда — гэта міласць (літасць).

Пайшла Каляда калядуючы,
А за ёю хлопчыкі жабруючы.
Пайшла Каляда па ляду,
Рассыпала каляду.
А вы, дзевачкі, не гуляйце,
Да ідзіце каляду пабірайце.

## СУСТРЭЧА НОВАГА ГОДА Ў ГОМЕЛЬСКІМ ПАВЕЦЕ МАГІЛЁЎСКАЙ ГУБЕРНІ

Напярэдадні Новага года, яшчэ да звону на ютрань, гурты сялянскіх дзяцей, так званых шчадраваннікаў, бегаюць пад вокны сялянскіх хат і віншуюць гаспадароў такімі песнямі, якія перадаваліся з пакалення ў пакаленне:

Шчэдрык Петрык, дай варэнік,
Нямнога кашкі, наверх каўбаскі!
Нуце, дарыце, нас не барыце!
Кароткі світкі, памёрзлі лыткі!
Бацька сварыўся, каб не барыўся,
Маці казала, каб кусок сала,
Добры вечар!

Выслухаўшы шчадраванае прывітанне, гаспадары падаюць у акно па колькасці шчадравальшчыкаў некалькі бліноў разам з салам, якія ў кожнай сялянскай хаце рыхтуюць наўмысна для гэтага.

Яшчэ больш цікавую з'яву ўяўляе пры сустрэчы Новага года звычай дарослых, які адгукаецца глыбокай даўнінай. Некалькі рослых і лоўкіх у беганні і танцах сялян апранаюць такое адзенне, каб мець выгляд казла, мядзведзя або каня, папярэдне навучыўшыся разыгрываць ролю кожнай з гэтых жывёлін. Другія, таксама падрыхтаваўшыся, бяруць на сябе ролю праважатых. З сялян-паляўнічых арганізоўваюцца хары спевакоў і музыкантаў, пад такт якіх пераапранутыя выяўляюць свой талент у беганні і танцах, прычым праважатыя разам з пеўчымі спяваюць:

Го-го-го, каза,
Го-го-го, серая,
Го-го, белая,
Дзе каза хвастом,
Там жыта кустом,
Дзе каза рогам,
Там жыта стогам.

## КАЛЯДНЫЯ СВЯТЫ Ў СЯЛЯН МАЗЫРСКАГА ПАВЕТА

Калядныя святы — самыя вясёлыя святы для сялян: кожны з іх (сялян) болей ці меней мае ў запасе хлеб і іншыя харчовыя прыпасы. Розныя работы ўжо закончаны, і селянін цешыцца спакоем, выязджаючы толькі часам на луг па сена ці ў лес па дровы. Астатні час праводзіць седзячы, ці ляжыць цэлымі гадзінамі на палацях, ці балакае ў карчме пра розныя розначсці. Такім чынам, час з 25 снежня па 6 студзеня сяляне стараюцца правесці як мага весялей. Увесь час зусім нічога не робяць. З далёкіх нават вёсак прыходзяць у госці, цэлыя ночы танцуюць у хатах вясковых скрыпачоў, а песні і вясёлая гамонка бываюць чутны на вуліцы далёка за поўнач.

Пярэдадзень Новага года завецца багатай куццёй. Тады ж ходзяць па сяле маладыя мужчыны і спяваюць песні болей вясёлага зместу. Спяваюць іх таксама пад вокнамі ў шаноўных людзей, а пасля заходзяць да іх у хату.

Пад акном хаты гаспадара-пчаляра спяваюць:

Добры вечар, пане гаспадару!
Калі ты спіш, гасподзь з табою,
А калі не спіш, гавары са мною.
Уздзень ты шубку, выйдзі на вулку,
Паслухай таго, што ў хмары гудзе,
Прачыстая ідзе, райкі вядзе,
Райкі вядзе дай навучае:
Сядайце, пчолкі, пану Івану
Па завулейку, па заборцейку,
Нясіце мяды ўсё салодкія,
Мяды сыціці, сына жаніці,
Свечкі сукаці, дочкі аддаваці.
А за тым словам да жыві з богам,
Не сам з сабою, з дзеткамі, жаною,
З усімі намі, каляднічкамі.

Дзе ёсць малады хлопец (жаніх), то пад акном той хаты спяваюць:

У чыстым полі — стада коней,
Ой, у тым стадзе не імушчы конь,
Не імушчы, не лавушчы конь,
Ніхто таго каня не спаймае, не асядлае.
Абабраўся красны, харошы, малады Іванька.
Дай яму, божа, шчасця, здароўя ў яго даму.
Ён таго каня і спаймае і асядлае,

І паедзе ён у чужую зямлю,
У чужую зямлю да па каралеўну.
Дай яму, божа, шчасця, здароўя ў яго даму.
Сустрэў жа ён тры мяшчанкі,
Тры мяшчанкі, тры Ульянкі.
Ён перад імі не скланіўся,
Не скланіўся, не змірыўся,
Шапачкі не зняў, ручанькі не даў.
Дай яму, божа, шчасця, здароўя ў яго даму.
Ой, сустрэў жа ён красну, харошу, маладую панну.
Ён перад ёю і скланіўся і змірыўся,
І шапачку зняў і ручаньку падаў.
Дай яму, божа, шчасця, здароўя ў яго даму.

Прыйшоўшы да мясцовага свяшчэнніка, валаснога старшыні, пісара і іншых службовых людзей, спяваюць:

У нашага пана двор гараджоны,
Двор гараджоны, явар саджоны.
На том явары сіў сокал сядзіць,
Сіў сокал сядзіць, на мора глядзіць.
Ён дзіва бачыць — караблі плывуць,
На тых караблях па сто малайцоў,
Тыя ж малайцы дорага плацяць,
Дорага плацяць па сто чырвонцаў,
Па яснай ветцы, па краснай дзеўцы.
Купім жа, братцы, залаты чоўнік,
Залаты чоўнік, срэбна вясельца.
Спусцім, братцы, да таго пана Івана,
Дай яму, божа, шчасця, здароўя ў яго даму.

Дзе ёсць маладая дзяўчына, ці «княгіня», спяваюць адпаведныя песні, і кожны гаспадар выносіць ім каўбасу, пірог, хлеба кавалак, сала ці што-небудзь іншае, якое яны дзеляць паміж сабою. Усе гэтыя песні выконваюцца найбольш пад скрыпку.

Разам са спяваючымі, ці «каляднікамі», ходзяць абавязкова двое мужчын, пераапранутыя: адзін — казой, другі — дзедам, з саламяным гарбом на спіне, прычым спяваюць і танцуюць з рознымі смешнымі крыўляннямі.

Уласна да хатніх звычаяў сялян адносяцца тры куцці, якія адбываюцца напярэдадні Каляд, Новага года і Вадохрышча. Першая і апошняя куцці называюцца галоднымі, гатуюцца з грыбамі і г. д., але галоўнае месца займае куцця — каша з тоўчанага ячменю.

Самая багатая вячэра гатуецца напярэдадні Новага года: тады куцця гатуецца з салам, смажацца скваркі, калі ёсць, то і каўбаса і шмат іншага.

У час вячэры гаспадар высоўвае ў акно галаву і заве мароза вячэраць наступнымі словамі: «Мароз, мароз! Хадзі куццяваць, а як прыйдзеш на лета, будзем пужкай сцябаць». Гэтым запрашэннем выражаецца задавальненне селяніна, якое ён адчувае, сытна павячэраўшы і ведаючы, што заўтра і наступныя дні — святы, значыць, будзе часу дастаткова для яго невялікай весялосці.

## [КОЛЯДЫ]

Пад назваю «Коляды» ў нас разумеюць усе дні з 25 снежня да 7 студзеня, прычым у апошні дзень «толькі да абеду Каляда». Дзень напярэдадні Каляд называецца куццёй. Назву гэту ён атрымаў ад стравы, якую абавязкова гатуюць у гэты дзень і падаюць на стол. На куццю гатуюць і многа іншых страў, але самая галоўная з іх — куцця. Яе гатуюць з раніцы. Як толькі сонца зойдзе, уся сям'я адзяваецца па-святочнаму, стол засцілаюць белым абрусам, і потым ставіцца на сена на покуці куцця, якая застаецца там да вячэры. А калі сядуць вячэраць, дык стол засцілаюць сенам і ядуць спачатку іншыя стравы, а куццю пад канец. Акрамя гэтай куцці адзначаюць яшчэ дзве іншыя: адну напярэдадні Новага года, якую называюць багатай (у іншых месцах — тоўстай), а другую напярэдадні Вадохрышча — яе называюць галоднай (або поснай). Апошнія дзве куцці адзначаюць з такой жа абраднасцю, як і першую, з той толькі розніцай, што на багатую гатуюць мясныя стравы і запрашаюць мароза «куццю есці», а на галодную ўсе стравы гатуюцца посныя і не ў такой колькасці і, акрамя таго, «Каляду запісваюць». На багатую куццю, калі сама куцця ўжо стаіць на стале, гаспадар, калі адчыняецца акно, адчыняе яго і кліча:

— Мароз, мароз, ідзі куццю есці! Улетку не бывай, а ў зіму прабывай, бо мы будзем цябе біці жалезнымі пугамі!

Гэта паўтарае ён тры разы.

А «запісваюць Каляду» на галодную куццю гэтак. Бяруць перад вячэрай кавалак крэйды і пішуць ёю крыжык на гаршку з куццёй і на хлебе, якім яна накрыта. Потым бяруць куццю, хлеб, крапіла з каласоў жыта, крыжык, зроблены з дрэва, і свянцоную ваду. Апошняй акрапляюць дом і ўсе будынкі каля яго, а крэйдай пішуць тры крыжы на верхнім і бакавых дзвярных і аконных вушаках і па аднаму на дзвярах, варотах і на кожнай сцяне, а ў хаце — таксама на дзвярах. Акрамя крыжа, крэсляць чалавека на белым кані і дрэвы, а некаторыя крэсляць яшчэ гусей, качак, кароў і інш. Крыжык і крапіла

ўтыкаюць потым у зямлю ля варот гумна. Крыжы пішуць таму, што яны праганяюць «нячыстую сілу», засцерагаюць ад чараў і перадаюць здароўе таму, хто там жыве, дзе ўсё гэта накрэслена. Чалавек на кані азначае каляду, якая павінна ехаць далей.

Калі гатуюць куццю, то кожны раз насыпаюць у гаршчок аднолькава і па тым, як варыцца, мяркуюць аб будучым ураджаі. Так, калі на першую куццю гаршчок з куццёй паўней, то лепшы ячмень будзе ранні, калі на другую, то лепшы ячмень будзе не зусім ранні, калі на трэцюю, то лепшы будзе позні ячмень. Звяртаюць увагу і на надвор'е ў гэты час: шэрань, іней і зоркавае неба прадказваюць ураджай грыбоў, грэчкі і раенне пчол; шэрань азначае грыбы, іней — грэчку, зоркавае неба — раі пчол.

Сена, якое было пад абрусам і на покуці пад куццёй, раніцай аддаюць свойскай жывёле. На багатую куццю замест сена на стол пад абрус кладуць жытнюю салому. Пасля вячэры, не ўстаючы з-за стала, гэту салому малоцяць кулакамі, г. зн. б'юць імі па настольніку, пад якім яна ляжыць, а потым выцягваюць з-пад яго ж па адной саломінцы, па даўжыні якой адгадваюць, які будзе лён гэтым летам. Потым салому сабіраюць і старанна вышукваюць у ёй зярняты, якія змешваюць з насенным запасам у надзеі, што гэта засцеражэ каласы ад галаўні, а па колькасці знойдзеных зярнят мяркуюць аб якасці будучага ўраджаю. Саломай гэтай абвязваюць ігрушы, яблыні і іншыя пладовыя дрэвы, упэўненыя, што садавіна ад гэтага будзе лепшай, саладзейшай і добра ўродзіць. Далей — у гэты самы дзень ходзяць у хлеў з куццёй глядзець, як ляжаць цельныя каровы, і па тым, як ляжаць, адгадваюць, у які час сутак яны будуць цяліцца. Так, напрыклад, калі карова ляжыць галавою на поўдзень, то гэта паказвае, што яна ацеліцца днём, калі на захад — ноччу, а на ўсход — раніцаю. Пасля вячэры не мыюць лыжак, а звязваюць іх шарсцяной ніткай і астаўляюць на стале; гэта для таго, каб авечкі не адбіваліся і прыходзілі ўсе з выгану дадому. Для таго каб куры несліся дома, а не дзе-небудзь на чужым двары, пасля вячэры робяць з чагонебудзь абруч, кладуць яго на зямлю і потым выкладваюць у яго круг астаткі ад вячэры — куццю. Хто-небудзь са сваіх выходзіць у гэты час з хаты на двор і кажа пад акном: «Добры вечар!» З хаты адказваюць: «Добрае здароўе!» Той, што пад акном, пытаецца: «А дзе вашы куры нясуцца?» З хаты адказваюць: «Пад печчу!» Паўтараецца гэты тры разы. Потым выпускаюць курэй, якія павінны падабраць (скляваць) куццю ў крузе.

Звязваюць або спутваюць ножкі стала, каб жывёла не пераскоквала праз платы і не таптала пасеваў, а таксама і для таго, каб не ўцякалі пчаліныя раі.

Дзяўчаты на багатую куццю варожаць пра свой лёс. Бяруць першы спечаны блін, вымятаюць хату, смецце кладуць на засланку і нясуць на сметнік. Там становяцца на засланку са смеццем, ядуць блін і ў гэты час прыслухоўваюцца, дзе брэшуць сабакі: з якога боку брэшуць, адтуль і жаніхі прыедуць.

Бяруць каноплі або проса, бягуць пад чыё-небудзь акно, там гэта высыпаюць і прыслухоўваюцца да размовы ў хаце. Калі пачуюць словы: «ступай», «хутка ідзі», «што засядзеўся», «чаму не йдзеш» і да т. п.,— да каго б яны ні адносіліся, то дзяўчына верыць, што яна ў надыходзячым годзе выйдзе замуж; калі данясуцца словы: «садзіся», «яшчэ рана», «пачакай трохі», «астанься» і да т. п., то гэта азначае, што дзяўчына замуж у гэтым годзе не выйдзе. А калі ж гаворка ідзе пра папа, свечку або пра дошкі, то гэта азначае, што дзяўчына або той, хто яе хоча сватаць у гэтым годзе, памруць.

Ходзяць у хлеў і ловяць у цемнаце авечак, прытым калі зловіць барана — выйдзе замуж, а калі авечку — не. Бяруць на сваім двары, колькі можна захапіць у ахапку, дровы, нясуць у хату і пералічваюць паленне; абхватваюць рукамі частакол і лічаць калы або насыпаюць куцці, даюць есці пеўню і лічаць зярняты, якія засталіся, пры гэтым калі іх цотны лік — выйдзе замуж, калі не цотны — не выйдзе.

Дзяўчаты збіраюцца ў адну хату, пякуць з мукі булачкі велічынёй з курынае яечка, кладуць іх у рад і клічуць сабаку: чыю булачку ён схопіць першую, тая першая выйдзе замуж. Бяруць першую лыжку куцці ў час вячэры, але так, каб ніхто гэтага не заўважыў, і кладуць пад галаву сабе на ноч, спадзеючыся, што ноччу абавязкова прысніцца жаніх; калі сасніцца што-небудзь накшталт свечкі, дошкі, дамавіны, то або яна, або ён павінны памерці.

Багатая куцця называецца яшчэ «Шчадрэц», відаць, таму, што ў гэты вечар хлопцы і дзяўчаты ходзяць шчадраваць, г. зн. ходзяць пад вокны, па хатах спяваць песні з прыпевам: «Шчодры вечар». Шчадраваць ходзяць звычайна невялікімі групамі: ад двух да пяці чалавек. За праспяваную песню гаспадары даюць па аднаму або па два бліны на кожнага або па паляніцы (маленькая булачка з жытняй, ці грэцкай мукі, ці з простай пшаніцы), а хто багацей, то і сала кусок, а іншыя — і грошы.

Некаторыя хлопцы робяць звязду і ходзяць з ёй. Ходзяць таксама і з «казой». Тут ужо ёсць скрыпка і бубен. Каза, вядома,

не сапраўдная, галаву яе робяць з дрэва — з доўгімі рагамі, абшываюць латкамі са старога кажуха, прымацоўваюць палку. Потым выварочваюць вялікі кажух поўсцю наверх і ў адзін з рукавоў устаўляюць палку з «казой» і моцна завязваюць на «шыі». Адзін з найбольш спрытных хлопцаў, звычайна здатны танцор, носіць гэту «казу», а калі трэба спяваць, ён залазіць у кажух, рукамі бярэцца за палку і варочае «казінай» галавой.

Ходзяць у гэты вечар яшчэ адны спевакі, якія шчадруюць на царкву. Усё імі сабранае прадаюць і атрыманыя грошы аддаюць у царкву. Гэтыя, аднак, хозяць са званочкам і з дазволу прыходскага святара. Яны спяваюць тыя ж песні, што і шчадроўшчыкі, якія ходзяць са «звяздой», але ім за песню даюць больш.

Вечары ў час Каляд усе лічацца святымі. Як толькі зойдзе сонца, усе перастаюць працаваць. У гэтыя вечары хлопцы і дзеўкі ў сувязі з тым, што няма ніякай работы, збіраюцца на так званыя ігрышчы. Наймаюць музыкаў — у складзе скрыпкі і бубна, хлопцы закупляюць гарэлку, піва і квас, а дзяўчаты прыносяць прадукты і гатуюць вячэру. На ігрышчах п'юць, весяляцца і танцуюць. А калі ў які вечар няма музыкі, то слухаюць апавяданні, байкі і казкі старых; загадваюць загадкі, спяваюць шчадроўкі або і такія песні, якія можна спяваць у любы час, гуляюць і ў розныя гульні.

Днём жа на Каляды не робяць той работы, якую звычайна робяць у любы іншы час. Так, нельга прасці, віць вяроўкі і ніткі, намотваць іх у клубок, круціць дзіркі, скручваць штонебудзь, звязваць, гнуць, плесці лапці або што-небудзь іншае, шыць, малаціць, калоць, шчапаць. І ўсё гэта таму, што такія работы маюць (паводле сялянскіх уяўленняў) шкодны ўплыў на прыплод дамашняй жывёлы: усё будзе нараджацца з крывымі нагамі, або сляпымі, або і яшчэ з якімі заганамі. Не вараць нічога, не кінуўшы папярэдне ў гаршчок косткі, хоць голай, дзеля таго, каб не радзілася што-небудзь без касцей.

Не пякуць на Каляды хлеба да Шчадраца і бліноў, каб не пякла печая (пякотка). Стараюцца, каб на першы дзень Каляд не прыйшла першай дзяўчына, таму што будуць сякеры ламацца. На Новы год стараюцца не піць вады, каб і летам не хацелася піць. Стараюцца на Каляды не разбіваць чаго-небудзь з посуду, каб наогул посуд не біўся ўвесь год. Смецце не выкідваюць на сметнік, а складваюць у жлукту, адкуль пасля Каляд выбіраюць і выносяць на балота, каб не было пустазелля ў полі.

Калі ж хто па неабходнасці або незнарок парушыць што-

небудзь з прыведзеных вышэй звычаяў, устаноўленых даўніною, то, каб не шкодзіла, не здарылася чаго, на наступную раніцу рассякаюць у плятні перавясла, прыгаворваючы: «Што секлася — рассячыся, што вязалася — развяжыся, што шылася — расшыйся» і г. д., а на галодную куццю ўстаюць да сонца, рассякаюць дзяркач на дробныя часткі і кідаюць каля будынкаў, дзе больш за ўсё свінні бегаюць.

## АБРАДНАСЦЬ КУЦЦІ

На першую куццю жонцы з ранку трэба прыбраць хату ды пахаваць усе верацёны, каб, барані божа, нідзе не відно было ніводнага ў час свята, бо яно летам скінецца верацяніцаю і, як пойдзеш у лес, палохаць будзе. Дзяўчаты павінны прыбраць свае прасніцы, каб Каляда не зрабіла ім пакасці ў кудзелі. А калі ўжо затопіш печ, то куццю сып у гаршчок як можна мерна ды прыглядайся, каторая куцця вырасце лепш: ці першая, ці другая, ці трэцяя. Тады трэба так і ячмень сеяць, каторая куцця лепш вырасце, значыць, той і ячмень будзе лепшы: ці першы, ці сярэдні, ці апошні. За сенам пасылаюць таго хлопца, які заўсёды валы пасе. Калі ён і згубіць валы палету, то шукаць іх не трэба, самі прыйдуць, таму што ён прынёс сена на куццю. Калі ж хочаш, каб у цябе рана квахталі куры, то прывяжы белы фартух, вазьмі ім з печы гаршчок з куццёю і, несучы на покуць, квахчы, як курыца, дзевяць раз «кво, кво, кво...» ды старайся, каб схапіць каго-небудзь за чуб: тады ў цябе будуць чубатыя кураняты. Сухую корку куцці збяры ў чарапок і захавай. Звараную куццю пастаў на сене і закрый хлебам...

Як прыйдзе вечар і запаляць агонь у хаце, а сям'я збярэцца вячэраць, адскубні палавіну сена, дзе стаіць куцця, і пасцялі на стол, пасля накрый белым абрусам. Гаспадар павінен прынесці пляшку гарэлкі і паставіць на стол. Потым гаспадару трэба ўзяць куццю з гаршком і абысці тройчы хату, затым пастукаць у акно, а жонка з хаты павінна спытаць: «Хто там стукае?» Гаспадар адкажа: «Сам бог стукае з цёплай, мокрай вясною, з гарачым небурлівым летам, з сухой і багатай восенню». А жонка павінна сказаць: «Просім да хаты».

На вячэру трэба, каб быў квас добры з грыбамі, а то і з рыбай, блінцы з макам і з мёдам, гарох з сытою ды ўзвар добры, як на радзіны, і куцця. Як садзяцца за стол, то гаспадар першым садзіцца на покуці (пад абразамі), а жонка насупраць яго на ўслоне, бо ёй трэба ўставаць, ставіць міскі на стол. Як

пачнуць піць гарэлку, то гаспадар, наліўшы першую чарку, павінен сказаць: «Дай жа, божа, за год даждаць Каляд у добрай радасці і карысці...». На апошнюю страву, куццю, гаспадар, зачэрпнуўшы першую лыжку, павінен пазваць мароза: «Мароз, мароз, хадзі куццю есці! Каб ты не марозіў ячменю, пшаніцы, гароху, сачавіцы, проса і грэчкі і ўсяго, што мне трэба пасеяць». А гаспадыня, набраўшы ў лыжку куцці, павінна падысці да таго акна, што насупраць печы, пастукаць і сказаць: «Мароз, мароз, хадзі куццю есці, каб не марозіў расады, агуркоў, гарбузоў, морквы і буракоў і ўсяго таго, што мне трэба пасадзіць і пасеяць». Дзеўкі павінны выцягваць сяннінкі з-пад абруса і мераць: чыя будзе даўжэйшая, у той і лён будзе лепшы. А як павячэраюць, то ўсе павінны адысці ад стала. Гаспадар, тройчы перахрысціўшыся, павінен сесці на покуці, а жонка насупраць яго і запытаць:

— Чы бачыш ты мяне?

А ён павінен сказаць:

— Не бачу!

— Каб жа ты не бачыў за стагамі, за капамі, за вазамі, за снапамі свету.

Тады гаспадар пытае ў жонкі:

— Баба! Чы бачыш ты мяне?

— Не бачу!

— Каб жа ты не бачыла за агуркамі, за гарбузамі, за капустай, за буракамі свету.

Затым жонка брала качаргу і штурхала гаспадара. А ён хутка падаў на лаўку і гаварыў:

— Дай, божа, каб твае снапы так хутка падалі на ніве!

Пасля клаліся спаць. Дзеўкі варажылі пра жаніхоў. Сена з покуці не прымалі. Яно ляжала аж да апошняй куцці. На другую куццю зноў здымалі вяршок з ячменнай кашы і захоўвалі ў тым жа самым чарапку. Пяклі блінцы, якія давалі шчадроўнікам.

На галодную куццю зноў клікалі мароза. Гэты дзень трэба было пасціць да зары дай напісаць крыжы на ўсіх дзвярах, вокнах і варотах дзеля таго, каб не ўвайшоў чорт у двор... і каб сваркі не ўнёс у хату, каб сям'я жыла лагодна, а ў хлявах каб дамавік скаціны не чапаў. Можа чула, што дамавік ездзіць на конях і на валах, дай так замучыць, што і рукамі не гожа дакрануцца да іх, а ў гумнах і свірнах, каб чорт нічога не хаваў, а то ён на пакасць як схавае што-небудзь, то хоць і перад вачыма, ды не знойдзеш,— а як будуць крыжы напісаны, то ён пакасці рабіць не пасмее. Пасля крапілі куткі святой вадой у хаце, бо так рабілі нашы бацькі, то і мы так будзем рабіць.

На Вадохрышча хадзілі ў царкву ды стараліся як можна хутчэй вярнуцца дадому. Тады ты першая і з поля збярэш. Не забудзь унесці ў хату на Вадохрышча рана абручыка, пасыпаць куццю, што збірала ў чарапок, няхай куры яе паклююць, то не будуць губляць яек па чужых харомах, а будуць несціся ў сваім двары. І сена тое, на якім праз усе гэтыя Каляды стаяла куцця, аддаць па крошцы ўсякай скаціне, бо гэтае сена, не раўняючы, для яе так, як ля нас праскурка.

## КУЦЦЯ

Першая зорка загарэлася. На ўскраіне Піншчыны ў маленькай хаціне лесніка старэнькая сівая жанчына паслала на стол сена, апусціла рукі і ў задуменні прыціхла: дзве буйныя слязіны пакаціліся па яе зморшчаным твары. Ляснік, які нерухома сядзеў у канцы стала на лаве, падняўся і, крутнуўшы галавой, сказаў:

— Хіба гэтым дапаможаш?

— Я нічога, толькі падумала сабе, можа ў нашага Яна няма і такога сена пад галаву... больш нічога і не падумала!

— А можа і ёсць, на ўсё божая воля.

Скрыпнулі дзверы, увайшла маладая дзяўчына.

— А божачка,— сказала,— якія ж гэта сёння разумныя вочы ў авечак. Як увайшла ў хляўчук, і старыя і малыя падбеглі да мяне і так глядзяць, так разумна глядзяць!

— А што тут дзіўнага,— сказаў ляснік,— кожная жывёліна з узыходам першай зоркі ведае, што гэта дзень не звычайны, у поўнач усё жывое становіцца разумным і лагодным. У гэты час усялякае стварэнне валодае чалавечаю моваю...

Каля акна пачуўся стук; праз хвіліну дзверы адчыніліся і ўвайшоў жабрак.

— Спяшаўся да жылля,— сказаў ён.— Зорка ўжо даўно свеціць.

Дзяўчына кінулася дапамагаць яму зняць торбы, распрануцца. Гаспадыня радасна ўсклікнула:

— Якое шчасце для нас!

— Праходзіў каля двара пана Горуня перад самым заходам сонца,— працягваў жабрак,— але думаю сабе: не зайду... цяпер не гэтак, як раней, можа і не прымуць.

— Як можна! — усклікнуў гаспадар.— Кожная жывёліна разумее цяпер чалавечы голас, як жа б чалавек чалавека не зразумеў.

Гаспадыня накрыла стол абрусам. Жабрака пасадзілі на ганаровым месцы, з левага боку ад яго сеў гаспадар, з правага — гаспадыня. Дзяўчына дастала з шуфляды каляду, падала яе жабраку, засяшалася да печы па вячэру. Жабрак перахрысціўся і разламаў хлеб. Пачалася вячэра ў гонар той вялікай таямніцы, дзякуючы якой жывёла разумее чалавечую мову, а жабрак без прытулку становіцца гаспадаром у чужым доме.

## КАЛЯДНЫЯ СВЯТЫ Ў БЕЛАРУСАЎ ВІЛЕНСКАЙ ГУБЕРНІ

Увесь хрысціянскі свет урачыста праводзіць свята Каляд, звязваючы з ім шмат рознага роду забаў і ўвесяленняў. Але, унікаючы ў святочныя звычаі і абрады, асабліва сярод простага люду, прыходзіцца далучацца да таго заключэння, што ў гэтых народных звычаях і абрадах яшчэ шмат засталося ад старажытнага язычніцтва.

Калядныя святы вядомы ў нашага народа пад назвай зімовага свята, але часцей за ўсё пад назвай Каляд. Першая назва, відаць, дадзена гэтаму святу таму, што яно супадае з сярэдзінай зімы, у назве ж «Каляды» гучыць водгалас самай глыбокай старажытнасці. Каляда ёсць свята агульнаславянскае, і святкавалася яно ва ўсіх старажытных славян у гонар сонца. Бачачы ў сонцы крыніцу самых неабходных умоў быту — цяпла і святла, старажытны славянін стаў пакланяцца яму і ўводзіць у гонар яго святкаванні (урачыстасці), а так як у канцы снежня месяца дзень павялічваецца, то ён і ўстанавіў дату 25-га дня гэтага месяца свята ў гонар сонца і святла. Хрысціянства звязала з гэтым днём дзень так званага нараджэння Хрыста, і, такім чынам, старажытнае язычніцкае свята асвяцілася хрысціянствам, захаваўшы, аднак, у неасвечаным народзе яшчэ і да гэтага часу (маецца на ўвазе час, у які рабілася апісанне гэтага свята) свае старыя язычніцкія абрады і звычаі. Слова «коляды» ці «каляды» ёсць змененае лацінскае слова «calendae». Старажытныя рымляне называлі гэтай назвай першае чысло кожнага новага месяца... Пазней слова «calendae» было прымеркавана выключна да студзеньскіх Каляд. Затым, у часы сярэдневякоўя, гэтай назвай сталі называць святочныя забавы і ўвеся-

ленні гэтай пары года. Да нас слова «calendae» перайшло з Візантыі і, паводле гукавых законаў славянскай мовы, змянілася ў «каляду»...

Напярэдадні свята Каляд, на куццю, беларус наладжвае вечарам куццю пасля з'яўлення зорак на небе. Увесь дзень гэты праводзіцца ў посце. Куцця ў сэнсе ежы ўяўляе сабой разнастайную посную вячэру. Стол для вячэры ставіцца абавязкова на покуці хаты. На яго спачатку кладуць сена і накрываюць затым белым абрусам. Калі ўся сям'я ўсядзецца за стол, гаспадыня падае па парадку прыгатаваныя стравы. Для прыкладу можна ўказаць (назваць) склад абавязковых для куцці страў: селядзец, посная верашчака, аладкі на алеі, суп з крупамі (крупнік), аўсяны кісель, вараны гарох у сухім выглядзе і, нарэшце, куцця з сытою... Гарох ніколі ўвесь не з'ядаецца, частка яго застаецца, і ім гаспадар абсыпае вулей з пчоламі і сад (зразумела, калі такое ёсць у гаспадарцы). Робіцца гэта для таго, каб надыходзячы Новы год быў ураджайным на садавіну і на пчол. Акрамя таго, у гэты вечар гаспадар абвязвае кожнае садовае дрэва саломай, якая ахоўвае дрэвы ад пашкоджання. Сена, якое знаходзіцца на стале пад абрусам, застаецца на стале да наступнай раніцы, г. зн. да таго часу, калі пачынаюць глядзець, якіх зярнят болей за ўсё засталося на стале пад сенам. Гэтым самым так варажылі аб ураджаі ці неўраджаі ў будучым годзе. Выцягваюць таксама з-пад абруса сянніну і па яе даўжыні мяркуюць аб даўжыні льну ў новым гаспадарчым годзе. Само ж сена гаспадар патроху аддае жывёле як ахоўваючы сродак ад хвароб, а галоўнае — у засцярогу жывёлы ад шкоднага ўплыву ведзьмаў. На працягу калядных святкаванняў беларус наладжвае куццю тры разы: перад пачаткам Каляд, перад Вадохрышчам (галодная, або посная, куцця) і перад Новым годам (шчодрая, ці шчадруха, таму што ў гэты дзень гатуецца разнастайная багатая скаромная вячэра). Сама куцця як ежа прыпраўлена ўжо не сытою мядовай, а салам...

Каляды святкуюцца беларусамі ў суправаджэнні разнастайных забаў і ўвесяленняў. У ліку гэтых забаў першае месца займае калядаванне. Збіраюцца хлопцы, дзяўчаты, а часам і людзі пажылыя, ствараюць цэлы гурт і ідуць калядаваць. Прыходзяць пад вокны заможных людзей і спяваюць песні, болей прымеркаваныя да падзеі названага свята, за што атрымліваюць розныя падарункі, часам і грашыма, якія ідуць пасля на наладжванне гулянак. Такім чынам, каляднікі вельмі нагадваюць сабою валачобнікаў. Рэпертуар калядных песень, таксама як і валачобных, вельмі разнастайны.

I

Пайшла Каляда калядуючы,
За ёю дзеўкі да жабруючы.
Адна просіць, другая носіць,
Пакінь прасіць, цяжка насіць.
Перайшла сяльцо — дастала яйцо,
Перайшла другое — згубіла і тое,
Перайшла трэцяе — згінула сама,
Вот і Каляда.

II

Да месяцу ясны. Каляда!*
Выйдзі, выйдзі
Да ні рана,
Пастой, пастой
Да ні мала,
Пакуль мая дзяўчына
Русу касу расчэша,
Падарачкі пакроіць,
Дзевяроў абдорыць,
Дзевяроў і залавіцы,
Мае родная сястрыцы.

III

Шчадрую, шчадрую,
Кілбасу чую.
Святы вечар!
Дайце кілбасу,
Я дадому занясу.
Святы вечар!
Дайце мне грошай,
Падзякую большай (болей).
Святы вечар!
Дайце крывянку,
Панясу Янку.
Святы вечар!

Каляднікі ходзяць большай часткай вечарам на свята Каляд (у некаторых, вельмі нямногіх месцах — напярэдадні).

Другой забавай, праўда, рэдкай у Віленскай губерні, служыць батлейка, якая прадстаўляе сабою невялікіх памераў лялечны тэатр. Акрамя таго, у калядныя святы нашы прасталюдзіны забаўляліся яшчэ і чымсьці такім, што напамінала маскарадныя прадстаўленні. Звычайна для гэтай мэты вываpочваюць кажух, затым пад кажух залазіць адзін з найбольш здатных на танцы хлопцаў, які сваімі рухамі і голасам стараецца паказаць розных звяроў і жывёл...

* Прыпеў «Каляда!» паўтараецца ў канцы кожнага радка.

У некаторых месцах Віленскай губерні на калядныя святкаванні беларуская моладзь наладжвае так званыя вечарынкі, г. зн. збіраюцца вечарам да каго-небудзь з суседзяў у хату і забаўляюцца рознымі гульнямі. Прытым робіцца частаванне за кошт хлопцаў. У ліку гульняў першае месца ў калядныя святы займала гульня, вядомая ў народзе пад назвай «Яшчар». Гульня гэта заключаецца ў наступным: моладзь бярэцца за рукі і, стварыўшы круг, пачынае кружыцца з выкананнем песні. У сярэдзіне круга на стуле сядзіць выбраны хлопец, які і ёсць Яшчар, і пільна глядзіць, каб ніхто не засмяяўся, не ўпаў, не спатыкнуўся і да т. п. Калі хто-небудзь парушыць гэта правіла, той павінен даць Яшчару фант: пярсцёнак, хустку і інш. Пасля пачынаюць разыгрываць фанты. Бярэ хто-небудзь фант і перадае яго каму-небудзь з удзельнікаў так, каб тая асоба, якой належыць фант, не заўважыла, каму іменна перададзены ён, а затым уладальніку фанта прапаноўваецца адгадаць, у каго знаходзіцца яго фант.

Прывядзём некалькі песень, якія суправаджаюць гэту гульню.

I

Сядзіць, сядзіць Яшчар,
Гэй, нам, гэй *,
На залатым крэслі,
Гарэшачкі лушчыць
Да ў каробку сыпле.
Каробка няпоўна,
Паедзем да Коўна.
З Коўна да Бяліцы,
Купім чамярыцы
Яшчара паіці.
Чамярыца горка,
Як Любісева жонка.
Любі сабе панну,
Хоць і Ганульку,
За белую ручку,
За ядвабну хустку.

II

Яшчарочак, мой паночак,
Проша аддаць мой вяночак,
Мой вяночак — лямендравы,
Я страціла з сваёй галавы,
Я не знаю, дзе шукаці:

* Прыпеў паўтараецца пасля кожнага радка.

Ці ў матулі на прыполі,
Ці ў сястрыцы на касіцы,
Ці ў ойчанькі на галоўцы,
Ці ў брацеткі пры шапачцы.
Два сакалы ясненькія,
Дзве паненкі красненькія.

### III

У каго персцень найду,
Таго з лаўкі звяду.

Калі тыя, хто шукае фанты, не знойдуць адразу, то ім спяваюць:

Не ўгадала, панна (не ўгадаў, пан),
Не ўгадала, красна,
На чыёй руцэ
Залаты персцень,
Каляда!

Яшчэ гуляюць у «Падушачку». Гэта гульня заключаецца ў наступным. Моладзь стварае круг, бярэцца за рукі і пачынае кружыцца вакол хлопца (ці дзяўчыны), які павінен стаяць пасярэдзіне круга. Пры гэтым выконваюць наступную песню:

Падушачкі, падушачкі,
Да ўсе пухавыя,
Малодушкі, малодушкі,
Да ўсе маладыя.
Каго люблю, каго люблю,
Таго пацалую.
Таню * люблю, Таню люблю,
Яе пацалую.

Пасля гэтага асобе, якая стаіць у сярэдзіне круга, трэба пацалаваць таго, каго ўказана ў песні.

Аднак гэтымі забавамі нашы прасталюдзіны не былі задаволены. Самым галоўным месцам для іх забаў і весялосці служыла карчма... У карчме звычайна наладжваліся ігрышчы, у час якіх хлопцы і дзяўчаты пад гукі незмаўкаючай скрыпкі вытанцоўваюць свае нескладаныя танцы...

Усе дні ад 25 снежня і да 7 студзеня новага года беларусы лічаць святымі днямі. У гэтыя дні не ўсё можна было рабіць. Да забароненых работ адносіліся наступныя: шыццё, рэзанне,

* Імя дзяўчыны ці хлопца называлася ў залежнасці ад таго, гледзячы каму адрасавалася песня.

прадзіва і інш. Калі выконваць гэтыя работы ў святочныя дні, то, па павер'ю, у доме, дзе ёсць маладыя жанчыны, могуць нараджацца дзеці-калекі. У роўнай меры гэта адносілася і да гаспадаркі.

Акрамя таго, сяляне ў гэтыя дні вельмі асцерагаюцца пазычаць што-небудзь, кажучы, што скаціна цэлы год будзе цягацца па вёсцы.

Свята Каляд складала для нашага народа галоўную эру часалічэння. Святочныя і іншыя больш важныя дні лічацца звычайна так: такое-та свята прыйдзецца за столькі-та тыдняў да Каляд ці пасля іх; такі-та дзень прыйдзецца на такім-та тыдні да ці пасля Каляд. Свята Каляд мела вялікае значэнне для вясковых людзей, якія служылі ў пана. Гэта час, з якога яны пачыналі і якім канчалі сваю службу ў яго. У адной песні так і гаворыцца:

Тыдзень, тыдзень да Каляд,
Пан чэлядзі не рад.
Аддай, пане, кілбасу,
Бо я ў цябе да часу.
Аддай, пане, каляду,
Бо я ў цябе не буду.
Аддай, пане, акорак,
Бо ўжо твой хлеб агорак.

## МЯСЦОВЫЯ НАРОДНЫЯ ЗВЫЧАІ НА КАЛЯДНЫЯ СВЯТЫ

Свята Каляд — адно з тых свят, якіх увесь хрысціянскі свет чакае з асаблівай радасцю і стараецца сустрэць найболей урачыста. І горад і вёска, і стары і малы — усе рыхтуюцца сустрэць свята як мага лепш, але ў горадзе гэта не так прыкметна, як у вёсцы. У вёсцы падрыхтоўка да свята пачынаецца з першага ж тыдня посту. Кожную ноч з 2—3 гадзін апоўначы ўся вёска напаўняецца глухімі пераменлівымі ўдарамі, як бы падземным грукатам — гэта таўкуць куццю. Тыдні праз два стогны ступ сціхаюць, і ў тую ж пару пачынаецца роўны, аднастайны, які схіляе да сну, гоман жорнаў. Уся вёска робіцца падобнай да велізарнага вулля, у якім усё рухаецца, шуміць, трывожыцца, гудзе ў чаканні чагосьці вялікага, вельмі важнага. Але вось і гэта работа заканчваецца, і апошнія тыдні праходзяць у нарыхтаванні рыбы, грыбоў, маку; а ў апошнія дні мыюць, беляць, пякуць, вараць і г. д. На куццю, калі ўжо ўся работа закончана, кожная сям'я

пачынае мыцца. Затым, апрануўшыся па-святочнаму, усе дарослыя ідуць да вячэрні. Вярнуўшыся з царквы, прымаюцца за вячэру. Стол засцілаецца сенам і накрываецца белым абрусам. Пасля малітвы садзяцца за стол, п'юць спачатку гарэлку, а потым падаецца ежа ў такім прыблізна парадку: селядцы з ільняным алеем, боршч з рыбаю і грыбамі, рыба, пампушкі, кісель і, нарэшце, куцця. Вечарам і на працягу ўсёй ночы, на другі дзень Каляд ходзяць славельшчыкі, па-простанароднаму каляднікі. Звычай калядаваць існуе ў нашым народзе спрадвеку і заключаецца ў тым, што моладзь і мужчыны сярэдніх гадоў збіраюцца асобнымі групамі, бяруць з сабою скрыпача, пераходзячы з хаты ў хату, распяваюць песні, выказваюць сваю добразычлівасць і віншаванні кожнаму гаспадару — багаты ён, ці бедны. Падышоўшы да вядомай хаты, калядоўшчыкі прыпыняюцца каля акна і хто-небудзь з іх пытаецца ў гаспадара: «Дзядзька, ці кажаш спяваці, ці так каляду даці?» Калі гаспадар дазваляе, то і пачынаюць спяваць свае простанародныя песні. З такіх песень некаторыя даволі характэрныя і заслугоўваюць увагі. Пасля выканання песень калядоўшчыкі звяртаюцца да гаспадара з прыпевамі і куплетамі:

Пахадзі, дзядзька, каля кваскі,
Пашукай, дзядзька, нам каўбаскі,
Пахадзі, дзядзька, каля печкі,
Пашукай, дзядзька, нам панечкі.

У кожнай сялянскай сям'і для калядоўшчыкаў пякуць асобныя невялікія булкі хлеба, пірагі, даюць сала, каўбасу, а падчас і грошы. Адпусціць іх без нічога ніхто не адважваецца, і кожны гаспадар абавязкова павінен што-небудзь даць, інакш калядоўшчыкі нагавораць яму вострых жартаў і стануць пець з'едлівыя песні. Абышоўшы такім чынам спачатку сваю вёску, калядоўшчыкі адпраўляюцца ў суседнія, іншы раз вёрст за 10—15 і болей. Сабраныя прадукты затым прадаюцца і ўтаргаваныя грошы дзеляць паміж сабою. У некаторых месцах на гэтыя грошы купляюць іконы і ахвяруюць цэрквам. Час ад Каляд да Вадохрышча называюць Трыма каралямі, у гэтыя дні вечарамі ніхто не працуе, таму што вечары гэтыя лічацца святымі вечарамі.

Пярэдадзень Новага года называецца «Шчодры вечар», «Шчадруха». Ён мае для нашых сялян такое ж значэнне, якое для велікарусаў вечар на Вадохрышча. Усе дзяўчаты займаюцца варажбой.

Найбольш распаўсюджана варажба па калах, хоць існуе

выліванне на ваду растопленага воску ці волава, падслухоўванне, аб чым гавораць, і многае іншае. Пры варажбе па калах дзяўчаты бяруць міску з каўбасой ці з кашай, выходзяць на двор і ставяць яе ў тым месцы, куды выкідваюць смецце (на сметніку), а самі бягуць да плота і, хапаючыся рукой за калы па парадку, кожны раз паўтараюць: «Удавец, маладзец»; апошні кол і выявіць, удавец ці маладзец. Тады ж прыслухоўваюцца да брэху сабак: у якім баку забрэша сабака, адтуль, значыць, і з'явіцца жаніх. Кашу і каўбасу аддаюць на другі дзень старцам, але большую частку, калі варажбіткі бегаюць вакол плота, хлопцы, якія падпільноўваюць, выкрадваюць у іх. У гэты ж дзень, як гавораць сяляне, «ходзяць па шчадрусе», г. зн. таксама калядуюць, як на першы і другі дзень Каляд, толькі песні спяваюцца ўжо трохі іншыя, больш свецкія:

Шчодры вечар, добры вечар,
Пане гаспадару да цебе!
Маеш хлопцаў пышных, гарных,
Яны ў стадоле пшаніцу мераць.
Намералі трыццаць шанкоў,—
То табе.
А другія штыры — нам, калядні́чкам,
Каляды.

Акрамя ўсяго гэтага, напярэдадні Новага года існуе звычай красці. Пагэтаму кожнага, хто прыходзіць у хату вечарам у гэты дзень, прымаюць за злодзея і хаваюць рэчы. Крадуць не толькі рэчы, але і скаціну. Усе, хто ўкраў, на другі дзень прыносяць і прыводзяць да гаспадара ўкрадзёнае, і гаспадар павінен іх частаваць. Гэтым звычаем часам карыстаюцца сапраўдныя зладзеі, і тады крадзенае прападае.

На Вадохрышча, ці па-простанароднаму «на вадзяную Каляду», устаноўлены такі звычай. Пасля агульнай малітвы перад вячэрай гаспадыня дома ставіць у невялікай місцы куццю з макам ці мёдам, кладзе туды адну лыжку і падае гаспадару кавалачак крэйды. Гаспадар бярэ прынесенае, хрысціцца і пачынае пісаць крэйдай крыжы; перш на вокнах, дзвярах і печы, у сярэдзіне дома, а затым знадворку малюе па 3—4 крыжыкі на вокнах і дзвярах жылога дома і на дзвярах усіх сваіх будынкаў. У гэты час усе хатнія размяшчаюцца за сталом і сядзяць у чаканні гаспадара. Падышоўшы да апошняга акна (запечнае акно) і намаляваўшы крыжыкі, гаспадар пытаецца: «Баба, а дзе будзем лён сеяць?» Прысутныя ў хаце адказваюць: «Там, дзе бог ходзіць». Вярнуўшыся ў хату, гаспадар ставіць на стол узятую ім куццю і, па-

каштаваўшы яе тры разы, прапануе таксама і ўсім астатнім. Пасля гэтага падаюць тыя ж стравы і ў тым жа парадку, як перад Калядамі.

У канцы вячэры варожаць, як лён уродзіць у наступным годзе. Для гэтага хто-небудзь з жадаючых устае з-за стала і, стаўшы да яго спіной, не гледзячы, цягне з-пад абруса сяннінку да трох раз. Па даўжыні сцяблінак і мяркуюць пра будучы ўраджай. Рэшткі куцці на другі дзень даюць патроху ўсёй скаціне. Такія агульныя звычаі нашых сялян на Каляды.

## [АБ КАЛЯДНЫХ СВЯТАХ У ГРОДЗЕНСКАЙ ГУБЕРНІ]

З каляднымі святамі ў нашай [Гродзенскай] губерні звязана шмат народных звычаяў, якія існуюць з даўніх часоў. Да іх можна аднесці хаджэнне са «звяздой», а таксама асаблівага роду лялечныя прадстаўленні, якія называліся ў народзе словам «батлейка», падобныя на маларускія, вядомыя пад назвай «вертеп».

Хаджэнне са «звяздой» пачынаецца ў Гродзенскай губерні з вечара 25 снежня і працягваецца да Новага года, а ў некаторых месцах і да Вадохрышча. Удзельнікі дзеляцца на дзве групы: адну складаюць дарослыя сяляне, а другую — сялянскія падлеткі і хлапчукі, большай часткай вучні сельскіх школ. Як дарослыя, так і падлеткі спяваюць па-беларуску калядныя песні.

Ва ўпамянутых вышэй лялечных прадстаўленнях, акрамя нагляднага паказу, у асобах некаторых біблейскіх падзей выводзяцца на сцэну «Цар Ірад», «Антон з казой» і г. д. Трэба бачыць, колькі прыемнасці даюць простаму народу такога роду відовішчы, якія суправаджаюцца музыкай; як смяшыць тут якая-небудзь «Антонава каза» не толькі моладзь, але і сівавалосых дзядоў. Да гэтага часу лепшымі батлейшчыкамі ў [Гродзенскай губ.] лічацца мяшчане славутых Жыровічаў.

## ВАСІЛЁЎ ДЗЕНЬ І КАЛЯДНЫЯ СВЯТЫ

Просты народ не святкуе 1 студзеня як першы дзень новага года. Прытрымліваючыся даўніны, вясковыя жыхары святкуюць гэты дзень як дзень св. Васіля і пачынаюць свята з вячэрняга пярэдадня, называючы яго «Васілёў вечар», або, як, напрыклад, у Беларусі, «Шчодры вечар», «Шчадроўка».

Да яго прымеркаваны спецыяльныя песнапенні — шчадроўкі.

У беларускай вёсцы збіраюцца маладыя хлопцы і выбіраюць самага рослага і мажнага дзецюка. Гэта Шчадрэц, ён апрануты старым, у абшарпаную вопратку, з тасёмкамі, шнурочкамі і званочкамі. З галавы, з накінутага на валасы парыка з ільну ці пакулля звісаюць на плечы доўгія касмачы. На парык надзеты папяровы каўпак, на спіне тарчыць агідны горб. У суправаджэнні таварышаў ён ходзіць з хаты ў хату і шчадруе, г. зн. танцуе з апранутымі мядзведзем і казою і спявае (за блінцы, каўбасу і сыр). Старадаўнія шчадроўкі жадаюць кожнаму гаспадару ўраджаю «жыта, пшаніцы і ўсякай пашніцы». Надзіва, да беларускай варажбы ў гэтых звычаях падобна тая ж самая варажба на хлебныя ўраджаі ў Маларасіі, але з тым дапаўненнем, што, ходзячы па хатах, калянднікі-шчадравальнікі стараюцца песнямі і рухамі цела прыкладна паказаць абрад ворыва. Такім жа чынам выходзяць у сад і б'юць абухом сякеры па фруктовых дрэвах, каб лепей радзілі вішні, ігрушы, яблыкі. Замест беларуса-шчадраца тут з'яўляецца мужчына, пераапрануты жанчынай, якая завецца «меланка». На вячэру гатуюць асабліва багатую ежу з пірагамі, варэнікамі і г. д., чаму і сам вечар носіць назву багатага. Гаспадар садзіцца за стол, гаспадыня выганяе дзяцей з хаты, а затым сама кліча іх і пытаецца:

— А дзе ж наш бацько?

— Няўжо вы мяне не бачыце? — гаворыць бацька.

— Не, не бачымо, тату! — адказваюць па-завучанаму дзеці.

— Дай жа, божа, каб заўсёды не бачылі! — гаворыць гаспадар у тым сэнсе, каб і на будучы год Шчодры вечар быў такім жа багатым.— Радзі, бог, так расна, як на небе зоры, і так красна, як ад іх ясна.

У адной з песень-шчадровак пытаецца:

— Каму службу да служыць будзем?

І затым адказваецца:

— Служыць службу да святому Васілю (які, як і ўсе астатнія 12 вечароў, уваходзіў у склад калядных свят).

Васілёў вечар у Беларусі ад іншых святочных вечароў адрозніваўся тым, што патрабаваў надзвычай багатай вячэры і тлустай куцці ў адрозненне ад іншых куццяў, якія былі поснымі, або, як называлі ў некаторых месцах, вадзянымі.

Паміж трыма беларускімі куццямі ёсць розніца не толькі ў назвах, але і на самой справе. Напярэдадні Каляд — куцця посная: ядуць толькі разваранае ячменнае зерне з мядовай

сытой, рыбу, вараныя грыбы, аўсяны кісель. Тады ж выклікаюць і старога бога-«мароза», завуць яго куццю есці. Яму кідаюць за акно першую лыжку гэтай стравы, прыгаворваючы: «Зімою прыходзь, а летам не хадзі, пад гнілою калодаю ляжы». «Хадзі, мароз, на чыгунную барану жалезным бізуном»,— дапаўняе мудрагелістая старадаўняя прымаўка. Сэнс гэтага пажадання заключаецца ў тым, каб у наступным годзе было што на патэльню (чыгунную барану) пакласці і жалезным бізуном, г. зн. чапялою, выняць з печы і паставіць на стол.

На Вадохрышча куцця называецца галоднаю (яна таксама посная): ядуць што папала, таму што ўсё ўжо раней з'едзена, асабліва вечарам пад Новы год, які невыпадкова называецца Калядой ласай, мясной, тоўстай, шчодрай, сытай, багатай. Калі вымыюцца ў лазні, усе садзяцца за стол, застаўлены лепшымі стравамі. Тут на першым месцы каўбаса з кашай і рознай падліўкай, а таксама разнастайныя мясныя стравы, студзіна і г. д. Куцця ўжываецца таксама не з мядовай сытой, а ўжо з малаком і топленым сметанковым маслам.

## КАЛЯДНЫЯ СВЯТЫ НА БЕЛАРУСІ

Святы Каляды, Новы год і Вадохрышча вядомы ў беларусаў пад агульнай назвай «Каляды». Пярэдадзень гэтых свят носіць таксама агульную назву «куцця» — па назве традыцыйнай стравы, якую рыхтуюць у гэты дзень з ячменных круп.

Куцця перад Калядамі служыць прадвеснікам свята, якое пачынаецца і спраўляецца з асаблівай урачыстасцю, чаму і называецца «Вялікая куцця». Самы важны момант гэтага дня — вячэра, якая носіць характар сямейнага святкавання.

З самай раніцы гаспадыні пачынаюць рыхтаваць ежу для будучай вячэры: пякуць блінцы, часта двух сартоў — грэцкія і аўсяныя, што служыць прыкметай урачыстасці дня, таму што блінцы ў Беларусі — пераважна святочная ежа, і беларус лічыць «і нядзелю ні ў нядзелю, калі блінцоў на стале няма». Акрамя таго, вараць верашчаку, квас з грыбамі і селядцом, аўсяны кісель, пякуць пірагі і ў заключэнне ўсяго вараць куццю. Куцця варыцца густая, прытым абавязкова з ячменных круп (з тоўчаных у ступе ячменных зярнят). Для варкі куцці ва ўсе прызначаныя дні ўжываецца адзін і той жа гаршчок, прычым крупы сыплюць у яго ў строга пэўнай колькасці. Гэта неабходна для наладжвання варажбы па куцці.

Вечарам, перад захадам сонца, звараная куцця ставіцца ў сена на покуці. Да вячэры забараняецца каштаваць куццю.

У час варкі яе не толькі не каштуюць, але нават і не перамешваюць.

У звычайны час беларус рана вячэрае; на куццю ж вячэра адбываецца яшчэ раней, таму што гэты дзень праводзіцца многімі членамі сям'і ў посце. «Як толькі сутоніцца (змеркнецца) і зоркі ўзыдуць на неба», на стол кладуць сена і накрываюць яго чыстым абрусам. У гэты час усе члены сям'і павінны быць у зборы. Ёсць звычай, каб маладзіцы на першым годзе свайго замужжа прыбывалі на куццю павячэраць у родную сям'ю. Сабраўшыся на вячэру, члены сям'і спачатку моляцца, прычым малітву чытае старэйшы член сям'і, а потым ужо прыступаюць да вячэры. Парадак падачы ежы за сталом наступны: квас, верашчака, кісель, булка і куцця; да апошніх трох страў падаецца сыта — мядовая ці з цукру. Зачарсцвелая скарынка куцці ў час вячэры здымаецца і аддаецца курам, «каб добра яйкі неслі». Кожны ўдзельнік вячэры павінен пакаштаваць усіх пададзеных страў. Старэйшыя звычайна папярэджваюць дзяцей, каб яны не захапляліся першымі стравамі і захавалі апетыт да апошніх.

Пасля вячэры чытаецца агульная малітва, услед за якой усе ўстаюць з-за стала. Усе стравы, за выключэннем куцці, прыбіраюць са стала, а стол застаецца накрытым да раніцы, калі з яго забяруць сена і аддадуць, змяшаўшы з другім кормам, каровам і авечкам. Коням гэтага сена не даюць, «бо конь не свянцоная костка...»

Тут неабходна адзначыць варажбу па куцці. Куцці варыліся тры, і кожны раз гаспадыня заўважала, як яна зварылася. Удала звараная куцця прадракае добры ўраджай ячменю ў наступным годзе, а кепска звараная, наадварот, дрэнны ўраджай. Кожная куцця ў паслядоўным парадку адпавядае аднаму з трох пасеваў ячменю: ранняму, сярэдняму і позняму. І сапраўды, часцяком беларус пасеў ячменю робіць у адпаведнасці з вынікамі варажбы па куцці.

Дарэчы, яшчэ адна прыкмета, якая назіраецца ў кожную куццю. Паданне снега на куццю, па разуменні беларуса, прадказвае добры ўраджай грыбоў у наступнае лета, а марознае, яснае надвор'е — адваротную з'яву.

Да вячэры на сцэну выступаюць чыгуны з гарачай вадой, і ўсе члены сям'і ад малога да вялікага мыюцца і мяняюць бялізну. Гэта чыста гігіенічная справа не пазбаўлена некаторай ступені абраднасці. Выказанае меркаванне не здаецца нам дзіўным, калі мы звернем увагу на тыя абставіны, што такія пагалоўныя абмыванні робяцца толькі напярэдадні двух вялікіх свят — Новага года і Вялікадня. Акрамя таго, беларус

настолькі адданы сваім звычаям, што вельмі часта ўзводзіць іх на ступень абраду. Так, прымеркаваўшы змену бялізны ў звычайны час у нядзелю, беларус строга выконвае гэты звычай і толькі ў выключных выпадках змяняе бялізну ў другія дні.

Наступныя за куццёй тры дні лічацца ўласна калядндымі. Калі першы дзень Каляд выпадзе на нядзелю, то да іх звычайна прылічаюць яшчэ і сераду і называюць яе тады Градавой серадой, таму што ўстанаўленне свята ў гэты дзень адбылося з прычыны «афяры», каб бог збавіў ад граду.

На Каляды хлопцы і дзяўчаты ўзаемна частуюць адзін аднаго арэхамі і гарбузнымі семкамі. Гэтае частаванне так цесна звязана з Калядамі, як і ўжыванне яек на Вялікдзень. Шырока таксама распаўсюджаны звычай піць на Каляды піва. Кожны беларус, нават падлеткі лічаць абавязкам пакаштаваць у гэтыя дні названы напітак. Піва ўжываецца нявыбрадзілае, ці, як яго называюць беларусы, «цыроп». Варта заўвагі, што беларусы чамусьці лічаць недазволенай справай пячы на самі Каляды блінцы. З падобнай з'явай мы сустракаемся і ў перыяд святкавання Вялікадня.

У першы дзень Каляд існуе звычай нашэння парадзіхай пірагоў (пшанічных ці аржаных) у дом кумоў, прычым адбываюцца часта нават багатыя частаванні. Паколькі ў перыяд Каляд авечкі прыносяць ягнят, то ў беларусаў з'явіўся звычай варажыць па першых наведвальніках дома, якога полу будзе ягнё. Калі першы ў дом увойдзе мужчына, то ягнё будзе мужчынскага полу, і наадварот, калі ўвойдзе жанчына, то народзіцца ягнё жаночага полу.

Хаджэнне са «звяздой» цяпер слаба развіта ў Беларусі. Праўда, па расказах старых людзей, раней у гэтыя дні па вёсках часта хадзілі «штукары з батлеямі» (з лялечным тэатрам) і паказвалі ўсялякія штукі.

**Ігрышча.** З выпадку вялікай колькасці святочных дзён ігрышчы так частыя на Каляды, што па справядлівасці гэты час можна назваць перыядам ігрышч. Ігрышча — уласна вечар з танцамі. Наладжваюцца ігрышчы ці ў прасторнай хаце якога-небудзь памяркоўнага гаспадара, ці (часцей за ўсё) у карчме, якая наогул служыць улюбёным месцам правядзення часу беларуса і якую ён кожны дзень акуратна наведвае пад маркай што-небудзь прачуць. У даным выпадку карчма мае за сабой усе выгоды: 1) яна прасторней за любую сялянскую хату; 2) у ёй у любы час можна дабыць гарэлкі. Апошняя акалічнасць асабліва каштоўная, таму што ігрышчы ёсць час ужывання вялікай колькасці гарэлкі.

І гэтакае вяселле там будзе,
Калі гарэлкі не будзе.
І музыкі не будуць іграць,
Без гарэлкі яны не ўмеюць
пальцамі перабіраць,—

гаворыцца ў адным беларускім вершы. Ды і хлопцы не асабліва ахвотна ідуць танцаваць, папярэдне не выпіўшы.

Перад ігрышчамі хлопцы ўносяць па 20—50 капеек на частаванне і найм музыканта, дамаўляюцца наконт месца, запрашаюць музыканта за плату 1—2 рублі, а пасля ўжо з песнямі і крыкамі ў суправаджэнні гурту дзяцей накіроўваюцца да абранага месца. Тут яны наладжваюць папярэдняе маленькае частаванне, пасля якога ідуць запрашаць дзяўчат. Патрэбна адзначыць, што для дзяўчат лічыцца непрыстойным хадзіць без запрашэння на ігрышча, і яны строга выконваюць гэтыя правілы этыкету, толькі падлеткі не саромеюцца.

З прыходам дзяўчат ігрышчы адкрываюцца. Упачатку яны маюць стрыманы, сталы (паважны) характар: хто ўмее — танцуе, іншыя заляцаюцца. Тут жа часцяком хлопцы частуюць сваіх дзяўчат півам, абаранкамі, цукеркамі і інш. Адны толькі хлапчукі, якія тайна забраліся сюды, вырабляюць розныя бясчынствы, за што часам падвяргаюцца пагалоўнаму выгнанню.

З танцаў асабліва ў хадзе полька, кадрыль. Танцуюць таксама вальс, мазурку, кракавяк, а іншы хлопец, выпіўшы, пранясецца ў «Казачку». Добра што на ігрышчах захоўваецца поўная роўнасць і дзяўчаты не маюць права адказвацца ад танцаў нават з нялюбым хлопцам. Канец ігрышча амаль заўсёды бывае сумным: азарт разгараецца, перапіўшыя хлопцы часцяком пачынаюць бойку. Дзяўчаты, заўважыўшы гэта, спяшаюцца пайсці дадому, але доўга па дарозе можна бачыць, як перашэптваюцца ва ўтульных куточках закаханыя парачкі.

## КАЛЯДНЫЯ СВЯТЫ НА БЕЛАРУСІ

Прамежак часу паміж Калядамі і Новым годам носіць агульную назву «святыя вечары». У гэты перыяд работа выконваецца толькі днём, а вечары звычайна праводзяцца ў святкаванні. Тут у вясёлым крузе моладзі даецца поўны прастор усёмагчымым забабонам. Адна пастанова строга выконваецца ў пэўным доме, а ў другім лічыцца залішняй. Між іншым, у гэтыя дні не дазваляецца таўчы куццю, малоць, кроіць палатно, латаць бялізну, гнуць палазы і інш. За невыкананне

некаторых з гэтых забабонаў вінаватыя, па разуменні беларуса, падвяргаюцца пэўным пакаранням. Так, хто гне палазы ў гэты час, у таго ўсялякі прыплод хатняй жывёлы будзе нараджацца з крывымі нагамі; хто латае бялізну, у таго ўсе ягняты будуць пярэстымі (колер, не асабліва любімы беларусамі) і інш. Забабоны тычацца не толькі работы, але і роду ежы. Так, у гэтыя дні забараняецца варыць струковыя плады на той падставе, што ў спажыўцоў іх пры выхадзе на двор будуць каціцца з вачэй слёзы. Свінням у гэты прамежак часу не даюць грэцкай мякіны, каб вясною іх курч не брала.

Другая куцця называецца багатай, Шчадрацом, таму што яна адна з куццяў няпосная. Гэты дзень вядомы як дзень варажбы. Вера ў варажбу яшчэ моцна трымаецца на Беларусі, асабліва ў асяроддзі жанчын: ці захварэе дзіця раптам, ці прападзе ў каровы малако, беларуская жанчына тут жа адпраўляецца да знахара ці варажбіткі і пачынае варажыць. На Шчадраца варожаць толькі дзяўчаты. Прывядзём некаторыя з варожбаў:

1) «Апалаюць пацеркі». Сабраўшыся, дзяўчаты складваюць свае пацеркі ў таз, і на выбар адна з іх «апалае»: чые пацеркі выпадуць хутчэй, тая дзяўчына раней за другіх і выйдзе замуж.

2) Кладуць свае пярсцёнкі ў кубак з вадой і накрываюць яго ручнікам; замужняя жанчына наўгад вымае гэтыя пярсцёнкі з кубка. У якім парадку будуць выняты пярсцёнкі, у такім парадку ўладальніцы іх выйдуць замуж.

3) Раскладваюць у рад на чым-небудзь блінцы па ліку варажбітак; кожная дзяўчына намячае адзін з блінцоў для сябе; пасля ўпускаюць сабаку і глядзяць, у якім парадку ён прымецца за блінцы. Гэты парадак і служыць указаннем на час выхаду дзяўчыны замуж.

4) Гуртам ходзяць падслухоўваць пад вокнамі і па размове вызначаюць свой лёс.

5) З прывітаннем «Шчодры вечар, добры вечар! Ці ісці ў хату?» ходзяць пад вокны суседзяў. Калі пачуюць у адказ «ідзі», гэта і будзе вернай прыкметай хуткага выхаду замуж. Адказ «сядзь на камені» прадракае дзявоцкасць.

6) Дзяўчына, якая выносіць смецце з хаты, прыпыняецца на сметніку і слухае, дзе забрэша сабака: у той бок, адкуль пачуецца брэх сабакі, і выйдзе гэта дзяўчына замуж.

7) Слухаюць яшчэ брэх сабак на папялішчы, дзе смалілі свінню. Сюды дзяўчаты звычайна прыходзяць ноччу (у папярэджанне насмешак) і прытым з качаргой.

8) Кідаюць праз ашорстак чаравік. Накіраванасць яго наска і ўкажа бок замужжа дзяўчыны.

9) Кормяць пеўня. Калі певень старанна клюе зярняты, то муж будзе добры работнік. Калі ж певень часта падыходзіць да пастаўленай перад ім міскі з вадой, то муж будзе п'яніца.

10) Пытаюць, злёгку стукаючы па плячы, у прахожых імя. Якое імя ў прахожага, такое імя будзе і ў жаніха.

11) Носяць дровы ў хату, захопліваюць іх на рукі без ліку, а пасля падлічваюць, ці цотная (цот) ці няцотная (лішка) колькасць пален прынесена. Цот прадракае жаніха хлопца, а лішка — удаўца.

12) Аналагічная варажба праводзіцца па частаколу агароджы. Абхопліваюць наўгад некалькі частаколін і лічаць, колькі знаходзіцца ў руках: цот ці лішка прымаюцца ў ранейшым значэнні.

13) Ліюць растопленае волава ці воск у халодную ваду і па фігуры, якая ўтварылася з іх, мяркуюць пра жаніха. У гэтай варажбе вялікую ролю адыгрывае фантазія, яна багата заключэннямі: дастаткова найменшага падабенства злітка з якім-небудзь прадметам са штодзённага жыцця, каб зрабіць па ім заключэнне. Так, шабля прадказвае жаніха салдата; кола — грошы і, значыць, багатага жаніха і інш. Трэба заўважыць, што варажба па волаве вельмі распаўсюджана на Беларусі і ўжываецца ў многіх іншых выпадках.

14) Перад сном кладуць пад падушку рэшткі ежы і запрашаюць прыйсці жаніха на вячэру. Мужчына, які прысніцца, і будзе жаніхом.

15) Пад пасцель ставяць на ноч пасудзіну з вадой з мосцікам праз яе. Хто перавядзе ў сне праз гэты мосцік, таму і быць яе жаніхом.

16) У пустым месцы клічуць жаніха. Пасля трохразовага заклікання абавязкова павінен з'явіцца чорт у вобразе жаніха. Тады трэба адрэзаць у яго кусок адзення і схаваць у сябе. З таго часу жаніх адчуе такую моцную цягу да дзяўчыны, якая варажыла, што паўсюдна будзе шукаць яе. Тут нельга не заўважыць змешвання варажбы з прываражваннем.

17) У час вячэры частку кожнай стравы (і цвёрдага, сухога, і рэдкага) непрыкметна апускаюць у рукаў, а пасля ідуць у пустое месца (склеп, вышкі) і раздзяваюцца там; апоўначы да іх з'яўляецца суджаны.

Адносна апошняй варажбы расказвалі наступны выпадак. Адна пані параіла сваёй служанцы зрабіць так. Тая ў дакладнасці ўсё выканала. У склеп, дзе служанка стаяла голая, да яе з'явіўся сам пан. У служанкі мільганула думка, што пані пажар-

тавала над ёй. У парыве гневу яна прыбегла да пані і з дакорам расказала ёй аб тым, што здарылася. Пані растлумачыла ёй гэты выпадак так: «Вось ведаеш што, мая мілая, мусіць, я пamру, а цябе пан па маёй смерці возьме замуж». Так і здарылася. Праз год пані памерла, а служанка выйшла замуж за пана...

Прамежак часу ад Новага года да Вадохрышча адны сяляне залічваюць да святых вечароў і пераносяць на гэтыя дні ўсе раней указаныя забабоны; другія ж, наадварот, лічаць іх звычайнымі днямі.

Апошняя калядная (вадохрышчанская) куцця называецца галоднай, таму што гэты дзень беларус праводзіць у посце. На гэту куццю перад вячэрай для папярэджання пакарання за выпадковае ці наўмыснае парушэнне забабонаў хто-небудзь з сям'і перасякае «вывітак на плоце».

Свята Вадохрышча працягваецца чатыры дні. Паводле ўяўлення беларуса, чорт у гэты дзень вылазіць з вады і селіцца аж да Вербнай нядзелі на вярбе. Існуе адно цікавае павер'е, якое адносіцца да дня Вадохрышча: калі хто ў час асвячэння вады першым зачэрпне яе з усіх палонак крыжа, той будзе шчаслівы на пчолы.

У дзень Вадохрышча ўсе хатнія беларуса прытрымліваюцца строгага посту да таго часу, пакуль не прынясуць з царквы свянцонай вады і пакуль кожны член сям'і не вып'е яе крыху.

Частка гэтай вады звычайна наліваецца ў бутэльку і захоўваецца цэлы год. Ёй акрапляюць саху і валоў, калі першы раз выязджаюць у поле араць, а таксама кароў і авечак пры першым выгане іх у поле. Акрамя таго, вадохрышчанская вада ўжываецца яшчэ як лекавы сродак, над ёю чыняць замовы.

Вадохрышчам заканчваецца доўгі зімовы святочны перыяд у жыцці беларуса.

## НАПЯРЭДАДНІ НОВАГА ГОДА Ў БЕЛАРУСІ

Святы Каляд і Новага года ў Беларусі суправаджаюцца рознымі абрадамі, якія захаваліся, відавочна, яшчэ з часоў язычніцтва. Так, напрыклад, напярэдадні Новага года маладыя хлопцы водзяць па хатах двух пераапранутых таварышаў, якія называюцца «багатая Каляда» і «бедная Каляда». Першы з іх апранаецца ў святочнае адзенне і ўпрыгожвае галаву вянком з жытніх каласоў, а другі надзявае разарваную світку і вянок з саломы на галаву. Пры ўваходзе ў хату абодвух хлопцаў накрываюць прасцінаю і прымушаюць гаспадара выбіраць любога. Калі той выбера багатую Каляду, то хор

хлопцаў спявае яму песню, у якой прадракаецца багацце і ўраджай у новым годзе. Калі ж выбар гаспадара выпадзе на бедную Каляду, то гэта служыць прадвесцем неўраджаю і беднасці.

## КАЛЯДЫ Ў СЕННЕНСКІМ ПАВЕЦЕ

Каляды працягваюцца з вечара 24 снежня па 6 студзеня. Святкуюцца тры Каляды (куцці). Першая Каляда (куцця) называецца простай. Першай Калядой заканчваецца шасцітыднёвы Піліпаўскі пост. Другая Каляда (куцця) перад Новым годам называецца тоўстай, ці багатай. Трэцяя перад Вадохрышчам — тонкай, ці поснай. На кожнай Калядзе (куцці) неабходна страва куцця, г. зн. каша з пшанічных ці ячменных круп. На першую і трэцюю Каляду куцця прыпраўляецца канапляным алеем, а на другую — маслам ці салам.

На першую Каляду (куццю) увесь дзень праходзіць у падрыхтоўцы да свята: уборка і мыццё хаты, заканчэнне ўсіх работ. Пасля заканчэння работ усе мыюцца ў лазні, а вечарам садзяцца за стол. У куце на сене стаіць куцця. Сена кладзецца і на стол. У час вячэры куццю есці першым пачынае гаспадар, які сядзіць на покуці, за ім пачынаюць іншыя члены сям'і па старшынстве. Перш чым пачаць есці куццю, гаспадар звяртаецца да акна, якое бывае ў асноўным замёрзшым, заве мароза на куццю, каб ён летам не марозіў ячменю: «Мароз, мароз, хадзі куццю есці! Цяпер твая пара, хадзі, марозька. А летам не хадзі, пад калодай сядзі, бо конюхі баронамі задзяруць, а пастухі пужкамі засякуць. Хадзі, марозька, куцця смачная, з канапелькамі!» Калі на другі дзень мароз аслабее, гавораць: «Мароз паеў куцці і паласкавеў». А калі зробіцца мацнейшым, гавораць: «Разгневаўся».

Абрадам куцці, які абавязвае прысутнічаць усіх членаў сям'і ў хаце, часам карысталіся зладзеі. Пра гэта расказвалі так. Гаспадар заве ў хату мароза куццю есці, а злодзей, які вывеў каня з хлява, адказвае: «Дзякуй, гаспадар, паеў і на кабылу ўссеў, ідзі вароты зачыні». Толькі раніцай, увайшоўшы ў хлеў, гаспадар здагадваўся, які гэта мароз адказваў яму.

Страў на каляднай вячэры ў беднай сялянскай сям'і бывае тры: боршч, бліны ці аладкі, куцця; у сярэдняй — пяць: боршч, аладкі, рыба, кісель, куцця; у заможнай — сем: бліны, боршч, кісель, грыбы, рыба, узвар, куцця.

З каляднай куццёй у народзе звязана шмат прыкмет: калі ў калядную ноч на небе шмат зорак, летам будзе шмат грыбоў.

Калі з паўдня пасыплецца дробны град, умалотны будзе гарох. На Каляды снег — будуць моцна раіцца пчолы. Калі ноч пад Каляды ясная, у сенакос будзе добрае надвор'е і г. д.

У наваголнюю Каляду, акрамя прыкмет, вялікае развіццё ў Сенненскім павеце маюць варожбы. Так, дзяўчаты выцягваюць па травінцы з сена: чыя даўжэйшая, у таго лён лепшы ўродзіцца, г. зн. таму і сеяць трэба яго. Па просьбе дзяўчыны хлопец кладзе пад дзве талеркі вугаль, крэйду і цукар. Калі яна дастане вугаль, будзе смутак; мел — смерць; цукар — светлае, салодкае жыццё. Або: дзяўчына, паеўшы салёнага, кладзецца спаць і гаворыць: «Суджаны, напаі мяне!» Каго ў сне яна ўбачыць, той і будзе яе суджаным. Ці, кладучыся спаць, дзяўчына сыпле пад падушку некалькі зярнят і гаворыць: «Суджаны, дапамажы жаць!» Хто ў сне дапамагае ёй, той яе і суджаны будзе. Ідучы каля частаколу, дзяўчына пачынае падаць і хапаецца за частакол, пасля лічыць частаколіны, якія засталіся: калі цот — выйдзе замуж, калі лішка — застанецца дома. У хляве ў цемнаце авечак ловяць: старую зловіш — муж удавец будзе, ды й стары; маладую — малады. Калі ж захочаш даведацца, як імя будучай жонкі, вечарам, на Каляду, спытай імя ў жанчыны, якую першую сустрэнеш: якое яна скажа, такое і будзе ў тваёй жонкі і г. д.

Каляды заўсёды суправаджаюцца ігрышчамі і песнямі. Ігрышчы наладжваліся амаль кожны дзень да 6 студзеня, дзе моладзь танцавала і пела калядныя песні (напрыклад, «Ай, мароз, мароз, не змарозь мяне» і інш.).

Вадохрышчам заканчваюцца Каляды. На Вадохрышча раніцай змешваюць астаткі куцці і бліноў ад трох Каляд (куццяў) з хлебам у зярнятах і асвячонай вадой і даюць гэты корм рагатай жывёле, авечкам, коням, акрамя свіней, каб здаровыя былі.

З прыкмет і павер'яў, звязаных з вадохрышчанскай Калядой і днём Вадохрышча, можна ўпамянуць наступнае: мяцеліца ў дзень Вадохрышча прарочыць ураджай грыбоў, ягад і арэхаў. Калі хата ў гэтыя дні трымаецца ў чысціні — летам уродзіцца лён чысты. У час каляднай вячэры спяшаюцца з ядой, каб летам хутчэй выконваць палявыя работы. Пасля вячэры рэшткі куцці падкідваюць да столі, каб лён высока рос ці каб маладая жывёла хутчэй расла і г. д.

Святы праходзяць хутка. Народ праводзіць іх песняй:

Ай, Калядачкі, нашы нежачкі,
Набілі ў карчомку чорны сцежачкі.
Вы ж, Калядачкі, вярніцеся,
Хоць нядзельку працягніцеся!

## ЦЯРЭШКА

Да в. Каптуркі, дзе ў хаце селяніна Ежгура павінна адбыцца гульня «Жаніцьба Цярэшкі», было зусім недалёка, не больш адной вярсты, але снегу намяло цэлыя горы. У хатуназбіралася столькі хлопцаў і дзяўчат, падлеткаў, старых, што нават не было дзе ўпасці яблыку. Сядзелі на печы, на палацях, на жорнах — проста павярнуцца не было дзе. На покуці сядзіць цымбаліст, а перад ім яго велізарныя цымбалы. Ён верна перабірае ў такт скрыпкі па металічных струнах свайго інструмента кручкаватымі палачкамі. Скрыпач іграе заліхвацкую французскую кадрыль, праўда, з рускіх песень. Проста дзіву даешся, як гэта ў такой цеснай хаце ўмудраюцца танцаваць кадрыль на 8 пар. Гарачыня немагчымая. З танцораў даўно ўжо пот градам ліецца. Хлопцы танцуюць з вялікім захапленнем, ствараючы ў час танца вобраз гультая ці каго-небудзь іншага з пэўнымі недахопамі. Танцы працягваліся амаль да першых пеўняў. У невялікіх перапынках паміж танцамі цымбаліст гучна абвяшчаў віншаванні гасцям:

— Віншуем (называлася імя) з маршам!

І цымбаліст «аджарваў», а скрыпач падхопліваў разухабісты марш, ад якога проста мароз па скуры прадзіраў. Тым не менш той, па чыйму адрасу іграўся марш, лез у кішэню, даставаў 2—5 капеек і апускаў іх у адтуліну (дзірку), зробленую спецыяльна ў цымбалах. Па поваду гэтай даніны мужчыны заўважалі:

— Ну што ж, трэба даць музыкантам на струны!

Але вось другі раз певень прагарланіў поўнач. Хтосьці з-за печы закрычаў:

— Ці не пара, браточкі, Цярэшку жаніць?

Сярод публікі пачулася:

— Пара! Пара! — І многія сталі пляскаць у ладкі.

У той жа час выбіралі «бацьку» і «матку» — тых, якія вельмі добра ведалі ўсіх гасцей, ведалі, хто з кім «любіцца», а значыць, і сумеюць пары падабраць. Вось «бацька» з «маткай» і пачалі падбіраць пары: калі падабраная пара згодна гуляць Цярэшку, то хлопец падае сваёй нарачонай руку і яны абое ў такт музыкі танцуюць «Лявоніху-крутуху».

— Слава богу,— крычыць «бацька»,— адну пару сасваталі! Благаславі іх (звяртаецца да «маткі»), старуха, «ад вуха да бруха».

Бывае і так, што падводзяць хлопца да дзяўчыны, але тая запішчыць, замахае рукамі і ўцякае на печ. Ёй, значыць, гэты хлопец не падабаецца. Дзяўчыну некаторыя пачынаюць цяг-

нуць з печы, але яна наадрэз адказваецца з ім Цярэшку гуляць. І яе пакідаюць у спакоі. Хлопец гэты тады стаіць каля печы, як у ваду апушчаны. Сватаўство не ўдалося. Але тут жа пачынаюць падбіраць новыя пары. Гэта працэдура цягнецца вельмі доўга, усім ніяк не ўгодзіш. То дзяўчына хлопцу не падабаецца, то хлопец ад дзяўчыны хаваецца пад стол ці пад палаці. Зусім часам забываюцца, што гэта толькі гульня. Здаецца ім, што тут адбываецца сапраўднае сватаўство. Колькі тут «бацька» і «матка» ўгаворваюць, распісваюць годнасць пар, колькі тут дзяўчаты канфузяцца, ламаюцца, чырванеюць, як мак. Здаецца, што сватаўству не будзе канца. Але вось набралася ўжо пар дванаццаць. Усе яны пасярод хаты расстаўлены: мужчыны — з аднаго боку направа, дзяўчаты — з другога налева. Цяпер пачынаецца, так сказаць, другая частка Цярэшкі. Кожны хлопец павінен злавіць сваю нарачоную. Гэта свайго роду гульня ў «ката і мышку»: хлопец ловіць, а дзяўчына ўцякае. Публіка стараецца «ўкрыць» (схаваць) дзяўчыну ад пагоні. Смех, крык, штурханіна. Дзяўчына першай пары, уцякаючы ад суджанага, напявае:

Па гарэ дудар ходзіць,
Карагод дзяўчат водзіць.
— Дзевачкі-пралесачкі,
Не ідзіце ў арэшачкі,
А то васваўчок паесць,
А то вы заблудзіце.

Калі хлопец злавіў сваю нарачоную, то музыкі, як бы ўзрадаваўшыся, што справа ўладжана, хутка іграюць «Лявоніху-крутуху», а першая пара ў карагодзе кружыцца як віхор, прычым кавалер стараецца як можна мацней прыстукваць ботамі.

У другой пары дзяўчына тоненькім галаском запявае:

Аж мая галоўка баліць,
Як жа мне дзядульку ўлавіць.
Хоць жа я і ножку зламлю,
А ўсё-такі дзядульку злаўлю...

І зноў ідзе гульня ў «ката і мышку». Калі ж хлопец другой пары злавіў дзяўчыну, то яна ў такт музыкі напявае:

Ах ты, дзед, ах ты, дзед,
А я — твая бабка,
Танцуй, мяне ўважай,
Што б я была гладка!

На жаль, тут не прыводзяцца ўсе песні, якія выконвала кожная з 12 пар. Неабходна толькі заўважыць, што кожная пара выконвала сваю песню. Вось, напрыклад, што павінна спяваць дзяўчына чацвёртай пары:

Бітая дарога, як ток,
Лепшая пападдзя, як поп.
Пападдзя кашулю шыла,
А трасца папа біла.

А ў шостай пары чамусьці ўпамінаецца «шавец» і «чапец». Дзяўчына спявае, калі яе ловіць хлопец:

Білася шаўчыха з шаўцом,
Выбіла тры зубы чапцом.
— Вось табе, шавец, за тое,
Не сучы дратвы утрое:
У мяне лён не родзіць,
На дратву многа ўходзіць...

Нарэшце ўсе пары пералавіліся, цяпер пачынаюць «аддувацца» і выціраць потныя твары. Наступае невялікая паўза. Раптам на палацях заспявалі фабрыканты.

Ад іх песень павеяла дысанансам пры гульні сапраўднай Цярэшкі. Але публіка аддала належную даніну новым матывам.

— Вот, брат, загудзелі... Не па-нашаму.

Калі антракт закончыўся, то наступіла заключная частка Цярэшкі. Дзяўчаты раптам накінулі на галовы хусткі і пабеглі з хаты. Гэта яны адправіліся кожная дамоў гатаваць ежу для сваіх каханых (суджаных) — пячы каўбасы, яешню, бліны і г. д. Гэта называлася падрыхтавацца да вясельнага банкету. Хлопцы са свайго боку, каб не быць у даўгу, пачалі рыхтавацца да банкету таксама.

Праспявалі трэція пеўні. Адна за другой з'яўляліся ў хату дзяўчаты, і кожная з іх несла прыгатаваную ежу. Выставілі сталы і пачалі ўсаджвацца, прычым каля кожнай дзяўчыны сядзеў яе нарачоны. Музыка іграла Цярэшку. Вясельны банкет быў у поўным разгары. Кожная пара як мага лепей старалася пачаставаць адзін другога. Пачынала світаць, а вясельная бяседа яшчэ ўсё працягвалася.

## КАЛЯДЫ

Каляды спраўлялі ў нас даўней вось як.

Раніцай, устаўшы, гаспадар браў са стала сена, на якім елі куццю, і нёс у хлявы, каб даць усёй скацінцы па каліўку,

а гаспадыня, затапіўшы печ, пякла бліны, пражыла каўбасы, бо і гожа так у добрай гаспадарцы, дзе ёсць наёмная чэлядзь. Служба найміта — да Каляд; трэба ж падзякаваць за працу, а наймiт падзякуе за службу сягоння. Пакарміўшы скацінку, гаспадар даставаў з клеці арэхі і раздаваў дзецям: пачыналася зараз гульня ў «цот і лішку».

Вечарам хто на ігрышча ішоў — гуляць «Яшчара», «Жаніць Цярэшку», а хлопцы рабілі «казу»: хто спрытнейшы і байчэйшы на язык — прыбіраўся дзедам, другія — за цыганоў і важатых, бралі музыку і ішлі шчадраваць. Перш за ўсё спявалі пад акном:

Ой, выйдзі, мужу, ды й на вулачку,
Паслухай, мужу, што ў тваім бару...

А пасля калі гаспадары прасілі, то заходзілі ў хату і рабілі прадстаўленне: «дзед» са сваёю табакеркай, напоўненай попелам, частуе гаспадара і жартамі ды прыгаворкамі забаўляе ўсіх, а яму стараюцца падпаліць кудзельную бараду. Цыганы прыстаюць варажыць, а музыкі, заступіўшы «казу», іграюць і прыпяваюць песенькі, у якіх чапаюць то гаспадара, то гаспадыню, то дзяўчат, жартуючы з іх. Але вось важак запяваў:

Ой, ну-ну, каза,
Ой, ну-ну, шэра!

І мужчыны, а за імі пеўчыя падхапілі далей гэту песню, расступіліся, і на сярэдзіну хаты выступае важак з «казой» на повадзе. Пеўчыя пяюць:

Дзе каза ходзіць,
Там жыта родзіць,
Дзе каза хвастом,
Там жыта кустом,
Дзе каза рогам,
Там жыта стогам.

А як дапяюць да слоў:

Пуц, каза ўпала,
Здохла, прапала! —

то дагэтуль танцаваўшая «каза» падае на зямлю. А як запяюць словы:

Прыступіся блізка,
Уклонься нізка...

тады «каза» ўстае, кланяецца, і шчадравальшчыкі ідуць да другога гаспадара.

Шчадравалі раней ад першага дня Каляд да багатай, або шчодрай, куцці.

## КАЛЯДНАЯ КУЦЦЯ

Апошні дзень перад Калядамі — гэта куцця. Пачынаючы з паўдня, гаспадыня запальвала печ, каб варыць куццю. Падвязаўшыся белым фартухом, найперш засыпала ў гаршчок куццю, а потым ужо прыгатаўляла на вячэру іншыя стравы. Бедныя варылі найчасцей толькі куццю і кісель, а да кісялю рабілі мядовую сыту; багацейшыя рабілі шмат розных посных страў, сярод якіх важнейшымі былі блінцы з макам (зліжыкі), поліўка з грыбоў, рыба, садавіна і інш.

Калі куцця ўпрэла ўжо, то гаспадыня ставіла яе з гаршком на покуці, дзе перад гэтым гаспадар клаў ахапку сена. Дзяўчаты гэтым часам прыбіралі і прыхарошвалі хату.

А як прыходзіў вечар і запальвалі агонь у хаце, а ўся сям'я ўжо прыадзелася чыста, тады гаспадыня брала з-пад куцці палавіну сена, рассцілала на стале, паверх сена слала чысты абрус і ставіла стравы на стол. Тады садзіліся есці куццю: спачатку садзіўся гаспадар на покуці, потым гаспадыня проці яго на ўслоне, далей уся сям'я, дзе каму выпадала сесці, гледзячы па ўзросту. Зачэрпнуўшы першую лыжку стравы, гаспадар клікаў на куццю мароза або дзядоў паводле парадку, здавён заведзенага.

Выпіўшы першую чарку, гаспадар казаў: «Судзі, божа, каб на другі год прыждалі ў шчасці, у долі і ўсякай добрай памыснасці; каб жывы і здаровы былі, каб разам святую куццю спраўлялі; судзі божа!» Яму адказвалі ўсе: «Судзі, божа!» Гэтак па чарзе, прымаючы чарку з рук у рукі, усе выказвалі свае найлепшыя жаданні, але ўжо іншымі словамі. Павячэраўшы, старэйшыя садзіліся гутарыць, а моладзь варажыла.

## КАЛЯДЫ

Усякі з нас ведае, што такое Каляды і калі яны святкуюцца, але не ўсякі ведае, што гэта за такое свята Каляды і адкуль яно ўзялося. Вось паслухайце, што аб гэтым кажа нам гісторыя. Многа, многа гадоў таму назад калісь паміж славянскага племені, з якога пайшоў таксама і беларускі народ, не было

яшчэ хрысціянскай веры, калі не было яшчэ ні каталікаў, ні праваслаўных. Кожны народ на свеце мае сабе якую-небудзь веру, так і нашы прапрадзеды мелі сваю веру, у якую верылі. Славяне былі тады яшчэ язычнікамі, вера іх не дужа была багатая, што да багоў. Цяжкае жыццё, нецікавая прырода іх краю, напоўненая мхамі ды балотамі, не дазваляла іх фантазіі надта буяць. У тых народаў, што жылі ў багатых, прыгажэйшых па прыродзе краях, і вера была прыгажэйшая і багацейшая па ліку багоў. Не тое было ў славян. Галоўны іх бог быў бог грому і маланкі — Пярун. Ды яно і ведама, чаму людзі лічылі яго за галоўнага бога. Калі яшчэ не было навукі, калі людзі многа чаго не ведалі, яны ўсё тое, што іх страшыла, чаго баяліся, лічылі за бога і пакланяліся гэтаму. Пярун быў грозны бог. Верылі славяне таксама ў сонца, месячыка, розных ведзьмаў, лесуноў, ваўкалакаў, але гэта ўсё былі благія, страшныя багі, якія толькі і стараліся, каб як-небудзь зрабіць чалавеку прыкрасць ці зло. Адзін з добрых багоў быў бог сонца, але ён быў добрым толькі паўгода, на другое паўгода ён адходзіў недзе далёка ад зямлі, а тым часам злыя багі прыносілі снег, холад, усё замірала. Людзі з нецярпеннем чакалі, пакуль зноў вернецца сонейка, калі пад яго цёплымі праменнямі зноў усё ажыве, снег згіне, настануць цёплыя дні, калі пожні зазелянеюць траўкай, калі на палях узрасце ўсялякае збожжа, што так патрэбна для жыцця чалавека і жывёлы. Прадвяшчала гэта сонца, калі карацелі ночы і даўжэлі дні. Людзі прыкмецілі, што гэта якраз робіцца каля цяперашняй палавіны снежня. Нездарма і прыказка склалася, што «Барбара ночы ўварвала». Быў гэта радасны час для людзей. Усе радаваліся, што зноў скора прыйдзе лета, старыя змогуць зноў выграваць свае косці на сонцы, мужчыны і бабы выйсці на працу ў поле, каб зноў прызапасіць ужо на другую зіму, дзецюкі радаваліся, што ўжо не будуць сядзець у дымнай хаце, як зімой, а пабягуць гуляць куды ўздумаецца. Як жа не дзякаваць за ўсё гэта добраму сонцу! Дзеля гэтага спрадвеку славяне ў гэтым часе (каля палавіны снежня) пачалі святкаваць дзень, у які зноў пераможа дзень над ноччу, і свята гэтае называецца «Каляды». На Каляды адбываліся гульні: спявалі, танцавалі, віншавалі адзін аднаго, вадзілі «мядзведзя», «казу» і да т. п. Наогул усялякімі спосабамі радаваліся.

Каля тысячнага году па цяперашнім календары сярод славянскіх народаў, а значыць, і сярод беларусаў, стала шырыцца хрысціянская вера. Славяне святкавалі свае Каляды з 25 снежня. Назва засталася старая, але ўжо іншая аснова

была пад ёю. Многа яшчэ і цяпер звычаяў захавалася з тых язычніцкіх часоў.

Смутна толькі, што за апошнія гады народ стаў забываць звычаі сваіх дзядоў, а нават дзе-нідзе і саромецца іх. П'янства, буянства, карцёжная гульня сталі заступаць іх месца. Уводзяцца чужыя звычаі. Але не трэба забываць, што вам кажа дзедаўская прыказка: «Чужому навучайся, але і свайго не чурайся». Трэба любіць мінулае дзеля будучыні.

## КАЛЯДЫ

Ва ўсіх язычніцкіх народаў сонца, месяц, зямля, агонь, вада, вецер і розныя іншыя праявы прыроды абагаўляліся.

З цягам часу старадаўнія звычаі і абрады набылі іншы характар. Са старадаўніх апісанняў вядома, што ў першыя вякі хрысціянства ў нас пры дварах князёў адбываліся гульні і ігрышчы на Каляды. Хадзілі скамарохі з мядзведзямі, вадзілі «казу», наладжвалі маскарады, ці, як цяпер кажуць нашы сяляне, «пераадзяваліся за цыганоў», і многа іншага.

Так было даўней... Шмат чаго захавалася з гэтых звычаяў і да нашага часу, але, бадай, яшчэ болей загінула, сплыло з людской памяці.

## ВЕЧАР ВАРОЖБ, АБО ВАСІЛЁВА КУЦЦЯ

...Адна Тыкеля, 85-гадовая бабулька з нашай вёскі, расказала мне агулам, што яна памятала аб гэтых старых звычаях. Паводле яе слоў, у вечар 31 снежня збіраліся цэлыя сем'і на сумесны банкет. Прыходзілі тут аддзеленыя сыны са сваімі дружынамі да бацькоў, сыходзіліся браты, асобна жыўшыя, да старэйшага брата, калі бацькоў не было, і ўсе ў адной хаце праводзілі стары і сустракалі Новы год. Калі між імі бывалі якіясь сваркі ці нязгоды, то ў гэты час заціхалі. Калі зноў катораму брату або сястры блага жылося, то ім усе памагалі радай, нават давалі падмогу, як яна была патрэбна, словам, гэты вечар быў вечарам сямейнай еднасці.

На Васілёву куццю першай абрадавай стравай быў аўсяны кісель, густая куцця з макам, селядцы і інш. Усё адбывалася таксама, як на куццю перад Калядамі.

Па вячэры гаспадар уставаў найперш з-за стала і выходзіў у сені. Вярнуўшыся назад, абвяшчаў сабраўшымся прыход даражэнькага госціка. Пачуўшы такую навіну, усе падымаліся

на ногі, каб прывітаць новапрыбыўшага. Стоячы, паглядалі на дзверы. Але госць доўга не ўваходзіў у святліцу. Тады гаспадар пытаўся ў стаячых:

— Чаго ж вы, госцікі, стаіце?

А ўсе гуртам адказвалі:

— Стаімо, каб пачэсна павітаць прыйшоўшага госця!

Гаспадар адказваў:

— Ну, дык вітайце, бо ён ужо прыйшоў, а гэтым госцем ёсць Новы год.

Пачуўшы такія словы гаспадара, усе грамадой, з вясёлымі падскокамі наперабой пялі:

Ідзі, ідзі, Новы год,
Скажы нам наўпрод,
Што каму ты нясеш?

Ці ідзеш ты да нас,
Каб даць усім шчасны час?
Ты Новенькі наш!

Ці нясеш ты каму
Смерць, як году таму?
Ты міленькі наш!

Далейшых слоў гэтай песні старая бабулька не памятала, хоць змест яе ведала.

— Адгэтуль, мае дзеткі,— казала яна,— пялася гэта песня напалову з плачам, дзеля таго што ў песні людзі жаліліся перад Новым годам на свайго ліхога пана,— а бывалі паны ўсялякія, і дужа ліхія,— прыпаміналі дазнаныя крыўды ад дваровых служак і ўрэшце прасілі бога, каб было крыху свабодней жыццё ў будучым годзе.

Пасля песень наступалі розныя варожбы, а дзеля гэтага і сам вечар зваўся вечарам варожб. Варажылі ўсе, старыя і малыя, хоць у варожбы і не зусім верылі. Гэтак было калісьці, але аб гэтым рэдка хто памятае. Цяпер нічога падобнага не бывае. Адны дзяўчаты не забываюцца аб гэтым вечары і сабіраюцца, каб паваражыць...

Дзяўчаты стараюцца пазнаць з варожб, што іх чакае, які будзе муж: удавец ці маладзён? Ці хутка гэты суджаны, раджаны прыедзе ў сваты? І ці якога няшчасця не здарыцца маладзенькай дзяўчыне? Такія пытанні вельмі цікавяць маладых дзяўчатак. Кожная з іх з вялікай нецярплівасцю чакае, каб як найхутчэй прыйшоў вечар Васілёвай куцці і каб хутчэй адкрылася перад вачыма нязнаная і таямнічая буду-

чыня. Ужо ад самай раніцы сядзіць бедная дзяўчынка і падумвае, які ж пояс забраць на вечар варажбы. Бедненькае сэрца з нейкім страхам перад гэтым вечарам моцна б'ецца ў белых дзявочых грудзях.

Але вось вечар чаканы прыйшоў.

Настала часіна, калі ўсе дзяўчаты сабраліся ў адну хату. Тут яны рупна аглядаюць куткі і закуткі, каб ніхто з дзецюкоў не падслухаў іх дзявочых гутарак і песень ды не падглядзеў прарочых абрадаў. Па агледзінах хаты замыкаюць сені, каб ніхто не ўвайшоў, і пачынаюць варажыць.

Перш-наперш уносяць апалушкі, у якія кожная з прысутных дзяўчат кладзе свой пояс. Гэты пояс павінен быць новы і так скручаны, каб адзін яго канец абвязваў скрутачак, зроблены на далоні (у такія скрутачкі вясковыя дзяўчаты заверчваюць новыя паясы). Як ужо ўсё гатова і паясы складзены, тады ўдзельніцы варажбы выбіраюць са свае чарады наймалодшую і найпрыгажэйшую, так званую Апалайніцу. Па выбары Апалайніца бярэ апалушкі і «апалаець» зложаныя ў ёй паясы, а ўсе астатнія ціхім хорам пяюць:

Святы Апалас, чым хутчэй ідзі да нас,
Бо нам у людзі пара.
Прышлі нам малойца прыгожага,
Сокала яснага,
Да людзей і да бога шчаснага.
Святы Апалас, ой, хутчэй ідзі па нас.

Апалайніца апалае шпарка і таксама падспеўвае: «Святы Апалас...»

Пры гэтым апаланні паясы высока «падзыгаюць» (падскокваюць), адны выпадаюць з апалушкі, а другія развязваюцца або застаюцца ў апалушцы.

Чый пояс хутка выпадзе, то тая дзяўчына зараз пойдзе замуж, а чый доўга не выпадаў, то галубка, што яго прынесла, яшчэ пасядзіць у старым гняздзе сама меней год. А як часам пояс развяжацца, то гаспадыньцы яго, напэўна, здарыцца саромнае няшчасце.

Па апаланні паясоў наступае выліванне на ваду растопленай цыны або воску, лічэнне тыну і іншыя варожбы. Растопленую цыну або воск выліваюць у шклянку са сцюдзёнай вадой і кажуць:

Ой, цынка, цыніца,
Ці я буду маладзіца?
Хто прыедзе ка мне ў сваты:
Жаўнер прыгожы ці гаспадар багаты?

А пасля глядзяць, што там вылілася. Як вылілася рэч, падобная да мяча, то суджаны-раджаны будзе прыгожым жаўнерам, а калі вылілася саха ці якая іншая гаспадарская прылада, то муж будзе багатым гаспадаром.

Па вылiваннi воску выбягаюць дзяўчаты на двор лічыць тын, каб даведацца, маладзец ці ўдавец прыпадзе ў мужы. Лічэнне гэта адбываецца такім парадкам: падыдзе дзяўчына да плоту і пачынае ад пачатку лічыць тыніны да самага канца, кажучы: «Гэта кол, гэта калец, гэта ўдавец, гэта маладзец». І ўжо калі апошняя тыніна прыпадзе на слова «кол» або «ўдавец», то суджаны-раджаны і будзе ўдавец, а як апошняя тыніна прыпадзе на слова «калец» або «маладзец», то і муж будзе прыгожым малайцом. Скончыўшы варожбы, а яны амаль заўсёды канчаюцца на лічэнні тыну, дзяўчаты разыходзяцца дамоў. Дзеля гэтага што наогул у прыгожым жаночым чародзе языкі доўгія, то назаўтра амаль уся вёска і ведае, што каторай выварaжыла Васілёва куцця.

Які ж пачатак Васілёвай куцці? Старыя сяляне кажуць, што звычай гэты цягнецца ад незапомных часоў, а названне яго выводзяць такім сказам.

Калісь даўно нашы дзецюкі не ездзілі ў сваты, як гэта робіцца цяпер, але яны жанок сабе куплялі. Як ужо ў каторага бацькі дочкі павырастаюць і захочуць выходзіць замуж, дык ён павінен вазіць іх па сёлах, каб каму-кольвечы прадаць. Аднак справа гэта для самога бацькі нават тады, калі была яшчэ моднай, разам была і прыкрай,— ведама, свяці вачамі перад людзьмі, калі дочкі не ўдаліся. Вось з гэтай прычыны бацькі часта прасілі чужога чалавека, каб павёз прадаваць дачок. Называўся ён Васілём. Васіль быў чалавек лоўкі на язык і надта спрытны для гэтай справы. Ужо калі чужую дачку пасадзіць на свае цялежкі, то дамоў не прывязе, а прадасць напэўна за добрую цану. Дык і меў ён, бедны, працы па самыя вушы. Усе да Васіля звярталіся з просьбай, адны, каб дачку вёз да Клінчан, другія, каб да Іванаўцаў, а трэція, каб яшчэ куды-небудзь. І вазіў ён цэлы год. Вазіў вясной і летам, вазіў таксама і зімой. Адпачываў толькі ў Вялікі пост і ў перадкалядны пост. Вось аднаго году сабралася так многа тавару, што бедны Васіль па Калядах вазіў, вазіў, ды й завазіўся.

Якраз за два дні перад Новым годам богу душу аддаў. Хаўтуры яго адбыліся 31 снежня, у апошні дзень старога года. Маладыя дзяўчаты па ім плакалі і галасілі цэлы дзень аж да вечара, а ўвечары пачалі варажыць і згадваць сваю будучую долю. Вось дзеля гэтага з тых часоў і сам вечар стаў называцца вечарам Васілёвай куцці.

## СПАТКАННЕ НОВАГА ГОДА

Перад Новым годам спраўляюць багатую куццю. Павячэраўшы, зачынаюць розныя забаўкі. Дзяўчаты варожаць, хлопцы ходзяць з «казой». Дзеля гэтага адзін хлопец прыбіраецца казой, а другі — за павадыра. Першы павадыр павінен умець складна гаварыць і быць высокага росту.

Іншыя хлопцы з кампаніі ідуць як хто папала. Наладзіўшы ўсё, яны з музыкамі і механошай ідуць ад хаты да хаты. Прыйшоўшы пад хату, павадыр пасылае гаваркога хлопца прасіцца ў хату. Той, увайшоўшы, вітаецца, а потым кажа:

— Іду ад пана нашага. Ідучы, пытаю, што сказаці маю свайму пану Году, што носіць бароду,— шыроку, як лапату, сіву і касмату... Ці шырокі лавы, каб нам паляжаці? Ці добра гаспадыня, каб нас частаваці?

— Адкуль вы?

— Мы людзі не простыя, з далёкага краю; хлопцы ўсё сталыя, з-пад самага раю.

— Адкуль ідзяце?

— Ідзём кругом света, аж ад пана лета. Мы к лету ідзём і «казу» вядзём і радасць нясём.

— Дык просім у хату!

Тады ў хату ўваходзіць павадыр, за ім «каза». Павадыр з ільняной барадой, у вывернутым кажуху і з доўгім кіем у руцэ. За імі ідуць музыка, механоша і ўся чарада. Увайшоўшы і пахваліўшы гаспадара, павадыр муштруе кіем «казу», а потым зачынаюць спяваць:

Го-го, козанька!
Го-го, шэранька!
Павярніся складна,
Пакланіся зграбна!
Скажы, дзе хадзіла,
Дзе што ты рабіла.
Дзе каза паходзіць,
Там жыта зародзіць,
А дзе пагасае,
Там павылягае.
Дзе яна бывае,
Там шчасце вітае,.
Дзе каза хвастом,
Там жыта кустом.
Дзе каза нагою,
Там жыта капою.
Дзе каза рогам,
Там жыта стогам.
Дзе каза не ходзіць,
Там жыта не родзіць.

На балоце была,
Па лесе хадзіла
Ваўчат навучаці
Танцы танцаваці.
Каза мая вучона,
Кіем ахрышчона.
Ты, каза, сагніся,
Нізка пакланіся
І гэтаму пану,
Як таму гетману!
Хай будзе здароў,
Нам прышле дароў.
Ішлі ад ваяводы,
Стрэлі нас прыгоды:
Выскачыў з лесу воўк,
Аблупіў казе хвост,
Выстраліў стралец,
Адбіў казе хвасцец.
Каза мая ўпала,
Лягла і прапала.
Я лякарства зраблю,
Казе хвост прыляплю,
Кійком бачок змачу,
Нагою падважу.
Уставай, каза, усхапісь,
Гаспадыні пакланісь
Да саменькіх ножак,
Няхай дасць піражак!
Гаспадыня ў рэшаце
Бліны нам валачэ.
Ключыкам звякане,
Каморачку адамкне;
Нясе адтуль пляшку
І цялячу ляжку,
І збаночак мёду —
Нам на ўсалоду.
Пакланіся ўсім,
Старым і малым!
Закладай свае рогі,
Падбірай свае ногі!
З гэтай хаты выхадзі,
Бяду, гора вынасі!
Уцякаюць хай хутчэй
З гаспадаравых вачэй!
Го-го, козанька!
Го-го, шэранька!
Павярніся складней,
Пакланіся зграбней!

У час спеву «каза» ходзіць дробнай ступою то ўзад, то ўперад, то налева, то направа, а павадыр ёй кіруе, найбольш кіем. Як спяваюць прыгоды, «каза» кладзецца і прыкідваецца мёртвай, потым усхопліваецца і кланяецца. Адзін з чарады

гаворыць віншаванне:

Будзь, ваша, здароў,
Як рыжок бароў!
Май торбу грошы,
Жыві ў раскошы!
Май усяго даволі,
А бяды ніколі!
Стары год канчаем,
Новы зачынаем
З ранняю вясною,
З буйнаю травою,
З збожжам каласістым,
З зярном ядраністым
Ды з прыятным летам
І з грашом пры гэтым.
І з восенню яснай,
І з долечкай шчаснай!

— Дзе вы гэту казу дасталі? — пытае, нарэшце, гаспадар.

— За граніцай на кірмашы ад старога купіў,— адказвае павадыр,— семсот грошай заплаціў.

— А дзе сам так вучыўся?

— Па ўсім свеце ходзячы, торбу хлеба носячы, між людзей бываючы, дзівы дзіўныя відаючы, розныя кнігі чытаючы, уверх нагамі трымаючы. А вы здаровы бывайце, за год нас чакайце.

## КАЛЯДНЫЯ ЗВЫЧАІ

Першую Каляду трэба праводзіць, не еўшы да першай зоркі, пакуль на небе не з'явіцца зорка. На стол, на якім вячэраюць, пад абрус кладзецца сена ў знак таго, што Хрыстос быццам бы нарадзіўся на сене. Некаторыя сяляне для большай урачыстасці замест лямпы ці лучыны запальвалі на Каляду свечкі свайго вырабу. Гарэлка, купленая для ўжывання на Каляду, павінна быць куплена за грошы альбо пазычана, але ні ў якім разе не ўзята ў абмен на збожжа. Калі гарэлку атрымаць за збожжа, то яно не ўродзіцца. У першы дзень Ражства гаспадар ловіць пузыры ў кіпятку і палівае імі авёс, які досвіта дае коням, каб яны былі такія ж гладкія, як і пузыры, і каб так жа сама шпарка бегалі. Выпускаючы ў першы дзень Ражства свіней з хлява, а таксама на Новы год і на Кшчэнне, трэба кідаць ім у вочы снег, каб яны ўлетку не бачылі шкоды. Калі хто не нарыхтаваў к сьвяту дроў і прымушаны сячы іх у часе святаў, то ён развядзе ў сваёй гаспадарцы столькі мышэй, колькі махне сякераю. Калі на першую Каляду будзе шмат снегу, то год будзе ўраджайны.

# КАЛЯДЫ НА БЕЛАРУСІ

Цыкл калядных свят на ўсім хрысціянскім свеце пачынаецца ўвечары 24 снежня. У гэты вечар дзіўна дзеець на чалавека ўсё акружаючае і ўсё немагчымае робіцца магчымым. Усё нежывое ажывае, прырода думае, гаворыць людской мовай. Гляньма цяпер, ці ўсе гэтыя ўяўленні і надзвычайныя праявы паўсталі пад уплывам хрысціянства?

Калядныя святкі цалкам перанесены з далёкага свету язычніцкага ў сучаснасць, якая старалася афарбаваць іх формай хрысціянскай і ўкласці хрысціянскі змест. Але народныя традыцыі, асабліва духовыя вераванні, глыбока закараніліся ў душу паасобных адзінак, а таксама і ў душу цэлага народа, племя, сям'і. І язычніцкі элемент калядных святкаў, міма ўсяцэлага хрысціянізавання народа нашага, ператрываў да сягоння, хоць і з імглістымі формамі, але затое са зместам вельмі выразным. Касцёл і царква як установы на нашых землях з чужым кіраўнічым элементам, а таксама чужая цывілізацыя за чатыры-пяць апошніх стагоддзяў не патрапілі вырваць з душы народа таго, што было святым і неабходным у жыцці духовым беларуса. Усе традыцыі з жыцця духовага міма ўсякага глуму захаваліся да сёння.

У беларуса-селяніна ёсць дзве веры: вера прашчураў, пераходзячая дарогай традыцыі з пакалення ў пакаленне, і вера новая — хрысціянская, якая з'яўляецца ў яго паняцці афіцыяльнай, мала дзеючай на яго маральна-псіхалагічнае жыццё. Хрысціянская этыка для беларуса з'яўляецца «кодэксам карным» інстытуцыі боскай. Беларус не робіць зла, бо баіцца пекла. А калі б не было пекла і «кодэксаў», то таксама не рабіў бы зла, бо яму не дазваляла б на гэта этыка народная — традыцыйная. Глыбокага зразумення хрысціянскай навукі ў беларуса няма (хіба пачуццёвасць толькі); ён яе зразумець не можа, бо яна сягоння плыве да яго ў незразумелай форме, чужой мове. Словам, беларус не са сваёй віны мае сягоння дзве веры. За прыкладамі далёка хадзіць не трэба.

У каляднай абраднасці бачым тры найважнейшыя язычніцкія элементы: 1) памінальны (культ продкаў), 2) аграрны (земляробскі) і 3) любоўны (сватаўство, жаніцьба).

Усе вышэй успомненыя элементы выступаюць асабліва ў передкалядны вечар (на куццю). У гэты вечар, падчас вячэры, бачым, як найстарэйшы з сям'і — дзед, бацька кіруе абрадамі: ён першы з урачыстым настроем сядае на покуці і першы бярэ лыжкай куццю і запрашае на вячэру мароза або Васіля: «Васіль, Васіль, хадзі куццю есці». Ці ж у гэты

момант не бачым старадаўніх язычніцкіх форм тагачаснага родавага ладу? Ці даўней не кіраваў абрадавай урачыстасцю патрыярх — найстарэйшы з роду, клану, племя, сям'і? Патрыярх, які на Дзядах займае першае месца і кіруе ўсёй абраднасцю, ці ж не йграе ролю язычніцкага светара-духоўніка? Гэта ж ён запрашае на куццю душы продкаў, гэта ён кідае кашу ў кут «дзеду» нябачанаму, які прыйшоў з-за свету. Гаспадыня, варачы куццю, не каму іншаму, толькі душам продкаў тры лыжкі накіпу ліе ў памяльнік або ў падпечак. Таксама ў гэты вечар добра хату нацапліваюць, «каб душачкі маглі абагрэцца». Не каму іншаму, як толькі «дзядам» пакідаюць на стале няз'едзеную абрадавую вячэру і ставяць лыжкі кругом місы з куццёй, а таксама, калі сядзяць пры вячэры, пакідаюць адно вольнае месца для таго, хто з родных нядаўна памёр. А хто ж мае зашкодзіць людзям і жывёле, калі не духі памёршых, калі б хто адважыўся працаваць у святыя вечары ад куцці аж да Хрышчэння?

Пералічаныя факты цвёрда нас пераконваюць аб існаванні памінальнага элемента ў каляднай абраднасці. Не менш выяўляецца і элемент аграрны (земляробскі), гэта свята земляробскае, свята ўраджаю. Па вячэры з-пад настольніка выцягваюць па адным каліве сена. Хто выцягне даўжэйшае, у таго лён вырасце вялікі. Або глядзяць атрускі пад сенам: якога збожжа зярнят будзе больш, тое лепш уродзіць у будучым годзе. Таксама на другі дзень Каляд гаспадар ідзе ў гумно і кожнага збожжа па жмені сыпле празградкі ў асеці, і якое збожжа гусцей на таку ўпадзе, тое лепш уродзіць. У Браслаўскім павеце нясуць на куццю ў касцёл свяціць авёс (стары звычай, хрысціянізаваны пазней). Гаспадар на куццю ідзе ў сад і абвязвае фруктовыя дрэвы вязьмом, каб добра радзілі; па вячэры пчаляр ідзе да вулляў і слухае, ці «пчолкі гудзяць», або слухае, «аб чым скаціна гавора». Калі на куццю падае снег, то пчаляр пэўны, што ў наступным годзе будзе шмат раёў.

Калі дрэвы пакрыты шэранню, то многа будзе цвету на фруктовых дрэвах. І цэлы шэраг іншых павер'яў існуе ў беларускага селяніна, якія гавораць аб моцным элеменце аграрным у калядных звычаях.

Элемент любоўны, або ў мінуўшчыне жаніцьба, хапанне жонак з чужога роду, праяўляецца ў калядных варожбах і гульнях моладзі: на куццю, пасля вячэры, дзяўчаты выбягаюць на вуліцу і абымаюць плот, пасля лічаць тын: калі да пары, то выйдзе замуж у будучым годзе, калі ж не, то астанецца да наступнага года. Таксама бяруць дзяўчаты з дрывотніка

дровы наўгад і, прынёсшы ў хату, лічаць. У некаторых мясцовасцях дзяўчаты ідуць у хлеў і ўпоцемку бяруць са статка ягня: калі прынясе баранчыка, то памысна, калі авечачку, то не. Падходзяць пад вокны суседзяў і пытаюць: «Ісці?» Калі выпадзе адказ: «Сядзі»,— то азначае, што замуж не выйдзе.

Больш жорсткай формай варажбы з'яўляецца вось якая: дзяўчына апоўначы босая нясе на крыжавыя дарогі смецце і, рассыпаўшы на ўсе чатыры стораны свету, слухае: у якім баку забрэша сабака — у той бок і замуж выйдзе. Хлопцы ўночы абцягваюць барану кругом вёскі, каб ніводная дзяўчына ў чужую вёску замуж не выйшла.

Найвыразнейшай формай жанімскага абраду з'яўляецца калядная гульня, вядомая ва ўсходняй Беларусі і ў паветах Браслаўскім, Дзісенскім, Пастаўскім і Свянцянскім, гэта «Цярэшка»: на другі дзень Каляд моладзь сходзіцца ў адну хату, выбіраюць «бацьку» і «матку» са старэйшых, якія пасля моладзь лучаць у пары. Адбываецца агульнае частаванне з гарэлкай, пасля чаго не выключаны моманты і сапраўднага жаніцтва...

Усё вышэй успомненае выразна нам абмалёўвае пра старыя беларускія народныя традыцыі. Толькі ж гэтыя старыя традыцыі і ўкрыты змест надаюць урачысты настрой Калядам у народаў менш цывілізаваных.

Хрысціянскія калядныя абрады, можна сказаць, пачынаюцца і канчаюцца толькі ў царкве, касцёле, і характар іх зусім іншы.

## ГРАМНІЦЫ

У беларусаў больш, чым у якога-небудзь іншага славянскага племя, захавалася ўсялякага роду забабонаў і абрадаў з паўхрысціянскім, паўязычніцкім характарам. У самой беларускай гаворцы сустракаюцца вельмі яўныя сляды язычніцтва. У гутарковай мове велікаросаў і маларосаў не сустракаем ніводнага імя са старажытнарускіх язычніцкіх багоў, між тым як беларусы і да цяперашняга часу замест таго, каб сказаць «маланкай забіла», «маланкай спаліла», гавораць «пярун забіў», «пярун спаліў», «перуном спаліла». Намёк на другое старажытнарускае бажаство заключаецца ў беларускай назве хрысціянскага свята «Сретение». Акрамя царкоўнай назвы свята гэта носіць у беларусаў і іншую, чыста язычніцкую назву «Грамніцы». Апошняя назва напамінае імя старажытнарускага язычніцкага бога Грамоўніка.

Якім жа чынам адбылося прымеркаванне да хрысціянскага

свята язычніцкай назвы? Богу Грамоўніку старажытнарускія язычнікі прыпісвалі сілу ўчыняць вясеннія навальніцы і цёплыя веснавыя дажджы, дабратворныя для расліннага царства. Відаць, на люты месяц прыходзілася здзяйсненне ўрачыстых ахвярапрынашэнняў у гонар гэтага дабратворнага вясенняга бажаства, таму што, па народным уяўленні, іменна на люты падае сярэдзіна зімы («Грамніца — зімы палавіца»,— гавораць яшчэ і цяпер беларусы). З лютага іменна пачынаецца паступовае аслабленне зімовых марозаў і сонейка пачынае праграваць зямлю-матухну, якая знаходзіцца ўсё яшчэ ў ледзяных абдымках зімы, увасабленнем якой у старажытнарускіх язычнікаў служылі Баба Яга касцяная нага і Кашчэй Бессмяротны. «На Грамніцы зіма з летам сустракаюцца»,— гавораць беларусы. З гэтага часу пачынаецца паступовае падзенне ўлады змрочных багоў зімы, і людзі чакаюць прыходу светлага бога вясны і вясенніх цёплых дажджоў — Грамоўніка. Ад імя гэтага язычніцкага бажаства і паходзіць беларуская назва «Грамніцы».

Да Грамніц беларусы-сяляне рыхтуюць па магчымасці самыя вялікія васковыя свечкі, якія называюцца ў іх грамнічнымі, ці проста грамніцамі. У каго ёсць пчолы, той робіць гэтыя свечкі са свайго воску, а ў каго няма пчол, той купляе звычайны жоўты воск. У дзень самога свята беларусы ідуць з падрыхтаванымі раней свечкамі ў царкву, дзе свечкі запальваюцца, а затым пасля літургіі асвячаюцца. «Асвячоным» агнём беларусы падкурваюць накрыж валасы на галаве, а затым, прыйшоўшы дамоў, выпальваюць грамнічнымі свечкамі на верхніх касяках акон і дзвярэй крыжы. Тут ужо сказваецца хрысціянскі ўплыў. Але даўней, у язычніцкія часы, агні, якія запальваліся ў гонар бога Грамоўніка, азначалі, відаць, неперdesignможную сілу веснавога цяпла.

Грамнічная свечка іграе вельмі прыкметную ролю ва ўсіх забабонных абрадах і звычаях беларусаў. Гэтую свечку даюць у рукі паміраючаму ў хвіліну перадсмяротнай агоніі, носяць яе на поле ў час сяўбы і жніва, адганяюць гэтай свечкай ведзьму ад каровы, якая перастала даваць ранейшую колькасць малака. З гэтай свечкай ідуць шукаць купальскія скарбы і г. д. Але галоўнае прызначэнне грамнічнай свечкі — ахоўваць ад навальніцы дом, у якім яна знаходзіцца. Гэта апошняя акалічнасць таксама ўказвае на язычніцкае паходжанне слова «грамніцы».

## ГРАМНІЦЫ

Свята гэта ў беларусаў-сяльчан вядома з язычніцкага перыяду. Яно было прысвечана богу вясны і веснавых цёплых дажджоў — Грамоўніку. Яму папярэднічае «прысвятак» Васіля ды Ягора (30 студзеня). Да Грамніц хрысціяне (праваслаўныя і каталікі) рыхтуюць васковыя свечкі, якія асвячаюць у самое свята ў храмах за абедняй, а таму яны і называюцца грамнічнымі. Пасля прыходу з царквы гаспадар дома накрыж падпальваў такою свечкай валасы на галаве ва ўсіх членаў сваёй сям'і, таму што грамнічныя свечкі «грамяць» сілу д'ябальскую ў асобе ведзьмаў і чарадзеяў і ахоўваюць ад хвароб галовы. Гэтыя ж свечкі запальваюцца ў час навальніцы і смерці людзей, у руках з якой чалавек выпускае апошні дух.

У Бельскім павеце Гродзенскай губерні на Грамніцы варожаць аб ураджаі. «Калі на Грамніцы певень нап'ецца вадзіцы, то на Юр'я вол наесца травіцы», г. зн. калі на Грамніцы растане снег, то на Юр'я на лугах будзе ўжо трава. У іншых месцах прынята за правіла на Грамніцы есці сем разоў на працягу ўсяго дня, каб зрабіць запас для сямітыднёвага Вялікага посту, які павінен быць.

З Грамніц земляроб ужо думае аб вясне, аб будучых палявых работах. («Да Грамніц не скідай з рук рукавіц, а як прайшлі Грамніцы, то ўжо не трэба рукавіцы».)

З існаваўшых абрадавых бакоў ушанавання Грамніц цяпер застаўся толькі адзін — асвячэнне васковых свечак, што практыкуецца пераважна сярод каталікаў, таму што ў праваслаўных сяльчан грамнічную свечку выцясняе паступова свечка «страсная», якая, як вядома, запальваецца ў час чытання...

## ГРАМНІЧНЫЯ СВЕЧКІ

...Сваё слова «аб грамнічных свечках» аўтар абмяжоўвае асабістымі ўспамінамі гадоў за 45 перад гэтым у прыходах нашай Полацкай епархіі — Паддуб'еўскім, Каралеўскім, Стасеўскім, Веляшковіцкім, Замшынскім, Колышскім, Янавіцкім, Вымненскім і Катоўскім, г. зн. на паўднёва-ўсходняй ускраіне Віцебскай губерні (Віцебскага п.), і ў прыходах Дабейскім, Ловажскім, Сіроцінскім, Спаскім, Обаль-Ануфрыеўскім, Баноньскім, Махіраўскім, Стара-Замшанскім і Бельскім, г. зн. у заходняй частцы той жа губерні (Полацкага п.).

Звычайна кожная сям'я, што жыла ўласнай гаспадаркай, пачынаючы з Новага года, а то і раней, клапацілася аб набыцці

кавалка воску, які, за адсутнасцю ўласных пчол, здабывала купляю, менаю, падарункам выключна ад пчаляроў, але не з агаркавых вытапкаў, а з сотавых вытапкаў непасрэдна. Па гэтай прычыне некарыслівыя пчаляры пакідалі запасы воску і на ўласную патрэбу, і на патрэбу несумненных шукальнікаў воску і толькі пры задавальненні гэтых патрэб збывалі рэшткі ў рукі гандляроў.

Напярэдадні свята Грамніц гасподніх, але часцей за ўсё ў апошнюю суботу перад ім, нават і ў тым выпадку, калі гэта субота прыпадала на «радзіцельскую» («тоўстая субота», «мясаедныя Дзяды»), кожны гаспадар асабіста па сіле ўмення вырабляў («сучыў») для свайго дому свечку з прыхаванага воску, прычым той, хто меў васковыя дастаткі, рыхтаваў яе вяршкоў у 10 даўжынёй і ў 3/4 вяршка таўшчынёй, г. зн. такога памеру, які дазваляў бы схаваць свечку на грудзях пад верхняй вопраткай або ў рукаве і такім чынам утаіць ад чужых прысутнасць свечкі. Свечка, большая за ўказаны памер, наўмысна даўжэй гарэла пры першым запальванні, каб быць даведзенай да ўмоўнай даўжыні. Зразумела, асобы са сціплымі запасамі воску выраблялі свае свечкі значна меншых памераў, хаця і ў іх свечкі бывалі не карацей 5 вяршкоў пры таўшчыні ў мезены палец. Толькі нямногія, што апынуліся ў крайнасці, куплялі гатовыя свечкі ў гарадскіх лаўках ці ў сваіх прыходскіх цэрквах, аддаючы перавагу, аднак, ахвярным («офярным») свечкам хатняга, а не заводскага вырабу. Так або інакш здабытыя свечкі яшчэ не называліся грамнічнымі, а лічыліся толькі прыгатаванымі да Грамніц. Яны захоўваліся ў розных месцах: у сенцах, у клеці, у свірне як простыя прадметы штодзённага ўжытку. У гэтым выпадку дазвалялася ўжываць прыгатаваную свячу пры гасцявых, напрыклад, патрэбах, пры вячэрніх работах, але такая свяча ўжо не ўжывалася потым на грамнічныя патрэбы, а спальвалася пры будзённым ужыванні або пераплаўленая паступала на прыгатаванне новай свячы, дарылася беднаму, адносілася ў царкву, у капліцу.

У Грамніцы (г. зн. у свята Грамніц гасподніх) абавязкова кожны гаспадар, а ў выключным выпадку замест яго гаспадыня прыбываў (ла) у сваю прыходскую царкву, дзе, як гэта адбывалася па чыну уніяцкага трэбніка «Благаславенне свечак на Грамніцы гасподнія», над укладзенымі на століку, табурэтках або на ўнесенай у царкву лаўцы свечкамі чыталася пяць спецыяльна прымеркаваных да іх малітваў, тварылася трохразовае кадзенне іх (свечак), акрапленне свянцонай вадой і трохразовае ж асяненне іх напрастольным крыжам,

з якім святар выходзіў з алтара для трэбаспраўлення. Уніяцкі трэбнік указвае дакладны тэрмін трэбаспраўлення... Па сканчэнні свяшчэннік уласнаручна ўручаў гаспадарам іх свечкі... Багамольцы-гаспадары запальвалі асвянцоныя свечы з воклічам свяшчэнніка: «благаславенна царства» — і тушылі іх пасля літургічнага Евангелля,— тушылі пераварочваннем кнота ўніз і хавалі свечы за пазуху, у рукаў або заварочвалі ў хусціну, у халсціну; так трымаліся свечы ў царкве да канца літургіі і ўжо пад сапраўдным імем грамнічных свечак яны дастаўляліся дадому. Заўважалася: калі грамнічныя свечкі, як і царкоўныя, трашчалі ў час гарэння — летам трэба чакаць грамоў, і чым мацней, часцей быў трэск, тым часцей і страшней будуць летнія навальніцы і наадварот.

Першымі дзеяннямі гаспадароў, якія вярнуліся дадому з грамнічнымі свечкамі і пакуль што не распрануліся, бывалі наступныя: гаспадыня неадкладна і асабіста запальвала свечку ў руках гаспадара. Гэты апошні перш за ўсё крыжападобна абпальваў уласныя валасы на галаве, а затым рабіў тое ж самае з валасамі ўсіх членаў сям'і па старшынстве. Пасля гэтага ўся сям'я пры абавязковым удзеле гаспадара і гаспадыні ішла ў хлеў (абору), дзе гаспадар зноў жа крыжападобна абпальваў воўну кожнай жывёліны паасобку, датыкаўся полымем свечкі да кожнай сцяны, вушакоў дзвярэй. Тое ж рабілася ў астатніх гаспадарчых збудаваннях, да бані ўключна, а таксама ў пчальніку пры кожным вуллі. Зрэшты, у больш строгіх сем'ях такога абпальвання не рабілася над жанчынамі, конямі, свіннямі і ў банях.

Па вяртанні сям'і ў хату гаспадар тушыў і хаваў свячу. Так грамнічная свяча ўкрывалася для таго, каб ліхадзей не мог бачыць яе і, такім чынам, не ведаў бы аб прысутнасці прадмета, які працідзейнічаў злым намерам ліхадзея.

У далейшым на працягу года грамнічная свечка запальвалася ў наступных выпадках выключна хатняга жыцця:

а) пры прыняцці бабкай нованароджанага;

б) пры адпраўленні яго да св. хрышчэння;

в) пры першых праведках нованароджанай жывёлы, пераважна цялят і ягнят;

г) пры вясельнай змове, як і ў розных здзелках;

д) пры адпраўленні члена сям'і ў далёкі шлях, у рэкруты, у школу;

е) пры канчыне чалавека (свечка даецца ў рукі паміраючаму);

ж) пры вострых прыпадках — канвульсіях, каталепсіі;

з) пры небяспечнай навальніцы летам;

і) пры насыпцы насеннага хлеба ў мяшкі перад сяўбой і пры засыпцы ў засек першага вымалачанага хлеба;

к) пры першым выгане жывёлы ў поле і першай сустрэчы яе па вяртанні з пашы;

л) пры абходзе збудаванняў з крэйдай (пісаліся крыжы на дзвярах і сценах на Каляды) і з каляднай вадой на куццю (5 студзеня) і Вадохрышча;

м) пры разгавенні на Каляды і Вялікдзень;

н) пры перадтрапезнай малітве на Дзяды і нават у час гэтай трапезы.

За выключэннем таго, калі свечка знаходзілася ў руках паміраючага, пры келейным ужыванні, яе месца бывала: то сярэдзіна стала (у асобнай стойцы з бурака, бручкі, у бутэльцы «ліхтарыку»-падсвечніку), то бажніца; а ў астатніх месцах свечка трымалася ў руках гаспадара або гаспадыні, г. зн. таго, хто выходзіў з ёй з хаты. Незапаленая грамнічная свечка (у дзень Грамніц, у Іванаў дзень і інш.) прывешвалася на ноч да дзвярнога верхняга касяка ў жывёльных пабудовах, кнотам уніз, каб ведзьма і іншы дух не маглі даступіцца да жывёлы для сурокаў і знікнення малака ў кароў. У гэтым выпадку меркавалася, што ліхадзеі абпаляцца і пойдуць ад засцярожаных дзвярэй. З той жа незапаленай свечкай гаспадары пачыналі і заканчвалі сельскагаспадарчыя работы — пашу, жніво, касьбу, малацьбу і г. д. Здаралася нярэдка, што гаспадыня забяжыць у свой хлеў з грамнічнай свечкай і, бегаючы па ім, стане рабіць ёю прыкладныя рухі, быццам рыхтуецца абпаліць нябачнага ліхадзея. Рабілася гэта, так сказаць, авансам, пераважна ў тых выпадках, калі заўважаліся злыя намеры суседзяў, а таксама і пры відавочным расстройстве здароўя жывёлы, худобе і хваравітасці яе.

Самыя сплавы грамнічнай свечкі (а такія сплавы бывалі непазбежнымі ў выніку няўмелай апрацоўкі, непрапарцыянальнасці кнатоў, перамяшчэння запаленай свечкі і інш.) цаніліся значна вышэй простага воску. Кусочкі свечачнага сплаву даваліся як лякарства людзям і жывёле, насіліся пры целе як амулеты, прычым са сплаваў ляпіліся падабенствы тых членаў цела, якія пажадана было засцерагчы ад хваробы ці аднавіць у іх аслабленую жыццядзейнасць. Тымі ж сплавамі падкурваліся пры спалохах, у ліхарадках, падкурвалі захварэўшую жывёлу, навітую воўну, сеці, насенне, нават адзенне. Калі на працягу грамнічнага года свечка паслужыла хаця і палавіннай частцы вышэйназваных патрэб, то к канцу яго «грамнічная свечка прыгарала» да маленькага агарка, які ў новым годзе ўжо ўжываўся нароўні са сплавам пры

ўказаных патрэбах. Але калі такіх патрэб не бывала і грамнічная свечка значна ўцалела, яна дапальвалася ў святыя вечары — на Каляды і пераважна напярэдадні свята Грамніц господніх.

Застаецца дадаць, што грамнічныя свечкі не падлягаюць пазычанню, як і агонь, нават у блізкія дамы сваякоў, родным асобам, што жывуць у іншай сям'і. Сам попыт аб такім пазычанні прымаўся як нешта крыўднае і калі часам падлягаў задавальненню, то апошняе насіла адпаведна крыўдны характар.

## МАСЛЕНІЦА Ў ВЁСЦЫ

У вёсцы Масленіца, уласна, пачынаецца ў чацвер. Спачатку мужычок скупіцца: першыя два-тры дні на Масленічным тыдні яго гаспадыня пячэ бліны аржаныя, аўсяныя ці ячныя, а пасля, калі работа зусім спыніцца і настануць дні «развітальныя», мужык, за малым выключэннем, есць бліны з куплёнай грэцкай мукі. Сялянскі блінец рэзка адрозніваецца ад бліна іншых саслоўяў і па сваім аб'ёме, і па сваім змесце: цяжкі, наздраваты. Звычайна на стол падаецца цэлы стос бліноў. Гаспадар разразае гэты стос крыж-накрыж, на чатыры часткі, а затым кожны член сям'і бярэ чвэрць бліна, скручвае яго і апускае ў міску з тварагом і разагрэтым каровіным маслам. Добрая вясковая баба ўмее цудоўна зберагчы летні «пятроўскі» (г. зн. назапашаны ў час Пятроўскага посту) тварог, які яна злёгку перацірае з соллю, кладзе ў які-небудзь посуд і зверху залівае гарачым каровіным маслам. У такім выглядзе тварог можа доўгі час захоўвацца несапсаваным. Бедны мужык, гаспадыня якога не змагла назапасіць тварагу, змазвае свае бліны посным канапляным алеем.

Разам з блінамі падаецца на стол і селядзец. Гарэлку на Масленіцу пачынаюць піць з пятніцы. Даўней быў добры звычай: у апошні дзень Масленіцы «развітвацца». Вечарам, пасля вячэры, гаспадар садзіўся «на кут» у строгім і набожным настроі духу. Да яго па чарзе падыходзілі спачатку браты і сыны, а пасля і жанчыны і, кланяючыся да зямлі, гаварылі: «Прасці, бацька родны, калі чым саграшыў перад табою, справай ці языком». Пасля таго як усе дамачадцы канчалі з абрадам «развітання», гаспадар сыходзіў са свайго месца і ў сваю чаргу кланяўся да зямлі ўсяму свайму сямейству, просячы таксама даравання за ўсе свае грахі і памылкі.

Сваты, кумы і радня бойка ездзяць на сваіх санках адзін да другога. Прыцемкам збіраецца на вуліцы гурт моладзі. Песні спяваюць, скачуць, Масленіцу праводзяць.

У Краснінскім павеце па вёсках існаваў такі звычай, які меў прамыя адносіны да Масленіцы. У панядзелак на Масленічным тыдні збіраюцца бабы з усёй вёскі, бяруць пояс ці папругу і прывязваюць да аднаго канца яго невялікі, але тоўсты абрубак дрэва, а другі канец пояса прывязваюць да нагі халастога хлопца, які ім сустракаўся, як бы ў пакаранне за тое, што ён не жаніўся за мінулы Мясаед. Калі хлопец не пажадае насіць гэты цяжар за сабою ўвесь дзень, ён павінен адкупіцца і даць бабам на пернікі некалькі манет. Тое самае праблялася і з дзяўчатамі, калі яны не выйшлі ў Мясаед замуж, хоць гэта адбылося і не па іх віне.

## МАСЛЕНІЦА І ВЯЛІКІ ПОСТ

Ціха, амаль бязгучна праходзяць дні шырокай Масленіцы ў Беларусі. Можна назіраць толькі слабыя водгласы ўсеагульнага разудалага балявання Русі. У некаторых сёлах, дзе жыхары доўгі час былі уніятамі, сяляне часам ужываюць мясную ежу ў гэтыя дні. Бываюць і такія выпадкі (хоць рэдкія), што Загавіны адкладваюцца на аўторак першага тыдня Вялікага посту. Гэта пераважна назіраецца ў змешаных сем'ях. На мясапосным тыдні беларус наладжвае «запускі» на кілбасу і мяса. Гэтыя «запускі» цудоўныя як дзень перанасычэння скаромнай ежаю. На Запускі гаспадыні мардуюць сябе гатаваннем ежы. «То пячы, то вары, нават поту ўцерці некалі»,— гавораць яны. Нельга сказаць, каб кухня беларуса ў гэты дзень адрознівалася вытанчанасцю і разнастайнасцю: ежа гатуецца звычайная, толькі багата засквараецца салам і свежынай. Варыцца капуста і квас, але такі, каб заслаўся тлустасцю; верашчака, якая павінна перапаўняцца скваркамі. Апрача гэтага, у верашчаку кладуць яшчэ дзве-тры каўбасы, так што тлушч тоўстым слоем закрывае яе зверху. Каша, куцця і крупнік павінны плаваць у тлустасці. Як прывілеяваную страву на Запускі трэба адзначыць квашаніну, ці студзень. Гатуецца яна з свіных ног, галавы і вушэй. Больш блізкія сваякі на Запускі перазываюцца і загаўляюцца сумесна. У такіх выпадках неабходнаю прыналежнасцю стала з'яўляцца «тая, што яна нараджая, яна і пахавая», г. зн. гарэлка. У агульным вячэра на Запускі не адрозніваецца асабліваю абраднасцю.

З шэрагу іншых масленічных дзён па некаторых прымеркаваных да Масленіцы звычаяў выдзяляецца чацвер. Ён носіць назву ў сувязі з імем упамінаемага «святога Уласа». У гэты

дзень, па павер'і беларуса, першы раз павінен заспяваць жаваранак. Дарэчы, трэба заўважыць, што, паводле ўяўлення беларуса, жаваранак не вылятае на зіму на поўдзень (у вырай), а замірае да наступнай вясны дзе-небудзь ва ўтульным месцы на полі, пераважна пад мяжой. Таму ён і з'яўляецца на полі раней за іншых — «як толькі адтаюць межы». Ва Усялюбскай воласці Мінскай губерні на Уласа абучаюць маладых коней і быкоў (валоў). Як рэшткі масленічнай весялосці ў той жа мясцовасці захаваўся звычай наладжваць у гэты дзень «гойданку» (імправізаваныя гушкалкі) і гойдацца (гушкацца). Раней «гойданка» наладжвалася «пры браме» (пры варотах), якая вяла з двара. Цяпер (у той час, калі рабілася гэтае апісанне Масленіцы.— *А. Г.*) «гойданку» наладжваюць у гумне. Гойдаюцца толькі хлопцы і дзяўчаты, прычым іншы раз бывае і пачастунак. На пытанне адносна значэння гэтага звычаю адзін селянін адказаў: «Гэта гойдаюцца ля таго, каб на той год рос лён доўгі і моцны».

Масленіца заканчваецца «запускамі» на малако, якія наладжваюцца ў нядзелю. У гэты дзень таксама бывае вячэра, толькі яна складаецца з адных малочных страў, сярод якіх значную ролю адыгрываюць сыр, масла і тварог з малаком.

У першы дзень Вялікага посту ўвесь посуд чыста вымываюць, «шаруюць вехцем і саломай». У іншых месцах яго папярэдне перад ужываннем нават загартоўваюць. У гэты дзень усе старэйшыя члены сям'і, за рэдкім выключэннем, ходзяць у бліжэйшую карчму «паласкаць зубы». Гэта «паласканне зубоў» складаецца ва ўзаемным частаванні адзін другога гарэлкай. Зразумела, падобныя справы не могуць абысціся без рознага роду непрыстойных для першага дня посту сцэн. Чысціць зубы быццам бы трэба для таго, каб выпадкова там не застаўся кусочак скаромнай ежы. Існуе даволі характэрны ў гэтым сэнсе анекдот: «Адзін цыган пытаўся ў ксяндза, ці можна есці тое мяса, што застанецца ў зубах пасля запускаў. Ксёндз сказаў, а які ж то можа быць грэх, як засадзіў ты яго ў зубы, дык усё роўна што і з'еў. Вось цыган на другія запускі ўзяў цэлы поляц (вялікі кусок сала) і засадзіў яго адным канцом у зубы — і гэтак пераначаваў. Пасля ўжо цэлы постварыў страву з гэтым салам».

У сяле Мікольск Мінскага павета ў гэты дзень хлопцы па вуліцах цягаюць «калодку». Для гэтага збіраецца гурт хлопцаў, бяруць драўляны цурбан і прымацоўваюць да яго вяроўку. Адзін з хлопцаў «запрагаецца» і цягне яго па вуліцы. Астатнія, перакідваючыся жартамі, ідуць за ім. Да іх далучаюцца дзеці і шумным гуртам, не звяртаючы ўвагі на покліч бацькоў і холад,

часта нават басанож, з напружанай цікаўнасцю суправаджаюць «калодку». Падышоўшы да хаты, дзе ёсць дарослая дзяўчына, хлопцы прыпыняюцца і патрабуюць выкуп за «калодку». Дзяўчына выходзіць на двор і запрашае хлопцаў зайсці ў хату. Там іх частуюць гарэлкай, прычым на закуску падаецца ў большасці выпадкаў сырая капуста. Іншы раз хлопцы жартам загрувашчваюць «калодкаю» ў якога-небудзь селяніна выхад з хаты, і той павінен прапанаваць ім пачастунак. У такім парадку яны абыходзяць усё сяло. Не прыпыніцца з «калодкаю» перад хатай, дзе ёсць сталая дзяўчына, лічыцца вялікай крыўдай для яе.

Простая (непераборлівая) і бедная кухня беларуса і ў Мясаед. У пост яна робіцца яшчэ бяднейшай. За снеданнем беларус ужывае свежаспечаную ці звараную бульбу (у большасці выпадкаў бульбу ў мундзірах), бульбу з саладухай ці хлеб з той жа саладухай. На абед падаецца з кіслых страў капуста ці квас, з прэсных — крупнік, аржаная каша, прыварковая каша, у рэдкіх выпадках — і гарохавы суп. Вячэра складаецца з рэшткаў абеду, ці калі ўсё нагатаванае з'ядаецца за абедам, то зноў вараць бульбу ці гатуецца якая-небудзь каша.

У святочныя дні ці ў нядзелю пякуцца блінцы і варыцца верашчака з грыбамі, сялёдачным расолам (лёкам) і «малаком» з канаплянага семя.

З пераліку посных страў відаць, што склад іх той жа, што і ў Мясаед, толькі «акраса» для іх у посны перыяд ужываецца іншая. Як «акраса» відную ролю выконвае ў беларускай кухні канаплянае семя, з якога робяць муку шляхам таўчэння яго ў ступе, ці малако — пры дапамозе расцірання семя ў «церле» (гліняная пасудзіна, якая мае выгляд усечанага конуса). У тым і другім выглядзе яно дадаецца ў ежу для прыпраўкі. Акрамя гэтага, у некаторых месцах беларусы ўмеюць з дапамогай самаробных ціскоў дабываць з канаплянага і льнянога семя алей. Куплёны алей і селядзец з'яўляюцца як раскоша толькі за сталом заможных сялян. Мак і грыбы таксама лічацца рэдкасцю.

Асабліва налягае беларус на хлеб і бульбу. Гэта адзіны яго «пасілак». «Хто есць многа хлеба, той чырвоны, як рыжык»,— гаворыць беларус. Таксама часта можна пачуць фразу: «Адною картопляю толькі і жывіліся». Апошняя як нельга болей справядлівая ў адносінах да посту. «Картоплю» ў пост беларус ужывае ва ўсемагчымых відах: параную, печаную, вараную з крупнікам ці кашай і тоўчаную (камякі). Пагэтаму гора селяніну, калі не ўродзіцца бульба.

Сачавіцай беларус чамусьці грэбуе і заве яе не сваёю ядой.

Стравы саладуха і мілта, ці талакно, пераважна адносяцца да посту. Першая з гэтых страў рыхтуецца з соладавай мукі яравога збожжа, ці ярыцы. Для гэтай мэты выключна яе і сее беларус. З-за недахопу ярыцы саладуху гатуюць з жыта, але «з жыта саладуха не такая смачная, як з ярыцы». Для падрыхтоўкі соладу насыпаюць ярыцы ў ночвы, моцна змочваюць яе вадой і ставяць у цёплае месца, каб прарасла. Пасля гэтага вада зліваецца, а прарошчаную ярыцу высыпаюць на печ для прасушкі. З высушаных зярнят робіцца мука. У час варкі саладухі бярэцца некалькі жмень гэтай мукі і разбоўтваецца з вадой. Кашку, якая ўтварылася, ставяць у печ «у лёгкі дух». Як толькі кашыца пракіпіць, то саладуха лічыцца гатовай. Яе зліваюць у дзяжу і ставяць у цёплае месца, каб укісла. Толькі ўкісшая саладуха лічыцца зусім прыгоднай для ўжывання. Саладуху ядуць з хлебам і бульбай. Яе падаюць у любы час дня: за снеданнем, абедам, вячэрай.

Для атрымання мілты ўжываецца авёс. Спачатку яго параць, а пасля падвяргаюць хуткай прасушцы ў печы — «на чарані» ці на печы пры дапамозе гарачых камянёў. Прасушаны авёс шляхам таўчэння яго ў ступе ачышчаецца ад шалупіння; пасля ачышчэння зярняты ператвараюць у муку — і талакно гатова. Цяпер варта толькі ўзяць некалькі такой мукі і разбоўтаць яе вадой адпаведна на смак спажыўца.

Беларус хоць і гаворыць, што «ў пост толькі адышоўся ад стала, завярнуўся тройчы, дык ізноў есці захацелася», аднак пост захоўвае з усёй строгасцю. Нават жанчыны з груднымі дзецьмі не адважваюцца з'есці ў пост скаромнай стравы. Дзеці з 7 гадоў таксама павінны пасціцца. Зрэшты, яны і ў больш раннім узросце посцяцца. За парушэнне пастоў і наогул за аб'яданне і п'янства, па разуменні беларуса, бог пакарае чалавека тым, што «на тым свеце паставіць яго сярод усялякай яды і пітва, і яму бясконца будзе хацецца есці і піць, але няможна будзе дастаць нічога».

Сярэдзіна крыжапаклоннага тydня ў Беларусі носіць назву «пералом посту», «хрэсцы». Апошняя назва паходзіць ад звычаю пячы ў гэты дзень пірагі, паміж якімі найважнейшае месца займае пірог у выглядзе крыжа (хрэст, хрэсц). Пірагі пякуцца з грэцкай мукі, прычым цеста завіваецца з мукой з канаплянага семя. Заможныя сяляне, асабліва жыхары мястэчак, пякуць хрэсцы пшанічныя і завіваюць з макам. Акрамя крыжа пякуць «дзяжу», «кароўку», «барану», «касу», «серп», «затычку», «пужку» і інш. Кожны пірог адпаведна сваёй назве павінен мець форму таго ці іншага прадмета са штодзённага жыцця беларуса і загадзя прызначаецца аднаму

з членаў сям'і, гледзячы па родзе яго заняткаў. У Мінскім павеце ў гэты дзень дзяўчаты-падлеткі скачуць «палапосту». Для гэтага кладуць пасярод хаты на абрубак дрэва дошку, і дзяўчаты, стаўшы на канцах яе, пачаргова падскокваюць і прымаўляюць: «Палапосту, хлеба лосту».

З Вялікім постам цесна звязана споведзь. У першыя тыдні посту да споведзі ідуць малодшыя члены сям'і. Падрыхтоўваючы да споведзі дзіця, маці дае яму наказ накшталт наступнага: «Глядзі ж, сынок (дачушка), скажаш бацюшку, што маткі і бацькі не слухаў, пацер (малітвы) не гаварыў, у агарод чужы лазіў да, помніш, ад мяне з паліцы яйцо ўкраў... А цяпер пацалуй усім руку, каб злосці на цябе ніякай не мелі і не гневаліся». Наогул споведзь у сялян павінна адрозніваецца шчырасцю і чыстасардэчнасцю, а ўтойванне грахоў ад свяшчэнніка лічыцца смяротным грэхам. Строга назіраецца, каб дзеці па рассеянасці не з'елі чаго-небудзь перад прычашчэннем. У гэты дзень ім не дазваляюць браць ваду ў рот пры мыцці твару, каб выпадкова яны не праглынулі яе. Нават забаранялася глытаць сліну. З дзецьмі ад 9 да 12 гадоў мацеры ходзяць сумесна да споведзі. Гаспадар і гаспадыня стараюцца пайсці да споведзі ў нядзелю ці ў свята, каб не прапаў рабочы дзень. У гэты дзень яны бываюць асабліва сур'ёзныя і сканцэнтраваныя. Пазбягаюць, каб не пасварыцца, не падакараць каго-небудзь і нават не прагневацца. У штодзённым жыцці «гнеў толькі павінен быць да парога, а гэта ў такі дзень да яшчэ гневацца».

## [ДЗЕНЬ ВЕСНАВОГА РАЎНАДЗЕНСТВА]

9 сакавіка — дзень веснавога раўнадзенства — вызначаецца своеасаблівымі звычаямі, у якіх выражаецца спрадвечны міфалагічны бок іх жыцця і бачны рэшткі ўцалелых язычніцкіх абрадаў... Звычаі ў гэты дзень хоць некалькі і адрозніваюцца адзін ад другога, гледзячы па мясцовасці ці бытавых умовах народнага жыцця, але ў агульным па змесце амаль тоесныя і прыводзяць да заключэння, што дзень гэты служыў пераддзвер'ем свята вясны, якое адбываецца ў канцы сакавіка. Вось некалькі слоў, якімі народнымі звычаямі ўшаноўваецца гэты дзень у Слонімскім павеце...

У гэты дзень звычайна дзяўчаты пякуць з цеста своеасаблівыя піражкі, якія называюцца «галепы». Кожная дзяўчына пазначае свой. Галепы гэтыя кладуцца ў рад і прызначаюцца на з'яданне сабаку: чыя галепа будзе з'едзена першай, тая

дзяўчына хутчэй выйдзе замуж. Пры гэтым дзяўчаты прыгаворваюць:

Веець, веець
Вясенні вецярок,
Прыйдзі, мой міленькі,
Дам табе піражок.
З мёдам сычаным,
З ласкаю дзявічаю.

Разам з тым у гэты дзень выганяюць зіму на цэлы год, а іменна: робяць са снегу бабу, пасля разбіваюць яе на часткі з патрабаваннем, «каб зіма на дзевяць месяцаў ад нас пайшла». І ў доказ таго, што зіма ўжо як бы прагнана імі, бяруць старыя гаршкі, ідуць да сваіх знаёмых і кідаюць іх на парог, прыгаворваючы:

Хазяйка, хазяйка,
Кідай сваю пражу,
Зіма ўжо прагнана,
Адчыняй свае дзверы,
Заві нас у госці.

І гаспадыня павінна пачаставаць прадвеснікаў вясны, якія прагналі зіму. У іншых жа мясцовасцях павета гатаванне гэтых галеп мае другое значэнне. Падрыхтоўваюць іх лікам 40 (па ліку быццам бы 40 мучанікаў), каб напомніць, што Вялікі саракадзённы пост павінен «усякім шчыра спошчан быць». Прычым частку галеп пакідалі, і хто першы ўбачыць бусла, той выходзіць да яго насустрач са словамі:

Бацян, бацян!
На табе галепу,
Дай мне жыта капу.

У гэтым апошнім звычаі бачны яўныя рэшткі глыбокай павагі да названай птушкі. Нездарма бусел і цяпер карыстаецца вялікай пашанай у сялян. Гняздо яго на хаце прыносіць шчасце. Яйка, выкінутае буслам з гнязда на Благавешчанне (а ён абавязкова павінен да гэтага дня знесці яйка), прадвяшчае, што ў гэтым годзе будзе добры ўраджай.

Старыя ж аратыя частку галеп пакідалі разам з хрэсцамі, падрыхтаванымі на Серадапосным тыдні, да вясны і лета, з імі як з благаславеннем рабілі першае заворванне і першае зажынанне хлеба.

Адгэтуль вынікае, што гатаванне піражкоў 9 сакавіка ў тыя далёкія часы мела магічнае значэнне... Акрамя гэтага,

у дзень 9 сакавіка паілі жывёлу з палонкі, у якой мыўся спачатку сам гаспадар: «каб скаціна слухала гаспадара, набраўшыся яго розуму». Дзяўчаты адразалі валасы з хваста каровы, прыкладвалі іх да галавы ў надзеі, што каса вырасце даўжынёй з хвост каровы. Стукалі ў вулей, і калі з вулея вылеціць пчала, то будзе добрае лета. Рассыпалі па дарозе жыта і апілкі ў надзеі на добры ўраджай і багацце лесу. Кідалі саломай у сцяну хаты, і колькі стукнецца саломінак у сцяну, столькі курыца знясе яек у годзе. Наладжвалі арэлі, каб цэлы год жылося весела. Ставілі каля варот лапату, памяло і качаргу з мэтай, што ведзьма абавязкова ў гэту ноч на лапаце пры дапамозе качаргі і памяла з'едзе на Лысую гару. Навязвалі курам прыгожыя стужкі, каб прыгожы жаніх здарыўся, і г. д.

## СВЯТА КАМАЕДЗІЦЫ

Свята гэта заўсёды бывае напярэдадні Благавешчання, і прысвечана яно мядзведзю. У гэты дзень рыхтуецца асобая ежа: на першую страву гатуецца сушаны рэпнік у знак таго, што мядзведзь ужывае пераважна раслінную ежу, травы. На другую страву падаецца кісель, таму што мядзведзь любіць авёс. Трэцяя страва складаецца з гарохавых камоў, таму і сам дзень атрымаў назву «Камаедзіца». Пасля абеду ўсе — старыя і малыя — лажацца, але не спяць, а памінутна самым павольным спосабам перакатваюцца з боку на бок, як мага стараючыся прыладзіцца да паварочвання мядзведзя. Цырымонія гэта працягваецца каля дзвюх гадзін, і ўсё гэта робіцца для таго, каб мядзведзь лёгка ўстаў са сваёй зімовай бярлогі. Пасля абеду сяляне ўжо не займаюцца сваімі дзённымі работамі — святкуюць. Вядома, што, па перакананні сялян, мядзведзь на Благавешчанне абуджаецца ад спячкі, устае са сваёй бярлогі. Вось і сустракаюць яго з дабразычаннямі.

Пачатак свой гэта свята вядзе, без сумнення, ад часоў дахрысціянскіх і служыць магчымай аргументацыяй таго, што ў гэтай мясцовасці пакланяліся мядзведзю. Па расказе старажылаў, у мясцовасці гэтай былі велізарныя лясы і непраходныя нетры, у якіх вадзілася мноства разнастайных дзікіх звяроў, з якіх сваёй сілай і ростам мядзведзь наводзіў страх на людзей. А паколькі мядзведзь ёсць і драпежная жывёла (ён рабіў шмат шкоды, знішчаючы свойскую жывёлу), то, каб улітасцівіць яго, людзі гэтай мясцовасці і ўздумалі вітаць мядзведзя. Доказам справядлівасці такога меркавання слу-

жыць дзень, што захаваўся да цяперашняга часу, у які адбывалася вітанне мядзведзя. Гэта свята Камаедзіцы.

## БЛАГАВЕШЧАННЕ

Глыбокая пашана, якую аказвае рускі народ прасвятой дзеве Марыі, з асаблівай рэльефнасцю выступае ў Беларусі. Шматлікія «прошчы» існуюць у розных месцах гэтага краю. Калі хто-небудзь у злосці пажадае беларусу няшчасця, то апошні з жахам вымаўляе: «Няхай бог крые і маці божая аберагае», выказваючы тым поўную надзею на заступніцтва...

Святам Успення і нараджэння Багародзіцы ў некаторых месцах прысвоена назва «святак» (першы святак — 15 жніўня, апошні святак — 8 верасня). Гэтая назва выразна ўказвае на жаданне беларуса адцяніць тыя святы, выразіць важнасць, якую мае для яго свята Багародзіцы.

Адсюль зразумела тая пашана, якой карыстаецца сярод беларусаў Благавешчанне. Царква ў гэты дзень перапаўняецца людзьмі. Асабліва шмат бывае іспаведнікаў. Значэнне Благавешчання для беларуса ўзмацняецца яшчэ і тым, што гэта свята супадае з пачаткам вясны. Як толькі павее веснавым цяплом, душа селяніна страпянецца, і ён з нецярпеннем чакае таго часу, калі прыйдзецца яму першы раз узяцца за святую справу апрацоўкі зямлі, у якой ён бачыць адзіную заруку свайго дабрабыту. Усялякае грэбаванне гэтай святой справай, па разуменні селяніна, сурова караецца. Таму добры гаспадар заўсёды прымаецца за гэта з любоўю. Пачатак палявых работ, роўна як і канец іх,— сапраўднае свята для селяніна і суправаджаецца сямейнымі частаваннямі.

Адной з самых верных прыкмет набліжэння вясны лічыцца прылёт бусла, які, па павер'і беларуса, заўсёды бывае на Благавешчанне. («Бусел прыляцеў — вясна будзе»,— гаворыць беларус, заўважыўшы першае з'яўленне гэтай птушкі на гняздзе, што нярэдка бывае зроблена на страсе якой-небудзь вясковай пабудовы.)

Бусел — любімая птушка беларуса. На чыім двары ён паселіцца, там будзе поўны дастатак. Таму многія беларусы зацягваюць на стрэхі сваіх будынкаў старыя бароны, каб яны паслужылі асновай для гнязда бусла. Разбураць гняздо бусла — вялікі грэх. Акрамя таго, у бусла ў адной назе знаходзіцца агонь, у другой — вада, так што ён у адплату за разбурэнне гнязда можа зрабіць пажар. Забіваць бусла — таксама грэх. Гэта тое ж, як і забіваць чалавека, бо бу-

сел сам з чалавека. Зразумела, што вестка аб з'яўленні гэтага дарагога госця вясны [радасная], усе жадаюць паглядзець на яго ды і не рашаюцца тут жа выйсці на двор, таму што лепш за ўсё ўбачыць бусла першы раз лятучым: тады цэлы год «будзеш лёгкі на ногі». Здароўе для селяніна ў летні час, безумоўна, неабходна, таму ён стараецца пазбегнуць адных з'яў для прадухілення шкоды здароўю, а на другія натыкацца, таму што гэтыя апошнія, калі і не нададуць яму сілы, то засцерагуць ад той ці іншай хваробы. Так, ён пазбягае ўбачыць вясной раней жабу, чым бусла. Пачуўшы ўпершыню гром, ён качаецца па зямлі, «каб жывот улетку не балеў», ці падымае што-небудзь цяжкае, каб сярэдзіны не ламала. Для апошняй мэты раіцца яшчэ перагнаць уздоўж па голай спіне яшчарку, якая першая трапіла на вочы вясной. Але гэта вельмі рызыкоўна, таму што пры гэтым выпадкова можа трапіць на цела чалавека мача яшчаркі, якая моцна разгнойвае яго.

У Навагрудскім павеце Мінскай губерні гаспадыні раніцай да прабуджэння саміх гаспадароў стараюцца перавязаць саху, каб куры нясліся. У сяле Мікольск Мінскага павета з гэтай мэтай восенню пасля ворыва, г. зн. пасля збору гародніны і заканчэння ворыва зямлі, збіваюць з сахі нарогі (сашнікі). Куры — яйкі — гэта адна з важных крыніц даходу беларускай жанчыны, і яна па меры магчымасці стараецца ўзмацніць яе. Асабліва гэта з'яўляецца жаданым для дадзенага часу, таму што цяпер адкрываецца вялікі попыт на яйкі, якія неабходны як для наступаючага Вялікадня, так і на пасадку курэй для вываду куранят. Апошняя мэта таксама немалаважная, таму што раннія кураняты ў большай цане ў сялян: раннія курачкі ўжо з восені класці пачынаюць яйкі і прытым менш астатніх курэй баяцца. Асабліва гэтай уласцівасцю адрозніваюцца так званыя «марцовыя» (выседжаныя ў сакавіку) куры. Іх можна выпускаць на двор, як толькі сцежка пачарнее.

З разліку прыросту курынай гаспадаркі з'яўляецца пажаданым, каб у летні час куры не гублялі яек на чужых дварах. З гэтай мэтай на Благавешчанне беларускія гаспадыні не выносяць смецце з хаты, а ставяць яго ў пасудзіне пад лавай на покуці.

Благавешчанне як час яўнай перавагі вясны над зімой прымушае беларускіх гаспадынь падумаць пра агароды, тым болей што пара каля гэтага свята лічыцца найбольш прыгоднай для пасеву расады.

Для расады звычайна адводзіцца ў агародзе больш зацішнае месца, каб яе можна было накрыць — засцерагчы ад

курэй і маразоў. Агароджа пры гэтым папраўляецца, але колле ні ў якім разе не ўбіваюць у зямлю. Зямля, па ўяўленні селяніна, вясной «паросная», і біць па ёй у гэтую пару наогул грэх, акрамя таго, забіванне калоў у зямлю да ворыва палёў пазбаўляе яе апладатваральных летніх дажджоў, ці, як гавораць іншыя сяляне, «забіваць спор у зямлі».

Другі аграрны звычай, які мае некаторыя адносіны да свята Благавешчання, ёсць першы выган жывёлы ў поле. Хоць і гавораць: «Да Юр'я каб было сена і ў дурня», а «У каго хапае да Міколы, той не баіцца зімы ніколі», аднак у беларуса часта адчуваецца недахоп сена і каля Благавешчання. Таму патрэба прымушае яго выганяць жывёлу, асабліва авечак, у поле і раней гэтага свята. «Хоць які там ужо наедак,— разважае беларус,— а ўсё-такі полудзень згубіць».

Але якую б патрэбу не меў селянін, не зрабіўшы першага выгану жывёлы ў поле да 13 красавіка, ён ніколі не адважыцца зрабіць гэта ў перыяд ад 13 да 25 красавіка. Гэтая пара вядома ў беларусаў пад назвай «між Благавешчын», таму што апошні тэрмін яго супадае са святам Благавешчання па новым і старым стылі. «Запасванне» жывёлы ў гэту пару, на думку сялян, наклікае на статак ваўкоў, якія прыносяць вялікую шкоду. Каб пазбегнуць гэтага няшчасця, беларус пазбягае даваць у доўг рэчы, асабліва бёрда. Калі і дае часам якую-небудзь рэч, то абвязвае яе чым-небудзь, намякаючы гэтым самым на тое, што даная рэч знаходзіцца дома, у добрай схованцы і пакарыстацца ёй чужой асобе няма ніякай магчымасці.

## [ПАСЛЯ БЛАГАВЕШЧАННЯ]

Да Благавешчання не можна чапаць маткі-зямлі, бо яна можа прагневацца да й не зарадзіць. Пасля Благавешчання, калі ўжо сыдзе снег, гэтак лепей усяго ў чацвер сярод дня заворваць. Гаспадар надзявае чыстую бялізну, кладзе ў торбу акраец хлеба, соль, хрэшчык, яйка й сыр, калі е, запрагае ў саху валоў да й ідзе з імі ў поле араць. Там ён праводзіць тры баразны, памаліўшыся богу, потым вымае з торбы хлеб, соль і сыр і трохі палуднуе сам і па куску хлеба дае валам, каб яны былі спасныя, а яйка закопвае ў зямлю там жа на баразне. Гэта ён робіць пачостку матцы-зямлі, каб яна была ласкава да добра зарадзіла збожжа, каб усюды было поўна, як тое яйка. Потым гаспадар ізноў моліцца богу і вяртаецца з валамі дамоў, бо ў той дзень не можна многа араць, каб валы не таміліся ды заўжды былі спасныя.

## СВЯНЦОНАЯ ВЯРБА

Грамнічныя свечкі і іарданская свянцоная вада складаюць далёка не поўнае кола прадметаў, якія служаць духоўна-рэлігійным патрэбам селяніна: у кожным доме чырвоны кут упрыгожваецца яшчэ пучком свянцонай вярбы, якая з Вербнай нядзелі нязменна тырчыць за галоўным абразом на працягу года і толькі калі-нікалі вымаецца адтуль для некаторых патрэб.

Мясцовая вярба ёсць дубцы лазовых дрэў, пераважна такіх, на якіх раней з'яўляліся так званыя «коцікі» — жоўтыя кветкавыя пупышкі, з далучэннем да пруткоў двух-трох галінак ядлоўцу. Вербныя і ядлаўцовыя пароды — даволі распаўсюджаныя расліны ў нашай губерні, таму набываць вярбу зусім няцяжка ў любым месцы, прычым вярба з разаватай скуркай, а ядловец з ягадамі і лічыцца першасортным і найбольш адпаведным. Калі няма такой вярбы, а здабыць яе немагчыма, задавальняюцца больш простай, са светлай скуркай. Калі з выпадку ранняга Вялікадня або доўгай зімы вярба яшчэ не мае пыпушак, то падрыхтаваныя загадзя лазовыя дубцы змяшчаюцца ў пакаёвую ваду ў хаце, з-за гэтага да Вербнай нядзелі на іх паспяваюць разбухнуць пыпушкі, а часам і лісточкі.

У Вербную нядзелю амаль з кожнага гаспадарчага дома багамольцы адпраўляюцца ў сваю прыходскую царкву з пучкамі ўласнай вярбы, прычым у некаторых асоб такія пучкі нагадваюць часам добрую палавіну снапа. Такія запасы вярбы робяцца колькі для ўласных патрэб, столькі і для суседняга, як і пуцявога, пазычання. Ужо да царкоўнага асвячэння прызапашаная вярба не ўжываецца нават дзецьмі на гульнёвыя патрэбы. Пасля ж асвячэння яна становіцца ганаровай святыняй дома і па-за ім. Прасочым за вербным пучком ад моманту яго асвячэння ў царкве да канца вербнага года. Мы заўважым, што іншы багамолец зараз жа па асвячэнні з'ядае адну пупырышку вярбы, а калі ў галінках ядлоўцу меліся ягадныя зерні, то і адно такое зерне, пераважна чорнае — леташняга выспявання. Гэта робіцца з тым, каб летам абараніць сябе ад навальніц. Тое ж і па тых жа матывах робяць дамашнія, як толькі свянцоная вярба паступіць у дом. Аднак той, хто прыйшоў у дом са свянцонай вярбой, перш за ўсё стараецца тры разы стукнуць вербным пучком або асобным прутком кожнага члена сям'і, прыгаворваючы: «Вярба крэст (замест «хлест») б'е да слёз; не я б'ю, вярба б'е, няхай на здароўе жыве!» (той, каго хлешчуць). У сваю чаргу тое ж пра-

рабляе над вербным вестуном хто-небудзь з сям'і і толькі ў выключным становішчы, як, напрыклад, пры поўным адзіноцтве, ён хлешча вярбою сам сябе. Пры сустрэчы са сваякамі і знаёмымі вербныя багамольцы выказваюць сваё прывітанне не поціскам рукі, не здымаючы шапкі, а хлястаннем вярбою, і такое прывітанне міжволі выклікае здзіўленне. Зразумела, што вербнае прывітанне дае сельскай моладзі новы лішні раз да пажаданых адносін між сабой, перарваных з пачаткам Вялікага посту.

Дома гаспадар або асобы, якія яго замяняюць, абыходзяць з вярбой (дубцом) пабудовы для жывёлы, злёгку стукаючы ёю тры разы кожную жывёліну паасобна, і ўтыкаюць дубец у шчыліну гэтай пабудовы. Уласна кажучы, вербнае прывітанне робіцца ў адносінах толькі адушаўлёных прадметаў, і ў гэтым выпадку не застаюцца без яго вуллі ў пчаляроў, хаця ў той жа час не падвяргаюцца хлястанню кошкі і сабакі. З другім вербным пруцікам абыходзяць астатнія гаспадарчыя збудаванні, агарод і асабліва азімае поле, зноў жа тры разы сцёбаюць ім у розных месцах нівы і па сканчэнні ўсяго вербны пруток утыкаюць у адзін з куткоў агарода або нівы. Таму вельмі нярэдка можна бачыць, што пры мяжы дадзенага гаспадара, калі толькі зямля нізінная, вільготная, вырасла раскошная вярба з калісьці ўваткнутага тут вербнага прутка. Тое ж самае назіраецца і пры магіле сваяка, куды з прутком вярбы хто-небудзь абавязкова адпраўляецца для прывітання на магілах сваякоў. І тут наведвальнік тры разы хлешча магільны ўзгорак і вымаўляе звычайнае прывітанне, не дагаварваючы, аднак, другой палавіны або відазмяняючы гэту палавіну ў дачыненні да непарушнага спакою пахаванага. Ва ўсіх выпадках выхаду з вярбою, ці ў самы Вербны тыдзень або ў бліжэйшыя дні надыходзячага перадвелікоднага тыдня, вербны пруток не вяртаецца дадому, а пакідаецца ўваткнутым там, дзе ён абслугоўваў указаныя патрэбы. Ад гэтага, а таксама ад пуцявога і суседскага пазычання вербны снапок значна памяншаецца; рэшткі яго змяшчаюцца за галоўным абразом на гадавыя патрэбы дома. Зрэшты, калі не ўцалелі вербныя пруткі ў хляве і канюшні, пакінутыя там пры вербным абходзе, то пры першым выгане жывёлы ў поле (ён парадна адкрываецца 23 красавіка) і коней на начлег (парадны вывад 9 мая) пастуху і конепасу даецца па новым вербным прутку з «бажніцы»: той і другі трохкратна і нават па некалькі раз сцёбае выгнаную на пашу жывёлу і ўносіць пруток з сабой на ўвесь дзень замест пугі. У нямногіх выпадках з такім жа прутком вярбы з «бажніцы» земляроб адпраўляецца «заворваць» яравое поле і папар,

«драць аблогі» (заворваць цаліну), «капаць груды» (заворваць месца, дзе спалены груды хмызняку з-пад расчысткі зарасніку, лесу) і г. д.

Як адзначалася, рэшткі вярбы зберагаюцца да наступнага Вербнага тыдня і толькі тады, калі новая вярба паступіць у дом, спальваюцца ў печы, што адначасова ва ўсіх дамах адбываецца ў перадвелікодны панядзелак. Якім бы вялікім ні быў у іншым месцы рыбны дастатак, як ні спакусліва ў пост рыбнае блюда, ні ў адной гаспадарцы не стануць пры такім паленні гатаваць рыбу. Таксама пры такім паленні не рыхтуюць для бялізны шчолаку, не кіпяцяць і бялізны. Больш верныя старадаўнім звычаям гаспадыні стараюцца аддзяліць попел гэтага падпалу і ім удобрыць расаднік, дзе дзякуючы ахове «замёта» або акуратнай агароджы зямля не папіраецца нагамі людзей і жывёлы.

На працягу вербнага года вярба абслугоўвае наступныя, скажам, экстраардынарныя патрэбы:

а) у час першага грому з'ядаецца адна пупышка або кончык вербнага прутка, каб у наступны час не баяцца летніх навальніц;

б) пры наступленні навальніцы або набліжэнні небяспечнай хмары вербны пучок або ставіцца на падаконнік у бок навальніцы і хмары, або выстаўляецца на знешнім баку акна, каб аддаліць навальніцу і хмару, паралізаваць магчымую небяспеку;

в) пры недамаганні сем'яніна або хатняй жывёлы той і другі акурваецца вярбою; акурваецца гняздо квактухі, цельная карова і наогул цяжарная жывёла, каб тым або спыніць хваробу, або захаваць ад усемагчымай згубы, уплыву «дурнога вока». У гэтым выпадку вельмі важна, каб разам з вербнымі лазовымі пруткамі курыўся ў жароўні і ядловец, што складае неабходнае дапаўненне вярбы. Ёсць рэдкія выпадкі, калі вербныя пруткі і ядловец адварваюцца ў чыстай вадзе і гэты адвар ужываецца ўнутр як лекі ад колікаў, вадзянкі, ліхаманкі і звонку — у выглядзе прымочкі ад рэўматызму, пухліны, удару. Здробненая ў парашок вярба служыць на засыпку ран і болек, аднолькава ў людзей і жывёлы.

Застаецца дапоўніць, што, пакуль вярба не паступіла ў чырвоны кут, нават у межы двара, яна ахвотна пазычаецца, хто мае ў ёй патрэбу, але пасля гэтага яна ўжо не падлягае пазычанню падобна іншым свянцоным прадметам. Ведаючы гэта, хто мае патрэбу, не робяць і спробы да пазычання, а абыходзяцца іншымі свянцонымі прадметамі, як, напрыклад, травамі і кветкамі, асвячонымі 24 чэрвеня.

Пры пераходзе ў новы дом вербны пучок раздзяляецца папалам: адна частка застаецца ў старым доме, а другая пераносіцца ў новы, прычым першая застаецца ў доме няпэўны час, да яго разбурэння, і потым спальваецца нароўні і адначасова з гадавой вярбой у панядзелак перадвелікоднага тыдня.

## ПОГЛЯДЫ БЕЛАРУСАЎ НА СВЯТКАВАННЕ ВЯЛІКАДНЯ

Вялікдзень, альбо, як яго яшчэ называюць, Вялічка,— гэта значыць вялікі дзень, доўгі дзень. Вядома, што славянскія плямёны ў перыяд язычніцтва і нават з прыняццем хрысціянства наладжвалі святкаванні ў гонар жыватворнага і цеплатворнага сонца, Дажбога, святкаванні, вынесеныя славянамі, відаць, са сваёй далёкай радзімы, краіны вечнага сонца. Святкаванні гэтыя адбываліся, па сведчанні летапісца, прыблізна ў час веснавога і асенняга раўнадзенства, зімовага і летняга сонцастаяння.

Першыя гістарычныя звесткі пра славян гавораць пра іх як пра народ, які займаўся земляробствам. Земляробчая культура абавязкова павінна была своеасабліва паўплываць на склад народнага светапогляду, надаючы яму культурна-земляробчае адценне, падпарадкоўваючы яго жаданні і імкненні ўладзе зямлі. З'яўленне сонечнага цяпла і адначасова ажыўленне прыроды, рост раслін асацыіраваліся ў народным разуменні механічна. Па меры разумовага развіцця народа гэта механічная асацыяцыя перайшла ў лагічную, у сілу якой сонечнае святло і цяпло лічыліся прычынай, а з'яўленне расліннасці — вынікам.

Калі ж сонца з'явілася ва ўяўленні першабытнага славяніна ўсёапладатваральным, усёажыўляльным добрым пачаткам — светаносным Дажбогам, які дае ўсяму жыццё і змагаецца з цемрай, са злосным пачаткам, з зімой, з яе ўсёзнішчальнымі завірухамі і мяцеліцамі, тады з'явілася ў славяніна-земляроба патрэба нагляднай урачыстасці перамогі дабра над злом. Вось і ўстанаўліваюцца веснавыя святкаванні, аб якіх упамінае летапісец, у гонар багоў-апекуноў земляробчай культуры. Вітаецца і святкуецца наступленне вялікіх сонечных дзён, ці вялікадней, пачатак палявых работ, ад удачнага канца якіх залежаў увесь далейшы дабрабыт славяніна-земляроба. Святкаванні наладжваліся на гарах і наогул на адкрытых месцах са шчодрымі ахвярапрынашэннямі для ўміласціў-

лення ўшанаваных імі багоў:

А на тых гарах ды стаяць стаўбы,
Ды стаяць стаўбы маляваныя,
А на тых стаўбах вісяць катлы,
Ды вісяць катлы адліваныя,
А пад катламі ды гараць агні,
А гараць агні ясненькія,
З іх ідуць дымкі сівенькія,
Там сядзяць дзядкі старэнькія
І пяюць песні старасвецкія,
І сучуць свечкі двайчастыя,
Двайчастыя і трайчастыя,
Спадзяюцца любых госцікаў,
Любых госцікаў — светлых сяточкаў,
Светлых святочкаў — велікоднічкаў.
Першага свята — святога Вялічка,
Другога свята — святога Юр'я,
Трэцяга свята — святога Міколу і г. д.

І стары і малы скакалі праз агні ясненькія і ў заключэнне спальвалі ці тапілі чучала «Мару» — увасабленне зімы, цёмнага, злоснага пачатку.

Прыблізна так святкаваў язычнік-славянін наступленне вялікадней, часу палявых работ, крыніцы свайго дабрабыту, стараючыся ўміласцівіць ахвярамі і просьбамі абагатвораныя ім сілы прыроды, якія ён уяўляў у вобразе і падабенстве самога сябе і якія ігралі пэўную ролю ў яго лёсе, прыносячы карысць ці шкоду яму.

Пазней, будучы хрысціянамі, продкі нашы доўга не пакідалі сваіх язычніцкіх звычаяў, аб чым сведчаць шматлікія выяўленыя пасланні і настаўленні свяціцелей рускай царквы. Рэшткі старажытнаязычніцкіх звычаяў і поглядаў захаваліся ў народных святкаваннях хрысціянскіх свят і да цяперашняга часу. Гэта асабліва адносіцца да тых свят, якія па часе святкавання супадаюць са старажытнаязычніцкімі святамі сонечнага культу. Такія, напрыклад, Купала, Каляды, Вялікдзень і некаторыя іншыя, пры ўшанаванні якіх народ робіць шмат такога, што захавалася яшчэ з перыяду яго язычніцкага стану і што абумоўліваецца яго земляробчым бытам. Беларусы і да гэтага часу глядзяць на святы і святых праваслаўнай царквы скрозь прызму сваіх культурна-земляробчых інтарэсаў, лічачы іх памагатымі ў сваёй сельскагаспадарчай працы, абаронцамі статкаў, ахоўнікамі пчол, пасылацелямі дажджоў, расы і г. д. Народ і пасля прыняцця хрысціянства глядзеў на Вялікдзень з таго ж земляробчага пункту гледжання. У народнай свядомасці і Вялікдзень, і Юрый, і Мікола зліваюцца ў адно паняцце.

Такое зліццё тлумачыцца, між іншым, тым, што святкаванні іх супадаюць з часам наступлення палявых работ. А св. Юрый лічыўся апекуном статкаў, як аб гэтым гаворыцца ў валачобнай песні:

Святы Юрый зямлю адмыкае,
Зямлю адмыкае — расу выпушчае.
Расу выпушчае, статак выганяе,
Статак выганяе, слоўца вымаўляе:
— Каб таму статку не было ўпадку
Ад таго змея грамучага,
Ад таго гада бягучага,
Ад той ведзьмы-чараўніцы.

А св. Мікола — апякун палёў:

Па межах ходзіць, жытца родзіць,
Жытца родзіць, пчолкі содзіць,
Пчолкі содзіць медзяністыя.

Адсюль і відаць, што ўяўленні аб сваіх язычніцкіх багах народ перанёс на святых праваслаўнай царквы.

Падрыхтоўка да свята Вялікадня пачынаецца з перадвелікоднага чацвярга, які называецца ў народзе «чыстым». У гэты дзень трэба было абавязкова да сонечнага ўсходу ўсім вымыцца ў лазні. Гэта абмыванне лічылася вылячэннем і засцярогай ад скурных хвароб. Паводле павер'я, у гэты дзень нават птушкі, якія паспелі выседзець да гэтага часу сваіх дзяцей, як, напрыклад, крумкач, мыюць іх.

У першы дзень сонца ў момант усходу «іграе», як гаворыць другое павер'е, расцягваецца то ўдаўжыню, то ўшырыню, прымаючы эліптычную форму і распадаючыся на некалькі асобных сонц. Сонца «іграе» і на Купалку, і на іншыя першабытныя святы сонечнага культу, што можа служыць сведчаннем адзінства іх паходжання ў мінулым. Таксама заўважаецца падабенства паміж народным святкаваннем Вялікадня і Купалкі ў тым, што напярэдадні таго і другога свята запальваюцца агні, хаця трэба сказаць, што ў апошні час агні запальваліся ў Велікодную ноч толькі каля царквы, што можна растлумачыць неабходнасцю асвятлення. У ранейшыя часы, па расказах старых людзей, іх запальвалі і ў іншых месцах, каб кожны, хто не мае свайго агню, мог з кастра пакарыстацца ім, таму што перад Вялікаднем ніхто агню не пазычаў, лічачы, што ад гэтага зменшыцца яго дабрабыт, адчаго і сам агонь называўся багаццем.

Косці ад велікодных страў як свянцоныя пільна захоўваюцца, а пасля закопваюцца гаспадаром па канцах поля, што,

паводле павер'я, засцерагае яго ад граду, заломаў і іншай напасці. Да ліку характэрных асаблівасцей святкавання Вялікадня ў беларускай вёсцы трэба аднесці хаджэнне валачобнікаў па дварах аднавяскоўцаў, якія ў гонар гаспадара і яго сям'і выконвалі валачобныя песні, ярка паказваючы народныя погляды на падзеі, якія ўшаноўваліся. Хор валачобнікаў вярбуецца галоўным чынам з бабылёў, батракоў і беднякоў. Аднак як выключэнне ідуць у валачобнікі і заможныя людзі. Кіраўніком і асновай хору валачобнікаў лічыцца пачынальнік-запявала, астатнія ўдзельнікі называюцца падхватнічкамі. Акрамя таго, у хоры для акампанементу прысутнічае вясковы скрыпач і механоша-казнахавальнік, які носіць у мяшку сабраныя натурай падачкі і захоўвае мізэрныя грашовыя зборы. Усё сабранае дзеліцца паміж валачобнікамі пароўну, толькі пачынальнік і музыка атрымліваюць большую долю.

Падышоўшы да акна, пачынальнік запявае адну частку песні, абумоўленую яе размерам, а падхватнікі альбо ўвесь хор паўтараюць словы пачынальніка ці толькі адзін звычайны прыпеў. Узнікненне звычаю хаджэння валачобнікаў сяляне тлумачаць патрэбай дзяліцца маёмным з немаёмнымі велікоднай ежай, каб і бядняк меў што паесці ў час Вялікадня.

Валачобныя песні ў кожнай мясцовасці Беларусі, нават у кожнай вёсцы некалькі відазмяняюцца, хоць сутнасць іх зместу ўсюды адна і тая ж: сельская гаспадарка з яе клопатамі — звычайная тэма валачобных песень. Вось найбольш тыповыя з іх:

Ды на першы дзень святых вялікадней
Сабіраліся красны молайцы,
Красны молайцы — валачобнічкі.
А ішлі ж яны ды гуляючы,
Слаўнага сяла ды пытаючы,
А ў том сяле — слаўнага пана,
Слаўнага пана, пана Івана,
Дапытаўшыся, прыйшлі пад ваконца.
— Ой, чы ж дома ты, слаўны пане!
Чы спіш, чы ляжыш, чы адпачываеш?
Калі спіш чы ляжыш,— дык бог з табою,
А не спіш, не ляжыш,— дык гукай са мною.
Хоць ён і дома — не абзываецца,
У новай каморцы прыбіраецца:
Надзяе боты слуцкай работы,
Надзяе футру сабалёвую,
Надзяе шапку бабровую.
Паджыдае ён светлых святачкаў,
Светлых святачкаў-велікоднічкаў.
Першага свята — святога Вялічка,

Другога свята — святога Юр'я,
Трэцяга свята — святога Міколу.
Усе святыя пазбіраліся,
Аднаго святка ды нямашацька.
А якога святка? — Святога Міколы.
Святы Юрый, божы ключнік!
Сядлай каня — едзь па Міколу.
Толькі Юрый на каня садзіцца,—
Святы Мікола ідзе ў вароты.
— Святы Мікола, дзе ж ты бываў?
Дзе ж ты бываў, што ж ты чуваў?
— Па барах хадзіў — пчолкі садзіў,
Пчолкі садзіў раістыя,
Раістыя, медзяністыя.
Па межах хадзіў — жытца радзіў,
Жытца радзіў ядраністае,
Зерне к зерню, каласок у землю.
Каласок гнецца — жніва спадзяецца.
— А хто ж тое жыта зажынаць будзе?
— Зажынаць будзе пані гаспадыня,
Што раз разне, дык сноп нажне,
На ступень пражне, дык копу нажне.
Як на небе зоры часты-густы,
Так у полі копы часты-густы.
Ой, мы пелі, шчабяталі,
Як салавейка ў ціхім лузе,
У ціхім лузе, на каліне.
Чырвона каліна, не ўгібайся!
Слаўны пане, ўзвелічайся!
Адзавіся, слаўны пане!
Чы ўслух табе нашая песня,
Нашая песня — старасвецкая?
Калі ўслух табе — не тамі ж ты нас,
Не тамі ж ты нас — падары ж ты нас.
Выйдзі-выйдзі ды на ганачак,
Вынесь-вынесь ды падарачак.
Срэбра-злота ды не важучы,
Ды не важучы, ды не лічучы.
Срэбра-злота самі злічым,
Слаўнага пана вазвялічым.
Слаўнаму пану песня спета,
Песня спета проці нова лета.
Проці новага і вясёлага.
Ой, жыві ж здароў і багацей
І з жаною з маладою,
І з дзеткамі наймілейшымі,
З брацелямі найкраўнейшымі,
І з суседзямі найбліжэйшымі!
Будзь здаровы, як крынічна вада,
Будзь вясёлы, як хароша вясна,
Будзь багаты, як сырая зямля.

## ВЯЛІКДЗЕНЬ НА БЕЛАРУСІ

Вось наступіў апошні тыдзень Вялікага посту. Пачынаецца падрыхтоўка да светлага свята. Хто з сялян не мог ці не паспеў быць на споведзі і прычасціцца ў першыя тыдні Вялікага посту, той спяшаецца здзейсніць гэты хрысціянскі абрад на гэтым тыдні. Старыя звычайна выконваюць яго ў Вялікую суботу, таму што не без таго, каб не пажурыць каго-небудзь з сям'і за што-небудзь у гэтыя дні і такім чынам не зграшыць. Дзяўчаты ў Вялікую пятніцу ўстаюць раненька і мыюцца халоднай вадой: «гэта, як той казаў, каб быць белаю ўлетку» і каб «загара» не прыставала. Увесь гэты тыдзень прыгатаўляюцца пячэнні, саленні, варэнні і іншыя стравы, прымеркаваныя на ўсе тры першыя дні, бо варыць святочнымі днямі грэшна. У Вялікую суботу пачынаецца ўборка хаты. Вымываюцца і вышароўваюцца вехцем сцены, лавы, сталы; вымываецца падлога, выскрабаецца падпечак, дзе звычайна знаходзяцца куры і які чысціцца два разы ў год: перад Калядамі і перад Вялікаднем. Нарэшце хата прыбрана, на абразы павешаны чыстыя намёткі, на стол пастаўлены яйкі, пафарбаваныя ў шалупінне цыбулі, розныя стравы: тут ёсць і «кеінка», і «кіндзюк», тут і пірагі, і каўбасы, што засталіся ад Каляд і для захавання прасоленыя «як чэмер», па выразе сялян, тут і «вэмбрух» і іншая ежа. Тут, «як той казаў, добра йж каа казаў ёсць і тое, што яна і параджае, яна і пахавае, ці бо то пляшка гарэлкі». Пакуль усё гэта гатавалася, выстаўлялася, наступаў і вечар; тады вымалі з печы чыгуны з «лугам», налівалі яго «ў ночвы» і пачыналі абмыванне «плоці грахоўнае». Затым члены сям'і пачынаюць прыбірацца. Вымаюць з куфраў усё тое, што толькі прадназначана для святаў, і моладзь збіраецца ў царкву, а старыя застаюцца дома або, калі даволі моцныя, таксама адпраўляюцца ў царкву на ўсяночную. Пры гэтым бяруць з сабой хлеб, яйкі, сыр і мяса. Вось, нарэшце, скончылася літургія, «бацюшка пайшоў свянціць» прынесенае і прывезенае для свянцання. Перад ім ідзе царкоўны стараста з вялізнай лубкай і бярэ ад кожнага па яйку, а ў каго больш прывезена і прынесена,— і па пірагу. Пры гэтай аперацыі часта даводзіцца чуць зусім не святочныя выгукі і фразы... Нарэшце ўсё ўладзілася, закончылася, кожны, нічога не адведаўшы, спяшаецца дамоў «у сваю сямейку разгавецца, як той каа, каб было, прынамсі, як у добрых людзей». Разгавеліся, наеліся, а многія аб'еліся і здорава выпілі. Старэйшыя леглі спаць, а моладзь, «ведама, маладосць, буйнасць, як той каа казаў», выходзіць на двор; калі добры дзень і суха,

то качаюць яйкі, «б'юцца ў яйкі, прычым не адразу, а першнаперш разоў дзесяць пакаштуюць, заменяць і прысвояцца». Тут жа бываюць і дзяўчаты, якія частуюць хлопцаў і наадварот, г. зн. хлопцы «дзяўчатак», арэхамі, «гарбузінамі», сушанамі грушамі, яблыкамі і да т. п. Вось настаў і вечар першага дня святога Вялікадня. Старыя і наогул гаспадары прачынаюцца, просяць у баб маслёнкі напіцца «альбо сыроваткі, бо вельмі нешта ў роце палае»: маленькія вынікі разгаўлення. Бачыш, адчыняюцца дзверы, чуеш трохкратны выгук: «Хрыстос васкрэс!» Гэта прыйшоў сусед да суседа «пажупіць», «баек паслухаць». К гэтаму часу «народнікі» вернуцца са школы і прынясуць з сабою кніжачак з казкамі, якія ім дадуць настаўнікі народных вучылішч; а хто пабываў у горадзе ды завялася капейка, то і сам купіць.

І вось адкрываецца вельмі мілы абразок: хлопчык садзіцца на покуці за стол і пачынае чытаць уважлівым слухачам аб подзвігах Бавы Каралевіча, Іллі Мурамца, Еруслана Лазаравіча і другіх багатыроў. Але раптам карціна мяняецца: чуцен пад вокнамі трохкратны выгук: «Хрыстос васкрэс!» Гэта прыйшлі «кукольнікі». Іх чалавек пяць; між імі дзве ці адна дзяўчына. І вось, нарэшце, раздаецца:

На першы дзень на Вялікдзень
Маці сына нарадзіла,
Алелюя, алелюя, алелюя!..

Пасля чаго адзін з «кукольнікаў» дэкламуе рэчытатывам:

Жачак, жачак,
Малы рыбачак,
Па небу бегаў,
Суса Хрыста бачыў.
Кібец, кібец,
Дайце блінец,
Прыдатку аладку
Да й кіем па азадку.

Затым усе хорам спяваюць:

Да вынесь, вынесь,
Пане гаспадару,
Хрыстос васкрэс на ўвесь свет.
Карабец яец
Да й не лічаных.
Мы ж тыя яйца
Самі пералічым,
Самі пералічым,
Пана павялічым.

Звычайна гаспадар ці гаспадыня ці, нарэшце, які-небудзь член сям'і выносіць ім каўбас або чаго-небудзь з велікоднага. За гэта звычайна «кукольнікі» спяваюць удзячную песню таму, хто вынес. Падумаеш, што, атрымаўшы сваё, яны пойдуць. Ажно не! Ім добра вядома, што ў гаспадара ёсць «малада Стэфачка або малады Адамко», вось яны і пачынаюць велічаць іх і выпрошваць ізноў. Часта гэтыя «кукольнікі» ходзяць з музыкаю, г. зн. з імі ходзяць вясковы скрыпач і хлопец з бубнам. Але каму-каму добра ў гэты час, дык гэта мясцоваму Іцку ці Шлёме. Яго і ў звычайныя дні наш гаспадар не супраць наведаць, парастарэкваць там з «суседамі», выпіць па «кручку», прымусіць цікаўнага яўрэя паслухаць песню, напрыклад:

Сядзіць пісар за сталом,
Носы павесіўшы.
— Ніц не будзе з мужыкоў,
Гадаў тых не біўшы.
А старшына з старастамі
Аба ўсім талкуе:
— Ах, пане старшына,
На кручок бракуе!
Трэба ўзяці з кожнае хаты
На кручок і на табаку,
І не менша і не больша,
Толькі па шастаку...

А ў час свята ды яшчэ такога вялікага, тым больш, тым больш, што там колькі ўгодна «тае як той каа казаў, добра ён каа казаў, што яна й параджае, яна й пахавае». Таксама звычайна беларус «праважае і Каляды», і Вялікдзень, і іншыя святы, і, адтуль выйшаўшы пасля «праводзін», ён паўп'яны прымаецца за сваю работу.

## ВЯЛІКДЗЕНЬ У БЕЛАРУСАЎ ВІЛЕНСКАЙ ГУБЕРНІ

Свята Вялікадня па сваёй велічнасці рэзка вылучаецца з кола ўсіх свят... Святкаванне Вялікадня ранняй вясной, калі толькі што пачынае ажываць прырода пасля зімовага сну, надае гэтаму святу нейкае асаблівае значэнне. З наступленнем Вялікадня мы, так сказаць, развітваемся з зімой і сустракаем вясну ва ўсім яе харастве. Гэтым святам пачынаецца для земляроба многа палявых работ: трэба ўзараць поле пад яравыя, трэба яго засеяць, заскародзіць, трэба пасадзіць у агародзе, узараць зямлю пад азімыя пасевы для будучага года і г. д. Але ўсе гэтыя работы, якія павінны адбыцца, не страш-

ныя для нашага беларуса: ён любіць сваю адзіную карміцельку-ніву і, працуючы ў поце, выконвае тым самым сваё вялікае назначэнне перад людзьмі. Ён працуе з поўнай аддачай і любоўю. Усё гэта, блізка звязанае з часам святкавання Вялікадня, вылучае дадзенае свята з ліку іншых і надае яму нейкую асаблівую прыгажосць...

Яшчэ за тыдзень да Вялікадня пачынаецца падрыхтоўка да свята. Ужо на Вербніцу заўважаецца пэўнае ажыўленне з выпадку блізкасці свята, і слова «Вялікдзень» ва ўсіх на вуснах. Так як з Вербнага тыдня звычайна пачынаюць выганяць у поле жывёлу, пасцёбваючы яе свянцонай вярбой, то і склалася ў нашага народа наступная песня, якая выконваецца рэчытатывам:

Вярба б'е,
Не я б'ю.
За тыдзень —
Вялікдзень.
Вярбовым дубцом,
Ды самым канцом.
Уставай рана
Быдла гнаць,
Не забудзься
Лусты ўзяць.

Пры вымаўленні гэтых слоў у сувязі з укаранелым звычаем сцябаюць адзін другога вярбой.

Увесь перадвелікодны тыдзень праходзіць у клопатах па частцы падрыхтоўкі да свята. Работы, асабліва для гаспадынь, мноства: трэба напячы, наварыць, насаліць рознай ежы на свята, трэба хоць раз у год і менавіта цяпер перад Вялікаднем зрабіць, так сказаць, генеральнае мыццё хаты: вымыць столь, сцены, сталы, лавы, вычысціць падпечак, дзе ўсю зіму зімавалі куры, ачысціць печ, а часам і пабяліць яе. Што тычыцца велікоднай ежы, то беларускія гаспадыні тут шмат не мудруюць, і ва ўсіх свянцонае бывае аднолькавае: яйкі, пафарбаваныя шалупіннем цыбулі, сыр, масла, пірагі, вяндліна, кілбасы, парасё, смажаная цяляціна — вось, здаецца, і ўсё. Але, гаворачы аб падрыхтоўцы да свята Вялікадня, мы павінны адзначыць два дні перадвелікоднага тыдня — чацвер і пятніцу. У «чысты» чацвер дзяўчаты звычайна ўстаюць вельмі рана, так за гадзіну ці за дзве да ўсходу сонца, каб памыцца халоднай крынічнай вадой. Гэта для таго, каб быць чыстай улетку і каб «загара» не прыставала. У «чыстую» пятніцу некаторымі выконваецца дужа дзіўны і недарэчны звычай. Калі ёсць у сям'і хлопчык 8—10 гадоў, то ён раніцай, калі ўсе яшчэ спяць, зусім

голы вымятае з хаты смецце і зносіць яго ў хлеў, дзе знаходзіцца жывёла. Паводле народнага павер'я, гэта робіцца для таго, каб увесь год у хаце не было блох. У Вялікую суботу ўся падрыхтоўка да свята павінна быць закончана: хата ўнутры і знадворку ўся ачышчана, велікодная ежа згатавана. Беларусу застаецца заняцца сабою: памыцца, «ачысціцца», прыбрацца да светлага свята. Напальваюць агульную для ўсёй вёскі лазню і ідуць туды «ачышчацца»; спачатку — мужчыны, а пасля іх — жанчыны. Велікодная ежа складваецца ў спецыяльны кораб, сплецены з саломы, у той іменна кораб, з якога сеюць, чаму і называецца гэты кораб «сявенька», а калі ён лубяны, то «лубянка». У суботу свяшчэннік па раней аб'яўленым маршруце аб'язджае больш населеныя вёскі свайго прыхода і асвячае ежу. Пры гэтым, па ўкаранелым звычаі, свяшчэннік надзяляецца ад кожнай сям'і валачобным, г. зн. пафарбаванымі яйкамі. У гадзін восем ён вяртаецца дадому з прыхода, і прыкладна ў гэты час пачынаецца ў царкве чытанне апостальскіх дзеянняў... Пасля заканчэння службы свяшчэннік выходзіць на цвінтар і, праходзячы каля рада расстаўленых сявенек, асвячае ежу, якую ён не паспеў асвяціць напярэдадні. Пасля гэтага ўсе збіраюцца дадому. Пачынаецца страшэнная мітусня (беганіна). Справа ў тым, што ўсякі імкнецца трапіць у сваю вёску першым і раней другіх разгавецца. Гэта таму, што, па народным павер'і, у таго будзе лепшы ўраджай і той раней таксама закончыць палявыя работы... Разгаўляюцца абавязкова пры поўным зборы ўсёй сям'і і прытым у сваёй хаце. У сувязі з гэтым адбываецца часта, што пры такой паспешнасці псуюць збрую, воз і яго прыналежнасці ці што-небудзь губляюць.

На першы дзень Вялікадня не дазваляецца ніякіх асаблівых увесяленняў, і ўсе стараюцца быць дома... «Увесь год будзеш цягацца, калі на першы дзень пацягнешся»,— гаварыў наш беларус. Хіба толькі моладзь дазваляе сабе якое-небудзь увесяленне ці гульню. На гэта глядзяць прабачальна, скрозь пальцы, бо, вядома, маладосць — буйнасць...

На другі дзень Вялікадня пачынаюцца велікодныя ўвесяленні. Увесь вясковы люд дзеліцца на тры катэгорыі: на катэгорыю старых людзей, на катэгорыю хлопцаў і дзяўчат і на катэгорыю дзяцей. Усе весяляцца па-свойму і адпаведна ўзросту. Старэйшыя заняты частаваннем, балакаюць, вырашаюць пытанні, якія тычацца гаспадаркі, а вечарам не супраць зайсці і ў карчму, якая для беларуса служыць і клубам, і залай пасяджэнняў, і кухмістарскай, і чым хочаш. Але болей усяго весяліцца моладзь. Адным з самых звычайных увесяленняў

служаць качэлі. Качэлі ладкуюць часцей за ўсё ў гумне, куды збіраюцца хлопцы і дзяўчаты. Гушканне суправаджаецца жартамі, песнямі, а часам ігрой на гармоніку. Весела і прывольна моладзі: тут няма вока старэйшых, і ўсім дыхаецца вельмі свабодна. Вось які-небудзь хлопец штосьці хітра шэпча сціплай дзяўчыне. Ён, відаць, не раўнадушны да яе, ды яго бацькі не толькі не дазваляюць яму жаніцца на ёй, але нават і сустракацца з ёю. І раптам на свята, у крузе, дзе весяліцца моладзь, яны сустрэліся, забіліся іх маладыя сэрцы, і вось яны вядуць сардэчныя размовы, і ім ніхто не перашкаджае, ніхто за імі не назірае:

А я цябе бачыў,
Як ты бычкі гнала,
Не смеў цябе зачапіць:
Матуля стаяла.

А вось агульная харавая песня, якая выконваецца ў час гуляння моладзі:

Як я цябе да не бачу,
Я па табе дзень-ноч плачу.
Як я сяду блізка цебе,
Мне здаецца, што я ў небе.
Як я цябе пацалую,
Тры дні ў губах слодасць чую.

Выключна велікоднай забавай служыць гульня ў яйкі, якая мае дзве разнавіднасці: біццё і качанне з горак. Перш чым біцца яйкамі, звычайна іх мацуюць, г. зн. выпрабоўваюць іх моц пастукваннем яек аб зубы. Гульня гэта шырока распаўсюджана не толькі сярод моладзі, але і паміж старымі і дзецьмі. Выйграе яйка той, у каго яно будзе мацнейшым і таму не разбіваецца аб другое. Калі ў каго-небудзь яйка акажацца вельмі моцным, то ён «выбівае», г. зн. выйграе, яек вельмі шмат. Іншы шчаслівец набярэ іх цэлую шапку і, ззяючы ад поспеху, спяшаецца дадому, робячыся прадметам зайздрасці іншых. Пра яго шчасце весткі зараз жа разносяцца па ўсёй вёсцы: «Не чуў, куме, якое шчасце выпала Міхасю: паўкапы яек выбіў!»

З горкі качаюць яйкі па раней наладжанай дарожцы. Тут выйграе той, чыё яйка далей закоціцца (а ў некаторых месцах — чыё «выбівае» другое.— *А. Г.*).

Але верхам усіх велікодных забаў для беларусаў з'яўляецца ігрышча — гэта, так сказаць, танцавальны вечар, які наладжваюць звычайна ў карчме. На ігрышча збіраецца не

толькі ўся моладзь, але і старыя, каб паглядзець, як іх дзеці гуляюць, ды і пагаманіць са знаёмымі. Звычайна знаходзяць якога-небудзь скрыпача і пад яго музыку вытанцоўваюць часам далёка за поўнач. Гарэлкі на ігрышчах п'юць мала, а болей усё піва, якога часам выпіваюць вялікую колькасць.

На другі і трэці дзень Вялікадня па вёсках ходзяць валачобнікі (ад слова «валачыцца»). Гэтак называюцца велікодныя славельшчыкі-спевакі. Валачобнікі захаваліся толькі на Беларусі, таму што гэты велікодны звычай даўно ўжо прапаў у маларасійскай вёсцы, а ў Велікарасіі яго, здаецца, ніколі не існавала, таму што апошняе гэта свята праслаўляецца і апяваецца аднымі толькі духоўнымі асобамі.

...Народная беларуская паэзія прадстаўляе цэлы вялізны раздзел валачобных песень. Для ўзору мы прывядзём некалькі з іх, запісаных у розных месцах Віленскай губерні. Так, у гонар гаспадара спяваюць:

Добры гаспадару, васол дачакаўшы,
Дай табе божа, добры гаспадару,
Сыны гадаваці й дамы будаваці,
Лічыць тысячамі, даваць мільёнамі.
Твае добры дзеткі, як у полі кветкі,
А твая чэлядка вясела і гладка,
Твой конь пасля працы, як жарабец, скача,
Кароўкі, цяляткі, авечкі і ягняткі,
Качкі, качаняты, куры і курчаты.
Твая ніва дужа ўрадліва:
Чаго ні пасееш, то ўсяго імееш.
Авёс, ячмень, грэчка — з кожнай капы бочка.
Картофля, цыбуля, як гарматна куля.
Жыта і пшаніца і ўсяка пашніца.
Мы цябе віншуем і шчасцем жалуем.
Процiў лета песня спета,
Процiў Юр'я на здароўе.
Просім даць мы валачобнага —
Капу яек нам для кожнага.
Капу-ні-капу, а паўкапы — мала,
Вынесі ты сорак коп,
Каб нам усім стала!

У гонар гаспадароў наогул спяваюць наступную песню:

Ой, ці дома пане гаспадару?
Ой, віно ж, віно зеляно!*
А хоць дома, не акажацца,
У казловыя боты абуваецца,
Пойдзе ў поле жыта глядзець.
А на гарэ — пахілілося,

* Прыпеў паўтараецца пасля кожнага радка.

А ў даліне — у трубы павілося.
Густа, часта, як на небе зоркі.
Дай табе божа ў добрым здароўі
Дамоў звазіць і ў тарпы злажыць.
А дай божа ў тарпе — прыкладна,
На таку — умалотна,
У арудзе — прысыпна,
У млыне — прымольна,
У дзяжы — падыходна,
У печы — румяна,
На стале — сытна,
На стале — сытна,
У сям'і — змірна.
Пане гаспадару!
Не тамі гасцей,
А дары іх барздзей:
З вялікіх паноў — па сто рублёў,
З меншых паноў — хоць па трыццаць.
Пачынальніку — па дзесятнічку,
Механошы — па тры грошы,
А музычыне — горкая доля,
Горкая доля — кварту гарэлкі,
Сыру — на тарэлку, пірог — на закуску.
Гаспадыня! Твая рэч — скавародку ў печ,
А па сланінку — у клець.

Калі ў сям'і ёсць дачка — дзяўчына, то спяваюць:

А ў караля пасярод двара,
Віно, да віно, да, гэй, віно зеляно!*
Стаіць вярба караністая,
На ёй голья — пазлацістыя.
Наляцелі марскія пташкі,
Тыя голья зачапілі,
Тое злота абтрусілі.
Вышла-выбегла красна паненка,
Шаўкоў платок разаслала,
Тое злота падабрала,
Да злотнічкаў адаслала.
— Ах вы, злотнічкі, вы, работнічкі,
Вы здзелайце тры надобінкі:
Першую надобінку — залаты персцень,
Другую надобінку — руцвян вянец,
Трэцюю надобінку — залаты кубак.
Залаты персцень — на мянянейка,
Руцвян вянец — на вянчанейка,
Залаты кубак — на вітанейка.
Не пайду я за мешчаніна, ні за двараніна,
А пайду я за крулёвага сына:
Ён па местах паязджае,
Ён з коніка не злязае,
З тумень ножак не вымае,

* Прыпеў паўтараецца пасля кожнага радка.

Суды судзіць, перасуд бярэ,
А мне, маладзенькай, да да рук дае.
Нашы боцікі натапталіся,
Пакуль да паненкі дапыталіся.
Дай нам, панна, да не шкадуючы,
Каб мы пайшлі панну хвалячы.
Капу яек — на талерачку,
Кілбасою аблажыці,
Белым сырам завяршыці.
Чырвон злоты — нам на боты.
То табе, панна, песня спета,
Песня спета проціў лета,
Проціў Юр'я — на здароўе.

А вось песня ў гонар дачкі гаспадароў, запісаная ў Трокскім павеце, якая напамінае сваім зместам толькі што прыведзеную, са старажытным прыпевам «лалым», ад чаго даўней часамі валачобнікі насілі назву «лалымшчыкі»:

Стаіць вярба сярод двара,
Ай, лалым-лалым, гэй, лалым-лалым,*
На той вярбе — залатая раса.
Прыляцелі марскія пташкі,
Залатую расу абцерушылі.
Вышла-выбегла красная дзяўчына,
Шаўкову хустку разаслала,
Залатую расу падабрала
І панясла да злотнікаў.
Вы, злотнічкі-надобнічкі,
Вы вылейце тры надобкі:
Першая надобка — залаты персцень,
Другая надобка — руцвян вянок,
Трэцяя надобка — шаўковы каберац.
Залаты персцень — на ўпадабанне,
Руцвяны вянок — на заручанне,
Шаўковы каберац — на шлюбаванне.

У гонар сына гаспадара спяваюць:

А ў полі — мяжа,
Ой, віно ж, віно зеляно!*
Цераз тую мяжу да куна бяжыць,
А малады Ясенька
Меціць-меціць, хоча куну забіць.
Стала яна ў яго прасіціся:
— Маладзенькі Ясенька,
Не бі, не страляй мяне,
Ой, як будзеш жаніціся,
Буду я табе ў адгодзе,
У вялікай прыгодзе.

---

* Прыпеў паўтараецца пасля кожнага радка.

Я тваю панну перанясу,
Я цябе, маладога, перавязу,
Я твайго каня ўплаў пушчу.
Маладзенькі Ясенька,
Не тамі гасцей і г. д.

Праілюстраваных намі песень дастаткова, каб зрабіць вывад аб характары валачобных песень, якімі вельмі багата наша народная беларуская паэзія.

Святкаванне Вялікадня працягваецца толькі тры дні, астатнія ж дні тыдня беларус не лічыць святам, хоць і ўстрымліваецца ад работы, але ў сувязі з верай у забабоны. Так, у сераду не працуюць на полі, каб град не пабіў пасеваў, чаму і называецца гэты дзень Градавай серадою. У пятніцу не працуюць дзеля царквы, таму што ўсялякая першая пятніца пасля вялікага свята лічыцца якімсьці асаблівым свяшчэнным днём.

## ВЕЛІКДЗЕНЬ НА БЕЛАРУСІ

Тыдзень св. Вялікадня ў простага народа называецца Велікодным, вялікім і радасным. Першы дзень Вялікадня ў беларусаў называецца «Вялікадзень». Народ чуе ў царкве, што свята Вялікадня вышэй за ўсе іншыя, свята са святаў і ўрачыстасць з урачыстасцей. З другога боку, святкаванне Вялікадня ранняй вясною, калі толькі што пачынае ажываць прырода, надае гэтаму святу ў вачах селяніна нейкае асабліве значэнне. Разам са святам сяляне сустракаюць пачатак палявых работ — галоўную крыніцу іх дабрабыту, галоўную сваю эканамічную задачу.

З Велікоднага тыдня пачынаюцца летнія гулянні, ваджэнне карагодаў і закліканне вясны. На першы дзень Вялікадня ў некаторых мясцовасцях Беларусі сяляне ходзяць глядзець на «ігру» сонца. Дарослыя мужчыны падымаюцца на званіцы глядзець, як будзе «іграць» сонца, а жанчыны і дзеці назіраюць яго на ўзгорках і стрэхах хат. З'яўленне сонца на ясным небе і яго «ігранне» вяшчае добрае лета, добры ўраджай, шчаслівыя вяселлі. Бабулі пры ўсходзе сонца мыюцца з пасудзіны, у якую кладзецца золата, срэбра і чырвонае яйка, спадзеючыся разбагацець і памаладзець. Дзяды расчэсваюць валасы з прыгаворам: «Колькі на галаве валасоў, няхай столькі будзе ўнукаў». У панядзелак святога тыдня на Беларусі выходзяць на могілкі «пахрыстосавацца» са сваімі памерлымі і пагаварыць аб жыцці-быцці. Даўней выходзілі на могілкі ўсёй сям'ёй

і частаваліся да вечара. У аўторак спраўляюць «купалішча»: тых, хто прасыпае «заутраню», абліваюць вадой.

З Велікоднага тыдня паўсюль пачынаецца ваджэнне карагодаў, і першыя з іх, веснавыя, працягваюцца да канца Фаміна тыдня, які завуць таксама «краснай горкай», Радаўніцай. У іншых месцах «краснай горкай» завуць толькі панядзелак гэтага тыдня, Радаўніцай — аўторак. Беларусы Фамін панядзелак называюць «магілкамі», «грабкамі», «праводзінамі»; на «красную горку» яны спяваюць свае вяснянкі — ходзяць з песнямі па вуліцах; дзеці ходзяць па хатах славіць «яр» і «зялёначку».

У некаторых рускіх губернях заклікаюць першы дождж. З паданняў вядома, што раней у заклiканні дажджу удзельнічалі людзі ўсіх узростаў, цяпер жа гэтым займаюцца адны дзеці.

Рэшткі гэтага звычаю сустракаюцца і ў Беларусі. Дзеці прыгаворваюць:

Ідзі, ідзі, дожджыку,  
Звару табе боршчыку,  
Цэбрам, вядром, дайніцаю  
Над усякаю пашніцаю.

На Беларусі спецыяльна велікоднай забавай служыць гульня ў яйкі...

На другі і трэці дзень Вялікадня ў Беларусі па вёсках ходзяць валачобнікі (ад слова «валачыцца»). Так называюцца велікодныя ўслаўляльнікі-спевакі. Валачобнікі захаваліся толькі на Беларусі, гэты велікодны звычай даўно ўжо знік ва ўкраінскай вёсцы, а ў Расіі яго, здаецца, ніколі не існавала...

Валачобнікі гуртам блукаюць з вёскі ў вёску, з хаты ў хату, усюды пад акном, а часам і ў хаце, у выпадку ветлівага прыёму іх гаспадарамі, спяваюць розныя валачобныя песні, атрымліваючы за гэта валачобнае, г. зн. фарбаваныя яйкі ці штонебудзь з велікодных страў, а часам і грошы. Усе гэтыя падачкі збіраюць у адно месца і дзеляць між сабой пароўну або наладжваюць агульнае баляванне валачобнікаў. Падышоўшы да хаты, валачобнікі трохкратна вітаюць гаспадароў, потым пачынаюць пець песню і перш-наперш гаспадару.

Святкаванне Вялікадня працягваецца толькі тры дні, а астатнія дні Велікоднага тыдня беларус не лічыць святам, хоць і ўстрымліваецца ад работы, але па-свойму прымхліва. Так, у сераду не праводзяць палявых работ, каб град не пабіў збажыны. Гэты дзень называецца Градавай серадою. У пятніцу не працуюць дзеля царквы, бо кожная першая пятніца пасля вялікага свята лічыцца нейкім асобым днём.

# ВЯЛІКДЗЕНЬ У СЯЛЯН-КАТОЛІКАЎ ПАЎНОЧНА-ЗАХОДНЯГА КРАЮ

У маральна-рэлігійным жыцці тутэйшых католікаў, сярод якіх пераважаюць літоўцы, свята Вялікадня займае галоўнае месца. Большасць жанчын рыхтуюцца да свята на працягу ўсяго посту, каб як мага лепш сустрэць яго: увесь пост не ўжываюць мясной і малочнай ежы і посную порцыю прыкметна скарачаюць... Лічыцца свяшчэнным абавязкам кожнага селяніна-католіка ў Вялікі пост быць на споведзі ў сваім прыходзе (у іншы ж час можна спавядацца, дзе хочаш), атрымаць дараванне грахоў і прычасціцца. Хто памірае без велікоднай споведзі, згодна павер'ю, трапляе на тым свеце ў чысцілішча або беззваротна гіне, гледзячы што было перашкодай для велікоднай споведзі: памылка, нядбанне, хвароба і інш. Засуха, градабой, вялікі неўраджай, паморак на жывёлу і іншыя нягоды і бедствы ў вясковым жыцці вельмі часта тлумачацца ў народзе заўчасным паміраннем без споведзі наогул і асабліва без велікоднага спавядання. Таму паміж сялянамі-католікамі — земляробамі існуе ўзаемны кантроль, каб кожны сусед пабыў на велікоднай споведзі, непаслухмянага прымушаюць часта з дапамогай мясцовага настаяцеля; такі ж нагляд існуе і над тым, каб ніхто з суседзяў не памёр без споведзі.

У сувязі з постам на працягу ўсёй Чатырыдзесятніцы, не выключаючы падлеткаў і старых, забараняецца ўсялякая скаромная ежа. З малака, якое даюць каровы на працягу сямітыднёвага посту, здымаюць толькі смятану, потым заліваюць яго ў асобную кадушку і ўжываюць пасля Вялікадня — такое, як захавалася: смак, пажыўнасць і гігіенічныя якасці гэтага малака лёгка можна ўявіць сабе.

Напярэдадні Вялікадня, у Вялікую суботу, пры касцёлах на «цментаржу» раскладваецца «свяшчэнны» агонь і ставіцца ў кадушках такая ж вада, па якую прыходзіць звычайна вясковая моладзь — з кожнай вёскі некалькі чалавек; астатнія, хто не паслаў па агонь і ваду, купляюць у іх за яйкі; дапускаецца свяціць і запалкі. Агонь у дамах тушаць і раскладваюць новы, «свяшчэнны», а вадой асвячаюць будынкі, усё тое, што падрыхтавана і назапашана для Вялікадня, і жывёлу,— калі першы раз выганяюць у поле.

На першы дзень Вялікадня ў касцёл адпраўляюцца да світання, таму што велікоднае богаслужэнне («рэзурэкцыя») пачынаецца са світаннем. Да вяртання дамашніх з касцёла разгаўляцца нікому не дазваляецца. Існуе павер'е, што на першы дзень Вялікадня сонца, падзяляючы агульную радасць,

«іграе» («танцуе»), хоць гэта не кожнаму ўдаецца ўбачыць: трэба быць асабліва набожным. Разгаўленне на Вялікдзень пачынаецца з яйка, якое разразаецца на часткі па колькасці членаў сям'і рукой гаспадара, пры гэтым ён вітае ўсіх і жадае шчасліва дачакацца наступнага Вялікадня.

Галоўная забава на велікодных святах — арэлі, пры гэтым спяваюцца дзяўчатамі і маладзіцамі спецыяльныя велікодныя песні мясцовай народнай творчасці — пра жыццё і лёс земляроба. Не апошняя забава — качанне і біццё яек.

Вечарам на першы дзень Вялікадня хлопцы цэлымі гуртамі па 4—6 чалавек абыходзяць сваю і суседнія вёскі, спяваючы пад акампанемент скрыпкі так званую «алілую» і іншыя велікодныя песні, у якіх галоўным чынам на розныя лады ўсхваляюцца гаспадар з маладой жонкай, з просьбай нічога не шкадаваць для такіх гасцей. Песеннікі ходзяць усю ноч, часам да ўзыходу сонца, не даючы нікому спакою. Даюць ім пераважна яйкі, акрамя таго, частуюць спевакоў гарэлкай і закускай. Раніцай, пасля заканчэння абходу, сабраная ўзнагарода дзеліцца паміж членамі арцелі ў адпаведнасці з удзелам і стараннем.

## ВЯЛІКДЗЕНЬ У СЯЛЯН-БЕЛАРУСАЎ

У кожнай хоць троху заможнай сям'і да Вялікадня робіцца свянцонае. Стол накрываецца белым чыстым абрусам і на ім ставяць усялякага роду ежу: яйкі, масла, сыр, каўбасы, шынку, смажаную цяляціну, смажаную ялавічыну, парася, а таксама бабы, куліч і да т. п. Усю гэту ежу вязуць для асвячэння ў царкву, склаўшы яе ў карзіны ці ночвы, да велікоднай ютрані, а калі ў сяле ёсць царква, то свяшчэннік запрашаецца на дом для асвячэння гэтых страў. На велікодным богаслужэнні стараюцца пабываць усе, за выключэннем старых, пад нагляд якіх і пакідаюць свае хаты гаспадары. Пры вяртанні з царквы тыя, хто прыехаў туды на конях, стараюцца апярэдзіць адзін другога. «Калі я пераганю другіх, то мой конь будзець крэпак цэлы год і будзець пераганяць усіх суседніх».

Вярнуўшыся з царквы дадому, беларус у крузе ўсёй сваёй сям'і разгаўляецца свянцонымі яйкамі і кулічом, а затым каштуе ўсе іншыя стравы і свянцонае, якое захоўваецца цэлы тыдзень да Фаміна тыдня. Дарэчы, лічым патрэбным адзначыць адну асаблівасць у звычаі беларускіх сялян. Кожную раніцу на працягу ўсяго светлага тыдня яны перш за ўсё ядуць свянцонае, пасля снедання ці абеду свянцонай ежы нельга

каштаваць — грэх. Абрус, якім накрыты стол са свянцоным, захоўваецца недатыкальным на працягу ўсяго года: ён нібы ахоўвае ад граду, і таму пры з'яўленні градавых хмар рассцілаецца на дварэ. Косці ад свянцонага мяснога закопваюцца ў зямлі на нівах, таму што гэта садзейнічае добраму ўраджаю. Гэтыя ж косці засцерагаюць сабак ад шаленства. У Дзісенскім павеце Віленскай губерні косці і рэшткі мясных страў, пачынаючы са скуркі каўбасы, не аддаюцца ні кошкам, ні сабакам — грэх, яны свянцоныя — і спальваюцца ў печы. У Дзісенскім павеце на першы дзень Вялікадня няможна пазычаць агонь у суседа, інакш будзе перанесена ўсё багацце ў дом таго, хто мае патрэбу ў агні. Заўважым яшчэ, што нашы сяляне-беларусы свята шануюць звычаі і паданні даўніны. У першы дзень Вялікадня няможна ў печы распальваць агонь, інакш будзе пажар.

Разгавеўшыся ў сябе дома, гаспадары не наведваюць у першы дзень свята суседзяў, таму што хто-небудзь з апошніх падумае, што такія госці жабруюць, г. зн. што, не маючы ў сябе «свянцонага», жадаюць паесці яго ў заможных суседзяў. Уся сям'я, за выключэннем дзяцей, сядзіць у сябе дома, надзеўшы святочнае адзенне.

Хлопцы на Вялікдзень збіраюцца ў вялікія гурты валачобнікаў і пад вокнамі кожнай хаты спяваюць шмат розных песень, сярод якіх надзвычай цікавая наступная, якая сваім зместам складае, так сказаць, царкоўна-сельскагаспадарчы каляндар і да гэтага часу выконваецца ў Дзісенскім павеце Віцебскай і Барысаўскім Мінскай губерні:

Ішлі, прыйшлі валачобнікі,
Іграючы, спяваючы,
Добрага пана шукаючы.
— Добры вечар, пане гаспадару!
Чы спіш, чы ляжыш, пане гаспадару?
Калі ж да спіш — бог з табою,
Калі ж не спіш — ходзь за мною.
Адчыні вакно, паглядзі на двор.
На тваім дварэ стаіць шацёр
Навюсенькі, бялюсенькі,
А ў тым шатрэ — залатое крэсла.
На том крэсле сам бог сядзіць,
Перад богам усе святыя
Шыкуюцца, рахуюцца:
Катораму святу наперад пайсці.
Святыя Саракі наперад пайшлі,
Святы Аляксей сохі чэшаць,
Святое Благавешчанне заворваець,
Святы Вербіч вярбу пасвянцаець,
Чысты чацвер ячмень засяваець,
Святое Вялічка з красным яечкам.

Першы дзень пірагі маюць,
А сярэдні дзень пагуляюць,
А паследні дзень выпраўляюць.
Радаўніца статак запасываець,
Святы Юрай, божы пасол,
Да бога пайшоў
Да ўзяў ключы залатыя,
Адамкнуў зямлю сырусенькую,
Пусціў расу цяплюсенькую
На белы свет і на ўвесь свет.
Святы Барыс бабы сеець,
Святы Мікола па межах ходзіць,
Жыта родзіць,
Урасіўся, умачыўся,
Пад залаты пояс падапхнуўся.
Святы Ушэственнік жыта выплываець,
Святая Сёмуха гнаі возіць
І бога просіць.
Святы Дзевятнік жыта раўнуець,
Святая Дзесятуха жыта красуець,
Святы Іван пчолы садзіць
Пад пералазам,
Па шэсцера разам.
Святы Пётра жыта спеліць,
Святы Кузьма сярпы робіць,
Святы Паўлюк граблі робіць,
Святы Дзям'ян сена грабіць,
Святы Барыс снапы зносіць,
Святая Ганна дамоў возіць,
Святы Спас жыта пасвянцаець,
Святая Прачыстая папары мяшаець
І жыта засяваець,
А другая ёй памагаець,
Святое Узвіжанне з поля збіраець,
Святы Міхайла з халодным ветрам,
Святы Пакроў зямлю пакрыў,
Зямлю лістом, а воду лёдам,
Святы Юрай грудай гвоздзіць,
Святы Мікола снегам мосціць.
Прыйшлі Калядкі —
Гаспадарам парадкі.
Святая Васілля
Дзяжу мясіла,
Пірагі пякла, і рагатыя, і багатыя.
Святое Вадохрышча ваду пасвянцаець,
Людзей пакрапляець.
Святыя Грамніцы свечкі пасвянцаюць.
Прыйшлі Саракі да другіх Саракоў:
Дай, божа, гаспадарам здароўя,
Дай, божа, каб жыта радзіла
На ніве — капамі, а ў гумне — скірдамі,
На таку — умалотна, а ў арудзе — спорам,
А ў арудзе — намолам,
У дзяжы — падходам, а ў печы — ростам,
На стале — сыццём!

А вось яшчэ адна цікавая па сваім змесце песня валачобнікаў, якая выконваецца ў Навагрудскім павеце Мінскай губерні. Яна спяваецца ў гонар сына:

Да ляцяць, ляцяць два галубочкі,
Да нясуць па жалудочку.
Дзе жалудочкі палі,
Там два дубы сталі.
Між тых дубоў да Дунай цячэ,
На тым Дунаі чаўнок плыве,
У тым чаўнаку — малады паніч,
Малады паніч — душа Васілька
Пад Ноўгарад пад'язджае,
Турчат выклікае.
— Выйдзі, выйдзі, пан турчанін!
Пан турчанін не выходзіць.
— Мы тваіх служак не прымаем,
Мы твой горад расстраляем,
Расстраляем, разрубаем
Да стрэлкамі пературычам,
К сабе паненку пераклічам!

Валачобнікам-спевакам падаюць праз акно фарбаваныя яйкі, булкі, сыр і ўсялякую ежу.

Не кажучы аб тым, што ўсюды ў Паўночна-Заходнім краі існуе звычай пры хрыстосаванні абдорваць адзін другога яйкамі, адзначым арыгінальны звычай у Кобрынскім павеце: дарослыя дзяўчаты-нявесты абдорваюць маладых хлопцаў некалькімі парамі яек, а тыя ў сваю чаргу абдорваюць іх у час сельскіх свят, калі бываюць кірмашы, звязкай маленькіх смаргонскіх абаранкаў. Такі абмен падарункамі раўназначны прызнанню ў каханні паміж дзяўчынай і хлопцам.

З другога дня Вялікадня сяляне наносяць візіты адзін другому па чарзе, ад суседа да суседа, у кампаніі з другімі, што працягваецца да самай Велікоднай суботы, г. зн. цэлы тыдзень. У гэты апошні дзень селянін паступае ў сваёй абрадавай форме так, як і ў першы дзень свята Вялікадня. Разгаўляюцца раніцай свянцонымі яйкамі, прычым прымаўляюць: «Яйкам адгавелісь, яйкам і закончым».

Закончыўся Велікодны тыдзень, і сяляне чакаюць Радаўніцы, якая наступае ўслед за Вялікаднем, каб на могілках са сваімі бацькамі і дзядамі пахрыстосавацца.

## ВЕЛІКОДНЫЯ АБРАДЫ І ЗВЫЧАІ Ў ВЁСЦЫ

Толькі паспела прырода ачнуцца ад доўгага зімовага сну, як усе — і старыя і малыя — рыхтуюцца з радасцю сустрэць вялікае веснавое свята — Вялікдзень.

Вельмі важную ролю ва ўяўленнях сялян іграе велікоднае яйка, атрыманае ад каго-небудзь першым. Яно быццам бы не псуецца на працягу ўсяго года і мае цудадзейную сілу. З самім так званым хрыстосаваннем звязана нямала забабонаў: калі, напрыклад, на першае прывітанне «Хрыстос уваскрэс» не адказаць «Ва ісціну ўваскрэс», а задумаць якое-небудзь жаданне, то яно абавязкова здзейсніцца. Гэта павер'е сярод сялян трымаецца асабліва ўпарта. Вяртаючыся пасля велікоднай службы дамоў, народ любуецца ўзыходзячым сонцам (па павер'і, яно «іграе» ў гэты дзень на небе і раздзяляе агульную радасць і прыроды і людзей у сувязі з адраджэннем жыцця). Існуе таксама звычай: на першы дзень Вялікадня мыцца ў вадзе, у якую пакладзены срэбныя і залатыя рэчы і чырвонае яйка, каб увесь год быць багатым і такім чыстым і прыгожым, як яйка. Маці гладзяць чырвоным яйкам (якое вынуць з вады) па твары ўсіх дзяцей, каб яны былі заўсёды румянымі і чырванашчокімі, а значыць, і здаровымі. Старыя расчэсваюць у гэты дзень валасы с пажаданнем, каб у іх было столькі ўнукаў, колькі валасоў на галаве.

Ва ўсе тры дні свята маладыя хлопцы групай чалавек 10—15 з запявалам, ці пачынальнікам, на чале ходзяць па вёсках і маёнтках з валачобнымі песнямі, якія напамінаюць калядкі, і распяваюць іх пад вокнамі, а часам заходзяць у хату з мэтай, каб іх пачаставалі. За свае песні валачобнікі абдорваюцца гаспадарамі і печаным і вараным, а часам яны атрымліваюць нават і грошы, якія пасля дзеляць паміж удзельнікамі хору. Нярэдка групу валачобнікаў суправаджае музыкант са скрыпкай ці гармонікам, а раней — з дудой.

З гэтага часу ў вёсках пачынаюцца першыя вясеннія карагоды і гульні, якія заканчваюцца на Фамін тыдзень, а затым наступае так званая «красная горка» — час вяселляў і першага веснавога гуляння на адкрытым паветры.

## ВЕЛІКОДНЫЯ ПЕСНІ НА МІНШЧЫНЕ

### ВАЛАЧОБНІКІ

Калі прыйдзе Вялікдзень — свята вясны, сонца і адраджэння ўсяго, што прагне жыць маладым і буйным жыццём, а дагэтуль спала летаргічным сном,— у гэты час і ў шэрай призямленай душы беларускага люду будзяцца стыхійныя праблескі паэзіі і радасці жыцця.

У гэты час, паводле старадаўняга звычаю, гурты святочна

прыбраных падлеткаў і дарослых хлопцаў, а часам і старэйшых мужчын — валачобнікі — ходзяць ад вёскі да вёскі, ад двара да двара са спевамі і музыкай; яшчэ перад захадам сонца распачынаюць сваё вясёлае валачэнне, каб закончыць яго позна ноччу ў якой-небудзь прывілеяванай вясковай хаце або ў больш гасцінным двары. Зрэшты, валачобнікам усюды і ўсе рады; кожны ахвотна слухае прымеркаваныя да акалічнасцей і асоб спевы, пераплеценыя заліхвацкай, хоць не вельмі гарманічнай, музыкай, кожны адчувае абавязак надарыць спевакоў ці то грашыма ці велікоднымі спецыяламі, шчодра падрыхтаванымі вясковымі гаспадынямі.

Гэтыя валачобныя спевы вельмі разнастайныя ў кожнай ваколіцы. Першапачатковы змест, аднак, у іх заўсёды застаецца той самы — гэта радасць вясны, услаўленне вясны і ўсіх святых божых дароў, якіх яна з'яўляецца прадвесніцай, а пазней — лета ўрадлівага: селянін жыве толькі з плёну зямлі, таму таксама адзіна і перш-наперш з ёй разам жыве, з гэтай маці сваёй і карміцелькай. Адсюль гэта ўрачыстае ўгляданне ў пераломную хвіліну вясны. Адсюль тая расчуленасць і захапленне, і паэтычнасць строгай рэалістычнай сялянскай песні, калі гавораць аб вясне і яе будучых хлебных дарах. Адсюль гэта абрадавае манатоннае заканчэнне кожнага веснавога спеву:

Проціў лета песня спета,
Проціў лета ўрадлівага,
Проціў року шчаслівага.

Валачобныя песні не спяваюцца на чыстай беларускай мове: гэта мешаніна народнай гаворкі з «пальшчызнай», у якой уплыў гэтай апошняе сягае нават канцовак і цэлых выразаў — жыўцом польскіх пры існаванні раўназначных беларускіх. Сведчыць гэта, што спевы, зместам сваім звернутыя галоўным чынам да «двара» і «пана», мусілі былі аднолькава падлягаць пераважнаму моўнаму ўплыву таго ж двара, але ўплыву дабравольнаму адзіна вышэйшай культуры; ніякага прымусу тут быць не магло, калі роўна даўней, як і цяпер, польскія памешчыкі на Літве стала карыстаюцца «беларушчынай» у зносінах з народам і мовы сваёй яму ў цэлым не навязваюць. Які моцны павінен быў быць некалі той уплыў, калі дагэтуль захаваліся ў спевах такія выразы і азначэнні:

1) «шлі да свэга пана, як да гетмана»;
2) «нема ў дома, он в Кракове»;

3) «пшыедзе кавалер з Украіны»;

4) «у его сурдут сукна «варшавскего».

Мелодыя спеваў, як заўсёды, убогая і манатонная, а рыса гэтая яшчэ павялічвае спяваны пасля абсалютна кожнага радка харавы прыпеў «Хрыстос васкрэс, сын божы».

Усе ніжэйпрыведзеныя чатыры мелодыі маюць тую самую ноту. Запісаны ў ваколіцах збегу рэк Сулы і Нёмана, на пагранiччы Мінскага і Ашмянскага паветаў, у 1910 годзе.

## ВЯЛІКДЗЕНЬ

Да Вялікадня сяляне рыхтаваліся вельмі старанна. Прыбіранне хаты ішло надзвычай рупліва. Вялікдзень лічыўся самым вялікім святам, вышэй за Каляды. На Вялікдзень нават жанчыне дазвалялася выпіць крыху гарэлкі. Мыццё хаты пачыналі з серады. Усё выносілася на двор. Сяннікі набівалі свежай саломай. Падлогу мылі дабяла. У «чысты» чацвер перад Вялікаднем памытую падлогу засцілалі саломай. Салома ў хаце ляжала аж да суботы. У суботу апоўдні салома прыбіралася, а замест яе клалі лапкі. У пятніцу пяклі чорны хлеб. Рабілі макароны (вельмі смачныя, з яйкамі, цеста прасушвалася, а пасля з яго крышылі макароны). Зацірка варылася на вадзе, але з пытляванай мукі. У суботу пяклі пірагі. Раніцай (у суботу) фарбавалі яйкі. А ў каго жалоба была — не фарбавалі, вязлі свянціць нефарбаванымі.

Валачобнікі таксама не пелі ў тых, у каго жалоба. Звычайна валачобнікі хадзілі ў Велікодную ноч. Пачыналі пяяць з хаты дзяка, а тады ўжо ішлі па іншых дварах. Спявалі для гаспадара (гаспадыні), для хлопца і дзяўчыны. Усё гэта было ў ноч з першага на другі дзень Вялікадня.

Перад самым Вялікаднем, у суботу вечарам, на конях везлі свянціць да царквы. Вельмі рэдка хто нёс кошычак у руках, бо бралі з сабой шмат розных страў, тым больш што сем'і ў вёсках тады былі вельмі вялікія і ўсіх трэба было накарміць свянцоным.

Усе работы перад Вялікаднем завяршалі ў суботу да паўдня. Пасля паўдня мыліся ў лазні. Елі ўсё толькі поснае. Некаторыя жанчыны нават нічога ў рот не бралі пачынаючы з «чыстага» чацвярга. Бывала і так, што яны да Вялікадня не дацягвалі, трацілі прытомнасць. Тым больш што на гэтыя дні выпадала зрабіць нямала цяжкай работы.

Раніцай у першы дзень Вялікадня маці апускала свянцонае яйка ў ваду. І ўсе хатнія мыліся гэтай вадой пасля вяртання з царквы. Пасля разгаўляліся свянцоным.

Вечарам і на ўсяночнай у царкве званіў толькі званар. Выбіваў звонам гукі накшталт: «к нам», «кннам», «к нам», «кннам ідзіце».

На другі дзень Вялікадня ў царкве ішло набажэнства. Везлі прычашчаць дзяцей.

Трэці дзень свята ішоў без набажэнства. Лічыўся гэты дзень «праведачным да сваякоў».

Чацвёрты дзень — «градавік». Не працаваў ніхто, каб град пасеваў не пабіў. Некаторыя, праўда, не прытрымліваліся гэтага звычаю, ішлі ў поле і працавалі.

Праводная нядзеля — праз тыдзень пасля Вялікадня, у наступную нядзелю. Таксама святкавалі. Гэта азначала, што велікодныя святкаванні закончаны, засталася толькі Праводная нядзеля.

## ВАЛАЧОБНІКІ Ў ВІЦЕБСКАЙ ГУБЕРНІ

Калі вам давядзецца праязджаць па Віцебскай губерні ўночы са Светлай нядзелі на панядзелак, то абавязкова дзе-небудзь натрапіце на гурт сялян чалавек восем, дзесяць і больш. Магчыма, гэта сустрэча азадачыць вас у лесе ці сярод поля. Гэта так званыя лалыншчыкі, або валачобнікі, людзі зусім міралюбівыя, рахманыя, нават баязлівыя, як наогул беларускія мужычкі. Можаце ехаць спакойна, а калі маеце пры сабе медную грыўню і любіце простанародныя песні, то ў вашай ласцы будзе прымусіць беларускіх трубадураў праспяваць solo з акампанементам дуды і скрыпкі ў чыстым полі ці ў глухім лесе...

Валачобніцтва вядзецца ў нас з даўен-даўна, з незапамятнага часу і трымаецца ўпарта. Нельга сказаць, што асабліва весела было селяніну цягацца ноччу па падаконні, не выбіраючы дарогі, і драць глотку, і не дзеля нажывы пускаецца ён у гэтыя надзвычайныя падарожжы, хоць нельга зусім адмаўляць і той і другой пабудкі, а, строга кажучы, такі ўжо звычай завёўся і трымаецца. Мы аднойчы спыталі ў селяніна, якога бачылі ў гурце валачобнікаў, для чаго, маўляў, ваш брат бадзяецца начною парою з песнямі.

— Ды мы, паніч,— адказаў ён,— не ведаем добра, для чаго гэта. Бацькі і дзяды нашы хадзілі і нас вучылі. Кажуць, што «лалын» (азначэнне песні) пачалі спяваць, як змянілася вера...

Якую перамену веры валачобнік разумеў і ці сапраўды ў выніку змены веры ўзнік звычай валачобніцтва, бог ведае. Хто любіць дасціпныя і ні на чым не заснаваныя здагадкі,

што валачобніцтва ў нашым краі, магчыма, з'явілася разам з увядзеннем уніі, як бязмоўны пратэст простага народа супраць спынення пабожнага звычаю прытча на свята Вялікадня наведваць з абразамі дамы прыхаджан...

...Самі валачобнікі глядзяць на свой занятак амаль як на рэлігійны абавязак: прахадзіць пад вокнамі ўсю ноч з песнямі ў сваёй вёсцы і ў суседніх у іх значыць без мала тое, што працягнуцца на каленях вакол царквы ў гадавое свята ці праляжаць крыжам на царкоўнай паперці ўвесь час, пакуль адпраўляецца служба. А гаспадары прымаюць дакучанне як прыемныя і карысныя віншаванні і ў большасці выпадкаў чакаюць іх як благаславёных гасцей, а часткова і як прадвеснікаў лёсу гаспадаркі.

Варта ўвагі павер'е, якога прытрымліваюцца наконт гэтага сяляне. Паводле іх разумення, ёсць нейкая таямнічная сувязь паміж візітам валачобнікаў і станам гаспадарчых работ і прыбыткам у наступную вясну і лета. Калі ў час прыходу валачобнікаў у вёску на дварэ ціха, няма дажджу, ноч ясная, зорная, то гэта поўны знак таго, што надвор'е будзе спрыяць ярыне, што ўраджай будзе добры, асабліва ж прыбыльнай і паспяховай будзе ўборка сена. Невялікая бяда, калі на дварэ і пахмурна, калі нават незадоўга да прыходу валачобнікаў ішоў дождж: значыць, хоць і будуць летам дажджы, нават вялікія, але гаспадарка будзе і з хлебам, і з сенам. Але калі, на няшчасце, толькі спевакі зацягнуць свой «лалын», а тут дождж, то не чакай селянін дабра: будзе дождж і каля Юр'я, і каля Міколы, і каля Пятра, і на Іллю, у Спасаўку; яшчэ хлеб — так-сяк, а сена, лічы, прапала...

Наколькі нам вядома, акрамя паветаў Дзінабургскага, Люцынскага і Рэжыцкага, усюды па Віцебскай губерні вядзецца велікоднае валачобніцтва: праўда, па казённых маёнтках яно заўважаецца радзей, чым па памешчыцкіх. Валачобнікі ходзяць партыямі, чалавек па восем і болей, да дваццаці, і заўсёды трымаюцца ў межах той царквы, да якой належаць паводле месца жыхарства: гэта як нейкі свой народны прытч... У прыходзе не бывае ніколі менш двух-трох валачобных партый (гуртоў), а калі парафія вялікая і адлегласць паміж вёскамі значная, то лік іх даходзіць да дзесяці.

Галоўная асоба ў кожнай партыі — так званы пачынальнік, ці запявала; гэта нешта накшталт арцельшчыка і павадыра: ён пачынае песню і спявае ўсе куплеты, на яго рукі выдаецца ўзнагарода. У пачынальнікі найчасцей выбіраецца заможны гаспадар, абавязкова галасісты і пры гэтым бойкі,

нават назойлівы, каб пры выпадку мог выпатрабаваць добрую ўзнагароду за песню.

Пры партыі абавязкова маецца музыка, а часам і два, адзін са скрыпкай, а другі з так званай дудой. Для нашэння падарункаў таксама выбіраецца асобны чалавек, заўсёды дужы, адпаведна свайму прызначэнню: яго завуць механошам. Усе астатнія члены партыі складаюць штось нібы хор: яны спяваюць прыпеў пасля кожнага верша і завуцца падхватнікамі. Састаўляюцца партыі валачобнікаў выпадкова: задумае нехта адзін, скажа другому, трэцяму селяніну са сваёй вёскі ці з суседніх, сыйдуцца як-небудзь, трохі памяркуюць, згодзяцца, запрашаюць вядомага пачынальніка — і партыя гатова.

У валачобнікі ідуць часцей за ўсё мужчыны сярэдняга веку і маладыя хлопцы; рэдка трапляюцца між іх старыя і замужнія жанчыны, а дзеці і дзяўчаты зусім не ходзяць.

Хаджэнне валачобнікаў пачынаецца каля 5 гадзін вечара ў першы дзень свята, а ў пагостах — па сканчэнні вячэрні і працягваецца ўсю ноч да раніцы. На світанні слаўленне канчаецца, хоць бы і не ўдалося абысці ўсе дамы, толькі ў Себежскім павеце месцамі ходзяць валачобнікі і ў другую ноч і нават у трэцюю. Віншуюцца пераважна гаспадары заможныя, прынамсі не круглыя беднякі і бабылі; не пазбаўлены гэтай пашаны і раскольнікі, якія жывуць па суседству, тым больш што яны ветліва прымаюць віншавальнікаў і надараюць вельмі шчодра. Валачобнікі рашаюцца непакоіць і духавенства, толькі папярэдне пытаюць дазволу.

Двор, які стаіць на краі вёскі, першым прымае віншаванні валачобнікаў. За імі паступова іншыя, у тым парадку, у якім стаяць. Выключэнне з гэтага парадку не робіцца ні на карысць духавенства, ні на карысць стараст і іншых сельскіх чыноў.

Гурт валачобнікаў звычайна становіцца пад акном хаты паўкругам, усярэдзіне — пачынальнік; гэты апошні пад акампанемент скрыпкі запявае першы верш «лалыма»; падхватнікі спяваюць прыпеў «Хрыстос васкрос, сын божы!», за прыпевам спяваецца другі верш, за ім зноў прыпеў і так да канца. Запявала нярэдка суправаджае сваё сола адпаведнымі рухамі цела, а падхватнікі ў час прыпеву пляскаюць у далоні. Пасля заканчэння песні кім-небудзь з гурту, а часам і змешанымі галасамі многіх гаворыцца кароткае імправізаванае вітанне. Затым звычайна гаспадар ці гаспадыня адчыняюць акно, дзякуюць валачобнікам і падаюць ім, што бог даў: пяток ці дзесятак яек, канец пірага, акраец хлеба, кавалак сыру, варанага мяса або замест усяго грыўну грошай; у іншых дамах даюць асобна пачынальніку і падхватнікам. Атрыманае пера-

даецца механошу аж да дзяльбы. Якое б малое ні было дабравольна пададзенае, гурт заўсёды ім задаволены, хоць у песні выгаворвае сабе ледзь не залатыя горы, патрабуючы, між іншым, для пачынальніка 50 яек, а падхватнікам па 25. Ад шчырасці, зычлівасці гаспадара залежыць паклікаць валачобнікаў у хату — самі яны не заходзяць — і паднесці ім па чарцы ці па дзве гарэлкі: яны людзі падатлівыя, не адмаўляюцца ад гэтага частавання... Атрымаўшы ўзнагароду, гурт дзякуе гаспадару ці словамі, ці асобнай кароткай песняй, жадаючы яму ўсякага прыбытку і ўсяго добрага. Здараецца, што надзея падманвае валачобнікаў. Песню яны праспяваюць, чакаюць, што вось зараз заможны гаспадар узнагародзіць іх, а між тым у адказ ім толькі пастукаюць у акно і скажуць: «Ідзіце сабе з богам далей». У гэтым выпадку пачынальнік звычайна адстойвае годнасць партыі. У адрывістых, але моцных выразах ён пратэстуе супраць няветлівасці і скнарнасці гаспадара, будзіць яго сумленне, патрабуе, пагражае і не скупіцца на вельмі моцныя словы. Калі насуперак спадзяванням простыя перакананні не дзейнічаюць на кулака, калі ён яшчэ са свайго боку пасылае валачобнікам розныя нялёгкія зычэнні і пагражае сабакамі, то партыя скарыстоўвае апошні сродак, найболей, як ёй здаецца, страшны і дзейсны: ізноў строяцца ў пазіцыю пад акном і спяваюць іншую песню тым жа парадкам і з тым самым прыпевам, як і першая, толькі з такімі вітаннямі і зычэннямі, ад якіх, паводле меркавання валачобнікаў, не паздаровіцца ні гаспадару, ні гаспадарцы. Калі і песня не дзейнічае, то валачобнікі, вылаяўшы гаспадара яшчэ раз на развітанне, больш яму не дакучаюць і адпраўляюцца пад вокны іншага дома. На надвор'е нашы вандроўныя спевакі не глядзяць: ці снег на дварэ, ці дождж, няхай сабе па калена гразь — ім усё роўна. Спакойна, з халодным сэрцам, нягледзячы ні на што, яны пераходзяць ад хаты да хаты, з вёскі ў вёску, становяцца паўкругам, выдадуць песню: калі б іншаму гаспадару-жартаўніку ўздумалася пацешыцца іх танцам пад дажджом, у гразі, то адразу ж раздадуцца пранізлівыя гукі дуды, і гурт дзеля задавальнення гаспадара адтанцуе «Камарынскую» або «Галубца» ці што-небудзь іншае пад песню пра тое, як абадранец з абшарпанцам пусціліся ў танцы. Адна толькі ў валачобнікаў бывае перашкода: гэта мясцовы прытч, які часам загадзя прымае меры супраць сваявольнага слаўлення. Але гэта перашкода рэдка бывае. Прастуды, гарачак і падобнага наш селянін не баіцца, і ўся гарэзлівасць абходзіцца яму нядорага — толькі часам замерзне або вымажацца ў гразі, за што па звароце дахаты атрымае невялікую прачуханку ад жонкі ці ад сям'і.

Па сканчэнні працы валачобнікі са здабычай вяртаюцца ў сваю вёску і збіраюцца ў хаце запявалы ці найбольш паважанага з падхватнікаў, а часам у гумне. Пачынаецца дзяліцьба. Пачынальнік аддзяляе ад усяго збору тое, што дадзена было яму асабіста. Затым лічацца асобна яйкі, кавалкі мяса, пірагоў, хлеба, і кожнаму валачобніку з кожнай «стацці» выдаецца аднолькавая доля, а ўсё, што застаецца ад роўнай дзяльбы, складае непатрэбны барыш запявалы. Нярэдка пры гэтым бываюць сваркі і бойкі: рускі чалавек нападпітку, асабліва на свята, рэдка адмаўляе сабе ў гэтай прыемнасці. Частка здабычы амаль заўсёды тут жа бывае і з'едзена; рэшта прыносіцца дамоў, у рэдкіх выпадках трапляе ў карчму. А яйкі бяруцца для так званага качання.

## НАРОДНАЕ СВЯТКАВАННЕ ЮР'ЕВА ДНЯ Ў ЗАХОДНЯЙ РАСІІ

Свята св. Юр'я ў Заходняй Расіі абстаўлена, па народным паданні, шматлікімі цырымоніямі. У некаторых месцах (Мір — Мінская губ., Навагрудскі п.) у гэты дзень сяляне адпраўляюцца на могілкі і запрашаюць туды святара адслужыць ім паніхіду. Памянуўшы сваіх родных, яны з прынесенай загадзя ежай і гарэлкай застаюцца на могілках і там п'юць, ядуць, спяваюць песні па памерлых. Рэшткі ежы яны пакідаюць на могілках, думаючы, што мёртвыя выкарыстаюць гэта пасля таго, як яны пойдуць, таму што ў прысутнасці жывых мёртвыя не могуць есці. Гарэлку, калі застаецца, звычайна выліваюць на магілку з той мэтай, каб, прынамсі, абліць ёю мёртвага, які раптам, устаўшы пасля, не захоча яе піць.

Дзень Юр'я лічыцца апошнім, у які можна яшчэ біцца яйкамі, што засталіся ад свята Вялікадня.

Св. Юрый лічыцца ў сялян заступнікам жывёлы і асабліва коней. У ноч перад Юр'ем неабходна выводзіць коней у поле: гавораць, што ў гэты час з'яўляецца першая раса, якая вельмі карысная для жывёлы, асабліва для коней.

У песні спяваецца так:

Святы Юрай да ўрасіўся

або

Святы Юрай, божы ключнік,
Вазьмі ключы, ідзі ў стайню,

Вазьмі каня варанога,
Ідзі ў поле ў чыстае,
Адамкні зямлю, пусці расу.

Або

Юрай, уставай рана,
Адмыкай зямлю,
Выпушчай расу
На цёплае лета,
На буйнае жыта,
На ядраністае,
На каласістае,
Людзям на здароўе.

Дамовіўшыся з вядомым начлежнікам, якому гаспадар мае намер даручыць сваіх коней, спачатку ён з усёй сям'ёй становіцца перад іконай св. Георгія і моліцца, каб захаваць сваіх коней у цэласці. Пасля малітвы гаспадар бярэ столькі яек, колькі ў яго коней; тры разы абыходзіць вакол хлява, дзе стаяць коні, пасля кладзе іх пад парогам. Перахрысціўшыся тры разы, гаспадар адчыняе хлеў, уваходзіць туды, прымаўляючы: «Прыйшла Юр'ева раса, не дам вам аўса». Тры разы гладзіць іх рукой па ўсёй спіне, надзявае аброць, выводзіць з хлява і стараецца сам правай нагой стаць на парог хлява, дзе пакладзены яйкі: там, на думку сялян, знаходзіцца д'ябал, які ўсяляк імкнецца пашкодзіць коням і можа зрабіць гэта толькі напярэдадні Юр'ева дня. Стаць правай нагой на парог хлява — значыць зусім абяссіліць д'ябла, зрабіць яго для сябе бясшкодным. Вывеўшы коней з хлява, гаспадар перадае іх начлежніку. Разам з тым ён дае яму пару каўбас, кварту пшанічнай мукі, кусок сала, які-небудзь дзесятак яек і некалькі грошай. Начлежнік адпраўляецца ў раней ужо ўмоўленае з таварышамі месца, і там усе яны наладжваюць сабе пачастунак (в. Загор'е Сеннінскае — Мінская губ., Навагрудскі п.).

Народнае паданне расказвае, якім чынам св. Юрый зрабіўся заступнікам жывёлы. Аднойчы бог склікаў усю жывёлу пад вялікі дуб (дзесьці пад канец свята, па выказванні сялян). Тут разам з богам былі і ўсе святыя, за выключэннем аднаго Юр'я, які не паспеў з'явіцца да гэтай урачыстасці з-за далёкай дарогі. Ззаду за святымі стаяў «нячысты дух». На гэтым сходзе бог прызначаў кожнаму класу створаных істот асобную ежу, якая каму падабаецца. Д'ябал выпрасіў для сябе ў бога авёс, жадаючы, такім чынам, быць панам над коньмі. У гэты час падаспеў і Юрый і стаў прасіць у бога і яму даць што-небудзь з яго тварэнняў. Бог даў Юр'ю асот. Юрый стаў

прасіць у бога чаго-небудзь лепшага. Бог заўважыў яму: калі адбярэш у д'ябла, то будзе твой авёс. Юрый, не трацячы ні хвіліны, паспяшаўся апярэдзіць д'ябла і засеў непадалёку ад той нары, праз якую чэрці прабіраюцца з пекла на гэты свет і назад. Д'ябал, каб не забыцца, што назначыў яму бог, пастаянна гаварыў: «Авёс, авёс, авёс». А тут Юрый выскачыў з-за куста і крыкнуў нечакана: «Ага!» Чорт перапалохаўся, пачаў калаціцца, пляваць: «Цьфу, забыўся нават, што гаварыў!» «Ты паўтараў — асот»,— падказаў яму Юрый. Д'ябал стаў гаварыць «асот» замест «авёс» і адправіўся ў сваё царства. Юрый паспяшаўся да бога і быў назначаны апекуном жывёлы і ў сваё распараджэнне атрымаў авёс. Таму пастухі лічаць вялікім няшчасцем не пабыць у гэты дзень у царкве, а сяляне не наварыць аўсянага кісялю. Падобны пагляд на Юр'я выражаецца і ў народных песнях.

Напярэдадні свята Юр'я гаспадыні ў некаторых месцах пякуць хлеб, так званы каравай, абгортваюць яго пасля абрусам і аддаюць гаспадару. Узяўшы каравай, гаспадар кладзе яго ў кашэль (торбу з кары бяросты). Устаўшы на другі дзень як можна раней, гаспадар бярэ кашэль з караваем, адпраўляецца ў дарогу і абыходзіць усё сваё поле. Прыйшоўшы да апошняй паласы, дзе расце жыта, гаспадар дастае каравай, кладзе яго ў жыта і параўноўвае вышыню жыта з караваем. Калі каравай схаваецца ў жыце, то жыта, гавораць, у гэтым годзе будзе добрае. Прачытаўшы тут жа малітву, гаспадар адпраўляецца дадому. Калі ён вяртаецца дадому так рана, што ў сям'і не ўсе яшчэ ўсталі, то ён сам крыху адпачне, а пасля, калі ўсе падрыхтуюцца да снедання, разразае каравай на порцыі па колькасці членаў сям'і, і ўсе разам пасля малітвы снедаюць. Адведаўшы «святога хлеба», гаспадар спяшаецца ў царкву памаліцца св. Юр'ю з мэтай захавання яго жывёлы.

У другіх месцах гэтыя цырымоніі завяршаюцца крыху складаней, болей урачыста.

Спёкшы каравай, гаспадары часам з сям'ёй раненька, абавязкова не еўшы, адпраўляюцца ў абход сваіх палёў. Акрамя каравая яны бяруць з сабой гарэлку, каўбасы, яйкі, косці ад той ялавічыны, якую асвячалі на свята Вялікадня. Косці захоўваюцца ці ў натуральным выглядзе, ці ў выглядзе попелу пасля таго, як іх спаляць. Прыйшоўшы на поле, гаспадары часам качаюцца самі па жыце, каб акрапіцца «Юр'евай расой», а пасля качаюць свае караваі. Абыходзяць свае нівы з песнямі: «Юрый, уставай рана, адмыкай зямлю» і інш. На мяжы поля віншуюць сваю ніву. «Добры дзень, ніва святая,— гавораць сяляне,— віншуем з хлебам і соллю і святым Юр'ем, каб бог

і Юрый пацешылі надвор'ем, ураджаем і здароўем». Гаспадару пры гэтым жадаюць піва варыць, сына жаніць, гарэлку гнаць, дачку замуж аддаваць. Пасля гэтага тут жа пачынаецца баляванне. Выпіваюць прынесеную гарэлку і закусваюць. Касцямі, калі яны ў натуральным выглядзе, абтыкаюць мяжу; калі ж яны захаваны ў выглядзе попелу, то апошнім абсыпаюць тыя месцы, на якіх расце асака. Думаюць, што пасля гэтага не будзе расці пустазелле.

Ці яшчэ: абыходзяць палі з асвячонай вярбой. Пасля ў пэўным месцы ўтыкаюць яе ў зямлю з той надзеяй, што гэтым абароняць (засцерагуць) ніву сваю ад граду. Каб пазбавіцца ад граду, звяртаюцца яшчэ і да такіх сродкаў: калі ўбачаць градавую хмару, адломваюць некалькі галінак асвячонай вярбы, бяруць рознага роду травы (зелле), асвячоныя ў дзень Іаана Хрысціцеля ў мінулым годзе, на «зельную», і кідаюць усё гэта ў гарачае вуголле: думаюць, што хмара пасля гэтага пройдзе без шкоды.

Сярод сялян у некаторых месцах захоўваецца паданне, чаму неабходна ў дзень св. Юр'я рабіць абход сваіх палёў. Гавораць, што калісьці было зроблена такое распараджэнне, што калі сын не заб'е свайго састарэлага бацьку ў той час, калі сам можа быць гаспадаром, то сам ён ад грамадства павінен падвергнуцца гэтай долі. Аднак здарылася так, што адзін добры сын вельмі быў прыхільны да свайго бацькі, і ў яго ніяк не падымалася рука зрабіць злачынства. Не хацелася ў той жа час і самому падвергнуцца цяжкай долі. Вось любячы сын схаваў свайго бацьку ў склеп, распусціў тады ж слух, што ён забіў яго. Справа была ўладжана. Сын між тым пастаянна наведваў свайго бацьку, прыносіў яму ўсё неабходнае для жыцця і карыстаўся яго парадамі. Атрымалася, што ў гаспадарцы не стала жыта для сяўбы ды і недзе было купіць яго. Сын звярнуўся за парадай да бацькі, як быць у дадзеным выпадку. Бацька параіў яму пайсці набраць саломы, якою накрыты хаты, добра перамалаціць яе і пасля рассеяць па полі. Сын так і зрабіў. З прыходам вясны сын пайшоў паглядзець, што робіцца на яго ніве, якія ўсходы, але там, на яго здзіўленне, хоць шаром пакаці, нічога не было. Засмучаны, сын ізноў пайшоў да бацькі, паведаміў яму сваю тугу і гора. Бацька сказаў, што ён у дзень св. Юр'я павінен пайсці на поле, абысці яго, а пасля паслухаць, што будзе гаварыць жыта. Абышоўшы поле, сын прыклаў вуха да зямлі і стаў слухаць, улёгшыся на загоне. Жыта як бы гаварыла яму: «Пасунься ты, тут сядуць тры», што быццам бы ўказвала на будучыя густыя ўсходы. Сапраўды, жыта ўрадзілася

надзвычай добрае, кусцістае на заглядзенне ўсім суседзям. Удзячны сын адкрыў, у чым тайна... Усе, вядома, пранікліся глыбокай павагай да старога і рашылі болей не забіваць сваіх бацькоў, а на Юр'я абыходзіць палі і слухаць, што гаворыць жыта.

У некаторых месцах яшчэ водзіцца звычай, каб маладзіца, якая выйшла ў тую зіму замуж, накрыла ўсходы жыта палатном. Пасля гэтага п'юць і закусваюць у гонар заступніка статкаў і гаспадаркі. Яшчэ часам некалькі дзяўчат пякуць вялікі каравай і ў суправаджэнні хлопцаў нясуць яго з урачыстасцю над галавой. Заходзяць з віншаваннямі да ганаровых гаспадароў і не дзеля частавання, а дзеля чэснага пажадання, каб удзельніцам абраду болей не давялося хадзіць з караваем на Юр'я, а пашчаслівілася да наступнага года выйсці замуж. Хлопцы выкупляюць каравай у складчыну рубля за паўтара і менш. Пасля ўсяго наладжваецца агульная закуска і выпіўка.

Па надвор'і ў дзень Юр'я гаспадары варожаць аб поспеху ў гаспадарцы. Калі ў Юр'еў дзень ідзе дождж (густы, вялікі), то, гавораць, будзе расці вялікае жыта. Калі дождж будзе толькі крапіць, то будуць увесь год каровы даіцца. Калі будзе раса, то будзе ў дастатку коням аўса.

З заходнерускімі юр'еўскімі павер'ямі і прыкметамі маюць шмат агульнага і велікарускія. На Юр'я раса — не трэба коням аўса. Юрый запасвае кароў. Юрый — свята пастухоў. «Юр'ева раса» — ад сурокі, ад сямі хвароб. Будзь здароў, як «Юр'ева раса»... Юрый вясну пачынае, Юрый работы пачынае, Юрый і канчае. На Русі два Юр'і: халодны (26 лістапада) і галодны (23 красавіка) і інш.

## НЕКАТОРЫЯ МЯСЦОВЫЯ НАРОДНЫЯ ЗВЫЧАІ Ў ДЗЕНЬ СВ. ЮР'Я

Свята св. Георгія Пераможцы (у простанароддзі св. Юрый — абаронца жывёлы) адносіцца да ліку тых свят, якія наш народ сустракаў у мінулым з асаблівай урачыстасцю, наладжваў у іх гонар святкаванні, стварыў шмат звычаяў. Рэшткі старажытнага шанавання гэтага свята з даўнімі звычаямі, якія яго акружалі і якія паступова страцілі ўжо свой першабытны характар у сучасным пакаленні, захаваліся яшчэ ў некаторых мясцовасцях Беларусі і да цяперашняга часу. Найболей захаваў сваю патрыярхальнасць наступны звычай. Раніцай у дзень свята кожны гаспадар браў з сабой астаткі хлеба і касцей, што захоўваліся ад Вялікадня і былі асвячоны

ў царкве, а ў іншых месцах — знарок спечаны для гэтага каравай і абыходзіў з імі сваю зямлю. Прыйшоўшы на ніву з маладымі ўсходамі, ён станавіўся на калені, маліўся, а затым абыходзіў свой надзел, закопваў у вуглах кожнага поля прынесеныя свянцоныя косці, молячы ў бога сабе добрай жывёлы, ураджаю і інш. Варта заўважыць, што свянцоныя косці хавалі яшчэ і ў стрэхі хат і хлявоў, а хлеб і соль, загорнутыя ў анучку, вешалі пад страхой, большай часткай над дзвярыма хат. Рабілася гэта для таго, каб зберагчы свае будынкі ад маланкі. З гэтай жа мэтай у час навальніцы вывешвалі яшчэ на дзвярах абрус, якім засцілалі стол у дзень Вялікадня, выстаўлялі ў дзвярах лапату, на якой саджалі ў печ хлеб, і надымлівалі ў хаце асвячонымі травамі. Свянцоныя хлеб і соль служылі таксама лякарствам ад розных хвароб і быццам бы ратавалі ад нашэсця ведзьмаў у ноч 24 чэрвеня. Юр'я народ лічыць апекуном жывёлы, і таму ў гэты дзень у вялікай колькасці збіраецца ў храме народ (асабліва дзе ёсць ікона св. Георгія). У некаторых (нямногіх ужо) мясцовасцях Кобрынскага павета моладзь наладжвала ў гэты дзень святкаванне, ці, па мясцовым выразе, «спраўляла Юрай».

Рыхтавацца пачынаюць за тыдзень, а то і за два да свята. Маладыя дзяўчаты абыходзяць сваю і суседнія вёскі з просьбай даць ім, хто што можа, на каравай. Даюць звычайна пшанічную муку ці пшаніцу, яйкі, масла, сыр, каўбасу і інш.

Суседняя інтэлігенцыя, ці, як называюць тут, «паны і падпанкі», якіх таксама не мінаюць у гэтым выпадку, забяспечвае іх часам грашыма, якія аддаюцца выключна на каравай і яго ўпрыгожанне. Усе сабраныя прадукты прыносяцца ў мяшках ці фартухах дамоў і складваюцца ў таго гаспадара, у хаце якога прызначана «спраўляць Юр'я». Звычайна выбіраюць хату, у якой ёсць дзяўчына-нявеста. Напярэдадні свята мыюць сталы і лавы, вымятаюць хату і двор, высыпаюць усюды жоўтым пяском; смажаць, пякуць, вараць. Галоўная ўвага звяртаецца на каравай. Хлопцы ў сваю чаргу робяць складчыну па некалькі капеек з брата і купляюць крыху гарэлкі і ў вялікай колькасці піва і мёд. Наогул клопаты па забеспячэнні напіткамі ляжаць на іх. Калі ўсё гатова, каравай упрыгожваюць зеленню (барвінкам), істужкамі, кладуць на вечка (ад дзяжы) і пакідаюць усё нечапаным да дня свята. У дзень свята ўся моладзь адпраўляецца ў царкву, а па заканчэнні богаслужэння збіраецца ў хаце, якую выбралі для святкавання. Сюды запрашаюцца музыкі, збіраецца шмат людзей — дзяцей і дарослых, прыходзяць глядзець і аднасяльчане пажылога ўзросту. Музыкі пачыналі іграць, адразу ж чуўся шум, і ўвесь

натоўп, які папярэднічаў аднаму з «маторных» парубкаў, на галаве якога красаваўся ў вечку каравай, з песнямі, музыкай і скокамі выходзіў на вуліцу і накіроўваўся ў поле. Там усе спыняліся на ніве з лепшымі ўсходамі. Спевы і музыка замаўкалі. Усе станавіліся на калені, і пры поўнай цішыні пачыналася малітва.

Пасля малітвы рвалі ўсходы і кідалі на каравай, выражаючы пажаданне добрага ўраджаю ў надыходзячым леце. Затым увесь натоўп тым жа парадкам вяртаўся назад. Усё падрыхтаванае на свята з'ядалася. Уся ноч праходзіла ў песнях, музыцы і танцах.

## СВЯТЫ ЮРЫЙ НА БЕЛАРУСІ

Свята св. Юр'я, памяць якога ўшаноўваюць 23 красавіка, належыць да аднаго з самых вялікіх свят народных, таму што Юрый лічыцца заступнікам сельскай гаспадаркі. Напярэдадні свята неабходна на ноч выводзіць коней у поле, таму што ў гэты час з'яўляецца першая веснавая раса, якая вельмі карысна для хатняй рабочай жывёлы, апекуном якой лічыцца той самы Юрый...

Абраду вываду коней у поле ў ноч на Юр'я папярэднічаюць такія падрыхтоўчыя цырымоніі. Гаспадар з усёй сваёй сям'ёй старанна моліцца дома перад іконай св. Георгія, каб гэты святы захаваў у цэласці яго коней. Затым па колькасці коней бярэ яйкі і накіроўваецца да стайні, у якой знаходзяцца яго коні. Абыходзіць яе кругом тры разы, а затым кладзе яйкі пад парог. Тры разы перахрысціўшыся, ён адчыняе ўваходныя дзверы стайні і пры ўваходзе гаворыць:

Прыйшла Юр'ева раса,
Не дам вам аўса!

Падыходзіць па чарзе да кожнага каня, гладзіць па ўсёй спіне, надзявае на кожнага вяровачную аброць, выводзіць з канюшні, прычым стараецца правай нагой ступіць на парог стайні, дзе раней ім былі пакладзены яйкі. У гэтым-та месцы і знаходзіцца «нячыстая сіла», якая ўсімі сваімі сродкамі стараецца шкодзіць росту і здароўю коней, а на гэта ёй дадзена права толькі ў ноч на Юр'я. Калі гаспадар ступіць на парог пры вывадзе коней правай нагой, то д'ябальская сіла абясшкоджана на працягу цэлага года.

Пасля вываду коней з канюшні ці хлява гаспадар перадае

іх работніку-начлежніку, прычым дае апошняму пару кілбас, кварту пшанічнай мукі, кусок сала, некалькі яек і грошы.

Другая, больш урачыстая абраднасць здзяйснялася дзеля каровінага статка. Напярэдадні Юр'ева дня гаспадыні-сялянкі пякуць хлеб-каравай, загортваюць яго ў чысты белы абрус і аддаюць гаспадару, які кладзе яго ў бярозавы кашэль. На світанні ён выходзіць з хаты з гэтым кашалём, абыходзіць усе свае палі, падышоўшы да апошняй паласы, засеянай жытам, дастае з кашаля хлеб-каравай, кладзе яго ў жытнёвую рунь і параўноўвае вышыню сцябла з караваем. Калі апошні хаваецца ў жыце, то ў гэтым годзе жыта будзе добрае. Пасля малітвы ён вяртаецца з караваем дадому, разразае яго на кавалкі па колькасці членаў сям'і, і ўсе ядуць яго.

У іншых жа мясцовасцях гэтыя абрады праходзяць пры больш урачыстых абставінах. Сям'я гаспадара раніцай нашча адпраўляецца ў абход па сваіх палях, захапіўшы з сабою каравай, кілбас, яек, гарэлку і косці ад асвячонай велікоднай смажаніны ці ў натуральным іх выглядзе, ці ў выглядзе парашку (перапаленых касцей). Прыйшоўшы на ніву, яны качаюцца па ўсходах, каб абкрапіцца «Юр'евай расой», прычым спяваюць:

Здраствуй, ніва святая!
Паздраўляем з хлебам-соллю
І з святым Юр'ем,
Каб бог найвысшы і святы Юр'я
Пацешыў нас пагодаю і здароўем.

Гаспадару пры гэтым жадаюць:

Піва рабіць,
Сына жаніць.
Гарэлку гнаць,
Дочку замуж даць.

І пачынаецца частаванне. Касцямі абтыкаюць мяжу, а калі яны ў парашку, то абсыпаюць тыя месцы, дзе расце пустазелле, каб яно ніколі не расло. Звычай абыходжання палёў, паводле народнага падання, тлумачыцца тым, што ў гэты дзень можна падслухаць, аб чым гаворыць жыта. Па надвор'і, якое будзе ў дзень Юр'я, сяляне мяркуюць аб ураджаі. Калі ідзе буйны дождж, то будзе расці вялікае жыта, а калі дождж будзе толькі капаць, то будуць увесь год кароў даіць. Калі будзе раса, то будзе даволі коням аўса. Зразумела, шмат з гэтых народных абрадаў цяпер ужо адышлі ў вобласць

паданняў, але ўсё ж просты беларус яшчэ жыве рэшткамі сваёй роднай старасветчыны. Прыкладам можа быць звычай, які паўсюдна і зараз існуе, выганяць у поле хатнюю жывёлу вярбою, асвячонаю ў Вербную нядзелю. Яе ўтыкаюць у зямлю каля мяжы, і гэта ахоўвае ніву ад граду.

## ЗАПАСВАННЕ ГАЎЯДА

Запасванне — сапраўднае свята ўсёй сям'і і асабліва пастухоў. Свята гэта вылучаецца багатай абраднасцю і звязана з мноствам прымхлівых прыкмет і забабонаў...

Запасванню гаўяда — рагатай свойскай жывёлы папярэднічае нейкім чынам сямейны савет: гаспадара і ўсіх членаў сям'і.

Абмяркоўваюцца пытанні: ці пара ўжо запасваць гаўяда? Ці адпаведны дзень тыдня і па квадрах месяца? Ці няма нейкіх благіх прыкмет? Хто назначаецца ў пастухі? Ці ўсё гатова да выканання абраду? Трэба заўважыць, што панядзелак і пятніца лічацца нешчаслівымі днямі, чаму і пазбягаюць іх для пачатку нейкіх мерапрыемстваў. Запасванне жывёлы, як і іншыя пачынанні, прымяркоўваюць да дзён, якія набліжаюцца да поўні,— «каб усё было поўна». Акрамя таго, прыглядаюцца да прыкмет, ці не сведчаць яны аб якой-небудзь неспрыяльнасці. Так, напрыклад, лыжка, што ўпала са стала, прадракала няшчасце; калі б'ецца посуд — будзе блага; пагаслы ў «ямцы» (загнеце) агонь прадказвае набліжэнне бяды; калі курыца спявае па-петушынаму, то будзе няшчасце, і многа іншых падобных прыкмет. Асабліва глядзяць, каб у гэты дзень хто-небудзь з суседзяў не ўзяў з печы агню ці не пазычыў якой-небудзь рэчы. Існуе павер'е, што пры дапамозе ўзятага агню ці якога-небудзь прадмета благі чалавек можа прыцягнуць да сябе спор, г. зн. прыбытак ад тых ці іншых абрадавых захадаў.

Запасваюць жывёлу перад полуднем. Уся сям'я выходзіць з дома ў двор; тут старыя, жанчыны і дзеці — усім хочацца паглядзець на ўрачыстасць. Гаспадар пераапранаецца ў чыстую белую бялізну і ў чыстую святочную «світу» (верхняе адзенне), абувае новыя лапці з белымі анучамі, вешае праз плячо торбу (пастухоўская сумка, у якую кладзе акраец хлеба, соль, «хрэшчык» (крыж з хлеба, спечаны на Хрэсцы — у сераду на чацвёртым тыдні Вялікага посту), тры невялікія каменьчыкі, нож, замок, бязмен, сякеру, курынае яйка, грамнічную (пасвянцоную 2 лютага) свечку, і ўрачыста, з непакры-

тай галавой ідзе да хлявоў выпускаць усю свойскую рагатую жывёлу, коней, авечак і свіней. Потым гаспадар выцягвае са страхі гумнаў тры пучкі саломы, зачэрпвае ў студні паўнюткае вядро вады, абыходзіць з ім па сонцы наўкол жывёлы, перакідвае праз увесь статак камень, а вадой аблівае жывёлу. Потым ізноў ідзе па ваду і зноў абыходзіць наўкол статак. Гэты абрад гаспадар паўтарае тройчы. Потым ён закопвае ў зямлю каля варот замок, бязмен, сякеру і яйка і раскладае на гэтым месцы невялікі агеньчык, у які кідаюць шмаргнутую са страхі салому. Калі ўсё гатова, гаспадар перадае торбу пастыру, які пастрэльвае пугай і выганяе праз агонь усю жывёлу на вуліцу і ў поле або лес. Гаспадар і ўся сям'я тут жа сустракаюць статак, які вяртаецца з пашы.

Пераганяюць жывёлу праз агонь для таго, каб асвяціць яе і захаваць ад «нячыстай сілы» і благіх людзей. Калі закапанае ў зямлю яйка аказваецца цэлым, то гэта добрая прыкмета: на працягу ўсяго лета ўся жывёла будзе цэлая і непашкоджаная. Замок кладуць для таго, каб замкнуць пашчы ваўкам і мядзведзям. Бязмен кладуць для таго, каб жывёла тлусцела і павялічвалася ў вазе. Якое значэнне мае сякера, мне не маглі растлумачыць самі беларусы на месцы. Але мною заўважана, што ў народзе бяруць з сабою сякеру ва ўсіх урачыстых выпадках, а менавіта: пры запасванні жывёлы, пры заворванні, засеўках і да т. п. Жывёлу абліваюць вадой для таго, каб яна была чыстая ад лішаёў і струпоў і каб не баялася камароў, мошак, аваднёў і сурокаў. Вышмаргнутая са страхі салома мае моц цягнуць жывёлу дамоў. Перакінутыя праз статак камяні ахоўваюць яе ад звяроў і «нячыстай сілы».

Абаронцам (апекуном) жывёлы лічыцца св. Юрый. Запасванне жывёлы прымяркоўваюць да гэтага дня, але калі вясна ранняя, то абрад запасвання здзяйсняецца раней, а ў дзень св. Юр'я выганяюць скаціну «на расу», г. зн. вельмі рана, каб не апала раса. Выганяюць скаціну на рунь, нават калі яна ўжо вялікая. У народзе думаюць, што гэта карысна для хлябоў і жывёлы. Некаторыя жанчыны, якіх лічаць за ведзьмаў, рана, распрануўшыся дагала, бегаюць з дайніцай і ручніком і так збіраюць з руні і травы расу. Існуе павер'е, што ведзьмы такой маніпуляцыяй перацягваюць да сябе спор з хлябоў і жывёлы, якая пройдзе па тым месцы, дзе сабрана раса на Юр'я. За такімі ведзьмамі строга наглядаюць на Юр'я і жорстка з імі распраўляюцца. Вядома, падобным чараўніцтвам займаюцца не толькі ведзьмы, але і чарадзейнікі, якія знойдуцца ў кожным паселішчы. Ужо адна сустрэча з чарадзейнікам у час запасвання гаўяда ці ў іншым падобным выпадку вельмі цяжкая

для простага чалавека і можа выклікаць працяглы прыгнечаны душэўны стан. Таму чарадзейнікаў стараюцца ўсёй грамадой задобрыць і зрабіць прыхільнымі сабе. Не дарма кажуць: «Бога хвалі, але й чорта не гняві, бо ліхое і бога перамагае».

## ЮР'ЕЎ ДЗЕНЬ НА БЕЛАРУСІ

23 красавіка — дзень св. Юр'я — карыстаецца ў беларусаў вялікай павагай. І цягнецца гэта з далёкіх часоў. Ужо ў XVII ст. гэты дзень набыў юрыдычны статус і да гэтага часу не страціў свайго значэння. У гэты дзень лічыцца абавязковым праведаць свае палі, інакш яны не дадуць ураджаю летам. З гэтага дня адлічваюць тэрмін найму сельскагаспадарчых рабочых, заключаюцца дагаворы на арэнду фальваркаў і г. д. З гэтага ж дня прыступае да выканання сваіх абавязкаў пастух, хоць у залежнасці ад стану надвор'я кароў могуць выпускаць на пашу і раней.

Св. Юрый лічыцца апекуном жывёлы і асабліва кароў. Яму ў гэты дзень служаць малебны, прычым акрапляюць «святой» вадой статак і хлявы. У сцены апошніх утыкаюць таксама галінкі свянцонай вярбы. У Гомельскім павеце напярэдадні Юр'я выводзяць першы раз коней на начлег, а ў дзень свята раніцай да пастуха выганяюць жывёлу на «Юр'еву расу». У Віцебскім павеце папярэдне абкурваюць жывёлу ў хлявах іванаўскай травой (асвячонай 24 чэрвеня) і запальваюць велізарныя свечкі. У Віцебскай губерні і ў паўднёвых паветах Магілёўскай губерні Грамніцамі называлі дзень 2 лютага — свята Стрэчанне. Назва гэта ўзята ад католікаў. Па пераемнасці ад уніятаў (яны ўспрынялі асобныя элементы абраднасці каталіцтва.— *А. Г.*) у цэрквах 2 лютага асвячаюць свечкі, якія і носяць назву грамнічных. Гэтыя свечкі спальваюць у час страшных навальніц — грому і маланкі, каб нікога не забіла і нічога не запаліла. Гэтай жа свечкай падкурваюць хворых і ў некаторых месцах даюць у рукі паміраючым замест перадвелікодных свечак, таму што, па павер'і, агонь гэтых свечак адганяе ад душы «нячысціка». Гэтыя ж свечкі запальваюць і ў Юр'еў дзень, калі выганяюць жывёлу ў поле, прычым у варотах хлява кладуць на зямлі яйка, цераз якое і праганяюць усю жывёлу з хлява, каб каровы сталі такія ж круглыя і поўныя, як яйка. Пасля яйка гэта падымаюць і аддаюць жабракам ці пастухам. Праганяючы жывёлу да пастуха, некаторыя гаспадары стараюцца перагнаць яе праз азімае аржаное поле, збіраюць пры гэтым з азімых расу і абмываюць ёю кароў, каб болей малака давалі і былі недаступны для ведзь-

маў. У Веліжскім павеце для таго, каб ведзьмы не адбіралі малака ў кароў, апошнім даюцца мянушкі не па масцях, а па тых днях, у якія яны цяліліся, напрыклад: Нядзеля, Панядзелак і г. д. Акрамя таго, клапатлівыя гаспадары прасвідроўваюць у першацёлак (маладых кароў, якія ацяліліся першы раз) дзірку ў адным з рагоў. Уліваюць у гэту дзірку ртуці і залепліваюць воскам ад грамнічнай ці перадвелікоднай свечкі. Да такой каровы ведзьма не асмельваецца прыступіцца. У Магілёўскай губерні пры першым выгане жывёлы ў поле прытрымліваюцца наступных абрадаў: бяруць лусту хлеба і з ім абыходзяць тры разы кругом каміна і гавораць: «Як печ стаіць на месцы, так каб і жывёла хадзіла на месца», пасля чаго аддаюць гэты хлеб з'есці жывёле. Назіраюць, каб першы выган жывёлы не прыйшоўся на тыя дні, у якія былі святы Каляд і Благавешчанне. Пасля малітвы бяруць хлеб, соль, яйка і сала і свянцонай вярбой гоняць жывёлу да пастуха і там аддаюць яму прынесеную правізію, кладуць у варотах на вуліцу замкнуты замок і цераз яго пераганяюць жывёлу і г. д.

Св. Юрый лічыцца гаспадаром дзікіх звяроў, і яны маюць права з'есці тую жывёлу, якую ён ім дазволіць. Дзень Юр'я строга святкуецца ў Беларусі ўсім народам, але спецыяльна ён лічыцца святам пастухоў. Кожны гаспадар надзяляе ў гэты дзень пастухоў хлебам, салам, яйкамі, гарэлкай, і яны, выгнаўшы жывёлу ў поле, наладжваюць там для сябе пачастунак і абавязкова пякуць яечню. Хоць першы выган жывёлы на пашу, як было вышэй сказана, адбываецца намнога раней Юр'ева дня, але пастухоўскае свята павінна ажыццявіцца толькі ў гэты дзень, пасля абеду, пры ўдзеле ўсіх пастухоў дадзенай вёскі, але без удзелу непастухоў, дапытлівых гледачоў, якія прыбылі на пастухоўскае свята. Калі тут будзе сама мала парушана абраднасць у гатаванні яечні, у абыходзе з ёй вакол сабранага статка, св. Юрый будзе лічыць сябе абражаным і аддасць статак і пастухоў у распараджэнне ваўкоў. Але ў Гомельскім павеце ў Юр'еў дзень посцяцца. На другі ж дзень статак гоняць падпаскі, а ўсе «вялікія пастухі» збіраюцца да старшага пастуха і наладжваюць гулянку.

У гэтым павеце, як толькі прыгоняць жывёлу на выган, усе моляцца, і ўжо пасля гэтага пастухі адпраўляюцца з жывёлай у поле да вечара. Затым у вёску запрашаецца прычт. Сяляне ставяць дзе-небудзь паблізу вёскі каля азімага поля кадушку з вадой, прычт перш за ўсё асвячае ваду, потым служыцца малебен св. Юр'ю. Пастухі да гэтага месца падганяюць статак, і свяшчэннік акрапляе яго «святой» вадой. Пасля пачынаецца асвячэнне поля.

Св. Юр'ю моляцца гаспадары, калі карова заблудзіцца і заначуе на пашы. Запальваюць свечку і просяць: «Святы Юрый, зберажы маю жывёлу ад звяроў і зладзеяў, вярні яе цэлай і здаровай».

У Веліжскім павеце ў гэты дзень пад вечар да пастухоў збіраецца вясковая моладзь — хлопцы і дзяўчаты. Дзяўчаты прыносяць яйкі, масла, малако, а хлопцы — гарэлку, распальваюць агонь, над ім вешаюць кацёл і выліваюць у яго прынесенае малако, пасля разбіваюць яйкі і кладуць масла. Атрымліваецца своеасаблівая яечня ў вялікай колькасці. Зняўшы кацёл з агню, усе садзяцца кругом і ядуць гэту яечню. Пасля становяцца ў кружок, бяруцца за рукі і выконваюць юр'еўскія песні, якія распяваюцца да Міколіна дня.

У Гомельскім павеце існуе павер'е, што ведзьмы ў Юр'еў дзень адымаюць малако ў кароў. З гэтай мэтай яны выходзяць на світанні на поле і там цягаюць па расістай зямлі намётку. Калі яна стане мокрай, ведзьма ўцякае з поля дамоў, усяляк стараючыся, каб яе ніхто не заўважыў. І вось у далейшым, калі карова ўзыдзе на гэта месца, з якога ведзьма ўзяла расу, і з'есць той травы, то яна перастае даваць малако. Ведзьма ж з той намёткі выціскае так шмат малака, што яго хапае і на смятану, і на сыр, і на масла. Каб адпомсціць такой ведзьме, гаспадар (у якога карова пазбавілася малака) ідзе 24 чэрвеня да ўсходу сонца ў лес і заграбае ў мяшкі цэлы муравейнік. Прынёсшы яго ў вёску, ён перасыпае мурашкамі вуліцу ў канцы сяла, па якой ганяюць статак у поле. Як каровы пяройдуць праз рассыпаны муравейнік, то ў ведзьмы да паўдня ў назапашаным сыры і масле з'яўляцца чарвякі ў такой вялікай колькасці, што робяць іх непрыгоднымі да ўжывання, і ведзьма вымушана выкінуць іх вон. Таму ведзьмы зорка сочаць у гэты дзень, каб хто-небудзь не перасыпаў мурашкамі вуліцу да ўсходу сонца.

У Віцебску на Юр'евай горцы знаходзіцца царква св. Георгія. Пры царкве пабудавана капліца, у якой маецца калодзеж з крынічнай вадой, якой прыпісваюцца лекавыя ўласцівасці, пераважна пры хваробе вачэй і болі галавы. У дзень св. Юр'я ў гэтай царкве святкуецца фэст. Пры велізарным зборы народу тут адбываецца ўрачыстае богаслужэнне з крыжовым ходам і асвячэннем вады ў калодзежы, пасля чаго тыя, хто моліцца, п'юць ваду і кідаюць грошы ў калодзеж. У гэты дзень на Юр'евай горцы наладжваюцца кірмашы і адбываецца народнае гулянне, якое заканчваецца толькі познім вечарам.

З Юр'евым днём звязана шмат прыкмет. Вось некаторыя з іх: калі варона схаваецца на Юр'я ў жыце, то жыта добра ўродзіцца; за колькі дзён да Юр'я расцвітуць сады, за столькі

дзён да Пятра пойдуць жаць жыта; у Юр'еў дзень абавязкова павінен прайсці ці снег, ці дождж, інакш будзе сухое, неўраджайнае лета; снег ці дождж раніцай указваюць на ўраджай ранняга пасеву, у поўдзень — сярэдняга, а пад вечар — позняга (да паўдня — мокрае лета, пасля паўдня — такая ж восень).

На працягу тыдня пасля Юр'ева дня, пераважна ў аўторак ці ў чацвер, бываюць «бабскія разбрыкі» — святкаванне жанчын-гаспадынь. Калі да іх далучыцца «няўпраўная» гаспадыня, то гэтым яна загубіць усё дагэтуль зробленае на агародах. Тыя, хто святкуе, павінны качацца і, калі можна, куляцца. Звычайна гэтыя святкаванні (пры нешматлікай колькасці гасцей-мужчын) адбываюцца за вёскай ці за горадам і адрозніваюцца прыкметнай распушчанасцю.

У прамежак часу паміж Юр'ем і Міколіным днём нельга ставіць ні нават выпраўляць агароджы, інакш у аколіцы развядуцца ваўкі. Па той жа прычыне ў гэты час нельга рабіць асновы для красён ні нават перавозіць яе гатовай з вёскі ў вёску. У выпадку крайняй неабходнасці перамясціць аснову апошняя замыкаецца вісячым замком, каб замкнуць воўчыя зяпы.

## ЮРАЙ

Бяруць каробку, жыта троху, булку, гарэлку. Ідуць па вуліцы на жыта і скачуць ды спяваюць:

— Да святы Юрай,
Дзе ж ты бываў?
— Па памежках хадзіў,
Жыта радзіў,
Каб з каласочка
Была жыта бочка;
Каб з каласінкі
Было паўасьмінкі.

Спявалі і іншыя песні. Качаліся па жыце, каб жыта радзілася, скакалі. У зямлю нічога не закопвалі. На мяжу клалі кавалачак булкі і прыказвалі, напрыклад, так: «Каб бог даў да вырасла жыта, да спяклі булку, да смачная была...» Гэты абрад рабілі старыя замужнія жанчыны, а не маладыя.

## АБРАД ВЕСНАВАННЯ

Хадзілі веснаваць у лес дзяўчаты. Яшчэ гаварылі, што хадзілі на «чырку». У лесе рабілі вяночкі з барвенку, упры-

гожвалі іх перазімаваўшымі кісла-салодкімі журавінамі. Спявалі веснавыя песні:

Ужэ вясна, ужэ красна.
Чужыя жонкі ткуць кросна,
А мая шэльма не ткала,
Пад лёд мычкі таскала:
— Плывеце, мычкі, валакенцам,
А назад палаценцам.

## ВАДЖЭННЕ «СТРАЛЫ» («СУЛЫ») ВА ЎСХОДНІМ ПАЛЕССІ

Зонай бытавання абраду ў канцы XIX — пачатку XX ст. было сярэдняе Падняпроўе і басейны рэк Сожа і Дзясны, г. зн. тэрыторыя паўднёва-ўсходняй Беларусі, заходняй Браншчыны і паўночна-ўсходняй Украіны. У некаторых месцах гэтага рэгіёна ваджэнне «стралы» ўдаецца назіраць і ў цяперашні час [1].

У в. Стаўбун Веткаўскага раёна Гомельскай вобласці абрад, як і ў большасці месцаў усяго рэгіёна, прымеркаваны да свята Ушэсця і звязаны з першым выхадам у поле для агляду азімых хлябоў. У поўдзень прыгожа апранутыя жанчыны і дзяўчаты групамі збіраюцца ў розных канцах вёскі (з усіх вуліц) і пад спяванне «Стралы» ўтвараюць кругі. Некаторы час яны водзяць карагоды, затым выстрайваюцца ў шырокія рады (12—14 чалавек) і пад спяванне «Стралы», узяўшыся пад рукі, рухаюцца па цэнтральнай вуліцы да вялікай пляцоўкі каля перакрыжавання дарог у цэнтры вёскі. На працягу паўтары гадзіны, утварыўшы агульны круг (100 чалавек), яны водзяць карагод, узяўшыся за рукі (часам у карагод уступаюць дзеці, але яны не спяваюць). Затым вялікі круг раздзяляецца, унутры яго ўтвараюцца два кругі паменей, адна група заводзіць карагод пад песню «Я скакала, плясала», а другая — пад песню «Наша вуліца была шыракая». Нарэшце кругі спыняюцца, і жанчыны, разняўшы рукі і стоячы нерухома, пачынаюць пець «Стралу», прычым дзве групы пераклікаюцца адна з другой (анціфонныя спевы). Пасля выканання «Стралы» ўсе заводзяць так званы «крывы танок» (карагод змейкай) пад песню «А ў крывога танца не выведу вянца». У хуткім часе адна з жанчын гучным голасам усклікае: «Сходзіцеся ўсі, пайдзем у жыта!» Карагодніцы перастрайваюцца ў рады па 12—14 чалавек і накіроўваюцца да поля

з азімымі. У сувязі з тым што да гэтага часу на плошчы сабралася многа людзей (каля 500 чалавек), групы адходзяць адна за другой, а за імі ўсе прысутныя.

Шэсце працягваецца каля гадзіны, і на працягу ўсяго гэтага часу моцна гучыць і разносіцца далёка навокал напеў «Стралы», на які, пераклікаючыся ў анціфонных спевах, групы спяваючых выконваюць не толькі тэкст уласна «Стралы» («А ідзі, страла, да й удоўж сяла»), але і іншыя песні аналагічнага рытмаметрычнага ладу на гэты ж напеў. Калі ўсе падыходзяць да поля, з натоўпу выходзяць нямногія — толькі самыя паважаныя ў вёсцы жанчыны і лепшыя песельніцы — і водзяць карагод на ніве. Пасля некалькіх карагодных песень («Па садочку бег малойчык», «На гарэ лён, белы кужаль» і інш.) адна з жанчын заклікае сяброўак: «Закопвайце стралу!» Карагодніцы прыгінаюць калоссе да зямлі, становяцца на калені і закапваюць у зямлю прынесеныя для гэтага выпадку дробныя прадметы — завушніцы, грабеньчыкі, шпількі, манеты, прыгаворваючы:

Пайшоў гасподзь на небяса,
Пацягнуў жыта за каласа.

Лічыцца, што гэта дзеянне будзе садзейнічаць добраму росту каласоў і багатаму ўраджаю.

У час «пахавання стралы» дзеці разбягаюцца па полі і перакачваюцца па ім са смехам. Завяршыўшы абрад, дарослыя спяваюць «падводныя» песні («Што гэта за валы па Крыму хадзілі» і інш.) і, перахрысціўшыся, паступова разыходзяцца. Песельніцы вяртаюцца ў вёску групамі са спяваннем «падводных» песень, прыпевак і іншых песень пазаабрадавага зместу (назва «падводныя» — ад мясцовага вызначэння манеры спявання — «падводзіць голас», якая адрозніваецца ад стылю выканання «Стралы»).

Увесь абрад працягваецца каля шасці гадзін. Нягледзячы на такую яго працягласць і масавы збор народу, назіральнікі адзначаюць строгую паслядоўнасць усіх эпізодаў абраду і разам з тым неспадаючы эмацыянальны ўздым і энтузіязм усіх, хто ўдзельнічае ў карагодах, шэсці і спяванні песень на працягу ўсяго часу. Спантаннае (стыхійнае) разгортванне дзейства спалучалася з сігналамі распарадчыц абраду ў яго кульмінацыйных момантах — мясцовых сялянак М. Л. Зуевай, А. Л. Зуевай, Т. Д. Тараканавай, Ф. Ф. Халюковай. Трэба адзначыць таксама, што непасрэдныя ўдзельніцы абраду і шматлікія гледачы не змешваліся паміж сабой [2].

Ужо ў апісаным абрадзе выяўляецца сувязь яго з аграрнай прадуцыруючай магіяй (першы выхад у поле, ваджэнне карагода непасрэдна на ніве, закопванне дробных прадметаў, якія належаць жанчынам і адносяцца да жаночага ўбрання, перакачванне дзяцей па полі), хаця ў ім праглядаюцца сувязі і з рэлігійным святам (перанос абраза Ушэсця, які папярэднічае абраду, загавор з упамінаннем бога), а таксама мадыфікацыя некаторых традыцыйных момантаў абраду, што будзе відаць пры супастаўленні яго з ваджэннем і пахаваннем «стралы» ў іншых абследаваных намі населеных пунктах рэгіёна.

У в. Казацкія Балсуны Веткаўскага раёна, па сведчанні мясцовых жыхарак — выканаўцаў песень, «стралу» пачынаюць вадзіць, калі «сныточка» расцвітае (ядомая парасоністая расліна — баршчавік, або снядок), у бліжэйшай да Балсуноў вёсцы Загляддзе — на Вялікдзень. Карагоды пад спяванне «Стралы» і іншых песень тут цягнуцца ўсю вясну, прычым жыхары і Балсуноў, і Загляддзя часта сыходзяцца разам, але сам абрад развітання з вясной адбываецца адзін раз, калі робіцца агляд палёў у час пачатку каласавання азімага жыта. Тады ж у апошні раз выконваюць і «Стралу»[3]. Адну з дзяўчат прыбіраюць і ўпрыгожваюць (кветкамі, істужкамі), і калі, прайшоўшы па вёсцы пад спяванне «Стралы», усе падыходзяць да азіміны, яна выбягае наперад, іншыя яе даганяюць, штурхаюць, яна падае, і ўсе разам з ёю перакочваюцца па азімых [4]. Пасля гэтага пачынаюць вадзіць карагоды і гульні, а вяртаючыся дадому, спяваюць песні («Ой ты, ціхі Дунай», «Не ўстаяла белая бярозачка над вадою», «Вы сады ж мае, садочкі», «Ты чорная смародзіна» і інш.). Прыйшоўшы ж дадому, утыкаюць узятыя з поля каласкі ў жылым памяшканні над дзвярыма.

У в. Барталамееўка Веткаўскага раёна прыбіраюць і хаваюць у жыце не дзяўчыну, а ляльку (з ануч), а сам абрад цяпер называюць «праводзіны вясны».

Жыхары в. Барталамееўка расказваюць: «...Пайдзём усе па вуліцы з краю ў край і пяём «Як пушчу стралу», а таксама другую за «Стралой» — «Мы на сена ідзём, мы на новае» (у нас называецца гэта на сена хадзіць)». Загадзя сярод удзельніц абраду выбіраюць «пана» і «паненку», якія адпаведным чынам прыбіраюцца: дзяўчына, якая стварае вобраз «пана»,— у мужчынскае адзенне, «паненка» — у святочную сукенку (галаву ўпрыгожваюць вянком, істужкамі). Абедзве ідуць наперадзе натоўпу, у руках «паненкі» — каробка з лялькай. Абышоўшы ўсю вёску, спыняюцца каля поля з азімымі і ўтва-

раюць круг, у цэнтры якога знаходзяцца «пан» і «паненка». Пад песню-баладу «Паня пана неўзлюбіла» водзяць карагодную гульню. Затым адна з жанчын выкопвае ямку ў полі, у якую пад песню «Песенька (?) мая маленькая,//Схаваю цябе к налецей(ку)» хавае ляльку і галосіць над ёй, развітваючыся да наступнай вясны:

Лялечка мая мілая,
Да схавала я цябе к Ушэсцейку,
К Ушэсцейку, к налецейку,
Ка такому врэмю, як сёлета,
Прыйду к табе з сахою
Да буду гаварыць з табою,
Мая міленькая лялечка,
Ой, ой, ой![5]

Пахаваўшы ляльку, вяртаюцца ў вёску пад песню «У лузі, у лузі калініца стаяла». Развітаўшыся такім чынам з вясной, у Барталамееўцы вяснянкі больш не спяваюць, збіраюцца вечарамі і выконваюць іншыя песні — «Лета» або «Ладун» (апошняя назва па прыпеве: «Па вуліцы, па шырокай,//Ладун, ладун па шырокай»).

У в. Янава Веткаўскага раёна на Ушэсце, па словах выканаўцаў, «вядуць стралу закапываць у жыта», дзе качаліся па азімых і закопвалі ў зямлю розныя дробныя прадметы (шпількі, ланцужкі, манеты) пад спевы з «гуканнем»:

Павяду стралу да й удоль сяла,
  Ой і ой лёлі, да й удоль ся... У!
Закапаю стралу да й у жыцейка,
  Ох і ой лёлі, да й у жыцей... У!
Ты ляжы, страла, да налецячка,
  Ох і ой лёлі, да налецяя... У![6]

Жыхарка гэтай вёскі і выканаўца песень Л. Х. Ісачанка (1920 г. н.) расказвае: «Прыходзе Ушэсце. Ну, урані вытапліваем печы, і часоў у 11—12 сабіраюцца бабы. Ну, ідом па сялу, пяём. Папаём — пайдзём «стралу» закапываць у жыта. У жыце там хто валяецца, хто перакідаецца. Пагуляем у жыце, закапываем «стралу»: ну, хто шпільку, хто дзве капейкі, хто як... Кагда закапывалі — не галасілі, усе смяялісь, радавалісь. Дамой ідзем, пяем «падводныя» песні»[7].

У в. Прысна Веткаўскага раёна абрад, які спраўляўся на Ушэсце, называўся «праводзіны вясны»; яе ўвасабляла палка, абвітая крапівой і кветкамі, якую тапілі ў рацэ, але характэрна, што і гэтаму абраду надавалі значэнне «шчоб расло жыта» і пры гэтым спявалі «Стралу»[8].

У Бранскай вобласці РСФСР «стралу» вадзілі не на Ушэсце, а на Юр'я (вясенняга Ягорыя), да якога тут быў прымеркаваны першы выхад у поле, і закопвалі ў зямлю дзявоцкую стужку, якая таксама называлася «стралой»[9]. Аднак у некаторых месцах Браншчыны, напрыклад у в. Верашчакі Навазыбкаўскага раёна, «адкопвалі» «стралу» на Вялікдзень (г. зн. пачыналі яе спяваць), а «закопвалі» на Ушэсце — апошні раз вадзілі карагод і, нарваўшы траву, кідалі яе праз галаву [10].

Характэрна, што ў рускіх сёлах Веткаўскага раёна Гомельскай вобласці (у былых стараабрадавых слабодах), а таксама сярод стараабрадавага насельніцтва Бранскай вобласці ваджэнне «стралы» ўспрымалася як грэх, хаця вясеннія карагоды і цудоўныя карагодныя песні тут заўсёды бытавалі (яны добра памятаюцца і выконваюцца да гэтага часу). Гэты факт непрыняцця «стралы» перасяленцамі яшчэ ў большай ступені выяўляе мясцовы, лакальны характар абраду, характэрнага толькі для аўтахтоннага насельніцтва ўказанага рэгіёна.

Закопванне «стралы» ўспрымаецца мясцовым насельніцтвам як сродак, які садзейнічаў багатаму ўраджаю, аднак старажытнае магічнае прызначэнне перакочвання жанчын па зямлі (па азімых) як акта, стымулюючага пладароддзе зямлі, забыта [11], яму цяпер даецца іншае тлумачэнне: «Бабы па жыту пакачаюцца, штобы спіна не ўстала пасля карагода»[12].

Ваджэнне «стралы» асэнсоўваецца мясцовым насельніцтвам як абрад, які не толькі садзейнічаў росту хлябоў, але і ахоўваў ураджай і людзей ад стыхійнага бедства (навальніцы з градам, засухі). Многія спецыяльна апытаныя намі сяляне гаварылі: «Каб маланка не ўбіла», «Кабы ўвесці гразу на лета ад дзярэўні», «Каб жыта не згарэла» і г. д. Жыхарка в. Янава Л. Х. Ісачанка сказала Ю. І. Марчанку, які рабіў запіс «Стралы» (26.II.1982): «Кажуць, страла — як хмары ідуць, так маланка»[13].

В. І. Ялатаў, які запісаў «Стралу» ў Клімаўскім раёне Бранскай вобласці, паведамляе яшчэ адну цікавую дэталь: выканаўцы імітуюць абход жабракамі двароў і збор міласціны, як у беларуска-ўкраінскім валачобным абрадзе. Што ж датычыцца пахавання «стралы», то і там, па тлумачэнні мясцовага насельніцтва, яно «павінна нібы засцерагчы ад маланкі ўсіх удзельнікаў гэтага абраду»[14].

Некалькі асабняком стаіць абрад, зафіксаваны ў в. Чэлхаў Клімаўскага раёна Бранскай вобласці (у час экспедыцыі Інстытута славяназнаўства і балканістыкі АН СССР). Тут абрад называецца «вадзіць сулу»[15]. Прымеркаваны ён не да

Ушэсця і не да вясенняга Юр'я, а да Вялікадня; песня таксама называецца «Сула» і вызначаецца як «велікодная песня». Аднак характэрна, што, хаця зачын песні называе «сулу», у другім радку ўпамінаецца ўжо «страла»:

Ой, летить сула да й удоль села.
Ой лялей вода коло города,
Загубила стрела добра молойца.[16]

Тут у адрозненне ад усіх іншых месц абрад звязаны з выхадам не ў азімыя хлябы, а ў поле з ільном. Жанчыны, узяўшыся за рукі, «бегали у полотно всим селом с конца у конец» на працягу ўсяго Велікоднага тыдня: гэта лічылася неабходным, «каб лён радзіў», «каб лён быў добры»[17]. З гэтым звязана і некалькі іншая, чым у іншых месцах, форма шэсця: тут хадзілі не шырокімі радамі, як пры ваджэнні «стралы», а парамі, расцягнуўшыся ўздоўж усёй вуліцы; гэта мела таксама магічны сэнс — імітацыя «доўгага» льну або доўгага льнянога палатна: «Бегали ўдоль села, як полотно длинно»[18].

Форма ваджэння «сулы», якая адрозніваецца ад «стралы», асабліва выразна выявілася ў в. Дуброўка Добрушскага раёна Гомельскай вобласці: «Сула» — гэта доўгай змейкай закружваюць гуляючых у тугі клубок», «Сула» — гэта не карагод»[19].

Своеасаблівасцю абраду ў в. Чэлхаў было пераапрананне, якое суправаджала шэсце: «Прыбіраліся ў лахманы, а хто з ільну бараду зробіць, белую світку надзенуць... У карагод ідуць — у старца прыбяруцца»[20]. Хаця тут абрад спраўляўся моладдзю, сярод пераапранутых з'яўляўся і стары: «Дзед быў, дак ён бере коня серого, ружьё бере, надене шинель, шапку, приберется як зря и едет по селу»[21]. Аб конніку на белым кані сведчыць і другі інфарматар, які паведамляе яшчэ адну важную дэталь: жанчыны, якія прымалі ўдзел у абрадзе, вадзілі карагод, разыгрывалі прадзенне: «Кудзелы вынесуць і прадуць у карагодзе» (водзяць карагодную гульню «Дрёма дремле») [22].

Аналагічная форма ваджэння «сулы» захавалася ў в. Ніўкі Добрушскага раёна Гомельскай вобласці, дзе яно суправаджалася карагодам («карагод — скакуха»): «Ходзяць «дзед» і «баба», «старцы», гарбы зробяць... Твары завязвалі марляй, прыбіраліся ў лахманы. Яны ідуць наперадзе, а людзі бяруцца за рукі і адзін за адзін — за імі (...), а яны (пераапранутыя) танцуюць, спяваюць «Ішла страла да удоль сяла...»[23] Пераапрананне ў старога і старую было вядома і ў с. Пятрова Губа Клімаўскага раёна Бранскай вобласці.

Нягледзячы на некаторыя асаблівасці ваджэння «сулы», агульны сэнс і функцыя яго несумненна падобныя з абрадам ваджэння і пахавання «стралы» і адлюстроўваюць яго лакальны характар, звязаны з культурай ільну. Пераапрананне тут і ў іншых месцах, якое суправаджала ваджэнне «сулы», перайшло на гэты абрад са святак або з Масленіцы. У цэлым можна заключыць, што калі ваджэнне «сулы» абмяжоўвалася Велікодным тыднем, то ваджэнне «стралы» распаўсюджвалася на ўвесь веснавы цыкл карагодаў [24]. Часавая лакалізацыя ваджэння «сулы» мае вынікам тое, што яно аказваецца завершаным магічным абрадам. Ваджэнне ж «стралы», г. зн. хаджэнне па вуліцах сяла, што папярэднічала любому карагоду, само па сабе яшчэ не абрад, а звычай, які падрыхтоўваў абрадавае дзейства. Толькі ў апошні дзень веснавога цыкла, калі ваджэнне «стралы» прымеркавана да выхаду ў поле для агляду азімых хлябоў і непасрэдна папярэднічае пахаванню «стралы», яно набывае значэнне рытуальнага дзеяння.

Паспрабуем абагуліць вядомыя звесткі аб абрадзе ў цэлым. Хаця ён зафіксаваны толькі ў абазначаным у пачатку артыкула рэгіёне (і таму можа разглядацца ў якасці рэгіянальнага тыпу), яго структуры ўласціва варыятыўнасць, прычым розніца паміж лакальнымі варыянтамі часам значная. Ступень паўтараемасці (падабенства) асобных элементаў структуры ў лакальных варыянтах розная, тым не менш могуць быць вычленены некаторыя характэрныя для абраду ў цэлым прыкметы, якія ўтрымліваюць пэўную функцыянальную семантыку, агульную або падобную для розных лакальных варыянтаў [25].

Часавай канстантай абраду з'яўляецца прымеркаванасць яго да першага выхаду ў поле для агляду азімых хлябоў (у лакальным варыянце — агляд усходаў ільну), які, як правіла, прыпадае на дзень Ушэсця (у лакальных варыянтах — на дзень веснавога Юр'я або радзей — на Вялікдзень).

Адпаведна месцам, дзе адбываецца кульмінацыйны рытуал, служыць, як правіла, ускраіна поля (у рэдкіх лакальных варыянтах — лужок за межамі сяла, бераг ракі).

Удзельнікі або дзеючыя асобы абраду — дзяўчаты і жанчыны (па сведчанні інфарматараў, у мінулым — толькі дзяўчаты), у лакальных варыянтах — таксама пераапрануты мужчына, дзеці (у адным лакальным варыянце і хлопцы).

Акцыянальную структуру абраду, або абрадавае дзейства, складаюць узаемазвязаныя рытуальныя дзеянні, якія адбываюцца ў пэўнай паслядоўнасці [26]. Даследуемае намі абрадавае

дзейства ўключае наступныя рытуальныя дзеянні: а) збор удзельнікаў абраду ў традыцыйным месцы сяла пад спяванне «Стралы»; б) ваджэнне карагодаў; в) шэсце радамі («танок») пад спяванне «Стралы» ад месца збору да поля (у лакальных варыянтах — абход вакол сяла, карнавальнае шэсце з удзелам пераапранутых); г) ваджэнне карагода ў полі (у асобных варыянтах — карагодныя гульні); д) перакочванне жанчын па полі (у лакальных варыянтах — штурханне ў полі выбранай дзяўчыны або перакочванне па зямлі дзяцей); е) закопванне ў зямлю розных у розных варыянтах прадметаў, якое часам суправаджаецца смехам (пералік іх гл. ніжэй); дзеянне гэта можа набываць масавы характар (у лакальных варыянтах кожная з удзельніц закопвае прадметы ўпотай ад іншых) або адбываецца як акт з удзелам адной-дзвюх жанчын у прысутнасці астатніх; ж) аплакванне «стралы» (гэта дзеянне зафіксавана толькі ў адным лакальным варыянце); з) вырыванне з зямлі каласоў (у лакальным варыянце — пляценне з каласоў вянкоў) або травы (у адным лакальным варыянце); і) вяртанне ў вёску і святочны абед (у лакальных варыянтах — распальванне кастра і рытуальная вячэра пасля поля, якія папярэднічалі вяртанню) [27].

У некаторых лакальных варыянтах магчыма або выпадзенне аднаго з двух («д» або «е») дзействаў, або сінхроннае іх выкананне (адначасова закопванне ў зямлю прадметаў аднымі ўдзельніцамі і перакочванне па полі другімі). Структура абрадавага дзейства па ўсіх лакальных варыянтах можа быць прадстаўлена ў двух асноўных відах — як поўная (якая ўключае абодва гэтыя дзеянні або адно з іх) і як рэдуцыраваная (без гэтых двух дзеянняў), што вышэй тэрміналагічна ўмоўна абазначана як ваджэнне «стралы» або «сулы».

У акцыянальнай структуры абраду істотную ролю адыгрываюць розныя харэаграфічныя формы. Найбольш характэрнай з'яўляецца «танок» — хаджэнне шырокімі радамі жанчын, якія ўзяліся пад рукі (у лакальных варыянтах — хаджэнне жанчын, што расцягнуліся «шнуром», папарна). Часта выконваецца «крывы танок» — карагод змейкай. У рэдкіх лакальных варыянтах «танкі» замяняюцца прабегам удзельніц абраду па вуліцах вёскі з канца ў канец. У лакальных варыянтах вядома завіванне ланцуга жанчын, якія ўзяліся за рукі, жгутом (вакол жанчыны, што знаходзіцца наперадзе ўсяго ланцуга) і наступнае развіванне яго. Разнастайныя варыянты кругавых карагодаў (у лакальным варыянце — двайныя кругі, адзін з якіх складаюць хлопцы). На вуліцах вёскі і ў месцы традыцыйнага збору выконваюцца і «танкі», і карагоды, па шляху ад

вёскі ў поле — толькі «танкі», у полі выконваюцца толькі карагоды.

У матэрыяльнай сімволіцы абраду пераважаюць рытуальныя прадметы, якія належаць жаночаму ўбранню,— істужачкі, «каснік», завушніцы, грабеньчыкі, пацеркі, пярсцёнкі, «тканкі», шпількі для валасоў. У адным лакальным варыянце сустрэўся антрапаморфны (жаночы) сімвал (лялька). Другую групу складаюць раслінныя сімвалы — кудзеля, кветкі, галінка, упрыгожаная зелянінай палка, каласкі жыта, трава. У некаторых лакальных варыянтах побач з традыцыйнымі сімваламі з'яўляюцца выпадковыя прадметы (трэсачкі, ланцужкі, манеты і інш.), якія выконваюць, аднак, тую ж функцыю. Калі першая група сімвалаў, што закопваюцца ў полі, семантычна адпавядае значэнню перакочвання жанчын па азімых (чаму і магчыма ўказанае вышэй сумяшчэнне двух рытуальных дзеянняў), то другая група сімвалаў звязана з вегетатыўнай магіяй. Толькі ў нямногіх лакальных варыянтах абраду сумяшчаюцца сімвалы першай і другой груп, часцей жа ў адным варыянце ўжываюцца сімвалы той або другой групы.

Вербальную структуру абраду ва ўсіх без выключэння варыянтах у асноўным складае шматразовае выкананне песні «Страла».

Прыводзім тэкст варыянта, які адносіцца да асноўнай версіі «Стралы» (песня спяваецца з «гуканнем»):

Як пушчу стралу да й удоль сяла,
  Ох і ой лёлі, да й удоль ся... У!
Як уб'е страла добра молайца,
  Ох і ой лёлі, добрага молай... У!
Па том молайцу некаму плакаці,
  Ох і ой лёлі, некаму плака... У!
Матка старэнька, сястра маленька,
  Ох і ой лёлі, сястра малень... У!
Жана молада, кала горада,
  Ох і ой лёлі, кала гора... У!
Дзеці дробныя да ўсе родныя,
  Ох і ой лёлі, да ўсе родны... У!
Дзе матка плача — там калодзесі,
  Ох і ой лёлі, калодзе... У!
Дзе сястра плача — там рэчкі цякуць,
  Ох і ой лёлі, там рэчкі ця... У!
Дзе дзеткі плачуць — ручайкі цякуць,
  Ох і ой лёлі, ручайкі ця... У!
Дзе жана плача — там расы нема,
  Ох і ой лёлі, там расы не... У![28]

У некаторых варыянтах гэтай версіі пачатковыя строфы песні заклінаюць забіць сокала або чорнага ворана, а не молайца.

Побач з асноўнай версіяй вядомы яшчэ чатыры: а) версія з развітым фінальным матывам «жонка не бядуе, ідзе ў карагод і выбірае сабе новага мужа»; б) версія без аплаквання молайца з фінальным матывам цудоўнага пахавання (цела молайца знаходзіць у полі яго маці, бярэ на рукі, нясе да царквы, «сама зямля расступілася, само цела схаранілася»); в) версія, якая абмяжоўваецца матывам забойства сокала або чорнага ворана (без яго аплаквання); г) жартоўная, парадыйная версія. Аднак характэрна, што асноўная версія асабліва ўстойлівая ў руска-беларуска-ўкраінскім пагранíччы [29].

Хаця «Страла», як ужо адзначалася, выконваецца на працягу ўсяго цыкла веснавых карагодаў (ад Вялікадня), пачынаючы і завяршаючы кожны карагод (г. зн. набор карагодаў і гульняў, якія выконваюцца ў адзін вечар), абрадавая функцыя яе выяўляецца ў поўнай меры ў тых выпадках, калі яе выкананне непасрэдна звязана з першым выхадам у поле; тады ж раскрываецца сэнс сімволікі, што ўзыходзіць да міфалагічнай апазіцыі агонь — вада (страла — метафара маланкі, слёзы — метафара дажджу).

На тыповы напеў «Стралы» ў час шэсця ад сяла да поля выконваюцца таксама іншыя па тэксце песні з агульнай для ўсіх іх рытмаметрычнай структурай шасцімернага пяціскладовіка (на пяць складоў паэтычнага тэксту прыпадае шэсць музыкальных долей з акцэнтам на трэцім падоўжаным складзе). Для кожнага лакальнага варыянта абраду існуе пэўны, але які не паўтараецца ў іншых месцах, набор такіх песень (у абследаваных намі сёлах іх колькасць вагаецца ад 2 да 10). Часцей за іншыя сустракаюцца: «Ай, у Кіеве, у Чарнігаве// Там ляжаць брусы, брусы новыя»; «У полі, ў полі пад ігрушаю//Канюшок свішча, трох каней ішча»; «У майго татачкі да жыць харашо»; «Ох ты ластаўка, ты касістая». Сцвярджаць, што паміж тэкстамі ўсіх гэтых песень, якія суправаджаюць шэсце, ёсць якая-небудзь тэматычная сувязь, было б нацяжкай. Паслядоўнасць і частата іх выканання ў час шэсця адвольныя. Адзінай прыкметай, якая іх аб'ядноўвае, з'яўляецца музычная (меладычная і рытмічная) форма, што арганізоўвае рух удзельнікаў абраду ў «танку». Таму ў дадзеным выпадку дакладней было б гаварыць не толькі аб вербальнай, але і аб вербальна-музычнай структуры ваджэння «стралы».

Акрамя «Стралы» (песні) і выконваемых на яе напеў песень, у вербальна-музычную структуру абраду ўключаюцца і розныя карагодныя песні, а таксама (у лакальных варыянтах) песні-

заклінанні, якія суправаджаюць закопванне прадметаў (тыпу «Песенька мая маленькая»), і галашэнні па «страле»[30].

З усіх песень толькі ўласна «Страла» зачынае ўвесь абрад, адкрывае шэсце ў поле, папярэджвае асноўныя эпізоды абраду і выконваецца ў апошні раз непасрэдна перад кульмінацыйным эпізодам — закопваннем (пахаваннем) «стралы». Тым самым устанаўліваецца як агульная для яе і іншых песень, якія суправаджаюць шэсце, функцыя «паходнай» песні, так і толькі ёй адной уласцівыя сігнальныя (што арганізуе дзеянне) і магічная функцыі, непасрэдна звязаныя з функцыямі абраду.

За межамі абрадавага дзейства ў полі выконваюцца ўжо іншыя па функцыянальнай тэматыцы песні («на лета») і адвольна выбраныя песні і прыпеўкі, якія суправаджаюць вяртанне ўдзельнікаў абраду з поля ў вёску.

Неабходна падкрэсліць, што вылучаныя структуры абраду ўзаемазвязаны, дапаўняюць адна адну, складаючы свайго роду дынамічны кантрапункт, хаця ў ім няма абавязковай сінхроннай адпаведнасці ўсіх элементаў адной структуры ўсім элементам другіх структур. Найбольшае згушчэнне элементаў усёй цэласнай структуры абраду дасягаецца ў час кульмінацыйнага дзейства «закопвання стралы».

Разглядаемы абрад тыпалагічна блізкі іншым вясеннелетнім абрадам, звязаным з пахаваннем сімвалічных фігур, з праводзінамі русалкі. Пагранічны характар абраду (ён «замыкае» вясну і «адмыкае» лета — напомнім песеннае «к Ушэсцейку, к налецейку») вызначае яго полісемантыку і поліфункцыянальнасць. Завяршаючы цыкл веснавых вегетатыўных абрадаў, ён адначасова павінен быў засцерагчы зялёную яшчэ ніву і саміх людзей, якія ўзрасцілі яе, ад летняй засухі і навальніцы. Прымеркаванасць абраду, асэнсаваныя ў яго міфалагічным кантэксце песенныя матывы забойства і аплаквання молайца, закопванне ў полі прадметаў жаночага ўбрання, карагод у полі і перакочванне жанчын па азімых, раслінныя сімвалы — усё гэта, на наш погляд, сведчыць аб асноўнай аграрнай семантыцы абраду, у якой узаемазвязаны прадуцыруючая магія і ахоўная магія.

Разам з тым той жа пагранічны характар усходнепалескага абраду зрабіў яго структуру «адкрытай», вызначыў магчымасць асіміляцыі ў лакальных варыянтах некаторых элементаў папярэдніх яму абрадаў (пераапрананне, абход двароў) або абрадаў, якія ідуць за ім (утапленне ў рацэ зялёнай галінкі, кіданне ў ваду вянкоў). Таму ў рэдкіх выпадках ён мог зліваецца з абрадам праводзін русалкі [31].

У заключэнне адзначым, што звесткі аб бытаванні абраду ў мінулым, якія маюць даследчыкі, і асабліва назіранні над сучасным станам абраду адлюстроўваюць розную ступень захаванасці традыцыі ў лакальных варыянтах. Інтэрпрэтацыя абраду інфарматарамі сведчыць аб усведамленні толькі некаторымі яго ўдзельнікамі спрадвечнага значэння асобных элементаў, але агульны сэнс абраду ўстанаўліваецца толькі ў выніку навуковага аналізу. Абрад спраўляецца ў некаторых месцах рэгіёна да нашага часу, захоўваючы дзе-нідзе рысы масавага дзейства, але трансфармуючыся ў гульню, і ўспрымаецца як відовішча. Вядомы выпадкі рэканструкцыі (паказу) абраду ў непрызначаны час (для збіральнікаў, кінатэлевізійнай здымкі або дэманстрацыі на сцэне). У апошнім выпадку абрад са сферы фальклору пераходзіць у сферу фалькларызму і падлягае даследаванню ўжо як элемент традыцыі, уключанай у сучасную культуру.

## Заўвагі

[1] Ніжэй побач з іншымі крыніцамі аналізуюцца матэрыялы, сабраныя намі ў жніўні 1981 г. у Веткаўскім р-не Гомельскай вобл. разам з Ю. І. Марчанкам, і запісы, зробленыя ў Ленінградзе ад удзельнікаў фальклорных ансамбляў вёсак Барталамееўка (снежань 1981 г.) і Казацкія Балсуны (красавік 1982 г.), а таксама матэрыялы, сабраныя Ю. І. Марчанкам у час паўторных паездак у Веткаўскі р-н (люты 1982 г., жнівень 1982 г., чэрвень 1983 г.). У апошняй экспедыцыі група ў складзе Ю. І. Марчанкі, Л. І. Пятровай і А. І. Осіпава назірала абрад у дзень яго выканання (16 чэрвеня 1983 г.).

[2] Увесь абрад запісаны на магнітную плёнку Ю. І. Марчанкам, зафіксаваны ў палявым дзённіку Л. І. Пятровай, фатаграфаваўся А. І. Осіпавым. Прыведзенае ў дадзеным артыкуле апісанне састаўлена на падставе праслухоўвання плёнкі і інфармацыі Ю. І. Марчанкі і Л. І. Пятровай. Параўн. далёка не поўнае апісанне абраду ў тым жа сяле М. Каршуковым, якое адносіцца да першай палавіны 1920-х гадоў (Каршукоў М. Пахаванне стралы//Наш край. Мн., 1926. № 1 (4). С. 41).

[3] І сто гадоў назад у Гомельскім п. карагоды пачыналі вадзіць на Вялікдзень, суправаджаючы іх спяваннем «Стралы» (Романов Е. Р. Белорусский сборник. Вильня, 1912. Вып. 8. С. 177—178), спыняючы спяванне веснавых песень на Ушэсце (Там жа. С. 191). Характэрна, што і на Украіне «Страла» завяршала цыкл веснавых песень (гл.: Метлинский А. Народные южнорусские песни. С. 307).

[4] Гэты эпізод мясцовага абраду толькі часткова нагадвае праводзіны русалкі і асабліва абходы палёў з «каралевай» на Зялёныя святкі ў Польшчы (Календарные обычаи и обряды в странах зарубежной Европы. Конец XIX — начало XX в. Весенние праздники. М., 1977. С. 217).

[5] Запіс галашэння зроблены ў Ленінградзе 21 лістапада 1981 г. на магнітную стужку па нашай просьбе А. Ю. Кастровым (фанаграмаархіў ІРЛІ, ЭР 1981, Гом., касета № 27, зап. № 67; дадатак да матэрыялаў экспедыцыі, што запісаны ў в. Барталамееўка). Параўн. аплакванне Германа ў Бал-

гарыі, Джэрмана ў Сербіі і да т. п. з іншай функцыяй. «Песенька» ў прыведзеным вышэй тэксце, верагодна, сапсаванае «лесенка», г. зн. абрадавае пячэнне, якое раней кідалі на зямлю ў час абходу азімых на Ушэсце (параўн. закопванне калача ў паўночна-ўсходняй Сербіі на Джурджаўдан). Зрэшты, «песенька» сустракаецца і ў дарэвалюцыйных запісах развітальнай песні. «Налецейка» — памяншальнае ад «налета», г. зн. на будучы год.

6 Запіс Ю. І. Марчанкі ад 26 лютага 1982 г. (фанаграмаархіў ІРЛІ, ЭР 1982, Гом., касета № 10, зап. № 6). «Гуканне» — абрыў у рэфрэне апошняга складу з павышэннем голасу, як правіла, на актаву.

7 Запіс Ю. І. Марчанкі (расшыфроўка мая.— *В. Г.*). Фанаграмаархіў ІРЛІ, ЭР 1982, Гом., касета № 10, зап. № 6).

8 Запіс Е. Зайцавай і А. Тапаркова ў экспедыцыі Інстытута славяназнаўства і балканістыкі АН СССР 1982 г. Параўн. звальванне майскага дрэва ў Чэхіі і Славакіі, што Ч. Зібрт тлумачыў як водгалас старажытнага абраду «пахавання вясны».

9 Апошняя дэталь зафіксавана ў кнізе В. І. Ялатава (Песни восточнославянской общности. Мн., 1977. С. 33). Да ягор'еўскіх «танкоў» Браншчыны адносіць «Стралу» і К. Г. Світава (гл.: Свитова К. Народные песни Брянской области. М., 1966. С. 11). Першы выхад у поле для агляду азімых і качанне па полі прымяркоўваліся да Юр'ева дня і ў некаторых месцах Беларусі і Украіны (гл.: Соколова В. К. Весенне-летние календарные обряды русских, украинцев и белорусов. М., 1979. С. 171—172). Супадзенне некаторых звычаяў на Спасаўдан і Джурджаўдан характэрна і для сербаў і харватаў (калектыўныя гульні моладзі, агульная трапеза, абходы палёў і садоў з зялёнымі галінкамі або крыжамі з галінак) (Весенние праздники. С. 268).

10 Інфармацыя Н. М. Савельевай.

11 Гл.: Зеленин Д. К. Східнослов'янські хліборобські обряди качання і перекидання по земле//Етнографічний вісник. Київ, 1927. Вып. 5. С. 1—10. Аналагічны абрад вядомы і паўднёвым славянам. Гл.: Ђорђевић Д. Живот и обичаіи народни у Лесковачкоі Морави//Српски Етнографски зборнік. Београд, 1958. Кн. XX. С. 558. Параўн. зваротную функцыянальную сувязь (перадача пладароддзя зямлі бясплодным жанчынам) у звычаі качання па расе на Спасаўдзен у Балгарыі.

12 Сведчанне жыхарак в. Казацкія Балсуны. Тут жанчыны перакочваліся па азімых не толькі калі «хавалі стралу», але і пасля карагодаў, вяртаючыся ў вёску. Па словах жыхарак в. Янава, «такі закон быў — што валялісь у жыце, перакідалісь — спіна не будзе балець» (магнітны запіс Ю. І. Марчанкі.— Указ. захаванне фанаграмаархіва). Н. І. і С. М. Талстыя перакочванне па зямлі звязваюць з прафілактычнай магіяй адводу навальніцы (гл.: Толстые Н. И. и С. М. Заметки по славянскому язычеству. 3. Первый гром в Полесье//Обряды и обрядовый фольклор. М., 1982. С. 51—52).

13 Фанаграмаархіў ІРЛІ, ЭР 1982, Гом., касета № 10, зап. № 6. Нашы назіранні пацвярджаюцца аналагічнымі звесткамі С. М. Талстой (па матэрыялах палескай экспедыцыі 1980 г. пад кіраўніцтвам Н. І. Талстога): «...страла ў значэнні «маланка» ўжываецца і ў заходнім, і ва ўсходнім Палессі (...): «...Калі гром, то стрэла з неба ўпадзе...» (в. Ярылавічы); «Стрэла б'е» — пра маланку (в. Злееў Рэпкінскага р-на); «Чортаў палец — стрэла з маланкі» (в. Ярылавічы) (З пісьма аўтару ад 27.V 1982 г.). На падставе функцыянальнай сувязі абраду з ахоўнай магіяй ад навальніцы Г. А. Барташэвіч развівае гіпотэзу аб паходжанні яго з культу Перуна (гл.: Барташевич Г. А. Праславянские элементы в белорусской поэзии весеннего цикла//Славянская культура и мировой культурный процесс: Тез. докл. и сообщений Междунар. науч. конф. Мн., 1982. С. 10—11; Яна ж. Обряд

«водіння стріли» в Белорусії//Народна творчість та етнографія. 1983. № 4. С. 55—60).

[14] Елатов В. И. Песни восточнославянской общности. С. 33. Параўн. абходы вёсак «крыжарамі» на Спасаўдан у Сербіі, а таксама юр'еўскія абходы ў Харватыі і Славеніі, якія М. Гаваці звязваў з апатрапеічнай функцыяй і магіяй пладароддзя.

[15] Інфармацыя Л. М. Іўлевай, якой дзякую за ніжэй цытуемыя матэрыялы. Там жа, у в. Чэлхаў, О. А. Цярноўская зафіксавала выраз «бягіць сула», які сустракаецца і ў зачыне песні: «Ой, бягіць сула да й удоль сяла» (зап. О. А. Цярноўская, паведаміла аўтару Л. Н. Вінаградава). Яшчэ З. Ф. Радчанка пісала аб песнях, «якія спяваюць, «вадзіўшы сулу», г. зн. расхаджваючы па вуліцах натоўпам на святым тыдні» (Радченко З. Гомельские народные песни (белорусские и малорусские). С. 24). Функцыянальная семантыка «сулы» ў дадзеным кантэксце аналагічная «страле» («сула», або «суліца»,— кап'ё, рагаціна, клюка, дубінка, паліца, г. зн. зброя або прылада, якую кідаюць з мэтай паразіць якую-небудзь цэль).

[16] Запісала Л. М. Іўлева ў ліпені 1982 г. у в. Чэлхаў ад М. Н. Гайдуковай, 1907 г. н.

[17] Запісала Л. М. Іўлева ад М. Н. Гайдуковай і Е. І. Шайдука, 1910 г. н.

[18] Запісала Л. М. Іўлева ад Е. І. Шайдука.

[19] Запісалі М. Агафонава і Е. Савушкіна ў экспедыцыі ГМПІ імя Гнесіных у 1982 г. (паведаміла Л. Н. Вінаградава).

[20] Запісала Л. М. Іўлева ад М. Н. Гайдуковай.

[21] Запісала Л. М. Іўлева ад Е. І. Шайдука. Фігура ўзброенага «дзеда» на кані, відавочна, звязана з мясцовай казацкай традыцыяй (гэта частка рэгіёна была заселена ў XVII ст. украінскімі казакамі для аховы граніцы з Польшчай).

[22] Запісала Л. М. Іўлева ад Н. Ф. Бурай, 1909 г. н.

[23] Запісалі М. Агафонава і Е. Савушкіна ў экспедыцыі ГМПІ імя Гнесіных у 1982 г.

[24] З гэтага правіла магчымы выключэнні: так, у в. Андрэйкавічы Пагарскага р-на Бранскай вобл. «стралу» вадзілі толькі на Велікодным тыдні, аднак і тут, як пры ваджэнні «сулы», рытуальнага дзеяння «пахавання» не было (інфармацыя Н. М. Савельевай). Істотная не тэрміналагічная розніца, а сам характар «ваджэння» і яго прымеркаванасць.

[25] Гл.: Толстая С. М. Вариативность формальной структуры обряда «Купала и Морена»//Труды по знаковым системам. XV. Тарту, 1982. С. 72—89. Далей у сваіх вывадах мы асноўваемся не толькі на прыведзеных вышэй апісаннях абраду, але і на іншых палявых матэрыялах, якія не ўключаны ў артыкул, а таксама на апісаннях М. Каршукова і Г. А. Барташэвіч.

[26] Мы прымаем метадалагічнае значэнне чляпення структуры абраду на акцыянальную (дзейсную), прадметную і вербальную, якую прапануюць Н. І. Талстой і С. М. Талстая, але адрозніваем абрад у цэлым як комплекс усіх элементаў, абрадавае дзейства як яго акцыянальную структуру і рытуальнае дзейства як элемент гэтай структуры (гл.: Толстой Н. И. Из «грамматики» славянских обрядов//Труды по знаковым системам. XV. С. 57—58; Толстые Н. И. и С. М. Заметки по славянскому язычеству. 1. Вызывание дождя у колодца//Рус. фольклор. Л., 1981. Т. XXI. С. 97).

[27] Параўн. рытуальнае сняданне і карагоды каля гумна на Спасаўдзен у паўднёвых славян (гл.: Дробнакови Б. Етнологи а народа Іугослави е. Београд, 1960. С. 215. Примеч. 1).

[28] Запісана В. Я. Гусевым і Ю. І. Марчанкам 29. VIII 1981 г. у в. Казацкія Балсуны ад М. К. Хвастовай, 1907 г. н., даяркі; Е. О. Глушковай, 1930 г. н., работніцы саўгаса; Н. П. Мельнікавай, 1913 г. н., калгасніцы. У дадзеным тэксце выпраўляюцца недакладнасці і памылкі друку ў публікацыі запісу

ў артыкуле: Гусев В. Е. На окраине белорусского Полесья//Сов. этнография. 1982. № 5. С. 84—85.

[29] Аналіз песні (тэксту і музыкі) і яе лакальных варыянтаў гл.: Гусев В. Е., Марченко Ю. И. «Стрела» в русско-белорусско-украинском пограничье// Рус. фольклор. Л., 1985. Т. 24 (у друку).

[30] У вербальнай структуры лакальных варыянтаў сустракаюцца рэплікі-каманды распарадчыц абраду і магічныя прыгаворы ўдзельніц абраду.

[31] Гл.: Ганский И. Село Локотки Глуховского уезда//Зап. Черниг. губерн. стат. комитета. Кн. 1. Чернигов, 1866. Аналагічная з'ява ўстаноўлена экспедыцыяй ГМПІ імя Гнесіных (1982) у в. Ніўкі Добрушскага р-на Гомельскай вобл. (інфармацыя Л. Н. Вінаградавай). Экспедыцыяй Інстытута рускай літаратуры АН СССР (Ю. І. Марчанка) у Гараднянскі р-н Чарнігаўскай вобл. (1984) «Страла» запісана ў цыкле русальных («граных») песень (хаця прымеркаванасць абраду мясцовым насельніцтвам забыта).

## «ПЕСЕНЬКА МАЯ ХАРОШАЯ, ЗАХАВАЮ ЦЯБЕ...»

Як пушчу стралу да й па ўсём сялу,
Ох і вой люлі, да й па ўсём сялу.

Да й па ўсём сялу, удоль па Неглюбкі,
Ох і вой люлі, удоль па Неглюбкі.

Твары жанчын урачыстыя, засяроджаныя, інтанацыі ўзнёслыя, а ў канцы песні, дзе апавядаецца пра забітага маланкай молайца, па якім некаму плакаці, набываюць трагічнае адценне.

Але вось «ідзе» і сама «страла» «ўдоль па Неглюбкі»: шчыльны шэраг жанчын перакрывае ўсю вуліцу — выганяе злыя сілы з вёскі. Уперадзе шэрага дзве карнавальныя постаці «старцаў»: мужчына, пераапрануты жанчынай, і жанчына — мужчынам. Знешнасць іх гратэскная: «старац» — маленькі, шчупленькі; чырвонай рукавіцай падкрэслена яго прыналежнасць да мужчын, а «старчыха» — высокая, худая. У «старца» ў руках «магічная булава» — сімвал улады. Ёю ён намерваецца «частаваць» прысутных. Тыя могуць адкупіцца ад яго толькі ахвярай. «Старац» спыняе машыны, пужае дзяцей, «пагражае» ўдзельнікам свята. Па «ходу стралы» галоўныя дзейныя асобы забаўляюць прысутных. Паміж імі і прысутнымі адбываюцца імправізаваныя дыялогі-інсцэніроўкі. «Старцам» кідаюць далёка не цнатлівыя рэплікі пра жаночую і мужчынскую годнасць. Святочны настрой гэтаму шумнаму, маляўнічаму шэсцю надаюць музыкі: гармонік, скрыпка і бубен. Такія карагоды з усіх вуліц і завулкаў збіраюцца ў цэнтр Неглюбкі, дзе водзяць карагод самыя старэйшыя жанчыны — пераважна 80—90-гадовага ўзросту. Кульмінацыя ў эстэтычным развіцці

старажытнага абраду — само ваджэнне карагодаў. Найбольш маляўнічы з іх, які добра захаваўся, «Дрёма» (жанчына сядзіць у цэнтры карагода, прадзе кудзелю і дрэмле). Для яго доўга выбіралі самую таленавітую выканаўцу, якой карагод спявае:

— Не дрём, дрёма,
Не дрём, дрёма, пад кудзеляй,
Не дрём, дрёма, пад шаўковай.

Уставай, дрёма,
Уставай, дрёма, хату месці,
Хату месці — госці едуць.

«Дрёма» адмаўляецца ўстаць і месці хату, калі едуць бацька, маці, свёкар, свякруха. І толькі калі карагод праспявае: «Уставай, дрёма... мілы едзе»,— яна падхопліваецца і пачынае хуценька прыбіраць хату.

Вадзілі і спявалі тут яшчэ карагоды «Лука», два рады якога рухаюцца вакол пастаўленых у чатырох кутах дзяцей; «Крывы танок» — выканаўцы, што беглі шэрагам, раптоўна спыняюцца і круцяць адзін аднаго.

Як нам расказалі, у Неглюбцы і ў большасці вёсак Веткаўскага раёна карагоды водзяць у вольны ад работы час на працягу сарака дзён, ад Вялікадня да Ушэсця, калі «хаваюць стралу». Мы прыехалі ў Неглюбку якраз на «пахаванне стралы».

Удзельнікі карагода накіроўваюцца на ўзмежак жытняга поля. Пасярод вялікага агульнага карагода «старац» і «старчыха» качаюцца па зялёным жытнім полі — набіраюць яго пладаноснай жыватворнай сілы. Пасля таго як гэты сакральны рытуал адбыўся, па сведчанні многіх спевакоў, веснавых песень спяваць нельга і пачынаюцца песні лета.

Непасрэдна ў час «пахавання стралы», у якім яскрава гучыць старажытная магія дзеяння (калі пахаваць «стралу»-маланку, то яна не заб'е людзей, не спаліць пасеваў і збудаванняў і г. д.), не спяваюць, а вымаўляюць: «Ляжы, страла, да наступнага лета». У гэты дзень «хавалі стралу» ў многіх вёсках Веткаўскага раёна, з якіх асабліва песеннымі лічацца Неглюбка, Стаўбун, Барталамееўка, Казацкія Балсуны, Бесядзь.

Цікава падсумаваць і параўнаць з нашымі назіраннямі даныя розных збіральнікаў. Часавая працягласць першай часткі абраду «ваджэння стралы (сулы)» даволі шырокая: ад Благавешчання да Ушэсця, г. зн. фактычна ўся вясна. Але

ў розных вёсках гэтыя храналагічныя рамкі маглі быць і больш вузкімі: на Благавешчанне і пасля яго, да Вялікадня (в. Ручаёўка Лоеўскага р-на), на Вялікдзень (першы дзень і другі) і пасля яго, на святым тыдні (в. Чэлхаў Клімаўскага р-на Бранскай вобл.), ад Вялікадня да Ушэсця (вёскі Веткаўскага р-на) і нават на Русальным, Граным, тыдні (в. Ручаёўка Лоеўскага р-на). «Пахаванне стралы» праводзіцца ўсюды, як правіла, на Ушэсце (40-ы дзень — чацвер на шостым тыдні пасля Вялікадня). Часцей за ўсё абедзве часткі абраду аб'ядноўваюцца ў адным, і ён праходзіць на Ушэсце.

Асноўныя элементы такога кантамінаванага абрадавага дзеяння — рух удзельнікаў па вуліцы (вуліцах) вёскі з песнямі «стралы» (гэта і з'яўляецца ўласна «ваджэннем стралы»), выхад за вёску, звычайна на край азімага поля (у в. Нясвоеўка Навазыбкаўскага р-на Бранскай вобл. перад гэтым ішлі ў лес; у дубовы гай на беразе Дняпра выходзілі, па сведчанні В. Я. Гусева, у в. Дзяражычы Лоеўскага р-на), дзе таксама водзяць карагоды, у тым ліку і гульнявыя («Дрёма», «Селязень»). Адбываюцца і іншыя абрадавыя дзеянні: качанне па полі, сімвалічны акт апладнення зямлі (в. Неглюбка, «пахаванне стралы» — захаванне па краі поля (звычайна дзяўчатамі) розных прадметаў. У Стаўбуне Веткаўскага раёна — захаванне «дароў» (асабістых рэчаў) — істужак, кавалачкаў люстэрка і да т. п.; у Казацкіх Балсунах і Бесядзі — жытніх каласоў (у Казацкіх Балсунах каласы нясуць і дадому, кладуць іх там за абразы); у Барталамееўцы — антрапаморфнай лялькі. Істотны момант — наяўнасць у абрадзе элементаў тэатралізацыі. Да іх можна аднесці, апроч названых вышэй гульнявых карагодаў, абрадавае пераапрананне (напрыклад, у Неглюбцы — у «старцаў», у Чэлхаве — у воіна-конніка), а таксама інтэрмедыі.

Звяртае на сябе ўвагу разнастайнасць форм карагодаў: а) выканаўцы ідуць, цесна прыціснутыя адзін да аднаго, пры гэтым поўнасцю перакрываюць вуліцу; б) бягуць групамі насустрач адна адной; в) бягуць па вуліцы ў адзін бок (часта ад царквы, г. зн. ад больш высокага месца); г) бягуць парамі ўздоўж вёскі, узяўшыся за рукі (усе чатыры — у час ваджэння «стралы (сулы)»); д) кругавы (пасля выхаду за вёску) і, нарэшце, е) зусім унікальны, які адбываўся на зямлі, на краі поля: дзяўчаты пералазілі адна цераз другую (в. Нясвоеўка; гэта дзеянне не суправаджалася, зразумела, песняй; параўнайце, дарэчы, гэты абрад з названым вышэй сімвалічным актам апладнення зямлі).

Вартая ўвагі і геаграфія распаўсюджання «стралы». Па

нашых звестках, да цяперашняга часу абрад зафіксаваны прыблізна ў 40 пунктах 19 раёнаў 7 абласцей БССР, УССР і РСФСР. У Гомельскай — гэта Веткаўскі, Добрушскі, Гомельскі, Чачэрскі, Рэчыцкі, Лоеўскі, Кармянскі, Хойніцкі, Брагінскі, Светлагорскі і Петрыкаўскі раёны; у Брэсцкай — Лунінецкі; у Магілёўскай — Бабруйскі; у Мінскай — Барысаўскі, Мінскі; у Чарнігаўскай — Гараднянскі; у Жытомірскай — г. Радамышль; у Бранскай — Краснагорскі, Навазыбкаўскі, Клімаўскі. Зусім выразна на карце вызначаецца цэнтр (Веткаўскі і Чачэрскі р-ны Гомельскай вобл.) і перыферыя, прычым цэнтр размешчаны ў міжрэччы сярэдняга цячэння Сожа і Бесядзі — раёна, які ў апошнія дзесяцігоддзі прыцягвае ўвагу спецыялістаў розных галін славістыкі, а таксама некаторых балтыстаў.

Аналіз абрадавых дзеянняў, якія суправаджаюць карагоды, паказвае, што ў аснове «ваджэння стралы (сулы)», «пахавання стралы» ляжыць ахоўная магія, якая ўдзельнікамі абраду ўсведамляецца іншы раз яшчэ і цяпер: спяваюць дзеля таго, каб уберагчыся «ад Перуна» (в. Студзянец Кармянскага р-на), як бы «закапваюць молнію, каб не бліскала ў дзярэўні» (в. Казацкія Балсуны), і г. д. Ахоўны характар абрадавых дзеянняў пацвярджае і рад варыянтаў асноўнай песні «Ой, пушчу стралу»: «Ой, біла страла добрага молайца», «Убіла страла добрага молайца» (в. Неглюбка), «Ой, не бі, страла, добрага молайца» (в. Неглюбка), «Ой, не бі, страла, добрага молайца» (в. Стаўбун) і некаторыя іншыя. Аднак з цягам часу ахоўная магія, якая дайшла да нас, дарэчы, у класічна завершаным выглядзе (заклінанне — абрад — гульня), дапаўнялася аграрнай (у прыватнасці, карпаганічнай), а таксама любоўнай. Напрыклад, Ф. Д. Хамякова (в. Казацкія Балсуны) расказвае: «Каласкі, каторыя нясуць дамоў, за іконы кладуць са словамі: «Ляжыце, ляжыце, каласкі нашы, расцвітайце ў нашых косах... і любоў нашу разукрасьце». Магчыма, падобны полісемантызм звязаны з розначасовым адмiраннем адпаведных з'яў духоўнай культуры, менавіта аграрных абрадаў, і ўключэннем іх элементаў у структуру абраду «ваджэнне стралы (сулы)», «пахаванне стралы» як найбольш цэласнага і эстэтычна значнага.

Паэзія «стралы» — выдатная эстэтычная з'ява. Ядром, зернем абраду з'яўляецца распаўсюджаная ў многіх варыянтах па ўсёй Гомельшчыне песня «Як пушчу стралу». Аналіз зафіксаваных некалькіх дзесяткаў варыянтаў гэтай песні дазваляе гаварыць пра значную эстэтычную эвалюцыю тэксту, які, відаць, пачаў сваё жыццё з заклікання: «Не ўбі, страла,

добра молайца». Трагізм сітуацыі, калі маланка забівае чалавека, спарадзіў баладныя элементы ў абрадавай песні, якія пазней аформіліся ў матыў «тры птушачкі на магіле забітага — маці, сястра, жонка».

Але найвялікшае эстэтычнае напаўненне абрад «стралы» атрымаў у прымеркаванай да яго вялікай колькасці карагодаў. Вытокі іх — у магічных рытуальных дзеяннях, якім надавалася сакральнае значэнне. Паступова гэтыя дзеянні развіваліся да ўзроўню карагода як самастойнай эстэтычнай з'явы, унікальнай для нашага часу тым, што яна захавала непарушным сінкрэтызм старажытнага фальклору: сукупнасць мастацтва слова з музыкай, танцам, драматычным дзеяннем, гульнёй.

У некаторых сюжэтах карагодаў арганізуючым звяном з'яўляецца драматычнае дзеянне. Найбольш маляўнічае з іх — «Дрёма». Але класічнай і найбольш распаўсюджанай формай карагода «стралы» з'яўляецца рух па крузе спачатку злева направа па сонцы, а потым наадварот. Гэта прадыктавала і кампазіцыйную пабудову тэкстаў карагодаў, паэзія большасці якіх набыла ў сучасных запісах першаснае значэнне.

Тэматыка карагодных тэкстаў «стралы» ў большасці сямейная. У цэнтры іх вобраз жанчыны і яе ўзаемаадносіны з мужам і яго бацькамі, часцей са свякрухаю («змяёй лютаю, падкалоднаю»), успаміны-параўнанні з бацькоўскім домам.

Многа карагодаў «стралы» прысвечана любоўнай тэматыцы. Не маючы выразнага тэматычнага адрознення, карагоды «стралы» ўяўляюць сабою своеасаблівую мастацкую структуру.

Кампазіцыйная пабудова іх тэкстаў строга падпарадкавана карагоднаму руху па крузе: гэта старажытная аднарадковая рытмічна дакладная страфа, характэрны заклікальны прыпеў «Ох і вой люлі» і паўтор другой часткі першага радка. Звяртае на сябе ўвагу эпічная паслядоўнасць часам значна разгорнутага развіцця дзеяння карагодаў, часта па прынцыпе вобразнага паралелізму, які ахоплівае ўсю кампазіцыю песні. У іх многа эпітэтаў-прыдаткаў («цвет-рамон», «снытачка-шчамяліначка»), сімволікі, трохкратных паўтораў. Шырокая насычанасць памяншальна-ласкальнымі суфіксамі стварае глыбока эмацыянальнае гучанне карагодаў. Тут сустракаюцца баладныя элементы. Прыкладам можа быць карагод «А што ж з-пад лесу, лесу цёмнага», дзе брат сястру вёў праз кладку і яна «ўтонула». Сястра просіць брата не браць у мора вады, не касіць травы, не рваць красачак, бо гэта адпаведна як кроў, каса і краса.

Рытмічная завершанасць карагоднай структуры песень «стралы» расквечваецца разнастайнасцю прыпеваў: «Ой і я ў люлі», «Ой лі, вой люлі», «Вой люлі, вой люлі», «Лёлюшкі-лёлі», «Ой лёлі, ой лёлі» і т. п., «Ох і я ў лелю», «Ой гей лелю», «Ох і я хмелю», «Ой і я мелю», «Ух і ой люлі», «Ой, лялей вада каля гарода».

Такім чынам, карагоды, прымеркаваныя да абраду «стралы»,— унікальная з'ява ў творчасці беларускага народа. Вытокі яе ўзнікнення — у старажытнай праславянскай пары. У сваім развіцці яна прайшла шлях ад утылітарна-практычных закліканняў супраць маланкі да развітога карнавальнага народнага веснавога свята, якое было значна падоўжаным па часе (не менш за 40 дзён). Эстэтычнай вяршыняй яго стала вялікая колькасць самых разнастайных маляўнічых карагодаў.

## [ДУХАЎСКІЯ СВЯТЫ]

Напярэдадні Духава дня ў Духаўскую суботу сеюць каноплі. Гэта робяць звычайна пад вечар, таму што пасля пасеву канопляў ужо больш нічога нельга рабіць, інакш каноплі не ўдадуцца. Затым ставяць зялёныя бярозкі і галінкі іншых дрэў перад вокнамі, адтаго і называюцца Духаўскія святы Зялёнымі сяткамі. У Духаў дзень у сялян існуе звычай прыносіць у царкву кветкі і травы для акраплення «святой» вадой і захоўваць іх на працягу года. Сяляне абкурваюць імі свае хаты, жывёлу і пры надыходзе навальнічных хмар паляць на павольным агні для таго, каб прагнаць буру.

Пасля паўдня дзяўчаты адпраўляюцца ў лес завіваць вянкі. Яны бяруць з сабою яйкі, саланіну, кілбасы, а часам і гарэлку і, спражыўшы яечню і закусіўшы, прымаюцца завіваць вянкі. Кожная выбірае дзве невялікія бярозкі і, звязаўшы іх верхавінкі ў выглядзе вянка, праходзіць пад ім і спявае:

Пойдзем, дзевачкі, у луг гуляць,
Зялёных вянкоў завіваць.
Заўём вянкі на ўсе сяткі,—
На ўсе сяткі, на ўсе празнічкі.

Пры гэтым варожаць: калі вянок не ссохне да часу, калі трэба развіваць яго, то гэта добры знак, а калі рана ссохне, то «благая прыкмета». Затым зрываюць са сваіх бярозак зялёныя галінкі, робяць з іх вянкі і спяваюць:

А мы вяночкі завілі,
Гарэлачку папілі
І яешаньку паелі.

Вянкі гэтыя дзяўчаты ўскладаюць сабе на галовы і, несучы іх такім чынам да рэчкі, спяваюць:

Выхвалялася бяроза,
Што ў яе лісточак зеляненік,
Што ў яе ветвінкі да долу.
Як зачуў, пачуў серый дуб,—
Не хваліся, кажыць, бярозе,
Не сама бяроза расціла,
Расціў бярозу гасподзь бог,
Зялёны лісточак — дожджычак.
Выхвалялася дзевачка,
Што ў яе саянчык да долу.
Як зачуў, пачуў дзяцінка:
Не сама дзевачка спраўляла,
Спраўляла табе мамачка.
А ў мяне касіца да пояса.
Не сама касіцу расціла,
Расціла касіцу мамачка.

За рэчкаю, за быстраю
Чатыры дваркі,
А ў тых дварках —
Чатыры кумы;
Вы кумачкі, галубачкі,
Куміціся, любіціся, (2)
Любіце й мяне!
Пойдзеце вы ў зялёны сад,
Вазьміце й мяне;
Сашчыпіце па цвяточку,
Сашчыпіце й мне;
Саўеце вы па вяночку,
Савіце і мне;
Панясеце на ціхі Дунай,
Вазьміце вы й мой;
Кінеце свае вяночкі,
Кіньце вы і мой.
А ўсе вянкі паверх плывуць,
А мой патануў;
А ўсе дружкі з пахода йдуць,—
А майго нямаш.

Падышоўшы да рэчкі, усе кідаюць свае вянкі ў ваду і па іх варожаць аб будучыні. Калі вянок плавае па вадзе — добры знак, калі ж вянок патанае — благі. На Заговіны перад Пятровым пастом, а ў іншых мясцінах і ў дзень Пятра і Паўла дзяўчаты ідуць у той самы лясок «развіваць вянкі», мяркуючы,

што дрэва будзе праклінаць тую, якая не разаўе свайго вянка. Гэта таксама суправаджаецца песнямі, частаваннем і карагодамі.

## ВЯНКІ [РУСАЛКІ]

На Беларусі ж у адзін з дзён Зялёных святак так званыя русалкі, якія жылі ў рачных зараслях, выходзілі з вады і аж да св. Пятра (29.6) бегалі па жыце. У той дзень збіраўся люд па гаях, прылеглых да жытніх загонаў, і дзяўчаты вілі вянкі з бярозавых галінак. Вілі іх для сябе і для сваіх найбліжэйшых, якім жадалі варажыць на шчасце. Азываліся дуды, і прысутныя спявалі песні аб тым, як русалкі ўзлазілі на дуб, грызлі кару, падалі і пабіліся. Пасля звівання вянкоў скакалі каля дрэў і пляскалі ў ладкі. Потым найстарэйшая з кабет садзілася на зямлю з пуком крапівы, прывязанай да кія, прыкідвалася, што прала і задрамала. Дзяўчаты ж, узяўшыся за рукі, танцавалі вакол яе спяваючы. Нечакана жанчына зрывалася, падскоквала як найвышэй і крыўляючыся сцёбала танцорак крапівой па руках. Уцёкі, пагоня, разлягаўся смех. Заканчвалася гульбішча частаваннем гарэлкай і яечняй.

Вянкі павінны былі вісець у лесе аж да наступнай нядзелі, г. зн. да св. Тройцы, а тыдзень той называўся Русальным тыднем. Увесь гэты час на вёсцы нельга было гарадзіць платоў, ні ўпраўляцца з баронамі. Калі ж які-небудзь гаспадар не трымаўся гэтых засцярог, то за кару ў яго радзілася хатняя жывёла рознага выродлівага выгляду: з дзвюма галовамі, з незлічонай колькасцю ног або без іх і да т. п. Нельга было таксама пляскаць у далоні, а ні купацца ў рэчках. Бо было гэта велікоднае свята русалак, якое належала сяткаваць разам з імі, каб не наклікаць на сябе іхняга гневу.

Можа не зашкодзіць тут заўважыць, дарэчы, што русалкі — тое самае, што ў іншых месцах вадзяныя німфы; былі гэта прыгожыя чарнавокія дзяўчаты з чорнымі валасамі, доўгімі, аж да зямлі. Калыхаліся на галінках, гучным смехам вабячы да сябе кожнага, каго ўбачылі, каб яго потым зашчакатаць насмерць. Убраныя ў вянкі з васількоў, бегалі па жыце, пляскаючы ў далоні і клічучы:

Бух, бух, саламяны дух.
Матка мяне на свет пускала,
Не ахрысціўшы пахавала.

Таму што ўзяліся яны з дзяцей, памерлых без хрэсту. Часам спраўлялі вяселле, і тады чуваць былі па захадзе сонца пляск на вадзе, гулянне, смехі...

Як толькі мінаў тыдзень русалак і надыходзіла нядзеля св. Тройцы, усе зноў ішлі ў гай, да вянкоў. Цікавасць была вялізная: уласна цяпер можна было даведацца пра сваю будучыню і будучыню сваіх любых. Чый вянок ссох — таму суджана было няшчасце; хто ж свой вянок застаў свежым і зялёным — мог спадзявацца спрыяння і спаўнення жаданняў. Затым свежыя вянкі развівалі спяваючы, ссохлыя ж кідалі ў ваду. Кожны, які патануў, варажыў скорую смерць; той жа, што плыў, абяцаў яшчэ адзін год жыцця.

## [РУСАЛЬНАЯ НЯДЗЕЛЯ]

Русальная нядзеля акурат цераз тыдзень пасля Сёмухі. У гэтую нядзелю дзеўкі пяюць русальныя песні, убіраюцца ў кветкі, плятуць сабе з красак вянкі ды носяць іх на галовах, а ў рукі бяруць сухі май ды йдуць к рэчцы. Там яны робяць ляльку з «маю», быццам дзеўку, называюць яе русалкаю. Перш носяць тую русалку з песнямі па полі, а вечарам падыходзяць да ракі і кідаюць ляльку ў ваду. Гэта кажуць «тапіць русалку».

Даўней выбіралі самую гожую дзеўку, убіралі яе ўсю зялёнымі галінамі ды рознымі краскамі. Дзеўкі, пабраўшыся за рукі, станавіліся ў кружок кругом тае дзеўкі, якую звалі русалкаю, й так з песнямі хадзілі па полі, па лузе ды ў гаю. Мо да самае поўначы чуваць было, як раздаваліся песні ды вясёлы смех дзевак па полі й на вёсцы. У гэты дзень дзеўкі бавіліся без хлопцаў, якія не смелі да іх падыходзіць, каб не прагнявіць русалку.

## [КУМАВАННЕ]

У гэты ж дзень (29.6 ст. ст.) жанчыны і дзяўчаты кумяцца. Уласна дзяўчаты кумяцца на Сёмуху, а сумесна з хлопцамі — на Пятра. Але ў Чэрыкаўскім павеце наадварот: з мужчынамі — на Сёмуху, а адны — на Пятра. Вось чаму духаўскія песні так набліжаюцца да пятроўскіх. Кумаванне ўжо страціла свой абрадавы характар, толькі ў некаторых глухіх сёлах працягваюць яшчэ хадзіць у лес і там звіваць вянком дзве суседнія галінкі бярозы або галінкі дзвюх суседніх бяроз. Загадванне заключаецца ў тым: звянуць гэтыя завітыя галінкі ці застануцца свежыя, калі праз тыдзень прыйдуць іх развіваць. Прыкметы загадвання самыя звычайныя: ці буду я жывая, ці выйду замуж і да т. п. Звычайна ж кумаванне ўяўляе сабою

від балявання, прычым жанчыны і дзяўчаты балююць там, дзе завіваліся вянкі, а сумесныя баляванні хлопцаў і дзяўчат адбываюцца ў той хаце, дзе зімой бывалі супрадкі, пасядзелкі. У лесе раскладаюцца вогнішчы, ладзяцца арэлі, танцы; рыхтуецца абавязкова яечня, прыносяцца бліны, гарэлка. Калі на гэта жаночае баляванне прыйдуць мужчыны, жанчыны зрываюць у іх шапкі і кідаюць у вогнішча. У некаторых пунктах Магілёўскай губерні (напрыклад, Насовіцкая воласць) яшчэ бытуе баруканне дзяўчат з хлопцамі ў гэты дзень. Кумаванне ў хаце здзяйсняецца ў такім парадку. Вечарам на Пятра дзяўчаты прыносяць гаспадыні сыр, масла, малако, яйкі, сала, муку на бліны. Гаспадыня з адной з дзяўчат гатуе ежу, а астатнія спяваюць песні і танцуюць пад прыпеўкі. Хлопцы прыносяць гарэлку, і танцы робяцца байчэйшыя. У Рагачоўскім павеце запрашаецца і музыка, і адбываецца, такім чынам, поўнае ігрышча. Танцы працягваюцца ўсю кароткую ноч, і моладзь разыходзіцца дахаты ўжо раніцай на другі дзень. Існуе асобны цыкл кумаўскіх песень, якія таксама называюцца духаўскімі і пятроўскімі, але трэба сказаць, што апошнім часам сюды ўварваліся і песні запазычаныя, у якіх беларусам падабаецца не столькі тэкст, колькі рытм. Некалькі з іх прыводзіцца ў ліку друкаваных ніжэй.

## [СЁМУХА]

На Піншчыне і ў іншых краях Літвы, помню са сваёй маладосці, што першага гэтага месяца (мая.— *А. Л.*) на выгане, дзе люд збіраецца на гулянне, закопвалі зялёнае дрэва, убранае ў рознаколерныя стужкі. Прыходзілі дзяўчаты і замужніцы, хлопцы і ўвесь народ, маючы гожую дзяўчыну, якая прадстаўляла багіню Маю; зялёны вянок аздабляў яе галоўку, бярозавыя галінкі аж да ступнёў яе акрывалі. Спяваліся песенькі, у якіх часта паўтаралі: «О, Мая, Мая!» і танцавалі вакол дрэва. Звычайна гэта ўрачыстасць адзначаецца на Сёмуху. Дзяўчыну прыстойна ўбіраюць у сукенку ў выглядзе плашча, сплеценую з саміх бярозавых галінак. Акружыўшы яе, дзяўчаты ходзяць па вёсцы, танцуюць і спяваюць:

Каля тога да зялёнага куста
Пасеяна сачывачка згуста;
Хто тую сачывачку порве,
Той тую дзевачку замуж возьме.

## ДЗЕНЬ ТРОЙЦЫ

Дзень св. Тройцы беларусы называюць Сёмухай. Як жа святкавалася ў старажытнасці Сёмуха і наколькі абрады, прыстасаваныя да гэтага свята, захаваліся да нашых дзён сярод беларусаў. Гэта было свята ў гонар вясны як апекуна шлюбаў і любоўных асалод, вясны-нявесты, упрыгожанай кветкамі і зеленню, якая ішла насустрач свайму жаніху — Сёміку. Таму і свята гэта лічылася лепшым у годзе часам для кахання і для варажбы аб будучым сямейным шчасці. Сам Сёмік, па паданнях, паказваўся вясёлым, ласкавым юнаком, вялікім прыяцелем Масленіцы, а святкаванні, прысвечаныя яму, пачыналіся з таго, што дзяўчаты і жанчыны выходзілі на луг з зялёнымі галінкамі ў руках, танцавалі каля пастаўленай у полі статуі вясны ці Сёміка, упрыгожанай зеленню і кветкамі, і пелі песні ў гонар кахання, якія прыносілі ім асалоду. Гэты звычай, які перажыў стагоддзі і пакаленні, цалкам захаваўся сярод беларусаў. У Пінскім павеце ў гэты дзень сялянскія дзяўчаты выбіралі са свайго асяроддзя самую прыгожую сяброўку, абвязвалі яе бярозавымі і кляновымі галінкамі і пад назвай «куст» з адпаведнымі песнямі вадзілі па вуліцах і дварах. Затым нашы продкі збіраліся каля вады, якая прабуджалася з прыходам вясны, і там праводзілі варожбы: упрыгожаныя вянкамі, знакам кахання і шлюбнага жыцця, яны дапытвалі гэтую прарочую стыхію аб сваім будучым лёсе, пускалі па вадзе свае вянкі і назіралі за іх рухам, прамывалі вочы і ва ўдзячнасць за «прадказанне» кідалі ў яе розныя дары, прынесеныя з сабою. І гэтыя абрады не вымiралі. У гэты ж дзень сялянскія дзяўчаты адпраўляліся ў лес «вянкі завіваць». Яны бралі з сабою каўбасу, яйкі, смажылі ў лесе яечню і, паеўшы, прымаліся за варажбу. Кожная выбірала дзве невялікія бярозкі і, звязаўшы іх вярхушкі ў выглядзе вянка, праходзіла пад імі і спявала:

Пойдзем, дзевачкі, у луг гуляць,
Зялёныя вянкі завіваць.
Заўём вянкі на ўсе святкі,
На ўсе святкі, на ўсе празнічкі.

Пасля гэтага адломлівалі са сваіх бярозак галінкі, рабілі з іх вянкі і спяваючы:

Выхвалялася бяроза,
Што ў яе лісточак зялёненек,
Што ў яе вецвікі да долу.

Як зачуў, пачуў серы дуб:
— Не хваліся,— кажэць бярозе,
Не сама бяроза расцілася,
Расціў бярозу гасподзь бог,
Зеляніў лісточкі дождҗычак.
Выхвалялася дзевачка,
Што ў яе спадніца да долу.
Як зачуў, пачуў дзяцінка:
— Не сама, дзевачка, спраўляла,
Спраўляла табе мамачка.
— А ў мяне касіца да пояса,
Не сама касіцу расціла,
Расціла касу мамачка,—

кідалі свае вянкі ў ваду і варажылі аб будучым. Калі вянок паплыве — добрая прыкмета, а калі патоне — дрэнная.

Праз тыдзень прыходзілі развіваць вянкі. Ішлі і развівалі бярозкі, сплеценыя ў выглядзе вянка, пры гэтым заўважалі: калі чый вянок не засох — таму доўга жыць, а калі засох — таму смерць блізка. Пры развіванні вянкоў спявалі:

На Тройцу мы вянкі завілі,
На Разгары — развілі,
Гарэлачкі папілі
І яешню з'елі.

Звычай гэты не ўсюды на Беларусі захаваўся аднолькавым чынам, кожная мясцовасць уносіла ў яго свае рысы. Так, напрыклад, у іншых месцах не звязвалі бярозкі, а вешалі на іх вянкі і спявалі:

Русалачкі, зямлячачкі
На дуб лезлі, кару грызлі,
Зваліліся, забіліся.
Тройца!

Часам кожная дзяўчына пускала на ваду не адзін вянок, а два. Адным вянком загадвала на сябе, другім — на хлопца, якога яна хацела б мець сваім мужам. Глядзела, ці сходзяцца іх вянкі, ці не. Па гэтым жа яна і вырашала, збудуцца яе жаданні ці не.

Зелень і кветкі адыгрывалі галоўную ролю на вясёлым святкаванні вясны. Яны служылі абавязковымі атрыбутамі пры ўсіх абрадах і ўшанаваннях гэтай любімай багіні і, прайшоўшы горан стагоддзяў, якія захавалі нам паданні старажытнасці, адлюстраваліся ў нашых бярозках, у звычаі і г. д.

## «КУСТ»

У Пінскім павеце на другі дзень Тройцы збіраюцца дзяўчаты з усёй вёскі, выбіраюць самую прыгожую і маладую са сваёй кампаніі і надзяваюць на яе ўбранне, сплеценае з маладых бярозавых і кляновых галінак з лісцем. Прыбраная такім чынам атрымлівае назву «куст». Дзяўчаты становяцца парамі па ўзросце: старэйшыя ідуць уперадзе, пасля — малодшыя, а нарэшце — дзеці, і ў такім парадку, з «кустом» уперадзе ідуць на панскі двор ці да знаёмых. Свята гэта выключна дзявоцкае — рэдка прымаюць у ім удзел замужнія жанчыны ці маладзіцы. У такім выпадку яны займаюць месца ў першым радзе за «кустом». Мужчыны ж зусім не прымаюць удзел. Ідучы ў двор ці да якога-небудзь гаспадара, выконваюцца «куставыя» песні:

Да чэраз сяло Багданаўскае
Ішло войска ўсё ж дзявоцкае,
Да камяньчане не здзівіліся,
Што ў Багданаўцы нарадзіліся.
Бог вам даў, багданавачкі,
Што ў вас кусты ўсё кляновыя,
А вяночкі ўсё ж пярловыя.
А ў нас кусты ўсё лазовыя,
А вяночкі ўсё ж бярозавыя.

У двары ці ў гаспадара:

На гары, да на новай крамяніцы
Танцавалі дзеўкі, маладзіцы.
Там ягамосць да па перадочку ходзіць,
Сваю імаць да за белу ручку водзіць.
Ты, імаць, гардуеш ты мною,
Што быці штогод із табою.

Паненцы ці дачцэ гаспадара:

Каля таго да зялёнага куста
Парасла сачавічанька густа.
А каля дуба дуброва зялёна,
Да па той дуброве да Агапка хадзіла,
На ёй сукня ў дробненькія хванды,
Да любілі яе да багатыя паны.
На ёй сукня ў дарагія пасаманы,
Да любілі яе ненарокам, папраўдзе.

Сыну:

Каля таго да зялёнага куста
Парасла сачавічанька густа.

Хто ж тую сачавічаньку парве,
Той сабе красную панну азьме.
Наш Сямёнка сачавічаньку парве,
Ён сабе красную панну азьме.

У час танцаў спяваюцца наступныя песні:

Ой, пайду я пад гай зеляненькі,
Сустрэне мяне там казак маладзенькі,
Стане мяне да дарогі пытаці,
Да я, маладая, не ўмею адказаці...
Не ў свайго ты бацькі, дзеўка, узрасла,
Што не ведаеш, куды дарожанька пайшла.
Сказала б табе: у калінавы масты,
Да шкада будзе, што да бацюхны ў госці.
Сказала б табе: пад гай зеляненькі,
Да шкада будзе, што казак маладзенькі.
Мяне ж маці не на тое ўрадзіла,
Каб я казакаў па дарогах вадзіла.
Урадзіла мяне маці для сваёй выгоды,
Штоб я хадзіла з дзевачкамі ў ягоды,
Штоб падавала да крынічнай воды.
Пахілілася сухая ляшчынанька,
Палюбіліся да абое маладыя,
Пахавалі аднае гадзіны.
Казак ляжыць у зялёненькай дуброве,
Дзяўчына ляжыць у бацюхны ў каморы.
Па казаку чорны воран крача,
Па дзяўчыне бацька, матка плача.
Па казаку дуброва зашумела,
Па дзяўчыне ўся радзіна зажалела.
Па казаку ўсе лугі зашумелі,
Па дзяўчыне ўсе званы зазванілі.

Пры танцах спявалася і шмат іншых, прымеркаваных да «куста» песень.

У двары і ў знаёмых звычайна даюць «кусту» грошы ці што-небудзь з харчовых прыпасаў — вяндліну, хлеб, сыр і інш. Усё сабранае нясуць у карчму ці хату якога-небудзь гаспадара і, уваходзячы, гавораць:

Вот тут кусту есці, піці даці,
Вот тут кусту да на станцыі стаяці.

Тут наладжваецца вечарынка на сабраныя «кустом» грошы і прыпасы, якая працягваецца ўсю ноч.

## «КУСТ»

У м. Іванава Кобрынскага павета і ва ўсім Пінскім раёне здаўна існаваў звычай у дзень Тройцы вадзіць так званы «куст». Звычай гэты заключаўся ў тым, каб у прызначаны дзень, звычайна пасля абеду, збіралася кампанія сялянскіх дзяўчат (маладзей за 14 гадоў), і адну з іх, зразумела, самую прыгожую, прыбіралі ў болей святочнае адзенне, у валасы ўплятаді мноства рознакаляровых істужак. Шыю і грудзі ўпрыгожвалі штучным жэмчугам, на галаву надзявалі даволі вялікі вянок са штучных кветак, а твар закрывалі белай вуаллю. Прыбраная такім чынам дзяўчына называлася «кустом», які і вадзілі па вуліцах цэлым гуртам, душ з 10 і больш. Перад кожным заможным домам «куст» і тыя, хто яго суправаджаў, звычайна прыпыняліся і выконвалі падыходзячыя да гэтага выпадку песні. Гаспадары, каб не застацца ў даўгу за такую да іх увагу, павінны былі, вядома, аддзякаваць «кусту» па магчымасці сваёй шчырасці.

Адкуль узяўся ў мясцовых сялян гэты звычай, на якіх паданнях ён заснаваны, ніхто са старажылаў сказаць не мог. Не выклікае, канечне, сумнення, што гэта адзін з язычніцкіх абрадаў нашых старажытных славян, які захаваўся ў памяці мясцовых жыхароў да цяперашняга часу. Песні, якія адносяцца да гэтага звычаю, як вынікае з іх зместу, складзены яшчэ да часу вызвалення сялян ад прыгоннай залежнасці. Для прыкладу можна ўзяць адну з іх, якую сам «куст» і дзяўчаты, што яго суправаджалі, спявалі ў той час, калі прыпыняліся перад якім-небудзь выбраным імі домам:

Выйдзі, выйдзі, слаўны пан, з пакою
І вялі, дзе кусту стаці пад вішанькаю.
Вячэраці даці — піражкі ў масле,
А каля куста ўсе дзевачкі красны,
Ухвацілі куста з самага клёну,
Выкінь, пані, хоць па залатому.
Ухвацілі куста з самага бэзу,
Выкінь, пані, кусту хоць на адзежу.

Пасля кожнага двухрадкоўя вельмі часта ўслед даецца прыпеў:

Дзе куста вадзілі,
Там пшанічанька радзіла.

Тыя ж з дзяўчат, якія жадалі вадзіць «куст», але не ведалі адпаведных песень, звычайна спявалі ўсё, што папала. Вось

адна з такога роду песень:

— Чаго ломішся, сухая ляшчына?
Чаго плачаш, маладая дзяўчына?
— Я плачу, бо сваю долю знаю,
Ты мяне бярэш, я тавару не маю.
— Не бойся, дзяўчына, нічога,
Не будзе дагону ад нікога.
— Не дажэнеш ты, то маці,
Было, сынку, без тавару не браці.

Выконвалі таксама шмат песень, завучаных са звычайнага рускага песенніка, але пры гэтым у канцы кожнай песні прыбаўлялі:

Дзе куста вадзілі,
Там пшаніца радзіла.

## КУПАЛА [І СЁМУХА]

У пярэдадзень Яна, які прыпадае на 24 чэрвеня, вечарам, па захадзе сонца, у абраным месцы ўбіваюць вялікі кол (шост) у зямлю, абкладаюць яго саломай і канаплянай кастрыцай, а наверсе прывязваюць пук саломы. І гэты стос называецца «купала». Калі змяркаецца, запальваюць яго, і зараз жа прыбягаюць мноства прыбраных сялян і сялянак з бярозавымі дрэўкамі ў руках, якія кідаюць у стос, прыгаворваючы: «Каб мой лён быў такі вялікі, як гэтая хварасціна». Некаторыя, перад тым як кінуць бярозку, тры разы з ёю аббягаюць стос.

Дзяўчаты, хлопцы і маладыя жанчыны спяваюць наступную песню:

Купала на Йвана.
— Дзе Купала начавала?
Купала на Йвана,
Купала на Йвана.
— Начавала ў Івана.
Купала на Йвана,
Купала на Йвана.
— Што Купала ўжывала?
Купала на Йвана,
Купала на Йвана.
— Ужывала варэнішча ў алеішчы.
Купала на Йвана,
Купала на Йвана.
Рыбку з перцам, часнок з алейцам.
Купала на Йвана і г. д.

Калі стос дагарыць больш як да паловы, на той час хлопцы пачынаюць скакаць праз яго: ні жанатыя, ні ўдаўцы такога гонару не ўдастойваюцца. Жанкі прыносяць варэнікі, якімі, як і гарэлкай, частуюць.

Варэнікі — гэта цеста з грэцкай мукі, густа замешанае, начыненае тоўчанымі каноплямі і тонка парэзанай цыбуляй. Укідаецца гэта цеста ў вар, а затым сушыцца каля агню ў печы. Смак іх быў бы неблагі, калі б цеста не было вельмі цвёрдае і не мела зашмат цыбулі.

Пазней пачынаюцца танцы тут жа пры вогнішчы, у якое кідаюць бярозкі і канапляную кастрыцу для падтрымання агню.

У гэту ўрачыстую ноч не пакідаюць, як звычайна, на пашы коней, а прыганяюць іх дадому, бо баяцца, каб чараўніцы не падабралі іх для язды на Лысую гару ў Кіеў, куды ў тую пару злятаюцца на збор, услаўляны на Беларусі. Не толькі сяляне, але і іншыя жыхары Беларусі вельмі асцярожныя, што датычыць коней. Няма праўдападобна ніводнага дому, дзе б у гэту пару не падвесілі б (паставілі б) грамнічнай свечкі на варотах хлява, і ўсюды яе абрыдлая чараўніца згрызе, імкнучыся, хоць без поспеху, вызваліць уваход. Калі ж здарыцца, што сама пані аб гэтым (змяшчэнні свечкі над дзвярыма.— *А. Л.*) не дбае, тады жонка эканома праявіць клапатлівую абачлівасць і дзякуючы грамнічнай свечцы не дазволіць, каб пякельная гадзюка адабрала малако ў каровы. Калі ж праз чыю-небудзь няпільнасць гэта здарылася, тады ўжо каровы цэлы год або няшмат, або зусім не дадуць малака.

Сяляне прызнаюцца, што не ведаюць, хто быў той Купала, а святкуюць яго, ідучы за звычаем продкаў.

На другі дзень Сёмухі ідуць сяляне і сялянкі ў гай. Дзяўчаты і рэдка замужніцы, і то толькі вельмі маладыя, завіваюць галінкі бяроз у форме вянка. Кожная завівае столькі вянкоў, колькі мае блізкіх асоб, г. зн. для бацькі, маці, сястры, брата, дзяцей, мужа, а нарэшце, і для каханага. Завіваючы гэтыя вянкі, пад акампанемент скрыпкі спяваюць песню.

Пасля завівання вянкоў скачуць каля дрэў і, пляскаючы ў далоні, спяваюць:

Мы вяночкі завілі,
Мы гарэлачку папілі
І яешню паелі.

Тут дзяўчаты мяняюцца пярсцёнкамі на знак прыязні. Потым найстарэйшая з гэтага збору жанчына садзіцца на зямлю з хусткай, прывязанай да кія, і выдае сябе за праллю-

драмлівіцу. Дзяўчаты, узяўшыся за рукі, танцуюць вакол яе, спяваючы. Затым жанчына падхопліваецца з зямлі, падскаквае як мага вышэй і корчыць розныя прыкрыя грымасы і б'е па руках дзяўчат покрывам. Ад гэтага ўздымаецца вялікі смех, а насмяяўшыся, п'юць гарэлку.

Усе гэтыя цырымоніі павінны адбывацца каля дваровага жыта або ля жыта сялянскага. Мужчыны адны іграюць на скрыпках, а другія з'яўляюцца толькі гледачамі. Гэты вечар заканчваецца танцамі.

З нецярплівасцю і засцярогай чакаюць наступнага тыдня — часу прысудаў (варажбы), якія прарочаць, ці доўга будуць жыць любыя бацькі, сёстры, браты, муж, дзеці,— ах, і любы каханак! Які ж доўгі гэты тыдзень! Колькі разоў на дзень глядзіцца гэты вяшчунны вянок!..

У тую ж нядзелю ідуць сялянкі падобным парадам для развівання вянкоў. Шчаслівы той, для каго звіты вянок не ссох, бо абяцае для яго доўгае жыццё, наадварот, тым, у каго вянкі засохлі,— кароткае, аднак не без надзеі. Зрываюць засохлыя вянкі і кідаюць іх на ваду. Плывучыя прадракаюць як найменей год жыцця тым асобам, для якіх былі завіты; тыя ж, на жаль, пэўна памруць у той год, каго вянкі затанулі. Праўда, якая адвеку сцвярджаецца на Белай Русі.

Развіваючы вянкі, спяваюць:

На Тройцу мы вянкі вілі,
На Разгары — развілі...

Тут зноў дзяўчаты абменьваюцца сваімі пярсцёнкамі і потым танцуюць.

Ад Сёмухі аж да наступнага тыдня ніводзін з хлопцаў ні платоў не гародзіць, ні бараны не робіць: інакш бы гневаліся русалкі. Помста іх пашыраецца на хатнюю жывёлу, г. зн. за правіну маладняк можа нарадзіцца з крывымі нагамі.

Раней, некалькі дзесяцігоддзяў таму назад, паказваліся калі-нікалі тыя багіні, але пазней папы іх заклялі. Заўсёды бачылі іх голымі, з доўгімі распушчанымі чорнымі валасамі і вачыма такога ж колеру. Жылі ў гаях: калыхаліся на голлі дрэў, і каго толькі ўбачаць, адразу заклікалі такімі словамі: «Га! га! Хадзіце к нам на арэлі калыхацца!» Няшчасны, хто да іх наблізіцца: жахліва выкрыўляліся, і той, хто глядзеў на гэта, падобным чынам выкрыўляўся — і назаўсёды. Але зараз такога не здараецца: дзякаваць папоўскім праклёнам.

Ці хто-небудзь мог бы падумаць, што гэтыя беларускія сірэны вядуць свой род ад прыгожых беларусак? Маглі ж

гэтыя беларускі, якія спрадвеку справядліва славяцца сваім храраством, выдаць на свет такіх пякельных пачвар? Але так ёсць, бо так кажа народ, аколічная шляхта і папы. Русалкі — гэта дзеці беларусак, якія памерлі без хрышчэння...

## ПРА СВЯТКАВАННЕ КУПАЛЫ

Купала — свята агульнаславянскае і святкуецца яно ў гонар агню і сонца ва ўсіх славянскіх народаў. Пачатак яго адносіцца да самай глыбокай старажытнасці, калі чалавек, не маючы ніякіх паняццяў аб сапраўдным богу, абагаўляў тое, што наносіла яму шкоду ці карысць, бачачы ў сонцы крыніцу самых неабходных умоў існавання — цяпла і святла...

Хрысціянства, нягледзячы на свой уплыў, не паспела да гэтага часу знішчыць усіх паданняў язычніцкай даўніны, і Купала дайшло да нас амаль у тым жа выглядзе, у якім яно святкавалася некалькі стагоддзяў назад, захаваўшы свой першапачатковы, чыста язычніцкі характар. Ёсць падставы думаць, што свята гэта было і святам у гонар Купалы — бога (багіні) ураджаю і, магчыма, ад гэтага атрымала сваю назву. У адным старадаўнім безымянным рукапісе знаходзіцца наступнае апісанне Купалы: «Пятый бог Купало, которого урожаю быты бога розумилы. Тому жэ шалэпе извэдэни подякованя і офиры приносылы на початку жнив, которому то купали богу, альбо рачэй бису, по некоторых сторонах и тэпэр памятку отправляют, а особлыве на вэчеры рождэства св. Іоана Предытэчи таким способом: В вэчер, забравшися младэнцы і панны плэтут соби вэнки з зиля рожного, которыя кладут на головы и опоясуются имы. Кладут зась огонь и бэрут ея за руки и около огня оного скачут и, спиваючи писни, в которых часто вспоминают Купала, а потому прэз огонь оной пэрескакуют, бису оному купали офиру сэбэ самых приносят. Много и иных вымыслов бисовских бридких по той час на сходзках чинять...»

У Пінскім павеце 23 чэрвеня, напярэдадні св. Іаана Прадцечы, жанчыны вешаюць па хлявах крапіву і вянкі з асвячоных траў. Каровам прывязваюць да рог трошкі солі, хлеба і пасвячоныя свечкі, якія называюцца грамнічнымі. Усё гэта робіцца для таго, каб зберагчы жывёлу ад паморку і каб русалкі і ведзьмы не адымалі малака ў кароў. Вечарам дзяўчаты і маладыя мужчыны збіраюцца за вёскай на якім-небудзь узгорку і раскладваюць кастры... Кастры гэтыя з надыходам змяркання запальвае моладзь (дзяўчаты і хлопцы); танцуюць вакол іх, спяваюць песні ў адзіночным выкананні ці,

трымаючыся за рукі па парах, скачуць праз агонь. Калі ў час скакання праз агонь у закаханай пары рукі не разыйдуцца, то гэта добрая прыкмета — і вяселле іх у гэтым жа годзе павінна адбыцца. У другім выпадку — не. Смех, крыкі, песні, загарэлыя твары сялян, асветленыя полымем палаючых кастроў, і наогул усе абставіны гэтага свята надаюць яму надзвычай фантастычны і маляўнічы выгляд.

На другі дзень перад світаннем збіраюцца глядзець, як сонца выходзіць з купальні. У Багеміі і Польшчы свята гэта носіць назву Собаткі; у галіцкіх русінаў, маларусаў і беларусаў — Купала; у сербаў — Іванне. У Ноўгарадскай губерні святкуецца пад назвай Собаткі. У Польшчы перад запальваннем кастроў мужчыны і жанчыны збіраюць розныя травы. З гэтых траў дзяўчаты плятуць вянкі і пускаюць на ваду — чый вянок патоне, той у гэтым годзе не выйдзе замуж. У некаторых месцах Беларусі ў гэты вечар забіваюць у зямлю кол, абкручваюць яго саломай і пянькой, а наверсе навязваюць вялікі пук саломы, які называецца «купала». Кол запальваюць і бегаюць кругом яго, кідаючы галінкі бярэзіны і гаворачы: «Каб мой лён такі вялікі быў, як гэтая бярэзіна». У Сербіі гэтага ж дня ці ў дзень св. Іаана вешаюць у хатах і хлявах вянкі, каб выгнаць «нячыстых духаў», ці дамавых. Таксама паляць кастры, спяваюць розныя песні і інш.

Прывядзём тут купальскія песні, якія выконваюцца ў Пінскім павеце. Яны нешматлікія і большай часткай гумарыстычныя:

— Купала, Купала,
Дзе ж ты зіму зімавала?
Дзе ж ты лета летавала?
— Зімавала ў пірэйку,
Летавала ў зеллейку.
Цяпер Купала, заўтра Ян,
Кідаў бес ведзьму цераз паркан.
Купальнае ночы
Выдраў бес ведзьме вочы і інш.

Ноч з 23 на 24 чэрвеня лічыцца самай таямнічаю. У гэтую ноч, па народным павер'і, расцвітае папараць. Хто сарве кветку гэтай расліны і будзе насіць пры сабе, той будзе шчаслівы, багаты і атрымае ўсё, што захоча. Але здабыць яе вельмі цяжка: у самую поўнач, калі яна павінна раскрыцца, надыходзіць мацнейшая навальніца, зіхаціць бліскавіца, гром б'е за громам, і таму, хто асмельваецца сарваць кветку, здаюцца розныя пачвары (страшыдлы), якія імкнуцца ўсяляк перашкодзіць задумам чалавека. Каму ўдаецца сарваць кветку,

павінен, не аглядваючыся, ісці дадому і не звяртаць увагі на пагрозы ні на зманлівыя абяцанні, якімі ведзьмы стараюцца прымусіць чалавека аглянуцца. Інакш кветка ў адзін момант прападзе.

Ёсць паданне, што аднаму селяніну папала кветка ў абутак, і тады ён мог ясна бачыць тое месца, дзе закапаны скарб. Але, як амаль заўсёды ў такіх выпадках хто-небудзь з'яўляецца, каб загубіць шчасце чалавека, так і тут трапілася ведзьма і прапанавала яму новыя боты. Мужычок абрадаваўся і прыняў прапанову. Але, на жаль, надзяваючы боты, упусціў запаветную кветку, а з ёю і ўсё шчасце.

У гэту ж ноч збіраюцца з усіх бакоў усялякага роду «нячыстыя духі», ведзьмы на Лысую гару ў Кіеве і прыязджаюць туды звычайна на лапатах, качэргах, а часам і на рагатай жывёле, а таму ў гэтую ноч гаспадары ўзмацняюць нагляд за сваім статкам.

## ДЗЕНЬ ІВАНА КУПАЛЫ Ў ЗАХОДНЯЙ РАСІІ

Ні адзін дзень у годзе не абстаўлены, здаецца, такімі забабоннымі расказамі, як Купала (24 чэрвеня па ст.ст.). У гэтых расказах, праўда, ёсць шмат падобнага са светапоглядам велікарускім і наогул славянскім, але, думаем, падобная з'ява даказвае толькі супольнасць заходнерусаў з астатнім велікарускім светам. Гавораць, што ноччу на Купалу душы памёршых (русалак) прачынаюцца ад доўгага сну і купаюцца. Пасля, калі ўзыдзе сонца, яны быццам сушацца пры яго цяпле і святле. Калі сонца нібы ў тумане, то русалкі, значыць, закрылі яго. Раніцаю ў дзень Івана Купалы звычайна, на думку народа, «іграе» сонца. Гавораць, што яно раздзяляецца на шматлікія рознакаляровыя кругі, якія то сыходзяцца, то разыходзяцца, ствараючы пры гэтым цудоўную гульню колераў. Асабліва дзеці цікавяцца, каб убачыць падобную з'яву, і ўстаюць для гэтага па магчымасці раней. Але звычайна нічога не бачаць ці бачаць толькі тое, што намалюе ім іх настрой, вядомым чынам іх уяўленне. У іншых месцах проста гавораць, што немагчыма бачыць, як «іграе» сонца. Яно не дазваляе, кляне — вы, маўляў, людзі, цэлы год сорак раз гуляеце, дайце мне пагуляць хоць адзін раз.

На Купалу дзяўчаты і хлопцы збіраюць рознага роду кветкі, травы, наломліваюць галінак дубу, рабіны і ўсё гэта прыносяць пасля ў царкву, каб асвяціць. З асвячонай зелені ўюць вянкі і захоўваюць іх як сродак супраць нашэсця ліхой сілы.

Думаюць, што ў гэты дзень здзяйсняецца якісьці пераварот у свеце, цяпер быццам расхаджваюць па зямлі ведзьмы, духі. Дрэвы, звяры і наогул усё жывое нібы вядуць паміж сабою гаворку і г. д.

Гавораць, што ўсе гэтыя цуды можна бачыць, можна зразумець гаворку звяроў, знайсці скарб, варта толькі дагледзець, як будзе цвісці папараць, якая, на думку сялян, цвіце ў ноч на Купалу, і авалодаць гэтай кветкай. Апошняе дастаецца надзвычай цяжка. Перад захадам сонца трэба пайсці ў лес і абавязкова ў такую глуш, куды ніякім чынам не можа пранікнуць спеў пеўня, якога, на думку народа, моцна баіцца д'ябал. Адшукаўшы прыгоднае месца, дзе, зразумела, павінна быць і папараць, чалавек уладкоўваецца на ўсю ноч. У гэты час яму неабходна чытаць «боскую» кнігу пры запаленай «грамніцы», таму што д'ябал будзе прымаць усе меры, каб як-небудзь напалохаць яго і як бы выбіць з занятай пазіцыі. Ён будзе кідацца на чалавека ў выглядзе розных звяроў, будзе, відаць, затапляць яго вадою, падпаўзаць да яго ў выглядзе страшных змей, будзе пазбаўляць слыху пранізлівым гікам і піскам. Чалавеку будзе здавацца, што на яго валяцца велізарныя дрэвы, і ўсё гэта для таго, каб толькі прымусіць яго да ўцёкаў. Патрэбны, гавораць, незвычайная прысутнасць духу і цвёрдасць волі, каб устаяць супраць падобнага насланне. Гавораць, быццам бы і д'ябал быў неразумным, пакуль не авалодаў кветкай папараці. Таму ён і баіцца так, каб чалавек не падзяліў яго веды. Сродкам супраць яго нападкаў, акрамя малітваў, з'яўляецца яшчэ і наступнае: трэба абрысаваць круг вакол сябе крэйдай, якая была асвячона ў «дзень богаз'яўлення». Д'ябал ніякім чынам не пераступіць гэтай свяшчэннай лініі.

Расказваюць, што нейкаму шчасліўцу ўдалося авалодаць кветкай папараці. Было гэта так. У аднаго чалавека напярэдадні Купалы заблудзіліся валы. Ён пайшоў шукаць іх у лесы і сам заблудзіўся. Трапіў ён у такую глуш, што не меў магчымасці ісці далей, і паняволі прыйшлося прыпыніцца, каб адпачыць. Выявілася, што, заблудзіўшыся, лёг сярод папараці. Ноччу, калі адцвіла папараць, а цвіце яна, па ўяўленні народа, адно імгненне, кветка яе папала селяніну ў лапаць. Прачнуўшыся, селянін адчуў сябе зусім іншым чалавекам. Ён разумеў шапаценне дрэў, чуў, што гавораць у яго дома, бачыў усё, што там адбываецца, як бы перад сабою, бачыў тое месца, дзе знаходзяцца яго валы, бачыў багацці зямлі, скарбы. Ён вырашыў пайсці за валамі, хутчэй загнаць іх дамоў і адправіцца адкрываць скарбы. Ужо ён гнаў дамоў валоў,

але тут адчуў, што горача яго нагам, і, каб аблегчыць сябе і хутчэй дабрацца дамоў, ён скінуў лапці, не падазраючы, што ў іх знаходзіцца галоўная і адзіная прычына яго ўсёбачання. Скідаючы лапці, ён выпусціў з іх магічную кветку і ў тую ж хвіліну згубіў усе свае веды і разуменне: стаў ранейшым селянінам з няясным успамінам аб нядаўняй сваёй унутранай вялікасці.

У гэты дзень асабліва баяцца, каб ведзьмы не сапсавалі кароў. Яшчэ задоўга да гэтага паміж гаспадынямі ідзе размова, што хутка, маўляў, наступіць час змяншэння малака. Думаюць, што ведзьмы тады збіраюцца ў адно месца на Лысую гару ў Кіеве і там раяцца, куды і якая з іх павінна адправіцца за малаком. Паколькі некаторыя гаспадары ў гэты час выганяюць сваю жывёлу на пашу вельмі рана, то ведзьмы дзейнічаюць тут наступным чынам. На луг, дзе пасуцца каровы, яны з'яўляюцца таксама рана, бяруць ручнік, цягаюць яго па расе і гавораць, паказваючы на тую карову, у якой жадаюць адабраць малако: «Як раса ўбывае з-пад ручніка, так каб убыло малако ў гэтай каровы» і «Як раса ўбіраецца ў мой ручнік, так няхай і малако пераходзіць ад гэтай каровы і ўбіраецца ў вымя маёй каровы». Пасля ведзьма выкручвае ручнік і ваду, што з'явілася, дае выпіць карове. Малако пасля гэтага будзе ўбываць і пяройдзе да каровы ведзьмы. Гавораць, што іншы раз хтосьці пайменна ўсіх кароў заве ў лес. На гэты кліч каровы моцна рвуцца. Значыць, тут ёсць ведзьма. Трэба ўсімі сіламі не пускаць туды кароў: інакш ведзьма іх сапсуе.

Каб хоць колькі-небудзь засцерагчы сваіх кароў ад такога зла, іх пояць часам расою, сабранай у агародзе, або пераганяюць жывёлу праз раскладзены агонь. Яшчэ мацней баяцца сяляне, каб ведзьма не забралася да кароў у хлеў. З гэтай мэтай яны стараюцца як бы перагарадзіць ёй усе шляхі да свайго жылля. На варотах кладуць крапіву, каб ведзьма апяклася, а часам забіваюць касу, каб яна адрэзала сабе хвост. У хлявах затыкаюць усе дзіркі і шчыліны, над дзвярыма ў хляве вешаюць свечку, якая была асвечана ў царкве. Гавораць, што ведзьмы яе баяцца, і хоць са злосці грызуць яе, але перагрызці не могуць. На вуглах вешаюць вянкі з асвячонага зелля, вешаюць іх таксама ў дзвярах, кладуць на стрэхі, на вокны. Шчыліны ў дзвярах затыкаюць, таму што думаюць, быццам ведзьмы ператварочваюцца ў яшчарак і жаб і такім чынам могуць забрацца ў хлеў. На лбе ў кароў намазваюць дзёгцем крыж. Ісціну існавання ведзьмаў сяляне пацвярджаюць мясцовым паданнем.

У дзень Іаана Прадцечы сяляне наказваюць пастухам, каб

на гэты раз яны не пераганялі сваёй жывёлы «праз мяжу», г. зн. праз тую мяжу, якая аддзяляе палі адной вёскі ад другой: там, гавораць, збіраюцца ведзьмы, пераварочваюцца ў жаб і, падпоўзшы пад кароў, адбіраюць малако. Аднойчы дамовіліся некалькі хлапчукоў не паслухаць сваіх гаспадароў і пагнаць жывёлу ў забароненае месца «за мяжу». Адзін хлопчык, назіраючы за жывёлай, заўважыў, што паміж каровамі поўзае вялізная жаба. Ён зразумеў, што гэта ведзьма, узяў палку, завастрыў яе, быццам долата, і, наблізіўшыся да жабы, сказаў: «Ах ты, ведзьма, ты прыйшла за малаком да маіх кароў, вось я цябе пачастую!» Ён прыцэліўся і так лоўка стукнуў па жабе палкаю, што адсек ёй пярэднюю лапу. Параненая жаба запішчала і папаўзла без нагі. Хлопчык расказаў аб гэтай гісторыі сваім равеснікам. Яны пасмяяліся, пажартавалі — на гэтым усё, відаць, і закончылася б. Але калі гэты хлопчык вярнуўся вечарам з жывёлай дадому, то тут жа яму сказалі, што нядаўна хтосьці яго хроснай маці адсек руку. Успомніўся хлопчыку той выпадак, і ён тут жа паспяшаўся наведаць сваю хросную маці. Не паспеў ён уступіць у хату, як старая, сабраўшы апошнія свае сілы, схапіла качаргу і здаровай рукою шарахнула малому па галаве. «Ах ты, шалун, неслух,— сказала яна,— ты прыйшоў яшчэ сюды здзекавацца нада мною? З-за цябе я адыходжу на той свет!» Усе, хто прысутнічаў, былі здзіўлены падобным адказам і прасілі хлопчыка растлумачыць ім прычыну такога прыёму яго хроснаю маці. Хлопчык, зразумела, расказаў, што здарылася ў полі з несапраўднай жабай. Хатнія даведаліся, што была ў іх за старая. Хутка яна сканала, а паданне пра яе захавалася.

Жывёла ў гэты дзень вяртаецца з пашы ўвенчаная кветкамі, якія застаюцца на ёй на працягу ўсёй ночы. На другі дзень вянкі з гэтых кветак асвячаюцца ў царкве і захоўваюцца ў гаспадароў як ахоўныя сродкі супраць жывёльных хвароб. Коней у ноч перад Іванам не пускаюць на начлег. Думаюць, што тады злосныя духі маюць асабліва шмат клопатаў і спраў, адчаго і рады бываюць, калі пападаецца добры рысак, каб пры яго садзейнічанні хутчэй зрабіць сваю справу...

Вечарам на Купалу сялянскія хлопцы і дзяўчаты наладжваюць рознага роду гульні. Выбраўшы папярэдне месца па агульнай згодзе, яны позна вечарам выходзяць з вёскі са спевамі розных песень:

— Ой, маладая маладзіца,
Ой, выйдзі, выйдзі на вуліцу,
Ой, развядзі нам купальніцу.
— Ой, як я магу выхадзіці,
Вам купальніцу разваддзіці?

У мяне свёкарка — не баценька,
У мяне свякроўка — не мацюхна,
У мяне дзеверы — не брацікі,
У мяне залованькі — не сястронкі,
У мяне дзіця маленькае.
Што дзіця пісне,
То кулаком сцісне.
Што дзіця квякне,
То кулаком гракне.
Некаму ўстаці, яго пакалыхаці.

Ідучы па дарозе, хлопцы і дзяўчаты набіраюць крыху дроў, запальваюць з аднаго канца доўгія палкі і з імі часам праходзяць праз усю вёску. Прыйшоўшы ў вызначанае месца, моладзь кладзе «купалу» — вялікі агонь з дроў, і пачынаюць тут рознага роду перакульванні, гульні, танцы і песні:

Сягоння ў нас Купала... То-то-то!*
Сам бог агонь расклаў,

Усіх святых к сабе зазваў,
Толькі няма Іллі з Пятром.
Пайшоў Ілля каля жыта...

Або:

Купальнай ночы
Выпеклі ведзьме вочы,
Каб у ночы не хадзіла,
Каб расы не збірала,
Каб у печы не сушыла,
Каб у жорнах не малола,
Каб кашы не варыла,
Каб дзяцей не карміла,
Каб вядзьмят не пладзіла.

Зашалясціць што-небудзь удалечыні, вясёлы гурт адразу сціхне, але тут жа хвіліннае маўчанне перапыняецца яшчэ болей гучным крыкам: «Ведзьма ідзе!» Раздаюцца вясёлыя крыкі і рогат. Пачынаецца скаканне праз агонь, каб адным хутчэй жаніцца, другім — выйсці замуж, а там ізноў паліліся песні:

Звала Купала Іллю на ігрышча. То, то, то!*
— Хадзі, Ілышча, ка мне на ігрышча.
— Не маю часу, Купалічка.
Гэту ночку мне не спаці,
Нада жыта ўсяго пільнаваці,

* Прыпеў «То-то-то!» паўтараецца ў канцы кожнага радка.

Каб змяя заломаў не ламала,
У жыце карэнні не капала,
У кароў малака не адбірала.
Адбяры, божа, таму ручкі, ножкі,

Выдзеры, сава, са ілба вочкі,
Каб не відзеў, не чараваў,
Каб не хадзіў, а прапаў.

У некаторых месцах (в. Гарадок Вілейскага п. Віленскай губ.) у час вяртання назад з гульні дзяўчаты абыходзілі свае засеяныя палі і па вуглах іх утыкалі па адной галінцы. Думалі, што гэтым загародзяць ведзьме доступ на ніву і такім чынам засцерагуць пасевы ад той шкоды, якую б яна магла зрабіць. Ці па канцах нівы забівалі асінавыя калы, на верх якіх клалі каменьчыкі. У гэтым бачылі засцерагальны сродак ад граду. Часам крапяць яшчэ свае пасевы асвячонай вадой. Лічаць гэта засцерагальным сродкам і супраць ведзьмаў і супраць featureрознага роду насякомых.

## ІВАН КУПАЛА

Моцна трымаецца наш народ старасветчыны, але ўсё ж мала-памалу непрыкметна даўніна знікае. Розныя старажытныя абрады чыста язычніцкага характару пад уплывам хрысціянства і асветы забываюцца. Сустракаюцца толькі некаторыя глухія вёскі, дзе засталіся вядомыя старадаўнія звычаі і абрады. Так, у Слуцкім павеце Мінскай губерні амаль нідзе не адбываецца святкаванняў у гонар Купалы напярэдадні 24 чэрвеня (ст.ст.). Выключэнне складаюць в. Углы і іншыя суседнія вёскі, дзе яшчэ захаваліся рэшткі святкаванняў у гонар Купалы.

Здаўна ва ўсіх славянскіх плямёнаў гэта святкаванне вызначалася адметнай рысай — развядзеннем кастроў. У ноч на 24 чэрвеня хутка разгараліся купальскія агні. На Русі ў гэты дзень ужываўся «жывы» агонь, які атрымлівалі ад трэння сухога дрэва. Разводзілі кастры, скакалі праз іх, выконвалі песні ў гонар Купалы. Дзяўчаты варажылі, танцавалі. Бывалі танцы, якія часам суправаджаліся разгулам моладзі. Усё гэта паступова знікала і захоўвалася толькі дзе-небудзь у глухіх месцах Беларусі. Варта заўважыць, што, па агульным народным павер'і, напярэдадні Купалы, 23 чэрвеня, ведзьмы стараюцца рабіць зло людзям: высмоктваюць малако ў кароў, памяншаюць у пасевах, асабліва ў ільну, ураджай і г. д. Таму сяляне ўжываюць усе сродкі, каб адняць у ведзьмы магчымасць шкодзіць чалавеку... Па народным павер'і, сярод людзей зна-

ходзяцца знахары, ведуны, якія вылучаюцца вышэйшымі ведамі, а іменна ведаюць уласцівасці лекавых траў. Таксама і ведзьмы, толькі гэта нібы хвастатыя жанчыны, якія карыстаюцца сваімі чарамі, невядомымі забабоннымі, таямнічымі абрадамі, каб прыносіць беды людзям.

У Маладзечне Вілейскага павета ўказвалі нават прыкметы, па якіх можна распазнаць ведзьму. Яна на Купалу не можа ўтрымацца, каб не папрасіць чаго-небудзь у каго-небудзь з суседзяў, пераважна агню, запалак.

Каля в. Углы і ў наваколлі ўсюды на палях, дзе пераважна расце лён, утыкаюць у зямлю напярэдадні Купалы асінавыя галінкі, каб ведзьмы не аднялі спор (ураджай). Асіне народнае павер'е прыдае асаблівую ўласцівасць. Калі Дабрыня Мікіціч забіў змея, ён павесіў яго на асіну, адчаго той не мог ажыць.

Для засцярогі ад ведзьмаў, якія высмоктваюць у кароў малако, карыстаюцца таксама асінавымі галінкамі. На асінавых мастах спальвалі ведзьмароў... Асінавымі галінкамі карыстаюцца і знахары.

У шчыліны хлявоў і дамоў напярэдадні Купалы кладуць (у засцярогу ад ведзьмаў) крапіву. Адзін род крапівы (дробнай) называецца жыжкай.

Гадзін у 10 вечара хлопцы з в. Углы накіроўваліся з коньмі ў поле на начлег, а дзяўчаты, узяўшы бярозкі, што засталіся ад свята Тройцы, ішлі з песнямі па вёсцы на скрыжаванне дарог. У якой хаце ёсць халасты хлопец, перад тым домам выконвалі наступную песню:

— Чаму, Яначка, не жэнішся?
Ці твая хата не крытая,
Ці твая дзевачка не запітая?
— Мая хата накрытая,
Мая дзевачка запітая.
Мая хата не тручана,
Мая дзевачка заручана.
З хмелю чмялі гняздо звілі,
А людзі дзеўку разраілі.

Дарогай спявалі наступныя песні:

Да сягоння Купала, заўтра — Іван,
Будзе, дзецюкі, ліха вам.
А якое ліха — ліхое,
Пагоніце сабакі ў поле,
Да ад свіныя лебядзіцы (трава),
Пагоніце сабакі да вадзіцы.

Невялічка ночка-пятровачка,
Да не выспалася малодачка.
— Ты ж, маладая малодка,
Ты хадзі з намі на Купала.
— Ай жа вы, дзевачкі, дзіўнесенькі,
Ёсць у мяне дзіцятка малесенька.
— Уж, маладая малодка,
Да сваёй свякроўцы пакарыся,
Няхай тваё дзіцятка пакалыша.
— Я ж карылася і плакала,
А свякроў дзіцятка не калыша,
Қалыбелька мая скрыпіць,
А дзіцятка пішчыць.

Да ішло Купала сялом-сялом,
Да забіла жабу калом-калом,
Да ўсім дзецюкам па клешанцы,
Маладому Янaчку — саўсім жабку,
Ён яе аблупіць да пашые шапку,
Ён жа пойдзе жаніціся,
Будуць з яго людзі дзівіціся,
Ён жа пойдзе вянчаціся,
Будуць з яго людзі смяяціся.

Гэта песня носіць жартоўны характар, але ў ёй успамінаецца Купала, які забівае жабу. Жабы і гады складаюць як бы світу ведзьмаў па агульным народным павер'і. Малако ў каровы ведзьмы адымаюць часцей за ўсё пры пасрэднічанні жаб. Такіх жаб беларусы называюць большай часткай рапухамі.

Гурт дзяўчат з вышэйназванымі песнямі ў суправаджэнні дзяцей, якія ідуць ззаду і нясуць салому, прыпыняецца за вёскай на скрыжаванні дарог. На шасце ўмацоўваюць уверсе старое кола, скрынку ад дзёгцю, абкладваюць саломай і запальваюць. Калі шост упадзе, кідаюць на кола бярозкі, і наладжваецца касцёр, праз які скачуць, а калі патухне агонь, галавешкі кідаюць адзін у другога. Пасля гэтага ідуць у вёску. З'яўляюцца хлопцы з музыкай і пачынаюцца танцы.

Пакуль гарыць кола, выконваюць наступную песню:

Да гарэла Купала ясненька,
На Купаллі дзецючкоў поўненька.
Да гарэла Купала, пагарэла,
На Купалле дзецючкоў пагалела.
Да гарэла Купала з паўночы,
Да выпекла ведзьме вочы,
Каб яна ўночы не хадзіла
Да нам шкоды не рабіла.

Адпраўляючыся спаць, дзяўчаты зрываюць траву трыпутнік са словамі:

Трыпутнік, трыпутнік,
Ты стаіш пры дарозе,
Бачыш старога і малога,
Пакажы мне майго мілога.

Пасля гэтага ўжо няможна жупіць.

## КУПАЛА Ў БЕЛАРУСКАЙ ВЁСЦЫ

Купала — выключна свята моладзі — дзяўчат і дзецюкоў, якія ўвесь вечар, да глыбокай ночы весяляцца з бясконцымі песнямі. У гэты ж час дзяўчаты плятуць з сабраных на лугах і з палявых кветак вянкі, якімі пасля ўпрыгожваюць свае галовы. Вясёлае і радаснае свята Купала для вясковай моладзі, якая ў гэты дзень загадзя спяшаецца закончыць гаспадарчыя работы, каб мець час прыбрацца на гульбішчы.

Пасля паўдня, яшчэ далёка да заходу сонца, раздаецца па вёсцы вясёлая заклікальная песня: гэта спяваюць хлопцы, запрашаючы дзяўчат «зелле капаць», г. зн. збіраць на лугах кветкі:

Ходзіць Ян па вуліцы,
Дай памалу,
Просіць дзяўчат
Дай на Купалу.
Сягоння Купала,
Заўтра Ян,
Завець ён,
Наш добры пан.

Вясёлым гуртам з двароў высыпаюць на вуліцу прыбраныя дзяўчаты, сплятаюцца адна з другой за рукі і шчыльна доўгаю сцяною ў некалькі радоў памалу накіроўваюцца на лугі, нястомна распяваючы песні, дзе ўспамінаюць і маладзіц, у якіх цяпер няма сваёй волі, каб прыняць удзел у весялосці моладзі:

Досыць, досыць, нявестачкі,
Красавацца вам на Яна,
Маладзіцам няма волі,
Маладзіцам няма долі.

Марныя ўсе іх просьбы-ўпрошванні старых адпусціць іх і павесяліцца:

— Ой, татулька, я — маладая,
Пусці ўзвялічыць Яна.

— Няхай ідуць усе дзеўкі,
Узвелічаць Яна!
— Ой, татулька, і я пайду,
Можа, зёлку якую знайду.
Дзіця вазьму я на ручку,
А другое дай за ручку.
Прынясу я дамоў букоўку,
Святаянску першу зёлку.
Дай натаркну над сваім палком,
У сенях і пад вакном,
І над ложкам, над дзіцяцей,
Буду долі яго пільнаваці!
— Ой, нявестка, усё няпраўда,
Не хадзі, не нада, не нада,
Нас слухайце, людзей старых.
— Ой, татулька, не ў нас адных,
На ўсім свеце гэты прыкметы,
Чы хто жанаты, чы бяздзетны,
Ён на Яна зёлкі збіраець,
Да царквы святой прынашаець...
Пусці ж, татулька, няхай пайду,
Усякай зёлачкі знайду,
Купальнічка заспяваю,
Святога Яна ўзвелічаю.

Але ж маладзіца Яну не патрэбна:

Ён пяшком на вулку не выходзіць,
Ён на коніку выязджаець,
Сабе дзеваньку выглядаець.
Сам жа ён едзець на коніку,
Дзеваньку вязець на возіку.
Сам жа ён едзець у атласе,
А дзеваньку вязець у пакрасе.
Сам жа ён едзець, як жар гарыць,
Дзеваньку вязець, як цвет цвяціць!

Вось і дабраліся да лугу. Хлопцы і дзяўчаты прымаюцца за збор кветак, што на мове народна-беларускага эпасу называецца «зелле капаць», чаму многія сяляне і гавораць, што дзень збору кветак таму і называецца Купалаю, забываючыся пры гэтым пра розніцу двух кораняў «куп» і «кап».

Дзевачкі зелле капалі,
Яны капалі — не зналі,
Да караля паслалі.
Кароль зелля не пазнаў,
Да каралеўны адаслаў.
Каралеўна зелле пазнала
І да дзевачак адаслала.
— Гэта, дзевачкі, не зелле,
Гэта ваша вяселле.
Вы збірайце, збірайце,
Да ў вяночкі звівайце.

Другая песня папярэджвае дзяўчат, што ў жаданым для іх замужжы ўжо не будзе той весялосці, якая існуе ў іх цяпер:

— Зязюля рабая, чаму ў бары не кукуеш?
Чаго ў мой сад прылятаеш?
— Як мне ў бары кукаваць,
За сасонкамі не відаць,
За дзевачкамі не чуваць.
— Маладая малодачка,
Чаму ў бацькі не плакала,
Чаго да нас прыехала.
— Як жа мне ў бацькі плакаць,
За музыкаю не чуваць,
За дзевачкамі не відаць...
Цяжка, цяжка без мужа,
Я рабіці не дужа.
Спраў мне, татулька, цымбалы,
Каб мае ножкі гулялі,
Каб мае ручкі ў ладкі пляскалі.

Трэцяя песня праводзіць паралель паміж «суджанай» і «хвалёнай»:

Была ў суседа дачушка,
А ў другога — другая.
Адна — хвалёная,
А другая — суджоная.
Прыехалі баяры
Да суджонушку ўзялі,
А хвалёнушку не бралі.
Стала хвалёнка плакаці,
На свае белы дары гледзючы.
— Мае белы дарочкі,
Каго я буду дарыць вамі?
Белы бярэзнік укрыўшы —
Расой прыпадуць,
А чорны гасцінец услаўшы —
Баяры коньмі саб'юць,
Суджонку везучы,
А хвалёнку клянучы...

Песні раздаюцца ў начной цішы да світання, калі моладзь вяртаецца дамоў, несучы з сабой цэлыя снапы палявых кветак. Раніцай на заклік царкоўнага звана і старыя, і малыя спяшаюцца ў храм, дзе асвячаюць «зёлкі», г. зн. кветкі, і яны на працягу ўсяго года служаць лекавым сродкам ад розных хвароб і нагавораў злых людзей. Але ні ў песнях, ні ў абрадах цяпер ужо і паміну няма пра ведзьмаў, якія ў купаліну ноч калісьці збіраліся на Лысай гары ў Кіеве.

## КУПАЛЛЕ

Да найбольш паэтычных перажыткаў колішняй язычніцкай веры прадзедаў нашых, славян, належыць Купалле. Купалле — гэта свята сонца, святла, разросту жыцця, паўнаты сіл прыроды, якая дасягала ў гэтым часе свайго найвышэйшага развіцця... Прадзеды нашы верылі, што ў гэты дзень сонца ў вобразе казістага дзецюка гуляе вяселле сваё з багіняй лета. Патураючы прыкладу багоў, збіраліся яны між сёл на ўзлессі, каля вады, спраўлялі там ігрышчы ды ў гэту ноч «умыкалі» сабе дзяўчат на жон. А каб такі вянец меў законную сілу, дапаўнялі яго ўстаноўленымі здаўна звычаямі: ачышчаліся ад грахоў, купаючыся ў вадзе і скачучы праз полымя параскладаных вогнішч, пасля вадзілі карагоды, пелі песні. А калі ўсё гэта рабіла моладзь, старцы клалі ахвяры багам, пілі і закусвалі ды ўзмацоўвалі дух свой апавяданнямі з жыцця людзей, расказамі аб дзівах, якія ў гэту ноч дзеюцца на зямлі. Прайшло з таго часу шмат стагоддзяў, багі, забытыя і пакінутыя народам, замерлі. Іх месца заняло хрысціянства. Але звычай збірацца ў купальскую ночку, паліць агні, спраўляць ігрышчы ў лесе, пускаць вянкі па вадзе датрываў да нашых часоў... На працягу многіх пакаленняў людзі верылі, што ў гэту ноч зацвітае агністая краска папараці, якая мае моц даць чалавеку шчасце і сілу, пазнаць усе таямніцы прыроды. Расказваюць, як далёка трэба ісці за гэтай краскай-дзівам, якія перашкоды трэба перамагчы і асіліць, каб здабыць яе. У гэту ноч, як верыў народ, выходзяць наверх закапаныя ў зямлі грошы або паказваюцца сінім аганьком; дрэвы пераходзяць з месца на месца і вядуць гутарку між сабой. А калі ўзоймецца золак на ўсходзе, можна ўбачыць, як сонца «гуляе і скача». Ноч на Купалле авеяна паэзіяй і дзівам, і спаць у гэту ноч лічыцца грэхам. Таму, як шырока наша зямля, у гэту ночку людзі не спяць: адны ідуць спраўляць ігрышчы, другія — грошы шукаць, трэція пільнуюць у нетры лясной, куды голас пеўня не далынаець, агністай папаратнай кветкі.

Як у мове ды песнях, так і ў звычаях народа адбіваецца яго душа як культурны дабытак. Дзеля гэтага святкаванне Купалля нам трэба берагчы і, святкуючы, трымацца ўсіх устаноўленых вякамі звычаяў, адкідаючы толькі забабоны ды тое, што можа быць шкодным для другіх людзей. Свята Купалы павінна быць у нас святам паэзіі, звязкам нашым з прадзедамі і прашчурамі нашымі. Няхай у гэту ноч беларуская моладзь штогод выходзіць у поле і пад адкрытым небам спраўляе прыстойныя ігрышчы; няхай паляць агні, уюць вянкі і спяваюць

сваe розныя песні хорам. Няхай Купалле... служыць вечнай памяткай, што свет-сонейка заўсягды перасільвае цемру ночы, і ў гэтым мы будзем чэрпаць веру, што ўсё светлае, добрае, справядлівае звае адвечнае зло і нядолю, якія існуюць на зямлі, і дасць змогу жыць і развівацца на волі ўсяму жывому...

## КУПАЛЛЕ

Адвячоркам перад купальскай ноччу дзяўчаты, апрануўшыся ў чыстую, белую апратку, ішлі ў жытняе поле збіраць зелле на лекі, з імі разам ішлі і старыя бабкі-знахаркі, якія ведалі, якая зёлка ад чаго памагае, і вучылі пазнаваць гэтыя зёлкі маладых. Назбіраўшы зёлак, варочаліся дамоў: дзяўчаты адбіралі зёлкі, што на лекі, і, павязаўшы ў пучкі, вешалі пад прыклеццю, а з красак — васількоў, барвенку, мяты і іншых — плялі сабе на галаву вянкі і маілі хату.

На захадзе сонца збіраліся хлопцы і, выбраўшы перш сабе «ўрадніка» (ад стараславянскага слова «радзіць» — кіраваць, камандаваць), збіралі стары «май», якім былі прыбраны хаты на Сёмуху, атопкі і іншыя зношаныя і непатрэбныя рэчы. Тады ішлі на падворак да «ўрадніка», куды прыходзілі і дзяўчаты, прыбраныя па-святочнаму, з вянкамі на галаве, маладзіцы з закускай рознай, гаспадары з напіткамі.

Адтуль хор з дзяўчат і жанок, заспяваўшы песню, ішоў наперад, а за ім усе іншыя, хто з закускамі і прыпасамі, хто з палівам і бярозкамі зялёнымі — «маем»; гэтак ішлі ў жытнюю змену, на ўзгорак пад дрэва або пад лес, дзе размяшчаліся пад асобным дрэвам. Па дарозе рвалі быльнік і ўсе падпяразваліся ім. Прыйшоўшы, дзяўчаты распальвалі агні, хлопцы каля агнёў садзілі «май», пасля, раздзяліўшыся — асобна дзяўчаты, асобна хлопцы, скакалі цераз полымя. Найперш скакалі дзяўчаты, пасля хлопцы. Старыя гэтым часам, рассеўшыся за выпіўкай і закускай, гутарылі аб мінулых часах, аб дзівах усякіх. Моладзь вадзіла карагоды і танцы. Праз увесь час не змаўкалі музыка і песні. Пасля моладзь ішла да рэчкі, і дзяўчаты, зняўшы з галоў вянкі, пускалі на ваду. Вярталіся з песнямі назад і падкідалі агню, ды зноў ішлі танцы, музыка і песні аж да ўсходу сонца.

# НЕКАТОРЫЯ ЗВЫЧАІ І ПАВЕР'І ЗАХОДНЕРУСАЎ У ЧАС КАСЬБЫ І ЖНІВА

У канцы чэрвеня пачынаецца самая гарачая пара для сялян. Наступае час касьбы, а там і жніво. З Пятрова дня на лугах — зялёныя пакосы. Невялікі ў селяніна лужок, але тым горш, калі і гэтай невялікай колькасці сена яму не ўдасца сабраць загадзя пры спрыяльных умовах. Касьба павінна быць абавязкова закончана да Іллі («Прыйдзе Ілля — наробіць гнілля»). І што тады будзе рабіць селянін са сваёй жывёлай, калі для яе ён не нарыхтаваў на зіму пэўнага запасу. Касьба таму сур'ёзна займае думы гаспадара. Ён карыстаецца кожнай зручнай хвілінай і ўпотай і яўна заяўляе адно пакуль жаданне — даў бы бог сухое надвор'е. Звычайная песня касцоў наступная:

Касцы косяць,
Бога просяць:
— Ой, дай, божа, пагоданьку
Да на нашу работаньку.
Сена пакасіці,
Дадому звазіці.

Надвор'е — неабходная ўмова для касцоў, таму што «пасля Пятра сена, нават паднятае на куст, не сохне», тады як да Пятра яно сохла і пад кустом. Радасна і старанна працуе ў гэты час селянін, нягледзячы на цяжкі для яго час года ў матэрыяльных адносінах. У яго выйшлі амаль усе запасы старога года, а новых яшчэ ён не дачакаўся. Пры ўпартай працы ён нярэдка здавальваецца якой-небудзь травою-гардавіцай і цешыцца толькі надзеяй на будучае. У песні спяваецца:

Божа мой, да ў агародзе — гардовіца. Божа мой!*
Цяжка дзяцюкам Пятровіца.
Ідзіце, дзецеткі, гарду рваці,
Лягчэй будзе Пятра ждаці.
Ждалі Пятра — не прыждалі...

У некаторых месцах Гродзенскай губерні існуе наступны звычай. Калі з'яўляецца на луг гаспадар, які наняў касцоў, яго звязваюць вяроўкай, звітай з сена. З гэтага ганаровага палону ён павінен выкупіцца некалькімі капейкамі. Касцы пры гэтым спяваюць:

Ох, славен, славен наш гаспадар,
Ох, чым жа ён праславіўся:

---

* Прыпеў «Божа мой!» паўтараецца ў пачатку і ў канцы кожнага радка.

Ці сваім гумном,
Ці сваім дабром,
Ці сваёю жаною,
Ці сваімі дзеткамі?
Не праславіўся ён нічым,
Толькі гумном.

Як ужо адзначалася, касьба павінна быць закончана да Іллі. З гэтага часу для касьбы можа быць вельмі неспрыяльная пара, мокрая («Да Іллі ксёндз просіць дажджу, а па Іллі і баба фартухом нагоніць»; «Ілля наробіць гнілля»; «Да Іллі хоць адным зубам бараны падзяры папаравае поле»). Але, з другога боку, Ілля не можа быць не пажаданым для селяніна. У гэты час ён (селянін) ужо можа што-небудзь паесці з новых пладоў. Ёсць прымаўка: «На Ілью ў міску кашы налью» або «На Ілью перапечку налью», а «На Барыса ўжо хлеба наясіся». На Ілью селянін разлічвае, каб толькі наесціся кашы са свежага збожжа. Барыс (24 ліпеня) прыносіць ужо поўную спеласць пасевам, і селянін спадзяецца наесціся хлеба ўволю і гэтым самым узнагародзіць сябе за доўгія галодныя чаканні ў час вясны. Аднак у некаторых мясцовасцях (Нарва — Гродзенская губ., Бельскі п.) існуе і такая прымаўка: «На Івана (8 мая) — каласок, а на Пятра — піражок», г. зн. прыкладна 8 мая ў жыце з'яўляецца колас, а каля 29 чэрвеня са свежай мукі можна спячы ўжо пірог. Значыць, як і сапраўды бывае, кліматычныя ўмовы вядомай мясцовасці спрыяюць больш хуткаму выспяванню, чым у іншых месцах. Але як бы там ні было, а не паспеў яшчэ сціхнуць шум і звон кос пры касьбе сена, жнеі спяшаюцца ўжо ўторыць яму сваімі сярпамі. «Жыва, жыва,— чуецца з усіх бакоў,— бо находзіць жніва». Сапраўды, залацістыя нівы пачынаюць нахіляцца да зямлі ад паўнаты налітага коласа. Апошні «дрэмле», як бы просіць занесці яго ў гумно, пакласці яго ўбок, таму што на ніве прабіў яго час-гадзіна, а ў застаронку яму «гасціна».

Спачатку ідзе адна жняя «адкрыць», так сказаць, работу. Баяцца, каб хто-небудзь не перайшоў дарогу. Калі здарыцца гэта і ў час жніва работнік парэжа сабе руку, то няшчасце прыпісваюць прама зламыснасці таго, хто перайшоў дарогу. Пры адкрыцці жніва гаспадыня нясе кавалак хлеба, а нявестка ў першы год свайго замужжа — кавалак палатна, якім абкручвае першы зжаты сноп, прызначаны для гаспадара поля. Першы раз жняя большай часткаю жне толькі такую колькасць жыта, каб быў адзін даволі вялікі сноп. Яна бярэ яго і з ім вяртаецца дамоў, ставіць яго на покуці, а пасля вечарам гаспадар спраўляе маленькае частаванне — зажынкі. Пасля

зажынак уся сям'я, хто толькі можа, выходзіць у поле працаваць. Некаторы час працягвае кіпець двайная работа на лугах і палях. Хутка зялёныя аксамітавыя лугі і залацістыя нівы прымаюць выгляд пустынны і асірацелы. Небяспечней за ўсё для селяніна, калі на сваіх нівах ён знойдзе дзе-небудзь закруцень — дзесяткі два каласоў, звязаных разам, заломаных (закручаных) і пасохшых, ці абжатыя загоны. Нешчаслівы той гаспадар, у якога знойдзецца гэты закруцень. Сам ён не ведае, што яму рабіць. Бегае ад суседа да суседа, тужыць, гаруе і скрозь слёзы просіць параіць яму такога чалавека, які пазбавіў бы яго ад гэтага няшчасця. Трэба заўважыць, што існаванне закрутня таму гаспадару, на ніве якога ён знойдзе, прадвяшчае, на думку сялян, ці смерць, ці паморак жывёлы, ці іншую якую-небудзь бяду. Зразумела, што пры глыбока забабонным разуменні рэчаў тут ёсць аб чым прызадумацца. Некаторыя даўней звярталіся да свяшчэнніка і прасілі яго з малітваю вырваць сваімі рукамі закруцень. Ва уніяцкіх каноніках існуюць нават на гэты выпадак малітвы. Такое знішчэнне закрутня як бы гарантавала ўжо селяніна ад няшчасцяў, якія яму пагражалі. Самі сяляне ніколі не адважацца зжаць яго ці вырваць. Больш забабонныя адпраўляюцца да знахара.

Атрымаўшы ад селяніна магчыма вялікую плату, знахар з'яўляецца на «подзвіг», які павінен адбыцца. Большай часткай ён бывае страшэнны прайдоха і вопытны ў сваім рамястве. Ён разумее, што закруцень — глупства, што ад яго шкоднага нічога быць не можа для селяніна, але, каб не пазбавіцца вядомай крыніцы даходу, ён, наадварот, схіляе яшчэ сялян у забабонны погляд на рэчы. Падышоўшы да закрутня, знахар пачынае свістаць, крычаць, выкідвае рознага роду штукі, робіць незразумелыя скачкі, выкрыквае нязвязныя бессэнсоўныя словы. Усім гэтым ён быццам бы знішчае шкодныя вынікі закрутня. Пасля ён тлумачыць селяніну, якія здарыліся б з ім няшчасці, калі б ён не звярнуўся да яго за дапамогаю. У канцы ўсяго знахар бярэ асінавы кол і ім выкопвае з зямлі закруцень, прымаўляючы наступныя словы: «Няхай так таго чалавека, які зрабіў закруцень, раскідаецца гаспадарка, як я раскідаю закруцень». Пасля заканчэння справы селянін на радасцях частуе знахара, зразумела, усім лепшым і просіць яго не адказаць яму ў дапамозе і на будучае. Знахар, карыстаючыся бездапаможнасцю селяніна, пачынае падкрэсліваць яму свае клопаты аб ім, гаворыць, што ў яго (селяніна) ёсць шмат ворагаў сярод суседзяў, але яму няма чаго іх баяцца, таму што ў знахара ён заўсёды знойдзе сабе моцную засця-

рогу. Расчулены селянін зноў частуе знахара і яшчэ дае што-небудзь «на дарогу». Яны расстаюцца сардэчнымі сябрамі, а ў беднага селяніна — глядзь: на наступны год ізноў з'яўляецца закруцень, магчыма, звычайныя хітрыкі знахара — ізноў зварот да знахара. А знахару зноў гонар, ласка, плата і частаванне.

Адносна паходжання закрутня ёсць наступныя думкі: адны думаюць (Гродзенская губ.), што злыя людзі, незадаволеныя кім-небудзь са сваіх суседзяў, ідуць на іх нівы і робяць закрутні з рознага роду страшнымі пракляццямі і нядобразычлівасцю. Сяляне вераць, што калі не знішчыць закрутня ўказаным чынам, то пакладзеныя, так сказаць, на ніву заклінанні могуць спраўдзіцца. Другое тлумачэнне паходжання закрутня (Мінская губ.) — указанне на ведзьмаў. Яны быццам у Іванаў дзень ходзяць па полі і заломваюць жыта на якое-небудзь зло. Выжаўшы гэты «заломак», жняя прыносіць дамоў хваробу на цэлае лета.

Другая бяда селяніну, на яго думку, калі ў яго знойдуцца абжатыя загоны, г. зн. калі на канцах загонаў некалькі каласоў акажуцца зжатымі. Тлумачачы гэтую з'яву, сяляне гавораць, што злыя людзі, ведзьмы, калдуны ў час «красавання» жыта ноччу з сярпом адпраўляюцца голыя на ніву, абыходзяць яе кругом і з кожнага загона зжынаюць па некалькі каласоў. Зжатыя каласы яны кладуць у свае засекі. Адсюль, на думку сялян, адбываецца наступная з'ява. Калі гаспадары, нівы якіх абжаты, стануць звозіць дадому жыта, то і таму, хто абжаў, нябачныя сілы ўносяць у засекі сотую частку зерня. У сувязі з гэтым выпадкам расказваюць наступнае. Здарылася, што захварэў адзін надзвычай багаты чалавек. Ён сваё багацце сабраў тым, што займаўся абжынаннем ніў у час красавання жыта. Хвароба яго якраз здарылася ў тую пару, калі красавала жыта — адзіная прыгодная пара для абжынання. Паколькі хворы сам не мог зрабіць цяпер звычайнай сваёй справы ... а між тым не хацелася ўбачыць змяншэння свайго багацця, то ён і паслаў свайго сына абжаць нівы. Але сын не ўмеў «знахарыць» і, нягледзячы на дакладныя ўказанні свайго бацькі, не ведаючы, у чым сутнасць справы, замест ніў абжаў кусты. Калі пасля гаспадары ссеклі кусты, то засекі таго, хто абжынаў, у сілу прыцягнення напоўніліся лісцямі і галінкамі замест збожжа.

Некаторыя думаюць, што калі ў час красавання жыта асвяціць нівы свянцонаю вадой, то гэтым можна паралізаваць сілу і значэнне абжынання ніў. Калі на поле прыйдзе гаспадар у той час, як там жнуць, то жнеі, як і касцы ў час касьбы,

звязваюць яго перавяззю з саломы. Каб вызваліцца з гэтага палону, ці, як гавораць, «адкупіцца», неабходна даць некалькі капеек, на якія робіцца большай часткаю агульная выпіўка.

Жніво суправаджаецца разнастайнымі песнямі.

Заканчэнне жніва — дажынкі, як і яго пачатак — зажынкі, складае свята ў быце селяніна. У песні як бы ад жней спяваецца:

Дажалі жыта, дажнем і пшаніцу,
Тады мы прыйдзем гарэлку піці.

У некаторых месцах, калі жнуць ужо апошні загон (а напаследак пакідаюць загон самага лепшага жыта) і застаецца яшчэ толькі раз апошні і адзіны заняць сярпом, жыта, якое засталося, не зжынаюць, а прытоптваюць са спевам:

Ой, вылеці, перапёлка,
Бо ў нас жыта толька.
Як не будзеш вылятаці,
Будзеш у полі зімаваці.

Прытоптаную колькасць жыта прыціскаюць каменнямі і кладуць туды маленькі кавалак хлеба. Некалькі каласкоў з кавалачкам у сярэдзіне хлеба пакідаюць для мышэй, разлічваючы гэтым утрымаць іх ад пераходу з поля ў гумно. З нажатага жыта робяць вянок. Пры гэтым у Барысаўскім павеце Мінскай губерні спяваюць:

Канец ніўцы, канец,
Спляцём пану вянец.
Да ўжо жніва ў канца,
Ну-це, дзевачкі, да вянца!

Сплецены вянок кладуць на галаву адной з лепшых жней і з песнямі адпраўляюцца дадому. Па дарозе спяваюць:

Каціўся вяночак па полю,
Прасіўся ў жэнчыкаў дадому.
— Ідзіце, жэнчыкі, дадому,
Занясіце мяне ў стадолу,
Палажыце мяне ў старону.
Ой, то я пайду на ніву,
Ой, а мне на ніве гадвена,
Ой, а мне ў староне гасціна.
Адчыняй нам, пане, варота,
Нясем вяночак з залота.
Ой, не з золата — з крапівы,
Бо шчэ мы гарэлкі не пілі.

Сапраўды, у хаце гаспадара ў гэты час падрыхтавана бывае частаванне. Ён выходзіць насустрач жнеям, прымае ад іх віншаванні, вянок і просіць адведаць, што бог паслаў. Той, хто падае вянок, прыкладна гаворыць наступнае:

Прынеслі пану вянок
З шырокага поля,
З ядранога жыта.
Наш пан малады,
Конь вараны,
Сядло золатам вышыта,
Брыльянтамі выбіта.
Наш пан на каню
Войска б'ець,
Сваё рыцарства даказуець.
Гаварыў да служкі:
— Улажыў бы я собалі,
Але конь сваволі,
Не йдзе лукавы,
Мне собалі бракуе.
Пан свайго рыцарства не страціць,
Нам за вянок заплаціць.
Хоць чырвоны злоты —
Для нашай ахоты.
Жыту — на ўраджай,
А пану — на доўгі век.
Пану — вянок,
А нам — гарэлкі збанок.

На хатняе свята гаспадар зазывае ўсіх, хто хоць колькі-небудзь дапамагаў яму ў рабоце.

Калі пачынаюць звозіць хлеб, то першы воз вязуць у гумно праз абрус, разасланы ў варотах гумна.

Закончылася жніво. Селяніну-гаспадару лягчэй на душы, калі ў яго добры ўраджай. Папрацаваўшы да поту, ён цяпер можа наесціся ў ахвоту, узнагародзіць як бы сябе за папярэднюю працу. Гэтым не абмяжоўваецца кола работ селяніна: апошнія бясконцыя. І не паспее ён закончыць адну работу, як да яго напрошваецца ўжо некалькі новых.

## [ДАЖЫНКІ]

Пасля сканчэння жніва на Літве сплецены на полі вянок дзяўчаты ўскладаюць на галаву і прыносяць у двор, спяваючы:

Дажалі мы жыта да аблогу,
Падзякуем пану богу.
Плён прыносім, плён

Зо вшысткіх строн.
Выйдзі, пане, на ганачак,
Прымі жыта вяночак.
Дай, божа, у здароўі спажывалі,
А за год жаць дачакалі.
Не жалуй, пане, сівога дрыганта,
А пашлі па музыканта.

На Палессі ж так спяваюць:

Дубова мяцёлачка ўсё поле памяла
І ўсё жыта пажала.
Судзі, божа, паном, у здароўі спажываты,
А нам жа ж зарок дачакаты.

## АБРАДЫ СЯЛЯН ВІЦЕБСКАЙ І МІНСКАЙ ГУБЕРНЯЎ ПРЫ ЎБОРЦЫ ХЛЕБА З ПАЛЁЎ

Уборка хлеба з палёў складае на Беларусі адну з найважнейшых падзей.

...Пры ўборцы хлеба з палёў захоўваюцца наступныя абрады: 1) пакрыванне поля, 2) зажынкі і 3) дажынкі.

Першы і другі абрады звычайна здзяйсняюцца пры пачатку жніва ў кожнага селяніна, багатага і беднага, таму што не звязаны з вялікімі выдаткамі; трэці — пры канчатковай уборцы з поля жыта (а ў некаторых гэты ж абрад святкуецца пасля поўнай уборкі ўсяго хлеба з поля) і спраўляецца толькі ў багатых сялян і пераважна на панскім двары, таму што такі абрад патрабуе немалых расходаў для пачастунку значнай колькасці жней.

**Пакрыванне поля.** У Беларусі жыта звычайна даспявае ў пачатку месяца ліпеня, і кожны селянін імкнецца як мага хутчэй пачаць жніво, каб жыта не пераспела. Пачынаюць жаць нават крыху зеленаватае жыта, думаючы, што з такога бялейшая бывае мука; няхай лепей, кажуць, жыта даспее ў снапах, чым пераспее ў каласах. Жнуць звычайна жанчыны і дзяўчаты (а не мужчыны, як бывае ў велікарускіх губернях), а таму і ў жніўных абрадах удзельнічаюць выключна яны адны; нават пры частаванні вечарам амаль не бывае мужчын.

Раніцай, да ўсходу сонца, адпраўляецца на поле маладзіца, пераважна нядаўняя замужніца, і ў прысутнасці некалькіх дзяўчат нажынае невялікі снапок жыта і, абвіўшы яго намёткаю або проста ручнікам і нават кавалкам новага палатна, падкідае ўверх, прыгаворваючы:

Пакрыла ніўку
На добрую спажыўку;
Парадзі, божа,
Наша збожжа!..

Затым дзяўчаты спяваюць, пляскаючы ў далоні і кружачыся:

Пашлі, божа, многа збожжа!
Нарадзі хлеба пры дарозе:
Штоб было ўсім гожа
І не пуста на кожным возе.
Крыта, крыта!
Поўна, сыта!
Божа, памажы,
Хлеба ўрадзі!..

Потым маладзіца і дзяўчаты адпраўляюцца дамоў, г. зн. да таго селяніна, чыё поле пакрывалі. Пры ўваходзе ў хату ўсе разам спяваюць:

Крыта, крыта!
Поўна, сыта!
Божа, памажы,
Хлеба ўрадзі!

Маладзіца падае снапок гаспадыні, якая дарыць яе грашыма і палатнінай; потым разам з дзяўчатамі падыходзіць да гаспадара з паклонам. Гаспадар частуе іх гарэлкаю і запрашае на дажынкі. Тым і заканчваецца пакрыванне поля.

Пакрыванне поля робіцца амаль у кожнага селяніна Віцебскай і Мінскай губерняў; думаюць, што ў выпадку нездзяйснення гэтага абраду ўборка хлеба будзе няўдалая.

**Зажынкі.** Праз два дні пасля пакрывання поля ідуць зажынкі. Вечарам, на захад сонца, гаспадарова дачка разам з сяброўкамі адпраўляецца на поле. Выходзячы з дому, яны спяваюць:

Выпраўляюцца малажайкі
На спраўленне зажынак,
Паглядзець на дабро гаспадаркі
Да прыняць поўны жыта абірак...
Да гатоў жа, гатоў, гаспадыня,
Сустрэчанне ім шчырае,
Рашчыняй, калі ёсць, скрыня
Да бяры нясі мёд з вырая...

Гаспадыня ім дае яечню, сыр і гарэлку, з чым дзяўчаты і адпраўляюцца на поле *. Прыйшоўшы на месца жніва і падсілка-

* Чаго не з'ядуць і не вып'юць, тое закопваюць на тым месцы, дзе зжата жыта для снапка.

ваўшыся, дзяўчаты зразаюць па каласку і звязваюць невялічкі снапок, які вядомы пад назвай гаспадара-снапка; потым акрапляюць яго гарэлкаю і з ім адпраўляюцца ў гаспадарову хату, прыпяваючы:

Галубок-снапок
Нажалі малажайкі
Да іх белыя ручайкі.
Месяц месячыку!
Свяці ж нам дарожачку:
Што б мы не зблудзілі,
Снапочка не згубілі,
Бо наш снапок красны,
Як месячык ясны,
Яшчэ высшы ад плота,
Яшчэ дарожшы ад злота,
Яшчэ высшы ад гары,
Ясней ад зары.

Увайшоўшы ў хату, гаспадарова дачка з паклонам падносіць бацьку снапок-гаспадарок. Гаспадар, падкінуўшы ўверх снапок, ставіць яго на покуці пад абразамі; пад снапок кладзе чатыры медныя манеты і кланяецца.

Паставіўшы гаспадар-снапок, гаспадар частуе дзяўчат гарэлкаю, а гаспадыня дорыць іх пшанічнымі булачкамі; дзяўчаты спяваюць:

Слаўся, гаспадарку, слаўся,
Што малажаек не стыжаўся,
Як яны не стыжалі,
Ніўку тваю зажыналі...

Затым дзяўчаты разыходзяцца. Пры развітанні гаспадар з гаспадыняй запрашаюць іх на дажынкі. Зажыначны снапок захоўваецца «на куце», пад абразамі, да Прачыстай; напярэдадні яе снапок абмалочваюць і зерне прыносяць у царкву для свянцання; гэтым жа зернем засяваюць свежаўзаранае для азімага хлеба поле — некаторыя на Прачыстую, а іншыя на другі ці на трэці дзень пасля свянцання; пры засеўках звоняць манетамі, якія былі пакладзены пад снапком...

**Дажынкі.** Дажынкі бываюць розныя: багатыя і небагатыя. Для лепшага ўяўлення пра гэты абрад апішам дажынкі заможнага селяніна, якія адрозніваюцца ад панскіх дажынак тым, што пры першых захоўваецца больш народнасці і прастаты, чым пры другіх. Дажынкі ў сялян маюць аблічча старажытнаславянскага быту і знакаміты свабоднай нязмушанасцю жыцця...

Звычайна ў той дзень, калі назначаецца канчатковая ўборка жыта, збіраюцца на полі пэўнага селяніна (па запрашэнні яго дачкі ці жонкі напярэдадні дажынак) мноства жней, большай часткай бясплатна пажаць, адзіна радзі таго, каб павесяліцца ў гасціннага гаспадара. Колькасць жней залежыць ад гаспадаровай гасціннасці або прыхільнасці да яго суседзяў. Некаторыя жнеі прыходзяць нават незапрошанымі і з другіх вёсак... Гаспадар вельмі рады такім жнеям і іх старанне цэніць больш за гатоўнасць запрошаных работніц. На дажынкі збіраюцца большай часткай бясплатна; платных жа жней збіраюць у такіх выпадках, калі ў адзін і той жа дзень назначаюцца дажынкі ў некалькіх гаспадароў, а між тым чаму-небудзь пэўнаму гаспадару трэба неадкладна скончыць уборку жыта ў гэты самы дзень.

Збіраюцца на поле, як толькі рассвітае, і, калі жней шмат у параўнанні з невялікім участкам пасеянага жыта, жнуць паволі, не спяшаючыся; калі ж жней мала, жнуць як мага хутчэй, каб дажаць усё жыта.

Старшая між жнеямі размяркоўвае месца, каму дзе жаць, усе падпарадкоўваюцца і ахвотна выконваюць яе распараджэнні... Старшую называюць пачынальніцай, а астатніх — памагальніцамі.

Прыступаючы да жніва, пачынальніца запявае:

Наша ніўка залатая,
Нашы сярпы вострыя,
Наш пан гаспадар налягае,
Што б мы не былі чорствыя...

Памагальніцы працягваюць:

— Ой, чыё ж то поле
Зажаўцелае стаіць?
— Янукова поле
Зажаўцелае стаіць!
Жнейкі маладыя,
Сярпы залатыя...
Да зялён бор, зялёны
Над усімі барамі,
Да славен наш гаспадар
Над усімі гаспадарамі.
У нашага гаспадара
Куна на дварэ іграе,
Сабаля вызывае:
— Саболю, саболю!
Пагуляем з табою.
Развесялім свайго гаспадара
І гаспадыню маладую,
І чалядку вясёлую.

Калі ж жнуць на панскім полі, спяваюць наступную песню:

Золата маё, золата
На таку малочана,
На стале насыпана.
Хто золата палічыць,
Той на чужу старану не паедзець...
Да наш пан маладзенькі
На чужынку не паедзець,
Пашлець служку маладога
І каня варанога.
Конік будзе гарцаваці,
Служка паганяці.
Наш пан маладзенькі,
Пад ім конь вараненькі,
Выехаў на ніўку
У шчаслівую гадзінку,
Стаў жнеек лічыць,
Стаў бога хваліць:
— Слава табе, божа,
Маё жыта будзе ў стозе.

Песні складаюць галоўную асаблівасць дажынак. Ні адзін абрад не багаты так песнямі, як абрад дажынак. І ўсе гэтыя песні больш або менш маюць адносіны да той нагоды, з якой іх спяваюць.

Дык вось праз некаторы час (не больш двух гадзін), нажаўшы па дзесятку снапоў, жнеі спяваюць наступную песню, у якой гаворыцца, што яны ўжо сто коп нажалі:

Добрая ніўка была,
Сто коп жыта зрадзіла
І яшчэ хваліцца,
Што на капу калоссе валіцца...
Запрагайце волы,
Паедзем да дубровы
Хвойкі выцінаць,
Копкі падпіраць.

Калі настае час полудня (10 ці 11 гадзін раніцы), гаспадары прыносяць усякай ежы і піцця: на гэты раз нічога не шкадуюць...

Полудзень цягнецца гадзіны дзве: вясёлая шумная гаворка, звонкі рогат, песні, жарты, плясканне ў далоні не змаўкаюць на працягу ўсяго полудня. Полудневыя, або, так сказаць, застольныя, песні не маюць асобага значэння. Прыводзім адну для ўзору:

Ой, паслала мяне маці
Спелае жыта жаці,

Ой, нуце, жнейкі,
Не будзьце санейкі!
Ой, я жытка не жала,
У баразёнцы ляжала,
Ой, нуце...
Наехалі чужы жнейкі,
Нашлі мяне ў баразейке,
Ой, нуце...
Зажурылася Кацярына,
Што не зжата жыціна,
Ой, нуце...
Праз твае русы валосы
Выкасілі ўсе пакосы,
Ой, нуце...
Цераз твае чорны бровы
Выкасілі ўсе дубровы,
Цераз твае белы рукі
Выкасілі ўсе прылукі
І жыціну выжалі,
І Кацярыну палюбілі.
Ой, нуце, жнейкі,
Не будзьце санейкі,
Не рана пачалі,
Трэба, што б багата уцялі...

Пасля абеду бяруцца зноў жаць і зноў з песнямі. Гадзіны цераз тры па полудні гаспадары прывозяць падвячорак з халоднай стравы і закускі. Як пры абедзе, так і ў час падвячорка гаспадары частуюць жней гарэлкаю.

Пад вечар жнеі дружна бяруцца за працу і, падганяючы адна другую рознымі прыказкамі і прымаўкамі, спяваюць песню:

Ой, мілы божа
Нам дапаможа?
Ці не выжнем?
Сонейка нізка,
Вячэрайка блізка,
Ай, не выжнем!
Пташкі злятайце,
Снапочкі знашайце,
Ай, мілы божа
Нам дапаможа?
Ці не зносім?
Саколікі злятайце,
Копачкі складайце,
Ой, мілы божа
Нам дапаможа?
Зязюлейка кукуе,
Копачкі рахуе,
Не злічыць!
Ой, мілы божа
Нам дапаможа?

Сонейка нізка,
Вячэрайка блізка,
Не злічыць!..

Нарэшце, калі дажынаюць ужо апошні загон, кожная са жней адкладае па каласку для аднаго агульнага снапа, так званага дажыначнага. Сабраўшы такім чынам дастатковую колькасць каласоў і звязаўшы дажыначны сноп, жнеі дзеляцца на дзве палавіны: старыя і замужнія жанчыны зносяць і складаюць у копы снапы, а дзяўчаты, сабраўшыся ў кружок, доўга раяцца, каго выбраць багіняю (талакою). Выбраўшы ў багіні прыгожую сяброўку, жнеі-дзяўчаты дажынаюць пакінутую лапінку жыта і з гэтага сплятаюць вялікі вянок і аздабляюць яго рознымі кветкамі і стужкамі.

Старыя жнеі спяваюць:

У нас сягоння вайна была,
Усё поле зваявалі.
Змялі поле мяцёлкамі,
Ідзём дамоў вясёлкамі.
Ніўка, ніўка, ніўка,
Аддай нашу сілку.
Мы свайму гаспадару
Да зрабілі славу:
Жытачка нажалі,
У снапы павязалі,
У копы паскладалі.
Мы свайму гаспадару
Да зрабілі славу.
Ой, гаспадарачку наш!
Дажыначкаў час!..

У гэты самы час дзяўчаты-жнеі, дажынаючы жыта для вянка, спяваюць:

Канец ніўцы, канец!
Упляцём гаспадару вянец,
Да ўжо жніво ў канца,
Нуце, дзевачкі, да вянца!
Кружыліся, кружыліся,
Ужо мы жытка дажаліся,
Дажаліся дзевачкі
Да яснага сонейка.

Звіўшы вянок, дзяўчаты ўскладаюць яго на галаву «багіні», а ў рукі даюць дажыначны сноп, пакрыты доўгім белым пакрывалам. Потым дзяўчаты абкружаюць яе ланцужком і скачуць, прыпяваючы:

Кружком, дзевачкі, кружком,
К гаспадару з паклонам.
Не самі мы ідзём,
Мы вяночак нясём.
У нашай гаспадыні
Поўна хлеба ў адрыні,
Трэба пакланіцца,
Штоб к ёй дабыцца.

У гэты час да дзяўчат далучаюцца старыя і замужнія жнеі, і, узначаленыя «багіняю», усе разам адпраўляюцца да гаспадаровай хаты. Пры гэтым спяваюць:

Да гудзець поле, гудзець,
Багіня з поля ідзець.
Гаспадарку, не ўлякайся,
У святлічку не схавайся.
Выкаці бочку піва,
А другую гарэлкі...
Мы жнейкі не жаўнеркі,
Не пап'ём усёй гарэлкі.
Наша гаспадыня міла
Дасць нам белага сыра.
Сіва пава лятала,
Крыламі двор мятала,
Спадзявалася вянца
Да свайго гумянца!

Песні не моўкнуць усю дарогу. Праходзячы праз вёску, жнеі-дзяўчаты прытанцоўваюць, старыя пяюць:

Будзь сяло весяло,
Бо мы вянок несямо
З добрага жыта,
Вельмі красавіта...

Потым усе разам спяваюць:

Адчыняй, гаспадару, свой двор,
Бо вядзём увесь жніўны збор.
Ай, нажалі, навязалі копачак,
Як на небе зёздачак...
Спраў жа нам, гаспадару, дажынкі,
Бо мы страцілі для цябе свае сілкі.
Адчыні нам хатку,
Упусці багіню-матку.
Забі нам, гаспадару, барана,
Забі нам вялікага быка,
Забі нам свае гускі,
Не пажалуй цялушкі!..
Не крыйся ж, гаспадару, перад намі,

Бо мы відзім цябе вакнамі.
Выйдзі да нас,
Выкупі вянок у нас!..

Гаспадар і гаспадыня, пачуўшы песні жней, выходзяць з хаты і сустракаюць іх на дварэ хлебам-соллю. «Багіня» выступае наперад і, пакланіўшыся гаспадару, кладзе ля ног яго дажыначны сноп, які гаспадыня акрапляе «святой» вадою, а вянок перадаюць яму ў рукі, прыгаворваючы:

— Паздароў, божа, гаспадару! Прынятлі табе вянок з шырокага поля, з ядронага жыта. Гаспадар свайго гаспадарства не страціць, нам за вянок заплаціць, хоць чырвоныя боты для нашай ахвоты — жыту на ўраджай, гаспадару на доўгі век. Гаспадару вянок, а нам гарэлкі збанок!

Гаспадар бярэ вянок з паклонам «багіні», а гаспадыня дорыць ёй грошы і боты...

У той час, як «багіня» вітае гаспадароў, усе жнеі пяюць:

Прынеслі вам плён
За ўсіх чатырох старон,
Прынеслі вам збор
З-пад зялёных гор,
І з гары, з-пад гары
На гаспадарскія двары,
З падвароў да каморы
На ўсялякія зборы...

З'яўляецца музыка, і гаспадары пры гуках хатняга аркестра і прытанцоўванні дзяўчат вядуць «багіню» ў хату. Вянок і дажыначны сноп нясе якая-небудзь дзяўчына. Увайшоўшы ў хату, гаспадары ставяць дажыначны сноп на покуці, пад абразамі, разам з зажыначным, дзе ён стаіць часам цэлы год, а вянок вешаюць на абразы. Затым садзяць «багіню» на першым месцы, побач з ёю садзяцца гаспадар і іншыя жнеі. Гаспадыня кланяецца «багіні». «Багіня», не кранаючыся з месца, гаворыць:

Гаспадынечка, нут-ка!
Звівайся нам хутка,
Так як мы звіваліся,
Каля ніўкі напажываліся!..

Жнеі тут жа спяваюць:

Гаспадыньцы сорам,
Што сядзяць так жнейкі за столам.
Сілы ўсе яны растраслі,

Шыпкі на руках нараслі.
Трэба нам гарэлкі,
Штоб разагнуць касцелкі...
Дайце ж нам гарэлкі
З новай барэлкі!..
Казала нам ніўка,
Ёсць у каморы гарэлка,
У каморы на паліцы,
У малёванай шкляніцы...

Пасля такой просьбы «багіні» і жней гаспадыня прыносіць у вядры гарэлку, і гаспадар частуе ёю работніц. Першая чарка прапануецца «багіні», затым падаюць гарачыя стравы.

У час пачастунку музыка, седзячы воддаль, іграе розныя п'есы сваёй кампазіцыі...

Час ад часу ў прамежках змены страў некаторыя ахвотніцы спяваюць, але прыпевы не што іншае, як урыўкі або нават некалькі слоў з цэлых песень.

Пасля вячэры старыя застаюцца ў хаце разам з гаспадаром і гаспадыняй, а дзяўчаты і маладзіцы разам з дачкою і іншымі гаспадаровымі родзічамі выходзяць на двор, дзе, упрасіўшы музыку іграць, пачынаюць скакаць народныя мясцовыя танцы. І танцамі і музыкай распараджаецца «багіня»: музыка не адважваецца адказаць ёй ні ў якай просьбе. Любімыя танцы падчас дажынак розныя, але часцей іншых паўтараюцца «Талакуха», «Журавель», «Мяцеліца» і «Скакуха». Усе яны больш-менш падобныя адзін на другі. Адна «Талакуха» некалькі адрозніваецца ад іншых танцаў. Асаблівасць яе ў тым, што спачатку наперадзе ўсіх кружыцца «багіня», а іншыя дзяўчаты, стоячы паўкругам, топаюць нагамі і падскокваюць, не сыходзячы са свайго месца і размахваючы хусткамі. Потым усе дзяўчаты даганяюць «багіню» і, абкружыўшы яе, кланяюцца ёй, а яна, седзячы на зямлі, спявае:

Да іграла сонейка,
Небагата іграла,
У хмарку схавалася,
Дажджу баялася...
Камарочкі вы мае,
Не кусайце вы мяне,
А кусайце вы жнеек,
Што мне ўстаць неяк...

Пасля гэтага дзяўчаты ўсе разам садзяцца ля «багіні»...

Між тым гаспадыня не забывае дзяўчат і час ад часу выносіць ім гарэлку і закускі. Знамянальна, што пры падобных абрадах ніколі не бывае п'янства. П'юць няшмат для весялосці, але ніколі для таго, каб зваліцца з ног.

Танцы цягнуцца да позняй ночы. «Багіня» першая напамінае жнеям, што пара ісці дамоў, і вось уся грамада старых і маладых пачынае развітвацца з гаспадарамі. На развітанне гаспадар і гаспадыня яшчэ раз частуюць усіх жней гарэлкай, закускамі і дзякуюць за аказаную ім паслугу, просячы не адмовіць у дапамозе і ў наступнае лета. Жнеі дзякуюць гаспадарам за пачастунак, прычым «багіня», звяртаючыся да гаспадара, кажа:

Дай божа табе, нябожа,
Абсяваць, насяваць,
А нам жаць, дажынаць!

Тут гаспадар накідае на галаву «багіні» пакрывала з дажыначнага снапа і адорвае яе пшанічным хлебам.

Грамада жней разыходзіцца па хатах з песнямі і ў суправаджэнні музыкі... Нягледзячы на тое што музыка замучаны дарэшты, «багіня» ўсё ж патрабуе, каб ён праводзіў яе да самай хаты разам з іншымі дзяўчатамі-жнеямі. Нярэдка здараецца, што жнеі вяртаюцца дамоў на світанні і праз гадзіну адпраўляюцца на панскую або на сваю работу.

## ЖНІЎНЫЯ АБРАДЫ

**Зажынкі.** Жніво пачынаецца з жыта таму, што яно раней за іншую збажыну даспявае. Таму на яго долю пераважна і прыпадае больш абрадаў, пачынаючы з зажынак. Падобныя ў цэлым сярод рускага насельніцтва (Шэйн, паводле афіцыйнай тэрміналогіі, так называў і беларусаў.— *А. Л.*) Паўночна-Заходняга краю, гэтыя абрады адрозніваюцца па мясцовасцях некаторымі падрабязнасцямі, якія выразна сведчаць аб старажытнасці іх паходжання.

...У Гарадоцкім павеце Віцебскай губерні перад пачаткам жніва гаспадар кладзе на стол буханку хлеба, зверху якога ставіць салонку з соллю і, накрыўшы ўсё гэта чыстым абрусам, акрапляе свянцонай вадой. У такім выглядзе хлеб-соль застаецца на стале ўвесь першы дзень зажынак, на працягу якога неаднаразова паўтараюцца выпіўкі і танцы.

У Гродзенскай губерні зажынкі паўсюдна робяцца ў аўторак або чацвер, але найчасцей у суботу пад вечар, да захаду сонца.

Адпраўляючыся на зажынкі, гаспадыня бярэ акрамя простага аржанога хлеба і цэлы, знарок на гэты выпадак падрыхтаваны сыр і, прыйшоўшы на ніву, кладзе ўсё гэта на край

загона, дзе збіраецца зрабіць зажын. Першую жменю зжатага жыта яна кладзе асобна, а зверху яе — прынесеныя сыр і хлеб. Затым, нажаўшы снапоў з дзесяць, гаспадыня вяртаецца дамоў, распяваючы песні ўсю дарогу. Хлеб і сыр яна прыносіць з сабой назад некранутымі і кладзе іх на стол, дзе яны толькі перад вячэрай з'ядаюцца сям'ёй. Першы ж сноп нажатага жыта, перавязаны чырвонай ніткай, гаспадыня ставіць на покуць, за абразы, дзе ён і застаецца да будучага года.

У Бельскім павеце Смаленскай губерні да жніва жыта прыступаюць так. Гаспадыня адпраўляецца на зажын адна або ў суправаджэнні сваіх нявестак. Бярэ з сабой некалькі яек, невялікі кавалак хлеба з соллю і сала. Прыступаючы да зажыну першага снапа, прыгаворвае: «Стань, мой сноп, на тысячу коп», а затым гаспадыня, зрэзаўшы некалькі каласоў, звязвае іх у пучок і адносіць яго дамоў. Там яна кладзе яго пад абразы, дзе ён ляжыць аж да малацьбы. Калі ж пачнуць малаціць першы пасад жыта, то яго бяруць і кладуць сушыць у ёўню разам з іншымі снапамі.

У некаторых мясцовасцях Гродзенскага павета жыта зажынае абавязкова мужчына, каб, як там кажуць сяляне, лета не было гнілое. Першы сноп зжатага жыта таксама прыносяць у хату, ставяць на покуці і накрываюць ручніком. У гэты дзень рыхтуюць святочную вячэру.

**Дажынкі,** або **абжынкі.** У агульных рысах дажынкі, як і іншыя жніўныя абрады, адбываюцца амаль аднолькавым чынам на ўсёй Беларусі, адрозніваючыся толькі некаторымі, больш ці менш цікавымі асаблівасцямі па мясцовасцях.

а) Так, напрыклад, у Віцебскай губерні і павеце, заканчваючы жытняе жніво, адна частка жней, зрэзаўшы жменю жытніх сцяблін з каласамі, пачынае звіваць з іх вянок; у той жа час другая частка, аддзяліўшыся ад іх, садзіцца на зямлю і спявае адпаведную нагодзе песню. Першая з пявунняў садзіцца на кукішкі перад знарок пакінутым на полі кустом аржаных сцяблін з каласамі і, працягваючы пець з астатнімі, поліць, г. зн. вырывае траву, якая засталася ў недажатым кусце жыта. Гэта работа працягваецца і канчаецца адначасова з падрыхтоўкай вянка. Калі ўсё гатова, палольніца вырывае адну сцябліну і ёй звязвае ў пучок увесь куст ля самых каласоў, што і завецца «барадой», а ў сярэдзіну ачышчанага ад травы куста кладзе акраец аржанога хлеба з соллю. Усё гэта дзеянне называецца «завіваць бараду».

Закончыўшы сваю работу, усе ўстаюць, і жняя-завадатар, менавіта тая, што палола куст і «завівала бараду», бярэ вянок з рук тых, хто яго плёў, і кладзе сабе на галаву. Жнеі, узна-

чаленыя ёю, адпраўляюцца павольным крокам у хату гаспадара і дарогаю спяваюць доўгую песню. Калі на шляху ім трапіцца свойскі чалавек, то зачынальніца здымае з галавы вянок і адзяе яго на галаву свойскага сустрэчнага чалавека. У той жа час усе жнеі наўкол «палонніка» працягваюць спяваць да таго часу, пакуль ён не дасць ім выкупу, які складаецца звычайна з грошай або якой-небудзь рэчы. Толькі ў такім выпадку вянок здымаюць з яго галавы, і ён атрымлівае свабоду.

Падышоўшы да хаты, жнеі спыняюцца і заканчваюць песню. Да іх тады падыходзіць гаспадар і просіць у хату. Скончыўшы песню, зачынальніца здымае вянок са сваёй галавы і надзявае яго на гаспадарову галаву. У суправаджэнні гаспадара жнеі заходзяць у хату. Гаспадыня сустракае іх у сенях, трымаючы ў руках гарэлку, хлеб, соль і сыр, якімі яна тут жа іх частуе. У выпадку калі гатова вячэра, то адразу садзяцца за стол, і не толькі жнеі, але ўсе, нават людзі староннія, няпрошаныя, але ўцягнутыя адной пустой цікавасцю.

На дажынках (у Лепельскім п. Віцебскай губ.) пякуць бліны і да іх падаюць жнеям масла, мёд і сыту. Акрамя таго, гатуюць вельмі густую кашу для таго, каб і пасевы на лета былі такія ж густыя, як яна. Таксама смажаць або вараць парася, пякуць яечню і шчодра частуюць гарэлкаю.

б) У Мінскай губерні і павеце, калі гаспадар збіраецца святкаваць дажынкі або дажынаць хлеб, напярэдадні таго дня сам асабіста ідзе да сваіх суседзяў і просіць у іх на другі дзень колькі трэба жней, гледзячы колькі застаецца недажатага хлеба. Яму абяцаюць, і ён ідзе гатаваць на заўтрашні дзень частаванне для гасцей. У назначаны тэрмін прыходзяць да яго запрошаныя абедаць, а пасля абеду, а поўдні, ідуць у поле дажынаць. Гаспадар ідзе таксама на палетак і гатуе там полудзень і гарэлку. Пачастунак залежыць ад заможнасці селяніна. Калі на полі застаецца ўжо зусім мала жыта, то ўсе запрошаныя пачынаюць ірваць з гэтай рэшткі жыта траву. Гэта завецца «рваць бараду». Пры гэтым заклікаюць на дапамогу чараўнікоў, мядзведзяў, лісіц і іншых жывёл. Самі ж аржаныя каласы рве адна, выбраная ўжо загадзя для гэтага дзяўчына (замужняя жанчына або ўдава не можа рваць гэтыя каласы). Вырваўшы калоссе з зямлі, дзяўчына дзеліць яго на дзве часткі і кладзе іх накрыж адна з другой на зямлю. На гэтым крыжы ўсярэдзіне, па баках і па канцах кладуць хлеб. Пасля гэтага ўсе разам вяжуць вялікі сноп, які завецца «баба». З края бяруць каласы і плятуць аржаны вянок. Выбраная дзяўчына сядзіць у гэты час на «бабе». Калі сплятуць вянок, то маладзейшыя дзяўчаты здымаюць абранніцу з «бабы», надзяюць ёй

на галаву вянок і ідуць у вёску... Як толькі выйдуць з поля на дарогу, у той жа час пачынаюць пець «Засцілай, пані, сталы, лавы...»

в) У Бельскім павеце Смаленскай губерні апошні сноп абвязваюць хусткаю і адзяваюць на яго кашулю, называючы яго «бабай». Поле жнеі не дажынаюць да канца, а пакідаюць у ім нязжатую невялікую лапінку, называючы яе «барадою» таго гаспадара, у якога працавалі. Усе жнеі садзяцца наўкол «барады», паставіўшы перад сабою «бабу», і снедаюць прынесенымі запасамі ежы. Затым усе з песнямі адпраўляюцца дахаты, у двор гаспадара поля. Наперадзе ідзе адна, выбраная, з «бабаю» ў руках. Пачуўшы іх галасы, гаспадыня выходзіць да іх насустрач і запрашае ў хату. Там яны ставяць «бабу» на покуці, пад абразамі, і прымаюцца за прапанаваную ім вячэру; п'юць за здароўе гаспадара, гаспадыні, іх дзетак, жней і закусваюць блінамі, якіх яшчэ з вечара напякла для гэтага свята гасцінная гаспадыня. Па заканчэнні вячэры «бабу» адносяць у гумно і потым гуляюць усю ноч.

г) У Гродзенскай губерні паўсюдна жытнія сцябліны, што прызначаны для апошняга снапа, таксама не звязваюцца да таго часу, пакуль гаспадыня пры песнях жней не заўе так званай «барады», для чаго і пакідаюцца знарок недажатымі крыху сцяблін, у прамежках якіх старанна выполваецца трава і кладзецца невялікая луста хлеба з соллю. Затым гаспадыня перавязвае сцябліны чырвонай ніткаю і падразае сярпом пры самым карэнні, пасля чаго яна, трымаючы пучок жыта ў левай руцэ, правай кідае серп уверх і крыху ўбок і кладзе гэты пучок у сярэдзіну нязвязанага снапа, які цяпер і звязваецца ў двух месцах: зверху, ніжэй каласоў, і знізу, у звычайным месцы. Гэты сноп не прывозіцца возам разам з іншымі, а забіраецца з поля выбранай жняёй, хоць не заўсёды ў самы дзень дажынак. У гумне яму адводзіцца ганаровае месца. Напярэдадні ж Спаса (6 жніўня) гэты сноп абіваюць, а на самога Спаса свенцяць, і тады яго зерні скарыстоўваюць для засеўкаў.

У Лашанскай воласці той жа губерні і павета, калі дажынаюць жыта, таксама ў канцы поля, пры мяжы, пакідаюць невялічкую лапінку нязжатага і кажуць: «Трэба пакінуці звяром, бо калі не было на свеце гэтым жыта, то звяры пачалі прасіць бога чаго есці, а бог ім кінуў жменьку жыта, штоб яны памялі, і адгэтуль расплядзіўся хлеб». Затым робяць вянок з каласоў, палявых кветак, прыносяць яго дамоў і ставяць на покуці.

Калі дажынкі бываюць у пана, то хоць вянок робяць таксама з жыта, але пры перанясенні яго захоўваецца асобая

цырымонія: яго надзяваюць на галаву самай прыгожай дзяўчыне, і ўзначаленыя ёю астатнія жнеі адпраўляюцца ў панскі двор, спяваючы ўсю дарогу прымеркаваныя да гэтага выпадку песні. Калі жнеі падыходзяць да панскай сядзібы, то пан або пані ці абое разам выходзяць да іх насустрач, бяруць вянок з галавы дзяўчыны і хто-небудзь з іх надзяе на галаву сабе. У гэты час хто-небудзь з дворні раптам вылівае цэлае вядро халоднай вады на галаву дзяўчыны, што несла вянок. Пан дарыць яе грашыма, а часам звыш таго і хусткай.

## ЗАЖЫНКІ І АБЖЫНКІ

Прыйшла прыпарніца, і з раніцы да вечара вясковы люд потам абліваецца, не ведае стомы, рук не складае. Скрыпіць воз, звініць каса, іржуць коні, брэшуць сабакі, нясуцца песні, пануканне коней не змаўкае. Здаецца, людзі зусім забылі пра свае хаткі, хлявы, свірны — усё апусцела...

Жанчыны з вёскі Перунова сабралі таганы, павесілі калыскі на плечы і пайшлі на ніўкі — доўгія палоскі... Перш чым за справу брацца, трэба ж спачатку ў бога благаславіцца. І ў вёсцы Перунова гаспадыня Зося Змітрачыха стала рыхтавацца да зажынак. Нельга ж наваліцца на ніву нахрапам, як гэта робіцца ў паноў і шляхты. Таму бог і гневаецца на людзей, што яны забылі старасвецкія ўстаноўкі, таму і карае дажджаміўтопамі, градам, навальніцамі.

Зося становіцца на покуці і шэпча малітвы. Спачатку найсвенчай матцы, пасля Міколу з Юр'ем і, нарэшце, Спасу з Пакровам. Яна хутка шэпча, баючыся, каб не збіцца і не пачынаць дарэмна спачатку. Потым кланяецца, уздыхае. І, падняўшыся з каленяў, Зося лезе ў вугал, здымае ікону, укручвае яе ў велікодны абрус. Цяпер застаецца дастаць скавароднік з печы і ўзяць акраец хлеба з соллю: сустрэць, прывітаць ніўку, як сустракаюць добрага чалавека. Гаспадыня спяшаецца, абувае чаравікі, якія ляжалі ў куфры і толькі па вялікіх святах даставаліся.

Спяшаецца Зося на ніву з іконай, з хлебам-соллю і з грамнічнай свечкай. Прывіталася з ніўкай, перахрысцілася і аджала тры жмені. Гэтыя жмені яна перавязала ў маленькі снапок і будзе захоўваць за абразамі на покуці, каб зберагчы хатку ад усялякага ліха. А хлеб і скавароднік Зося захоўвае да вячэры, каб сям'я паспытала зажатага хлеба і сказала: «Дай, божа, у гэтым годзе хлябец сабраць і другога года дачакаць». А як выйшла Зося зажын зажынаць, то і іншыя вясковыя гаспадыні

паспяшаліся на ніву: нельга ж адставаць. Адстанеш — не паспееш разам з усімі зжаць, а вяскоўцы жывёлу пагоняць, палоску, што засталася, патопчуць. Вось глядзіце: пачынаючы ад закутнай канавы, у пачатку кожнай палоскі стаяць жанчыны і робяць такія ж зажынкі, што і Зося, а затым памалу вяртаюцца дамоў з пучкамі жыта ў руках.

Як зажынкі, так і абжынкі — справа чыста жаночая. Мужчыны тут не завадайлы. Іх справа — талокі склікаць, каля зямлі хадзіць. У жніве выяўляецца здольнасць і кемлівасць жанчыны. Хто з сярпом зможа далей адысціся ад саперніц, тая хутчэй і замуж выйдзе. Вось хоць бы перуноўскіх дзяўчат узяць: Малання і Сазонава пляменніца ва ўсіх стаяць на віду. Жаніхоў ім не шукаць. Вядома, якія іх рукі ў жніўнай працы.

Мужчыны ведаюць цану жаночай працы ў гэты час. А таму шануюць сваіх жанчын, хваляць іх, і часцяком можна сустрэць гаспадара, які нясе ваду з калодзежа ці які выбірае бульбу, хоць гэта і лічылася жаночай працай.

Час жніва і цяжкі, і вясёлы. Надта цяжка, у каго дзеці малыя. Трэба забіраць іх з сабою на ніву, ставіць для іх таган, закалыхваць і спяшацца да жанчын, а то спознішся і застанешся ў «хвасце». Свякроў патачкі не дасць. Паглядзіце і прыслухайцеся, як сварыцца Зося на сваю нявестку Кацярыну.

— Што ж ты зноў каля мальца возішся,— крычыць яна на нявестку.— Засне, калі захоча...

А хлопчык паўгодзіка яшчэ на свеце не пражыў. Маленькі, худзенькі, з васковым колерам твару. Ён ужо даўно глядзіць на паповы сані. Колькі бяссонных начэй правяла Кацярына, сама спала з твару, абяссілела і цяпер ледзь-ледзь на нагах стаіць. Але што рабіць! Не будуць жа хлебам карміць, калі ў гэты гарачы час будзеш дома сядзець.

— Ах, мой божа, не спіць малы... І рада была пайці,— апраўдваецца яна.

— Ды ты так, галубка мая, і да вечара дасядзіш,— яхіднічае свякроў.— Хто ж твой «хвост» дажынаць будзе?

Кацярына паспяшалася даць соску хлопчыку, падцягваючы таган з калыскай бліжэй да «хваста», і пачала даганяць жанчын. А сонца пячэ. Шум, гоман увышыні. Песні жанчын і дзяўчат перамяшаліся з плачам дзяцей, з трэлямі жаваранкаў, з крыкам кнігаўкі, з гойканнем пастухоў, з гудзеннем цэлых мірыядаў аваднёў і мошак...

Побач з перуноўскімі палоскамі расстаўлена «панская змена» — ляхаўская. Тут жнуць курылаўскія, мартынаўскія і захватаеўскія жанчыны. Цяпер ужо і на ляхаўскіх палях не бывае такога шуму, як раней. Цяпер жнуць не падзённа,

а падзесяцінна, таму можна бачыць жанчын не суцэльнай сцяной, а ўраздроб па розных канцах шырокага панскага поля. З ляхаўскіх палёў і панесліся жніўныя песні, перш чым перуноўскія жанчыны паспелі «наладзіць галасы»:

Не пайду дамоў,
Я тут заначую,
Журбы не пачую.

«Не пайду дамоў»,— пела некалькі галасоў на ляхаўскім полі.

Лягу спаці
Я пад калінаю,
Да пад зялёнаю
Лягу спаці!

Скарай, божа,
Мужа ў дарозе,
Свякроў на парозе,
Скарай, божа!

Мужа пірагамі,
Свякроў перунамі
А ўбій, божа.

— Што ж вы, галубкі, не спяваеце,— гаворыць Сапроніха на перуноўскай паласе.— Бачыш, як заліваюцца ляхаўскія.

— Маланка, пачынай! — крычаць дзяўчаты.— Ты самая карагодніца. Без цябе і песня не песня...

І зацягнула Маланья такую песню, а бабы на ўсіх палосках падхапілі:

Звалілася свякроў з тыну
Да ў зялёную крапіву.
Не жаль жа мне свякровачкі,
Да жаль жа мне крапівачкі.
Крапівачка — зялёная,
Свякровачка — шалёная.
Крапівачку — на нівачку,
Свякровачку — у магілачку.
Крапівачку паліваць буду,
Свякровачку праклінаць буду.

Надышла хмарка, і раптам паліўся дождж. На ляхаўскім таксама заспявалі жанчыны:

Закурыўся дробны дождж,
Па чыстаму полю закурыўся.

Затужыўся мой родны татулька,
Па майму бяздоллю затужыўся.

Не курыся, дробны дожджык,
Па чыстаму полю не курыся.

Не тужыся, мой родны татулька,
Па майму бяздоллю не тужыся!

* * *

Яшчэ пастухі не паспелі кароў ад сяла адагнаць, яшчэ сонца з-за возера не паказалася, яшчэ драч не закончыў сваёй аднастайнай песні, яшчэ паны ляхаўскія толькі другі сон бачылі, а перуноўскія бабы ўжо прыйшлі на «свае» (панскія) палоскі і прыняліся старанна за работу. Усе перуноўцы рашылі абжынкі сягоння наладзіць, каб не марыць голадам скаціну на папары. Дый панскі прадстаўнік гаварыў, што сабярэ на сягоння баб шмат і абавязкова закончыць работу на аржаным полі. Надвор'е не надзейнае, баран уніз пайшоў — дождж хутка будзе...

Ні Маланні, ні Зосі, ні Ганулі сягоння на перуноўскіх палосках не відаць. Пайшлі яны на заработкі на ляхаўскае поле. Ад таго і ўся весялосць сярод цяжкай працы перайшла да ляхаўцаў. Не стала Маланні, і бабам маркотна стала. «Няма нашай забаўніцы,— гаварылі перуноўскія жнеі,— не будзе каму абжынкі адпець». Добра яшчэ, што палоскі сумежныя з ляхаўскім полем, і жанчынам можна сысціся на абед разам, можна і песнямі перакінуцца. Усё-такі не так будзе цяжка гнуць спіну пад палячымі праменнямі сонца. Песню заспяваеш — з душы камень зваліцца.

Добра, калі поле народам усеяна: працавіты сілу пакажа, лянівы людзей пасаромеецца, а хто са жней у «хвасце» застанецца, таму і зімой гэты грэх прыпомняць.

Ляхаўскія жанчыны стаяць суцэльнай сцяной. Дзесяткі рук падымаюцца ўгору са жменямі каласоў, дзесяткі рук схопліваюць у самага кораня спелае жыта, рэжуць вострымі сярпамі, дзесяткі рук вяжуць цяжкія снапы, нагінаючыся да самай зямлі і сціскаючы каленямі вязьмо...

Дужая, спрытная, маладая і прыгожая Малання (на твары ніякай цені стомленасці не было відаць, толькі ўсмешка не зыходзіла з яе твару, жарты, смех, песні суправаджалі, здаецца, кожны яе рух) тут жа зацягнула песню:

Ясна сонца!
Я на цябе не нагледжуся,

Віна твая вялікая,
Ясна сонца!

І дзесяткі жанчын злілі свае галасы з голасам Маланні ў наступных словах песні:

Што ты рана ўсходзіш,
Позненька заходзіш,
Рана ўсходзіш!
Халодная раса пала,
Пусці, паня, дамоў рана:
Нашы дамы далёкія,
У нас мамкі няродныя,
У вароціках пераймаюць,
Па вадзіцу пасылаюць.
Вядзёрачкі дубовыя,
Перавёсла шаўковыя,
Наша доля далёкая,
Узмежачкі высокія.

І песня шырокай хваляй палілася ад возера да самага лесу і там замёрла далёкім рэхам... Жанчыны перавялі дух і паглядзелі на сонца. Яно ўжо паднялося вышэй лесу і, як бы любуючыся, заглядвала ў возера. Аблівала яно сваімі пякучымі праменнямі і нівы, і баб. Жанчыны перавялі дух, выцерлі потныя твары, паправілі касынкі, і з многіх грудзей вырваўся міжвольны ўздых... Толькі Прузына (амаль яшчэ падлетак), якая прыйшла толькі другі раз на заработак, адстала амаль на сажань ад баб. Яна, пачырванеўшая, стаяла і гатова была заплакаць. Але Малання падышла да яе і хутка стала жаць, напяваючы песню:

Я думала: зажалася,
Аж я з «казой» засталася.
Я думала: дуда іграець,
Ажно мяне за «хвост» лаюць.
Я думала: пірог даюць,
Ажно мяне да «хваста» вядуць!

У гэты час зазванілі на снеданне. Усе замоўклі. З-за возера чуць-чуць даносіўся ўдар звону. Значыць, «аддуха» настала, значыць, можна падсілкавацца хлебам і квасам, а хто багацей, то і хлебам з салам.

Ад снедання да абеду работа асабліва была цяжкая, таму што сонца ўжо стаяла высока і пралівала свае праменні прама на галовы жней. Авадні і мухі віліся цэлымі раямі і прымушалі адмахвацца і выпускаць з рук каласы. Грудныя дзеці не выносілі духаты і крычалі як маглі, а большыя дзеці падпаўзалі да

маці, працягвалі свае ручкі і прасілі піць. І плач, і ўздых, і песні, і падбадзёрванні зліваліся з трэлямі жаваранкаў, з крыкамі пастухоў, са звонам кос, якія адточваліся на лузе каля возера.

Цяжка ляхаўскім бабам, тым больш што яны вырашылі сягоння дажаць усе нівы. Хочуць паказаць яны сваю сілу, спрыт і працавітасць. І хоць твары жанчын пакрыты потам, хоць рукі іх часта бездапаможна апускаюцца ўніз, аднак у шматлікіх радах раздаюцца і песні, і жарты, і перакліканні з перуноўскімі бабамі. Ляхаўскія жнеі пелі па чарзе з перуноўскімі жнеямі:

А сумежнае поле,
Залатыя ўзмежачкі,
Пахваліўся Рыгорка —
Сокалам поле ляцець,
Селезнем мора плысці
А к цесцечку на дворык.
— А цесцечак, мой татулька,
Дазволь жа мне жаніцца!
А дзе твая дачушачка?
— Мая дочка ў сад пайшла,
У саду яна схавалася.
— Я ў сад пайду і там знайду,
За ручанькі яе вазьму.
За ручаньку, за правую,
За дзяўчыну бравую.

Калі сонца стала спускацца за возера, жанчыны ўздыхнулі свабодней. Павеяла прахаладай, і работа стала спорыцца ўдвайне... Добра жанчыны працуюць. Чуць жывы ад працы, а песні ўсё роўна пяюць... На ляхаўскім полі была чутна песня:

Падуйце, ветры, рана-рана
Па чыстаму полю,
Нясіце весці нашаму пану,
Што нашы жнейкі жыта пажалі,
Жыта пажалі, у копы паклалі,
Рана, рана, у копы паклалі.

Яна азначала, што абжынкі пачаліся. «Ну, цяпер віце вянок ды прыходзьце з песнямі да нас»,— сказаў прадстаўнік пана. На гэта жанчыны адказвалі такой песняй:

А зелен наш гай, зелен
Над усімі гаямі,
А хвалён наш пан, хвалён
Над усімі панамі.
Як выкаціў бочку мёду,

А другую гарэлачкі.
Бочку мёду — для дзевачак,
Гарэлачку — для жоначак.
А дзевачкі гуляць будуць,
А жоначкі піць будуць...

У нас сягоння вайна была,
Усё поле зваявалі,
Усё жыта пажалі.
Змялі поле мяцёлкаю,
Пайшлі дамоў вясёлкаю.

Калі пачынаюць «бараду» палоць, адна з жанчын (жней) прыносіць на поле яечню і бохан хлеба з соллю, і ўсё гэта ставяць каля «барады». Рассеўшыся на снапах, бабы пачынаюць з «барады» выполваць траву і пры гэтым хутка напяваюць песню:

Сядзіць жораў на дубе,
Дзівуецца барадзе,
Дзіва-дзіва!
— Чыя гэта барада
Уся смалой уліта?
Дзіва-дзіва!
Уся смалой уліта,
Уся лыкам абшыта,
Дзіва-дзіва!
— Лукашова барада
Уся смалой абліта,
Дзіва-дзіва!
— Чыя гэта барада
Уся мёдам абліта?
Дзіва-дзіва!
Уся мёдам абліта,
Уся шоўкам абшыта,
Дзіва-дзіва!
— Амелькава барада
Уся мёдам абліта,
Уся шоўкам абшыта.

Пасля гэтага прывітання «барадзе» тая жняя, якая прынесла яечню і хлеб з соллю, бярэ хлеб, хрысціцца і, кладучы хлеб у «бараду», гаворыць: «Дарую цябе, ніўка, хлебам з соллю, а ты нас сыццю сыці і спорам, і добрым здароўем!» Пасля гэтага жанчыны пачыналі есці яечню, затым варажылі: падымалі снапы, на якіх сядзелі, і глядзелі. Калі чарвякі касматыя поўзаюць, то выйдуць замуж за багатага, а калі маленькая кузурачка, то за беднага. А калі будзе павук, то за ўдаўца. Нарэшце, выпалаўшы чыста «бараду», вырывалі каласы і вілі вянок. Адпраўляючыся дадому, усе бабы пачыналі спяваць:

Ішоў бог дарогаю,
Дарогаю шырокаю.
За ім наш пан ідзе,
У руках шапку нясе,
Да сябе бога просіць:
— Да мяне, божа, да мяне,
У мяне гумно вялікае,
Пераплаты высокія,
Ёсць дзе богу пасядзеці,
Майго дабра паглядзеці.

Калі ўжо сонца зусім хавалася за возера і чырвонае полымя засцілала ўвесь «полацкі» бок неба, калі цішыня-раскоша разышлася на палях і лясах — толькі тады ляхаўскія жанчыны закончылі з «барадой» і накіраваліся ўсім гуртам да панскага двара. Уперадзе з вянком з аржаных каласоў ішла Малання, якую трымалі пад рукі дзяўчаты, за імі доўгая шарэнга жанчын з калыскамі за плячамі, са збанкамі, клункамі ў руках і з сярпамі на плячах... Здалёку магло б паказацца, што гэта белая шарэнга рухаецца ў пахавальнай працэсіі, калі б не былі чутны пастаянны смех і траскатня дзяўчат...

Падышоўшы да панскага двара, Малання пачала такую песню:

Разгарыся, вячэрняя зара, перад зоркамі,
Расхадзіся, наша гаспадынька, перад жнеямі,
А спытай, ці многа зжалі,
Ці многа нажалі?
А мы зжалі поле не мерана,
Копы не лічаны!

Далёка-далёка было чутна гэта прывітанне, якое выкрыквалася з усёй дзявоцкай моцы — дваццаць — дваццаць пяць галасоў у адзін голас. Засынаўшы ўжо люд вясковы, прыслухоўваючыся да гэтай песні, гаварыў: «Вось калі ляхаўскія абжынкі...» І слухаючы гэтую сумную, але гучную мелодыю, міжволі задумаешся: радасць чуецца ў гэтай песні з нагоды заканчэння справы, ці маленне аб лепшай долі, ці хвалебны гімн сялянскай працы.

Калі падыходзілі жнеі да панскага двара, пані выйшла на ганак з іконай і запаленай свечкай у руках і з зацікаўленасцю ўглядалася ў гурт, міжволі хвалюючыся, таму што ў ролі гаспадыні яна выступала першы раз.

— Што ж мне сказаць ім? — звярнулася яна да прадстаўніка пана.

— Нічога... Што ім гаварыць?! Скажыце дзякуй за вянок і аддайце грошы... Што там з імі размаўляць!

А жанчыны ўжо падыходзілі да ганка і гучна спявалі:

Запалі, пані, свечку
І выйдзі на сустрэчку,
Пераймі сваё дабро
І нясі сабе ў гумно!

Малання выйшла з гурту жанчын, паднялася на некалькі прыступак ганка і, аддаючы пані вянок, выказала наступнае прывітанне:

Найсвентша матка
Па небу хадзіла,
Па небу хадзіла,
Каронку згубіла.
Панскія жнеі жалі
І тую каронку паднялі.
І тую каронку паднялі,
Пані нашай на галаву ўсклалі.

Перанёс бог панскае дабро
Цераз залаты сярпок,
Перанясі яго праз мой дамок!
Дай, божа, у засеку спору
І ў дзяжы падыходу,
На стале сыццю.
Віншую паню вянком
І добрым здароўем!

Пані падзякавала ўсім, і бабы накіраваліся з панскага двара ў людскую, дзе ім была падрыхтавана вячэра з юшкі і клёцак.

## [ЗАЖЫНКІ]

Зажынаюць звычайна з вечара. Жанчына ідзе з мужам у поле, нажне сноп жыта і прыносіць дахаты. Тут сноп ставіцца «на куце», пад абразамі, як ахвяра богу. На наступны дзень жняя выходзіць на ніву рана, у самым лепшым адзенні і, стаўшы тварам на ўсход, моліцца богу: «Божа, бласлаў пачаць жаць і памажы ў добрым здароўі кончыць!» (Гомельскі п.).

Калі жняя пачуе стому, забаляць рукі і спіна, тады яна пачынае пець песні, якія носяць назву жніўных.

У Быхаўскім павеце зажынкі робяць крыху больш урачыста. Перад пачаткам жніва гаспадыня вымывае ўсю хату: падлогу, дзе ёсць, стол, лавы, вокны. Потым засцілаюць стол чыстым абрусам, кладуць хлеб і соль, запальваюць перад абразамі свечку... Адыходзячы на ніву, жняя бярэ ў «ношку» кавалак

хлеба, соль, кавалак сала і свечку. Хлеб і соль, пакладзеныя на стале, застаюцца ляжаць там і надалей. Прыйшоўшы на поле, жняя зноў моліцца з зямнымі паклонамі і потым вітаецца з нівай: «Добры дзень, ніўка, ядраное жыта! Я к табе прыйшла!» Зжаўшы жменю жыта, жняя скручвае яе, падпяразваецца і ўжо потым жне. Нажаўшы адзін сноп, ставіць яго і гаворыць: «Стаўлю сноп на сто коп, на тысячу мерак!» Пасля гэтых слоў кладзе яго на зямлю і падкладае пад яго сваю «ношку». Пасля гэтага жніво ўжо ідзе без перапынку. Вельмі строга сочаць, каб зажынкі адбываліся не ў дзень мучанікаў. Робіцца гэта для таго, каб жніво не было пакутлівым ні па рабоце, ні па надвор'і.

У Рагачоўскім павеце для зажынак выбіралася старэйшая ў сям'і жанчына. Яна адпраўляецца на ніву пад вечар і бярэ з сабою акраец хлеба, благавешчанскую прасфору і грамнічную свечку, кавалак артоса ці свянцонага вялікадня і свянцоную соль. Прыйшоўшы на свой загон, жанчына чытае ўсе вядомыя ёй малітвы з зямнымі паклонамі і потым нажынае адзін сноп, які і пакідае на полі стоймя, на другі дзень раніцай ідзе жаць ужо ўся сям'я.

У Себежскім павеце гаспадыні, выйшаўшы на ніву, становяцца тварам да сонца і моляцца, потым зажынаюць «бародку» са словамі: «Дай жа, божа, штоб лёгка жалась! Сярэдзінка не балела, ручанькі не млелі, ножанькі не дзервянелі, галава не гарэла!» Для «бародкі» зажынаюць тры жмені жыта, звязваюць іх у сноп і кладуць на плечы гаспадыні. Яна адносіць «бародку» дамоў і кладзе на абразы, а жнеі бяруцца за работу. Строга сочаць пры гэтым, каб у гаспадыні, якая зажынае жыта, была «рука лёгка», інакш жнеям будзе вельмі цяжка жаць. Калі ж між гаспадынь такой не знойдзецца, то зажынае жыта маладая дзяўчына.

Зерні з першага снапа прымешваюцца потым да семяннога жыта. У Мсціслаўскім павеце зерне з першага снапа выбіваюць хлопцы, якія жадаюць, каб іх любілі дзяўчаты. Для гэтага яны адварваюць зерне ў вадзе і п'юць гэту ваду.

Цыкл жніўных песень вельмі вялізны, хоць уласна часцей спяваюцца яны пры вяртанні з поля дамоў, чым на ніве. Як змест, так і матывы іх у Беларусі вельмі тужлівыя. Але дажыначныя песні ўжо мяняюць і змест і матыў на больш вясёлыя; пры жніве ж яравых часцей за ўсё пяюцца песні вясельныя.

## ДАЖЫНАЧНЫЯ, АБЖЫННЫЯ

### *Мінская губерня*

У дзень дажынак жнеі апранаюцца ў лепшае адзенне, а гаспадыня рыхтуе лепшы абед з гарэлкаю. Пры сканчэнні работ тры дзяўчыны пачынаюць віць вянок: адна выбірае лепшыя каласы, другая ўе вянок, а трэцяя падтрымлівае яго. Скончыўшы жаць, жнеі надзяюць падрыхтаваны вянок на галаву адной з дзяўчат і з песнямі ідуць у двор гаспадара. Ля брамы ці на ганку жней сустракае гаспадыня, бярэ з галавы дзяўчыны вянок і дае ёй срэбную манету. Затым жней частуюць, прычым яны спяваюць і танцуюць.

### *Магілёўская губерня*

У Быхаўскім павеце, як і ў другіх паўднёвых, канчаючы жаць, на апошняй паласе пакідаюць некалькі каласоў і звязваюць іх уверсе стужкай ці жытняй саломай. Каласы гэтыя пакідаюцца «на бараду богу». «Бараду» гэту чысценька полюць рукой, загорнутаю ў рукаў, але ні ў якім выпадку не голаю. Рассцілаюць сярод калосся чыстую палатніну і кладуць на ёй кавалачак хлеба і солі з малітваю і паклонамі да зямлі. Пасля гэтага жняя павінна пакаціцца па полі ўсім целам і сказаць: «Ніўка, ніўка, аддай маю сілку на другую ніўку!..» Толькі пасля гэтага абраду жнеі ідуць дахаты. Сярод дажыначных страў — абавязкова бліны і густая каша.

Калі пачынаюць звозіць жыта з поля ў гумно, то перад першым возам рассцілаюць у варотах гумна абрус, у якім на Вялікдзень адвозілі ў царкву свянціць велікодны стол. Для гэтага ў добрых гаспадынь ёсць асобны абрус. І на гэты абрус кладуць беллявую качалку і па ёй вязуць жыта ў гумно. Пры сушцы першай ёўні агонь пад асеццю распальваюць сухой травой, свянцонай на Сёмуху і Купалле або ў леташні Макавей (1 жніўня).

### *Сяло Гарадзец*

У Гомельскім павеце на «бараду» пакідаюць куст самага лепшага жыта; садзяцца ля яго і вяжуць чырвонымі ніткамі крыж з каласоў. Потым плятуць гаспадару вянок. Выпалаўшы «бараду», каб налета жыта было чыстае, і паліўшы яе вадою, каб не было засухі, рассцілаюць паміж калосся белую хусцінку, кладуць на яе лусту хлеба і пасыпаюць соллю. Потым збіраюць

палявыя кветкі і аздабляюць імі «бараду». Пасля гэтага жнеі кладуцца на зямлю, каб на будучы ўраджай жыта было добрае і калоссе гнулася да зямлі. Устаўшы з зямлі, жнеі мыюць рукі вадою, каб налета было чыстае жыта, і перавязваюць снапы травою або саломаю, каб на будучы год не парэзаць рук у час жніва. Пасля гэтага адпраўляюцца дамоў з вянком і крыжам. Крыж гэты і вянок разам з нававымалачаным жытам свенцяць у царкве 15 жніўня.

Калі па сямейных абставінах якая-небудзь слабая сям'я позніцца са жнівом, суседзі, што ўжо зжалі сваё, прыходзяць ёй на дапамогу: «Хадзіце к Пятру Сухарукаму на талаку!» Гаспадар дзякуе ім за дапамогу добрым абедам і частуе гарэлкаю.

Ёсць павер'і аб двухкалосных сцяблах-спарышах. Кажуць, калі жанчына з'есць двайны колас, яна непазбежна будзе мець двойню. Такія каласы даюць есці авечкам, каб яны прыводзілі па двое ягнят.

Вера ў моц заломаў, завіткаў, за́круці ўсё яшчэ трымаецца. Робяць гэтыя заломы ведзьмы і чараўнікі, каб нашкодзіць гаспадару нівы. Звычайна гэта робіцца на досвітку. Ведзьмы пры гэтым распранаюцца і робяць завіткі голымі, з распушчанымі валасамі.

...Пры малацьбе новага хлеба вараць густую кашу з розных круп. Пры гэтым лічыцца абавязковым і ўжыванне гарэлкі: «Сягоння абмалоткі, трэба па чарцы выпіць». Пры сканчэнні ж малацьбы ўсяго жыта гарэлку п'юць на таку ў гумне.

### *Віцебская губерня*

Пры заканчэнні жніва тут таксама пакідаецца жменя каласоў, але завецца яна не «барадой», а «кустом». У Віцебскім павеце для «куста» пакідаецца дзесяць каласоў. Жнеі садзяцца наўкол «куста» і пачынаюць павольна палоць траву ў ім. Пры гэтым спяваецца песня пра спарыш. Затым бяруць акраец хлеба, сыплюць у сярэдзіну яго соль і кладуць хлеб пасярод выпалатых каласоў. Потым завіваюць каласы справа налева, і кожная жняя павінна некалькі разоў перакаціцца па гэтым завітым «кусце». Робіцца гэта для таго, каб на будучы год быў добры ўраджай і каб каласы ад цяжару хіліліся да зямлі. Пасля гэтага ўюць вянок і надзяваюць яго на галаву дзяўчыне-жняі. А калі сярод жней няма дзяўчыны, то вянок надзявае сабе на руку адна з жанчын. З поля жнеі ідуць з вянком у дом гаспадара нівы і спяваюць тую ж песню «Спарыш». Гаспадыня сустракае іх у сенях ля парога, бярэ вянок і дорыць тую, што прынесла яго, грашыма. Пасля гэтага ідзе пачастунак і спяванне песень.

У Себежскім павеце дажынкі спраўляюцца ў канцы жніва яравых. Калі каласоў (звычайна аўса) застаецца ўжо мала, іх даручаюць жаць адной дзяўчыне; потым з іх плятуць вянок і адзяюць на галаву той жа дзяўчыне.

Пасля гэтага адпраўляюцца да гаспадара нівы. Дзяўчына ў вянку ідзе наперадзе, а жнеі з сярпамі на галовах услед за ёю. Прыйшоўшы да гаспадара, дзяўчына схіляе галаву; гаспадар здымае вянок, уносіць яго ў хату і кладзе на бажніцу, а потым дзякуе жнеям і частуе іх віном і закускаю.

## ЗАЖЫНКІ

Зажынкі даўней рабілі найчасцей у суботу пад вечар. Гаспадыня, выходзячы на поле, брала з сабой хлеба, солі і сыру, прыйшоўшы, клала гэта ўсё на край нівы і, узяўшы ў рукі серп, зразала першую жменю, звязвала яе і клала на зямлю, а наверх хлеб, соль і сыр. Нажаўшы яшчэ з дзесятак снапоў, вярталася дамоў, пеючы зажыначныя песні праз усю дарогу. У вёсках рабіць зажынкі гаспадыні выходзілі грамадой, па дварах гаспадыня ішла з кампаніяй маладзіц і дзяўчат. Хлеб, соль і сыр прыносяць дамоў разам з зажынам (у іншых месцах называюць першую жменю «гаспадар»). Хлеб кладзецца на стол, а зажын ставіцца «на куце» і абвязваецца або спаясываецца белым ручніком. Сям'я і госці садзіліся за стол і вялі банкет, які часта-густа канчаўся танцамі. У сямейных хатах матка або бабка ішла рабіць зажын разам з дочкамі, нявесткамі і ўнучкамі.

## ДАЖЫНКІ

Канчаючы жніво, адна частка жней зразала жменю жыта з каласамі і пачынала спяваць «раёк», другая частка асобна ад іх садзілася перад пакінутым кустком жыта і памагала спяваць, а адна з дзяўчат (ні маладзіцы, ні старой бабе гэта не гожа рабіць) палола «роя»: вырывала траву з недажатага кусціка. Канчалі палоць і віць вянок разам. Калі вянок ужо звіты, тады тая, што палола, вырывала адну саломіну і звязвала ў адно ўвесь кусцік каля самых каласоў, што называлі «раёвай», або «спарышовай», «барадой», а ў сярэдзіну кусціка клалі хлеб і соль.

Скончыўшы гэту работу, усе разам уставалі, і тая дзяўчына, што завівала «бараду», брала вянок з рук тых, што плялі, надзявала сабе на галаву і ішла наперадзе, а ўсе з ёю, спяваючы

«раёк» і іншыя жніўныя песні. Падышоўшы да хаты гаспадара, жнеі спыняліся і канчалі песню. Да іх тады падыходзіў гаспадар і прасіў у хату, а тая дзяўчына, што заплятала «роя», ускладала яму на галаву вянок, жнеі акружалі гаспадара і разам з ім уваходзілі ў хату. Гаспадыня ў сенях спатыкала іх з хлебам і соллю і чаркай гарэлкі. Гаспадар вянок перадаваў гаспадыні, кладучы на хлеб і соль. Пасля першага частунку жней сям'ю і ўсіх, хто прыйшоў, садзілі за стол на багатую вячэру. Пасля вячэры прыходзілі музыкі, і пачыналіся гульні і танцы да позняга часу.

## ЗАЖЫНКІ І ДАЖЫНКІ

У час зажынак маці клала ў жыта каравайніцу, каб жыта было ўмалотным. Маці выжынала вакол каравайніцы і рабіла снапок, які называецца «гаспадар». «Гаспадара» прыносілі ў хату і ставілі на покуці. Ён тут стаяў, аж пакуль не ехаў першы воз са снапамі ў ток. Тады маці рассцілала ў варотах абрус, клала хлеб-соль і «гаспадарыка». Конь з возам пераязджаў па абрусе. Маці тут жа брала з абруса «гаспадарыка» і несла ў ток, каб яго першым паставіць у застаронак. А пасля да яго ставіліся іншыя снапы.

Часта «гаспадарыка» зажыналі з загона жыта, што ў агародзе, каб з поля не несці.

Маці дажынала жыта. І з гэтых каласоў пляла вянок, які прыносіла ў хату і ставіла пад абразы. Пры малацьбе першым малацілі вянок. Апошнім абмалочвалі «гаспадарыка».

Калі маці, жнучы жыта, ні разу не парэзала руку, дык серп абвязвалі саломай, як падзяка сярпу, што не парэзаў жнялі руку.

## «ЖАНІЦЬБА КОМІНА»

Сёлета ў вёсцы Дзяржынск Лельчыцкага раёна нам прыгадалі, што перад зімой «коміна жанілі». Абвязвалі комін ці пасвет істужкамі, запальвалі лучыну і потым вечарамі пралі кудзелю.

Як вядома, комін — гэта вялікая труба, сплеценая з лазы і вымазаная глінай, якая прымацоўвалася да адтуліны ў столі хаты. Пад трубой вешалі пасвет (лучнік) — патэльню ці квадрат металічнай рашоткі, дзе гарэла лучына, што асвятляла хату селяніна ў асеннія і зімовыя вечары.

З усяго дзесятка вядомых нам запісаў абраду лепшым і паўнейшым нам уяўляецца публікацыя П. В. Шэйна «Жаніцьба

коміна», матэрыялы даслаў у 1883 г. настаўнік Пінскага рэальнага вучылішча В. Л. Грудніцкі. Каб уявіць і зразумець старажытны абрад пакланення агню, мы друкуем фрагменты той публікацыі.

«У горадзе Пінску і яго навакольных вёсках здаўна існуе звычай штогод 1 верасня рабіць абрад пад назвай «жаніцьба коміна...»

Прыгатаваўшы ўсё неабходнае для вячэры, гаспадыня абвязвае комін і лучнік новымі ручнікамі, а моладзь прыбірае іх кветкамі. Стол накрываецца новым абрусам і ставіцца пры самай печы ці пад лучнікам. Як толькі на дварэ сцямнее, у хату збіраецца ўся сям'я...

Гаспадар гаворыць вялікае пажаданне накшталт наступнага:

«Паздароўтэ, дзедуся, бабусю, дзядзька, дзеткі, чаляднічкі, прыяцеляў і дабрадзеяў!.. Зашчытыты худобку: коныкі, волыкі, кароўкі для дыток і ўсякую скацінку. Зарадыты хлебец, жыта, пшэныцю і ўсяку пашныцю. Зашчытыты пчолкі, вынесь іх на красну весну!.. Дайтэ чэлядачцы ахоту раненька ўставаты, пры світлі працоваты. Дайтэ, штоб нашаму роду не было пераводу...»

Калі ўся сям'я паспее закусіць, павесялее і ва ўсіх развяжуцца языкі, гаспадыня прыносіць у фартуху семкі (гарбузікі), сыпле іх на комін, а на стол кладзе «ласошчы»: пернікі, бублікі, яблыкі, гнілушкі, каліну, журавіны. А гаспадар прыносіць міску мёду — свежых сотаў. Моладзь збірае рассыпаныя семкі і бярэцца за салодкае. Тады гаспадыня прапаноўвае моладзі праспяваць жаніху, коміну, вясельную песню.

Ой, прыйшлі ж ночанькі доўгенькі,
Пасвіты ж нам, коміну біленькі.
Мы ж цябе квіткамі ўбіралы,
Бервяночкам, рутай аперазалы.
Праца наша — дзіўка гарненька,
Палюбыты коміна радзенька.
Мы ж цябе будзема жаніты,
Жаніты — квас, піва, мёд піты.
Светы ж, каміночку, ясненька,
Пабуджай чэлядачку раненька:
Шыты, прасты, ткаты маладым,
А падарачкі збіраты старым.
Каміночку, ты нам спагадай,
Кручу, верчу і буры праганяй,
Дым і сажу нясы варагам,
Світ, ахоту і радасць пашлы нам.
Гаспадыня наша, паглядай,
Піва, квасу, мёду падлівай.

Старэйшыя ў сям'і часта перапыняюць спяванне благаславеннямі накшталт наступнага: «Каб так рана ўставалы і шчыра працавалы, як голасна спiвалы!..»

Варта заўважыць, што з невялікай колькасці запісаў абраду мінулага стагоддзя тэкст песні зафіксаваны толькі ў гэтым, пінскім. Запісы паказваюць, што «жанілі коміна» два разы на год: «на Сямёна» (1 верасня), у некаторых мясцінах крыху раней ці пазней, калі з надыходам восені пачынала рана цямнець, і вясною на Фаміным тыдні (тыдзень пасля Вялікадня), калі дні станавіліся даўжэйшымі.

Пры гарэнні лучыны можна было не толькі рабіць, але і чытаць. Крапіўка (адзін з псеўдонімаў Алаізы Пашкевіч) назвала дзіцячы часопіс «Лучынка», каб несці святло дзецям у шырокім значэнні гэтага слова. Яна пісала ў 1916 г.: «Праз многа стагоддзяў у нас на Беларусі свяціла лучынка. Яшчэ і цяпер дзе-нідзе ў вёсках збіраюцца на попрадкі з кудзелямі дзяўчаты, маладзіцы: песні спяваюць, казкі баюць. Старэйшая з кабет або нехта з дзяцей ахоўвае дзеда-лучніка: то вугаль абтрасе, то свежую лучынку пакладзе. Мігаюць іскры па хаце. Пры пламеньчыку складна родная песня плыве, казка баецца».

На Беларусі, у прыватнасці на Палессі, існуе асаблівая пашана агню. «Жаніцьба коміна» — гэта сляды культу духаўпродкаў, дзядоў, хатніка, які, паводле ўяўлення язычнікаў, звязваўся з агнём (Сварожычам) і жыў у сушні, на печы і пад ёй, у коміне. Гэта яму прыносіліся ахвяраванні — «ласошчы». Паэтычна ўспрымаецца цяпер абразок з песні «Вяселле коміна з працай». Абрад мог узнікнуць пры феадалізме, стаўшы цяпер архаічнасцю, на аснове даўнейшых традыцый пакланення агню. У нас вядомы і іншыя «жаніцьбы»: гульні «Жаніцьба Цярэшкі», «Жаніцьба бахара», свята «Жаніцьба свечкі» і інш.

## «ЖАНІЦЬБА ПАСВЕТА»

На Тураўшчыне і Століншчыне яшчэ пасля Вялікай Айчыннай вайны некаторы час для асвятлення ў хатах ужывалі цяпер ужо забытыя пасветы. Пасвет — гэта невялікая металічная рашотка, падвешаная да столі пад спецыяльнай квадратнай адтулінай. Звычайна ніжэй яе ўмацоўваўся чатырохгранны драўляны комін, які да нізу расшыраўся. Каб дашчаты комін не загарэўся ад лучыны, яго абмазвалі чырвонай глінай і бялілі.

Выраблялі і больш працейшыя дымаходныя трубы. Пад дзіркай у столі вешалі звычайны бяздонны мех, які ўнізе вянчаўся абручом. Тканіна таксама прапітвалася глінай і бялілася.

Дым ад лучыны «выцягваўся» комінам на гарышча. Жар з пасвета падаў у пасудзіну з вадой, якая стаяла на падлозе. Калі пасвет доўга не выкарыстоўвалі, то мешкавіну скручвалі і чапплялі канец абруча за цвік на столі.

Доўга на Палессі тапілі ў печах «па-чорнаму», г. зн. без комінаў, хаця першыя з іх — спецыяльныя цагельныя адводы над дахам — з'явіліся ў больш заможных хатах яшчэ пры феадалізме. Але, як успамінаюць старажылы, за кожны комін селянін павінен быў плаціць падатак. Таму ў некаторых старых хатах, хаця і вельмі рэдка, выкарыстоўвалі традыцыю ўмацавання коміна ад печы ў сцяне.

Па язычніцкім вераванні нашых далёкіх продкаў, у хаце жыў хатнік (дамавік). Ён увасабляўся ў выглядзе агню, які палешуком асабліва шанаваўся. Можа, гэта сляды славянскага культу Сварожыча, які вядомы са старажытнай літаратуры.

Аб пакланенні агню і святлу палешукамі, якія жылі на межах этнічных тэрыторый, асабліва пераканаўча гаворыць абрад «жаніцьба пасвета». У цэнтральным Палессі яго праводзілі на Сямёна, гэта значыць 14 верасня (1-га па ст. ст.), калі пачынала рана цямнець і ў хатах трэба было паліць святло. У вёсцы Дзяржынск (раней Ра́дзілавічы) абрад успомнілі нам у 1988 г. пажылыя жанчыны, якія раней жылі ў суседняй вёсцы Храпунь Столінскага раёна, былой заходнебеларускай тэрыторыі.

Яны расказвалі: «Вырывалі з градкі васілька, такі бураковы цвет. І ўстаўлялі яго ў дзірку, зробленую ў палавінцы гарбуза. Потым адзін дзяржаў васілька, і ўсе за ім хадзілі кругом пасвета і спявалі або казалі:

— Свяці, наша свяціла,
Щоб агню нам не тушыла,
Щоб добра было працї, ткаці
І сяе́ць цяпло ў хаці.

Як «жанілі пасвета», то спявалі:

— Мой Сямёнку,
Мой салавейку,
Як табе харашэнька!
Як зацвіла каліканька
Да на лютам марозі.
Пацалуймася, мая сванечка,
Да на першым парозі.

Магчыма, раней выконваліся як спецыяльныя абрадавыя песні, так і прыстасоўваліся вясельныя. У абрадзе прымалі

ўдзел дзяўчаты, якія ў гэты вечар «запрадалі». Каля пасвета за грэбнямі, прадучы, спявалі многія пазаабрадавыя песні, слухалі бываліцы, жарты, гулялі на вечарніцах з хлопцамі.

## [БАГАЧ]

У Ігуменскім павеце Багачом называюць Ражство багародзіцы (8 верасня), і апошняя назва амаль невядома народу.

У жыцці земляроба гэта самая шчаслівая пара — пара адноснага дастатку, калі ў бедняка ёсць хлеб на стале, а ў багатых, «як князі, скірды шырока сядзяць, падняўшы галовы». Адсюль зразумела, чаму народ называе Багачом свята, што супадае з часам канчатковай уборкі хлеба і гаспадарчага багацця...

Галоўную ролю ў абрадзе гэтага свята адыгрывае «багач», або «багатца». Гэта лубка жыта з устаўленай у яе васковай свечкай. «Багач» стаіць на працягу цэлага года ў хаце гаспадара, на покуці, пад абразамі. У гэты дзень свечка запальваецца. Запрашаецца святар для служэння малебна, які адбываецца перш-наперш у тым доме, дзе стаіць «багач». Потым гаспадар услед за светаром нясе «багача» ў наступны двор, дзе іх сустракаюць гаспадары. Для сустрэчы ставяць на дварэ стол, накрыты белым абрусам, устаўлены лубкамі жыта, пшаніцы, ячменю ці іншага збожжа. «Багач» ставіцца на стол да збажыны, і служыцца кароткі малебен. Святар і ўсе, хто яго суправаджае, запрашаюцца ў хату для пачастунку, прычым «багач» ставіцца на покуці. І так абыходзяць па чарзе ўсе дамы. Збажына, якой сустракалі «багача», ідзе на карысць прытча.

На другі канец вёскі зганяюць усю жывёлу і, калі абойдуць усе двары, абносяць «багача» наўкол статка. Пасля гэтага адносяць яго ў хату чарговага гаспадара, дзе ён і застаецца цэлы год. Ён, паводле павер'я, прыносіць у дом багацце і шчасце.

У некаторых мясцовасцях жыта і воск для «багача» збіраюцца з усёй вёскі і падмяняюцца толькі тады, калі «багач» па чарзе абыдзе ўсе сяло ці калі свечка згарыць. А ў іншых месцах жыта і свечка падмяняюцца штогод чарговым гаспадаром, прычым жыта для гэтага вымалочваецца з першага зажыначнага снапа. У апошнім выпадку падмененае «багачовае» жыта змешваецца са звычайным і ўжываецца на насенне. Падрыхтоўка свечкі суправаджаецца агульнай вячэрай усіх удзельнікаў і асобнымі песнямі, што нагадваюць дажынкавыя.

## СВЯТА БАГАЧ

К гэтаму часу заканчваюцца палявыя работы, асабліва сяўба, чаму і склалася ў беларусаў прымаўка: «Багач, кідай рагач і з агарода проч». Гэта асенняе свята. Хлопцы выглядаюць дзяўчат, дзяўчаты знаёмяцца з хлопцамі. Цёткі ды кумкі распытваюць пра тую ды пра іншую дзяўчыну. Дзяўчаты купляюць чырвоныя хусткі, пацеркі і чакаюць жаніхоў. У некаторых прыходах вяселлі бываюць пераважна ўвосень да Каляднага посту.

## [БАГАТНІК]

Багатнік — вялікае свята. Усе святкуюць, бо чаму не святкаваць, калі, дзякаваць богу, к таму часу на полі ўжо ўсё парабяць, а дома дзела можа пачакаць; у кожнага е свежы хлеб, е якое-небудзь курча ці ягня. Е такія, што наварацъ піва або якое саладухі, е лішняя паўасьмінка збожжа, каб купіць гарэлкі,— можна святкаваць, бо ўсяго е багацька. Мо затым і гэтае свята завуць Багатнікам, што к гэтаму часу ў кожнага ўсяго багата.

## [ПАКРОВЫ]

Пакровы — канец лета і восені. З Пакроў ужо часамі лажыцца снег і наступаюць замаразкі. Пастухі кідаюць пасціць гаўядо, бо яны наймаюцца толькі з Юр'я да Пакроў. Да Пакроў не то што прыбрана з поля, але і з агародаў. Цяпер ссякаюць капусту ды яе шаткуюць ці галоўкамі соляць ды квасяць у кадушках. Лён ужо даўно сохне пад гумном ці дзе-небудзь пад капяжом. Цяпер толькі трэба яшчэ падсушыць у сушні ці ў хаце на печы ды церці. Гэта ўжо дамовае дзела жанок. З Пакроў пачынаецца самая лепшая пара ладзіць вяселлі, каб яшчэ да Піліпаўкі зрабіць лад. З Пакроў дзеўкі збіраюцца ў гурбу ды радзяцца, дзе атаўбавацца на вячоркі, дзе рабіць ігрышчы. А тут самы большы клопат — хлопцаў бяруць у салдаты. Хлопцы ходзяць п'яныя, гуляюць перад канцом, пяюць песні да прашчаваюцца з дзеўкамі. Ніколі так хлопцы не любілі моцна, як цяпер, ніколі не рвалася так сэрца, як цяпер, на прашчанні. Дзеўкі ходзяць да знахарак варажыць, ці застанецца любы, ці не. А жытка пачынаецца цёмная, бы й асенняя ночка.

## ДЗЯДЫ...

...Багата ў якіх мясцовасцях існуюць яшчэ дахрысціянскія жалобныя абрады. На Піншчыне, хоць і часткова, яны захаваліся і па сённяшні дзень, іх адзначаюць у лістападзе пад назвай «Дзяды». Ужо нават сам лістапад прыносіць разважлівыя думкі пра тое, у чым выяўлялася жыццё і на нашых вачах перастала быць жывым: на палях вострa тырчыць адно толькі ржышча пажатага збожжа; ні тут, ні ў лесе не чуваць болей песень; ні на дрэве, ні пад ім не напявае пастушок, пажоўклае і пачырванелае лісце аблятае з калісьці зялёных вершалін і смутна ўсцілае ўзгалоўе паміраючай прыроды на зімовы сон. Ціха і глуха: спевы птушак заціхлі, толькі стракаты дзяцел адгукнецца, куе па лону высахлага дуба, толькі часам пачуеш галасы адлятаючых журавоў, смутныя, як пахавальны плач. Хмура і панура: не відаць сонца, ад нябёс да зямлі навісла густая імгла. Толькі доўгім вечарам і ўночы праясняецца неба полымем зарыва, ці то ад смаляных печаў, ці ад агнёў, рассыпаных далёка па балотных травах і запаленых для паляпшэння багністай сенажаці. Можна сказаць, што гэта зарыва, запаленае пры пахаванні прыроды. Але на сенажацях сабранае сена ўзносіцца шматлікімі стагамі, на палях стаяць, як хаты, у доўгіх радах сцірты са збожжам, і ў сялянскія двары плённая восень натрэсла з поўнага рога і зерня, і гародніны. У сялянскіх хатах спакойна, добры дух; сяляне маюць час успомніць пра сваіх продкаў, якім яны абавязаны жыццём, бадзёрым здароўем і ўласным набыткам, якія і бога хваліць, і жыць на свеце іх навучылі; цяпер яны маюць час адплаціць доўг удзячнасці душам сваіх продкаў дзякуючы абраду ў гонар іх памяці і спраўляюць Дзяды.

На Піншчыне напярэдадні Дзядоў, альбо вячэры для мёртвых, гаспадыні старанна прыбіраюць свой дом, усю рухомую маёмасць, расстаўляюць па кутках усе гаспадарчыя прылады, каб тыя не замiналі ў хаце духам, што збіраюцца прыйсці сюды на бяседу. Назаўтра амаль усёй сямейнай грамадой ідуць на могільнік, падаюць на магілы, плачуць уголас і моляцца за сваіх мёртвых. Вярнуўшыся дадому, мітусяцца ў падрыхтоўцы да памінальнай вячэры, і да самага яе надыходу на працягу цэлага дня ніхто нічога не есць. Вечарам засцілаюць стол белым абрусам, пасярэдзіне яго запальваюць гарэлку для нагадвання пра пякельнае полымя [...] кідаюць соль на распаленае вуголле, каб пачуць мову яго таямнічага трэску. Асвяціўшы стол васковай свечкай, ставяць на яго боб ці гарох з мядовай сытой, поліўкамі з рыбы і мяса — кіслымі і прэснымі, сма-

жанай саланінай, аладкамі, яечняй з каўбасамі, кашай прасяной ці грачанай, малаком макавым і кіслым. Пасярод страў ставяць на стале булку хлеба і нарэзаным хлебам ці малымі боханамі абкладваюць вакол стала так, каб тры булачкі былі ў рад адна каля другой, на пачэсным месцы стала. Тут жа, каля гэтага пачэснага месца ці на покуці, вешаюць драўляную шабельку і пры ёй (калі няма кап'я) — качаргу ў выпадку, калі хтосьці з гаспадароў служыў у войску. Прыгатаваўшы багатую для продкаў вячэру, каб іх духі ў колішнім іх доме шчодра прыняць і ўсім дагадзіць, адчыняюць вокны і дзверы, старэйшыя з сям'і абыходзяць дом навокал, моляцца, пазіраючы ў бок могільніку, і запрашаюць мёртвых. Вярнуўшыся ў хату, у цішыні садзяцца воддаль стала і прыглядаюцца да ўяўнай бяседы духаў. Калі, па разуменні гаспадыні, духі, нарэшце, насыцяцца, яна падае знак, гаспадар садзіцца за стол і запрашае сям'ю і астатніх вячэраць. Гаспадар пачынае першы, зачарпнуўшы ад сыты з бобам або гарохам, ці так званай куцці, і першыя яе лыжкі адлівае для памёршых у асобную пасудзіну; за ім тое ж робіць гаспадыня, потым пачынаюць есці ўсе астатнія. Такім жа чынам гаспадар з гаспадыняй адліваюць духам і частку з усіх іншых страў. З кашы, акрамя аддзеленай ужо для памёршых часткі, кладуць для іх яшчэ трошкі за акно, з боку двара. Пасля заканчэння ўрачыстасці частка страў, выдзеленая для духаў, аддаецца дзецям, каб не палохаліся навальніц, маланак і перуноў, другія выносяць сваёй жывёле, а іншыя — птушкам, пакідаючы на даху свайго дома, або нясуць на рэкі, азёры ці сажалкі і выліваюць для падсілкавання тых душ, якія рассталіся з целам праз ваду. Рэшткі страў ад гэтай бяседы некаторыя нясуць таксама на могільнік, дзе разам з сабранымі жабракамі заканчваюць вячэру. Яшчэ некалькі дзесяткаў год назад падчас святкавання Дзядоў завязвалі вочы смялейшай і спецыяльна выбранай для гэтага дзяўчыне ці жанчыне і саджалі яе на слуп, укапаны ў падлогу каля печы. Гэта жрыца, цэлы дзень перад тым не еўшы, прыглядалася да душ, якія ўваходзілі ў хату, стараючыся пазнаць у іх сваіх знаёмых і родных; бачыла ў сваім уяўленні, як душы далёкіх сваякоў і сяброў дружалюбна набліжаліся да тых, хто сядзеў за сталом, палохалася выгляду постацей душ, не вядомых яе дому і чужых і абцяжараных пракляццем за крыўды і прысваенне чужога. Убачыўшы постаці гэтых непрытульных агрэсіўных душ, жанчына палохалася, часам, страціўшы прытомнасць, валілася на зямлю, палохаючы тым самым астатніх.

## ДЗЯДЫ

...Дзяды — свята продкаў, не звязанае з сонечным культам, прыпадала на восень, менавіта на першае лістапада. Дзісенскія крывічы ўрачыста абходзяць двое Дзядоў: веснавыя — Наўскі Вялікдзень і восеньскія — Вялікія дзяды [...] Наўскі Вялікдзень, веснавыя Дзяды, пасвячаецца толькі «наўцам», г. зн. новапамёршым (бацькам, братам, сёстрам, дзецям), а Вялікія дзяды пасвячаюцца цэламу роду, як толькі можа сягнуць памяць людская, і ў гэтым ёсць істотная розніца паміж веснавымі і восеньскімі Дзядамі.

Даўней восеньскія, Вялікія дзяды, абходзілі не паасобнымі сем'ямі, а родамі. Аб такіх родавых памінках апавядаў мой бацька, за якога яшчэ памяці, у 1840-х, 1850-х гадах, спраўлялі гэткія памінкі на Дзісеншчыне: Вангіны, Сарокі, Шышкі, Рублеўскія, Рымшы, Дземідовічы і інш. На гэткія Вялікія дзяды збіраліся зазвычай у дом найбагацейшай з роду сям'і ўсе дарослыя родзічы — ад найбяднейшага да найбагатшага, кожны са сваімі прыпасамі, і за агульным сталом спраўлялі вячэру. Вячэра пачыналася агульнымі малітвамі і спевамі за памёршых, якія прыпісвала царква. Скончыўшы малітвы, найстарэйшы з роду першы ішоў за стол і, запаліўшы абрадавую свечку, якая дагэтуль стаяла ўваткнутая ў карцы, напоўненым збожжам, гаварыў стоячы: «Святыя дзяды, просім за пачэсны стол!» Пасля гэтага забіралі па старшынстве месцы за сталом усе пры тым бытныя. Абрадавыя на Дзяды стравы — гэта «юшнік» з крыві, вараны з мясам, каўбаса і аладкі. Размова за сталом вялася выключна аб памёршых «дзядах», г. зн. продках роду. Пачынаў яе найстарэйшы ў родзе пасля першай чаркі, якая ішла ўкругавую, звычайным чынам, што першага прашчура роду нашага было імя такое-та, жыў ён там-та, вызначаўся тым-та і г. д. Далей гаварылі аб бліжэйшых продках аж да апошніх. Пасля вячэры размова цягнулася да «трэціх пеўняў», апавядаліся прыгоды, характары продкаў, родавыя і звязаныя з родам успаміны і легенды.

Падобна вышэйзгаданым дробнашляхецкім Дзядам, абходзіліся Дзяды і ў сялянскіх родах, толькі з большай прымешкай язычніцкіх перажыткаў. Гэтак рашчынялі напярэдадні Дзядоў хлеб і пяклі яго абавязкова на сухіх лістах; калолі парсюка на дзень Дзядоў, і ўрэшце вечар прысвячаўся гутаркам аб дзеях продкаў [...]

За маёй памяццю, у 1880-х, 1890-х гадах, ужо ў Дзісеншчыне не святкавалі Дзяды родамі, а толькі сем'ямі. У маёй сям'і гэта адбывалася такім парадкам. Напярэдадні Дзядоў з самай

раніцы жанкі прымаліся за капітальную чыстку хаты і ўсіх гаспадарскіх статкаў. Вечарам уносілі дзяжу, ставілі яе на «крыжох», сярод хаты, пакрывалі чыстым абрусам і садзіліся за стол вячэраць. У час вячэры лічылі «дзядоў», г. зн. прыпаміналі ўсіх памёршых продкаў. У нас налічвалі іх да трыццаці. Пасля вячэры рашчынялі «дзядоўскі хлеб», і на другі дзень пяклі столькі бахонкаў, колькі налічылі «дзядоў». Раніцай ехалі ў царкву і там раздавалі бахонкі ўбогім, кожнаму па аднаму. Велічыня бахонкаў залежала ад заможнасці сям'і: сем'і багатыя пяклі вялікія бахонкі, а бедныя абмяжоўваліся «бондачкамі» з кулак велічынёй. На вечар бывалі запрошаны бедныя з суседства, чалавек да дзесяці, і пачыналася за агульным сталом вячэра. На вячэру прыгатаўлялі «юшнік» з крыві, а ў гады, калі не калолі на Дзяды падсвінка, то клёцкі з «душамі», г. зн. з загорнутымі ў цеста скваркамі, і аладкі з верашчакай або замест аладкаў каўбасы з сырой капустай і на заканчэнне «саламатка», г. зн. сушаныя яблыкі, ігрушы і ягады, вараныя на мёдзе, або замест «саламаткі» аўсяны кісель з мядовай сытой. Варылі на вячэру больш чым было трэба і рэшткі мяса, аладак і іншае дзялілі паміж беднымі: кожны вяртаўся дамоў з клункам, у якім заўсёды акрамя ўсяго іншага была пара каўбас.

Перад вячэрай маліліся з малітоўнікаў па памёршых, а пасля вячэры, пасядзеўшы і пагутарыўшы на тэмы, пахвальныя для продкаў сям'і, разыходзіліся. Адліванне лыжкі стравы пад стол ніхто з нашай сям'і не практыкаваў, хоць з запрошаных гасцей некаторыя гэта рабілі. Сядаючы за стол, «дзядоў» не прызывалі. Але ніякага начыння пасля вячэры са стала не збіралі і рэштак страў, што заставаліся ў місах, не прымалі са стала.

З пераказаў майго бацькі, чутых ад дзеда і старых людзей яго пакалення, з днём Дзядоў звязвалі яшчэ адзін цікавы абрад — гэта ўпісванне і выпісванне з сямейнай кронікі членаў сям'і. Нованароджаных упісвалі, а памёршых выпісвалі. Кронікі гэтыя вяліся на бэльках хаты ў «пачэсным» куце. У сваёй Дзісеншчыне я ўжо нідзе не бачыў гэткіх запісаў, але давялося мне іх пабачыць вясной у 1914 г. у Бельскім павеце, у сяле Кленікі (заходняя частка Гродзеншчыны). У старых хатах «пачэсны» кут тут зазвычай заняты глыбокімі выразамі ў яго бэльках тэкстам славянскім, напрыклад, гэткага зместу: «Рдся. рб. Бж. Микола л. 1881. 20 іюл. + 1900. 5 март.» або скарочана: «Антон 1830. 10 мая+1870. 2 авг.» Яшчэ жывых сем'янінаў на сцяне маюцца імёны і даты народзін і насупраць іх пакінута месца для ўпісання даты смерці. Вось жа, у дзень

Дзядоў, паводле апавяданняў, прыводзілі ў хату грамацея, які падобныя запісы вырэзваў на «пачэсным» куце, натуючы народжаных або памёршых асоб за мінуўшы год у дадзенай сям'і. Праўдападобна, гэты звычай весці сямейныя кронікі пашыраўся па ўсёй крывічанскай тэрыторыі, бо сляды яго, паводле пераказаў, сустракаюцца і ў Веліжскім павеце, але поўнасцю ён захаваўся яшчэ адзіна толькі ў Бельшчыне...

## ВОСЕНЬСКІЯ ДЗЯДЫ Ў НЕЖКАЎСКАЙ ВОЛАСЦІ МАГІЛЁЎСКАГА ПАВЕТА

Дзядоў у сялян, як і паводле царкоўнага ўставу, чацвёра: Духаўскія, Змітраўскія, перад Масленым тыднем і Радуніца, а ў вёсках Навасёлкі і Васількі ёсць пятыя — перад Пакровам: Пакроўцы. У абрадах усіх гэтых дзён, акрамя Радуніцы, асаблівасцей няма, усе яны паміж сабой падобныя.

Калі прыйдзе дзень Дзядоў, то з самай раніцы на вёсцы можна паўсюль заўважыць жабракоў, на Дзяды іх звычайна запрашаюць. Аднак не для ўсіх іх прыём роўны: сяляне нашы заўсёды аддаюць перавагу таму з іх, хто карыстаецца славай лепшага спевака і чытальніка, «хто болі прычытвае і лепі пяе». Перш за ўсё ён чытае малітву па памерлых, потым за здаровых, а ў канцы, калі папросяць, і за жывёлінку. За гэта яму плацяць грашыма ад пяці да дзесяці капеек, а за жывёлінку асобна і часцей за ўсё даюць кавалачак «салца» ці «мясца», а не — дык два ці тры яйкі. Мукі жабракам не даюць і асабліва за заўпакойную малітву, бо нябожчыкам «будзя нылка на тым свеце».

Бабы ў гэты дзень мыюць стол, лавы, вокны, незасланы канец лавы стаіць збоку каля печкі і служыць падстаўкай для палацяў (г. зн. для нар): там будуць сядзець «дзяды», якія будуць памінацца, у чаканні вячэры; выціраюць і самыя нары. Пад вечар бабы пачынаюць паліць у печы, гатаваць стравы, пячы бліны. Да гэтага трэба дадаць, што ў вёсках Студзёнкі і Вішова першы блін рвуць на часткі і кладуць на вокны «для дзядоў».

Ведаючы, у якую пару рыхтуюць патравы, пастух выпраўляецца па вёсцы і, спыняючыся каля акна кожнага дома, пытае: «Гэй, гаспадыня! Ці пякла бліны? Прыслалі «дзяды» па бліны, свінкі па саланінкі, авечкі па яечкі, баранкі па соль, а кароўкі па сыр». Пры гэтым гаспадыні выносяць пастухам тое, што яны просяць. Некаторыя просяць так: «Хазяйка! Ці пякла бліны? Каб ласкава была, пастуху дала».

Патравы на Дзяды тыя самыя, што і на пахаванні, толькі ў каго часта паміраюць дзеці, то для іх пякуць «ладкі», каб жывыя дзеці не паміралі.

Перад вячэрай мыюцца ў лазні і, калі ўсе памыюцца, тады ставяць на палок вядро чыстай вады з чыстым венікам — «для дзядоў». Менавіта так трэба рабіць, сцвярджаюць сяляне, таму што памерлыя мыюцца ўсяго толькі чатыры ці пяць разоў у год і толькі на гэты час іх адпускаюць. Расказваюць пры гэтым розныя анекдоты, якім яны цалкам вераць [...] У «дзедаўскую» суботу не варта позна мыцца ў лазні. Гаспадары лазняў нават так робяць: калі хто-небудзь з тых, хто мыўся, у гэтыя дні ў лазні надта затрымаецца там, яго проста выганяюць адтуль, кажучы: «Пусціця ўжо нябожчыкаў».

Калі ўсе вяртаюцца з лазні, гаспадыня вымае з печы чыгуны з патравамі і ставіць іх на лаву супраць печы менавіта ў тым парадку, у якім яны будуць ставіцца на стол: тыя, якія пададуць спачатку, ставяць бліжэй да стала, якія потым — крыху далей і г. д. Гаспадар у гэты час запальвае грамнічную свечку перад бажніцай, і ўсе моляцца богу. У вёсцы Студзёнкі ў час малітвы хто-небудзь са старэйшых членаў сям'і бярэ чарапок ад гаршка, кладзе туды некалькі гарачых вугольчыкаў, а зверху траву, асвячоную ў Духаў дзень, і ёй абкурвае гаршкі з патравамі, стол з лыжкамі, хлебам і кубкамі і ўсю хату. Запаленая свечка гарыць да таго моманту, пакуль не з'ядуць кануна. Патравы на Дзяды бываюць наступныя: канун, поліўка, малако, клёцкі, яечня і каша. Мяса таксама лічыцца асобнай ядой. Колькасць страў абавязкова павінна быць няцотная. Падаюць іх на стол у намечаным вышэй парадку, толькі мяса з поліўкі часам пакідаюць на канец або ядуць адразу ж пасля поліўкі. Усе стравы ядуць з блінамі замест хлеба. Як толькі госці і члены сям'і пасядуць за стол, іх пачынаюць частаваць канунам [...] За сталом неабходна паспытаць абавязкова ўсе стравы, іначай нябожчыкі будуць злавацца. Першую лыжку ці хоць бы некалькі кропель ад кожнай стравы трэба выліць на стол. Лыжку за кожным прыёмам ежы неабходна класці на стол, каб ёй елі «дзяды», а класці лыжку трэба абавязкова выемкай не ўніз, а ўверх, іначай нябожчыкі перавернуцца ў магілах тварамі ўніз, і калі хто памылкова ці па нявопытнасці пакладзе лыжку ніцма, старэйшыя папраўляюць гэту памылку з адпаведнымі заўвагамі. Калі падчас вячэры што-небудзь з ежы ўпадзе са стала ці з лаўкі, то таго падымаць няможна: «Ето нехта есці хоча». Падымацца з-за стала па заканчэнні вячэры варта ўсім адразу; калі хто выпадкова паспяшаецца ўстаць раней за іншых, той хутка памрэ. Калі пасля вячэры прыбіраюць стол,

прымаюць таксама бліны з акна. Лыжкі, непамытыя, звязваюць ніткай і кладуць на лаве пад абразамі. У час вячэры ніякая адзежына не павінна вісець на курчыне (шастку)...

## ЗМІТРАЎСКІЯ ДЗЯДЫ Ў МЯСТЭЧКУ ЗАСЛАЎЕ МІНСКАГА ПАВЕТА

Паміnanne памёршых адбываецца ў нас хоць і ў розны час, але большай часткай восеньскай парой і пераважна ў кастрычніку. Прычыну неадначасовасці ўстаноўленых для памінак дзён нават у адным і тым жа прыходзе адзін селянін растлумачыў мне так: калі цар Дзмітрый пайшоў на вайну з нявернымі, дык ён, праязджаючы па розных мясцінах, прасіў праваслаўных хрысціян маліцца за ўпакой душ тых воінаў, якія па волі божай загінулі на вайне. Вось з таго часу ўстаноўленыя памінкі шмат у якіх вёсках адбываюцца не ў аднолькавыя дні, таму што цар Дзмітрый не ў адзін і той жа час праязджаў па розных вёсках.

На памінках больш за ўсё звяртаюць увагу на тое, каб прыгатаваць як мага болей разнастайных страў, сярод якіх абавязкова павінна быць вараная галава — свіная ці баранова, у крайнім выпадку хай сабе і курыная — усё адно пеўня ці курыцы. Галава гэта ў памінальным абрадзе займае даволі значнае месца.

Пасадзіўшы гасцей за памінальны стол, гаспадар бярэ ў адну руку свечку, загарнуўшы яе ў блін, а ў другую — булку хлеба і абносіць іх тры разы вакол пастаўленай на стале галавы, памінаючы ўголас па імёнах не толькі ўсіх памёршых родных і блізкіх, але нават і тых, што раней жылі калі-небудзь на цяперашняй яго зямлі, запрашаючы іх словамі: «Прыбывайце к гэтаму сталу!» Седзячы за сталом, усе госці [...] адліваюць з чарак на стол некалькі кропель, прыгаворваючы: «Прыбывайце!»

Па заканчэнні памінальнай вячэры на стале на ноч пакідаюць усе стравы, нічога не прыбіраючы: з нажамі, лыжкамі і інш., у поўнай перакананасці, што нябожчыкі прыйдуць уночы і пакарыстаюцца запрашэннем.

# СУЦЭЛЬНЫЯ АПІСАННІ АБРАДАЎ І ЗВЫЧАЯЎ ГАДАВОГА КОЛА





## ПРА ЗВЫЧАІ ПІНШЧЫНЫ

**«Куст».** У канцы лютага, як толькі сонейка пачне крыху цяплей паглядаць на зямлю, пакрытую скамянелым снегам, вясковая моладзь адразу збіраецца купкамі каля хатак, пляскае ў далоні і вясёлаю песняю кліча вясну. Сонца стане ўздымацца яшчэ вышэй, цяплейшым позіркам паглядзіць на зямлю, растане снег, трэсне, не вытрымае на рэках лёд, шырока і радасна пабяжыць веснавая вада, залье даліны і палі, пабяжыць у лясы. Гаспадар, які возіць сена сваё са стагоў з лесу на валах або конях, ледзь паспявае. Над разагрэтай сонцам пясчанай магілаю заспяваў жаваранак, узмахваюць крыламі патрывожаныя над перасохлай раллёю сівыя галубы, заклекатаў бусел на сваім гняздзе, заплакала, загаласіла над вадою кнігаўка, загаспадарыла над магільнымі дамавіннымі дошкамі рухавая пліска. Распусціла пупышкі-коцікі вярба, высыпала, узышла зялёная траўка. Веснавыя песні ў гэты час гучаць на ўсю ваколіцу: спяваюць іх на лодках, дубах-шугалеях і вываратах, што плаваюць на вадзе; пераганяючы жывёлу на пашу, перавозячы на сухія астравы або сплаўляючы што-небудзь. Чуваць песні ў лесе, дзе гоняць смалу і дзёгаць, і чуваць на раллі. Ні назойлівыя камары, ні кусліывыя слупы мошак у паветры не заглушаюць яе. У песнях гэтых ужо чуецца заклік кахання, гучыць смутак па страчанай цнатлівасці, якая даражэй за золата, і падае ўжо свой голас нядоля. Песень велікодных, або так званых валачобных, тут няма. Не ўдалося мне тут пачуць таксама і песень юраўскіх. Аднак на другі дзень Зялёных святак тут спяваюць песні пры абрадзе, які называецца «куст». Іменна ў гэты дзень збіраецца вясковы гурт дзяўчат, выбіраюць з гурту маладзейшую дзяўчыну, якая мае ўсяго 10—12 гадоў, і ўбіраюць яе шырокім зялёным поясам з кляновага лісту. Пояс некалькі сажняў даўжыні. Ім укрываюць лоб, абвіваюць шыю, твар, плечы і рукі, не прывязваючы яго, аднак, да стану, і ўсю постаць да нізу, крыху ніжэй каленяў. Лісце пояса, якім абкрываюць дзяўчыну, кладзецца адзін на адзін, поўнасцю закрывае дзяўчыну і ператварае яе ў зялёны рухомы куст. Слова

«куст» — гэта назва ўмаёванай жрыцы. Паставіўшы яе наперадзе, за ёю становяцца парамі маладыя жанчыны, потым старэйшыя дзяўчаты, за імі малодшыя, а ў канцы — дзеці. «Куст» са сваім доўгім «хвастом» з песнямі ідзе вуліцаю па вёсцы, заходзіць да гаспадароў або ідзе ў двор. Прынятыя там, спяваюць удвая больш і з песнямі танцуюць на свежым паветры. Танцоры дзеляцца на дзве супрацьлеглыя лініі. Яны то зbліжаюцца, то адыходзяць на сваё ранейшае месца, ідуць парамі па крузе або робяць адзін агульны круг. Другі, заўважаны пры «кусце» пінчукоў танец лічыцца важнейшым і абавязковым для гэтага абраду. Ён выконваецца з удзелам саміх жанчын (адна з адною або жанчын з мужчынамі) і з падскокамі жанчын да поўнага знясілення. Пасля танцаў і спеваў з атрыманай узнагародай — напіткамі і ежай — «куст» вяртаецца ў вёску. Тут жа выбіраюць для сябе хату і гаспадару дома аддаюць усё прынесенае. «Куст» заходзіць сюды, а за ім увесь хвост са словамі:

> «От тут кусту да піты, і есты даці,
> От тут кусту да на станцые стаці!»

Гэта значыць: «Тут кусту і есці і піць, тут кусту гаспадаром быць!» Гаспадар наладжвае частаванне, пасля якога зноў танцы і песні аж да ранку. Песні, якія можна пачуць пры гэтым абрадзе, мала даюць для яго тлумачэння, надзвычай ён старадаўні. У гэтых песнях расказваецца, аднак, пра красную дзяўчыну, пра дуб у зялёнай дуброве, гучыць просьба, каб зялёны гай не высякалі, а красная дзяўчына належыць таму, хто павырывае густую сачавіцу каля куста, г. зн. кветкі, якія там растуць. У іншых «куставых» песнях, якія прыкметна яшчэ менш звязаны з абрадам, гаворыцца пра каханне, жаданне пэўнага, такога, а не іншага шлюбу, успамінаюцца вялікія разлівы вады і бура, якая панесла і човен і вясло, а таксама журба пра шчасце і долю. Песні і «куставыя» і ўсе астатнія ад Зялёных свят да самага Яна або да Купалы, што тут спяваюць, самі жыхары называюць песнямі Тройцы, г. зн. што яны адносяцца да свята Тройцы. А сам «куст», або дзяўчына ў зялёным убранні, належыць аднолькава і да жаночай і да мужчынскай постаці, бо само слова «куст» на тутэйшай мове — мужчынскага роду.

**Купала.** 23 чэрвеня (па ст. ст.) у пінчукоў і цяпер яшчэ можна бачыць абрад, які называецца «Купала». У гэты дзень яны накладваюць груду хворасту і іншага смецця і рэштак, найчасцей з лазовага скарыстанага абутку, або так званых

пасталоў, зверху ставяць закончаны лучнік — своеасаблівы драўляны комін, праз які цэлы год дым з хаты пад страху выходзіў, запальваюць гэту падрыхтаваную груду, агонь вырываецца, і дымнік накіроўвае іскры высока ўгору. Моладзь, дзяўчаты і хлопцы, пляскаюць у далоні, скачуць праз гэты агонь, крычаць: «Купала! Купала!» Спяваюць песні і танцуюць дзенебудзь на выгане гэтак жа, як і пры святкаванні «куста», кружачыся парамі або асобна, падскокваючы ўверх аж да поўнай знямогі. Хлявы абтыкаюць крапівою, завешваюць грамнічнымі свечкамі і свянцонымі зёлкамі для засцярогі ад ведзьмаў, якія, паводле іх думкі, адбіраюць у кароў малако, а вароты каля хат упрыгожваюць вянкамі. Страх перад ведзьмамі распаўсюджаны і далёка вядомы. Бясспрэчна, што ў канцы чэрвеня каровы прыносяць малака менш. У гэты час паараны ўжо ўсе ўзгоркі, узняты папары, застаецца менш выгодных пашавых угоддзяў, ды і вужы ў многіх месцах высмоктваюць у кароў малако. Сам бачыў на Піншчыне, як вуж у статку на пашы, абкруціўшыся вакол нагі ў каровы, смактаў малако... Па тых або іншых і досыць простых прычынах удой малака ў гэты час змяншаецца, а людзі выдумалі ведзьму, якая адбірае малако і малочныя прадукты.

Як і ў іншых месцах, на Піншчыне думаюць, што ў поўнач напярэдадні Яна зацвітае на некалькі хвілін невялічкая кветка папараці, і той, хто знойдзе яе, даведаецца пра ўсе схаваныя скарбы, пра мінулае і будучае, пра ўсе чалавечыя сакрэты. Тыя, хто вельмі хоча знайсці кветку папараці, ідуць гэтай ноччу ў лес і чакаюць шчаслівую хвіліну, калі яна раптам успыхвае і падае, як упала аднойчы ў лапаць таго казачнага селяніна; а яны ўжо не дурні, памянялі лапці на боты, каб не згубіць кветку, якая дапамагае адкрываць таямніцы і знаходзіць багацці, не зрабілі так, як той казачны селянін — шчаслівы на адну хвіліну, і потым зноў, небарака, застаўся, якім быў. Такім чынам, ноч напярэдадні Яна, паводле ўяўленняў нашых людзей, можа прынесці чалавеку невычарпальныя багацці. Уяўленне гэтае агульнае для славян і літвінаў.

**Дажынкі.** У ліпені пачынае налівацца золатам на палях збажына. Жаваранак вырасціў сваёю нястомнаю песняю жыта, яно выспела, і ён змоўк. Буйныя і цяжкія каласы на лепшых дагледжаных загонах і дробныя, невялікія на худасочнай зямлі кланяюцца прахожым і просяць, каб іх зжалі і выратавалі ад пякучага сонца. Сялянкі бяруцца за сярпы і пакідаюць хаты. Адна бярэ з сабою ў кашолку грудное не сціхаючае дзіця; другая замыкае драўлянай засаўкай дзверы свайго памяшкання, а сама вылазіць праз малое акно ў святліцы; іншая,

менш здагадлівая пакідае сваю хатку з дзецьмі адчыненай, не зважаючы на тое, што можа воўк які за хатай ужо чакае гэтай хвіліны. Ёсць жа прыкрыя выпадкі з дзецьмі, пакінутымі ў час жніва дома без усялякага нагляду. Жнейкі, пачаўшы першую жменю «з богам», жнуць старанна і ахвотна; сонца прыпякае, пастаяннае віханне са жменяю да ночы стамляе, а звон сярпоў не спыняецца; падхопленыя адна за адной жмені з каласамі ляцяць, мільгаюць вакол галавы, кладуцца, і песня над полем гучыць, разносіцца па ўсім полі. А калі ўжо дажынаецца жыта, пакідаюць ад яго куст, прыгожы, на некалькі жменяў. Абраная жнейкамі дзяўчына абхоплівае яго пад самыя каласы чырвоным поясам і зжынае на ўкос вярхі, а салому ад каласоў таксама зжынае. Каласы яна аддае таварышкам на вянок для гаспадара, а салому раздзяляе на дзве палавіны і кладзе накрыж на пожні, а наверх буханку хлеба з соллю. Калі вянок гатовы, тая ж выбраная жнейка з песнямі надзяе яго сабе на галаву. Па абодва бакі ад яе становяцца дзве іншыя такія ж дзяўчыны, у другім радзе стаяць яе памочніцы-спявачкі, потым усе астатнія жнейкі з сярпамі на плячах, і так весела з песнямі ідуць у двор. Там з адпаведным віншаваннем гаспадару выбраная дзяўчына перадае яму свой вянок. Гаспадары з радасцю прымаюць сваіх працавітых жнеек і робяць для іх банкет з танцамі.

## ЗЕМЛЯРОБЧЫ КАЛЯНДАР

**Калядкі.** Абрад гэты адбываецца ў калядныя святы. Каляднікі звычайна падыходзяць пад акно, спяваюць і ўсхваляюць гаспадара, гаспадыню, дзяцей, жадаюць ім усялякага дабра і заканчваюць словамі:

Ці кажыце спяваці,
Ці каляды даці?

Гаспадар па свайму жаданню дае або грошы, або штонебудзь з ежы.

Вельмі падобныя да калядак шчадроўкі, або Шчодрыя вечары. Шчодрым вечарам называецца вечар перад Новым годам. Абрад выконваецца тымі ж каляднікамі. Ад калядак шчадроўкі адрозніваюцца запевамі:

Добры вечар,
Шчодры вечар!

Пажаданні такія:

На новае лета
Радзі, божа, жыта,
Жыта, пшаніцу,
Гарох, сачавіцу,
Ў клуні ўмалотна,
Ў дзежцы ўзыходна.

Ксяндзы ў гэтыя дні наведваюць сваіх прыхаджан, якія дораць іх па магчымасці, і гэта называецца «ксёндз едзе па календзе», г. зн. ксёндз едзе па каляду.

**[Сустрэча вясны.]** Сустрэча вясны распачынаецца спяваннем вяснянак:

— Вясна красна, шчо нам вынесла?
— Нам вынесла саху, барану,
Старым бабкам пасядзеннечка,
Маладыцам красенца ткаці,
А дзяўчаткам да й пагуляці.

Гэта песня вельмі добра вызначае занятак мужчын, старых баб, маладых жанчын і дзяўчат з надыходам вясны.

У Вербную нядзелю, віншуючы са святам, б'юць свянцонаю вярбою і гавораць:

Не я б'ю, вярба б'е...

Таму, каго віншуюць, жадаюць:

Не будзь санлівы,
Да работы лянівы,
Не будзь зайздрослівы,
А будзь здароў, як вада,
Расці, як вярба,
Будзь шмыткі, як пчала,
Будзь багаты, як зямля.

**Жніво.** Уборка збажыны — важная падзея ў жыцці селяніна: хлеб — крыніца яго жыцця і дабрабыту, хоць пан і абірае селяніна. Жывучы па звычаях сваіх бацькоў, селянін, захавальнік народнай мудрасці, адзначаў заканчэнне палявых работ рознымі абрадамі. Аб гэтым абрадавым характары палявых песень мы цяпер і хочам сказаць некалькі слоў.

Жніво ў тутэйшым краі пачынаецца ў першыя дні ліпеня, жнуць звычайна жанчыны і дзяўчаты, і жнуць жыта не зусім спелае, лічачы, што з такога жыта будзе бялейшай мука.

Дажынкі бываюць сялянскія і панскія; адрозненне заключаецца ў тым, што на сялянскіх больш натуральнасці, даўніны і шчырасці. Дажынаюць жыта найчасцей «помаччу». Старэйшая жняя размяркоўвае месцы, дзе каму жаць, таму яна называецца пачынальніцай, а ўсе астатнія — памагальніцамі. Гаспадар частуе «помач» абедам і падвячоркам. Але галоўнае ў дажынках песні:

Жніся, загоне, жніся!
На мяне не дзівіся!
У мяне загон шырокі,
Араў ратай бязбокі.
Або ж мяне падаждзіце, (2)
Або дайце Антона
Падагнаці загона;
Або ж дайце Грыця,
Грыц на мяне падзівіцца.

Калі жнуць апошні загон, то кожная жняя адкладвае па каласку для аднаго агульнага снапа — дажыначнага. Потым дзяўчаты сыходзяцца да гурту і выбіраюць прыгажэйшую сярод жней — «багіню», галаву якой упрыгожваюць вянком з жыта, у рукі ёй даюць дажыначны сноп, накрыты доўгім белым пакрывалам. Потым ідуць з поля, скачуць і спяваюць песні. Гаспадар, пачуўшы песні жнеек, выходзіць з хаты ім насустрач з хлебам і соллю. «Багіня», пакланіўшыся гаспадару, кладзе яму да ног дажыначны сноп (гаспадыня апырсквае яго свянцонай вадою), а вянок перадае яму ў рукі. Потым усе ўваходзяць у хату. Дажыначны сноп разам з зажыначным ставяць на покуць, пад іконы, дзе і стаяць яны часта ўвесь год, а вянок вешаюць на бажніцу. Пасля гэтага пачынаюцца частаванне, песні, музыка і танцы.

Калі дажынкі спраўляюцца ў пана, то ўся вёска ідзе да яго на двор. Пан бярэ ад «багіні» вянок, дае ёй грошы і аблівае вядром вады. Потым пачынаюцца полькі, вальсы, мазуркі — танцуюць толькі панскія госці. Хто-небудзь з больш кемлівых і смелых сялян гаворыць да пана прамову з усялякімі алегорыямі. Сяляне ў гэты час спяваюць песні.

## АБРАДЫ І ЗВЫЧАІ СЯЛЯН

На некаторых сваіх святах сяляне прытрымліваюцца звычаяў, устаноўленых спрадвеку, асабліва гэта заўважаецца на Юр'я, 23 красавіка. У гэты дзень кожны гаспадар бярэ невялікі хлябец, спечаны напярэдадні, а з ім косткі ад велікоднага

стала (ад свянцонага) і абходзіць сваё азімае поле. У розных месцах на полі ён закопвае гэтыя костачкі, а з хлебам прыходзіць у царкву і блаславляе яго. Потым хлеб гэты спажываюць дома, пакідаючы толькі выразаныя трохвугольныя кавалачкі, якія засушваюцца і захоўваюцца да Юр'я ў будучым годзе. Кавалачкі гэтыя на Юр'я раніцай разломваюць і даюць рагатай жывёле і авечкам. Затым, як і ўсюды, жывёлу апырскваюць «святою» вадой і выганяюць у поле галінкамі вярбы, асвячонымі ў Вербную нядзелю.

Жанчыны, гонячы жывёлу разам з пастухамі, спяваюць песні, якія пачынаюцца словамі: «Божа мой! На Юр'еву расу— бычка напасу, божа мой!»

Вялікі пакутнік Георгій (Юрый) лічыцца тут апекуном пастухоў і пасеваў. Самі сяляне гавораць, што яны менавіта для таго закопваюць на пасеяным полі костачкі, каб бог ахоўваў іх пасевы ад граду і чарвякоў. Па гэтай жа прычыне з асаблівай стараннасцю адзначаюць Благавешчанне. У гэты дзень можна толькі варыць і лічыцца вялікім грэхам што-небудзь пячы. Таму на гэтае свята не пякуць ні хлеба, ні пірагоў, а падрыхтоўваюць усё раней. А калі даведаюцца, што якая-небудзь гаспадыня раніцаю пякла што-небудзь, то паважаныя жанчыны, сабраўшыся з усёй вёскі, выводзяць віноўную на вуліцу ў адной кашулі і абліваюць яе вадою. Робяць гэта дзеля таго, каб дагадзіць богу, каб ён дараваў грэх і не паслаў на ўсю вёску градабой.

Засцерагаючыся ад граду, нічога не робяць на чацвёрты дзень пасля так называемага нараджэння Хрыста (28 снежня), у сераду. Тыя, што жывуць каля рэк і азёр, шануюць дзень 17 сакавіка, дзень Аляксея, божага чалавека, лічачы яго засцерагальнікам ад утаплення людзей і жывёлы. З такімі самымі мэтамі адзначаюць і моцна шануюць дні Міколы Цудатворца 9 мая і 6 снежня.

У некаторых мясцовасцях Вілейскага павета дзеля засцярогі ад непрадбачаных здарэнняў у гаспадарцы святкуюць дзень св. Еўдакіі 1 сакавіка. На Івана, 24 чэрвеня, прыносяць у царкву пахучую траву і кветкі, каб іх абпырскалі «святою» вадой. Гэтае пахучае зелле маюць у кожнай вёсцы і замест фіміяму абкурваюць ім свае дамы і будынкі, асабліва пры набліжэнні цёмных хмар.

6 верасня прыносяць у царкву для баславення каласы жыта і пшаніцы, перамешаныя з кветкамі, як першыя зямныя плады. У іншых мясцовасцях гэты звычай адзначаецца 15 жніўня. Гэтыя благаслаўлёныя зярняты дома потым змешваюць з насеннем, прыгатаваным да азімай сяўбы.

**Свята Купалы** адбываецца ноччу 24 чэрвеня. Вечарам уся вясковая моладзь збіраецца на двор абранага ёю распараджальніка свята, «урадніка», які пачынае займацца падрыхтоўкай: загадвае ўсім ісці па вёсцы, збіраць усялякую ўсячыну — старыя чобаты, анучы, лахмоцце, рыззё, луб, кару сасновую, лапці і г. д. Калі назбіраюць гэтага хламу вялізную кучу, тады бяруць у аднаго гаспадара каня, у другога колы, у трэцяга цягу, у чацвёртага аглоблі, у пятага шворан і г. д. Склаўшы воз, пачынаюць вывозіць увесь гэты хлам на поле, куды прызначана, і скідваюць усё ў адну кучу. Звожанне гэтае адбываецца часам і днём да прыцемак. Але вечарам ужо ўся моладзь — хлопцы і дзеўкі — ідуць на гэтае месца, склікаючы пад вокнамі ўсіх жадаючых. Па дарозе да месца ігрышча рвуць траву, горкі палын, усе як адзін падпяразваюцца і, узяўшыся за рукі, спяваюць песні накшталт наступных:

На святога Яна
Дзевачкі зелле капалі.
А што ж гэта за зелле?
Чырвонае карэнне,
Гэта зелле купальнае,
Дзявоцкае гулянне,
Дзецюкова ўздыханне.
Ходзіць Ян па вуліцы, да й памалу,
Просіць дзяўчат на Купалу.
Сягодня Купала, заўтра Ян,
Завець ён, наш добры пан.
Вы, дзевачкі, шчасліва доля,
Вы, дзевачкі, свая воля.
Маладзіцам нету долі,
Маладзіцам нету волі і г. д.

Досыць, досыць, нявестачкі,
Красавацца вам на Яна.
— Ой, татулька, я маладая,
Пусці ўзвелічаць Яна.
— Няхай ідуць усе дзеўкі
Узвялічаць святога Яна.
— Ой, татулька, і я пайду,
Можа зёлку якую найду,
Дзіця вазьму я на ручку
І другога да й за ручку,
Ой, прынясу я да й букаўку,
Святаянску першу зёлку,
Да й наторкну над сваім ганкам,
У сянёх і пад вакошкам,
А над ложкам, над дзіцяці,
Буду долі яго пільнаваці.
— Ой, нявестка, ўсё няпраўда,
Не хадзі, не нада, не нада!

Нас слухай, людзей старых.
— Ой, татулька, не ў нас адных,
Па ўсім свеце гэты прыметы,
Ці хто жанаты, ці бяздзетны,
Ой, на Яна зёлкі збіраець,
Да цэрквы святой прынашаець,
Ой, буроцкаю ці ўдоўкаю,
А стары дзед кароўкаю.
Як першы раз у поле гонюць,
А іх вярбой паганяюць,
Святым зеллем падкураюць,
Божа дрэўкам да й мятай.
Пусці ж, татулька, няхай пайду,
Усякай зёлачкі я найду.
Купальнічка заспяваю,
Святога Яна ўзвелічаю.
Ой, нету, нету Купальнічка
Да Яна над нашага Янасчка:
Пяшком на вулку не выходзіць,
Ён на коніку выязджаець,
Сабе дзеванькі выглядаець.
Сам жа ён едзець на коніку.
Дзеваньку вязець на возіку.
Сам жа ён едзець у атласе,
А дзеваньку вязець у пакрасе.
Сам жа ён едзець, як жар гарыць,
Дзеваньку вязець, як цвет цвіцець.

Прыйшоўшы да назначанага месца, кучу гэту падпальваюць, і агонь гарыць увесь час. У непагадзь заранней робяць шатры з толькі што ссечаных зялёных дрэў, а добрым надвор'ем убіваюць некалькі зялёных дрэў у зямлю, як быццам яны тут і раслі. Гаспадыні прыносяць сякую-такую яду, а гаспадары віно. Усё раскладваюць каля агню. Закусіўшы крыху, адны пачынаюць спяваць і танцаваць, другія п'юць і закусваюць, трэція шукаюць папараці або грошай. Калі касцёр моцна разгарыцца, тады «ўраднік» аддзяляе хлопцаў ад дзяўчат і разводзіць іх па абодва бакі ад кастра — хлопцаў на адзін бок ад агню, а дзяўчат на другі.

Пастаўшы гэтак, адны насупраць другіх, пачынаюць скакаць праз агонь. Спачатку скачуць дзяўчаты, і хто з іх не пераскочыць, тую называюць ведзьмаю. Пасля дзяўчат пачынаюць скакаць і хлопцы. Пры іх пераскакванні дзяўчаты спяваюць прыпеў:

Цяпер Купала, заўтра Ян,
...Кідаю хлопцаў цераз баркан.

А хлопцы спяваюць:

Цяпер Купала, заўтра Ян,
...Кідаю дзевак цераз баркан.

Прыпеў гэты працягваецца да таго часу, пакуль яны скачуць. Тым часам прыходзіць на ігрышча самая старая бабуля па агонь. Яе вяртаюць, каб яна, узяўшы агонь, не магла непрыкметна пайсці не злоўленая. Як толькі яна возьме агню, за ёю пачынаюць гнацца і сцябаць палыном да таго часу, пакуль не знікае «ведзьма». Прагнаўшы яе, моладзь зноў пачынае гуляць да позняй ночы. Ёсць, аднак, і такія (найчасцей старыя), хто, магчыма, уступаючы моцным павучанням і ўнушэнням, не ўдзельнічае ў гэтым ігрышчы і часта і моладзь сваю не пускае гуляць. Але найчасцей віноўныя ў гэтым свёкар і свякроў:

Дзіця плачэць у калысцы,
Свёкар бурчыць у запечцы,
А свякроўка дай на палу,
Памагаець свёкру майму.

Па народных уяўленнях, ноччу на Купалу ўсе жывёлы і дрэвы размаўляюць паміж сабой. Калі іх падслухаць, шмат аб чым можна даведацца і зрабіцца знахарам. У «нячыстай сілы» таксама шмат спраў у гэты час. Невыпадкова ж нячысцікі раз'язджаюць на конях, калі толькі паспеюць іх захапіць дзе-небудзь. Таму ў гэту ноч сяляне не выводзяць коней на начлег, а трымаюць дома. Скарб, схаваны ў зямлі, выходзіць на паверхню ў розным абліччы — нібыта ён агонь, воўк і інш., але ўзяць яго не проста, патрэбна адвага і мужнасць, таму што «нячыстая сіла» ўсяляк ахоўвае яго, палохае і марочыць галаву смельчакам, заводзіць іх у балота, нетры, часам здымае чобаты, мяняе адзенне лепшае на горшае і да т. п. Адны толькі знахары дабіваюцца свайго.

У гэту ноч расцвітае папараць. Хто знойдзе яе, той будзе ўсё ведаць. У некаторых месцах захавалася наступнае распаўсюджанае паданне. Работнік-парабак нейкага гаспадара, блукаючы па лесе і шукаючы коней, зачапіў нагою папараць, кветка адарвалася і ўпала яму ў лапаць. Работнік стаў усёзнаючым, раптам даведаўся, дзе яго коні, дзе схаваны якія скарбы, што каму зрабілі ведзьмы, як можна адрабіць і інш.

Але, прыйшоўшы дамоў і здзіўляючы ўсіх сваім дагэтуль небывалым знахарствам, ён, седзячы на падлозе, стаў разувацца, адкруціў аборы, лапаць упаў, а з ім разам і кветка папараці, і знахарства яго скончылася. Тут толькі людзі бывалыя, знахары-няпромахі здагадаліся, у чым справа: кінуліся глядзець лапаць. Гасцей было шмат. У агульным замяшанні нехта Сцяпан схапіў кветку і пабег з дому. Праз некалькі дзён даведаўся аб гэтым пан. І Сцяпана войт паклікаў да пана. Пан загадаў аддаць кветку. Сцяпан аддаў, і пан яе сабе ўзяў...

Ведзьмы ў гэту ноч таксама не спяць, адымаюць у сваіх нялюбых суседзяў ад кароў малако. Для гэтага яны ўпотай збіраюць на чужых агародах расу і даюць піць яе сваім каровам. На чыіх агародах раса сабрана, каровы тых гаспадароў зменшаць малако. Але ёсць супроць гэтага сродак жахлівы для ведзьмаў. Гаспадыня, заўважыўшы, што малако ў яе кароў зменшылася, бярэ цадзілку і варыць яе са святаянскім зеллем у гаршку. Ведзьме, якая збірала расу, зробіцца дрэнна: яна абавязкова прыйдзе і будзе прасіць чаго-небудзь: рэшата, сечкі і г. д., але не трэба нічога даваць і не дазваляць, каб яна падняла што-небудзь з зямлі, нават трэску ці пясок. Толькі ў такім выпадку ведзьма нічога не зробіць, стане сохнуць, хварэць і абавязкова памрэ.

На Івана сонца, узыходзячы, «іграе», г. зн. з аднаго звычайнага сонца робіцца некалькі сонцаў, якія верцяцца адно каля аднаго, разыходзяцца і зноў зыходзяцца ў адно звычайнае. Раніцаю на Івана сяляне, як мы вышэй гаварылі, ідуць па траву і кветкі, ірвуць іх, нясуць у царкву і асвячаюць у час абедні. Гэтыя травы атрымліваюць назву святаянскага зелля і захоўваюцца да наступнага года. Адны з іх лічацца лякарствам ад некаторых хвароб, іншыя засцерагаюць ад чараўніцтва або служаць прыкметамі дабрабыту на будучае. Так званыя букоўкі, або багаткі, утыркаюць у сцяну і па іх адгадваюць пра будучае шчасце і спаўненне надзей: калі зацвіце, дык добра, а калі засохне ў тым выглядзе, як сарвана і ўваткнута, дык прадвяшчае няўдачу.

Сяляне вераць у сімпатычныя сродкі некаторых траў і кветак. Так званыя кветкі «купальні» і ўласна святаянскія служаць сродкам узбуджэння пачуцця адданасці і кахання ў іншых асоб. Калі які-небудзь хлопец закахаецца ў дзяўчыну і, перамагаючы ўсе перашкоды, стараецца ажаніцца з ёю, то звычайна гавораць: відаць, яна дала яму святаянскага зелля, разумеючы пад гэтым не ўсе наогул кветкі і травы, якія таксама называюцца святаянскімі, а менавіта адзін з гэтых відаў кветак.

**Куцця.** Слова «куцця» ў сялян атаясамліваецца з тымі днямі, калі адбываецца святочная вячэра. Назву гэту яна атрымала, відаць, ад куцці, якую гатуюць у гэтыя дні. Такіх свят усяго тры: напярэдадні Каляд, перад Новым годам і перад Вадохрышчам. На калядную куццю гатуюцца стравы з усялякага роду жорнавых круп: гароху, пшаніцы, ячменю, грэчкі і некаторыя з іх падсалоджваюцца мёдам. На куццю перад Новым годам гатуюцца мясныя стравы, а перад Вадохрышчам зноў посная ежа, толькі не ў такой колькасці, як перад Калядамі. Першая і трэцяя куцця — посныя, другая — багатая.

У гэтыя дні і больш за ўсё на першую куццю варожаць і прыкмячаюць. Перад Калядамі вечарам, падрыхтаваўшыся да свята, засцілаюць стол сенам, накрываюць абрусам, ставяць посную ежу і вячэраюць. Гэты звычай захоўваецца і ў вышэйшых колах грамадства. У час вячэры і пасля яе, яшчэ не ўстаючы з-за стала, выцягваюць з-пад абруса па адной сяннінцы і па яе даўжыні адгадваюць, які высокі вырасце лён. Пасля вячэры робяць назіранні, ці пратоптаны па двары снежныя сцяжынкі да чорнай зямлі і ці блішчыць блакітнае неба зоркамі. Першае сведчыць паказальнікам добрага ўраджаю грэчкі, а другое — шчаслівым і багатым прыплодам дамашняй жывёлы. Гэтыя назіранні робяцца пераважна на багатую куццю.

Дзяўчаты напярэдадні Каляд адгадваюць свой лёс. Выбягаюць на двор і прыслухоўваюцца, як брэшуць сабакі: у якім баку пачуюць брэх, адтуль і жаніх прыедзе. Падслухоўваюць размовы пад вокнамі суседзяў. Калі пачуюцца словы: «садзіся», «астанься», «пачакай», «яшчэ рана», «яшчэ паспееш» і да т. п., дык гэта азначае, што дзяўчына, якая падслухоўвала, у гэтым годзе яшчэ не выйдзе замуж. А калі скажа хто-небудзь: «ступай», «засядзеўся» і да т. п., то да каго б ні адносіліся гэтыя словы, дзяўчына з радасцю вяртаецца дадому. Калі будзе гаворка пра свяшчэнніка, свечы або пра дошкі, то дзяўчыну чакае смутная доля: або яна, або той, хто захоча да яе сватацца, павінны памерці.

Вяртаючыся з падслухоўвання, дзяўчаты, асабліва тыя, якія не падслухалі нічога пэўнага, яшчэ раз спрабуюць адгадаць свой будучы лёс: схапіўшыся наўгад у якім натрапіцца месцы за частакол або плот, вымяраюць яго да канца сажнямі, г. зн. колькі можна захапіць выцягнутымі рукамі: калі апошні сажань прыпадзе на цотны лік, то дзяўчына радуецца, да яе будуць сватацца, а няцотны лік засмучае дзяўчыну. Акрамя такога адгадвання, хапаюць як мага больш дроў на сваім двары, прыносяць у хату і лічаць — цот або няцот. Вывады тыя самыя. У той час як моладзь перад Калядамі займаецца адгадваннем свайго лёсу, працалюбівыя гаспадары стараюцца і клапоцяцца аб тым, каб быў зроблены пачатак усялякаму рукадзеллю і ўсім дамашнім работам, таму што з першага дня Каляд і да Вадохрышча наогул нельга нічога пачынаць, калі што яшчэ не распачата. Таму ў гэты вечар падрыхтоўваюць матэрыял для прадзення льну — кудзелю — і пачынаюць праці, матаць клубкі, віць вяроўкі, сукаць ніткі, шчапаць лучыну і да т. п. Не гнуць толькі абручоў, абадоў і палазоў, таму што такі занятак у гэты дзень мае шкодны ўплыў на прыплод дамашняй жывёлы: усё будзе нараджацца з крывымі нагамі

і іншымі недахопамі. Не вяжуць таксама памяло (яно вяжацца са свежых зялёных сасновых галінак). Тыя, хто не выконвае гэтага правіла, наклікаюць на свой дом пажар ад грому. Чым большы наматаюць клубок, тым лепш: такія будуць і качаны капусты; але намотваць клубкі трэба старанна, роўна, гладка і моцна, бо ў адваротным выпадку валы будуць слінявыя, г. зн. з рота будзе цячы сліна, будуць не моцныя ў плузе або ў іншай рабоце. Звязваюць яшчэ або спутваюць ногі стала, каб жывёла не пераскоквала плятнёў і не таптала пасеваў і каб не ўцякалі пчаліныя раі.

Сена, што ляжала пад абрусам у час вячэры, а ў некаторых месцах і астаткі ежы аддаюць раніцаю свойскай жывёле. Насенне, якое высыпалася на стале ад усялякай травы, з сена, старанна збіраюць і змешваюць з насенным збожжам, спадзеючыся, што гэта будзе засцярогай ад галаўні ў будучых каласах.

Багатая куцця перад Новым годам і посная перад Вадохрышчам не суправаджаюцца такімі абрадамі, як першая. Дзяўчаты варожаць, але ўжо без таго запалу і без той упэўненасці, якая натхняла іх перад Калядамі. Багатая куцця мала адрозніваецца ад святых вечароў. Уся розніца толькі ў багацці мясной ежы і віна.

Вадохрышчанская куцця адзначаецца сваімі рэлігійнымі асаблівасцямі. Да вячэрняга асвячэння вады захоўваецца самы строгі пост і нават пасля, на вячэры, не стараюцца піць і есці: няма віна і такой колькасці страў, як на першых дзвюх. Асвячонай вадой гаспадар абпырсквае дом і ўсе каля яго прыбудовы, а крэйдай надпісваюць тры крыжыкі на верхніх дзвярных і аконных вушаках, на свірнах, хлявах, на вуллях, упэўненыя ў тым, што надпісаныя крыжыкі праганяюць «нячыстую сілу», засцерагаюць ад чараўніцтва і захоўваюць у добрым стане ўсё жывое, што знаходзіцца па-за гэтымі крыжыкамі... Рэшткі крэйды захоўваюцца як лекавы сродак ад болю ў жываце.

**Каляды.** Кожны гаспадар забівае перад Калядамі адкормленага яшчэ з восені кабана або вепрука. Пра гэтага кабана гавораць: «забілі каляду» або «забілі к Калядзе». Гэтыя словы намякаюць часткова на ахвяру язычніцкаму богу Калядзе, або Ляду (Ладу). Пэўнасць такой здагадкі пацвярджаецца яшчэ тым, што звычай забіваць кабана перад Калядамі абавязковы для кожнага селяніна. Магчыма, у язычніцкія часы гэта было ахвярай Калядзе, або Ляду. Цяпер Калядамі сяляне называюць першыя дні свята. Калі гавораць «каляда», то пад гэтым словам разумеюць усё, чым надзяляюць тых, хто ходзіць па хатах з песнямі. Каляднікам, якіх гаспадары звальняюць са службы або якія самі

пакідаюць гаспадароў, паводле звычаю, даецца невялікі хлеб і маленькі кумпяк або пара каўбас, і гэты дар таксама называецца калядою.

На другі дзень Каляд для ўсіх работнікаў і работніц заканчваецца тэрмін службы, і калі хто хоча, каб у яго яшчэ год служылі, то павінен рабіць новы ўгавор. І пагэтаму гаспадары стараюцца да гэтага часу задобрыць тых са сваіх слуг, якіх хочуць пакінуць на наступны год: іх усяляк частуюць, дагаджаюць, «спагадваюць» ім ва ўсім. Работнікі са свайго боку ведаюць сабе цану, выказваюць сваю крыўду, незадаволенне, ідуць да бацькоў, сваякоў або знаёмых, прымушаюць упрошваць сябе, часам нават даволі доўга. Адсюль і прыказка: «На святы Сцяпан усякі сабе пан». Нарэшце ў карчме або ў хаце, выбранай калядпікамі для свайго часовага прытулку, іх частуюць гарэлкаю, і тут жа заключаюцца ўзаемныя абавязацельствы. Пры гэтым спяваюць:

Аддай пане, каляду,
Ужэ я ад цябе пайду.
Пайшла каляда калядуючы. Каляда! Каляда!
А за ёю хлопчыкі жабруючы,
Пайшла каляда па ляду. Каляда! Каляда!
Рассыпала каляду,
Ой вы, дзевачкі, не гуляйце,
Да ідзіце каляду пабірайце.

У Лявона куццю таўкуць,
Куць, куць, куць, ой, куццю таўкуць...

Пане-гаспадару,
Ты з божага дару,
Маеш хлеба-солі
І ўсяго даволі.
Гаспадыня гладка,
А ты ж наша матка,
Беражы ж ты гасцей,
Штоб ездзілі часцей.
Насі толькі фляжку
Альбо і біклажку.
У масле курыцу,
А хоць і палявдвіцу.
Добра нам гасціці,
Даюць есці, піці.
Адна толькі крыўда,
Што сваё насіці.
Каб адзежу далі
І так частавалі,
То б дадому
І не падумалі.
Славен панічу,

Ой, чым жа ён славен?..
. . . . . . . . . . . . . .
А мужычыная горкая доля,
Горкая доля кварта гарэлкі,
Кварта гарэлкі, цэбар мёду.
Кварта гарэлкі на выпіванне,
Цэбар мёду на пагулянне.
Пойдзем мы, гуляючы,
Вашы дары і богу яўны,
І людзям слаўны.

**Вечарынкі,** або **святыя вечары і ігрышчы.** Ад Каляд да Вадохрышча ў сялян бываюць так званыя вечарынкі, або святыя вечары і ігрышчы. З захадам сонца спыняюцца ўсе дамашнія работы і заняткі, нават тыя, якія пачаты на калядную куццю. Парушэнне гэтага звычаю продкаў цягне за сабою няшчасці, а часам і гібель усёй гаспадаркі — звядзецца, як гаворыць, хата, г. зн. разладзіцца, загіне ўся гаспадарка. Калі ж хто вымушаны будзе парушыць гэты звычай, то, каб пазбавіцца кары, павінен на другі дзень раніцай рассячы жэрдку ў сваіх пярэплатах.

Вечары гэтыя служаць не толькі адпачынкам ад бесперапыннай працы, але і сродкам абуджэння высакародных пачуццяў і ўдасканалення разумовых здольнасцей. Удзельнікі вечароў прыслухоўваюцца да баек і заўваг таленавітых казачнікаў і людзей, вядомых сваім розумам і вопытам.

На гэтых вечарах прапаноўваюць адзін аднаму загадкі, гуляюць у розныя гульні, танцуюць з прыпевамі і спяваюць песні.

Тут бывае і скрыпка або дуда — муцянка. Вельмі добра, што ўжыванне гарэлкі на гэтых вечарынках бывае самае сціплае; больш п'юць хіба ў корчмах, дзе ў гэты час таксама адбываюцца падобныя вечарынкі і дзе пераважна «чаляднікі» і «чаляднiцы» прагульваюць свой гадавы заробак. Зрэшты, такія гулянні ў корчмах трацяць ужо назву святых вечароў, або вячэрнікаў, і называюцца проста ігрышчамі. У апошніх прымаюць удзел толькі тыя з гаспадароў або гаспадарскіх дзяцей, якія, як гавораць, забываюць на сваю хату і аддаюць перавагу тым гульням, дзе адбываецца разгул і п'янства.

Песні на вечарынках, або святых вечарах:

Нядорага піва п'янае,
Да дорага пасядзеннейка,
Мужское пагуканнейка,
Мужское — гаспадарскае.
А ў бяседзе людзі добрыя,
Гукаюць яны, мужское

Усё добра знаюць,
Малайцоў і маладзіц навучаюць:
Як трэба гора гараваць,
Як айца, матку шанаваць,
Як трэба сваіх жонак любіць,
А малых дзетак дай ня глуміць...

Туман, туман на даліне,
Шырокі ліст на каліне;
Шырэй таго на дубочку,
Клічыць голуб галубочку...

Ай на моры, на цёмным азёры,
Дубраўка ты, дубраўка ты зялёная мая!
Пісар гусей ганяець, у скрыпачку іграець...

Гульні на святых вечарах: «Жаніцьба Цярэшкі», «Падушачка».

**Дажынкі** — свята заканчэння збору з палёў збажыны. Дажынкі адзначаюць гэтак: калі гаспадар вырашыў святкаваць дажынкі, або дажынаць хлеб, то напярэдадні гэтага дня сам ідзе да сваіх суседзяў і запрашае на наступны дзень колькі трэба жней, гледзячы па колькасці недажатай збажыны. Яму абяцаюць, і ён ідзе дамоў рыхтаваць на заўтрашні дзень пачастунак для гасцей. У дамоўлены тэрмін прыходзяць да яго запрошаныя, абедаюць, а пасля абеду ў поўдзень ідуць на поле дажынаць. Гаспадар таксама ідзе на поле і падрыхтоўвае там полудзень і гарэлку. Пачостка залежыць ад заможнасці гаспадара.

Калі на полі застанецца ўжо зусім крышку жыта, то ўся кампанія пачынае выполваць з яго траву. Гэта называецца «рваць бараду». Пры гэтым клічуць на дапамогу ваўкоў, мядзведзяў, лісіц і іншых звяроў, а самі каласы жытнія рве адна, выбраная зараней для гэтага дзяўчына (замужняй жанчыне або ўдаве нельга рваць гэтыя каласы). Вырваўшы каласы з зямлі, дзяўчына дзеліць іх на дзве часткі і кладзе іх крыжападобна на зямлю. На гэтым крыжы ўсярэдзіне, па баках і на канцах кладуць хлеб. Пасля гэтага ўсе разам вяжуць вялікі сноп, які называецца «баба». З краёў яго бяруць каласы і плятуць вянок. Выбраная дзяўчына сядзіць у гэты час на «бабе».

Калі сплятуць вянок, то дзяўчынкі маладзейшыя здымаюць тую, што сядзіць на «бабе», надзяюць ёй на галаву вянок і ідуць у вёску, падняўшы з зямлі вырваныя і складзеныя накрыж каласы. Як толькі выйдуць з поля на дарогу, пачынаюць спяваць песні:

Засцілай, пані, сталы і лавы,
Едзе да пані госць небывалы.

Плён нясём, плён,
З усіх старон.

Адчыняй, пані, новыя вароты,
Нясём вяночак з шчырага злота.
Плён нясём, плён...

А наш вяночак не па такому,
Кажда ветанька па залатому,
Плён нясём, плён ...

А наш вяночак ядвабам віты,
Не аддам яго за талер біты...

Дажалі жыта аж да дарогі,
У нашага пана харошыя ногі...

Дажалі жыта, выгналі ліса,
У нашага пана чырвонцаў міса...

Нашая пані выскачыла,
Нам бочку піва выкаціла...

Ой, на балоце зялёны жабы,
Дажалі жыта, былі і бабы...

Дзякуй богу за дажынкі,
Было піва і гарэлкі...

Цяпер у нас вайна была,
Ой, мы поле заваявалі,
Паном жыта дажалі,
Табе, пане, дажыначкі,
А нам дайце гарэлачкі...
І п'яненькага піва,
Штоб на той год добра
Вадзілася ніва...

## НАРЫСЫ НАРОДНАГА АБРАДУ, ЗВЫЧАЮ І ЎСЯГО БЫТУ

**Вялікдзень.** Вечарам на першы дзень гэтага свята збіраюцца і ўслаўляюць яго так званыя валачобнікі (валачоўнікі, валачобныя), скарочана валоўнікі. Назва ўзнікла ад слоў «валачыцца», «жабраваць», «прасіць». Найчасцей гэта маладыя хлопцы (жанчыны не ходзяць), вясковая бедната, маюць у сваім складзе хлопцаў-падгалоскаў або і музык, ходзяць з валынкаю, дудою, скрыпкаю ад хаты да хаты, з двара на двор, заходзяць да паноў і сялян, за слаўленне выпрошваюць і атрым-

ліваюць узнагароду: яйкі, пірагі, гарэлку або пачастунак... Свята гэтае супадае з пачаткам вясны, сяўбы і пачаткам года па старадаўнім календары (1 сакавіка). Старадаўнімі песнямі велічаюць гаспадароў з надыходам новага года («проціў новага лета», «проціў года новага», «проціў вясны краснае»), услаўляюць хлопцаў, дзяўчат, усіх членаў сям'і, жадаюць шчасця і поспехаў у новым годзе ў гаспадарцы, у рабоце і ў асабістым жыцці. Дзейныя асобы валачобнага гурту: пачынальнік, запявала; спевакі, якія адгукваюцца і падхопліваюць часам толькі прыпеў, памагальнікі, падхватнічкі; музыкі і скрыпкі, калі ёсць музыка; механоша (механошый) з вялікім мехам, як у перахожых калек або ў старадаўніх скамарохаў, які збірае ўзнагароду — сала, аб'едкі — і ходзіць часта з вялікаю палкаю, а на ёй таксама трымае кавалак сала або што-небудзь іншае. У сувязі з тым што яны бядней за гаспадароў, іх «жалуюць», узнагароджваюць і называюць часам «жалоўнікі». Наогул у іншы час, у Каляды, іх называюць калядоўшчыкамі. Ходзяць яны на першы дзень або і два-тры дні і ўвесь тыдзень (у гарадах святкуюць цяпер тыдзень, а ў вёсках спрадвеку толькі тры дні). Валачобныя песні, губляючы паступова свой духоўны воблік, выконваюцца ўсё часцей з прыпевам «спявайце», «лалым» («леля», «лада») і да т. п., па змесце яны часам набліжаюцца да жартоўных песень, а некаторыя падобны на «скамарошыну». У апошнім выпадку сярод валачобнікаў ёсць яшчэ і асвісты, падсвісты, жартаўнік, вастраслоў.

Надворайка нахмурылася,
Кума з кумам пасварылася:
Ці за яблычкі сажоныя,
Ці за дзеткі хрышчоныя?
Ні за яблычкі сажоныя,
Ні за дзетачкі хрышчоныя...

**Юр'еў дзень** беларусы-католікі цяпер зусім не святкуюць, праваслаўныя ведаюць і асенняга Юр'я, але святкуюць толькі вясенняга, 23 красавіка. У апошніх захаваліся часткова і вершы пра Ягорыя, прымеркаваныя да вясны, пачатку лета (гл. іх у выданні «Калекі перахожыя», вып. 2-і і 3-і). Але і католікі, і праваслаўныя ў веснавых песнях і дома, і пры першай працы на полі часта ўспамінаюць імя Юр'я: ён тут з'яўляецца часцей распараджальнікам вясны, які выпускае яе на зямлю разам з расою, з пашаю для жывёлы і да т. п. У гэтых песнях, паходжання дахрысціянскага, застаўся, аднак, своеасаблівы «свяшчэнны» прыпеў, прымеркаваны да свята. Сяляне да гэтага часу захавалі абрад — выганяць жывёлу свянцонаю вярбою. Гэта

свята пераважна пастухоўскае: яны раскладваюць на полі агонь, гатуюць любімую ежу, асабліва яечню з салам, без якой у гэты дзень не садзяцца абедаць. Спяваюць і пастухі-хлопцы і дзяўчаты, і ў полі і дома. Песні гучаць наступныя:

А Юр'ева маці,
Божа мілы, (2)
Па небе хадзіла,
З Юр'ем гаварыла:
— А Юр'ю мой, Юр'ю,
Падай Пятру ключы,
Зямлю адамкнуці,
Траву выпусціці,
Статак накарміці...

А Юр'ева маці
Па небе хадзіла,
Дзевачак будзіла:
— Уставайце, дзевачкі,
Галоўкі чашыце...

Юр'я, Юр'я,
Божа мой,
Падай ключы
Зямлю адмыкаць,
Бычка напасаць!
На Юр'еву расу
Бычка напасу:
— Бычок-трацячок,
Ці повен бачок?
— Яшчэ не повен,
З левым не ровен.

**Тройца.** Святкуецца ў беларусаў 3—4 дні, у католікаў — каталіцкая Тройца — адзначаецца 2 дні, пачынаючы з нядзелі наступнага тыдня, пасля першай Тройцы. Гэта славянскае дахрысціянскае свята называлі раней «Сеймік», або «Сямік». Яно і было першым веснавым святам: першы збор на ігрышчы, выхад у поле і ў лес, замольванне і завіванне дрэў, пляценне вянкоў, адгадванне лёсу, «кумаванне» з улюбёнымі кумамі і на гэтых зборах — першы веснавы торг або кірмаш, першая абшчынная размова, абмеркаванне спраў гаспадарчых, жывёлагадоўчых, земляробчых. Усе гэтыя асаблівасці Сейміка ў пазнейшую хрысціянскую эпоху пераразмеркаваліся і перайшлі да новых свят: Вялікадня, Юр'я, Міколы, Тройцы і г. д. Да Тройцы ад Сейміка перайшло ўпрыгожанне дамоў, дарог, вуліц, рагатай жывёлы ўсялякай зеленню, таму і само свята атрымала яшчэ адну назву: «Зялёныя святкі». Напярэдадні Зялёнага свята, ноччу, першы выезд у поле начлежнікаў з коньмі на

начлег, пры гэтым раскладваюць агонь, як на Купалу, гатуюць яечню, выпіваюць і танцуюць — у некаторых месцах гэта робіцца на Міколу.

Сеймік у Беларусі ўжо не адзначаецца гэтак, як ён захаваўся ў глыбіні Расіі,— з абрадамі, завіваннем і развіваннем, вянкамі і «кумаваннем». Усё гэта толькі ўпамінаецца ў беларускіх песнях як водгалас мінулага, без абраду. Інакш кажучы, песня зусім вызвалілася ад такога абраду, ад даўніны, стала голая. І таму большасць іх перайшла ў агульнавеснавыя, спяваюцца на працягу ўсёй вясны і нават летам, хоць ёсць у іх, упамінаюцца і вянкі, і загадкі, і «кумаванне». Усё гэта ўвабраў у сябе Купала. Адзіны астравок, дзе захаваліся траецкія, або сейміцкія, песні з абрадам, складае Піншчына, край, дзе беларускія асаблівасці змешваюцца з украінскімі (мы маем на ўвазе абрад «куста»). На другі дзень Зялёнага свята дзяўчыну тут убіраюць ад вянка на галаве да ног зялёнымі галінкамі, лісцем, травою, так што яна становіцца падобнай на жывы куст. Гэта абрад «куста». Яна ідзе спераду, за ёю парамі жанчыны, старэйшыя, потым малодшыя, у хвасце зусім малыя. Натоўп у такім парадку абыходзіць дамы з песнямі, збірае ўзнагароду, зносіць усё гэта ў адзін дом на пачастунак; там п'юць, гуляюць, танцуюць, нярэдка ўсю ноч, да самага світанку. Вось найбольш прыдатныя да гэтага абраду «куставыя» песні:

Да цераз сяло Багданаўскае
Шло войска усё ж дзявоцкае.
Да каменчане не здзівіліся,
Што ў Багданаўцы нарадзіліся.
— Бог вам даў, багданавачкі,
Што ў вас кусты ўсё кляновыя,
А вяночкі ўсе ж пярловыя.
А ў нас кусты ўсе лазовыя,
А вяночкі ўсе ж бярозавыя.

Да не сячыце да зялёнага гаю,
Да не рабіце да чысценькага поля:
Ў чыстым полі да рута і васількі,
А ў Багданаўцы дзеўкі-чарнабрыўкі.
Да руту і васількі — у вяночку завяну,
З чарнабрыўкаю свой век скаратаю.

Да каля куста сачавічанька густа,
А каля дуба дуброва зялёна,
Да па той дуброве да Агапка хадзіла,
На ёй сукня ў дробненькія хваўды,
Да любілі яе не нарокам, папраўды...
Да каля куста сачавічанька густа,
Хто ж тую сачавічаньку парве,

Той сабе красную панну вазьме.
Наш Сямёнка сачавічаньку парве,
Ён сабе красну панну вазьме.

Ой, пайду я, гдзе мне вясёленька,
Шчо лето-зіма дзерава зялёненька.
Майго бацюхны падворца вясёленька.
Пайду я, гдзе мне не весела,
Шчо лето-зіма дзерава не зелена,
Майго свякраткі падворца не весела...

«Куст» па часе яго святкавання, па складзе ўдзельнікаў і песнях падобны на сербскія Краліцы і яшчэ больш па ўбранні і ўпрыгожанні падобны на іх жа Дадолы (але апошнія ў іх адбываюцца пазней, летам, калі яны выпрошваюць дождж).

**Пятроў дзень (Пётра)** таксама святкуецца... з кірмашамі, арэлямі, ігрышчамі. У народных песнях, праўда, хоць і гаворыцца, што Пятро адмыкае пятроўку, як Юрый вясну, але пятроўка гэта адзначаецца спякотай, якая знясільвае працаўнікоў, напрыклад:

А ў гародзе гардовіца,
Цяжка хлопцам пятровіца...

**Купала.** У ім сабрана ўсё, што толькі ёсць у беларускіх сялян самага святочнага, таямнічага, цікавага, радаснага на працягу ўсяго лета, таму што ўвесь астатні час паглынае цяжкая праца пад спякотлівым сонцам сярод пяскоў і балот.

Вечарам 23 чэрвеня збіраюцца амаль усе жыхары хат і вёсак у полі, на горцы, каля ручая, рэчкі, вялікай ракі, выбіраюць найбольш прыдатнае месца. Верхаводзяць дзяўчаты, з імі нежанатыя хлопцы, адпаведна паруюцца, становяцца радамі, арганізоўваюцца ў карагод, гуляюць і замужнія маладыя жанчыны, а таксама бабулі, удовы, меншая роля адводзіцца астатнім, але ў цэлым жанчыны маюць перавагу. Дзяды і бабулі не гэтак актыўныя, але ўдзельнічаюць, п'юць, гуляюць, некаторыя з іх, як і зусім малыя дзяўчаты, застаюцца дома, няньчаць дзяцей і назіраюць за гаспадаркай. У хлопцаў-падлеткаў ёсць свае сябры, танцы і нават песні. Самы разгар свята — гульняў і песень — адбываецца ноччу на Івана. Робяць і прыбіраюць ляльку — чучала жаночае, носяць яе, танцуюць вакол яе, запальваюць, а потым топяць у вадзе. Купала — істота напалову мужчына, напалову жанчына, хоць гэта і ледзь прыкметна і вынікае перш за ўсё з песень. Сама лялька, аснова яе — гэта слуп або кол, да якога прымацоўваюць салому, лыкі, канапляныя вяроўкі, хворост, бярозкі. Галоўнае, аднак, без

чаго нельга абысціся на Купаллі, касцёр, які гарыць і згарае да апошняга або яго заліваюць вадою. На касцёр ідзе (кідаюць) дуб, салома, каноплі, а таксама бяроза, сасна і ўсё, што ёсць пад рукою. Агонь у некаторых месцах здабываюць трэннем сухіх дошак, часта кляпчын з разбітых бочак, кублоў, вёдзер, іншага дамашняга посуду — усё гэта потым ідзе на агонь разам з лапцямі, анучамі, лыкамі, буркамі.

Праз касцёр або агонь пераскакваюць, але менш, чым на Украіне і ў іншых краях. Вакол кастра больш ходзяць, танцуюць, гуляюць. Замест кастра або каля яго часам гарыць бочка, стараюцца, каб была смаляная, выбіраюць месца на пагорку або на крутой гары.

Агонь заліваюць кублямі (чан, цэбар з вечкам) і вёдрамі: часам распальваюць яго на вадзе, на плыце; рэдка цяпер купаюцца перад раніцай; замест купання ўжываецца лазня — ужо як сродак ачышчэння пасля купальскіх гулянняў. Разам з тым каля купальскіх кастроў, паблізу ад іх, у полі робяць сенцы, кусты, шатры з зялёнага галля, суччa. Само месца, дзе збіраюцца, абгароджваецца зялёнымі дрэўцамі, бярозкамі, калочкамі ў выглядзе зялёнага тыну, плятня. Гэтым адзначаецца мяжа свяшчэннага, запаветнага месца.

Да абраду адносяцца і купальскія песні, знарок узмоцненыя прытупваннем, стукам — гэта знаходзіць водгалас і ў прыпеве купальскіх песень. Там, дзе ёсць яшчэ дуда або можна яе дастаць,— без яе не абыходзяцца, пры ёй і дудар, і скамарох са скокамі, а калі няма — хоць скрыпка.

Ва ўбранні святкуючых галоўная ўвага звернута на жаночую галаву і абутак. Лапаць адыгрывае вялікую ролю ва ўсім абрадзе, у песнях і паданнях Купалы. Пачастунак складаецца з сыру, тварагу, прэсных перапечак — бабак (з тоўчаным канапляным семям, цыбуляю, часнаком, вострай зялёнаю прыправай), халоднага квасу, яечні і верашчакі, якая падрыхтавана з сала і мяса. Уся астатняя ежа на гэтым свяце, за выключэннем верашчакі, раслінная. Гарэлкі — як найбольш. І ў сувязі з тым што народу збіраецца шмат, то, вядома, выпіваюць цэлыя барылкі. Пусты, паламаны посуд потым гарыць у агні. Вядомае сваёй параўнальнай устойлівасцю ў маральных адносінах сямейнае жыццё беларусаў калі і адхіляецца дзе-небудзь у горшы бок, дык іменна ў час святкавання Купалы.

Значную ролю ў купальскую ноч адыгрываюць ведзьмы (чараўніцы). Па народным уяўленні, яны адпраўляюцца ў гэту ноч на Кальварыю (лац.) —Лысую гару, лобнае месца. Адпраўляючыся, садзяцца на коней і мучаць іх сваёю яздою. Каб не здарылася гэтага, беларусы развешваюць вянкі і асвячоныя

травы на канюшнях, моцна замыкаюць іх, вартуюць, не выганяюць коней на начлег, у поле і г. д. І ўсё-такі раніцаю коні быццам бы вельмі ўстрывожаныя, з іх валіць пар, у іх зблытаны грывы і да т. п. Ведзьма ў гэту ноч доіць чужых кароў, папярэдне напойваючы іх расою з агародаў; сама п'е малако ў склепе, есць сыр і ўсё малочнае. Засцярогай супраць вядзьмарства служаць вянкі і святаянскія травы, якімі ўпрыгожваюць рогі ў жывёлы, якія растыкаюць і развешваюць у хлявах, па вуглах і г. д., асабліва ластавіца, ластаўнік, вешаюць над дзвярыма забітую сароку, лучыну крыжам, грамнічную свечку і да т. п. Але ёсць яшчэ больш моцны сродак. Гаспадыня бярэ цадзілку і варыць яе ў гаршку разам са свянцоным зеллем... Ведзьма прыходзіць у хату і звычайна просіць пазычыць вядро, цэбар, рэшата. Яе ўжо чакаюць. І калі яна чаго-небудзь не ўхопіць, не «пазычыць» — хоць пясчынкі, то будзе сохнуць, хварэць і памрэ. Лепшы ласунак на Лысай гары, калі толькі паспеюць дастаць, нехрышчонае дзіця. І таму ведзьма прыкідваецца перад светам павівальнай бабкай і ходзіць па хатах. Нярэдка ведзьма становіцца Стрыгаю. Гэта жанчына вялікага росту, з расплеценымі валасамі, худая, з зялёнымі кашачымі вачамі. Сустрэўшыся з ёю, цяжарная жанчына абяцае ёй і за сябе, і за сваю радню дагаджаць ва ўсім. І сапраўды дагаджае. Інакш Стрыга можа нарабіць шмат бяды: яна можа падмяніць прыгожае дзіця на выродка, калеку або і зусім забіць, разбіць дзіцячую галаву на вачах у маці аб камень. Ведзьмы заломваюць у купальскую ноч жыта ў полі «на чатыры вуглы». Часам пад заломку кладуць вугаль, лушпайку ад яйка і кавалачак зямлі. Вугаль азначае, што гаспадар пагарыць, лушпайка — што абяднее, зямля — што памрэ. Гэта палохае сялян яшчэ больш.

Зелле, кветкі і травы ў купальскую ноч збіраюцца наогул усе, якія толькі патрэбны для рознага ўжывання, у тым ліку для вянкоў, лякарства і ежы: гэта лепшая пара. Але, як усюды ў славян і ў глыбіні Расіі, у Беларусі ёсць травы і кветкі, якія належаць выключна да купальскіх: рута, васілёк, дзягіль; багаткі, саладушка, буйрак, бурашнік; ластавіца, кураслеп, лапух; быліца; расходнік, браткі і больш за ўсё — папараць. Яна цвіце, паводле падання, толькі адзін раз у год незвычайнай цудоўнай яркай белай кветкай менавіта ў гэту ноч...

З сеяных і агародных раслін найбольшую ролю адыгрываюць на Купалу лён, каноплі, цыбуля, часнок. З дрэў у песнях і купальскім абрадзе ўпамінаюцца вярба, рабіна, дуб, бяроза, на захадзе — ліпа, елка, сасна; з кустоў — горда, гардовачка (радовачка).

З птушак асабліва актыўныя зязюля, сарока і ластаўка: птушкі наогул у гэтую ноч гавораць паміж сабою і з людзьмі. Дрэвы, асабліва дубы, пераходзяць з месца на месца, гавораць з кветкамі, галлём, шумяць.

Мову ўсяго жывога, раслінную і птушыную, можа пачуць толькі той, хто знойдзе кветку папараці...

Рэкі, па перакананні рыбаловаў, робяцца серабрыстымі.

Раніцай на золку ўсё павінна скончыцца купаннем. Пасля купання ўсе ідуць глядзець узыход сонца: яно «іграе» ў гэту раніцу, «дрыжыць», пераліваецца, раздзяляецца на некалькі частак, кругоў, якія разбягаюцца, разыходзяцца, зноў зыходзяцца ў адзін круг.

Раніца 24 чэрвеня — перадом, пасля якога наступае ўжо Іван (Ян).

Найбольш характэрныя купальскія песні:

То-то!
— Хто ў нас на дзеўкі лас?
То-то!
— Да ў нас Яначка на дзеўкі лас,
То-то!..

Сягоння Купала, заўтра Ян!
Будзе, дзяцюкі, ліха вам...

Купала наша, Купала!
Дай нам катлы золата!
Вот салодушка цвецёць;
Я ўсяду пры ёй,
Пранaчую пры ёй,
Падсцерагу красачку,
Сарву папыратку,
Буду багач — багатыр:
Закуплю я весь свет,
Не пайду я на прыгон
І буду спаць у клеці
Лепшы майго пана!
На гарэ дуб'ё пагарэла,
На вуліцы дзецюкоў пагалела:
Ідзіце, дзецюкі, дуб'ё тушыць
Да рашотамі воду насіць!

**«Каляда»** па-беларуску вымаўляецца з націскам на апошнім складзе (Каляда, Калядкі, Калядзіца). Мяркуючы па песнях, гэта вышэйшая істота, якую, як і Купалу, чакаюць, сустракаюць, частуюць і г. д. Абрысы яе вельмі цьмяныя, невыразныя. Істота гэта двухполая: мужчынска-жаночая, менавіта Каляда-Аўсень, Каляда-Таўсень, Каляда-Мароз, гэтаксама, як Купала-Іван...

Больш выразна яна выглядае ў святочным абрадзе.

# КАЛЯНДАР ПАВОДЛЕ НАРОДНЫХ ПАДАННЯЎ

## I

...Народныя святы складаюць у паўсядзённай практыцы пакуль што адзіны спосаб уліку часу, таму што ў народзе не шмат хто ведае назвы месяцаў і размеркаванне часу па календары, а найчасцей вызначаюць час гэтак: за два тыдні да калядных Запустаў нарадзілася Настуля, праз гэтулькі дзён пасля Каляд парабак приступіў да працы, за гэтулькі дзён да Міколы сеяў тое ці гэтае, пасля Прачыстай выйшла замуж праз столькі і толькі часу і да т. п. Народная гаспадарчая метэаралогія таксама моцна звязана са святочнымі днямі, да якіх прымацаваліся пры пэўных акалічнасцях розныя прыкметы, забабоны, прымхі, спецыфічныя абрады, таму што на народныя паданні наклалі свой адбітак і жывое асяроддзе каталіцызму, і застарэлая унія, і агульнаславянская міфалогія, хоць вядучую ролю і адыгрывалі элементы праваслаўя.

Як жа народ вызначае час надыходжання сваіх свят? Даволі цікавым спосабам, ды так, што непісьменныя, без усялякіх дапаможнікаў, сяляне, асабліва пажылыя, трымаюць у галаве каляндар на ўвесь год, па якім вызначаюць не толькі святы, але і прысвяткі. Я сустрэўся з гэтым цікавым календаром пры такіх акалічнасцях. У нашым прыходзе раней было свята св. велікамучаніцы Параскевы, 28 кастрычніка. У часы прыгону, калі сяляне адбывалі паншчыну, гэты дзень лічыўся рабочым, і таму дарэмныя былі заклікі пастыраў на храмавое свята. Так яго і не святкавалі. Але пасля прыгону нам, абодвум святарам прыходу, прыйшло ў галаву аднавіць свята. Аб'явілі мы народу загадзя пра гэты дзень свята, запрасілі суседніх святароў на ўрачыстасць, і калі наступіла свята, сабраўся народ, заканчвалася ўжо ранішняе служэнне (пачатак у 8 гадзін), як мяне раптам просяць да хворага за 8 вёрст. Я паехаў, выканаў адправу, але на адваротным шляху выгаварваў свайму фурманшчыку за тое, што, нягледзячы на нашы неаднаразовыя просьбы і папярэджанні, яны стараюцца выклікаць да хворага не ў будні дзень, а ў святочны, калі ў царкве служэнне, і вось я цяпер рызыкую не паспець на абедню ў дзень свайго храмавога свята.

— Гэта для мяне прыкра,— сказаў я яму.— Хіба ты не ведаў, што сёння дзень свята нашай святой Параскевы?

— Ды чаму ж я не ведаў,— адказаў ён,— мы із веку заўсёды святкуем Параску.

— Ой, брэшаш, мусіць, таму што ў вас не збіраліся раней у гэты дзень на храмавое свята.

— Можа дзе і не святкавалі, але наша вёска заўсёды святкавала, і я табе, отчыньку, скажу, чаму: ці бачыш, быў калісьці выпадак такі, што праз панскую работу да гэтага самага дня адзін гаспадар не паспеў выараць сваёй бульбы, дык ён у гэты дзень адправіўся з валамі на бульбішча, хоць яго суседзі і перасцерагалі, што дзень Параскі — нельга. «Нічым, а раздзяру гэта свята?» — сказаў ён і пайшоў алешнікам. Як увагнаў валы ў гэту кудру, то ні назад ім, ні наперад. Рвануў і раздзёр валы на месцы. Вось з таго часу ні-ні не робім у гэты дзень.

— Гм, ды як жа ты вылічыш, у які дзень свята Параскі? Мне здалося, што ён спрытна выкручваецца.

— Як? Ды вось як: ад Пакровы (1 кастрычніка) першая Параска (14 кастрычніка) праз два тыдні, без аднаго дня. Калі Пакрова ў нядзелю, то першая Параска праз два тыдні — у суботу, а ад гэтай Параскі да другой Параскі (28 кастрычніка) таксама два тыдні і таксама ў суботу.

Прызнаюся, мяне, чалавека, які прывык звяраць святы па календары, здзівіў такі вынаходлівы спосаб вызначаць па памяці нават дробныя нязначныя святы, але тады было не да таго, а пазней я больш дэталёва пазнаёміўся з народнымі каляндарнымі паданнямі. Зрэшты, мае даведкі ў маладых грамацеяў былі дарэмныя: яны таксама прывыклі кіравацца друкаваным календаром.

— Ды як жа нам угадаць,— кажуць яны,— глянем у кнігу, дык і ведаем, калі крыжык курсіўнымі літарамі напісаны, то гэта свята.

Толькі пажылыя гаспадары, асабліва бабы, вядуць свой арыгінальны лік часу, але гэтыя вельмі неахвотна адказваюць на няўдачна пастаўленыя пытанні. Ім дзіўным здаецца, чаму свяшчэннік пытае, калі ён лепш за іх ведае, калі якое свята, ды яшчэ аб гэтым робіць аб'яву ў царкве; не, тут нешта іншае. Трэба неяк markознымі пытаннямі пра тое, якой зімы ці вясны нам чакаць, закрануць народныя прыкметы і паданні пра святы.

— Паслухай, такая і такая, скажы, на якім тыдні будзе такі і такі прысвятак?

Тая здзіўлена паглядзіць і скажа:

— Не ведаю, я тыкеля ведаю: улій ды выеж.

Рашуча адмовіцца і потым сваім дзе-небудзь намякне: «Бацюшка з мяне жартуе». Я паклічу яе да сябе.

— Ну, паслухай, павер, што пытаю не дзеля жарту, але, бачыш, аднойчы выходжу ў нядзелю з царквы, пасля абедні, і чую, як бабы гавораць між сабою: «І чаму гэта бацюшка не

сказаў, што заўтра свята?» Якое, думаю, свята, гляджу па кніжцы — невялікае царкоўнае свята. Калі б ведаў, што народ прывык у такія дні святкаваць, запрасіў бы прыйсці на маленне.

— Гэта праўда, і мяне задзівіла, што бацюшка на такі і такі дзень нічога не сказаў народу.

— Ну, вось бачыш, таму я і хачу сабраць звесткі, каб ведаць, якія тут у вас дні лічацца святочнымі.

Пасля гэтага яна адкажа бадай ужо на ўсе пытанні.

— Вось бачыш,— скажу я ў захапленні,— святкуеце вы нават і невялікія нашы рускія царкоўныя святы. І як гэта табе ў галаву прыходзіць, калі трэба адзначаць такія невялікія святы? Ці ты гэта сама вылічыла, сваёю галавою дадумала, ці цябе хто навучыў гэтак вылічваць?

— Як гэта сама? Гэта ўжо спрадчасоў карта карце заказвае (г. зн. пакаленне пакаленню перадае).

Які трапны выраз пра пераемства народных паданняў! Зрэшты, такія паданні не збярэш ад адной асобы, тым больш што ў адных вёсках пэўныя дні святочныя, а ў іншых — рабочыя. Ёсць свае святы ў вёсках каля рэчак, асобныя ў палевікоў і ў лесавікоў, у рыбаловаў, у пчаляроў і да т. п.

## II

Вось якія вывады перадае карта карце адносна вызначэння святочных дзён. Скажу пры гэтым крыху аб народных звычаях, звязаных са святамі. Народ вядзе асобна ўлік свят, якія, па яго словах, пільнуюць аднаго тыдня (трымаюцца адной сядміцы — непераходзячыя), і такіх, што змяняюцца (пераходзячыя). Разгледзім спачатку пераходзячыя святы, якія залежаць, як вядома, ад дня Вялікадня. Месяц і дату Вялікадня сяляне самі папярэдне без абвяшчэння свяшчэннікам дня Запускаў вызначыць не могуць, але мяркуюць, акрамя таго, па тым часе, да якога не адмаўляюць маладым запісвацца для абвяшчэння ў царкве аб іх жаданні ўзяць шлюб. Або высвятляюць у грамацеяў па друкаваным календары. Ведаюць толькі, што Вялікдзень святкуецца заўсёды пасля поўні (у апошнюю квадру), а Запускі, што перад Вялікім постам,— заўсёды маладзіком. Гэтаксама, калі Запускі (сырныя) выпадаюць на маладзіку, сяляне ведаюць, колькі будзе працягвацца Мясаед і разам з тым калі будзе Вялікдзень, гледзячы па тым: калі маладзік настае ў Каляды, то Мясаеда будзе 8 тыдняў, а калі на Новы год, то Мясаед доўгі — 9 тыдняў, уключаючы Масленіцу. Зрэшты, пра даўжыню Мясаеда больш ці менш прыблізна мяркуюць па Мясаедзе мінулага года. Калі, напрыклад, у міну-

лым годзе Мясаеда было 6 тыдняў (з Масленіцы, як лічаць у нас у народзе), то ў гэтым годзе Мясаеда будзе 9 тыдняў (без Масленіцы — 8), а ў наступным годзе — толькі 7 тыдняў (па царкоўным уліку — 6) і вельмі добра ведаюць, што Мясаеда 4 тыдні і менш ніколі не бывае. Падлік па Мясаедзе мінулага года, вядома, не заўсёды апраўдвае сябе, але ў цэлым правільны. Велічыні велікодных гадоў складаюцца, як вядома, з 50, 51, 54 і 55 тыдняў; і хоць парадак чаргавання іх самы зменлівы, але найчасцей атрымліваецца, што пасля года велічынёю 51 тыдзень ідзе год з 55 тыдняў, потым 50 тыдняў. Напрыклад, бліжэйшыя да нас велікодныя гады:

Велікодны год 1859/60 — 51 тыдзень, 1860/61 — 55, 1861/62 — 50, 1862/63 — 51, 1863/64 — 55, 1864/65 — 50, 1865/66 — 51, 1866/67 — 55, 1867/68 — 50 тыдняў.

Таму часцей атрымліваецца прыблізна, прымаючы пад увагу толькі тыдні, не зважаючы на лішнія дні, што пасля 6 або 7 тыдняў Мясаеда ідуць 9 або 10 тыдняў, а потым 7 або 8 тыдняў, уключаючы Масленіцу, так у нас лічаць. Тыдзень Масленіцы таму ідзе ў лік Мясаеда, што сяляне ў гэтым краі пад уплывам каталіцызму, у часы уніі, прывыклі есці мясное ў гэтыя дні: і таму трымаюцца гэтага правіла, што тутэйшая мясцовасць зусім не багатая пашаю для жывёлы і масла — прадукт вельмі дарагі. У некаторых бедных сялян не знойдзецца лыжкі масла да аўсянкі. Таксама нават і самая дробная рыба ў нас рэдкасць. Аднак сяляне пушчавыя (што ў лесе), тыя на Масленіцу не ядуць мяснога і строга прытрымліваюцца гэтага, таму што на свой ужытак маюць масла. Некаторыя сем'і палявых сялян таксама не ядуць мяса на Масленіцу, калі здарыцца што-небудзь ці дадуць абяцанне.

На Масленічным тыдні не адбываецца ў нас ніякіх забаў, людзі не ўмеюць так павесяліцца, як велікарусы: ні арэлямі, ні катаннем не пацяшаюцца, запрашэнняў адзін аднаму не робяць; блінамі таксама Масленіца не адзначаецца, таму што бліны падаюць на кожны, як гавораць, багаты стол з выпадку свята. Вядома, сяляне не прапусцяць моманту наклюкацца віна, аднак нельга сказаць гэтага пра ўсіх. На Запускі звычайная ежа, акрамя бліноў і розных страў (кіслага, прэснага), гэта: верашчака (г. зн. каўбасы і саланіна, паджараныя з падліўкаю і блінамі), кішкі, начыненыя крывёю з крупамі і запечаныя, сяканка і да т. п.

У Вялікі пост на першым тыдні вельмі мала прычашчэнняў. Магчыма, гэта таму, што прыхаджане любяць часта спавядацца і лічаць, што вельмі шмат часу засталося б ад пакаяння да Вялікадня. З трэцяга тыдня збіраецца да 500 прычашчэнняў.

У пост перабіваюцца самаю простаю ежай, сырой і варанай: капустай, буракамі, бульбай, бобам, гарохам, аўсяным кісялём і інш. Замест алею заціраюць сырымі каноплямі. Мала ў каго ёсць насушаная ў печы на саломе рыба або мёд. Агуркоў не соляць.

У сераду, на чацвёртым тыдні Вялікага посту, так званае Серадапосце, або часцей Хрэсцы — да паўдня працуюць, а гаспадыні ў гэты час пякуць «хрэсцы», г. зн. пірагі (часам пшонныя), накрыж кочаныя, з макам, мёдам або, калі бедна, з каноплямі. Чаму гэты дзень і пірагі называюцца «хрэсцамі», невядома; відаць, таму, што царква гэты тыдзень называе крыжапаклонным — у гонар крыжа. Пякуць яшчэ ў гэты дзень акрамя крыжападобных пірагі на манер гаспадарчых прылад пад назваю: «саха», «каса», «сярпы», г. зн. з цеста пякуць піражкі накшталт сахі з ярмом, увагнутай касы, сярпа, бараны (пірог сам круглы з пакладзенымі на ім зверху маленькімі піражкамі, каб нагадваў барану). Хлопчык пры гэтым просіць спячы яму пужку, і яму спякуць доўгі шылаваценькі піражок: няхай, маўляў, кожны сваім цешыцца. Пасля паўдня народ зусім не працуе ў гонар свята Серадапосця, і тады стол узбагачаецца селядцом, гарэлкаю, півам і да т. п.

У Вербную нядзелю людзі прыходзяць у царкву з вялізнымі пукамі вярбы, ядлоўцу і да т. п. Хлопчыкі пасцёбваюць адзін аднаго вярбінаю, гаворачы: «Не я б'ю, вярба б'е, за тыдзень Вялікдзень». Першы раз выганяюць жывёлу ў поле абавязкова вярбінкаю.

У «чысты» чацвер, паводле народнай назвы, або інакш у Вялікі, лічаць патрэбным да дня падмесці хату, каб усё лета блох не было, мыць галаву, каб увесь год была чыстая, а хто ў гэты дзень адважыцца з раніцы «пакупацца» па марозе, то ўпэўнены, што ён не будзе хварэць цэлы год.

У Вялікую суботу яшчэ раніцай у многіх сялян усё гатаванне да Вялікадня закончана. Звычай спраўляць свянцонае, г. зн. накрываць асвячоны велікодны стол з сытнаю халоднаю ежай, захоўваецца ва ўсёй Заходняй Расіі. Багацце свянцонага ў сялян абмяжоўваецца пшонным кулічом (шмат у каго самым чорным), хлебнымі перапечкамі (падрыхтаванымі, між іншым, для бедных), печаным парасём, кавалкам варанай ялавічыны або цяляціны, смажаным пеўнем, а лесавыя аматары рыхтуюць сабе на гэты выпадак сёе-тое з дробнай дзічыны. Усё гэта складваюць у лубку (авальную каробку з кары), у якой парася з паднятымі ўверх ножкамі і абавязкова з хрэнам у роце займае самае галоўнае месца; каля яго пакладуць каўбасу, свежы сыр, гаршчочак масла, жменьку солі і некалькі яек, пафарбаваных

цыбуляй, драўлянай карой або бярозавымі пупышкамі... Заўсёды кладуць адно абабранае яйка і з такімі лубкамі чакаюць у суботу прыезду свяшчэнніка для асвячэння. Свяшчэннік на сваёй фурманцы па раней аб'яўленым маршруце аб'язджае ўсе аддаленыя куткі свайго прыхода і над выстаўленымі ў рад лубкамі чытае малітвы, акрапляе брашна і едзе далей, надзелены ад кожнай лубкі валачобнымі (пафарбаваным яйкам) і кураком (булачкаю чорнага хлеба вагою ў 2 фунты — для рабочых). На велікодную ютрань народ з далёкіх вёсак збіраецца загадзя, і яшчэ з вечара можна заўважыць цэлыя гурты пілігрымаў з закінутымі на плечы святочнымі ботамі, чаравікамі і іншым уборам.

У ранейшыя часы, да мяцяжу, ноччу прыходзілі пад вокны хоры валачобнікаў па валачобнае (г. зн. велікоднае яйка) з велічальнымі песнямі ў гонар гаспадароў і іх дзяцей. Вось некаторыя з гэтых песень.

а) Гаспадару і гаспадыні:

Ой, чы дома, пане гаспадару?
Ой, віно ж, віно зеляное.*
А хоць дома — не акажацца,
Ў казловыя боты абуваецца,
Пойдзе ў поле жыта глядзець,—
На гарэ пахілілася,
Ў даліне ў трубы павілося.
Часта, густа на небе звёзды,
Часцей, гусцей на ніве копкі.
О дай, божа, ў добрым здароўі
Да дому звазіць, ў тарпы злажыць.
О дай, божа,— ў торпе прыкладна,
На таку ўмалотна, ў арудзе прысыпна,
Ў млыне прымольна, ў дзяжы падыходна,
Ў печы румяна, на стале сытна,
Ў сям'і зладна.
Пане гаспадару, не тамі гасцей,
Надары барзджэй,
Невялікім дарам, бітым талярам.
Наш дар невялік, дзвермі не ходзіць,
Праз акно шые (даецца):
Пачынальнічку па дзесятнічку,
А механошу па тры грошы,
А музыцы горкая доля,
Горкая доля — кварту гарэлкі,
Сыру на тарэлку, пірог на закуску.
Гаспадыня! Твая рэч —
Скавародку — ў печ, а па сланіну — ў клецьь.

* Прыпеў паўтараецца пасля кожнага радка.

б) Хлопчыку:

Ой, у полі межа,
Ой, віно ж, віно зеляное.*
Цераз тую межу куна бяжыць (або сокал),
А малады Федзенька меціць,
Меціць, хоча куну забіць,
Меціць, меціць, хоча застрэліць.
Стала ж яна ў яго прасіціся:
— Маладзенькі Федзенька,
Не бій мяне, не страляй мяне.
Ой, як будзеш жаніціся,
Буду я табе ў адгодзе,
Ў вялікай прыгодзе,—
Я тваю панну перанясу,
Я цябе маладога перавязу,
Я тваго каня ўплаў пушчу.
Маладзенькі Федзенька!
Не тамі гасцей, надары барзджэй.
Наш дар невялік, дзвярмі не ходзіць,
Праз акно шые:
З вялікіх паноў хоць па сто рублёў,
З меншых паноў — па трыццаць рублёў і г. д.

в) Дзяўчынцы:

На сінім Дунаі, на белым камені,
Ой, віно ж, віно зеляное.*
Красная панна, слічна маладзенька,
Красная панна, слічна маладзенька,
Слічна маладзенька, маладая Надзенька,
Ручкі мыла, персцень ураніла.
Пашла ж яна кала беражочку,
Кала беражочку, па жоўтым пясочку.
Ўстрэла ж яна трох рыбалоўнічкаў.
— Вы рыбалоўнічкі, вы брацікі,
Закіньце ж мне шаўкоў невад,
Злавіце ж мяне срэбран персцень,
Буду я вам у адгодзе, ў вялікай прыгодзе:
За аднаго сама пайду,
За другога сястру аддам,
За трэцяга хоць таварышку;
Сястру аддам ў злоце,
Таварышку ў аксаміце,
Сама пайду ў розуме.
Маладая Надзечка, не тамі гасцей і інш.

Ляцела сойка сахацістая,
Ой, віно ж, віно зеляное.*
Пагубляла пер'я пазлацістыя.
Выйшла, выбегла красная паннанька,

* Прыпеў паўтараецца пасля кожнага радка.

Слічна, маладзенька, маладая Надзенька,
Тое пер'е падабрала, ў рукавец склала,
Панесла ж яна да да злотнічка.
— Ой, вы злотнічкі, вы работнічкі,
О скуйце ж мне тры надобейкі:
Першае надоб'е — руцвяны вянец,
Другое надоб'е — срэбран персцень,
А трэцяе надоб'е — залаты кубак.
Руцвяны вянец, што вянчаціся,
Срэбран персцень, што мяняціся,
Залаты кубак, што вітаціся.
Красная панналька, слічна, маладзенька,
Не тамі гасцей, надары барзджэй і г. д.

З паўдня народ ужо цэлым натоўпам збіраецца на вячэрню. Уся царкоўная плошча стракаціць істужкамі, хусткамі, уборамі. Пасля малення пачынаюцца гульні: горкі, з якіх скочваюць яйкі, або гуляюць у біткі, або калышуцца на арэлях. Амаль увесь светлы тыдзень народ не працуе. Акрамя першых трох дзён вялікага свята, у сераду, якая лічыцца Градаваю, каб пазбегнуць стыхійнага бедства, таксама не працуюць. У чацвер — кірмаш на рынку — таксама не да працы: хто жывёлу купляе, хто прадае, хто выменьвае, хто выводзіць паказаць знахару жарабят або цялят паглядзець у рот, ці асуджаны яны, маўляў, лёсам на з'ядзенне ваўкам. Сяляне раз-пораз гарцуюць на конях, выпрабоўваюць іх. У пятніцу, тым больш першую пасля вялікага свята, народ устрымліваецца ад працы, як гавораць старажылы, «дзеля царквы». Такіх пятніц за год святкуецца мясцовымі жыхарамі некалькі. Не кожны, вядома, цяпер можа растлумачыць, чаму гэтыя пятніцы так ушаноўваюцца. Некаторыя памятаюць, што раней у гэтыя пятніцы былі кірмашы. А ў пятніцу кірмашы адбываліся, як гавораць у народзе, таксама «дзеля царквы». Я са свайго боку думаю, што кірмашы адбываліся ў пятніцу яшчэ і таму, што слова «пятніца» — гэта пераклад грэчаскага імя Параскева, якім называлі вялікую пакутніцу, што нарадзілася ў гэты дзень, і яе бацькі гэты дзень адзначалі постам. Вымаўляючы «Параскева» — грэчаскае імя пакутніцы, Руская царква атаясамлівае з ім пераклад гэтага слова на нашу мову, таму што пераклад азначае і тлумачэнне, якое дала сама пакутніца на сваёй мове перад сваімі ка́тамі, якія пыталіся ў яе пра сэнс гэтага слова.

У гонар таго, што Валожынская царква насіла імя Параскевы, або Пятніцы (па дакументах 1710 г.), і наладжваліся тут з даўніх часоў кірмашы ў тыя пятніцы, якія ідуць пасля важных свят і ў якія народ да нашых дзён не працуе, асабліва ў пятую пятніцу і дзесятую пасля Вялікадня.

Наступнае свята Пяцідзесятніцы завецца ў народзе «Сёмуха» (таму што да яго ад Вялікадня сем тыдняў). Гэта тое, што і Сямік.

Людзі прыносяць у гэты дзень кветкі ў царкву, бярозкі таксама. На наступны дзень больш, чым у іншы час, бярэцца шлюбаў, таму што гаспадары маюць на ўвазе гарачы час касьбы і жніва, калі вельмі патрэбны сем'янін. Вечарам у гэты самы дзень адбываецца пастушковае свята. Пастушкі выпрошваюць тады ў гаспадароў сала, яйкі, пірог і на начлезе раскладваюць агні, спраўляюць балёк, г. зн. пражаць яечню, п'юць гарэлку, гуляюць і весяляцца.

На наступны, дзевяты, тыдзень ад Вялікадня, у чацвер, святкуецца так званы Дзевятнік. Тутэйшая заходнеруская царква ўрачыста адзначае яго «як векапомнае ўз'яднанне уніятаў з праваслаўнымі», і праводзіцца ў гэты дзень хрэсны ход, і ў нас таксама. У гэты дзень зноў ставяць бярозкі для ўпрыгожання царквы, а прыхаджане прыносяць з сабою на малебен зелле, г. зн. кветкі, вянкі траў, якія захоўваюць да Іванава дня.

На дзесятым тыдні Вялікадня, у пятніцу, якая і называецца «Дзесятая», народ у нашым прыходзе не працуе а-ні-га (нікольькі), шануючы сваю царкву Параскеву-Пятніцу. Зрэшты, і ў іншых месцах Дзесятуха святкуецца «дзеля граду», і гэта трэба тлумачыць ранейшым уплывам — запалохваннем громам і градам.

Адносна шанавання дзён пераходных свят трэба сказаць яшчэ пра Пятроў пост. Працягласць яго, як вядома, залежыць ад ранняга або позняга Вялікадня. Калі пост большы, у народзе гавораць: Тройца большая, калі меншы: Тройца меншая. На жаль, у нас не ўсе прыхаджане своечасова пачынаюць гавець перад Пятровым постам. Сяляне пушчавыя і рачныя посцяць у адпаведнасці з патрабаваннямі царквы, некаторыя, аднак, посцяць два апошнія тыдні да Пятрова дня. Гэта можна растлумачыць адсутнасцю рыбы і нават канапель у гэты час і палявымі работамі. Зрэшты, гэта няпосціца некалькі дзён укаранялася стагоддзямі, праз унію; але і іншае трэба адзначыць, што ў час посту і хворы не адважваецца аскароміцца, задавальняецца ежаю самаю мізэрнаю. Пятроў пост — звычайна хлеб з цыбуляю і квасам, аўсяная мілта і да т. п.

**Нерухомыя святы і прысвяткі.** Хоць свяшчэннік заўсёды аб'яўляе, калі наступаюць важныя святы, але ў галаве ў селяніна дні гэтых свят маюць свае супастаўленні, а ў залежнасці ад іх супастаўляюцца і прысвяткі (невялікія святы). Народ не ведае даты і месяца свят, але вызначае іх па тым, якога яны тыдня пільнуюць пасля Каляд. І сяляне загадзя ведаюць, коль-

кі яшчэ тыдняў да такога і такога свята. А ў які дзень тыдня яно наступіць, аб гэтым мяркуюць па днях мінулагодняга падліку: яны памятаюць, што мінулы год такое і такое свята было, дапусцім, у панядзелак, значыць, у гэтым годзе будзе ў аўторак. Калі высакосны год, які пераступае такі лік праз дзень, то пра высакос, або па-тутэйшаму праз год пераступны, або прыбышовы, мяркуюць па тым, у які дзень прыйдзецца святкаваць Саракі (9 сакавіка), таму што гэта першы сакавіцкі прысвятак адразу пасля прыбышовага дня 29 лютага. Калі Саракі выпалі не ў той дзень, у які трэба было іх чакаць пасля мінулагодняга тэрміну, але на дзень пазней — значыць, год пераступны, і ўжо на дзень пазней будуць святкавацца ўсе наступныя святы.

Напярэдадні Каляд, вечарам, на куццю спраўляюць на хатах куццю з некалькіх посных страў, прыкладна: селядца, верашчакі, селядца з цыбуляю і поліўкаю (соусам), аладак (жараных на алеі), крупніка, кіслага аўсянага кісялю, груцы (тоўчанага ячменю) з сытою. Ядуць на падасланым пад абрусам сене на ўспамін аб тым, што Хрыстос нарадзіўся ў яслях на сене.

Нараджэнне Хрыста, па-простанароднаму — Ражаство, а часцей Каляды, хоць апошняе слова паходжання язычніцкага, але ўжываецца ў сэнсе «святкі». Калядаваць — значыць услаўляць Каляду, даць — надарыць дзеля свята Новага года каўбасою, хлебам, лапаткаю. Каўбасы і кішкі складаюць неабходную прыналежнасць каляднага стала. Каўбасу і лапатку нясуць, хто набожны, і ў царкву на карысць прычту; каўбасою і хлебам надзяляюць і слуг, якія пакідаюць сваіх гаспадароў звычайна на другі дзень свята (дзень св. Іосіфа), пасля дадзенага ім абеду. Гэта самы клапатлівы і непрыемны час для гаспадароў. Адначасова разам усюды, у адну хвілінку, насуперак святочнаму настрою слугі раптам патрабуюць разліку і пакідаюць службу, рэдка якія застаюцца на ранейшым месцы. Кожнаму парабку і парабчанцы важна ў гэты час пажуіраваць на ігрышчах, пра хлеб надзённы ніякіх пакуль клопатаў, таму што ў сувязі з адыходам гаспадар дасць на дарогу булку хлеба, прынамсі фунтаў 20—30, ды яшчэ каўбасу, кавалак саланіны. Сустрэчных па булках хлеба, якія яны ледзь нясуць, можна пазнаць, хто вольная птушка, хто яшчэ не наняты. Слугі ў гэты дзень цану сабе ведаюць, і таму вельмі разумеюць нараўленне і ліслівасць гаспадароў, якія, так сказаць, бясконца павінны ўпрошваць іх.

Іх шукаюць ад самага ранку па ўсіх корчмах, і там, як на біржы, заключаюцца ўсе пагадненні, пры гэтым часам выпрош-

ваецца адтэрміноўка на некалькі святочных дзён — пагуляць на ігрышчах. Многія гаспадары сярэдняга класа і ўладальнікі-арандатары застаюцца ў гэтыя дні без чалавека ў людской і вымушаны самі паіць сваю жывёлу, бывае, звяртаюцца за дапамогаю да пасрэднікаў, каб наняць парабкаў. Іншы раз парабак і наймецца, а на наступны дзень дае драла...

На ігрышча збіраюцца пераважна парабкі, хлопцы і дзеўкі — у карчму, дзе пад гукі безупынна пілікаючай скрыпкі моладзь адтопвае свае самыя няхітрыя танцы, у якіх хлопец паказвае ўсю сваю размашыстасць і ўдаласць ускідваннем ног, а ангажыраваная больш сціпла, пад такт,— з нагі на нагу то паднімаецца, то апускаецца, як качка.

Для разгульных калядных дзён маюцца розныя песні, напрыклад:

Пайшла Каляда калядуючы,
За ёю дзеўкі жабруючы.
Адна просіць, другая носіць.
Пакінь прасіць, цяжка насіць.
Перайшла сяльцо — дастала яйцо,
Перайшла другое — згубіла і тое,
Перайшла трэцяе — згінула сама.
От і Каляда.

Напярэдадні Новага года спраўляецца тлустая куцця, або Шчадруха. Тут вось і выступае элемент міфалагічны, агульнаславянскі: варажыць. Асабліва дзеўкі варожаць пра сваё замужжа — рознымі спосабамі. Напрыклад, кожная кідае сабакам аладкі, і чыю першую яны схопяць, тая і спадзяецца выйсці раней замуж. Або падымаецца дзеўка, бярэ і нясе бярэмя дроў (колькі абхопіць), скіне іх і лічыць: калі выявіцца цотны лік пален — да пары, то быць ёй у пары, пад вянцом, а не — аставацца ў адзіноце. Або яшчэ дзяўчаты, як у нас гавораць, апалаюць чаравікі, г. зн. набяруць поўныя начоўкі (карытцы) чаравікаў і апалаюць іх, як пшаніцу, вытрасаюць ад пылу — чый раней чаравік выскачыць, тая і спадзяецца раней выйсці замуж. Больш заўзятыя нявесты падыходзяць пад вокны падслухоўваць, што раней будзе сказана ў хаце: «Бывай здароў» або: «Сядзь, пасядзі». Калі першае, то прыкмета добрая — прыйдзецца пакінуць бацьку, родную хату і ісці замуж; калі ж насуперак чаканням пачуецца, як нецярплівая маці ў хаце раптам прыкрыкне на свайго неўгамоннага дурасліўца: «Да сядзь, каб ты макам сеў!» — то дзяўчына, як апараная, уцячэ ад акна, прыйдзецца, маўляў, сядзець у дзеўках.

Напярэдадні Вадохрышча многія маюць звычай прыходзіць з пасудаю ў царкву па ваду, якая ў народзе гэтак і называец-

ца: Іарданская. Ваду гэту захоўваюць на працягу ўсяго года, лічаць, што яна не псуецца, п'юць яе нашча, асабліва хворыя. Да самага вечара ў гэты дзень многія нічога не ядуць. Увечары ядуць так званую бедную куццю, г. зн. самую сціплую, посную. У дзень свята Вадохрышча збіраецца вялікае мноства людзей — ідуць хрэсным ходам на «Іардан», зладжаны на крынічным вадаёме, і тут, яшчэ калі асвячаецца вада, многія ўжо стаяць напагатове, з апушчанымі на вяровачцы збанкамі, каб з-пад жыватворнага крыжа, які апускаецца ў ваду, набраць асвячонага струменя.

На шостым тыдні ад Каляд — свята Стрэчанне, называецца яшчэ «Грамніцы». Гэта ўжо ўплыў каталіцтва, якое ў гэты дзень устанавіла асвячаць васковыя свечкі, па-касцельнаму Грамніцы, на той падставе (як адзначаецца ў Катэхізісе езуіта Лоіцкага, 1784 г., выданне Віленскай акадэміі), «што громяць яны сілу нячысцікаў, каб не прыносіла шкоды громам, маланкаю, праліўным дажджом і градам, якіх бог не затрымлівае і якімі лёгка карыстаюцца чараўнікі і чарадзейнікі». Народ са свайго боку верыць, што такія свечкі карысна выкарыстоўваць для адгону ведзьмаў ад кароў, да якіх яны падпаўзаюць нібы ў выглядзе жаб, узбіраюцца па нагах да вымя і высмоктваюць малако. Але грамнічная свечка, прымацаваная да вушака ў хляве, не пускае ведзьмаў... і сляды бяссільнай злосці іх астаюцца на згрызеным воску свечкі. Самае падыходзячае ўжыванне асвячонай свечкі — у час расставання з жыццём, і таму праваслаўныя свяшчэннікі не адмаўляюцца асвячаць свечкі прыхаджанам у дзень Срэцення (Стрэчання), але тлумачаць пры гэтым народу, што лепш за ўсё сабе на апошні дзень падрыхтаваць свечку, асвячоную ў «чысты» чацвер. Праз напамінак праваслаўных пастыраў звычай асвячаць грамнічныя свечкі выводзіцца. За тры дні да Срэцення адзначаецца прысвятак пад назвай Васіля. У дзень Агаф'і прыносяць асвячаць хлеб з натыканымі кавалачкамі солі. Паводле звычаю, гэты хлеб «зачэпліваюць на рожкі карове, каб сурокаў не баялася». Калі здарыцца пажар, хлеб кідаюць або ў агонь, каб патух, або ў чыстае поле, каб туды накіраваўся вецер. Звычай асвячаць хлеб Агаф'і засвоены ад католікаў і невядома чаму, але знікае. На адзінаццатым тыдні ад Каляд адзначаецца прысвятак пад назваю Саракі, і калі не ў высакос, то выпадуць у той жа дзень тыдня, што і Срэценіе. Гэта свята пераважна пчаляроў. На Саракі робяць клёцкі з цеста і кідаюць іх у вар. З сарака клёцак адну раніцаю ядуць, і калі мароз, то спадзяюцца, што яшчэ сорак маразоў будзе. Хлопчыкі раніцою босыя выходзяць на двор і спрабуюць перакінуць праз страху сорак

трэсак: калі ўдала перакінуць, то, маўляў, будзе ўдача на знаходку птушыных гнёздаў, што вельмі цікава для пастушкоў.

На наступным, дванаццатым, тыдні ад Каляд святкуецца прысвятак пераважна надрэчных сялян і рыбаловаў — дзень св. Аляксея, у які збіраецца на споведзь больш за 500 чалавек. Народ прыкмячае, што калі Сарокі на адзінаццатым тыдні былі, дапусцім, у чацвер, то на дванаццатым дзень Аляксея выпадзе ў пятніцу, а на трынаццатым — Благавешчанне ў суботу.

Сапраўдны вясенні для народа дзень — вясенні Юрый. Ужо напярэдадні з вечара на вуліцы вітаюць вясну песнямі. Свята Юр'я выпадае на семнаццатым тыдні ад Каляд і на тым дні тыдня, калі не высакос, на які выпалі Каляды. На Юр'еў дзень сяляне строга захоўваюць пост дзеля жывёлы.

З Юр'ева дня пачынаюцца абедні за гаспадарку і малебны за жывёлу. У гэты дзень сяляне раніцаю абыходзяць нівы з пірагом, гарэлкаю, селядцом; мужчыны абтыкаюць мяжу костачкамі, зберажонымі ад велікоднага стала, калі гэта ў Велікодны тыдзень; маладзіца, якая выйшла гэтай зімою замуж, накрывае ўсходы жыта палатном (што, дарэчы кажучы, паўтарае яна зноў над зжатым снапом), а дзяўчаты, іншы раз спецыяльна запрошаныя спяваць Юр'я, абыходзяць ніву з песнямі. Затым на мяжы ў полі п'юць і закусваюць у гонар заступніка сваіх статкаў і гаспадаркі. Вось адна з песень:

Юрый, ўставай рана,
Адмыкай землю,
Выпускай расу
На цёплае лета,
На буйнае жыта,
На ядраністае,
На каласістае,
Людзям на здароўе...

Потым заклікаюць гаспадара «выходзіць на вулачку» і жадаюць яму:

Піва рабіць — сына жаніць,
Гарэлку гнаць — дачку замуж даваць.

На дваццатым тыдні ад Каляд вельмі шануецца Міколаў дзень (9 мая), а напярэдадні Міколава дня, 8 мая, адзначаецца, як гавораць у народзе, Міколаў бацька (бацька — маецца на ўвазе тут апостал і св. Іаан Багаслоў). На дзень Мікалая пастухі і начлежнікі спраўляюць на начлезе балёк (вечарынку), як і на дзень св. Духа.

На 26-м тыдні ад Каляд святкуецца дзень Івана Купалы. Напярэдадні гэтага дня, ноччу, сяляне, бывала, палілі агні

(чаму патуралі нярэдка і памешчыкі) і праз гэтыя агні скакалі, кругом танцавалі, спявалі песні, найбольш бryндзюшкі. У гэту ноч простанароддзе знаходзіцца пад чарамі міфаў. Напрыклад, у народзе не сумняваюцца, што ў гэту ноч можна знайсці кветку папараці і з ёю скарбы, а калі праляжыш у папаратніку, то гавораць, што можна ўсё тады ведаць, што робіцца па свеце. «Але хто ж яго ўлежыць»,— прызнаюцца шчыра. Не сумняваюцца, што ў гэту ноч надзвычай шныраюць ведзьмы, пярэваратні і ўся «нячыстая сіла», і многім людзям уяўлялася нават, быццам яны чулі на свае вушы, як у гэту таямнічую ноч пад песню начлежнікаў скакаў невідзімкаю, відаць, благі (слова, невядома чаму, адпавядае нячыстаму, нядобраму; благое дзіця — нягоднае), таму што ўсе з аднолькавым жахам чулі, як штосьці такое «ўзбегла на мосцік, стукала, топала, ляскала, пляскала і потым закружылася ў лесе, аж лаза ламалася і начлежнікі прыціхлі».

Зараз з распаўсюджаннем адукацыі і вызваленнем ад прыгону звычай дурэць ноччу на Купалу часткова адмірае, таму што ашчадней стала з дрывамі і няма з чаго раскладваць агні.

На Іванаў дзень, паводле павер'я, сонца, узыходзячы, «іграе». Значна больш займаюцца сяляне ў гэты дзень тымі мерамі, якія прынята робіць у гэты час супроць ведзьмаў і «нячыстай сілы». Для гэтага ўтыкаюць пад вокнамі і хатнімі дзвярамі галінкі дубу, рабіны, асіны, крапівы. У царкву да абедні прыносяць вялізныя вянкі і пукі зелля, што засталося яшчэ ад Дзевятніка, і асвячаюць, каб абкурыць ім ад перапалоху, болі, падзіву і да т. п. Каля хат ставяць на доўгіх кіях венікі, і гэтымі венікамі ў першы дзень Каляд, Вялікадня, Пяцідзесятніцы вымятаюць хату, каб не было ў хаце зарокаў на дзяцей.

На 27-м тыдні ад Каляд — свята Пятра. У гэты дзень многія дзеля поснай ашчаднасці прыносяць у царкву сыр і хлеб на карысць прычту. Вось для ўзору дзве песні, што спяваюць на Купалу і Пятра:

Божа мой! Да ў гародзе гардовіца. Божа мой!*
Цяжка дзецюкам Пятровіца.
Ідзіце, дзецяткі, гарду рваці,
Лягчэй будзе Пятра ждаці.
Рвалі гарду, не вырвалі,
Ждалі Пятра, не прыждалі.
Рэчка, па рэчцы чаўночак плыве,
Да у-ў том чаўночку белы малойчык
Кудзеркі чэша, перачэсуе.
Плывіце, кудры, да маёй мілай,

* У пачатку кожнага радка і ў канцы гучыць прыпеў «Божа мой!»

Паслухайце, што міла гаворыць,
Чы ўспамінае, чы праклінае?
**— Ох, мілы мой, глуміўся мной,**
**Сеяў палынь на маём сэрцы**
**Да клаў агні на маіх плечках,**
**Рабіў скрыпкі з маіх ручак,**
**Увязываў каня да маіх косак,**
**Пушчаў рэчкі з маіх вочак.***
— Мілая мая, няпраўда твая,
Я сеяў палынь у чыстым полі,
Я клаў агні ў шчырым бары,
Увязываў каня ў белай бярозы,
Я пушчаў рэчкі крынічныя,
Я рабіў скрыпкі з белай ліпкі.
Пятрова ночка невялічка,
Я, маладзенька, не даспала,
Не даспала, шнуры сукала,
Сукала шнуры ядвабныя,
Я й сяму-таму запрадавала,
Сваяму міламу дорага давала,
Сяму-таму па засцежцы,
Сваяму міламу на падвязкі.

На 30-м тыдні ад Каляд, за 5 дзён да Барысава дня, у той жа дзень тыдня, што і свята Пятра, прыходзіцца святкаваць дзень св. прарока Іллі, якога вельмі шануе народ. У гэты дзень абавязкова чакаюць навальніцу, у час якой, мяркуюць, Ілля ездзіць па небе. За сем дзён да Спасаўскіх запускаў адзначаецца дзень Барыса і Глеба, на які сяляне не дазваляюць сабе цяжкай працы, напрыклад араць, жаць. Многія маюць не толькі імя Барыс, але і прозвішча. На наступны дзень пасля Барыса ўшаноўваецца св. Ганна (25 ліпеня). У гэты дзень многія ў прыходзе лічаць сваім абавязкам ісці за 15 вёрст у Вілейскі павет у прыпісаную царкву, што знаходзіцца ва ўрочышчы Вострава Хольхельскага прыхода, дзе шануецца цудатворная ікона; і там, пасля споведзі, ахвяруюць па 20 капеек на памінкі.

Загаўляюцца на Спасаў пост у свой час, праз тыдзень пасля Барыса, у той жа дзень тыдня.

Спас (6 жніўня) выпадае, калі не высакос, у той жа дзень тыдня, што і Каляды, а да наступнага каляднага свята ад Спаса застаецца роўна 20 тыдняў. На Спаса прыносяць асвячаць садавіну і перш за ўсё мяшочак насеннага жыта для сяўбы.

14 верасня наступае свята Узвіжання, па-народнаму — Здвіжанне. Некаторыя сяляне ў гэты дзень працуюць. Відаць, гэта тлумачыцца тым, што раней памешчыкі не прызнавалі

* Падкрэсленыя шэсць радкоў (скарга жонкі на мужа) маюць некалькі іншы прыпеў: «Божа мой!» у пачатку радка паўтараецца два разы, а ў канцы радка — адзін раз.

гэтага свята дзеля рабочага дня на прыгоне, але пост, якога прытрымліваюцца ў гэты дзень нават простыя людзі, пацвярджае астатак павагі да гэтага дня.

На другім тыдні каляднага посту асабліва ўшаноўваецца дзень Юр'я асенняга (26 лістапада), які адзначаецца ў той жа дзень тыдня, што і Юрый вясенні.

Ці адносіць святкаванне гэтага дня заходнерускім народам да часоў Яраслава Мудрага, які ўстанавіў гэтае свята і часта рабіў паходы супраць яцвягаў і засяляў іх землі і большую частку Літвы рускім народам, ці, можа, гэта тлумачыцца тым, што асенні Юр'еў дзень быў некалі днём адыходу сялян ад сваіх землеўладальнікаў? Як бы ні было, але Юр'я святкуюць.

На пятым дні пасля Юр'я, у дзень Андрэя, дзяўчаты пасцяць увесь дзень да захаду сонца і ўстрымліваюцца ад гаворкі. Вечарам сеюць каноплі і лён каля палонкі або калодзежа, прыгаворваючы: «Дай, божа, знаць, з кім век каратаць»,— і пасля гэтага чакаюць, хто прысніцца.

На пятым дні пасля Андрэя ўшаноўваецца дзень Варвары (4 снежня), асабліва ў надрэчных вёсках, каб, кажуць, жывёла і дзеткі не ўвальваліся ў ваду і не тапіліся. Гэты дзень лічыцца ў народзе Серадапосцем — сярэдзінай каляднага посту, як Хрэсцы на Вялікі пост. На Варварын дзень ядуць варэнікі з цеста — з макам, мёдам або канаплямі, вараныя або печаныя.

Праз дзень глыбока шануецца свята зімняга Міколы, які выпадае на дзень пазней ад Міколы вясенняга, напрыклад, калі вясенні быў у аўторак, то зімні — у сераду — так заўважана народам.

Праз два дні пасля Міколы шануецца зімняя Ганна (9 снежня), а ад Ганны застаецца два тыдні і два дні да Каляд.

Такі вось каляндар вядзе для сябе народ у сваёй памяці.

Закончыўшы, так сказаць, святцы, якія вякамі склаліся ў галовах нашых прыхаджан, я не магу некалькі не закрануць народных паняццяў і прыкмет адносна іншых каляндарных прадметаў, якія адносяцца да народнага часалічэння.

Час змены квадраў месяца прыкмячаецца ў народзе вельмі старанна. Яны называюцца па-мясцоваму квадрамі. Але ўласна сялян цікавіць не астранамічны час чатырох відазмяненняў месяца, а толькі калі настае маладзік, поўны і стары.

Маладзік у выглядзе вузенькага сярпочка ўпершыню паказваецца на захадзе, праз 2—3 дні пасля астранамічнага часу першай квадры; поўны — поўня, а стары — гэта самы маленькі ражок на зыходзе апошняй квадры, паказваецца на ўсходзе перад самым світанкам. І калі хто з сялян не заўважыў, як настаў маладзік, то абавязкова аб гэтым спытае ў іншых; і мно-

гія з іх ведаюць правіла: калі пэўная фаза, напрыклад, маладзік або стары апошні раз паказаўся ў панядзелак, то наступны раз пару́ перацягне, г. зн. з'явіцца ў аўторак. Відаць, такая прыкмета заснавана на большасці выпадкаў, што квадра месяца, змяняючыся, перацягвае на адзін дзень тыдня.

Невядома, чаму маладзік выклікае ў народзе нейкую глыбокую забабонную павагу да яго. Як толькі сяляне ўпершыню ўбачаць сярпок маладзіка, адразу хрысцяцца і вітаюць яго словамі: «Малады маладзічок, вялікі князь, паздраўляй нас, дай нам здароўе, спосаб і раду да жыцця, сабе на прыбытак, а нам на спасенне»,— і затым чытаюць малітвы: «Отча наш», «Багародзіца дзева» і іншыя паўсядзённыя. У першую нядзелю пасля маладзіка, у так званую маладзіковую нядзелю, прыхаджане з асаблівай актыўнасцю наведваюць царкву, пры гэтым многія бабы і дзяды лічаць, што ім абавязкова трэба пабываць на споведзі і на св. прычасці. Маладзіковую нядзелю настолькі шануюць, што ў звычайную нядзелю сяляне, бадай, яшчэ даруюць невялікае парушэнне свята, але на маладзіковай нядзелі лічыцца недаравальным грэхам. «То ж маладзіковая нядзеля»,— напомняць парушальніку. Мабыць, акружаючае асяроддзе іудзейства і каталіцтва аказала такі ўплыў на рэлігійнае шанаванне ў народзе маладзіка.

Зрэшты, ад маладзіка народ заўсёды чакае атмасферных змен: або пагоды пасля дажджоў, або дажджоў пасля ветру. У апошнім выпадку ў народзе гавораць: «Маладзік абрадзіўся і ўмыўся або ахрысціўся». Лічаць, што маладзіком добра вуллі ставіць, маўляў, пчолы збіраюцца; зноў, калі на трэці дзень маладзіка прышчапіць дрэўца, то на трэці год плады будуць. Перад поўняй нібы самы лепшы час парсюкоў калоць, лягчаць жарабцоў, бычкоў, парсюкоў і да т. п., каб паўнелі; садзіць птушак на седала, сеяць і садзіць у агародзе, высякаць лес на будынкі, а галоўнае, хату закладваць, каб была, як гавораць, поўнай чашай.

На старым — самае лепшае даваць дзецям на глісты і наогул прымаць сродкі для знішчэння шкоднікаў, насякомых і чарвякоў на агародзе.

Акрамя маладзіка мала што прыцягвае ўвагу народа на небасхіле, хіба незвычайнае з'яўленне каметы або зацьмення, якія, па павер'ях, прадвяшчаюць нешта нядобрае, найчасцей вайну. Зрэшты, калі наглядна растлумачыць нашым сялянам прычыну зацьмення, то яны цалкам згаджаюцца з навуковай тэорыяй. Нават здзіўленыя праўдападобным тлумачэннем пасвойму наіўна аддзякуюць: «О то, божа, дзіва, што за аднаго бітага даюць дзесяць нябітых».

Камень з неба (метэор) — як прадвесце нябеснай кары, аднак, па разуменні баб, ён і карысны: яго можна павесіць на шыю кароўцы, якая без канца «бегае» (за быкамі).

Час узыходу маладзіка ў розных фазах, як і ўзыходжанне ранішняй і вячэрняй зорачкі, дае сялянам магчымасць мяркаваць прыблізна аб тым, колькі ў гэту пару часу, г. зн. як рана або як позна. Калі не бачаць маладзіка, дапусцім, увосень, калі ўставаць трэба рана, ісці на малацьбу, то яны кіруюцца пры вызначэнні часу месцазнаходжаннем на небасхіле «сітца» або «рашатні» (сузор'е плеяд, стажараў). Прыкладна каля Піліпавых запускаў, калі ўстаць ноччу і калі сітца будзе ўжо на поўдні, то пара ўставаць: тады да свету можна ў чатыры цапы вымалаціць тры капы (капа — 60 снапоў). Калі ж сітца трымаецца на ўсходзе даволі высока, то яшчэ рана ўставаць.

Днём мяркуюць аб часе па вышыні сонца на гарызонце або даўжыні ценю, прымаючы за поўдзень той час, калі можна пераступіць свой цень.

Што датычыць змены чатырох пораў года, то ёсць шмат прыкмет, але, здаецца, сам народ пераканаўся, што рэдка яны спраўджваюцца; прынамсі, многія наіўна заўважаюць: «Без пары не будзе пары». Наогул пра вясну гавораць: «У сакавіку зіма не гіне, а ў красавіку трава не расце»,— і таму стараюцца назапасіць кармоў. «Хто мае корм,— гавораць,— у таго вясна позняя, а хто не мае — ранняя...»

Больш або менш мяркуюць пра будучую зіму і вясну па наступных прыкметах:

а) калі перад Спасам за тыдзень буслы стануць рыхтавацца да адлёту, то спадзяюцца, што зіма будзе ранняя і з марозам, а вясна — цёплая, а калі перад Прачыстаю, то восень будзе цёплая, а вясна — халодная; калі буслы адлятаюць за 15 тыдняў да Каляд, то і прыляцяць праз 15 тыдняў пасля Каляд, «а калі бусел пацяне, то і вясна пацяне»;

б) калі мянёк (мянтуз) нерастуе перад Піліпавымі запускамі, то чакаюць ранняй вясны, калі ж перад асеннім Юр'ем, то позняй. Сапраўдная зіма лічыцца са свята Міколы, па прыказцы: «Варвара варыць, Мікола гвоздзіць»;

в) калі зімою ў лесе вецер пагоніць галлё (сучкі, іголкі і іншае лясное смецце) па снезе ды так, што белы снег стане брудным, то праз тры месяцы пасля гэтага павінна, як лічаць, зрушыць зіму (снег кранецца). Чакаюць звычайна, што ён кранецца на дзень Мацея (гэта, па каталіцкіх святцах, здаецца, 24 лютага).

У народзе гавораць, што на Мацея дарога пацее, на Саракі дрэвы адпускаюцца, на Аляксея рыба хвастом лёд ломіць, а на

Благавешчанне бусел прылятае. Гэта ўжо абагульненне, нешта сярэдняе.

Раней за ўсіх у нас з'яўляюцца жаваранкі, і таму ў народзе лічаць, што яны не адлятаюць на зімоўку, а зімуюць пад каменем. Народ верыць здаўна, што ластаўкі таксама не адлятаюць на зіму, а заміраюць на дне ракі, ля берагоў, злучаныя доўгімі гужамі, а вясною зноў ажываюць. Адстойваючы такую думку, спасылаюцца на такія факты, што рыбаловы выцягвалі іх у такім мностве, што невад ірваўся і многія на свае вочы бачылі, як выцягваліся ластаўкі, узяўшыся адна за адну, лапкай за лапку. Дарэчы, да ліку арыгінальных баек трэба аднесці і тое, што, па разуменні народа, зязюлька не мае самца, і гэта заснавана на тым, што многія бачылі, як яна падлятала да пеўня і заляцалася да яго.

Пасля жаваранкаў з'яўляюцца пліскі, потым вадзяныя птушкі, дзікія качкі, гусі, у гонар якіх Млечны Шлях на небасхіле названы ў народзе гусінай дарогаю, таму што, маўляў, гэтай дарогаю гусі ідуць у вырай (г. зн. у адлёт, у невядомыя краі). Потым прылятаюць буслы, жураўлі, кулікі, берасцянкі, дразды і інш., пазней — перапёлкі, драчы, жоўны і інш. Зязюлька першы раз кукуе на Юр'я, і з гэтага часу лічыцца, што наступіла сапраўдная вясна, якую сустракаюць песнямі, пра што я ўжо гаварыў.

Вераць, што калі пліска і буслы прыляцяць крыху раней, то ў гэтым годзе вырасце выдатны лён. Наогул, паводле народных прыкмет, птушкі шмат прадвяшчаюць, і ўсё гэта на забабонных людзей моцна дзейнічае. Напрыклад, вераць, што на пажар злятаюцца нейкія белыя птушкі, якіх у іншы час ніхто ніколі не бачыў, накшталт белых качак, марскіх варон (ці не сарокі?). Першае спяванне зязюлькі, калі ёсць у кішэні грошы,— вельмі добра, а калі няма — дрэнна. Калі сарока стракоча — будуць госці, варона каркае — чакаецца нешта жахлівае, смерць і да т. п. Асаблівай вяшчункай у адносінах ураджаю лічыцца перапёлка. У народзе прымаюць за ісціну, што колькі разоў прагучыць яе голас вечарам або раніцаю, столькі злотых (злоты — 15 капеек) будзе каштаваць у гэтым годзе шаснаццатка (1/16 доля бочкі, чвэртка) жыта. Прагалосіць яна, напрыклад, тры разы або шэсць, або на дарагі год восем разоў, нават дзесяць, то будзе чвэртка каштаваць 3 або 6, 8, 10 злотых. Часам налічаць такіх гукаў запар спачатку менш, потым больш, напрыклад тры-чатыры, потым пяць-шэсць, і тады лічаць, што спачатку ўвосень хлеб будзе крыху танней, а потым, вясною, даражэй. Адносна дрэнных гадоў вось яшчэ прыкмета: калі выпадзе шэсць тыдняў Мясаеда перад Вялікім постам, то будзе галодны

год. Калі па календары значыцца літара (ключ) А, то яшчэ год будзе прыстойны, літара В — добры год, а калі Е — то ўсё [паесць] — і скаціну, і людзей. Калі рыба ловіцца ў вялікай колькасці, то чакаюць галоднага года, па прыказцы: «Калі рыбна, то голадна». Калі пчала не выходзіць з вулля да Благавешчання, то будзе добрае ўраджайнае лета, а калі пакажацца раней, то дрэннае, скупое. Багаты пакос і цёплая восень прадвяшчаюць доўгую зіму і недахоп кармоў згодна са словамі прыказкі: «Калі выкасіш заванькі (гнілыя лужкі), то і вымяцеш застаранкі (апарожніш гумно)». Пасля вялікіх ягад чакаюць жорсткую зіму, а як «мокры май — лета як гай».

Пра пагоду робяцца меркаванні таксама пераважна па назіраннях над птушкамі, жывёламі і іншымі прыкметамі. Напрыклад, свіргун (берасцянка, зяблік) спявае на цяпло, свішча на холад. Пігаўка (кнігаўка) на дождж прысядае па полі. Кулік, наадварот, на пагоду пакідае сваё балота і лятае па полі. Драч на пагоду задзіраецца вечарам. Шэрая варона часам прылятае да вады — на дождж; гусі і качкі перад непагодай неспакойна палошчуцца ў вадзе і крыкліва гагочуць; тады ж і ластаўкі прыпадаюць над вадой. Калі ж у працяглую непагадзь несціхана зашчабечуць вераб'і і заспяваюць пеўні, то можна чакаць наступлення пагоды, усё роўна, як і калі куры раней сядуць. Снягір зімою спявае на снег, завею і слоту.

Да гэтага можна дадаць і іншыя прыкметы адносна пагоды. Харавое кваканне турчакоў (жаб) з прыемнаю трэллю ў вячэрні змрок прадвяшчае ясную пагоду. Такую ж пагоду прадвяшчаюць няспыннае лятанне кажаноў пасля захаду сонца, жвавы палёт і гудзенне хрушчоў і іншых жукоў. На дождж і непагоду, наадварот, жабы квакаюць крыкліва і непрыемна, мухі, камары і блохі дакучаюць назойліва і нязносна. Калі пчала вечарам вяртаецца позна ў вулей, то трэба чакаць дажджу; а калі ў самы захад сонца сядзіць у вуллі, то, трэба думаць, будзе пагода. Калі ў надвячэрнім змроку рыба іграе і плёскае па паверхні вады, то гэта прыкмета добрай пагоды, а калі выскоквае і над вадою ловіць мошак, то гэта на дождж і непагоду. Чакаюць дажджу і калі з рыбы, забітай вострай прыладай, доўга цячэ кроў. Калі наготкі раніцаю раней разгорнуць венчыкі сваіх кветак, то чакаецца пагода, калі пазней, каля поўдня, то, наадварот, дождж, навальніца. Марозны іней на траве прадвяшчае дождж, а вялікая раса з раніцы і вечарам, без ветру — пагоду. Угадваюць яшчэ пагоду па свяцілах, узыходу і захаду сонца, па хмарах і да т. п. Напрыклад, калі абрадзіўся месяц або сонца (туманны круг каля свяціла), то будзе мяцеліца; радужны туман каля месяца паказвае на вецер, непагоду,

слупы каля сонца — на марозы. А ў летні час узыход сонца са слупамі азначае пагоду. І наадварот, калі пры ўзыходзе сонца румяны шар яго здаецца большым, чым звычайна, чакаецца вецер, навальніца, дождж. Калі пры захадзе сонца і на супрацьлеглым баку з усходу паказваюцца хмаркі, або сонца хаваецца за хмарку, або выходзіць пад хмарай, то ўсё гэта абяцае непагоду. Яркае зіхаценне зорак прадвяшчае пагоду, цьмянае — процілеглае надвор'е; зарніца — пагоду; багатка (вясёлка) прадказвае працяг дажджу. Першы гром вясною — прыкмета сапраўднага цяпла. Хто першы раз пачуў, як гром грыміць, павінен адразу праз галаву куляцца, каб грому не баяцца.

Акрамя таго, пагоду вызначаюць па санлівасці ў чалавека і хатніх жывёл, па звонкім і глухім гуку ў лесе, па празрыстай і мутнай вадзе, па прамым і непрамым дыме, накірунку ветру, па сырасці на розных прадметах і іншых фізічных з'явах; усяго не пералічыць... Некаторыя гаспадары акуратна, па два-тры разы ў дзень, запісваюць у сшытак свае назіранні надвор'я ў зімовы час і робяць свае вывады аб тым, якая будзе пагода ў летнія часы, прымяркоўваючы прыкладна дні лістапада да майскіх дзён: завея — навальніца, снег — дождж, мароз — пагода і да т. п. Многія заблыталіся і кінулі гэты занятак.

...Асабліва зменлівая тэмпература апошніх майскіх дзён: пасля першага вясенняга цяпла настаюць халады і маразы. «Вот май,— гавораць у народзе,— валам дай, а сам на печку ўцякай...» Або: «Да святога Духа не скідай кажуха, а па святым Духу — у тым самым кажуху...» Але горш за ўсё, што пастаянна заўважаецца змяненне клімату да больш нізкай тэмпературы. Зімы становяцца даўжэйшымі і халаднейшымі, а лета карацейшым. Ужо на Аляксея рыба не разбівае хвастом лёд. На Благавешчанне буслы прыляцяць ды нярэдка, застаючы яшчэ снег на гнёздах, адлятаюць ізноў на ніз (раўніна на поўдзень ад Валожына). Старыя сцвярджаюць, што раней зімы былі карацейшыя, а як «Кацярына забрала край, лета стала карацейшае». Многія памятаюць, як на Параскеву (28 кастрычніка) бульбу капалі на полі. Даўно калісьці быў такі год, што многія гаспадары праз паншчыну спазніліся пасеяць азімыя і сеялі пасля першага снегу перад самым Новым годам. Старыя гавораць, што быццам былі такія гады, што на Юр'я вясною каласавалася азімае жыта.

...Нарэшце, варта прывесці арыгінальны спосаб вядзення ў народзе храналогіі. Народ не прызвычаіўся адмяраць час па гадах, але як на працягу года прымяркоўвае тыдні да вядомых свят, не ведаючы месяцаў, так на сваім вяку прымяркоўвае гады да вядомых падзей у сваім жыцці. Толькі які цяпер

год, многія ведаюць, а пра мінулае ніхто з сялян не ведае, у якім годзе ён нарадзіўся і колькі яму гадоў. Стары, напрыклад, спасылаецца на тое, што «як Кацярына Ольшч забірала», то ён быў ладным пастушком і памятае, як першы казацкі полк ішоў. Такіх старых застаў я ў прыходзе каля сямі; цяпер яшчэ жывуць трое. Пажылы селянін спасылаецца на тое, што ўжо «ва французы» (у айчынную вайну) ён араў і да т. п. З пазнейшых падзей народ спасылаецца на першае паўстанне, на памятны кірмаш, «як змярзалі людзі», на халеру (як мiралі людзі), на памерыю (як размяжоўвалі грунты), на голад, які адбыўся пасля таго, як ланцуг (межавы) прайшоў па зямлі; таксама на памор жывёлы і іншыя няшчасці. З бліжэйшых да нас падзей спасылаюцца на час, калі выйшаў маніфест на волю, калі быў панскі мяцеж, калі прайшла камісія (зямельная), пасля якой зноў быў галодны год, таму што ланцуг прайшоў па зямлі, калі былі пажары і калі асвячалі цэрквы.

Пра пару года ўспамінаюць па тым, кросны тады снавалі для палатна ці яшчэ толькі пралі; палолі ў агародах ці касілі, жалі; адным словам, па святах або па работах жыва ўспамінаюць вядомы выпадак і падзею.

## СЛЯДЫ ЯЗЫЧНІЦТВА Ў СВЯТАХ, АБРАДАХ І ПЕСНЯХ

Дзедка свінку ўбіў,
Дзедка беленькую,
Свінку пегенькую.
Ай да бож'я Каляда!
Прылятай к нам з высака,
Раз у жаланны год.

Як Сербія і Балгарыя, так аднолькава і Беларусь адзначаецца сярод іншых славянскіх земляў багаццем міфалагічных паданняў і песень, якія спяваюцца тысячы гадоў, хоць некаторыя ўжо з хрысціянскім «налётам», але галоўны змест якіх і больш за ўсё нават самыя выразы несумненна адносяцца да часоў язычніцтва. Не толькі паданні і песні пераконваюць нас у гэтым, але і абрадавыя звычаі, якія тояць у сабе шмат ніцяў, што звязваюць сучаснасць з даўнейшым мінулым.

Мы пераканаемся ў гэтым, калі прасочым цэлы год жыцця беларуса ў яго народных святах, звычаях, абрадах і павер'ях.

Пачнём з Каляды, самага паэтычнага і старадаўнейшага са славянскіх свят, якое мае несумненна міфалагічнае значэнне, свята, якое да гэтага часу добра захавалася ў Беларусі і ўсюды адзначаецца.

Каляда, або Калядкі, святкуецца з 24 снежня па 1 студзеня, у некаторых месцах працягваецца нават да Вадохрышча. Каляда цалкам адпавядае сербскаму божышчу, новانароджанаму богу, які ў гэтым сэнсе вельмі блізкі да таінства беларускай Каляды. Абраднасць адрозніваецца, але сутнасць тая ж — нараджэнне новага божышча (сонца), перамога святла над цемраю, першае радаснае свята сонца, урачыстасць павароту сонца. Але нават і ў абрадавых звычаях ёсць сёе-тое агульнае. Як у беларусаў, так і ў сербаў і ў іншых многіх славян калонне да Лады кабана, свінні, парасяці лічыцца неабходнасцю. Народная песня, прыведзеная намі вышэй, недарма гаворыць: «Дзедка свінку ўбіў».

Мы не станем разважаць пра паходжанне слова «каляда», або «коляда». Пра гэта шмат ужо гаварылі нашы этнолагі. Што датычыць Беларусі, тут Коляды, Калядкі ўласна азначаюць каляднае свята. Гэтым жа словам называюць таксама ўсё, што дораць прыходскаму свяшчэнніку, які, па старадаўнім звычаі, наведвае кожны дом, як панскі, так і сялянскі, у час свята, адчаго і гавораць: «Ксёндж (або поп) едзе па календзе». «Хадзіць або бегаць па календзе» — значыць збіраць святочныя дары (больш за ўсё што-небудзь са свініны). Калядою называюць таксама дары, якімі гаспадар надзяляе свайго наёмнага парабка (работніка), калі той пакідае ў яго службу, таму што на другі дзень Каляд, па прынятым з даўнейшых часоў звычаі, гаспадары і работнікі разлічваюцца, або заключаюць новыя ўмовы, або расстаюцца. Адсюль і прымаўка: «На святы Сцяпан кажды сабе пан» (26 снежня св. Сцяпан у рускіх католікаў).

Міфалагічнае значэнне каляды відавочна са старадаўняй песні, якую і да гэтага часу спяваюць у Пінскім павеце. Яна атрымала шырокую вядомасць. Многія этнографы звярнулі на яе асаблівую ўвагу. Вось самае галоўнае з гэтай песні:

Ого-го, козынька,  
Ого-го, сера,  
Ого-го, бела!  
Выскачыў ваўчок,  
Казу за бачок,  
А ваўчанята  
За казянята.  
Мудрая козынька  
Дагадалася,—  
У ніцыя (нізкія) лозанькі  
Захавалася:  
— Я ж не баюся  
Ні ў полі лаўца,  
Ні ў лесе стральца.  
Адно баюся

Старога дзеда.
Сіва барада,
Той мяне заб'е
З тугога лучка,
З правага плячка.

Беларус сярод марознай зімы з мяцеліцамі і завірухамі,— калі дні ўсё карацеюць і ноч хавае ад яго прыгажуню-прыроду, калі прарочае выццё ваўкоў, якія (гэтаксама, як завыванне буры) даходзяць да самой яго агароджы, палохаюць дзяцей і дарослых,— панура праводзіць снежаньскія дні сярод сваіх дрымучых лясоў і пустэльных балот. У мінулыя часы ва ўяўленні яго маляваўся канец свету; ён ведаў, што ў гэты час адбываецца страшэнная барацьба дабра са злом, святла з цемраю. Але набліжаецца першае свята сонца (сонечнага павароту, калі яно ўваходзіць у знак Казерога); падземны цар прадчувае, што павінен нарадзіцца божыч, светлае сонейка, і што тады барацьба зробіцца немагчымаю.

«Каза» ва ўсіх славянскіх народаў іграе немалаважную ролю. На Беларусі значэнне «казы» яшчэ і да гэтага часу тыповае, відавочнае. І цяпер існуе звычай у розных месцах Беларусі (таксама, як ва ўсходняй Галіцыі і ў некаторых іншых славян) убірацца казою. Малады хлопец адзявае шарсцяную белую кашулю, да каўняра якой прышывае галаву казы з мордаю і рожкамі. Галава гэта зроблена даволі ўмела з якога-небудзь пучка [саломы], а морда — з дзвюх драўляных плашак, пакрытых шэрсцю, пад якою працягнута вяроўка, так што сама «каза» непрыкметна пашморгвае вяроўку, прымушае плашкі ляскаць і гледачам можа здавацца, што «каза» ляскае зубамі. Пераапрануты казою хлопец, якога суправаджае гурт, ідзе па вёсцы з хаты ў хату, спявае песні, расказвае байкі, выклікае ўсеагульнае захапленне.

У некаторых месцах у дні сонечнага зімняга павароту мядзведзя лічылі нават царом звяроў. У ранейшыя часы на Каляды вадзілі жывога ручнога мядзведзя з казою. Цяпер дзе-нідзе яшчэ прыбіраюцца мядзведзем, але часцей галоўная роля адводзіцца «казе».

Воўк у народным уяўленні таксама не пазбаўлены міфічнага значэння. Ён увасабляе сілу холаду і зімы. Снежань называлі воўчым месяцам. У гэты час у іх пачынаецца перыяд цечкі, і яны ходзяць чарадою. Вось чаму ў беларусаў воўк адыгрывае ролю дэмана, з'яўляецца памочнікам злых сіл.

Нарэшце, вяпрук, свіння на зімнім свяце прыносіліся ў ахвяру богу-сонцу — звычай, хоць несвядома, і цяпер існуе ў многіх славян. На Беларусі, як і ва ўсіх заходніх губернях, не

толькі ў панскіх дамах, але ў асяроддзі сялян кожны заможны гаспадар гадуе з восені кабана і забівае яго перад Калядамі. Гэта і называюць «забіць каляду», або «забілі к Калядзе».

У містэрыях, што расказваюцца ў час ваджэння «казы», важную ролю адыгрывае бог зімы — Зюзя. Беларус яго добра ведае. Ён сівы, з доўгаю барадою, босы, у белым футры, без шапкі, з жалезнаю булавою. Каб яго задобрыць, каб не быў люты, яму пакідаюць куццю, а яшчэ часцей гаспадар першую лыжку куцці кідае за акно, прыказваючы: «Мароз, хадзі куццю есці». Асабліва напярэдадні Новага года яму адкладваюць куццю ў асобную міску і пакідаюць яе на ноч на стале, ведаючы, што Зюзя прыйдзе «куццю паесці». Большую частку зімы ён знаходзіцца ў лесе, але часам наведвае і вёскі, і кожны яго прыход прадвяшчае суровую сцюжу. Калі Зюзя ўзлуецца, ён ударае сваёй булавой у пень — і пайшлі траскучыя маразы. Міф сонца, якое нараджаецца, змешваецца з хрысціянскім паданнем пра зорку, што апавяшчае аб нараджэнні «збавіцеля».

На Каляды, якраз так, як пры сустрэчы вясны і ў купальскую ноч, ведзьмы і ведзьмары ляцяць на Лысую гару ў Кіеве, так як літоўскія ведзьмы на гару Шатрыю (у Шавельскім п. Ковенскай губ.), а польскія, чэшскія і славенскія на Бабіны горы (Babia góra, у Карпатах, на граніцы Венгрыі). Там у іх у гэты час адбываецца шабаш, заляцанні з дэманамі і ўсялякага роду д'ябальскія забавы. Калядныя святы ўсюды на Беларусі, як у праваслаўных, так і ў католікаў, пачынаюцца 24 снежня, на куццю — куццёю. Вымыўшыся папярэдне ў лазні, пасля захаду сонца збіраюцца сем'ямі ў дамах, прысоўваюць у кут стол, на ім рассцілаюць сена, накрываюць белым абрусам і на ім ставяць падрыхтаваныя стравы з куццёю пераважна з грэчкі, ячменю, пшаніцы, гароху, жыта, а ў некаторых, багацейшых, бываюць і бліны. Неабходная прыналежнасць куцці — мядовая сыта. У панскіх дамах і наогул у багатых людзей падаюць розныя гатункі рыбы, але сапраўдная куцця, г. зн. грэчка, пшаніца і г. д., стаіць увесь час на стале з сытою, пакуль вячэраюць, і потым яе падаюць у канцы вячэры гэтак, як аўсяны кісель. Пад абрус таксама абавязкова падсцілаюць сена. На Беларусі ў ніжэйшых слаях і нярэдка ў сярэдніх і нават вышэйшых старэйшы ў сям'і гаворыць малітву, сам накладвае куццю, падлівае сыту, віншуе ўсіх сваіх дамачадцаў са святам, успамінае родных нябожчыкаў, жадаючы ім вечнага спакою. Пры гэтым, як ужо ўпаміналася, кідае лыжку куцці ў кут Зюзі або пакідае для яго ў місе. У Магілёўскай губерні ў некаторых вёсках запрашаюць таксама «дзядоў», г. зн. нябожчыкаў баць-

коў і дзядоў, есці, прыгаворваючы: «Дзяды, дзяды, хадзіце куццю есць», пакідаючы ім частку куцці за аконцам або ў сенцах. У прамежках выцягваюць з-пад абруса сянніну і па даўжыні яе мяркуюць аб будучым ураджаі льну. Пасля яды бягуць глядзець, ці пратоптаны дарожкі па двары да чорнага (да зямлі) і ці многа зорак на небе. Першае прадказвае багаты ўраджай грэчкі, а апошняе — добры прыплод жывёлы. Абглядаюць таксама на дрэвах галінкі: калі яны ўсе пакрыты інеем, то будзе добры ўраджай садавіны. Калі ў гэты дзень адліга, то санная дарога захаваецца да паловы сакавіка і прытым будзе ранняя вясна і багатае лета.

Калі пажылыя варожаць пра пагоду і ўраджай, дзяўчаты ў гэты час прыслухоўваюцца да сабачага брэху: адкуль ён чуваць, адтуль з'явіцца жаніх. Потым бегаюць пад суседнія хаты і слухаюць пад вокнамі. Радуюцца, калі пачуюць словы: «Ну, ідзі, браце, досыць сядзець» і г. д. Даходзяць да роспачы, калі пачуюць, што госця просяць яшчэ пасядзець. Першы выпадак прадказвае замужжа на працягу года, апошні — сядзенне ў дзеўках. Але горш за ўсё, калі пачуюцца словы: «свяшчэннік», «свечы», «дошкі» і да т. п.— гэта прадказвае хуткую смерць той, што слухае, або яе суджанага. Тыя, каму не ўдалося падслухаць і адгадаць свой лёс, бяруць бярэмя дроў або абхопліваюць выцягнутымі рукамі пляцень і потым лічаць колькасць пален ці колляў: цотная лічба прадказвае замужжа, няцотная — увесь год ніхто не пасватаецца.

У гэты ж вечар звязваюць ногі ў стале, каб жывёла не пераскаквала плятнёў і не таптала пасеваў, а таксама каб не ўцякалі пчаліныя раі. Жанчыны ў гэты час матаюць клубкі як мацней і пабольш, таму што гэта нібы павялічыць качаны, г. зн. галоўкі капусты; нядбайная ж мотка клубкоў пазбавіць валоў сілы ў нагах. Нельга таксама ў гэты час гнуць абручы, абады і палазы, таму што гэта дрэнна дзейнічае на жывёлу: увесь прыплод на працягу года будзе з крывымі нагамі.

Нельга звязваць памяла для вымятання печаў, таму што ад гэтага здарыцца пажар або гром ударыць у дом.

Сена, што было пад абрусам, і рэшткі яды на другі дзень аддаюць жывёле; пакінутыя на стале зярняткі збіраюць і хаваюць да сяўбы, змешваюць тады з насеннем, якое сеюць. Гэта засцерагае каласы ад псавання. Куцця паўтараецца напярэдадні Новага года, але ўжо скаромная, абавязкова з каўбасамі і багатаю выпіўкаю. Трэцяя куцця бывае напярэдадні Вадохрышча. У гэты дзень да вячэрняга асвячэння вады захоўваюць строгі пост, і нават у час куцці няма таго багацця яды і піцця, якія патрэбны напярэдадні Каляд і Новага года. Вадою апыр-

скваюць жыллё, свірны, хлявы і іншыя будынкі. Надпісы і акрапленне засцерагаюць ад вядзьмарства і хвароб. Крэйду захоўваюць увесь год і п'юць як лякарства з віном ад страўнікавага болю.

Ад Каляд да Вялікадня сяляне святкуюць і асабліва пасля заходу сонца ні за што не бяруцца, ні за якую работу. Калі ж што-небудзь непрадбачанае, тэрміновае прымусіць узяцца за работу, то, каб пазбегчы немінучай бяды, парушальнік павінен на наступны дзень рассячы жэрдку загарадзі. Звычай гэты, вядома, ідзе з далёкай мінуўшчыны і не без таямнічага значэння. Растлумачыць значэнне цяжка, але рассячы жэрдку ва ўласнай загарадзі — значыць прынесці ахвяру, якая пазбавіць ад грэху. Каму гэта ахвяра — сказаць цяжка.

Вечарамі ва ўсе дні калядных свят сяляне збіраюцца сем'ямі па хатах і мірна, ціха праводзяць час. Нездарма гэтыя вечары называюцца святымі, або вечарынкамі. Віна або зусім не п'юць у гэты час, або вельмі мала, спяваюць песні, слухаюць апавяданні бывалых людзей, прапануюць адзін аднаму загадкі, танцуюць пад скрыпку або дуду, якую ў некаторых месцах называюць муцянкай. Арахі — таксама любімая гульня. Бяруць жменю арахоў і прапануюць угадаць, ці цот, ці лішка.

Варта адзначыць, што наёмныя работнікі і работніцы, якія пакінулі службу і атрымалі плату ад гаспадароў часам за паўгода, а то і за ўвесь год, не ўдзельнічаюць у сямейных святых вечарах. Яны спраўляюць у корчмах так званыя ігрышчы... і часам за адну ноч прагульваюць увесь заробак. Таму зборышчы гэтыя і забараняецца называць святымі вечарамі, якія складаюць выключную прыналежнасць мірнага сямейнага ачага.

Масленіца на Беларусі, як і ва ўсіх славян,— працяг тых жа калядак і служыць заканчэннем свят. Але беларус наогул не такі багаты і заможны, каб збыткаваць. Уся раскоша заключаецца ў блінах, яечні, у нямногіх мясных стравах.

У некаторых месяцах быў звычай, здаецца, ужо не існуючы, гуртам (моладзі) бадзяцца на Масленіцу пад вокнамі дамоў і выпрошваць падачку, пры гэтым, зразумела, спяваліся святочныя песні. Бяссонаў прыводзіць цікавую масленічную песню з Барысаўскага павета:

— Маладзіца, маладзіца маладая!  
Выйдзі к нам на вуліцу,  
А вынесь нам сыру,  
А народзіш сына,  
А вынесь ты мачку,  
А народзіш дачку.  
— Як я маю выходзіць —

Свёкар скажа: пазаўгольніца,
А свякруха скажа: пахмурніца,
А дзевер скажа: палятуха,
Залва скажа: шчабятуха.
— Маладая маладзіца,
Умей гэтак адказаці:
— Пазаўгольніца, заўгольніца —
Свіння чорна,
Пахмурніца — цёмна хмара,
Палятуха — ластавіца,
А шчабятуха — сарока!

Вялікі пост не вызначаецца нічым асаблівым. У Вербную нядзелю стараюцца як найраней устаць і падрыхтаванаю вярбою будзяць спячых, прымаўляючы: «Не я б'ю — вярба б'е...»

Пост, строгі і даволі пашыраны, даводзіць многіх да знясілення, прымушае чакаць з нецярпеннем гэтага свята, да якога кожная сям'я стараецца абавязкова падрыхтаваць свянцонае (як у праваслаўных, так і ў католікаў). Неабходная прыналежнасць свянцонага ў сялян — яйкі, пафарбаваныя чырвонаю фарбаю (маларускіх пісанак не ведаюць зусім), куліч, сыры і каўбасы. Больш заможныя дадаюць вяндліну, парсюка і г. д. Усё гэта складваюць у каробкі і ноччу адпраўляюцца ў прыходскую царкву або касцёл, дзе пасля ўсяночнай свяшчэннік асвячае свянцонае, частка якога тут жа аддзяляецца для свяшчэнніка або ксяндза. Вялікая ноч у католікаў або Вялікі дзень у праваслаўных раней суправаджаліся стральбою з ружжаў і марцір, а вакол царквы і цяпер запальваюць смаляныя бочкі. Уся вёска на нагах, радасць, весялосць усюды. Пасля вяртання дамоў з царквы ў кожнай сям'і пачынаюць разгаўляцца: гаспадыня рэжа яйка на некалькі кавалачкаў і падае кожнаму з прысутных, а затым прыступаюць да мяснога і гарэлкі. Народ святкуе чатыры дні. Чацвёрты дзень дадатковы, называецца людовым. У кожнай вёсцы робяць арэлі і падрыхтоўваюць лубкі для качання яек. Цікава, што народ лічыць арэлі супрацьдзеяннем ад нападзення камароў. Біццё і качанне яек з лубкоў нярэдка пераходзіць у гарачую і азартную гульню, якая прыводзіць да сваркі і нават бойкі. Гульні гэтыя працягваюцца да Юр'я. У першыя дні свята маладыя хлопцы ходзяць па вуліцах і спяваюць перад хатамі свяшчэнныя песні, часам і ў суправаджэнні музыкі, г. зн. скрыпкі, балалайкі або дуды. Вядома, іх запрашаюць у хату і частуюць свянцоным або дораць ім па кавалку пірага і мяса, што яны складваюць у асобна падрыхтаваны мех. Хлопца, якому даверылі мяшок, называюць механошам, наогул жа пеўчых і музыкантаў назы-

ваюць валачоўнікамі або валачобнікамі. Музыкантаў называюць яшчэ скамарохамі.

Песні, што спяваюць валачобнікі, не заўсёды толькі духоўнага зместу. Трапляюцца сярод іх вельмі старадаўнія песні, часоў язычніцкіх, бываюць і «скаромныя». Валачобныя песні маюць ужо характар вясенні.

Ужо гаварылася, што ў беларусаў вясна называецца Ляля, або Лёля, але сапраўдная багіня вясны, бясспрэчна, вядомая Лада, да якой і звяртаюцца ў песнях і закліках. Лёля — юная, стройная, прыгожая дзяўчына. Калі хочуць пахваліць прыгажосць дзяўчыны, гавораць: «Прыгожа, як Ляля!» У гонар Лёлі, або Лялі, бывае свята напярэдадні св. Юр'я, г. зн. 22 красавіка, і называецца «Ляльнік». Гэта і ёсць уласна закліканне вясны. Дзяўчаты збіраюцца з усёй вёскі на прасторным лузе. Яны выбіраюць са свайго асяроддзя самую прыгожую, надзяюць на яе белую кашулю, шыю, рукі і стан упрыгожваюць зелянінаю, на галаву ўздзяюць вянок з веснавых кветак. Потым яе садзяць на падрыхтаваным узвышэнні, засланым зялёным дзёрнам. Перад ёю кладуць зялёныя вянкі, хлеб, малако, яйкі, масла, сыр, смятану. Дзяўчаты, узяўшыся за рукі, акружаюць Лёлю карагодам і спяваюць песні. Пры закліканні вясны ў песнях звяртаюцца да самой багіні Лады:

Благаславі, маці,
Ой, Лада, маці!
Вясну заклікаці.

Цудоўная песня з просьбаю аб ураджаі:

Дай нам жытца
Да пшаніцы
У агародзе,
Сенажаць,
Роўны грады,
Роўны грады.

У адказ на гэту песню Лёля дорыць дзяўчатам вянкі і частуе іх. Вянкі і травы, якія былі на Лёлі, захоўваюцца ўвесь год да наступнага Ляльніка.

Пасля свята Ляльніка адразу пачынаецца ўрачыстасць сына Лады і Дажбога (сонца) — Ярылы. Св. Юрый пры хрысціянстве замяніў Ярылу. Беларусы ведаюць Ярылу: гэта малады, прыгожы юнак, ён раз'язджае на белым кані (гэтак, як і Юрый) і ў белым плашчы; на галаве ў яго вянок, у руках каласы, ногі босыя. Ярыла — бог урадлівасці і пажадлівага

кахання. На Юр'еў дзень Ярыла, або цяпер св. Юрый, па загаду маці раскрывае нябесныя вароты і на белым кані прыязджае на зямлю, а з яго прыездам пачынаецца сапраўдная вясна. У гэты ж дзень першы раз выпускаюць жывёлу ў поле... Не толькі сяляне, але і багатыя ўладальнікі ў гэты дзень запрашаюць свяшчэнніка на поле і ў чатырох канцах яго адпраўляюць малебны. У дзень св. Юр'я народ спявае:

А Юр'ева маці,
Божа мілы!*
Па небе хадзіла,
З Юр'ем гаварыла:
— А Юр'ю мой, Юр'ю,
Падай Пятру ключы
Зямлю адамкнуці,
Траву выпусціці,
Скаціну накарміці.

Не толькі на дзень св. Юр'я, але і на наступныя дні да канца красавіка беларусы ўшаноўваюць Ярылу. Яшчэ нядаўна свята яго суправаджалася карагодамі, песнямі, потым выпіўкаю. Паданне малявала Ярылу як апекуна пажаданага кахання. Як на свята Ляльніка, так і цяпер дзяўчаты выбіраюць самую прыгожую, убіраюць яе Ярылам (св. Юр'ем) і саджаюць на белага каня. Вакол яго не толькі дзяўчаты, а ўсе жыхары сяла, старыя ўзначальваюць карагод, і ў кожнага з прысутных вянок са свежых кветак. Ярыла едзе па засеяных нівах, а карагод спявае песні, дастаткова пераконваючыся, як народ разумее Ярылу, як ён садзейнічае ўрадлівасці зямлі і нараджэнню дзяцей. У адной песні гаворыцца:

А дзе ж ён нагою —
Там жыта капою,
А дзе ж ён не зірне —
Там колас зацвіце!

Наступнае свята св. Тройца — Зялёныя святкі, старадаўні славянскі Семік (Сеймік) і неадлучны ад яго абрад «куста». Ёсць штосьці зварушлівае і высокапаэтычнае ў гэтым ушанаванні вясны. Народная паэзія бачыць у месяцы маі і пачатку чэрвеня шчаслівыя дні, калі, перамогшы нябесную цемру, «святыя» сыходзяць на зямлю, каб узнавіць, ажывіць прыроду, упрыгожыць яе кветкамі і зелянінаю. Хрысціянства з дальнабачнасцю і надзвычайнай празорлівасцю здолела скарыстаць галоўныя майскія і вясеннія ўрачыстасці ў двух вялікіх святах:

* Прыпеў «Божа мілы!» паўтараецца пасля кожнага радка.

Тройцы і Ушэсця. На Тройцу, у чацвер, святкуецца Семік, затым — Ушэсце, таксама ў чацвер (у канцы мая або ў пачатку чэрвеня), а чацвяргі былі прысвечаны Грамаўніку і вельмі шанаваліся народам. На Ушэсце вясна амаль канчаецца, набірае моц лета.

Перад Тройцай ноччу — першы выезд начлежнікаў у поле з коньмі. Суправаджаецца ён незвычайным гуляннем ля запаленых агнёў, з абавязковаю яечняю і скокамі. Яшчэ больш урачыстае свята ноччу перад тым, як настане Духаў дзень. Па старадаўнім звычаі, на Тройцу не толькі вуліцы, дамы ўсярэдзіне і з двара ўпрыгожваюцца маладымі бярозкамі, нават рогі жывёлы абвіваюцца зелянінаю. Звычай рассаджваць дрэўцы па вуліцах і каля хат захоўваецца і да гэтай пары ў гарадах і мястэчках не толькі на Беларусі, але і на ўсім Літоўскім Палессі, у Польшчы і ў некаторых іншых мясцовасцях славянскіх зямель. Гэты звычай ды заадно і сама назва «Зялёныя святкі», бясспрэчна, язычніцкага паходжання, спадчына далёкага мінулага.

У Пінскім павеце, таксама як і ў Маларасіі, святкуецца на другі дзень Тройцы «куст» — абрад, малавядомы ў іншых месцах Беларусі. Ён складаецца з наступнага: збіраюцца ўсе вясковыя дзяўчаты, з іх выбіраюць самую прыгожую, распранаюць яе дагала, кладуць ёй на галаву вянок і потым усю да ног абвіваюць зялёнымі голлямі, бярозавымі, кляновымі, ліпавымі, і кветкамі зазулінымі чарамычкамі, а таксама шаўковай травою і некаторым зеллем. Гэтак упрыгожаная дзяўчына называецца кустом, на які яна і на самай справе падобна. Яе вядуць усёй грамадою з песняю: «Павядзём куста пад гай зялёнsenькі» і інш.— спачатку ў панскі дом, потым у заможныя вясковыя дамы і ўсюды збіраюць дары, якія зносяцца і складаюцца ў пэўнае месца, дзе і пачынаецца бяседа з песнямі, музыкаю і скокамі — усю ноч.

2 мая і 24 ліпеня, напачатку і ў канцы палявых работ, народ святкуе апекуноў земляробства, князёў Барыса і Глеба. Самі імёны іх мелі падабенства са словамі «барыш» і «хлеб», і таму сяляне стараюцца абавязкова прадаць што-небудзь 2 мая, каб увесь год гандляваць з барышом. Барыс і Глеб разам з Кузьмою і Дзям'янам лічацца вынаходнікамі плуга. У беларускай песні спяваецца:

Святы Барыс ляды паліць,
Зямлю грэець, ячмень сеець,
З паўсявалкамі, з правай жменькі,
Кінеш рэдка, дасць бог густа.

У іншай песні св. Барыс пасе коней, а летні Барыс (24 ліпеня) снапы зносіць, бабы́ сеець.

9 мая свята св. Міколы Марскога, або Мокрага. На яго перанесена язычніцкае ўяўленне марскога бога, цара вадзянога — Стрыбога. Ва ўяўленні беларусаў ён хітрэй і дабрэй Перуна (Іллі) — ён і апякун земляробства, таму што Стрыбог быў адначасова богам вятроў. Нарэшце, Мікола Мокры — апякун коней, і дзень 9 мая лічыўся святам конюхаў. Цікавасць мае наступная беларуская песня:

А ідзець-брыдзець святы Мікола,
Святы Мікола з чыстага поля,
Ураснуся, умачнуся — макрошанек.
Прачыстая маці яго пытаець:
— Святы Мікола, дзе ж ты бываў?
Дзе ты бываў, дзе ж прабываў?
— Прачыстая маць багародзіца!
Я ў чэснага мужа ў Раманічка
Коней пасціў да запасаваў,
Я, запасаўшы, дамоў прыганю,
Я дамоў прыганю, у хлеў заганю,
У хлеў заганю, слаўцо згавару:
«Етаму статку не будзець упадку,
Ні ад мядзведзя, ні ад нарову,
Ні ад гада бягучага,
Ні ад змея лятучага».

Св. Мікалая звычайна малююць лысым. У некаторых месцах ёсць павер'е, што, калі хочуць, каб быў вецер, трэба дражніць лысага дзеда. У іншых месцах, калі маразы вельмі моцныя, трэба налічыць дзесяць знаёмых лысых — і мароз пройдзе.

Пасля Каляд выдатным народным святам лічыцца Іван Купала — свята, у якім да нашага часу захаваліся шматлікія сляды язычніцтва — як у песнях, так і ў абрадах. Купалам на Беларусі заканчваюцца веснавыя святы.

Само свята Купалы адбываецца ноччу з 23 на 24 чэрвеня амаль гэтак жа, з невялікімі адхіленнямі ў той ці іншай мясцовасці, як мы ўжо расказвалі, гаворачы пра Літоўскае Палессе. Але ў карэннай Беларусі, г. зн. у Магілёўскай і Віцебскай губернях, урачыстасць Купалы захавалася ў першабытнай чысціні больш наглядна і своеасабліва, чым у іншых славянскіх землях. Вечарам 23 чэрвеня, г. зн. напярэдадні св. Іаана, усё насельніцтва сяла або вёскі выходзіць у поле, да ракі, возера або хоць бы да ручая. Выбраўшы зручнае месца, убіваюць вялікі кол, зверху прывязваюць сноп, абкладваюць саломаю, на якую кідаюць пруткі, паленне, галлё і г. д. Потым запальваюць; хто скача праз агонь, хто бегае вакол абавязкова тры

разы. Кідаючы пруткі ў агонь, прыгаворваюць: «Каб мой лён быў так вялік, як гэтая прутчына». Дзяўчаты між іншым спяваюць:

Купала на Івана,
Дзе Купала начавала?..

Скаканне праз агонь узмацняецца, калі агонь згарыць да паловы, але жанатыя і ўдаўцы пазбаўлены гэтай уцехі. П'юць многа, ядуць варэнікі з грэчневай мукі, яечню, каўбасы і да т. п. У некаторых месцах замест звычайнага слупа робяць чучала ў выглядзе жанчыны. Дзяўчаты танцуюць вакол чучала і спяваюць. Купальскія песні беларусаў вельмі старанна сабраны Бяссонавым. Мы прывядзём тут адну з іх, надзвычайную па сваёй даўнасці і якая разам з тым высвятляе сэнс Сопухі. Гэта, верагодна, адно з імён Лады... Вось гэта песня:

Сярэдзь сяла Ваўчкоўскага,
То, то!
Туту стаяла лазня дубовая,
Ту, ту, ту!
А хадзілі дзецюшкі богу памаліцца,
Стоўб абнімалі, печ цалавалі,
Перад Сопухай крыжом ляжалі.
Яны думалі: Прачыстая,
Адно ж — Сопуха нячыстая!

Тут ужо выяўляюцца сляды барацьбы першых апосталаў хрысціянства з язычніцкімі абрадамі. Гэта відаць з упамінання Прачыстай, г. зн. божай маці.

Але вернемся да Купалы. Беларусы паказваюць Купалу, якая сядзіць на плоце, ірве кветкі ў Янавым садзе. Гэта відаць з песень. Напрыклад:

Як сядзіць Купала на плоце,
У яе галоўка ўся ў злоце.

Або ў наступнай песні:

— Дзе ж ты была, Купалачка?
— У тваім садку, Іванічка:
Красачкі рвала, Іванічка.
— Нашто табе красачкі, Купалачка?
— Вянкі віці, Іванічка,
Вяжынскім дзеўкам, Іванічка,
Яны замуж пойдуць, Іванічка.

Сэнс песні тлумачыцца абрадам, і да гэтага часу яшчэ сямтам захаваным у Магілёўскай губерні. Перад світанкам Іва-

нава дня дзяўчаты выбіраюць са свайго асяроддзя самую прыгожую, распранаюць яе дагала і голае цела абмотваюць кветкамі і абвешваюць вянкамі. Потым, акружаная мнагалюдным карагодам, дзеўка-Купала, як яе называюць, ідзе ў лес, дзе таксама падрыхтаваны вянкі. Тут ёй моцна завязваюць вочы, дзяўчаты скачуць і выкручваюцца вакол яе, а яна раздае ім вянкі. Вянкі гэтыя прадказваюць лёс дзяўчат: каму дастанецца свежы вянок — тая будзе жыць весела і багата; наадварот жа, калі якая атрымае завялы, то «не бачыць ёй шчасця», гавораць дзяўчаты.

Этнолагі да выдатных беларускіх песень адносяць яшчэ наступную, якую спяваюць таксама пры ўзыходзе сонца 24 чэрвеня:

Іван да Мар'я
На гарэ купаліся:
Дзе Іван купаўся,
Бераг калыхаўся,
Дзе Мар'я купалась,
Трава рассцілалась.

Травы ў гэту ноч адыгрываюць важную ролю і набываюць асаблівы сімвалічны сэнс. Першае месца, вядома, належыць папараці, або Перуновай кветцы. На папараць, паводле народнага падання, зыходзіць агонь Перуна, і яна загараецца прыгожаю кветкаю. Гэта і ёсць кветка папараці, і адсюль склалася думка, быццам папараць цвіце толькі адзін раз у год — у поўнач 24 чэрвеня. Хто сарве гэту кветку, таму адкрыты ўсе таямніцы прыроды, і злыя духі будуць яму служыць. Цяжка, аднак, зрабіцца ўладальнікам чарадзейнай кветкі. Народ верыць, што скарбы, закапаныя ў зямлю, выходзяць гэтай ноччу на паверхню ў самым розным выглядзе: як аганькі ў кустах, якія свецяцца, кветкі, асабліва кветкі папараці, і да т. п.

Для святкавання Купалы выходзіць павінны ўсе — старыя і маладыя. Хто гэтага не выканае, таго нібы спаткае горкая доля. Песня гаворыць:

Хто ня йдзець на траўку на зялёную,
На вуліцу на шырокую,
Няхай ляжыць калодаю дубоваю,
А дзеткі яго карчоўем няхай ляжаць.

Не адна папараць адыгрывае важную ролю ў Купальскую ноч. Наогул у гэты час збіраюць розныя травы, зёлкі, былінкі як для ўпрыгожання і пляцення вянкоў, так аднолькава лекавыя, патрэбныя на ўвесь год ад усялякай немачы. Збіраюць

васількі, улюбёныя на Беларусі, руту, браткі, дзягель і інш. Збіраюць іх так многа, што, пакідаючы сабе, шмат яшчэ прадаюць на кірмашах у Іванаў дзень і наступныя дні.

Трэба заўважыць, што да 24 чэрвеня і наступных дзён да 29-га і нават далей прымяркоўваюцца вялікія кірмашы як на Беларускім Палессі, так і Літоўскім. Уласна на Беларусі ў гэту пару кірмашы ў Мінску, Барысаве, Лоеве, Пінску, Свержані і Тураве; на Магілёўшчыне — у Лядах, Магілёве, Шклове, Быхаве; на Віцебшчыне — у Бешанковічах, Асвеі і іншых месцах.

Купальскае свята на Беларусі з усімі абрадамі, песнямі, павер'ямі, легендамі цалкам увасабляе паэтычную творчасць народа, яго любасць да прыроды, да запаветных бацькоўскіх звычаяў. Паняцці, уяўленні пераблыталіся з хрысціянскім поглядам на св. Іаана, але старадаўнія звычаі і абрады захаваліся. Праўда, цяпер наўрад ці дзе-небудзь на Беларусі топяць у рэчцы ці ў возеры чучала Лады раніцаю, перад узыходам сонца, калі яно «іграе» на досвітку, гуляе зайчыкам, разбіваючыся на мноства частак і раптам збіраючыся ў адзін круг.

Народ верыць, што Днепр, Бярэзіна, Сож, Вехра, Дзвіна і іншыя рэкі пераліваюцца ў гэты час нейкім асаблівым незвычайным святлом, што дрэвы сыходзяць са сваіх месц і гавораць паміж сабой патаемнаю моваю. Размову дрэў, раслін, кветак, птушак і жывёлы можа зразумець толькі той, каму ўдасца здабыць кветку папараці. Нават раса ў Купальскую ноч валодае жыватворнымі лекавымі сродкамі: ёю ўмываюцца, каб прагнаць ад сябе ўсялякія хваробы. На Літоўскім Палессі ў некаторых месцах, нават у Вільні, само свята і месца, дзе яно адбываецца, называюцца «Раса».

20 ліпеня свята Іллі-прарока. Само супадзенне гэтага дня з пачаткам жніва звязала св. Іллю з Перуном-Грамавержцам. Па народных павер'ях, Перуна змяніў Ілля і да такой ступені з ім зліўся, што народ самога Іллю называе Грамаўнікам, а пра забітага громам гавораць: «Ілля ўзяў яго к сабе».

З надыходам восені галоўным міфічным боствам, і прытым выключна беларускім, з'яўляецца Жыцень. Прызначэнне Жыценя даволі выразнае: ён садзейнічае росту і паспяванню збажыны і гароднiны. Ён ходзіць па палях і агародах і паглядае, ці добра вядзецца гаспадарка, а пасля ўборкі ўраджаю,— ці ўсё так як трэба ўбрана. Адразу ж на месцы чыніць суд і расправу: як толькі заўважыць на якім полі шмат нязжатых і раскіданых каласоў, ён збірае іх, звязвае ў снапы і пераносіць на поле таго гаспадара, у якога ўсё ў парадку. Але гэтым суд

не канчаецца: вынікі з'явяцца на наступны год — у нядбайнага гаспадара ўсё загіне, а ў руплівага, на поле якога ён перанёс снапы, будзе багаты ўраджай. Не дзіўна, што вера ў такі суд і расправу вельмі карысная і яна прымушае старанна ўбіраць ураджай.

Жыцень ходзіць часам па дарогах у выглядзе жабрака з жабрачаю торбай. Сустрэўшы падарожнага, ён пагражае яму пальцам. Падарожны, вядома, пазнае яго, і адразу пойдзе навіна, што Жыцень пагражаў неўраджаем. «Жыцень з Кобзай — голад на двор»,— гавораць беларусы. Ёсць прымаўкі: «Жыцень хлеба даў» або «Бардзей на Жытня, калі ў засеку хлеба не прытне», г. зн. валі віну на Жытня, калі ў клеці хлеба няма. Жыцень і клапоціцца са свайго боку, каб ураджай быў добры: калі восенню сеюць, ён, хоць і нябачны, заўсёды прысутнічае, утоптваючы ў зямлю кінутыя зярняты, каб ніводнае марна не прапала.

## НЕКАТОРЫЯ ЗВЫЧАІ, ПАВЕР'І, ПРЫКМЕТЫ І ПРЫМХІ

Што датычыць звычаяў, павер'яў, прыкмет і прымхаў гомельскіх беларусаў, то яны тыя ж, што і ў астатняй Беларусі і на Украіне.

Святая пятніца ходзіць па вёсках пад выглядам старой бабы і строга наглядае за тым, каб ніхто не адважваўся прасці ў пятніцу, бо яна, бедная, вельмі пакутуе і ў тым доме здарыцца нешта нядобрае або наогул будзе няўдача. Вера ў існаванне ведзьмаў і ведзьмакоў, лесавікоў, вадзяных і чарцей непахісная. Ваўкалакі існуюць бясспрэчна: гэта людзі, перавернутыя ў ваўкоў за якое-небудзь злачынства. Калі такога воўка параніць, ён зноў ператварочваецца ў чалавека, пачынае гаварыць чалавечым голасам і, паміраючы, прызнаецца, што быў воўкам і што яму было цяжка наносіць страты свайму сялу.

Не трэба прыносіць аснову (ніткі для кроснаў) з чужой вёскі, бо ваўкі будуць нападаць на жывёлу. Вераць таксама, што чэрці жывуць у лозах, каля берагоў рэк, і хапаюць там людзей.

Ведзьму можна лёгка пазнаць на Юр'я, трэба толькі накідаць мурашніку па вуліцы: ведзьма ніяк не зможа прайсці праз гэту вуліцу, будзе злавацца і зробіць вялікі круг у абход, таму што не можа і кроку ступіць паблізу мурашак. На Юр'я ведзьмы адбіраюць малако ў кароў. Каб яе

ўбачыць, трэба сесці на дварэ каля хлява пад бараною з запаленаю свечкаю. Ведзьма прыйдзе ў адной кашулі з распушчанымі валасамі. Карыстаючыся гэтымі забабонамі, часам маладыя жанчыны ідуць на чужы двор «па малако». Як іх застаюць, то ўжо не сумняваюцца, што гэта і ёсць сапраўдныя ведзьмы.

Калі надыходзіць час сеяць жыта, збіраюцца ўсе сейбіты і просяць пачынаць першым самага лепшага, добрага чалавека. У выніку калі здарыцца неўраджай, то высвятляецца, што першым сеяў жыта нядобры чалавек. Няўдачу ў жніве, калі хлеб ад дажджу гніе ў копах, тлумачаць таксама тым, што першая жнейка была нядобрая баба.

Заломы ў жыце пазбаўляюць сілы. Бяда, калі хто сажне, не заўважыўшы, немінуча здарыцца няшчасце.

Купацца ранняй вясной нельга, бо схопіць хіндзя; яна, вядома, сядзіць на дне і ловіць тых, хто купаецца. Сродак ад ліхаманкі наступны: кідаюць каля дарогі кашулю, хто яе возьме і адзене на сябе, на таго і ліхаманка пяройдзе. Ліхаманак семдзесят сем, і, каб пазбавіцца ад іх, бяруць семдзесят сем зярнят проса, ідуць да вады і, павярнуўшыся спіною, кідаюць гэтыя зярняты праз галаву назад са словамі:

Цёткі хіндзі,
Вас семдзесят сем,
Наце плату вам усім!

Каб не сурочылі, трэба адзяваць сарочку навыварат або задам наперад. Калі пахваляць, трэба сплюнуць тры разы і сказаць: «Соль табе ў вочы, малонне ў зубы». Цяпер гэтыя словы ўголас не гавораць, а шэпчуць самі сабе. Калі хто пералякаецца, то яму тады ж разрываюць сарочку, каб не захварэў з пераляку. Калі жывёла не вернецца з пашы нанач, дык моляцца святому Юр'ю, каб ён яе пасцярог; потым ідуць да знахара і просяць яго «закладаць» жывёлу ад звера. Знахар бярэ ў гаспадара замок з ключом, пашэпча над ім, замыкае замок ключом і кладзе яго на дварэ дзе-небудзь на відным месцы, каб гаспадыня адразу магла знайсці,— тады жывёла вяртаецца з пашы сама або з дапамогаю чорта, ідала, як тут гавораць. Мне гаварыла адна набожная бабуля: «Не люблю я таго — няхай лепей мая жывёла прападзе, як яна мне вернецца ад ідальскай сілы». Наогул калі жывёла вяртаецца сама (пасля таго як лічылася страчанай, пераначавала ў лесе), дык вераць, што

яе прыгнала «нячыстая сіла». Калі яна мае стомлены выгляд, дык гавораць: «Як ён яе, бедную, замардаваў...»

Беларусы любяць песні і многа спяваюць. У свята і ў будні, на рабоце і на вячорках, вясною, летам, увосень і нават зімою пад адкрытым небам гучаць іх песні.

Вяснянкі — самыя любыя песні беларусаў. 2 лютага, на Стрэчанне, спяваюць першую вяснянку, якая пачынаецца гэтак:

Зіма з летам сустракалася,
Пра здаровейка пыталася і г. д.

Потым перастаюць спяваць, пакуль не пацяплее. З сакавіка пачынаюць спяваць амаль кожны вечар да позняй ночы. 25 сакавіка спяваюць вяснянку:

У нас сягодні Благавешчанне...

На Юр'я захоўваецца звычай юрыцца: дзяўчаты і нават дзеці ідуць за вёску ў поле або ў лясок і пад бярозкаю гатуюць яечню. У гэты дзень дзяўчаты выбіраюць сабе сяброўку на ўвесь год, пры гэтым абменьваюцца паясамі і хусткамі і гавораць пасля гэтага: «Мы з ёю паюрыліся». Звычай гэты суправаджаецца спяваннем вяснянак.

Вяснянкі адрозніваюцца ад усіх іншых песень своеасаблівым прыпевам накшталт перагуквання (гукання) у сярэдзіне песні, што само па сабе вельмі прыгожа, калі песня прагучыць у лесе, праляціць над вясеннім разлівам і адгукнецца далёкім рэхам...

Усе маладыя дзяўчаты збіраюцца вечарам пасля заканчэння сваіх работ і становяцца групамі на беразе ракі, а калі няма рэчкі або возера, то за вёскай, на аколіцы, часам на ўзгорку. Размяркоўваюцца гэтыя групы далёка адна ад другой. Калі адна група закончыць свой куплет і толькі пачынае заціхаць апошняя нота, тады ўдалечыні другая група працягвае наступны куплет. Такое выкананне веснавых песень мае ў іх назву «вясну гукаці». Вяснянкі спяваюць да самага лета, г. зн. да 24 чэрвеня. Апошняя вяснянка вельмі дарагая для іх:

Песенька мая харошая,
Схаваю цябе на лецейка,
Паеду ў поле з сахою,
Вазьму песеньку з сабою;
Ой, сахою буду араці
І цябе, песенька, спяваці.

Пасля гэтай апошняй вяснянкі адзначаюць ужо Івана Купалу. 24 чэрвеня, калі зойдзе сонца, усе дзяўчаты збіра-

юцца за вёскай і плятуць вялізныя вянкі для ўсіх, а самы вялікі для той, якая выдае сябе за русалку. Русалкаю выбіраюць тую, якая мае самыя доўгія валасы. Яна здымае свой андарак і застаецца ў кашулі з расшпіленым каўняром. Калі яна даволі смелая, то скідае нават і кашулю. Доўгія распушчаныя валасы закрываюць плечы, вялізны вянок, як кола, прыкрывае ўсю галаву. Адначасова выбіраюць і дзяўчыну на ролю дачкі русалкі. А з саломы робяць чучала накшталт чалавека. Калі ўсе вянкі адзеты, бяруць чучала і вядуць «русалку» ў поле з песняю:

Правяду я русалачку да бору,
А сама вярнуся дадому...

Давёўшы да поля, ідуць мяжою, выбіраюць месца як найдалей ад вёскі, ад засеянага поля, раскладваюць касцёр і кідаюць у агонь чучала з песняю пра Івана Купалу:

Купала на Івана, Купала!
Дзе, Купала, начавала, Купала!

Калі чучала згарыць, тады дзяўчаты і хлопцы пераскакваюць праз гэты агонь, і доўга яшчэ працягваюцца іх песні і скокі.

Вясковыя ўлады забараняюць выконваць гэтыя старадаўнія язычніцкія абрады; неяк было зусім перасталі адзначаць Івана Купалу, а нядаўна зноў пачалі, але ўжо не напярэдадні, г. зн. не 23 чэрвеня, а на самога Купалу, 24 чэрвеня.

Вясеннія карагодныя песні спяваюцца толькі на Велікодным тыдні, на Вялікадне, як тут гавораць, таму яны і велікодныя. Іх называюць яшчэ «танкі» («танок»). Разам з тым гэта і гульні («А мы проса сеялі», «Ці далёка мой старац», «А на гарэ мак», «На гарэ лён, белы кужаль» і г. д.). Ёсць яшчэ песні, якія спяваюць, вадзіўшы «сулу», г. зн. ходзячы па вуліцах на святым тыдні: «сулу» — з вуліцы на вуліцу...

Яшчэ перад жнівом спяваюць: «Пара, маці, жыта жаці». А калі ідуць зажынаць, г. зн. першы раз жаць (абавязкова ў суботу, якая лічыцца лёгкім днём), дык да поля звяртаюцца з наступнай песняй:

— На дабранец, да шырокае поле, жыта ядраное!
— На здароўе, жанцы маладыя, да сярпы сталяныя,
Вы прыходзьце заўтра рана, штоб я ў полі не стаяла і г. д.

Жаць жыта адпраўляюцца ўсе — і падлеткі, і дзяўчаты, і маладзіцы, і старыя бабы. А калі ў сям'і толькі сыны, яшчэ не жанатыя, то і яны жнуць. Усе яны спяваюць свае жніўныя песні.

Пасля заканчэння жніва гуляюць абжынкі: з жыта робяць вянок і крыж. Вянок гэты адзявае на сябе адна з дзяўчат, а крыж нясе другая. Вянок робяць з жыта, а таксама з пахучай траўкі пад назвай «кудраўчык» і з вялікіх жоўтых гваздзікоў. Усё гэта прыносяць у дом гаспадара, якому жалі, за гэта ім плацяць грошы і частуюць гарэлкай. Вянок і крыж вешаюць пад абразамі. На гэтым святкаванні спяваюць розныя жніўныя песні, а потым усялякія іншыя. Захаваўся яшчэ адзін звычай: калі дажынаюць, то пакідаюць на ніве «кругловінку» нязжатага жыта, звязваюць яго поясам, убіраюць кветкамі і паліваюць вадою. Пры гэтым спяваецца наступная песня:

Сядзіць казёл на капе
Да дзівіцца барадзе...

Ёсць яшчэ звычай склікаць людзей на талаку, г. зн. запрашаюць жаць жыта або ўбіраць сена без усялякай платы, толькі за пачастунак; даюць многа гарэлкі, абед, падвячорак, вячэру. На гэту талаку ідуць з вялікай ахвотаю. Талаку склікаюць найчасцей у якое-небудзь невялікае свята, напрыклад на Пятра і да т. п., калі адзначаюць другі дзень пасля свята. Сабе рабіць, гавораць, грэх, а людзям можна, але не за плату, а толькі за пачастунак. Для гэтага наймаюць часта нават музыку. На рабоце не падганяюць людзей, а толькі частуюць іх.

«Звязду» носяць на Каляды, на Новы год і на Вадохрышча. Хлопчыкі ходзяць вялікім гуртам і спяваюць хорам песні аб нараджэнні Хрыста...

На Каляды водзяць яшчэ «казу». Ролю казы выконвае хлопец, адзеты ў вывернуты кажух, а другі хлопец, які вядзе «казу», адзеты старым дзедам з вялікаю льняною барадою. Пра «казу» спяваюць:

Го, го, го, каза,
Каза серая,
І дзе каза ходзіць,
Там жыта родзіць...

Шляхцюкі на Каляды водзяць «кральку». Зместам гэтай песні-гульні з'яўляецца расказ пра нялюбую жонку, якая ўсім дагаджае: і свёкру, і свякроўцы, і дзеверу, і залоўцы —

толькі мужу нічым не можа дагадзіць. Песня даволі прыгожа гучыць. Усе становяцца ў круг, скачуць і спяваюць. У сярэдзіне круга скача «кралька» ў вобразе пачварнай карліцы, з двума гарбамі.

Напярэдадні Новага года пад вокнамі шчадруюць дзеці, часам і маладыя дзяўчаты. Вось узор шчадровак:

Шчадрую, шчадрую,
Каўбасу чую.
Дайце каўбасу,
Дамоў панясу...

Вясковыя ўлады забараняюць шчадраваць...

На першы дзень Новага года дзеці ходзяць «засяваць». Уваходзячы ў хату, сыплюць жыта, ячмень або проса са словамі:

Сею грэчку і пшаніцу,
А мне дайце паляніцу.

Гэтых дзяцей частуюць і даюць ім грошы.

## АБРАДЫ, ПРЫКМЕТЫ, ВАРОЖБЫ, ЗАБАБОНЫ, ПАВЕР'І І ПРЫМХІ ПІНЧУКОЎ

**Буськавы лапы** (ці Благавешчанне, 25 сакавіка па ст. ст.). Бабы пякуць пірагі ў выглядзе буськавых лап; у гэты дзень не садзяць гусей, інакш будуць калекі; не затыкаюць кроснаў, таму што будуць рвацца, аслабляцца ці выйдуць крывыя бакі.

**Хрэсты.** Серада ў палове посту. У гэты дзень нічога не робяць; баба не возьмецца нават за іголку. Пякуць пірагі ў выглядзе крыжа.

**Наўскі чацвер** — першы чацвер пасля Вялікадня.

**Крывая серада** — апошняя серада перад Тройцаю. Капусту, буракі і іншае не садзяць, таму што калі пасадзіць у гэты дзень, то зародзіцца крывое, малое, чарвівае.

**Св. Юрый** — вясною — 23 красавіка і восенню — 26 лістапада па ст. ст. У свята св. Юр'я з раніцы да вечара просты чалавек не займаецца работаю. Гавораць, што «асенні Юрый адмыкае раты ваўкам», так што з гэтага дня крыважэрныя ваўкі пачынаюць хадзіць зграямі і нападаць на жывёлу. Вясенні Юрый замыкае раты звярам — і ваўкі спыняюць ці, прынамсі, значна памяншаюць свае стратныя напады на жывёлу.

**Доўгі Іван** (8 мая). Садзяць у гэты дзень моркву, агуркі, рэдзьку і г. д. У час пасадкі бабы падбіраюць спадніцы высока ў надзеі, што ўсё пасаджанае вырасце высока, і хапаюцца за сваё калена з упэўненасцю, што пасаджанае будзе такое ж тоўстае і круглае, як калена.

**Купайла** (24 чэрвеня). Пад імем Купайлы ў народзе вядома свята нараджэння Іаана Хрысціцеля. Вечарам пад Купайлу бывае карагодная гульня пад назвай «Выкінь». Яна складаецца з наступнага: вечарам пад свята маладзіцы (жанчыны, якія нядаўна выйшлі замуж), дзяўчаты і хлопцы збіраюць чарот, якога на пінскіх балотах вельмі шмат, салому, галлё — і ўсё гэта выносяць за сяло, выбіраюць больш узвышанае месца, з сабранага матэрыялу робяць касцёр і запальваюць; калі разгарыцца касцёр, моладзь пераскаквае праз агонь па некалькі раз; пры гэтым бываюць танцы і карагодная гульня пад назвай «Выкінь»: хлопцы з дзяўчатамі і маладымі жанчынамі робяць круг і, кружачыся каля агню, спяваюць песні. Усё гэта пачынаецца перад захадам сонца і канчаецца каля поўначы. Скачуць праз агонь з перакананнем, што русалкі не будуць нападаць і прыходзіць на працягу года ў хлеў даіць кароў.

Жанчыны рана на Купайлу рвуць крапіву, якую вешаюць на дзвярах сяней, у хлявах, таму што русалкі, на іх думку, баяцца гэтай расліны. Калі пападзецца ў гэты дзень жаба, забіваюць яе з той упэўненасцю, што гэта русалка паўзла ў выглядзе жабы.

**Конскі Вялікдзень.** Гэта свята народ устанавіў у гонар коней. Ён бывае ў першы аўторак пасля Тройцы. У гэты дзень не скарыстоўваюць коней для работы. У канюшнях вешаюць свечкі за здароўе коней.

**Арабінавы дзень і ноч.** Бываюць пасля Прачыстай на трэці дзень. Народ у гэты дзень нічога не робіць у чаканні грому, маланкі і дажджу. Усякі баіцца якога-небудзь няшчасця. Другая назва гэтаму дню — Варавіты дзень.

**Галавосік** (29 жніўня). Капусту з град не рэжуць, бульбы не ядуць, наогул нічога круглага не ўжываюць: інакш будуць на целе болькі (верада). Цэлы дзень пост.

**Каляда** (24 снежня). Пад назвай «Каляды» ў народзе вядомы пярэдадзень Новага года. На Піншчыне калядою называюць таксама песні, якія распяваюцца моладдзю вечарам гэтага дня, а ў некаторых месцах і ў самое свята. Гэтак жа называюць і ўзнагароджанне, якое дае гаспадар калядоўшчыкам.

Да з'яўлення на небе вячэрняй зоркі сяляне нічога не ядуць. Садзяцца вячэраць усе ад малога да вялікага. Гаспадыня, старшая ў доме, насыпае на стале некалькі хлебных зярнят, кладзе сена і паверх пасцілае абрус. На покуці, ці ў куце пад абразамі, ставіцца першая страва — гэта куцця, звараная з ячменных круп з мёдам. Акрамя куцці амаль у кожным доме падаюцца на вячэру боршч, сухія грушы, слівы, яблыкі, варэнне з мёдам, рыба, аўсяны кісель і бліны. Гаспадар дома, наліўшы шкляначкі гарэлкі, чытае ўголас малітву, а затым, пажадаўшы ўсяму дому здароўя, выпівае; за ім п'е па старшынству ўся сям'я, не выключаючы жанчын і дзяцей. Кожны п'е да дна. Перад апошняй стравай піццё гарэлкі паўтараецца ў тым жа парадку, толькі цяпер галава дома, павярнуўшыся да акна, запрашае да сябе на куццю госця — мароза: «Мароз-мароз, хадзі куццю есці, а калі не хочаш, то ўжэ не йдзі ніколі». Так заканчваецца вячэра.

Збожжа сыплюць на стол з той мэтай, каб быў ураджай на хлеб; сена кладзецца ў памяць таго, што быццам бы збавіцель ляжаў у яслях на сене, калі нарадзіўся. Куцця варыцца з ячменю ў памяць таго, што калі нарадзіўся Хрыстос, то асёл еў у той час ячменную салому. Мароз запрашаецца на вячэру для таго, каб ён не марозіў жывёлу і што пасеяна ў полі. Ставяць у куццю, якая засталася, свае лыжкі і раніцаю глядзяць: чыя лыжка ўпала, той памрэ перш за другіх у сям'і. Пакідаюць куццю з тым перакананнем, што ноччу прыходзіць на вячэру сам збавіцель. Пасля вячэры, не выходзячы з-за стала, жанчыны выцягваюць з-пад абруса, заплюшчыўшы вочы, сянніну, каб даведацца, які будзе лён: калі выцягне доўгую сянніну, верыць, што ў яе ўродзіцца добры лён, а калі кароткую, то будзе лён дрэнны. Мужчыны ў сваю чаргу спяшаюцца даведацца такім жа чынам, які будзе ўраджай на хлеб. Пасля вячэры выходзяць на двор паглядзець, ці шмат зорак на небе: многа зорак прадракае добры ўраджай на хлеб і ў час сенакосу добрае надвор'е, мала зорак на небе — дрэнны ўраджай і благое надвор'е ў час сенакосу. У дзень свята жанчыны яшчэ да світання ходзяць за вадою на рэчку ці да калодзежа і, прыйшоўшы туды, вітаюць рэчку ці калодзеж, а мужчыны ў іх адсутнасць запальваюць у печы. Рана прынесці вады ў дом, а мужчыну запаліць у печы лічылася верным сродкам для таго, каб садзіліся пчолы. Запаліўшы ў печы, селянін выходзіць на двор і глядзіць, у які бок падымаецца дым з коміна, і па напрамку дыму робіць вывад,

у які бок паляжа жыта. Пасля ўсяночнай старшы гаспадар нясе пакінутую ў гаршку куццю ў хлявы і аддае яе жывёле.

Калі свята нараджэння Хрыста трапіць на пятніцу, то ў тым годзе будзе паміраць больш жанчын, чым мужчын, калі на аўторак ці чацвер, то больш мужчын, а калі на панядзелак, то жанчыны ў тым годзе цяжка будуць нараджаць дзяцей.

**Шчадруха.** Пярэдадзень Новага года завецца Шчадрухаю, Шчадрацом і багатаю куццёю, таму што вячэра ў гэты дзень бывае шчодраю, г. зн. багатаю, таму што яна складаецца з мясных страў у супрацьлегласць поснай куцці, якая бывае на Каляду.

Ні адной пары года просты чалавек не пражывае з такім мноствам забабонаў, як пярэдадзень і першы дзень Новага года. Гэту пару ён лічыць самаю спрыяльнаю для варажбы. Цяпер, па яго разуменні, усё ў прыродзе знаходзіцца ў такім становішчы, што варта толькі дакрануцца, да чаго захочаш, і яно раскажа табе сваёй таямнічаю моваю будучае. Гаспадар дома стараецца даведацца, ці добры будзе ўраджай на хлеб у будучым годзе, які будзе ў новым годзе прыплод на жывёлу, ці добра будуць раіцца пчолы і г. д. Гаспадыня варожыць, ці добры будзе лён, ці будуць каровы даваць шмат малака і да т. п.

Хлопцы і дзяўчаты занятыя пытаннем аб шлюбе: першыя даведваюцца, ці жэняцца яны ў гэтым годзе, якая будзе жонка; другія варожаць, ці хутка выйдуць замуж, якія будуць іх суджаныя, ці будуць любімы мужамі. Словам, цяпер кожны спадзяецца вырашыць неспакойнае пытанне, якое займае яго душу, кожны хоча даведацца, што чакае яго наперадзе.

Аб'язджаюць маладых коней і валоў, каб добра хадзілі запрэжанымі.

Жанчыны, нічога не рабіўшы ўсю Каляду, цяпер стараюцца больш шыць, каб у жывёлы не было чарвей летам.

Абвязваюць дрэвы перавяслам, каб было столькі пладоў на дрэве, колькі ў снапе зярнят. Жанчыны матаюць ніткі з верацён у клубкі, каб урадзіла бульба.

Запальваюць вечарам васковую свечку, каб больш было мёду і воску.

Вечарам нарэзваюць хлеба на наступны дзень, каб не рэзаць рук, ног на працягу ўсяго года.

Па зорках даведваюцца аб прыбытку жывёлы: калі многа зорак на небе — чакаюць добрага прыплоду жывёлы, мала зорак — дрэнны прыплод.

Стральцы вераць: калі пад Новы год застрэляць штонебудзь, то цэлы год будзе шчасце ў паляванні.

Пчаляры зашываюць у сваіх парваных шапках вярхі, каб вяліся пчолы.

Кожны стараецца ўкрасці што-небудзь у свайго суседа, хоць украдзенае на другі ж дзень аддаецца. Калі таго, хто ўкраў, ніхто не заўважыць, то ў гэты год гаспадарка яго не будзе мець турбот ад зладзеяў, г. зн. хоць бы злодзей і ўкраў у яго што-небудзь — будзе злоўлены; калі ж той, хто ўкраў пад Новы год, будзе заўважаны, то ў гаспадарцы яго на працягу года будуць здарацца кражы і ўкрадзенае бясследна прападзе.

**Новы год.** На Новы год мужчыны абуваюцца на печы з тым перакананнем, што будуць весціся свінні.

Вымятаюць раніцаю хату і выносяць смецце за сяло, каб на палях у пасевах не было пустазелля. Паляць старыя мётлы, каб цяліліся каровы і давалі многа малака. Не даюць жывёле есці да той пары, пакуль самі не сядуць вячэраць, каб не было на жывёлу паморку. У час вячэры ядуць хлеб, стараючыся не рабіць крошак: інакш не будуць весціся авечкі. Не пояць у гэты дзень авечак, каб летам не нападалі на іх мошкі.

**Пры палявых работах.** Ураджай хлеба для простага чалавека — галоўная ўмова яго дабрабыту. Таму не правядзе ён плугам першай баразны на ніве, не сажне першага снапа без вядомага абраду ці павер'я...

Першы дзень ён працуе ў полі не ўвесь, а ўзарэ адзін загон і вяртаецца дадому. Толькі што правядзе адну баразну, як спяшаецца забегчы да першага вала ці каня і, стукнуўшы рабочую жывёлу ў лоб, гаворыць: «Няхай дасць бог здароўе і сілу табе». Прасфора, булачка, хлеб і свечка ляжаць у гэты час на ніве, і, вярнуўшыся дадому, ён з'ядае са сваёй сям'ёй прасфору і булачку.

Сеяць выязджае таксама першы раз толькі для аднаго загона, і засяваюць звычайна тым жытам, якое выбіраюць з вянка пасля дажынак і асвячаюць у царкве на Прачыстую. Выязджаюць звычайна нашча ў пятніцу, лічачы гэты дзень шчаслівым. Першую жменю засеву пінчук кідае левай рукою. Вянок ён закопвае ў канцы загона разам з вараным яйкам, якое ён у суботу бярэ з зямлі і, вярнуўшыся дадому пасля работы, з'ядае са сваёй сям'ёю.

## НАТАТКІ ПА БЕЛАРУСКАЙ ЭТНАГРАФІІ

**Веснавыя песні** пачынаюць спяваць недзе ў сярэдзіне сакавіка і канчаюць на Тройцу, так званую Сёмуху. Спяваюць толькі жанчыны ў час працы. У Мазырскім павеце захаваўся яшчэ звычай «клікаць вясну». Дзяўчаты і жанчыны збіраюцца на вуліцы і дзе-небудзь пад плотам спяваюць песні, што і называецца «клікаць вясну». З'яўленне мужчыны прымушае іх адразу пераходзіць на іншае, менш прыкметнае месца, дзе зноў працягваюць спяваць. Жартаўнікі-хлопцы паспяваюць такім чынам перагнаць іх з канца ў канец вёскі не адзін раз. «Клічуць вясну» толькі да надыходу цёплых веснавых дзён.

**Велікодныя песні.** Хадзіць з велікоднымі песнямі прынята цяпер не ўсюды, звычаі мінулых часоў адыходзяць. У Мінскім павеце такое яшчэ практыкуецца, г. зн. ходзяць павалачобнаму, ад чаго і назва «валачобнікі». У Слуцкім павеце іх звычайна называюць кукольнікамі, але абедзве гэтыя назвы пашыраны і ў іншых кутках губерні. Валачобнікі спачатку спяваюць духоўныя песні, звычайна польскія канты, потым пачынаюць песні гаспадару, гаспадыні, дзеткам. Па словах сялян, папярэднія пакаленні вельмі шанавалі валачобнікаў, сям'я гадзінамі слухала іх песні і плаціла вялікія грошы, а цяпер калі дзе і спяваюць, дык толькі пад вокнамі, плацяць мала. Валачобнікамі бываюць мужчыны і жанчыны. Усё або частку свайго заробку яны аддавалі на царкву. Па ўспамінах, валачобнікамі раней маглі быць не ўсе, а толькі тыя ў прыходзе, хто найбольш клапаціўся аб узбагачэнні царквы. Занятак лічыўся ганаровым. Мяркуючы па ўсім, валачобнікі складалі вузкае кола, таварыства, брацтва; іх песні, самыя, відаць, цікавыя,— сакрэт для этнографаў. Старыя расказваюць пра гэтыя брацтвы з неахвотай, маладыя нічога не ведаюць. Адны хваляць іх за падтрымку цэркваў, другія гавораць, што грошы ішлі на гарэлку. Гэта пытанне вельмі цікавае і загадкавае.

**Св. Юрый.** У Мінскім павеце да дня св. Юр'я захоўваюць косці ад велікоднага стала. На Юр'я мужчыны з жанчынамі, хлопцы з дзяўчатамі ідуць на засеянае азімым хлебам поле з гарэлкаю і закускаю. На выбраным месцы закопваюць прынесеныя велікодныя косці і тут жа з песнямі пачынаюць піць гарэлку і закусваць. Гэта свята называецца Расою. Пасля выпіўкі забіраюць рэшткі, ідуць да карчмы і працягваюць гуляць да позняй ночы. Хлопцы і дзяўчаты танцуюць.

Ёсць павер'е, што хто на Юр'я выйдзе вельмі рана ў поле, той убачыць святога на белым кані, які едзе па полі. Калі ж хто на Юр'я выганіць рана жывёлу ў поле і паспее напасціць да ўзыходу сонца на маладым жыце, той усё лета не будзе скардзіцца, што не хапае малака.

Вясною ў маі або ў пачатку чэрвеня — час дакладна не адзначаецца — пад вечар, «як толькі пачне сутуняцца», збіраюцца жанчыны і дзяўчаты ў адну якую-небудзь хату. Збіраюцца толькі тыя жанчыны, якія «не дараслі гадоў ці перараслі», г. зн. падросткі-дзяўчаты і сталыя жанчыны. Кожная з іх нясе з сабою прасніцу, верацяно і касмык кудзелі. Сабраўшыся ў хату, яны адразу ўключаюцца ў працу, папярэдне перахрысціўшыся. Адны з іх, пераважна дзяўчаты, спяшаюцца прасці, другія стараюцца хутчэй снаваць. Аснову кладуць на своеасаблівыя драўляныя грабяні, і калі ўсё падрыхтавана, уносяць неразабраныя кросны. Усе спяшаюцца як найхутчэй іх наладзіць і ткаць. У гэты час спяваюць прызначаныя для гэтага моманту песні. Першым гучыць польскі духоўны кант: матыў сумны і нудны. Пачынаецца самая спешная праца. Усе стараюцца, каб да світанку выткаць палатно, па даўжыні роўнае шырыні вуліцы. Як толькі палатно выткана, усе разбягаюцца па хатах, каб паведаміць сваім родным (блізкім) і суседзям. Справа ў тым, што ведаюць аб гэтым палатне толькі ўдзельнікі і яшчэ, магчыма, некалькі чалавек; для большасці ж усё гэта невядома. Ад таямнічасці нібы залежала дзейснасць гэтага сродку.

Жанчыны і мужчыны, хто як паспеў, схопліваюцца і бягуць на вуліцу, гонячы перад сабою жывёлу. Некалькі старых жанчын у гэты час выносяць палатно на канец вёскі і рассцілаюць яго ўпоперак вуліцы. Уся жывёла вёскі павінна прайсці праз гэтае палатно. Жанчыны, якія разаслалі яго, увесь час назіраюць, каб ніводная жанчына не пераступіла праз яго, таму што гэта строга забаронена. Звычайна чакаюць, каб абавязкова ўся жывёла вёскі прайшла гэты пераход, па вераваннях сялян, вельмі карысны для здароўя жывёлы, і грэх было б перашкодзіць каму ці не паведаміць аб перагоне. Пераганяюць толькі рагатую жывёлу. Усю яе затым зганяюць у гурт, жанчыны акружаюць яе; прыносяць палатно і недапрадзеныя рэшткі кудзелі і ўсё гэта спальваюць. Увесь абрад трэба каб быў выкананы абавязкова да ўзыходу сонца.

**Купала.** Дзень гэты лічыцца свяшчэнным, поўным таямнічасці. Вера ў цвіценне папараці і сустрэчу са скарбам вельмі

моцная. Скарб трапляецца ў выглядзе якога-небудзь страшыдлы; трэба толькі не спалохацца і змагчы ўзяць яго. Ведзьмы і ўсялякія «нячыстыя духі» робяць свае справы ў гэту ноч. Ведзьмы на гэты дзень усяляюцца ў жаб, і таму ўсе стараюцца як найбольш забіваць гэтых істот у гэты дзень. Асаблівую шкоду наносяць ведзьмы малаку. Каб прадухіліць яго крадзеж або псаванне, утыкаюць у дзверы дамоў і вароты хлявоў крапіву, зялёныя бярозавыя галінкі і спецыяльную траву пад назвай «купала». Святкаванне Купалы каля агню вечарам адыходзіць, але гадоў дзесяць — пятнаццаць яно было паўсюдным, не выключаючы і гарадоў. Хлопцы і дзяўчаты запасаюцца гарэлкай і закускай і выходзяць на перакрыжаванне дарог. Тут раскладваюць вялікі агонь з асінавых дроў (асіна — дрэва нешчаслівае, на ім павесіўся Юда-здраднік). У кацялку ставяць на агонь варыцца цадзілку, праз якую працэджваюць малако. Уся кампанія садзіцца навокал вартаваць ведзьму, таму што яна абавязкова захоча ўкрасці цадзілку. Ведзьма прыходзіць або ў сваім выглядзе, або ў выглядзе жывёлы — сабакі, кошкі. Ведзьме, якая прыйшла красці цадзілку, адсякаюць пальцы на руках. Вядома некалькі выпадкаў знявечання ні ў чым не павінных жанчын. Вартаванне заканчваецца выпіўкай, закускай, скаканнем праз агонь. У Мазырскім павеце ў некаторых мясцовасцях агонь раскладваюць з лазы і вярбы, у яго кідаюць усялякае смецце, ірванае адзенне і інш.; раскладваюць агонь на беразе ракі.

На Купалу сонца «купаецца», а на Івана «сушыцца». Бачыць могуць толькі шчаслівыя людзі перад узыходам сонца.

**Зажынкі** і **дажынкі** пачынаюцца, паводле народных уяўленняў, у шчаслівыя дні: панядзелак, аўторак, чацвер і суботу. Зажынаючы жыта, сялянка першую жменю зжатых каласоў кладзе ўбок, асобна, і вечарам прыносіць дамоў. У ранейшыя часы разам з гэтым жытам прыносіўся яшчэ і вянок з каласоў і палявых кветак; цяпер гэты звычай знік. Гаспадар дома, памаліўшыся перад абразамі з запаленаю свечкаю, пасля вячэры ўрачыста кладзе прынесены пучок жыта за ікону. Шостага або пятнаццатага жніўня яго асвячаюць у царкве. Асвячонае жыта селянін потым змешвае з насенным зернем для будучага ўраджаю.

Дажынкі ў апошні час адыходзяць. Асобныя сяляне рэдка гуляюць дажынкі. Толькі гуртавыя, талочныя дажынкі спраўляюцца: плятуць з жыта і кветак вянок, нясуць з песнямі дамоў, адбываецца частаванне. У с. Мікольск Мінскага павета існуе наступны цікавы звычай (з паве-

дамлення П. П. Дземідовіча): на тым месцы, дзе заканчваецца жытняе жніво, жнейкі пакідаюць невялічкі нязжаты кавалачак, у сярэдзіне яго або побач кладуць крыжападобна чатыры камяні (з кулак), на іх два пучкі жыта крыж-накрыж, потым наверх кавалачак хлеба і дробку солі. (Паведаміў В. Ляхоўскі.)

Зажынкі і дажынкі спраўляюцца толькі пры жніве жыта.

**Гульня «Яшчар».** У Мінскім павеце «Яшчара» спраўляюць у Піліпаўку.

На лаўцы, пастаўленай пасярод хаты, садзіцца хлопец — Яшчар. Вакол яго становяцца дзяўчаты, узяўшыся за рукі. Яны пачынаюць кружыцца і прыпяваць:

Сядзі, сядзі,— гэй, наш, наш!
На залатым крэслі,— гэй, наш, наш!
Вазьмі сабе панну,— гэй, наш, наш!
Каторую любіш,— гэй, наш, наш!

Затым сам Яшчар (яго падтрымлівае ўвесь хор) адказвае:

Ой, люблю Каську,— гэй, наш, наш!
Што ў русай касіцы,— гэй, наш, наш!
У залатой прасціцы,— гэй, наш, наш!
У шаўковым паясочку,— гэй, наш, наш!
У руцвяным вяночку,— гэй, наш, наш!

Названая дзяўчына падыходзіць да хлопца і аддае яму што-небудзь са сваіх рэчаў. Хлопец саступае месца наступнаму, той ізноў робіць выбар і г. д., пакуль усе не выберуць сабе пару.

Пасля заканчэння выбару хлопец, які быў першым Яшчарам, садзіцца каля сцяны. Дзяўчаты становяцца ў рад каля супрацьлеглай сцяны і, узяўшыся за рукі, ідуць да Яшчара з песняй:

Ой, Яшчару, паночку,
Прашу аддаць вяночку
Краснай Марысьцы,
Што ў русай касіцы,
У залаценькай прасніцы,
У шаўковым паясочку,
Да ў руцвяным вяночку.
Да яна ночаньку не спала,
Да вяночак завівала,
Па край моры хадзіла,
Да красачкі збірала,
Да ў садочку саджала,
Прыгаршчмі палівала:
— Расціце, красачкі, тонкія высокі,

На лісцейка шырокі,
На карэння глыбокі.

Яшчар пасля заканчэння песні аддае тую рэч, што браў, яе ўладальніцы і саступае месца наступнаму і г. д., пакуль хлопцы не вернуць усе ўзятыя рэчы.

У Мазырскім і Рэчыцкім паветах гэта гульня амаль нічым не адрозніваецца.

**Танец «Падушачка».** Дзяўчаты становяцца ў круг, адна ўваходзіць у яго і спявае:

Падушачка, падушачка, мая пухавая!
Малодачка, малодачка, мая маладая!
Каго люблю, каго люблю, таго й пацалую,
Падушачку пухавую таму й падарую!
Быў-жыў, да няма, да паехаў да лігіна,
Бедна мая галованька — адна спаці легла!
Быў-жыў, да няма, да паехаў на рэчку,
Каб ведала, што ўтапіўся, паставіла б свечку.
Ой, жаль жа мне, што не вернецца,
Падушачка пухавая перавернецца!

Астатнія падцягваюць (падпяваюць) і плаўна танцуюць кругавую, то раскалыхваючыся верхняю часткаю тулава, то прытупваючы на месцы. Пасля заканчэння песні дзяўчына, якая спявала, бярэ адну з дзяўчат, астатнія разбіраюцца таксама парамі і пачынаюць танцаваць «Круцёлку». Потым дзяўчына, што танцавала з запявалаю, уваходзіць у кола — і зноў паўтараецца тая ж гульня.

Гульня вядома па ўсёй Беларусі. Народная музыка захоўвае спецыяльныя матывы для гэтай гульні, якія таксама называюцца «Падушачкаю». Рухі танцуючых спачатку мерныя і плаўныя, але, пераходзячы на «Круцёлку», танец становіцца бурным. Наогул увесь танец у пэўным сэнсе мае характар оргіястычны і, відаць, блізкі да гульні «Падушачка» на Дану.

**«Калодачка».** Пасярод хаты ставяць калодку або засланку (дошку, якою засланяюць печ). На яе садзіцца дзяўчына, астатнія стаяць вакол яе і спяваюць:

На гары мак, мак,
А ў падолі так, так!
Бедная мая галовачка,
Залатая макавачка!
Ці паспеў мак?

Дзяўчына, што сядзіць на дошцы-калодачцы, калі праспяваюць песню першы раз, гаворыць «пасеяла!», другі раз

праспяваюць — гаворыць «узышоў!», трэці раз — «цвіце!», чацвёрты раз — «паспеў!». Як скажа «паспеў!» — усе кідаюцца да яе і пачынаюць шчыпаць.

**Вячоркі, гульні, погляды на цнатлівасць дзяўчат.** Умовы сялянскага жыцця не вельмі перашкаджаюць знаёмству і сустрэчам хлопцаў і дзяўчат. Перш за ўсё яны сустракаюцца на вясковых святах, пры выкананні купальскіх, троіцкіх і іншых абрадаў, у час летніх карагодаў, гульняў; зімою — на вячорках.

У вялікія святы, калі збіраецца ўся моладзь з наваколля або ўсёй вёскі, арганізоўваюць танцы, карагоды з песнямі. Карагодных летніх песень вельмі шмат, і змест іх разнастайны.

Зімовыя зборы моладзі некалькі адрозніваюцца. Яны перш за ўсё падзяляюцца на ігрышчы і вячоркі; апошнія адпавядаюць велікарускім «посиделкам» і маларускім «вечарніцам».

Ігрышчы — гэта вялікія зборы моладзі, якія бываюць звычайна ў вялікія святы, на Каляды, Масленіцу і інш. На ігрышча запрашаюць музыку са скрыпкай або гармонікам, а часам і яшчэ аднаго з бубнам. Грошы на музыку, як і на ўсе іншыя расходы, даюць (збіраюць) хлопцы. Месцам для збору служыць хата якога-небудзь гаспадара або (у апошні час найчасцей) карчма. У вёсках, куды яшчэ не пранікла «цывілізацыя», танцуюць «Лявоніху», «Бычка», «Падушачку» і інш., а ў прыгарадных сёлах сустрэнеце і «Кандрэля», і «Вальца». Хлопцы частуюць паміж танцамі дзяўчат мядком, цукеркамі, а па закуцці (у кутках) і шчыпкамі. Сюды ж збіраюцца і старэйшыя: паглядзець, пабалакаць. У вугле дзеці і падлеткі пераймаюць дарослых: танцуюць, частуюць адзін аднаго і інш.

Зусім іншы характар маюць вячоркі. У пачатку зімы, дакладней восенню, дзяўчаты дамаўляюцца з якім-небудзь гаспадаром аб дазволе ім збірацца ў яго. Выбіраюць хату чым большую, а гаспадара як найпамяркоўнейшага, каб не перашкаджаў моладзі. Платы за хату ні гаспадар, ні гаспадыня не бяруць, але за гэта пры ўсякім выпадку моладзь частуе іх. Часам, калі не знаходзяць пастаяннай хаты, пераходзяць кожны вечар ад гаспадара да гаспадара.

Вёсачкі ў Беларусі невялікія, і таму для гульні заўсёды хапае адной хаты. Калі цесна або не паладзяць, падзяляюцца на «куткі» і атрымліваецца некалькі як бы клубаў.

Вечар пачынаецца вельмі паважна. Дзяўчаты прыходзяць з кужалем і прадуць, паціху спяваючы. Часам бабуля расказвае ім казкі. Але вось гуртам увальваюцца хлопцы. Пачы-

наюцца жарты, размовы і да т. п. Хлопцы падсаджваюцца да дзяўчат, не абыходзіцца без абдымкаў, пацалункаў, шчыпкоў. Наогул вядомая вольнасць у адносінах на вячорках не толькі дазваляецца, але нават патрабуецца звычаем, і дзяўчыну могуць выключыць з вячорак, калі праз меру сур'ёзна супрацiўляецца звычайным жартам. Зрэшты, не трэба думаць, што жарты гэтыя і вольнасць заходзяць вельмі далёка або становяцца не зусім прыстойнымі. Адзін з мясцовых назіральнікаў — Ермаковіч — паведаміў з Мінскага павета факты, якія, зрэшты, нам даводзілася назіраць і ў Рэчыцкім, і Мазырскім паветах. На вячорках не існуе розніцы паміж багатым і бедным хлопцам, прыгожым і брыдкім. Усе аднолькава роўныя. Самы бедны і самы непрыгожы можа падсесці каля прыгожай і багатай дзяўчыны, жартаваць з ёю незалежна ад таго, падабаецца ён ці не. На вячорках падсаджваюцца да дзяўчат і жартуюць з імі не толькі хлопцы, з якімі яны «кахаюцца», але хто каму трапляецца. Дзяўчына не павінна зневажаць хлопца аплявухай, грубым словам і інш., яна не можа таксама забараніць хлопцу сесці каля яе.

Кепскіх вынікаў на вячорках на бывае. Сяляне глядзяць на наведванне іх дзецьмі вячорак як на абрад, устаноўлены дзядамі і таму неабходны. Седзячы вечарам у сялянскай хаце, можна заўважыць, як адразу пасля вячэры і нават да вячэры маці дасць дачцэ ў рукі кудзелю, кавалак хлеба і сала і адправіць на вячоркі. Хаджэнне дзяўчыны на вячоркі лічыцца адным са звычаёвых патрабаванняў, такім строгім, што парушыць яго асмельваюцца толькі ў прыгарадных вёсках. Маці будзе моцна засмучана, калі яе дачка не захоча наведваць вячорак.

Нашы вячоркі, як велікарускія «посиделки», бяседы, маларускія «вечарніцы», у сваім абрадавым значэнні ёсць водгалас і перажыванні гэтага першабытнага гетэрызму. Пасля таго, што сказала навука па гэтым пытанні, наўрад ці можа быць сумненне ў этналагічным значэнні і беларускіх вячорак.

У практычным паўсядзённым жыцці вячоркі маюць не менш важнае значэнне. Блізкія адносіны маладых людзей абодвух полаў перашкаджалі развіццю погляду на жанчыну як на істоту ніжэйшую, падпарадкаваную мужчыне. На вячорках і ігрышчах яны не толькі роўныя, але дзяўчатам аддаецца перавага ва ўсіх адносінах. Хлопец адносіцца да дзяўчыны як да роўні; пасля жаніцьбы ён захоўвае гэтыя

адносіны і да сваёй жонкі. На самай справе жанчына ў беларускай сям'і і займае вельмі высокае становішча.

Але няправільна было б лічыць, што збліжэнне маладых людзей абодвух полаў заўсёды вядзе да іх шлюбу. У апошні час, вядома, парадкі змяняюцца: хлопец патрабуе, каб бацькі слалі сватоў да той дзяўчыны, з якою ён «кахаецца». У малой сям'і, дзе кожны работнік вельмі дарагі, дзе пачуцці бацькоў да дзяцей маюць большую прастору ў сваім развіцці, маладыя людзі дасягаюць сваёй мэты. Але ў вялікіх сем'ях, дзе агульны парадак вышэй пачуццяў, дзе падпарадкаванне асобнага сем'яніна гаспадару мацней,— там яшчэ і цяпер хлопца жэняць, а дзяўчыну аддаюць замуж, мала звяртаючы ўвагі на іх жаданні. Абрадавае значэнне вячорак дзейнічае і ў гэтым выпадку: у больш глухіх сёлах, дзе захавалася яшчэ многа вялікіх сямей, сямейных абшчын, вячоркі, як і ўсе абрады, строга выконваюцца. Але менавіта ж тут шлюб поўнасцю залежыць ад старэйшых членаў сям'і. І наадварот, у прыгарадных вёсках, дзе ўзніклі ўжо новыя ўмовы жыцця, дзе вячоркі страцілі абрадавае значэнне, тут вось шлюб адбываецца па жаданні маладых людзей.

## КАЛЯДЫ І КУПАЛА НА БЕЛАРУСІ

Са свят, якія захаваліся на Беларусі са старадаўніх часоў, найбольш поўна абрадавы бок іх заўважаецца ў святкаванні Каляд і Купалы.

Каляды — зімовае свята. Яно працягваецца два тыдні. З нецярплівасцю беларус чакае гэтых святкаў; ужо пачынаючы з Піліпаўскага посту дзяўчаты спяваюць:

Ай, Калядачкі, вы барджэй, барджэй,
Вы нясіце нам у бліны дражджэй:
Нам Піліпаўка надакучыла,
Нам жамеры зубы праелі...

Да свята пачынаюць рыхтавацца за два дні ўперад, колюць свіней, чыняць каўбасы, на калядную куццю таўкуць у ступе пшаніцу на кашу, якая абавязкова падаецца ў гэты дзень на вячэру. За Каляды спраўляюць тры куцці: першую — посную перад Калядамі, другую — скаромную, або багатую, перад Новым годам і трэцюю — посную перад Вадохрышчам. Самая любая з іх для беларусаў — багатая куцця:

Прыехала каляда звечара,
Прывезла каўбас рэшата.
Каўбасы паставіла на staўпе,
Сама ж села на куце
У беленькім кажушку,
У чырвоненькім грабушку.

Беленькі кажушок... Словы «ў чырвоненькім грабушку» падкрэсліваюць, як старанна вараць гэту кашу: яна трэба каб была чырвоненькая, г. зн. крыху прысохла зверху, і гэта верхняя корка каб нагадвала сабою курыны грэбень. Як таўкуць першую куццю, некалькі пшанічных ці ячменных зярнят сыплюць пад абруч курам, каб не бадзяліся, знаходзіліся заўсёды дзе-небудзь паблізу, каля двара, і неслі яйкі ў адным месцы. У некаторых жа вёсках для гэтай мэты ўжо ў дзень Каляд робяць на падлозе вяроўкай круг і сыплюць туды крыху куцці. У гэтыя тры дні, на куццю, трэба пячы і бліны. На Каляды нельга рабіць ніякай работы, асабліва віць вяроўкі, круціць віткі на агароджу, пераплятаць дубцамі колле ў плоце і г. д. За парушэнне гэтага свяшчэннага звычаю, па глыбокім перакананні беларусаў, віноўнага чакае непазбежная кара: у бліжэйшым прыплодзе жывёлы абавязкова знойдзецца якая-небудзь загана. У маладняку або ногі будуць сапсаваны, быццам хто з іх вяроўкі віў, або з дзвюма галовамі ці яшчэ з якім недахопам — будуць калекі, «крывыя». Часам падобнае няшчасце быццам бы распаўсюджвалася і на нованароджаных дзяцей.

Строга выконваюць беларусы наказ сваіх дзядоў, ніхто не адважыцца нават вузел завязаць на вяроўцы. А калі здарыцца, што хто-небудзь па сваёй няўважлівасці парушыць гэты звычай, дык павінен увечары ў перадапошні дзень Каляд, на трэцюю посную куццю, пры захадзе сонца рассячы два дубцы ў плоце і кінуць іх на «заход сонца», каб прадухіліць небяспеку.

Таму жанчыны на Каляды не прадуць і не ткуць. Для прадухілення ўсялякага гора, якое можа прыстаць да іх, калі яны незнарок парушаць гэты звычай, бяруць на калядную куццю з лазні венік, якім парыліся, мятуць ім на Каляды хату, а ў апошні дзень сякуць яго на кавалкі і пруцікі ўтыкаюць перад хатаю ў снег, ствараючы на снезе круг.

У гэтай абраднасці ярка прасвечвае старажытнаславянскі культ служэння сонцу — гэтаму творцу прыроды, якое зноў вяртаецца да людзей і нясе ім свае дары. Яны будуць павялічвацца разам з павелічэннем самога сонца, таму на снезе так выразна і падкрэсліваецца яго форма — круг.

У гэтыя дні, прысвечаныя вялікаму боству — сонцу, можна ўлагодзіць і меншых бажкоў. Гэтак на Каляды карысна прынесці ахвяру хлеўніку, духу, які жыве ў хляве. Для гэтага раніцаю на першы дзень трэба забіць сароку, а гэта не так проста, бо хітрая птушка кудысьці хаваецца гэтым ранкам. Забітую птушку вешаюць нагамі ўверх у хляве, дзе стаяць коні, каля дзвярнога вушака. Гэта ахвяра ўлагоджвае хлеўніка, які, калі гаспадар яго ўзлуе, катаецца на яго конях, адчаго яны да раніцы ледзь дацягваюць. Але калі павесіць сароку, хлеўнік будзе на ёй зганяць сваё зло.

Старадаўняя славянская рэлігія пакінула нам у спадчыну і такога асобнага самастойнага бажка, як мароз. Аб гэтым сведчыць звычай беларусаў задобрыць і яго. На трэцюю куццю, увечары, калі ўся сям'я вячэрае, гаспадар глядзіць у акно і кліча яго з вуліцы да сябе ў госці:

— Мароз, мароз, хадзі куццю есці, а ўлетку па грачысе не валачыся — будзем жалезнаю пугаю біць.

У іншых месцах дадаюць:

— Не хадзі ні па бабах, ні па гурках, ні па гарохах, мяжой абайдзіся, расой абалліся.

У гэтым закліканні заслугоўваюць увагі словы: «Будзем жалезнаю пугаю біць». У нас ёсць магчымасць меркаваць, што славяне, просячы аб чым-небудзь свайго бога, для большага поспеху карысталіся часам і пагрозамі.

Дзяўчаты на Каляды варожаць толькі на першую калядную куццю. Спосаб варажбы нескладаны. Бяруць пасля вячэры сена з-пад абруса, якім быў засланы стол, на сена кладуць блін, на блін лыжку кашы і выходзяць з гэтым за вароты: дзе брэшуць сабакі, там і суджаны.

На трэцюю куццю, г. зн. напярэдадні апошняга дня, адбываецца «запісванне Каляд». Гаспадар бярэ ў рукі першы спечаны ў гэты дзень блін і «піша» крэйдаю крыжы на гаршку з куццёю, на варотах, на вушаках дзвярэй. Гэты звычай, несумненна, прадукт пазнейшага часу; гаспадар малюе крыжы і гэтым спадзяецца засцерагчы сябе ад злой сілы, якую нядаўна ўміласціўляў.

З Калядамі звязаны і некаторыя прыкметы. Снег на Вадохрышча — добра будуць пчолы раіцца і бульбы будзе шмат. На Каляды дарога чорная — грэчка ўродзіць. Калі на першую куццю неба чыстае і на ім шмат зорак — пасля першага вясенняга дажджу будзе шмат грыбоў.

Агаркі лучыны, выбраныя са «светача» за Каляды, хаваюць да лета на свята Купалы. Але, як і Каляды, забываецца

і Купала. Звычаі, звязаныя з гэтым аднадзённым святам, цяпер хутка знікаюць: слабы прамень культуры, які прабіўся ў глухую беларускую вёску, нанёс ім рашучы ўдар. Цяпер ужо не адбываюцца тыя «дзівы дзіўныя», якія здзіўлялі дзядоў. Сярод беларусаў ходзіць павер'е, што на ўсю тую нечысць, якая раней глумілася над безабаронным чалавекам, цяпер накладзена закляцце. Гэтая ж думка чытаецца і ў адзначаным вышэй «запісванні Каляд». Пра сутнасць свята Купалы можна меркаваць толькі па сякіх-такіх абрадах ды па купальскіх песнях, што нагадваюць сваім зместам пра былыя часы.

Свята Купалы супадае з днём адзначэння ў цэрквах нараджэння св. Іаана Прадцечы (24 чэрвеня па ст. ст.), таму і ў песнях гэтак часта паўтараецца прыпеў: «Купала на Івана».

Што гэта за боства Купала, сказаць цяжка. У песнях, запісаных мною ў Магілёўскай губерні, пра яго гаворыцца зусім нямнога:

Ехала Купала да сялом, сялом,
Накрыўшы вочы белым шатром.

Або другі варыянт:

А ішло Купала сялом, сялом,
Накрывала вочы серым шатром.

Па характары гэта свята кахання і цудаў:

— Дзе ж ты, Купала, начавала?
— Пад асінкаю з Аксінкаю!

Ноччу перад святам вясковая моладзь збіраецца за ваколіцу. Каб ахаваць сябе ад нападзення «нячыстай сілы», яна раскладвае агонь, на які з вёскі нясуць усялякую непатрэбшчыну: старыя зношаныя кажухі, світкі, стаптаныя лапці, дзіравыя ад даўнасці магеркі (суконныя шапкі), словам, усю «старызну», якую і кідаюць на вялікі агонь. На высокі шост падымаюць старое кола і запальваюць яго. Прамочанае дзёгцем, яно гарыць паволі, свеціць далёка наўкола і гэтым надае бадзёрасці вясёлай моладзі. А яна, вясёлая і святочная, бегае вакол агню, размяркоўваецца на пары і спявае вясёлыя па змесце, аднак па матыву звычайна сумныя купальскія песні. Вось для прыкладу адна:

Ехала Купала да сялом, сялом,
Накрыўшы вочы белым шатром.

Выйдзіце, жонкі, да дзівіцеся,
Што едзець стары да жаніціся.
Сам едзе на качарзе,
А жонку вязе на памяле.
Выйдзіце, дзеўкі, да дзівіцеся:
Малады едзе жаніціся.
Сам едзе на коніку,
А жонку вязе на возіку.
Сам едзе — як жар гарыць,
А жонку вязе — як мак цвіціць.

У гэту кароткую чэрвеньскую ноч на свеце адбываецца шмат цудаў.

Ні адзін селянін не павядзе коней на начлег: там штосьці незразумелае, страшнае палохае коней і людзей. Русалкі ганяюцца за людзьмі, з цяжкасцю пералазячы ў полі праз межы, усё роўна як людзі праз агароджу. Таму і ўцякаць ад іх трэба не ўздоўж межаў, а папярок іх. Хітрыя, яны, седзячы на голлях бяроз, запрашаюць даверлівых людзей, пераклікаючыся паміж сабою мілагучнымі галасамі: «Кацярына, Марына, хадзі гутатацца!»

Калі ўзяць з сабою лучыну — выгаркі, што захаваліся ад Каляд, стаць на старым ільнішчы (на полі, дзе ў мінулым годзе быў лён, а зараз папар), абвесці лучынаю круг і абкласціся ёю, то ўбачыш, як скарбы выходзяць гэтай ноччу з зямлі і сушацца, «ператрасаюцца» пры святле купальскіх агнёў, якія, як вартавыя, гараць над імі. Калі гэтае льнішча на лядзе і на ім расце папараць, то можна ўбачыць, як яна зацвітае гэтай ноччу. Але мала ёсць ахвотнікаў паглядзець на гэты цуд, многія ўжо не вераць...

Гэтай ноччу адбываюцца цуды і з жывёламі. Аб адным з іх расказвае купальская песня:

Івана на Купала!
Дзіўныя людзі вы (назва вёскі),
Вы не відзелі дзіўнага дзіва,
Як заячка кросны ткала,
А рак-небарак цэўкі сукаў...
Івана на Купала!

Для кароў яшчэ днём, напярэдадні свята, трэба сабраць траву браткі, спяваючы песню:

Купала на Івана!
У цёмным лесе гоман-гоман:
Брат сястру за руку водзіць,
Ён яе загубіць хоча.
А яна ў яго прасілася:

— Іванечка, братулечка, не бі ж мяне,
Не губі ж мяне, не губі ў цёмным лесе,
Загубі пры дарозе, загубі мяне на дарозе,
Закапай проціў цэркаўкі!
Івана на Купала!
Абсей мяне красачкамі, васілёчкамі!
Будуць дзеўкі к цэркві ісці,
Будуць краскі шчыпаць...
Івана на Купала!
Краскі шчыпаць і мяне памінаць!
А гэта ўсё — трава «брат-сястра»!
Купала на Івана.

Вечарам сабраную траву трэба даць каровам. Дзверы ў хляве на гэту ноч трэба шчыльна зачыніць, «стрэшнай свечкай» на дзвярах напісаць крыж, на канцах яго пакапаць воскам і павесіць на дзверы «дзядоўнік», а свечку пакідаць не трэба: ноччу ў постаці змяі прыйдзе сюды ведзьма забіраць малако ад кароў, але запячатаныя дзверы не пусцяць яе; са злосці яна будзе грызці траву, будзе грызці і свечку, а гэта вялікі грэх. Іншыя замест «стрэшнай свечкі» абсыпаюць хлеў вакол макам, асвячоным пасля велікоднай заутрані разам з кулічом, пад які яго хаваюць, каб не бачылі лішнія вочы, і тады ведзьма можа дабрацца да кароў толькі пасля таго, як пералічыць усе рассыпаныя макавыя зярняты — да раніцы ёй гэтага не зрабіць.

Калі ж пачынаецца дзень, а ведзьма яшчэ не напілася малака, тады сумная, ужо ў сваёй уласнай іпастасі ідзе яна на поле, у жыта, і там цадзілкаю будзе збіраць сабе расу з каласоў да ўсходу сонца, а яно, узыходзячы, будзе «іграць» на небе.

Шмат іншага дзівоснага робіцца на свеце ў гэту летнюю ноч, але маладое пакаленне падрабязна не можа расказаць пра ўсё. Дзяды, якія ўсё гэта бачылі на свае вочы, даўно ўжо памерлі. Скора памруць і гэтыя апошнія сведкі старадаўняй мінуўшчыны.

## ПАВЕР'І, АБРАДЫ І ЗВЫЧАІ

*Відзы.* На ўсе тры куцці (першая напярэдадні Каляд, другая напярэдадні Новага года, трэцяя напярэдадні Вадохрышча) да вячэры нельга не толькі нічога есці, але і каштаваць тое, што гатуецца на вячэру, таму што пры парушэнні гэтага звычаю палявыя пасевы будуць знішчаны птушкамі і жывёлай.

Калі жыта красуе, днём нельга бяліць палотны, бо гэта накліча вецер, які прынясе шкоду красаванню жыта, можна, аднак, бяліць палатно ў гэту пару раніцаю і вечарам. На Спаса (6 жніўня) раніцаю да ўсходу сонца кожная гаспадыня ідзе на агарод і далонямі пяшчотна сціскае кожны качан капусты — гэта робіцца для таго, каб галоўкі былі вялікія і тугія.

*Смолвы.* Пры закладзінах дома кожны гаспадар-беларус выдзёўбвае на канцах бярвенняў, якія кладуцца ў аснову, невялікія ямачкі і кладзе туды крыху хлеба, солі і грошай. Гэтыя тры прадметы лічацца ў дадзеным выпадку зарукай дабрабыту гаспадара і кладуцца для таго, каб жыццё жыхароў дома было ў поўным дастатку.

Калі наступае вясна, а з ёю і палявыя работы, то гаспадар або яго работнік, адпраўляючыся першы раз у поле, павінен узяць з сабою ў кашолку або торбу хлеба, мяса і солі. Пасля першага ворыва беларус вяртаецца ў сваю хату, становіцца пасярод яе, а ў гэты час хто-небудзь са сваіх дамашніх павінен абліць яго вадою з галавы да ног. Гэта робіцца для таго, каб зямля заўсёды была сырая і давала багаты ўраджай.

На першую калядную куццю варожаць — больш за ўсё маладыя хлопцы і дзяўчаты. Іх цікавіць наступнае. Седзячы за сталом у час вячэры, маладыя дзяўчаты заплюшчваюць вочы і выцягваюць з-пад настольніка як найдаўжэйшую сцяблінку сена (перад тым, як засцілаць настольнік, на стол кладуць сена). Калі дзяўчына выцягвае доўгую сцяблiну, то ў будучым годзе будзе добры ўраджай ільну; калі ж варожыць хлопец, то ў яго будзе добры ўраджай збажыны.

Дзяўчаты ў калядную ноч (на багатую куццю) ходзяць па вуліцы і пытаюць у незнаёмых мужчын, як іх імя, робячы з гэтага вывад, якое імя будзе ў яе суджанага. Хлопцы ў сваю чаргу пытаюць імёны ў сустрэтых імі на вуліцы жанчын.

Бярэцца адразу бярэмя дроў, прыносіцца ў хату і робіцца падлік: хто прынёс цотны лік пален — той у наступным годзе ажэніцца або выйдзе замуж, а хто няцотны — таму не суджана ні ажаніцца, ні выйсці замуж; акрамя таго, пра жаніцьбу загадваюць, кідаючы за вароты чаравікі, а таксама па гаўканні сабак: угадваюць, у які бок трэба будзе ісці замуж і як далёка.

Пісьменныя вырэзваюць са скуры вялікую колькасць друкаваных літар і кладуць пад падушку. Раніцаю па літарах, якія прыліплі да падушкі, адгадваюць словы і па іх мяркуюць пра будучыню.

Акрамя варажбы існуе такі звычай. На трэцюю калядную куццю старшы селянін бярэ вараны гарох і ў суправаджэнні каго-небудзь са сваіх абыходзіць усе будынкі. Пры гэтым захоўваецца пэўны парадак і чарговасць. Увайшоўшы ў гумно, у хлеў або ў іншы будынак, старшы становіцца каля дзвярэй тварам да таго, хто суправаджаў яго і стаіць у памяшканні каля сцяны насупраць дзвярэй. Старшы бярэ з рэшата жменю варанага гароху і, кідаючы ў таварыша, пытае:

— Ці поўна?

Той адказвае:

— Поўна.

Пытанне і адказ паўтараюцца тройчы. Пасля трэцяга разу старшы гаворыць:

— Дай, божа, каб усюды было поўна.

Калі пабываюць ва ўсіх халодных будынках, вяртаюцца ў хату, дзе іх чакаюць члены сям'і з прыпаднятымі падаламі кашулі або каптана. Старшы, уваходзячы паважна ў хату і кідаючы гарохам, задае тое ж пытанне:

— Ці поўна?

Яму ўсе хорам адказваюць:

— Поўна.

Потым гарох аддаецца гаспадыні, а ўсе прысутныя лічаць, каму колькі трапіла ў прыпол гароху, і па гэтым вызначаюць, колькі ў каго ў будучым годзе прыбудзе авечак і іншай жывёлы.

**Талака.** У канцы мая або ў пачатку чэрвеня сяляне вывозяць на поле гной, прычым для гэтага выбіраецца дзень пераважна перадсвяточны. У вызначаны дзень гаспадар запрашае да сябе на дапамогу сваіх суседзяў і сваякоў. Апошнія дапамагаюць звычайна бясплатна; суседзям жа сваім гаспадар плоціць натураю, дапамагаючы ім у час палявых работ. Вывазка гною сваякамі і аднавяскоўцамі, якія сабраліся да гаспадара, і называецца ў беларусаў талакою. Амаль кожны больш або менш заможны беларус збірае пры патрэбе талаку. На талаку прыязджаюць галоўным чынам хлопцы, якіх завуць капачамі; задача іх заключаецца ў тым, каб накладваць на вазы гной; потым дзяўчаты, якіх завуць трасенніцамі, якія раскідваюць па полі вывезены гной, і, нарэшце, падлеткі (9—14 год), якіх завуць лаштаямі, якія адвозяць гной на поле і прыганяюць зноў пустыя вазы. Кожны з тых, хто прыехаў на талаку, стараецца запрэгчы коней у такі воз, на які можна было б палажыць менш гною. Прыбываючы на талаку з узыходам сонца, капачы і лаштаі адразу ж бяруцца за работу;

трасенніцы дапамагаюць гаспадыні падрыхтаваць снеданне і абед. Гадзін каля дзесяці раніцы ўсе садзяцца снедаць. Для гэтага ставяць два сталы — адзін у галоўным куце, другі бліжэй да дзвярэй і далей ад ганаровага месца. За першым сталом садзяцца капачы разам з гаспадаром і пры гэтым у пэўным парадку: галоўныя месцы належаць сваякам гаспадара і больш заможным суседзям-аднавяскоўцам. За другі стол садзяцца трасенніцы і лаштаі. На снеданне падаюць хлеб, сыр, масла, бліны і гарэлку; апошняя — самая важная: не дай гаспадар гарэлкі, работа ў яго пойдзе вяла і без поспеху, а талачане нават пры самым шчодрым частаванні будуць незадаволеныя і гаспадаром і талакою. Таму некалькі бутэлек гарэлкі з'яўляюцца найлепшым частаваннем; у папярэднія гады, калі жылося лепей і гарэлка была танней, яе куплялі вёдрамі. Цяпер аб гэтым астаўся толькі адзін успамін. На снеданне капачам падае гарэлку гаспадар, а трасенніцам і лаштаям — гаспадыня; выпіваюць пры гэтым першую чарку самі, а потым па чарзе ўсе прысутныя — не больш дзвюх чарак кожны. Пасля снедання ўсе адпраўляюцца на работу, у тым ліку і трасенніцы. Работа працягваецца да двух-трох гадзін дня. Да гэтага часу падрыхтоўваецца абед, на які акрамя сыру і масла падаюць крупнік і яечную кашу (абавязкова з маслам). Гарэлкі даюць па тры-чатыры чаркі ў такім жа парадку, як і на снеданні. Пасля абеду адбываюцца так званыя «аблівіны» — самая важная і неабходная частка талакі. Амаль усе ўдзельнікі талакі запасаюцца вадою, набіраюць яе ў вядро, цэбар, гаршчок; пры гэтым трасенніцы стараюцца пабольш выліць вады на капачоў, а апошнія — на трасенніц. Лаштаі раздзяляюцца на групы, і адны падтрымліваюць капачоў, а іншыя — трасенніц. Калі паблізу знаходзіцца сажалка, рака або возера, то капачы стараюцца выкупаць у вадзе першую схопленую трасенніцу; трасенніцы стараюцца адплаціць тым жа. Часцей за ўсё трасенніцы стараюцца выклікаць да сябе на поле капача. Калі ён прыедзе, яго акружаюць усе трасенніцы, укачваюць у гной і вядуць у лужыну або ў сажалку і штурхаюць у ваду. Пасля заканчэння работы вечарам трасенніцы з песнямі вяртаюцца ў дом гаспадара, які сабраў талаку. Капачы да гэтага часу запасаюцца вадою, узлазяць на стрэхі, аркі варот, хаваюцца за варотамі, слупамі і ў іншых месцах, каля якіх павінны ісці з поля трасенніцы. Апошнія, часам зусім не ведаючы аб гэтым, накіроўваюцца ў дом гаспадара, дзе збіраецца талака, і раптам з усіх бакоў на іх ліецца вада. Спачатку яны разбягаюцца, а потым ізноў збіраюцца, каб адплаціць капачам. Чым

больш запрошаных на талаку будуць абліты вадою, тым лепш для гаспадара: больш будзе дажджоў, і таму лепшы будзе ўраджай.

У прамежку між абедам і вячэраю талачанам даюць яшчэ закуску — хлеб, яечню і гарэлку. Коней у гэты час не адпрагаюць; капачам закуску абавязкова прыносяць у хлеў, а трасенніцам на поле. Капачы ў хляве садзяцца звычайна на саломе, а трасенніцы — на полі на драўляным голлі, якое для гэтага падрыхтоўваецца імі. Гадзін каля дзесяці вечара ўсе садзяцца вячэраць. Меню вячэры складаецца з тых страў, што падаваліся на абед, і яшчэ з пшанічных і яечных «клёчак». Вячэра праходзіць заўсёды больш ажыўлена, чым абед, гарэлкі прапануецца больш. Пасля вячэры талака лічыцца скончанай.

**Купалле.** Напярэдадні дня Іаана Хрысціцеля (23 чэрвеня) вечарам прынята збіраць «купаллю», г. зн. кветкі і травы. У кожнай вёсцы збіраецца гурт дзяўчат, якія ідуць на засеянае жытам поле. Тут, спяваючы спецыяльныя «купалавы» песні, збіраюць яны разнастайныя кветкі і травы, звязваюць іх у пучкі або сплятаюць вянкі. Затым 24 чэрвеня нясуць у касцёл, дзе ўсё сабранае ў полі асвячаецца. Гэтыя асвячоныя кветкі і трава захоўваюцца на працягу ўсяго года ў кожным доме, таму што яны лічацца цудадзейнымі. Пры ўсялякім горы селянін карыстаецца гэтымі асвячонымі прадметамі. Калі здарыцца ў доме хвароба, гаспадыня абкурвае гэтымі кветкамі і хворага чалавека, і жывёлу; калі здарыцца ў вёсцы пажар, то разам з абразом абносяць вакол палаючага будынка траву і кветкі, адзначаючы мяжу для пажару. Гэтымі ж кветкамі і травамі абкурваюць кожны раз дом, калі заўважаюць вялікую хмару на небасхіле або чуюць навальніцу. Вясною ніводзін селянін не выганіць першы раз жывёлу ў поле без таго, каб не абкурыць яе «купальнымі» кветкамі і травою. З кветак, што сабіраюць 23 чэрвеня, асаблівы сэнс мае багатка. Напярэдадні 24 чэрвеня вечарам кожны з членаў сям'і ставіць на ноч над сваёй пасцеллю сцябло багаткі. Калі за ноч кветка распусціцца больш, гэта лічыцца добрай прыкметай для таго, над чыёй пасцеллю была пастаўлена кветка: ён будзе ўвесь год здаровы і будзе даўгалетні.

## БЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ КАЛЯНДАР

(Святы, прысвяткі, абрады, гульні)

### Студзень

1/19*. Новы год. Працяг Піліпаўкі (да 5.01).
3/21. Пракоп («Пракоп па снезе ступае, дарогу капае»).
5/23. Посная, або галодная, куцця, запіс Каляд (н. ст.)**.
6/24. Першая, або посная, бедная, куцця. Пачатак Каляд. Тры каралі, Вадохрышча (н. ст.). «На Вадохрышча дзень цёплы — будзе хлеб цёмны».
7/25. Пачатак каляднага Мясаеда — да 25.02 («Нам Піліпаўка надакучыла, дзеўкам жываты перамучыла. Мальцам жамеры зубы праелі. А калядныя ж бліны ладныя»). Раство («Святое Раство — людзям прыгаство»).
8/26. Маладзёны, або Бáбіны,— калядны дзень гасцявання ў бабуль. Зімні Пакроўчык. Насілі «звязду», «жанілі Цярэшку».
9/27. Сцяпан — дзень найма парабкаў, слуг («На святога Сцяпана вышэй слуга за пана»).
13/31. Шчодрая, або багатая, куцця, куцця св. Козліка. Пачатак Шчодрага тыдня. Куготы — рытуальныя абрады ля калодзежа на Палессі.
14/1. Новы год па ст. ст., або Васілле («Святое Васілле дзяжу мясіла»). Св. Козлік. Абрад «засявання».
15/2. Шчодры. Аб'езд маладога бычка («Кідай быковае ды бярываловае»).
17/4. Марк. Правяраюць насенне морквы.
18/5. Вадзяная Каляда, Піскуха — завяршальны дзень Каляд, Шчодрага тыдня. Трэцяя, або галодная, вадапосная, куцця, вадзянка. Апанас (н. ст.) — апякун жывёлы.

---

* Першая лічба тут і далей азначае дату па новаму стылю, другая — па старому стылю. Напр.: 1/19 (1 — студзень па н. ст., 19 — снежань па ст. ст.).

** (н. ст.) — новы стыль; абазначаны каляндарныя дні, якія бытуюць пераважна ў некаторых заходніх (каталіцкіх) раёнах Беларусі і замацаваны ў календары па н. ст., грыгарыянскаму летазлічэнню.

19/6. Вадохрышча, Кшчэнне («Трашчы не трашчы — ужо прайшлі Вадахрышчы»).

20/7. Прывадахрышча, Лянівы дзень — заканчэнне святак. Прыцік, Прысеча («Іван Прыцік узяў куццю да й уцік»). Пачатак малой Вясельніцы (да Масленкі).

21/8. Провады Каляд, Адпусціцель, Расцвендзень.

24/11. Аксіння (н. ст.). «Аксіння дарогу перамяце, а корм падмяце».

31/18. Апанасся, Апанас, Гусеўнік — дзень жывёлы; гусінае свята («Хавай нос у апанасаўскі мароз»).

## Люты

2/20. Срэценне, Грамніцы (н. ст.). «Як на Грамніцы адліга — з ураджаю будзе фіга»; «На Срэценне зіма з летам сустракаецца».

5/23. Агата (н. ст.). «Агаты бароніць ад агня хаты».

6/24. Аксіння, Ксеня («Калі да Аксені мяце, то ўвесь корм падмяце»).

9/27. Іван Златавус. Згодна з легендай, замест падпаленых вусоў бог падарыў Іаану Хрысціцелю залатыя.

11/29. Ігнат («На святога Ігната зіма багата, а Ігнат Грамніцам рад»).

12/30. Тры Свяціцелі.

Панядзелак. Пачатак * *Усяднага тыдня* — тыдзень памяці продкаў; апошні тыдзень Мясаеда перад Масленічным тыднем.

13/31. Стрэчаньскія дзяды.

14/1. Грамнічны бацька — пярэдадзень Грамніц. Рыхтавалі свечкі. Трыфан («На Трыфана зорна — вясна позняя»).

15/2. Стрэчанне, Грамніцы — дзень сустрэчы зімы з летам, свята свечкі («А ў нас сёння Стрэчанне, Стрэчанне, зіма з летам стрэлася, стрэлася...»; «Грамніцы — палавіна зіміцы»).

Пятніца. *Масленічныя,* або *Мясаедныя, дзяды, Дзедава пятніца* — пятніца перад Масленічным тыднем.

Субота. *Дзедава субота, Бабы.*

18/5. Агата («Хлеб святой Агаты не пусціць бяды да хаты»).

---

* Святы і прысвяткі, якія не маюць сталага дня прымеркавання ў календары; залежаць ад Вялікадня (у тэксце выдзелены курсівам).

19/6. Вакулы — ахоўнік чалавека ад ператварэння яго ў ваўкалака.

Панядзелак. *Масленіца, Масленка* — пачатак Масленічнага, Сырнага, тыдня — восьмы тыдзень перад Вялікаднем. Свята «гукання вясны».

Чацвер. *«Крывы» чацвер. Валосы, Улас* — свята жывёлы, культу Воласа; чацвер на Масленічным тыдні.

24/11. Улас, Аўлас — «каровіна і конскае свята». Сухі дзень, Мацей (н. ст.). «На Мацея зіма пацее».

Нядзеля. *Масленічныя загавіны* — апошні дзень Масленіцы. «Гуканне вясны».

Панядзелак. *Шыльны панядзелак, Паласказуб* — першы дзень Вялікага посту (7 тыдняў).

26/13. Фацiння — заступніца ад ліхаманак, трасцы.

## Сакавік

Субота. *Зборная субота* — субота перад Зборам. Абрад «споведзі дзежкі».

4/19. Казімір (н. ст.). «Святы Казімір дровы сякець і ў клад кладзець».

Нядзеля. *Збор, Ізбор* — пачатак збору селяніна ў поле; нядзеля першага тыдня пасля Масленіцы.

9/24. Абертас, Паўраценне — паварот птушак дадому. Янка («Янкавай галавы баіцца зіма»). Дзень Сарака мучанікаў (н. ст.). Прыска, Пліска (н. ст.). «На Прыска праб'е лёд і пліска».

12/27. Рыгор (н. ст.). «На святога Рыгора ідуць рэкі ў мора».

14/29. Касьян. Адзначалі толькі адзін раз у тры гады за тое, што ён падпаліў Іаану Хрысціцелю вусы.

14/1. Аўдоцця Вясноўка — першы дзень вясны і жанчыны. «Гуканне вясны».

17/4. Герасім Грачэўнік — дзень прылёту грачоў.

Панядзелак. Пачатак *Крашчатага, Благавеснага тыдня* — чацвёрты тыдзень Вялікага посту. Пяклі «храсты» (пячэнне).

Серада. *Кросная серада, Серадапосце* — серада на чацвёртым тыдні Вялікага посту.

19/6. Язэп (н. ст.). «Язэп кіўне барадою, дык зіма ўцякае ўніз галавою»; «Святы Язэп сярод посту шлюб дае прахвосту».

22/9. Саракі («На Саракі прылятае сорак выраяў») — дзень сустрэчы птушак.

25/12. Рыгор («На Рыгора зіма ідзе ў мора»). Дабравеш-

чанне (н. ст.). «У каго хлеба шмат — і Дабравешчанню рад». «Гуканне вясны».

Нядзеля. *Засеўкі* — звычайна на Крашчатым тыдні або пасля Благавешчання. Абрад «жаніцьба коміна» (гл. таксама 14.09).

30/17. Аляксей цёплы («На цёплага Аляксея рыба ідзе на нераст, карова на верас, а бартнік на хвою»).

**Красавік**

1/19. Дар'я вясенняя — свята вясны ў некаторых раёнах.

Нядзеля. Пачатак *Пахвальнага тыдня* — тыдзень перад Вербніцай («Дзіка качка яйцом пахваліцца»).

5/23. Арына, Ірына (н. ст.). «На Арыну сей купусту ў расадніках».

6/24. Камаедзіца — язычніцкае свята пакланення мядзведзю.

Пятніца. *Пахвальная пятніца* — дзень на Пахвальным тыдні. Мылі хлебныя дзежкі.

Субота. *Пахвальна, Мезіна субота.*

7/25. Благавешчанне, Звеставанне — свята прылёту бусла. Гукалі вясну.

Нядзеля. *Вербніца* — нядзеля перад Вялікаднем. Пачатак Вербнага, Страснага, тыдня. Засеўкі.

Панядзелак. *«Чысты» панядзелак* — панядзелак Вербнага тыдня. Пачатак Белага тыдня.

Аўторак. *«Чысты» аўторак* — аўторак Вербнага тыдня.

Серада. *Дравяная страсць* — серада Вербнага тыдня.

Чацвер. *Дравесны, «чысты», Вялікі, чацвер, Жыльнік* — дзень Вербнага тыдня («Чысты чацвер ячмень засявае»). Абрад «мыцця дзежкі».

Пятніца. *Красная, Велікодная пятніца* — пятніца Вербнага тыдня.

9/27. Матрона («На Матрону шчупак хвастом лёд прабівае»).

14/1. Прабуджэнне дамавіка («Апрэль — нікаму не вер»).

Субота. *Красная, Вялікая субота, Тайкушчы дзень* — субота перад Вялікаднем.

Нядзеля. *Вялікдзень, Вялічка, Паска* — пэўная нядзеля ў перыяд з 4 красавіка па 8 мая, у каталікаў з 22 сакавіка па 25 красавіка («Святое Вялічка ды гуляць вяліць малым дзеткам з красным яечкам. Старым мужам — мужжываннейка, старым бабам — пагуканнейка, маладым малайцам — паляваннейка, маладым паненкам — пагуляннейка»).

16/3. Мікіта («На Мікіту няма ні зімы, ні лета»).
Панядзелак. *Вялікі панядзелак* — другі дзень Вялікадня. Валачобніцтва.
Аўторак. *Вялікі аўторак* — трэці дзень Вялікадня («Першы дзень пірагі маюць, а сярэдні дзень пагуляюць, а паследні дзень выпраўляюць»).
Серада. Пачатак *Праводнага, Мёртвага, Фаміна тыдня* — серада пасля Вялікадня («Пайшла зіма да Кіева, а нам лета пакінула»). *Людавы дзень. Градавая серада.* Абрады каля студні.
Чацвер. *Вялікадне мёртвых, Наўская Паска* — дзень памінання на могілках; чацвер на Велікодным тыдні.
21/8. Руф («рушыць снягі»).
23/10. Войцах (н. ст.). «Святы Вайцеху выпусціў жаўранка з меху». Юры (н. ст.). «Як настане Юр'ева раса — не патрэбна коням аўса».
Панядзелак. *Радунічныя дзяды* — Дзяды перад Радуніцай.
Аўторак. *Радуніца, Радаўніца* — першы або другі аўторак пасля Вялікадня («На Радаўніцу да абеду пашуць, па абедзе плачуць, а к вечару скачуць»).
24/11. Анціп — ахоўнік зубоў.
25/12. Марк (н. ст.). «Дождж на Марка — дык зямля як скварка».
28/15. Пуд («Пуд снег пудзіць»).
30/17. Зосім — ахоўнік пчол. Андрыянава ноч — час дзявочай варажбы.

## Май

1/18. Кузьма («У дзень святога Кузьмы сеюць моркву і буракі»).
5/22. Ляльнік — язычніцкае свята ў гонар Лады.
6/23. Юр'е, Юрай, Ягорый — свята выгану жывёлы ў поле.
Панядзелак. Пачатак *Пераплаўнага, Чарвівага, тыдня* — чацвёрты тыдзень ад Вялікадня.
8/25. Станіслаў (н. ст.). «Сей лён на Станіслава — вырасце як лава». «Бабскія разбрыкі» — абрады на ніве.
Серада. *Градавая серада, Перапалавенне* — серада на Пераплаўным тыдні.
10/27. Абрад выезду ў поле Ярылы.
Ярылавіца — святкаванне ў гонар язычніцкага культу веснавой урадлівасці і плоднасці жанчыны (да Пятра).

13/30. Якуб («На Якуба грэе люба»).

14/1. Май («Май — валам сена дай, а сам на печ уцякай»). Макарэй.

15/2. Барыс — апякун веснавых палявых работ («Ляды паліць, зямлю грэець, ячмень сеець»).

21/8. Іван веснавы, Мікольнік, Іван доўгі, бацька Міколы («Міколін бацька із сявалачкі яр засяваець. Первая сяўба — белы й гарошак, втарая сяўба — яра пшаніца»).

22/9. Мікола — свята пастухоў («Па межах ходзя і ўсё родзя, і траву расціць, і скот пасціць»).
Галена, Алёна (н. ст.). «Сей лён на Галену, то будзе кашуля па калена».

23/10. Зілот («Сей пшаніцу, і яна будзе як злата»).

Чацвер. *Ушэсце, Шоснік* — дзень агляду жыта; саракавы дзень пасля Вялікадня. Абрад «стралы».

27/14. Сідар («Прыйшлі Сідары, прыйшлі і сіверы»).

28/15. Пахом («Сей агуркі на Пахом — будзеш насіць мяхом»).

29/16. Магдалена (н. ст.). «Магдалена зязюльку прысылае».

Серада. *Градавая, «крывая», серада* — чацвёртая серада пасля Вялікадня.

31/18. Шэсць Дзеў («На Шэсць Дзеў лён сей позні»). Канапелька Матруна («Канапелька Матруна ў зямлю махнула»).

**Чэрвень**

Пятніца. *Сёмушныя, Траецкія, дзяды* — пятніца перад Сёмухай («У пятніцу вараць поснае, а ў суботу — скаромнае»).

Субота. *Духавая субота, Сёмка, Стаўроўскія дзяды* — субота перад Сёмухай. *Кляновая субота, Зелянец, Май, Зялёныя святкі* — свята зелені.

Нядзеля. *Сёмуха, Сямік, Тройца, Клечанне* — свята культу продкаў і расліннасці; пяцідзесяты дзень пасля Вялікадня («Мы куміліся, не сварыліся»).

3/21. Алёна, Ульяна — дзень ільну.

Панядзелак. Пачатак *Праводнага, Гранага, тыдня, Русальніцы* — наступны тыдзень пасля Сёмухі. Ваджэнне «куста».

4/22. Васіліска («Ад Васіліскі і салавей блізка»).

5/23. Дзень памяці Ефрасінні Полацкай. Хадзілі ў Полацк пешшу.

Аўторак. *Конскі Вялікдзень* — аўторак пасля Сёмухі.

Серада. *Градабой* — дзень аховы ад грому; серада на Гранным тыдні. *Серада-Русаль* — дзень здабывання «жывога агню» на Палессі.

Чацвер. *Наўская Тройца, Наўскі чацвер* — дзень памінання продкаў; чацвер пасля Сёмухі. Абліваха — абрад вызывання дажджу.

Нядзеля. Пятроўскія запускі — пярэдадзень Пятроўкі. Абрады «развівання вянкоў».

Панядзелак. *Розыгры* — апошні дзень Русальнага тыдня. Пятроўка — Пятроўскі пост («Хто ў Пятроўку сена не косіць, той зімою ў сабак просіць»).

14/1. Юстын. Харытон («Юстын цягне ўверх каноплі, а Харытон — лён»).

Чацвер. *Дзевятнік* — чацвер на дзевятым тыдні пасля Вялікадня («у жыце... красу здымаець»).

Пятніца. *Дзевятуха* — пятніца на дзевятым тыдні пасля Вялікадня («Дзевятушка-памяжаначка па межах хадзіла, жытцо абзірала»).

21/8. Тодар («На Тодара раса — канапель паласа»).

Пятніца. *Дзесятуха* — пятніца на дзесятым тыдні пасля Вялікадня. *Пяценка* — час, калі завязваецца зерне («пятка»). («Дзесятуха красу давала, а Пяцінка красу здымала, пятку стаўляла»).

23/10. Купалле (н. ст.) — язычніцкае свята летняга сонцастаяння («Сёння Купала, заўтра Ян, пойдзем, дзявачкі, у зялёны гай»).

24/11. Ян Купальны, Янаў дзень (н. ст.). «На Яна сонца гуляе».

25/12. Анапрэй («Святы Анопры, радзі каноплі»; «Хто на Нупрэя пасее грэч, той будзе бліны печ»).

26/13. Акуліна Грэчышніца, Акуліна — «задзяры хвост» («каровін зык»).

28/15. Амос («Прыйшоў Амос — цягне ўгору авёс»).

29/16. Ціхан — дзень заканчэння севу на Смаленшчыне. Пётра і Паўла (н. ст.). «Святы Пётра ў косы звоніць, а святы Паўла граблі робіць».

**Ліпень**

2/19. Юды («На Юды конь баіцца груды»).

6/23. Купалле.

7/24. Іван Купала, Іван Пятроўскі, Іван летні, Іван ведзьмін — старажытнае земляробчае свята, свята сонца і агню, бостваў урадлівасці і росквіту зямлі.

10/27. Сем братоў (н. ст.). «Сем братоў варожаць, колькі тыдняў пагоды». Сямён («На Сямёна дождж — сем тыдняў то ж»).

12/29. Пятро, Пятрок, Пятро і Павел — земляробчае свята, канец Пятрова посту («Свята Пятро — ў жыце ядро»).

13/30. Паўлюк, Паўпятро — працяг свята Пятра.

14/1. Кузьма, Касьма і Даміан — земляробчае свята, свята кавалёў («Святы Пятро жыта спеліць, святы Кузьма сякеры робіць, а святы Дзям'ян сена грабіць»).

17/4. Андрэй — адзін з апекуноў земляробства («Трэці празнік — святы Андрэй, святы Андрэй за ўсіх мудрэй. Саху ладзіць, каня гладзіць»).

18/5. Свята месяца, Лампады. У гэтым свяце, як сцвярджаў А. Кіркор, ёсць рэшткі культу Велеса — «бога статка, апекуна пастухоў».

21/8. Казанская — дзень засцеражэння ад хвароб вачэй і галавы. Данат (н. ст.). «Святы Данат коскі точыць, сянцо косіць». Пракоп («Пракоп бок прыпёк»).

23/10. Мацвей — пачатак лета.

25/12. Прокл. Засцерагаліся вялікіх росаў, пасля якіх гніло сена. Якуб (н. ст.). «Які Якуб да паўдня, такая да снежня зіма».

26/13. Гаўрылей. Засцерагаліся граду, каб не пабіў каноплі. Шыпілінка, Серпавіца — пятніца перад Ільіным днём, дзень «зазубрывання сярпоў» («Шыпілінка ў кузню ідзец, у кузню ідзец сярпы зубіць»). Ганна (н. ст.). «Дождж на Якуба — для жалудоў згуба, а як Ганна з дажджом — дык гарох з чарвяком».

## Жнівень

1/19. Макрыны, Макрэня, Макрыдка («Як не будзе на Макрэню дажджу, то не будзе бульба гнісці»).

2/20. Ілля, Галляш — свята дажджоў і навальніц; апякун земляробства і абаронца ад «нячыстай сілы», які ўвабраў рысы язычніцкага бога Перуна. Існуе шмат прымавак. Заканчвалі касавіцу, хадзілі талакою касіць удовам («Івановэ сена — пановэ, а Петровэ — ужэ не таковэ, а Іллінэ — удовінэ»). Спраўлялі зажынкі — свята пачатку жніва.

4/22. Магдалена («Магдалена — вады па калена»).

6/24. Барыс і Глеб, Барыс Палікоп («На Глеба і Барыса хлеба напарыся і за раллю бярыся»).

7/25. Ганна («Меншы святочкі носяць снапочкі, святы Ганны бабкі стаўляюць, святы Барыс бабкі злічае»).

9/27. Палікоп — дзень жніва, у які нібы маланка паліць копы, стагі, будынкі. У некаторых раёнах Палікопам лічацца дні ад Барыса да гэтага дня.
Панцеляймон — лекар ад хвароб галавы.

10/28. Лаўрын (н. ст.). «На Лаўрына спяшай да млына».

11/29. Іван Калінавік, Іван Каліннік — дзень збору каліны, журавін. Сеялі жыта, вілі вянкі.

12/30. Іван — абаронца ад злодзеяў.
Сіла («Хто на Сілу жыта пасее, у таго на хлеб надзея»).

13/31. Спасаўскія запускі, запусты — пярэдадзень Спасаўскага посту.

14/1. Макавей, Макаўе, першы Спас, медзяны Спас — свята маку. Спасаўка, Спасаўка-Ласаўка, Спажын пост — пятнаццацідзённы асенні пост (да 28.08).

15/2. Базыль («Базыль авечкам воўну дае»). Прачыста (н. ст.). «Прыйшла Прачыста — стала поле чыста».

16/3. Рох (н. ст.) — «маленькі сьвяток», «кірмаш на паненак», як заўважаў А. Сержпутоўскі на Капыльшчыне і Случчыне.
Антоні («Антоні віхравеі»).

19/6. Яблычны Спас, вялікі Спас, сярэдні Спас, другі Спас, Іспас — свята садавіны.

24/11. Баўтрамей, Варфаламей (н. ст.) «Прыйшоў Баўтрамей — жыта на зіму сей».

Субота. Спасаўскія дзяды — Дзяды перад Успленнем адзначаліся на Століншчыне і іншых сумежных раёнах.

28/15. Успленне, Прачыстая, вялікая Прачыстая, першая Прачыстая, Аспажа, Гаспажа, Спажа, вялікая Спажа, Зялёная, Зельна — свята ўраджаю.
Бабскае лета — маладое «бабскае лета», да 11 верасня.

29/16. Хлебны Спас, трэці Спас, малы Спас — свята хлеба. Дажынкі — свята заканчэння жніва. Ян (н. ст.). «Ян на лета прыйшоў, а ўжо восень знайшоў».

31/18. Флор і Лаўр, Хрол і Лаўр — «конскае свята». Арабінавы дзень і ноч, Варавіты дзень — пара, калі бывае «сухая» навальніца, або буран. У некаторых раёнах лічылі, што «рабінава ноч» бывае на Спасаўку або ў нейкую ноч ад Барыса да Прачыстай ці ад першай Прачыстай да другой.

## Верасень

5/23. Лупа («будзе жыта купа»).

10/28. Мацей, Майсей — абаронца ад запойнага п'янства («Пасля Мацея мужык на полі пацее»).

11/29. Галавасек, Галаварэз, Іван Крываўнік, Іван Посны. У гэты дзень нічога круглага не рэзалі.
Бабскае лета — старое «бабскае лета» (да Цудаў, Багача, Пакровы — у розных раёнах па-рознаму), пачатак жаночых сельскагаспадарчых работ.

14/1. Сямён («У Сямёнаў дзень да абеда пашы, а пасля абеду пахара з поля гані»; «Сямён да варот — на двары сем пагод: сее, вее, дзьме, крупіць, муціць, зверху лье, знізу мяце»). Абрад «жаніцьба коміна» (лучніка, пасвета).
Узвіжанне, Здзвіжанне (н. ст.). «На Узвіжанне халат з плеч, а кажух на плечы».

19/6. Цуды («Не так бойся Прачыстай, як «цуда» яе»; «Прачыста гаворыць: «Мяне не святкуй, а святкуй маё Цуда»).
Міхайла — прысвятак, асацыіруецца з Цудам. Не палілі святло ў хлявах. Існуе шмат паданняў пра незвычайныя цуды, якія адбываліся з людзьмі ў гэты дзень.

21/8. Багач, Багатнік, Багатуха, Гаспожка багатая, малая Прачыстая, другая Прачыстая, другая Спажа, Зельная — старажытнае свята заканчэння ўборкі збожжа.

27/14. Здзвіжанне, Звіжанне — свята «закрывання» зямлі на зіму.

29/16. Міхал (н. ст.). «Калі на Міхала з поўначы вецер вее, то не май на пагоду надзеі».

## Кастрычнік

4/21. Пранцішка, Францішак (н. ст.). «На Пранцішка шукае зярнят у полі мышка».

Нядзеля. Зялезная нядзеля («Перад Пакровам пянькі не мачы: крэпка будзець»).

9/26. Іван Шаптун, Іван Пакроўны, Багаслоў («Іван Багаслоў дружак разаслаў, а на Пакрова дзеўка гатова»; «Хто не дасее да Івана Багаслова, той не варт добрага слова»).

11/28. Пакроўны бацька — прысвятак за тры дні перад Пакровамі.

Пятніца — субота. Пакроўцы — Дзяды перад Пакровамі.

14/1. Пакрова, Пакроў, трэцяя Прачыстая — народнае свята, якое знамянуецца ў календары як глыбокая восень, пасля якога пачынаецца зіма.

18/5. Юліан — ахоўнік дзяцей.

20/7. Сяргей («З Сяргея пачынаецца зіма»).

24/11. Зміцер (н. ст.). «Зміцер зямлю выцер, на груды пабіў, каб ніхто не хадзіў»; «На Змітра баба хітра». Марцін (н. ст.).— свята млынароў; елі гусей («Марцін святы — губіцель гагаты»).

28/15. Параскева Пятніцкая (н. ст.).

29/16. Логін — збавіцель ад хвароб вачэй.

30/17. Паклоны — дзень адбівання паклонаў Андрэю Крытскаму.

31/18. Лука («Хто сее да Лукі, то не будзе мець ні хлеба, ні мукі»).

**Лістапад**

1/19. Усе святыя (н. ст.) — памінальны дзень у беларусаў-католікаў. «Па Усіх святых холад для ўсіх».

2/20. Задушны дзень — працяг памінальных дзён. Артошка («Святы Артошка, напрадзі пачатак з лукошка»).

Пятніца — субота. Асяніны, Змітраўка, Казанскія, Змітраўскія дзяды — памінальны дзень перад Змітрам.

Субота. Змітрава, Памінальная, Радзіцельская субота — працяг Асянін.

8/26. Зміцер — «хітры дзень», канец надзеі выйсці замуж («Да Змітра дзеўка хітра»; «Святы Зміцер — ён на ўсіх хіцер: салады салодзіць, піва робіць, сыноў жэніць, дачок выдаець»). Дзяды. Дарэвалюцыйныя этнографы адзначалі, што ў Ашмянскім павеце першыя Дзяды ў чацвер, другія — у суботу, трэція — у нядзелю, чацвёртыя — у суботу перад Загавінамі (Берман, 1874); у Гомельскім павеце спраўлялі Змітраўкі, Дзяды — 26, а Бабы — 27 лістапада (Радчанка З., 1888).

9/27. Тадор (н. ст.). «На Тадора поўна камора».

10/28. Параскі, Параскева Пяценка, Параскімка, Параскоўя, Параскі асеннія — дзень забароны прадзення і ткання.

11/29. Настуся. Стрыглі авечак. Марцін (н. ст.). «Ад Марцінавага дня пачынаецца зіма».

14/1. Кузьма-Дзям'ян, Кузьма-Зямян, Касьма-Даміян — свята шаўцоў, кавалёў; апякун земляробства і вяселля. Пачатак Піліпаўскіх запустаў (па 27 снежня) — апошніх дзён перад Піліпаўкай.

Пятніца — субота. Міхайлаўскія, асеннія, Дзяды.

Субота. Бабы, Міхайлаўскія бабы.

21/8. Міхайла, Міхайлаў дзень — апошняе свята года, абаронца ад грому.

Пятніца — субота. Піліпаўскія, Раздзвяныя, дзяды — памінальны дзень перад Піліпаўкай («Піліпаўскі дзед кажа: хоць трашчу, але не пушчу»).

25/12. Кацярыны (н. ст.). «Прыйшла Кацярына — прыйдзе й пярына».

26/13. Іван Залатавус — дзень пчаляроў («Іван мёд выбірае»).

27/14. Юсцініян — апякун плоднасці жанчыны.
Канец Запустаў, Загавін.
Піліп, Піліпей — канец Мясаеда («Піліп дзяцей адзявае»).

28/15. Піліпаўка, Раждзественскі пост — шасцітыднёвы перадкалядны пост (да 6 студзеня).

30/17. Андрэй (н. ст.) — дзень варожбаў («Святы Андрэю, я ячмень сею...»).

**Снежань**

4/21. Увядзенне, Вадзенне («водзяцца ваўкі», «вадзілі Варвару», «Увядзенне, што свят навядзе»). Барбара (н. ст.). «Барбара мосціць, а Мікола гвоздзіць».

5/22. Сава (н. ст.). «Барбара мосціць, Сава цвікі вострыць, а Мікола прыбівае».

6/23. Матрыхваны, Матрыпан — дзень вольны ад прадзення ў Піліпаўскія вечары.

7/24. Кацярыны.

9/26. Юр'е зімовы, Юр'еў дзень, Ягорый, Цуды («Ёсць на свеце два Юр'і і абодва дурні: адзін халодны, а другі галодны»; «Юры мосціць, а Мікола гвоздзіць».

13/30. Андросы, Андрэй, Андрэйкі — дзявочае свята.

14/1. Навум. Раней некаторыя сяляне пачыналі вучыць грамаце сваіх дзяцей («Прарок Навум наставіць на вум»).

17/4. Варвары, Варкі — прысвятак. Мусіць, у старажытнасці святкавалі дзень зімовага сонцастаяння, таму паўсюдна вядома прымаўка «Варвара ноч урвала, а дзень надтачыла».

18/5. Савы, Саўка, Міколін бацька («На Савы не пралі, таўклі проса, ячмень на куццю, жыта малолі на калядніко, пасталы плялі, валокі вілі»).

19/6. Мікола зімовы, Мікольшчына («Да Міколы няма зімы ніколі»; «Ніводнаму Міколу не вер ніколі»).

22/9. Ганна, Ганкі («На Ганкі сядайце на санкі»).

24/11. Посная куцця (н. ст.). Пачатак Каляд па каталіцкім календары (да 6 студзеня).

25/12. Польскія Каляды, польскае Ражство (н. ст.). «Калі польскія Каляды трашчаць, дык нашы плюшчаць, калі ж польскія плюшчаць, то нашы трашчаць».

26/13. Сцяпан (н. ст.).

31/18. Мадэст — апякун дамашняй жывёлы. Марк («Марка да Варка, няхай будзець парка»).

Тыдзень да Каляд («Тыдзень, тыдзень да Каляд, наш пан чэлядзі не рад...»). Сільвестра (н. ст.). На Сільвестраву ноч» дзяўчаты варожаць. Багатая, шчодрая куцця (н. ст.).

* * *

У беларускі народны каляндар мы ўключаем святы і прысвяткі, на якія традыцыйна выконваліся песні, праводзіліся абрады, адбываліся гульні, ігрышчы і з якімі звязаны прыкметы і павер'і. Сюды ж уваходзяць тыдні і большыя прамежкі часу, што атрымалі адпаведныя назвы. Такім чынам, у календары аказаліся народныя святы, абрады, гульні і ігрышчы, якія маюць язычніцкае паходжанне, некаторыя з іх злучыліся з «рухомымі» датамі афіцыйнага календара, а таксама святы і прысвяткі, у якіх бачна хрысціянскае паходжанне, але назвы і сутнасць іх фальклярызаваліся, г. зн. упамінаюцца ў народных песнях, казках, паданнях, з імі звязаны прыкметы і павер'і, прыказкі. Часцей такія назвы каляндарных дат гучаць на беларускі лад, напрыклад Мікола («Перенесение мощей святителя чудотворца Николая» * — 9 мая), Іван веснавы («Апостол и евангелист Иоанн Богослов» — 8 мая), Ганны («Зачатие праведной Анны Пресвятой Богородицы» — 9 снежня), для некаторых характэрна выкарыстанне форм множнага ліку (Ганны, Кацярыны, Варвары, Парaскі).

Да язычніцкіх святкаванняў і абрадаў адносяцца Камаедзіца, ваджэнне і пахаванне «стралы», Ярылавіца, «жаніцьба

* Прыклады ўзяты з праваслаўнага царкоўнага календара, дзе даты свят пададзены па ст. ст.

коміна» і інш. У календары ёсць вялікая група свят і прысвяткаў, якія ўяўляюць сінкрэтызм «паганскай» і хрысціянскай культур. Народная язычніцкая традыцыя была настолькі моцная, што царкве і касцёлу прыходзілася прыстасоўваць свой каляндар, каб пастунова выцесніць старажытныя абрады або трансфармаваць іх у хрысціянскія. Таму цяпер побач са спрадвечнымі «паганскімі» святамі ўжываюцца чыста хрысціянскія, якія маюць як некаторае падабенства, так і адрозненне (пачатак Каляд — «Рождество Господа Бога и Спаса нашего Иисуса Христа»; Валосы, Аўлас — «Священномученик Власий, епископ Севастийский»; Гуканне вясны, Аўдоцця вясноўка — «Преподобномученица Евдокия»; Вялікдзень, Вялічка — «Светлое Христово Воскресение. Пасха» і інш.).

Беларускі народны каляндар сабраны з розных крыніц: асобныя публікацыі дарэвалюцыйных і савецкіх фалькларыстаў і этнографаў, архіўныя і асабістыя запісы.

*А. Ю. Лозка*

# КАМЕНТАРЫІ





# СПІС СКАРАЧЭННЯЎ

ААН СССР — Архіў Акадэміі навук СССР у Ленінградзе

АІМЭФ — Архіў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР

БАН — Бібліятэка Акадэміі навук СССР у Ленінградзе

адв.— адваротны

адз. зах.— адзінка захавання

б.— былы

бел.— беларускі

бл.— блакнот

в.— вёска

вар.— варыянт

вобл.— вобласць

вол.— воласць

воп.— вопіс

вып.— выпуск

г.— год

гл.— глядзіце

г. н.— год нараджэння

г. п.— гарадскі пасёлак

губ.— губерня

зап.— запісана (запісаў, запісала)

заўв.— заўвага

ін-т — інстытут

кам.— каментарый

л.— ліст

м.— мястэчка

п.— павет

пас.— пасёлак

пер.— пераклад

перадрук.— перадрукавана

польск.— польскі

р-н — раён

Романов. Белорусский сборник — Романов Е. Р. Белорусский сборник. Вильна, 1912. Вып. 8.

рус.— рускі

с.— старонка

спр.— справа

с/с — сельсавет

ст.— стагоддзе

ст. ст.— старога стылю

сш.— сшытак

т.— том

у.— уезд

ф.— фонд

ч.— частка

часоп.— часопіс

Шейн, 1887 — Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края. СПб., 1887. Т. 1. Ч. 1.

Шейн. Материалы — Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края. СПб., 1890. Т. 1. Ч. 2.

## АПІСАННІ СВЯТ ЗЕМЛЯРОБЧАГА КАЛЕНДАРА

### Каляда

Эгілеўскі. Беларускія павер'і//Маяк. 1844. Т. 17. С. 41—49. У гэтым жа артыкуле асобна вылучаны: Каляды. С. 42—43; Калядныя павер'і. С. 44—45.

Пер. з рус. Дж. М. Чэчка.

Вар.: Каменка І. Беларускія норавы: Багатая каляда//Витеб. губерн. ведомости. 1846. Отд. ІІ. Часть неофиц. к № 1. С. 1—2. Зап. вучань Лепельскага павятовага дваранскага вучылішча Ігнат Каменка.

### Каляда

Могилев. губерн. ведомости. 1852. К № 4. С. 77—79.

Пер. з рус. А. А. Янкоўскага.

Перадрук.: Вилен. губерн. ведомости. 1852. Часть неофиц. К № 14. С. 53—55.

### Святочныя дзявочыя варожбы ў Магілёўскай губерні

Магилев. губерн. ведомости. 1852. К № 8. С. 133—135.

Пер. з рус. А. А. Янкоўскага.

### Шчадрэц

Могилев. губерн. ведомости. 1852. К № 11. С. 198—200. Зап. Н. Гашкевіч.

Пер. з рус. А. І. Гурскага.

Галоўная роля ў час шчадравання адводзіцца таму, каго прыбіраюць Шчадрацом, а астатніх — па значнасці выконваемых роляў у дадзеным святкаванні.

### Каляда

Вилен. вестник. 1860. № 37. С. 358. Зап. С. Мікуцкі.

Пер. з рус. А. І. Гурскага.

### Сустрэча Новага года ў Гомельскім павеце Магілёўскай губерні

Могилев. губерн. ведомости. 1870. № 6. С. 21. Зап. П. Маркоўскі ў Гомельскім п. Магілёўскай губ.

Пер. з рус. А. І. Гурскага.

Вар.: О-вский. Суеверные обряды простонародья Западного края: Кутья. Коляды//Русский мир. 1873. № 344.

**Калядныя святы ў сялян Мазырскага павета**

Мин. губерн. ведомости. 1878. № 5. С. 74—75. Зап. А. Я. Васільева ў Мазырскім п. Мінскай губ. ад сялян.

Пер. з рус. А. І. Гурскага.

У мінулым святкаванне Каляд і Новага года лічылася ў сялян самым вясёлым святам.

**[Коляды]**

Шейн, 1887. Зап. настаўнік народнага вучылішча Аляксей Шарупіч у в. Мялешкавічы Мазырскага п. Мінскай губ.

Пер. з рус. В. І. Скідана.

Вар.: Ящуржинский Хр. Белорусские колядки//Киевская старина. 1889, февраль. С. 477—485.

**Абраднасць куцці**

Шейн, 1887. Зап. настаўніца П. О. Журакоўская ў в. Кочышчы Скародзінскай вол. Мазырскага п. Мінскай губ. ад 70-гадовага мужчыны.

Пер. з рус. В. І. Скідана.

Вар.: Праводная, ці галодная, куцця: Нарыс з беларускага простанароднага жыцця [не закончаны]//Вилен. вестник. 1884. № 15. С. 2.

**Куцця**

Kraj. Peterburg, 1889. № 51. С. 7. Зап. Броліс.

Пер. з польск. В. І. Скідана.

**Калядныя святы ў беларусаў Віленскай губерні**

Вилен. вестник. 1891. № 277—278. Зап. С. І. Карскі.

Пер. з рус. А. І. Гурскага.

Заўв. збіральніка: Куцця з сытою — пшанічная рассыпчатая каша з падліўкаю з разведзенага вадою мёду. Відаць, такая куцця была характэрна для той мясцовасці, дзе рабіўся ў свой час запіс. Звычайна ж куцця на Беларусі варылася з ячменнай крупы.

*Беліца* — мястэчка на Нёмане ў б. Віленскай губ.

*Лямендравы* — тут: фарсісты.

**Мясцовыя народныя звычаі на калядныя святы**

Гродн. губерн. ведомости. 1892. № 2. С. 2—3. Зап. М. Г. у Гродзенскай губ.

Пер. з рус. А. А. Янкоўскага.

**[Аб калядных святах у Гродзенскай губерні]**

Гродн. губерн. ведомости. 1893. № 2. С. 1. Матэрыял надрукаваны пад загалоўкам: «Кое-что о рождественских святках в нашей губернии».

Пер. з рус. А. І. Гурскага.

**Васілёў дзень і калядныя святы**

Могилев. губерн. ведомости. 1893. № 6. С. 23.
Пер. з рус. А. А. Янкоўскага.

**Калядныя святы на Беларусі**

Вилен. вестник. 1894. № 277. Зап. П. П. Дземідовіч у Мінскай губ. Пер. з рус. А. І. Гурскага.

**Калядныя святы на Беларусі**

Вилен. вестник. 1895. № 3. С. 2. Зап. П. П. Дземідовіч у Мінскай губ. Пер. з рус. А. І. Гурскага.

*Ашорстак* — жэрдка, якая працягваецца ў хаце ад печы да процілеглай сцяны (заўв. збіральніка).

**Напярэдадні Новага года ў Беларусі**

Звезда. СПб., 1896. № 1. С. 28.
Пер. з рус. Дж. М. Чэчка.

**Каляды ў Сенненскім павеце**

Могилев. губерн. ведомости. 1898. Часть неофиц. № 103—104. С. 451—452. Зап. К. А. у Сенненскім п. Магілёўскай губ.

Пер. з рус. А. І. Гурскага.

Вар.: NN [Никифоровский Н.] Иорданская освященная вода//Полоцкие епарх. ведомости. 1903. Неофиц. отдел. № 15. С. 566—569; № 16. С. 605—607.

**Цярэшка**

Витеб. губерн. ведомости. 1908. № 26. С. 2. Зап. А. Пшчолка ў 1908 г. у в. Каптуркі Віцебскай губ.

Пер. з рус. А. І. Гурскага.

Апісанне «Цярэшкі» А. Пшчолкам зроблена з натуры, іменна ў той час, калі моладдзю праводзілася гульня «Жаніцьба Цярэшкі». Апісанне не закончана. Пад назвай «Цярэшка» раней у Полацкім і Лепельскім паветах Віцебскай губерні захоўвалася назва вечарынкі, дзе паказваліся ўсе стадыі сватаўства і шлюбнага банкету з музыкай і песнямі. «Цярэшку», як і «Яшчура», гулялі толькі ў час калядных свят — на Новы год і на Вадохрышча.

Гульня «Жаніцьба Цярэшкі» запісвалася і іншымі аўтарамі. Поўны збор матэрыялаў трэба глядзець у томе «Жаніцьба Цярэшкі» серыі БНТ. Названая гульня звязана з календаром (менавіта з зімовым цыклам), напэўна, невыпадкова. Паколькі з Каляд пачынаўся новы сонечны год, а разам з тым і гаспадарчы, то і гульня гэтая, сімвалічны сэнс якой заключаўся ва ўтварэнні новай сям'і і працягу жыцця на зямлі, прыпадала іменна на Новы год (пасля Каляд да Масленіцы пачынаўся перыяд вяселляў).

*Фабрыканты* — так называлі вясковых хлопцаў, якія ўжо пабывалі на работах (на фабрыцы) у горадзе.

Вар.: Дзмітрыеў М. А. Жаніцьба Цярэшкі: Абрады і звычаі заходнерускіх сялян//Гродн. губерн. ведомости. 1867. Часть неофиц. № 38; Каладзінскі М. А. Народны тэатр (БНТ). Мн., 1983. С. 159—168; Каментарыі. С. 497; Гурскі А. І. На вечарынцы//Голас Радзімы. 1985. № 52. С. 8 і інш.

**Каляды**

Беларускі каляндар «Нашай нівы» на 1912 г. Вільня. С. 7, 9.

Вар.: Власт. Каляда-Грамавіца//Наша ніва. Вільня, 1909. № 51—52. С. 748—750; Ён жа. Каляды//Наша ніва. 1914. № 51—52. С. 5.

**Калядная куцця**

Беларускі каляндар «Нашай нівы». Вільня, 1912. С. 27, 29.

Вар.: Каляды, бедная і багатая куцці//АІМЭФ, ф. 8, воп. 85, спр. 13, сш. 1, л. 25—29. Зап. Г. А. Каханоўскі ў 1985 г. у в. Васюлькі Мядзельскага р-на ад М. І. Клімковіча, 1903 г. н.

**Каляды**

Наша ніва. 1913. № 51—52. С. 2. Зап. Р. Навіцкі.

**Каляды**

Наша ніва. 1914. № 51—52. С. 5.

**Вечар варожб, або Васілёва куцця**

Наша ніва. 1914. № 5. 31 студз. С. 2. Зап. М. Разамка.

**Спатканне Новага года**

Беларусь (Менск). 1920. № 3 (59). Зап. Я. Лёсік.

Вар.: Каляды на Беларусі//Змаганне. Вільня, 1923. № 21.

**Калядныя звычаі**

Шлюбскі А. Матэрыялы для вывучэння мовы і фальклору Віцебшчыны. Мн., 1927. Ч. 1. С. 47.

Вар.: Каладзінскі М. А. Народны тэатр (БНТ). Мн., 1983. С. 76—104; Каментарыі. С. 486—489.

**Каляды на Беларусі**

Шлях моладзі. 1934. № 1. С. 3—5. Зап. М. Пецюкевіч.

**Грамніцы**

«Грамніцы» (белорусские обряды)//Минский листок. 1893. № 13.

Пер. з рус. А. І. Гурскага.

**Грамніцы**

Вилен. вестник. 1893. № 27.

Пер. з рус. А. І. Гурскага.

*Грамніцы* — свята з язычніцкага перыяду Беларусі, якое было прысвечана богу вясны Грамоўніку і вясеннім цёплым дажджам (заўв. збіральніка).

**Грамнічныя свечкі**

N.N. [Нікіфароўскі М.] Грамнічныя свечкі//Полоцкие епарх. ведомости. 1903. Неофиц. отдел. № 10. С. 372—377.

Пер. з рус. Дж. М. Чэчка.

Матэрыялы, змешчаныя ў працы М. Я. Нікіфароўскага «Простонародные приметы и поверья, суеверные обряды и обычаи, легендарные сказания о лицах и местах» (Витебск, 1897), увайшлі ў падрыхтаваны да друку том серыі БНТ «Прыкметы і павер'і земляробчага календара».

**Масленіца ў вёсцы**

Смолен. вестник. 1888. № 29. С. 2.

Пер. з рус. А. І. Гурскага.

Вар.: Масленіца ў Вільні (з прыватнага пісьма)//Северная пчела. 1840. № 57. С. 225—226; О. Л. Гісторыя Масленіцы//Минский листок. 1894. № 17.

Заўв. збіральніка: Падобна ўсім народным святам, руская Масленіца вядзе свой пачатак з часоў язычніцкіх. Гэта было першае веснавое свята ў гонар сонца. У час свята на санях вазілі кола (сімвал сонца) і чучала ці жанчыну, якая выступала ў ролі маці яго. Народ не пакідаў язычніцкіх звычаяў нават пасля прыняцця хрысціянства, святкаваў так, як і язычніцкае свята Каляды і да т. п. Духавенства рабіла спробы змагацца з гэтым перажыткам даўніны, але дарэмна. Усе яго громы і маланкі аказваліся бездапаможнымі. Народ упарта стаяў на сваім. Патрыярху ўдалося толькі скараціць на 7 дзён святкаванне Масленіцы замест ранейшых 14. Сучаснік цара Івана Грознага пастар Адэрборн так апісаў рускую Масленіцу таго часу: «Яна (Масленіца) таму і названа так, што на працягу ўсяго гэтага тыдня рускім дазвалялася есці каровіна масла, а ў посныя дні яны ўжывалі чорнае (канаплянае)...» У гэтыя дні пяклі аладкі, бліны, запрашалі гасцей, наладжвалі народныя гулянні і г. д. Пётр І, які праследаваў бесшабашны разгул у народзе, дазваляў, аднак, народныя весялосці на Масленіцу і нават сам іх наладжваў. Святкуючы заключэнне Ніштацкага міру са Швецыяй (1722), ён наладзіў у Маскве вядомы маскарад і сам прымаў у ім відны ўдзел у ролі флоцкага капітана на караблі, які везлі 16 коней. Арганізоўваў ён і ў Пецярбургу народныя маскарады, прычым прыбіраўся барабаншчыкам і да т. п.

Вар.: Масленіца//АІМЭФ, ф. 8, воп. 85, спр. 13, сш. 1, л. 23. Зап. Г. А. Каханоўскі ў 1985 г. у в. Васюлькі Мядзельскага р-на ад М. І. Клімковіча, 1903 г. н.

**Масленіца і Вялікі пост**

Вилен. вестник. 1895. № 64, 67. Зап. П. П. Дземідовіч у Мінскай губ. (гл.: Белорус [П. П. Демидович]. Мелкие заметки из жизни белоруса).

Пер. з рус. А. І. Гурскага.

Трэба адзначыць, што на Беларусі слаба бытавалі перадвясеннія абрады, у прыватнасці святкаванне Масленіцы — старажытнага абраду, звязанага з культам прыроды, асноўная накіраванасць якога — паскарэнне прыходу вясны, забеспячэнне багатага ўраджаю і дастатку ў доме.

Вялікі пост для беларускага селяніна вызначаўся асаблівай беднасцю ежы на працягу доўгага перыяду пасля Масленіцы. Земляробчая праца, клопаты пра будучы ўраджай з'яўляюцца асноўным матывам усёй бытавой абраднасці беларускага селяніна.

*Сяло Мікольск* — цяпер в. Мікалаеўшчына Стаўбцоўскага р-на Мінскай вобл.

*Гойданка* — імправізаваная гушкалка (заўв. збіральніка).

*Брама* — вароты, глухія, крытыя зверху (заўв. збіральніка).

*Прыварковая каша* — прыварковая мука робіцца з сумесі грэчкі і ячменю ці з прымесі іншых зярнят (заўв. збіральніка).

*Церле* — гліняная пасудзіна, відаць, макацёр.

«*Хто есць многа хлеба, той чырвоны, як рыжык*» — гэтымі словамі беларус характарызуе моцнае здароўе чалавека (заўв. збіральніка).

*Ярыца* — яравае жыта (заўв. збіральніка).

*Мілта* — злітая з аўса вада, якая лічылася раней лячэбным сродкам ад кашлю. Авёс налівалі вадой, пасля сушылі ў печы, тады таўклі ў ступе, потым малолі — і ўсё гэта рабілася для атрымання талакна (заўв. збіральніка).

Вар.: Вялікі пост (Вялікі пост на захадзе.— Гістарычная даведка.— Вялікі пост у рускага народа.— Тыдзень праваслаўя.— Імянная анафема)// Гродн. губерн. ведомости. 1893. Часть неофиц. № 13; Wołyniec. Zapusty// Dziennik Warszawski. 1893. С. 29—30; Каладзінскі М. А. Народны тэатр (БНТ). Мн., 1983. С. 104—105; Каментарыі. С. 489.

### [Дзень веснавога раўнадзенства]

Вилен. вестник. 1895. № 129. Ив. Романовский. К этнографии Белоруссии.

Пер. з рус. А. І. Гурскага.

Вар.: Васільева А. Я. Веснавыя песні і абрады (у вёсках Мазырскага п.)// Мин. губерн. ведомости. 1878. Часть неофиц. № 50; Вебер К. Народные праздники, предания и обычаи [Сустрэча вясны на Беларусі]//Семейные вечера. СПб., 1877. № 1, 3, 4—12; Каладзінскі М. А. Народны тэатр (БНТ). Мн., 1983. С. 55—58; Каментарыі. С. 483.

### Свята Камаедзіцы

Нячаеў С. Нешта з рэлігійных абрадаў і забабонаў у Бягомльскім прыходзе Барысаўскага павета//Мин. епарх. ведомости. 1874. Часть неофиц. № 7. С. 229—230.

Пер. з рус. Дж. М. Чэчка.

### Благавешчанне

Вилен. вестник. 1895. № 68. С. 1—2. Зап. П. П. Дземідовіч у Мінскай губ.

Пер. з рус. А. І. Гурскага.

*Прошча* — прасціць, дараваць (заўв. збіральніка).

Святкуючы Благавешчанне, беларускі селянін як бы адзначаў пачатак вясны. Ён з вялікім нецярпеннем чакаў гэтага часу, калі прыйдзецца яму

першы раз пасля доўгай зімы ўзяцца за святую справу апрацоўкі зямлі, у якой ён бачыў адзіны залог свайго дабрабыту. Пачатак палявых работ, як і іх заканчэнне,— сапраўднае свята для селяніна і таму суправаджалася сямейнымі частаваннямі.

**[Пасля Благавешчання]**

Сержпутоўскі А. К. Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў. Мн., 1930. С. 96—97.

**Свянцоная вярба**

N. N. [Нікіфароўскі М.] Свянцоная вярба//Полоцкие епарх. ведомости. 1903. Неофиц. отдел. № 18. С. 675—678.

Пер. з рус. Дж. М. Чэчка.

Вар.: Вербная нядзеля на Беларусі//Гоман. 1918. № 24.

**Погляды беларусаў на святкаванне Вялікадня**

А. Б. Воззрения белорусов на празднества Пасхи//Минский листок. 1887. № 27.

Пер. з рус. А. І. Гурскага.

*А. Б.* — Адам Ягоравіч Багдановіч (бацька Максіма Багдановіча).

Вар.: Галенне галоў на даўнім Палессі перад Вялікаднем//Tygodnik Ilustrowany. 1867. № 394.

**Вялікдзень на Беларусі**

Календарь Северо-Западного края на 1889 г., издаваемый под редакцией М. В. Довнор-Запольского. М., 1889. С. 136—138. Нарыс. Зап. у в. Канюхі Слуцкага п. Мінскай губ.

Пер. з рус. А. С. Ліса.

**Вялікдзень у беларусаў Віленскай губерні**

Вилен. вестник. 1891. № 86. Зап. Сяргей Карскі.

Пер. з рус. А. І. Гурскага.

Вялікдзень — таксама веснавое свята старажытных славян у гонар ажыўлення прыроды. Напластаванне хрысціянскай рэлігіі на старажытныя народныя абрады і звычаі, як і на абрадавую народную паэзію, аказалася павярхоўным: яно прыдало ім чыста знешнюю хрысціянскую афарбоўку, але не змяніла іх традыцыйнай сутнасці, іх магічнага аграрна-вытворчага зместу.

*Пайкапы* — 30 адзінак чаго-небудзь (заўв. збіральніка).

*Тумень* — стрэмя (заўв. збіральніка).

*Перасуд* — тут: дар, падатак (заўв. збіральніка).

*Да рук* — тут: у значэнні падарунак (заўв. збіральніка); даваць да рук — даваць у рукі.

**Вялікдзень на Беларусі**

Валынец А. Великдень в Белоруссии//Вилен. вестник. 1893. № 66.

Пер. з рус. А. С. Ліса.

Матэрыял часткова пераклікаецца з папярэднім: А. Валынец у сваім апісанні Вялікадня на Беларусі выкарыстаў у значнай меры публікацыю С. Карскага «Вялікдзень у беларусаў Віленскай губерні».

### Вялікдзень у сялян-католікаў Паўночна-Заходняга краю

Вилен. вестник. 1893. № 68. Зап. М. Х. Петрулан у Свянцянскім п. Пер. з рус. В. І. Скідана.

### Вялікдзень у сялян-беларусаў

Вилен. вестник. 1895. № 73—74. Зап. П. П. Дземідовіч у Мінскай губ. Пер. з рус. А. І. Гурскага.

Вар.: Раманаў Е. Р. Вялікдзень у Магілёве 4 красавіка 1697 г.//Могилев. губерн. ведомости. 1898. Часть неофиц. № 27. Матэрыялы ўзяты Е. Р. Раманавым з «Путевого журнала» стольніка П. А. Талстога, які Пятром I быў камандзіраваны ў Італію ў 1697 г. для вывучэння марской справы і якi дні Вялікадня ў той час правёў у Магілёве; Драч М. Провады «Вялікадня» (Малюнкі быту)//Савецкая Беларусь. 1923. № 83; Вялікдзень// Новае жыццё. Вільня, 1923. № 6.

### Велікодныя абрады і звычаі ў вёсцы

Ивашин И. Пасхальные обряды и обычаи в деревне//Витеб. губерн. ведомости. 1905. № 87.

Пер. з рус. А. І. Гурскага.

*Івашын І.* — псеўданім Я. Журба.

### Велікодныя песні на Міншчыне

#### Валачобнікі

Bułhak Jan. Kwartalnik Litewski. Wilno, 1910. T. 5. C. 140—144.

Пер. з польск. А. С. Ліса.

### Вялікдзень

АІМЭФ, ф. 8, воп. 85, спр. 13, сш. 1, л. 47—50. Зап. Г. А. Каханоўскі ў 1895 г. у в. Васюлькі Мядзельскага р-на ад М. І Клімовіча, 1903 г. н.

Вар.: Велікодная ноч. Зап. Г. А. Каханоўскі ў 1985 г. там жа ад таго ж.

### Валачобнікі ў Віцебскай губерні

Шпилевский П. Волочебники в Витебской губернии//Русский дневник. 1859. № 101.

Пер. з рус. А. С. Ліса.

Вар.: Валачобніцтва на Беларусі ўпершыню апісана А. Рыпінскім у кн. «Беларусь» (Парыж, 1840); Каладзінскі М. А. Народны тэатр (БНТ). Мн., 1983. С. 58—67; Каментарыі. С. 483—484.

**Народнае святкаванне Юр'ева дня ў Заходняй Расіі**

Вилен. вестник. 1872. № 12. Зап. Юл. Крачкоўскі ў в. Загор'е Сеннінскае Навагрудскага п. Мінскай губ.; в. Азяты Кобрынскага п. Гродзенскай губ.; в. Нарва Бельскага п. Гродзенскай губ.; в. Шаркоўшчына Дзісенскага п. Віленскай губ.; в. Альшаны Ашмянскага п. Віленскай губ. Усе змешчаныя ў томе матэрыялы Юл. Крачкоўскага пазней выйшлі асобным выданнем «Быт западнорусского селянина» (М., 1874).

Пер. з рус. А. І. Гурскага.

**Некаторыя мясцовыя народныя звычаі ў дзень св. Юр'я**

М. Г. Некоторые местные народные обычаи в день св. Юрия (23 апреля)//Гродн. губерн. ведомости. 1893. Часть неофиц. № 32.

Пер. з рус. А. І. Гурскага.

**Святы Юрый на Беларусі**

Вилен. вестник. 1893. № 84.

Пер. з рус. А. І. Гурскага.

Вар.: Вилен. вестник. 1895. № 88.

**Запасванне гаўяда**

Сержпутоўскі А. К. Запасванне гаўяда: Очерки Белоруссии//Живая старина. 1908. Вып. 1. С. 29—33.

Праца А. Сержпутоўскага «Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў» (Мн., 1930) намі поўнасцю не выкарыстана па той прычыне, што ўсе прыкметы і павер'і, звязаныя з гадавым колам земляробчага календара, змешчаныя ў ёй, будуць апублікаваны ў томе серыі БНТ «Прыкметы і павер'і».

**Юр'еў дзень на Беларусі**

Николаев Е. П. Юрьев день в Белоруссии//Витеб. вестник. 1913. № 89. С. 3—4.

Пер. з рус. А. І. Гурскага.

*Фэст* — храмавое свята.

*«Бабскія разбрыкі»* — свята скачкаў выключна жанчын-гаспадынь, якое наладжваецца на працягу тыдня пасля Юр'я (пераважна ў аўторак ці ў чацвер і ў асноўным пасля абеду) з нагоды падрыхтоўкі град да пасеву.

Вар.: Юр'еў дзень//АІМЭФ, ф. 8, воп. 85, спр. 13, сш. 1, л. 18. Зап. Г. А. Каханоўскі ў 1985 г. у г. Маладзечна ад Н. М. Капуцкай-Каханоўскай, 1913 г. н.

**Юрай**

АІМЭФ, ф. 8, воп. 87, спр. 233, сш. 2, № 21. Зап. А. Ю. Лозка ў 1987 г. у в. Мікалаеўшчына Стаўбцоўскага р-на ад А. М. Каралецкай, 1923 г. н.

Вар.: Каладзінскі М. А. Народны тэатр (БНТ). Мн., 1983. С. 67—68; Каментарыі. С. 485.

**Абрад веснавання**

АІМЭФ, ф. 8, воп. 87, спр. 233, сш. 3, № 46. Зап. А. Ю. Лозка ў 1987 г. у в. Букча Лельчыцкага р-на ад М. С. Сушчык, 1907 г. н.

**Ваджэнне «стралы» («сулы») ва Усходнім Палессі**

Гусев В. Е. Вождение «стрелы» («сулы») в Восточном Полесье//Славянский и балканский фольклор. М., 1986. С. 63—73.

Пер. з рус. Дж. М. Чэчка.

Ваджэнне і пахаванне «стралы» праводзілася ў асноўным у канцы вясны (на Вялікдзень, Юр'я, Ушэсце) пры аглядзе азімых пасеваў. Гэта быў магічна-аграрны, ахоўна-засцерагальны веснавы абрад. Месца бытавання яго — пераважна тэрыторыя Гомельшчыны, а таксама Чарнігаўскай і Бранскай абласцей. Зафіксаваны ён і ў некаторых раёнах Брэсцкай, Магілёўскай, Мінскай абласцей. «Стралой» завяршаўся веснавы каляндарна-земляробчы цыкл. У час абраду «стралы» абавязковым было выкананне некаторых песень, як, напрыклад, «Ой, пушчу стралу па ўсяму сялу». У наш час гэтыя песні ў розных варыянтах бытуюць, як правіла, у пазаабрадавай паэзіі, а сам абрад страціў сваё ранейшае прызначэнне і існуе на Беларусі як вясёлая народная гульня.

Вар.: Українські народні пісні в записах Зоріана Доленги-Ходаковського... Київ, 1974. С. 514—515; Головацкий Я. Народные песни Галицкой и Угорской Руси. М., 1878. Т. 1. С. 192; Метлинский А. Народные южнорусские песни. Киев, 1854. С. 307; Романов Е. Р. Белорусский сборник. Киев, 1886. Вып. 2. № 16. С. 276; Добровольский В. Н. Смоленский этнографический сборник. М., 1903. Т. 4. № 81. С. 122—123; Радченко З. Гомельские народные песни (белорусские и малорусские). Записаны в Дятловичской вол. Гомельского у. Могилевской губ. СПб., 1888. № 9. С. 39; Яна ж. Сборник малорусских и белорусских песен Могилевской губ. (Гомельского у. Дятловичской вол.)... СПб., 1911. № 92. С. 39; Каршукоў М. Пахаванне «стралы»//Наш край. Менск, 1926. № 1 (4). С. 41—42; Веснавыя песні//Склад. Г. А. Барташэвіч, Л. М. Салавей; муз. частка В. І. Ялатава. Мн., 1979. № 291. С. 227; № 292. С. 228; Борташевіч Г. О. Обряд «водіння стріли» в Білорусії//Народная творчість та етнографія. 1983. № 4. С. 56—58; Гусев В. Е., Марченко Ю. И. «Стрела» в русско-белорусско-украинском пограничье (к проблеме изучения локальных песенных традиций)//Рус. фольклор. Т. 24. Л., 1987. С. 129—143; АІМЭФ, ф. 8, воп. 87, спр. 233, сш. 1. Зап. А. Ю. Лозка ў 1987 г. у в. Стаўбун Веткаўскага р-на ад М. Л. Зуевай, 1928 г. н., Е. П. Грамадцавай, 1923 г. н., А. Л. Фясько, 1922 г. н., Ф. Ф. Халюковай, 1910 г. н., М. Д. Тарановай, 1924 г. н., М. П. Марозавай, 1934 г. н., і інш.

**«Песенька мая харошая, захаваю цябе...»**

Ліцвінка В. Д. Песенька мая харошая, захаваю цябе//Мастацтва Беларусі. 1987. № 5. С. 67—71.

Аўтарам названага вышэй артыкула выкарыстаны ўласны багаты экспедыцыйны матэрыял аб ваджэнні і пахаванні «стралы» на Гомельшчыне ў наш час (1985 г.). Запісы зроблены ў многіх вёсках Веткаўскага р-на, асабліва песеннымі з якіх вызначыліся Неглюбка, Стаўбун, Барталамееўка, Казацкія Балсуны, Бесядзь і інш.

Вар.: Каладзінскі М. А. Народны тэатр (БНТ). Мн., 1983. С. 68—69; Каментарыі. С. 485.

## [Духаўскія святы]

Дембовецкий А. С. Опыт описания Могилевской губ. Могилев, 1882. Кн. 1. С. 515—516.

Пер. з рус. А. С. Ліса.

## Вянкі [Русалкі]

E. S. Светаянская ноч (фрагмент артыкула).

Czas. 1883. № 142. Паводле кн.: O. Kolberg. Dzieła wszystkie.

T. 52. Wrocław; Poznań, 1968. С. 119—120.

Пер. з польск. А. С. Ліса.

У некаторых мясцовасцях Беларусі сярод простанароддзя чэрвень месяц называўся русальным, а святы Русальнага тydня былі карнавальнымі відовішчамі, якія суправаджаліся русальнымі песнямі, гульнямі, музыкай, танцамі, скамарошнымі пераапрананнямі. Радзівілаўскі летапіс XIII ст. нават захаваў на мініяцюры выяву дзяўчыны ў рытуальным танцы на Русальніцу.

Вар.: Шлюбскі А. Русальніца//Маладняк. 1926. № 9. С. 87—102.

## [Русальная нядзеля]

Сержпутоўскі А. К. Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў. С. 101—102.

## [Кумаванне]

Романов Е. Р. Белорусский сборник. Вильна, 1912. Вып. 8. С. 229—230.

Пер. з рус. А. С. Ліса.

Кумаванне праводзілася на Сёмуху і Пятра і мела абрадавы характар.

## [Сёмуха]

Gelębiowski Lukasz. Yry i Zabawy róznych stanów w kraju calum, lub niektórych tylko prowincyach. Warszawa, 1831. S. 185—186.

Пер. з польск. А. С. Ліса.

Вар.: З. Б. [Змітрок Бядуля] На «Сёмуху»//Сав. Беларусь. 1923. № 117. С. 3.

Заўв. збіральніка: Сёмуха — свята зелені, ці Зялёныя святкі, адзначалася праз сем тыдняў або 50 дзён пасля Вялікадня. На Беларусі ў гэты час адзначаўся Русальны, або Граны, тыдзень. Па вёсках усе двары ўпрыгожваліся зеленню (бярозкамі). Зеленню ўпрыгожвалі нават цэрквы. Вясковыя дзяўчаты на галовы надзявалі вянкі з кветак і бярозавых галінак, пераапраналіся ў русалак і спявалі русальныя песні на жытніх палях. У песнях выказвалася просьба да русалак, каб тыя забяспечылі добры ўраджай. Калісьці Сёмуха і называлася проста «Русалія». Над адным казаннем Златауста напісана: «На Русалію», г. зн. на Сёмуху. Абраднасць у час Сёмухі складаецца з двух элементаў: абагатварэнне дрэў, раслін і абагатварэнне духаў продкаў (частаванні ядой сваіх «дзядоў»). На Сёмуху варылася для «дзядоў» спецыяльная куцця (Бядуля З. Сёмуха//Рунь (Менск). 1920. № 4).

## Дзень Тройцы

А. С. Тройцин день//Минский листок. 1886. № 18.

Пер. з рус. А. І. Гурскага.

Вар.: Бядуля З. На Сёмуху//Наша ніва. Вільня. 1915. № 18; Каладзінскі М. А. Народны тэатр (БНТ). Мн., 1983. С. 70—72; Каментарыі. С. 485.

## «Куст»

Вилен. вестник. 1866. № 214.

Пер. з рус. А. І. Гурскага.

«Куст» — у мінулым абрадавае свята ў сялян. Абрад «куста» першы апісаў Р. Зянькевіч (Piosenki gminne Ludu pińskego. Kvuno, 1851).

Некаторыя лічаць, што свята «куст» адпавядае святу Додоля ў сербаў і Кралька ў чэхаў (заўв. збіральніка).

*Сукня* — тут: сукенка.

*Хванды* — тут: складкі.

*Пасаманы* — тут: абшыўкі.

*Ляшчынанька* — тут: арэшнік.

Перадрук.: Быковский В. Праздник «куста»//Памятная книжка Виленского генерал-губернаторства на 1868 год. СПб., 1868. С. 80—84.

## «Куст»

В. Н. Куст//Гродн. губерн. ведомости. 1894. Часть неофиц. № 47.

Пер. з рус. А. І. Гурскага.

*Дагону* — тут: дакору.

*Не дажэнеш* — тут: не папракнеш (не ўпікнеш); не дагоніш.

Вар.: Каладзінскі М. А. Народны тэатр (БНТ). Мн., 1983. С. 73—74; Каментарыі. С. 485—486.

## Купала [і Сёмуха]

Czarnowska M. Zabytki mitologii slawiańskiej w zwyczajach wejskiego ludu na Bialej Rusi dochowywane//Dziennik Wileński. Wilno, 1817. T. 6. S. 398—406.

Пер. з польск. А. С. Ліса.

Вар.: Tyszkiewics J. Tygodnik Peterburski. 1837. № 66.

## Пра святкаванне Купалы

Вилен. вестник. 1866. № 228.

Пер. з рус. А. І. Гурскага.

Заўв. збіральніка: агонь у сялян Пінскага павета і ў час запісу твора азначаў шчасце і багацце. Так, у час вяселля маладыя, едучы ўжо ў дом бацькоў жаніха, павінны былі пераехаць праз агонь, запалены ў варотах, для таго, каб ім пашчаслівілася ў жыцці. У некаторых месцах Пінскага павета сяляне агонь называюць «багач». У Ноўгарадскай губерні купальскі агонь называлі «жывы агонь».

Папараць адносіцца да тых раслін, якія не маюць кветак, таму і немагчыма знайсці іх; кветкі, якія карыстаюцца такою славай, існуюць толькі ва ўяўленні народа.

Перадрук.: Быковский В. О празднике Купалы//Памятная книжка Виленского генерал-губернаторства на 1868 год. СПб., 1868. С. 77—80.

### Дзень Івана Купалы ў Заходняй Расіі

Вилен. вестник. 1872. № 34—35. Зап. Юл. Крачкоўскі ў Брэсцкім, Слонімскім, Вілейскім, Дзісенскім, Навагрудскім і Барысаўскім паветах.

Пер. з рус. А. І. Гурскага.

Вар.: О. Б-ский. Суеверные обряды простонародья Западного края. I. Купала//Русский мир. 1873. № 342.

### Іван Купала

Этнограф. обозрение. Кн. XI. Издание этнограф. отдела ИОЛЕАЭ. М., 1891. № 4. С. 190—192; П. Бывалькевич. Иван Купала. Зап. у в. Углы Слуцкага п. Мінскай губ.

Пер. з рус. А. І. Гурскага.

Вёска Углы ў той час уяўляла сабой адзінае месца (з усіх суседніх вёсак) у Слуцкім павеце, дзе яшчэ захоўваўся старажытны звычай святкавання Купалы. Яна стаяла ў баку ад вялікіх дарог. Сяляне рэдка выязджалі куды-небудзь у горад, а некаторыя нават ні разу не былі ў суседнім мястэчку. Таму, на думку даследчыка, гэта было адной з прычын захавання ў дадзенай мясцовасці старых звычаяў святкавання Купалы.

*Жупіць* — размаўляць.

### Купала ў беларускай вёсцы

Вилен. вестник. 1895. № 134. С. 2. Зап. П. П. Дземідовіч у Мінскай губ.

Пер. з рус. А. І. Гурскага.

### Купалле

Власт. Купалле//Наша ніва. Вільня, 1911. № 25—26. С. 326—327.

Вар.: Власт. Купалле//Наша ніва. Вільня, 1912. № 22. С. 3.

Абрад «куста», які адбываўся на Купалле ў Ваўкавыскім п. каля Лыскава, добра апісаны М. Федароўскім. Поўнасцю гэты матэрыял знаходзіцца ў рукапісным аддзеле бібліятэкі Варшаўскага універсітэта, сігн. 135-IV, т. 1, вокл. 6-d, арк. 157—158. Коратка ён апублікаваны ў кн. Я. Саламевіча «Міхал Федароўскі» (Мн., 1972. С. 246—247).

### Купалле

Беларускі каляндар «Нашае нівы». Вільня, 1912. С. 19, 21.

Вар.: Каладзінскі М. А. Народны тэатр (БНТ). Мн., 1983. С. 69—70; Каментарыі. С. 485.

### Некаторыя звычаі і павер'і заходнерусаў у час касьбы і жніва

Вилен. вестник. 1872. № 51—52. Зап. Юл. Крачкоўскі ў Брэсцкім, Бельскім і Кобрынскім паветах Гродзенскай губ. і ў Навагрудскім п. Мінскай губ.

Пер. з рус. А. І. Гурскага.

Жніўныя абрады і звычаі з'яўляюцца вяршыняй гаспадарчай дзейнасці чалавека. Асноўныя жніўныя абрады былі звязаны з двума этапамі жніва: зажынкамі і дажынкамі. У абрадах і звычаях зажынак і дажынак знайшла ўвасабленне вялікая пашана чалавека працы да хлеба — асновы дабра і жыцця працоўнай сям'і.

## [Дажынкі]

Gelębiowski Lukasz. Yry i Zabawy róznych stanow w kraju całum, lub niktórych tylko prowincyach. Warszawa, 1831. S. 270.

Пер. з польск. А. С. Ліса.

*На Літве* — тут: на Віленшчыне.

## Абрады сялян Віцебскай і Мінскай губерняў пры ўборцы хлеба з палёў

Шпилевский П. Обряды крестьян Витебской и Минской губерний при уборке хлеба с полей//Пантеон. 1853. Т. 9. Кн. 6. С. 19—34.

Пер. з рус. А. С. Ліса.

## Жніўныя абрады

Шейн, 1887. С. 237—240, 263—270.

Пер. з рус. А. С. Ліса.

## Зажынкі і абжынкі

Пшчолка А. Зажинки и обжинки//Витеб. губерн. ведомости. 1903. № 207, 240, 283. (Зап. А. Пшчолкам з натуры).

Пер. з рус. А. І. Гурскага.

*Прыпарніца* — перыяд найбольш напружанай працы.

*Таган* — трыножак, на які вешаюць калыску з дзіцем (заўв. збіральніка).

*Велікодны абрус* — абрус, у які захіналі велікодную свянцоную ежу.

*Завадайла* — завадатар.

*Патачка* — паблажка.

*Глядзець на паповы сані* — цяжка хварэць, быць у такім стане здароўя, калі ўжо няма надзеі на папраўку.

*Журба* — тут: лаянка, сварка.

*Баран* — тут: барометр.

*Пайсці вясёлкаю* — пайсці вясёлымі.

*«Бараду» палоць* — палоць невялікі кусцік недажатага жыта, якое спецыяльна пакідалі для вянка ў знак заканчэння работы — дажынак.

*«Полацкі» бок неба* — відаць, што знаходзілася ў напрамку да Полацка.

## [Зажынкі]

Романов. Белорусский сборник. Вып. 8. С. 239—240, 260—268.

Пер. з рус. А. С. Ліса.

*Артос* — прасфора — про́свіра — прасвірка — круглая белая булка (з

крутога прэснага цеста), якая выкарыстоўваецца ў абрадах праваслаўнага набажэнства, або: размалёваны хлеб, які на працягу святога тыдня знаходзіцца ў царкве перад іканастасам, а ў суботу на святым тыдні асвячаецца «святой» вадой і размяркоўваецца паміж веруючымі.

**Зажынкі**

Беларускі каляндар «Нашае нівы». Вільня, 1912. С. 23.

**Дажынкі**

Беларускі каляндар «Нашае нівы». Вільня, 1912. С. 23, 25.

Вар.: Плашчынскі Я. Аб жніўных абрадах і песнях//Маладняк. 1925. № 6.

**Зажынкі і дажынкі**

АІМЭФ, ф. 8, воп. 85, спр. 13, сш. 1, л. 20—21. Зап. Г. А. Каханоўскі ў 1985 г. у г. Маладзечна ад Н. М. Капуцкай-Каханоўскай, 1913 г. н.

**«Жаніцьба коміна»**

Лозка А. «Жаніцьба коміна»//Крыніца. 1988. № 8. С. 29.

Вар.: Каладзінскі М. А. Народны тэатр (БНТ). Мн., 1983. С. 74—75; Каментарыі. С. 486.

**«Жаніцьба пасвета»**

АІМЭФ, ф. 8, воп. 88, спр. 235, сш. 2. Зап. А. Ю. Лозка ў 1988 г. у в. Дзяржынск Лельчыцкага р. ад Н. Я. Паповіч, 1939 г. н., П. М. Паповіч, 1924 г. н., М. М. Таргоня, 1914 г. н.

**[Багач]**

Богданович А. Е. Пережитки древнего миросозерцания у белорусов. Гродна, 1895. С. 122—125.

Пер. з рус. А. С. Ліса.

**Свята Багач**

Материалы по этнографии Гродненской губернии. Вильна, 1911. Вып. 1. С. 40.

Пер. з рус. А. С. Ліса.

**[Багатнік]**

Сержпутоўскі А. К. Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў. С. 106.

**[Пакровы]**

Сержпутоўскі А. К. Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў. С. 107.

### Дзяды...

Zieńkiewicz R. O uroczyskach i zwyczająch ludu pińskiego oraz o charakterze jego pieśni//Biblioteka Warszawska. 1853. T. 1. C. 111—113. Зап. у Пінскім п.

Пер. з польск. У. А. Васілевіча.

Вар.: Анимелле Н. Быт белорусских крестьян//Этнограф. сборник, издаваемый ИРГО. СПб., 1854. Вып. 2. С. 212—214. Зап. у Віцебскай губ.; ААН СССР, ф. 104, воп. 1, адз. зах. 120, л. 1—4. Зап. А. Несцярук у в. Ягнешчыцы Кастравіцкай вол. Слонімскага п.; О. Б-ский. Суеверные обряды простонародья Западного края. II. Дзяды//Русский мир. 1873. № 344; Нечаев С. О поминовении умерших: Нечто из религиозных обрядов и суеверий в Бегомльском приходе Борисовского у.//Минские епарх. ведомости. 1874. Часть неофиц. № 7. С. 227—229; АІМЭФ, ф. 9, воп. 5, спр. 6, сш. 2, с. 30—31. Зап. у 1932 г. А. К. Супінскі; АІМЭФ, ф. 8, воп. 84, спр. 220, сш. 2, л. 48—49. Зап. 24 лютага 1984 г. ад М. Я. Лазар, 1920 г. н., у в. Баранцы Вілейскага р.

### Дзяды

Крывіч. Коўна, 1927. № 12. С. 66—69. Зап. у Дзісенскім п.

### Восеньскія Дзяды ў Нежкаўскай воласці Магілёўскага павета

Шейн. Материалы... С. 608—612. Зап. настаўнік народнага вучылішча П. Рачкоўскі.

Пер. з рус. У. А. Васілевіча.

Вар.: Шейн. Материалы... С. 598—600. Зап. М. Я. Нікіфароўскі.

БАН. Аддзел рукапісаў, 45.8.36, л. 3 адв. Зап. у 1910 г.

Пер. з рус. У. А. Васілевіча.

З. Б. [З. Бядуля] Дзень ураджаю//Сав. Беларусь. 1924. № 238. С. 2.

У 20-я гады XX ст. Дзень ураджаю адзначаўся штогод восенню 14 кастрычніка.

### Змітраўскія дзяды ў мястэчку Заслаўе Мінскага павета

Шейн. Материалы... С. 602—603. Зап. свяшчэннік Ф. І. Смародскі.

Пер. з рус. У. А. Васілевіча.

Вар.: Tyszkiewicz E. Opisanie powiatu Borysowskiego. Wilno, 1847. S. 378—379; Шейн. Материалы... С. 606—608. Зап. настаўнік Лешчанка.

## СУЦЭЛЬНЫЯ АПІСАННІ АБРАДАЎ І ЗВЫЧАЯЎ ГАДАВОГА КОЛА

### Пра звычаі Піншчыны

Zieńkiewicz R. O uroczyskach i zwyczajach ludu pińskiego oraz o charakterze jego pieśni//Biblioteka Warszawska, 1853. T. 1.

Пер. з польск. В. І. Скідана.

Вар.: Юзэфіна О. (Ю. Асіпоўская). Звычаі і абрады люду ў Запушчанскім//Магазын Повшэхны. 1838. С. 178, 186, 194, 202, 213, 220; Kamiński M. Kilka słów o zwyczajach ludu w gubernii Mińskiej//Tygodnik Ilustrowany. 1867. № 422; Wacława. Jeszcze słów kilka o zwyczajach i pieśniach ludu w gubernii Mińskiej//Tygodnik Ilustrowany. 1869, № 84—85.

### Земляробчы каляндар

Гильтэбрандт П. Сборник памятников народного творчества Северо-Западного края. Вильна, 1866. Вып. 1 (з прадмовы да зборніка).

Пер. з рус. В. І. Скідана.

Апісанне «жніва» зроблена І. В. Катовіч у в. Косічы Брэсцкага п.

Вар.: С. С. Б. Сельскія нарысы. Павер'і і прыкметы. Сельскі каляндар//Могилев. губерн. ведомости. 1865. Часть неофиц. № 29, 34. С. 193—194, 235; Кучынскі Е. М. Звычаі і павер'і ў некаторых мясцовасцях Рагачоўскага п.//Могилев. губерн. ведомости. 1868. Часть неофиц. № 22. С. 150—151; Сердзюкоў І. Сялянскае жыццё і звычаі ў Мсціслаўскім п.//Могилев. губерн. ведомости. 1868. Часть неофиц. № 22. С. 146—148; Слупскі А. І. Паўночна-Заходні каляндар на 1892 высакосны год. Мн., 1891. С. 3—22; Невяровіч В. Аб святах, павер'ях і звычаях у сялян беларускага племені, якія насяляюць Смаленскую губ.//Памятная книжка Смоленской губернии на 1859 г. Смоленск, 1859. С. 135—169.

### Абрады і звычаі сялян

Дмитриев М. А. Собрание песен, сказок, обрядов и обычаев крестьян Северо-Западного края. Вильна, 1869. С. 221—264. Зап. М. А. Дзмітрыеў у Вілейскім п. Віленскай губ.

Пер. з рус. В. І. Скідана.

Гэтыя ж матэрыялы спачатку былі надрукаваны М. Дзмітрыевым у газеце «Гродненские губернские ведомости» за 1867 г. у № 30—40, 42—43 пад загалоўкам «Абрады і звычаі заходнерускіх сялян». У «Гродненских губернских ведомостях» за 1868 г. (№ 30—36) пад загалоўкам «Норавы і звычаі заходнерускага народа» М. Дзмітрыеў апублікаваў вялікую колькасць беларускіх народных песень розных жанраў, запісаных ім у Віленскай губ.

### Нарысы народнага абраду, звычаю і ўсяго быту

Бессонов П. Белорусские песни с подробными объяснениями их творчества, языка, с очерками народного обряда, обычая и всего быта. М., 1871.

Пер. з рус. В. І. Скідана.

*Хвайды* — тут: фалды, зборкі.

### Каляндар паводле народных паданняў

Зап. ИРГО по отд-нию этнографии. СПб., 1873. Т. 5. С. 1—43; Берман И. Календарь по народным преданиям в Воложинском приходе Ошмянского у. Виленской губ.

Пер. з рус. В. І. Скідана.

*Оруд* — тут: засек.

*Дзесятнічак* — тут: грыўна.

*Гардовіца, гарда, гардойка* — расліна, дзейнічае, па словах мясцовых жыхароў, супроць нарываў, коклюшу і інш.

**Сляды язычніцтва ў святах, абрадах і песнях**

Киркор А. К. Белорусское Полесье: Следы язычества в празднествах, обрядах и песнях//Живописная Россия. СПб., 1882. Т. 3. С. 249—277.

Пер. з рус. В. І. Скідана.

*Ляды паліць* — ачышчаць поле ад зарасніку (заўв. збіральніка).

**Некаторыя звычаі, павер'і, прыкметы і прымхі**

Радченко З. Гомельские народные песни. СПб., 1888. С. XIV—XLII (Введение: Некоторые обычаи, приметы и суеверья, песни и связанные с ними обряды).

Пер. з рус. В. І. Скідана.

**Абрады, прыкметы, варожбы, забабоны, павер'і і прымхі пінчукоў**

Зап. ИРГО по отд-нию этнографии. Т. 13. Вып. 3; Булгаковский Д. Г. Пинчуки: Песни, загадки, пословицы, обряды, приметы, предрассудки, поверья, суеверья и местный словарь//Этнограф. сборник. СПб., 1890. С. 178—185.

Аграрныя абрады і звычаі, як і наогул увесь апублікаваны ў зборніку матэрыял, зап. Д. Г. Булгакоўскі ў 70-х гадах XIX ст. у Пінскім п. Мінскай губ.

Пер. з рус. А. І. Гурскага.

**Нататкі па беларускай этнаграфіі**

Живая старина. СПб., 1893. Вып. 2. С. 283—296; Довнар-Запольский М. Заметки по белорусской этнографии.

Пер. з рус. В. І. Скідана.

**Каляды і Купала на Беларусі**

Этнограф. обозрение. М., 1908. № 1—2. С. 158—165. Зап. А. Петрапаўлаўскі.

Пер. з рус. В. І. Скідана.

*Жамеры* — жмыхі, высеўкі з тоўчанага канаплянага семя.

**Павер'і, абрады і звычаі**

Каминский В. Белорусы Ново-Александровского уезда: Поверья, обряды и обычаи//Филол. записки. Воронеж, 1910. Вып. 5. С. 759—769.

Пер. з рус. В. І. Скідана.

Вар.: Бядуля З. Беларускі тэатр. II. Жывы каляндар беларускага гадавога круга//Вестник Народного комиссариата просвещения ССРБ. 1922. Вып. 9—10.

# ЗМЕСТ

Каляндарныя абрады і звычаі . . . . . . . . . . . . . 5
Зіма . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 13
Вясна . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 40
Лета . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 55
Восень . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 63

Апісанні свят земляробчага календара . . . . . . . . . 71

Суцэльныя апісанні абрадаў і звычаяў гадавога кола . . . 281

Беларускі народны каляндар . . . . . . . . . . . . . 369

Каментарыі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 383

Научное издание

БЕЛОРУССКОЕ НАРОДНОЕ ТВОРЧЕСТВО

**ЗЕМЛЕДЕЛЬЧЕСКИЙ КАЛЕНДАРЬ**

**ОБРЯДЫ И ОБЫЧАИ**

Минск, издательство «Навука і тэхніка»

*На белорусском языке*

Навуковае выданне

БЕЛАРУСКАЯ НАРОДНАЯ ТВОРЧАСЦЬ

**ЗЕМЛЯРОБЧЫ КАЛЯНДАР**

**АБРАДЫ І ЗВЫЧАІ**

Загадчык рэдакцыі *Л. І. Пятрова*
Рэдактар *М. А. Вячорка*
Мастак *Вікт. В. Саўчанка*
Мастацкі рэдактар *В. В. Саўчанка*
Тэхнічны рэдактар *В. І. Кручонак*
Карэктар *Я. У. Марціновіч*

ІБ № 3629

Друкуецца па пастанове РВС АН БССР. Здадзена ў набор 05.04.90. Падпісана ў друк 06.09.90. Фармат $60 \times 84^1/_{16}$. Папера афс. кн.-час. Гарнітура літаратурная. Афсетны друк. Ум. друк. арк. 23,7. Ум. фарб.-адб. 23,93. Ул.-выд. арк. 25,6. Тыраж 2700 экз. Зак. № 666. Цана 2 р. 60 к.

Выдавецтва «Навука і тэхніка» Акадэміі навук БССР і Дзяржаўнага камітэта БССР па друку. 220600. Мінск. Жодзінская, 18. Друкарня імя Францыска Скарыны выдавецтва «Навука і тэхніка». 220600. Мінск. Жодзінская, 18.

**Земляробчы каляндар:** Абрады і звычаі / Уклад.,
З-53 класіф., сістэм. матэрыялаў і камент. А. І. Гурскага; Уступ. арт. А. І. Гурскага, А. С. Ліса; Рэдкал.: А. С. Фядосік (гал. рэд.) і інш.— Мн.: Навука і тэхніка, 1990.— 405 с.— (БНТ: Беларус. нар. творчасць / АН БССР. Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору).

ISBN 5-343-00464-4.

Земледельческий календарь: Обряды и обычаи.

Упершыню найбольш поўна дадзены апісанні традыцыйных абрадаў і звычаяў гадавога кола беларускага земляробчага календара. Матэрыялы, уключаныя ў том, запісаны этнографамі і фальккларыстамі ў асноўным у XIX і XX стст.

Разлічана на этнографаў, фальклярыстаў, гісторыкаў, філолагаў, работнікаў культуры і ўсіх, хто цікавіцца беларускай народнай творчасцю.

З $\frac{4702120105-146}{М316(03)-90}$ 143—90

**ББК 82.3 Бел-6**

**У выдавецтве**

**«НАВУКА І ТЭХНІКА»**

у 1991 г. выйдзе кніга

Васілевіч У. А. **Збіральнікі.** Аб'ём 10 л.

*На беларускай мове. Арыенціровачная цана 1 р. 50 к.*

Прысвечана жыццю і дзейнасці дзесяці малавядомых беларускіх фалькларыстаў — Кольберга, Глогера, Бермана, Троіцкага, Пшчолкі, Біруты, Яленскай-Дмахоўскай, Вярыгі, Пяткевіча, Машынскага. На падставе шматлікіх архіўных дакументаў прадстаўлены творчыя партрэты збіральнікаў, публікатараў і даследчыкаў беларускага фальклору. Кніга раскрывае новыя старонкі беларускай навукі пра народную творчасць і разлічана на шырокае кола чытачоў.

*Заказы накіроўвайце па адрасу:*

*220600, Мінск, Ленінскі пр., 72.*
*Магазін «Акадэмкніга».*

2 р. 60 к.

ЗЕМЛЯРОБЧЫ КАЛЯНДАР